ЛОЕЎШЧЫНА... БЭЗАВЫ РАЙ, ПЕСЕННЫ КРАЙ

СУЧАСНЫ СТАН ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЛОЕЎШЧЫНЫ

ЛОЕЎСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ»

ЛОЕЎШЧЫНА...
БЭЗАВЫ РАЙ, ПЕСЕННЫ КРАЙ

СУЧАСНЫ СТАН ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЛОЕЎШЧЫНЫ

ГОМЕЛЬ
«СОЖ»
2007

1-Зак.1526

УДК 398(=161.3)(476.2)
ББК 82.3(4Беи)
Л70

Аўтар-укладальнік
В. С. НОВАК

Рэдакцыйная калегія:
В. С. Новак, доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры беларускай культуры і фальклярыстыкі (адказны рэдактар);
А. А. Станкевіч, доктар філалагічных навук, прафесар,
дырэктар Навукова-даследчага інстытута гісторыі і культуры
ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Ф. Скарыны;
Л. В. Мельнікава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай і замежнай літаратуры
УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна»;
С. А. Вяргеенка, аспірантка
ДНУ «Інстытут мастацкай этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі»;
А. А. Кастрыца, настаўніца СШ № 59 г. Гомеля;
А. В. Кучарава, малодшы навуковы супрацоўнік;
Т. М. Дубяк, рэдактар газеты «Гомельскі універсітэт»;
Т. В. Кручэнка, рэдактар аддзела сацыяльных праблем газеты «Гомельская праўда»,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі

Навуковыя рэцэнзенты:
А. У. Марозаў, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела славістыкі
ДНУ «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі»;
Р. М. Кавалёва, кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры тэорыі літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт»

Выданне падрыхтавана і надрукавана
пры фінансавай падтрымцы Гомельскага аблвыканкама

Творчы калектыў выкладчыкаў і студэнтаў-філолагаў УА «ГДУ імя Ф. Скарыны» выказвае словы шчырай удзячнасці старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Валерыю Сцяпанавічу Сяліцкаму за падтрымку выдання

Лоеўшчына... Бэзавы рай, песенны край : сучасны стан традыцыйнай
Л70 культуры Лоеўшчыны / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца
В. С. Новак. – Гомель : Сож, 2007. – 472 с. : іл.

ISBN 978-985-6551-78-2

У кнізе прадстаўлены сучасныя запісы розных жанраў вуснай народнай творчасці жыхароў Лоеўшчыны. Гэта своеасаблівая энцыклапедыя духоўнага жыцця і побыту лаяўчан прыцягвае ўвагу шчырасцю, глыбінёй і дасканаласцю словатворчасці, трапнасцю і мудрасцю народных назіранняў і ўяўленняў.

Гэтае выданне будзе карысным і цікавым для работнікаў устаноў культуры, этнографаў, фальклярыстаў, гісторыкаў, настаўнікаў, студэнтаў і школьнікаў, для ўсіх аматараў традыцыйнай культуры беларусаў.

УДК 398(=161.3)(476.2)
ББК 82.3(4Беи)

© Лоеўскі райвыканкам, 2007
© УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», 2007
© Афармленне. КВПУП «Сож», 2007

ISBN 978-985-6551-78-2

ЛОЕЎШЧЫНА – «КРАЙ ШЧОДРЫХ СЭРЦАЎ І РУПЛІВЫХ РУК»!

Гэтым краем нельга не зачаравацца! Аднойчы ўзышоўшы на высокі правы бераг і ўбачыўшы панараму велічнага цячэння Дняпра, яго аздобленыя зелянінай вербалозаў і заліўных лугоў кручы, імгненна адчуваеш крылы за плячыма. Дух захоплівае ад радасці палёту над гэтай непаўторнай зямлёй. Прагнеш зноў і зноў вяртацца сюды, бо менавіта тут жывеш адчуваннем еднасці сваёй чалавечай істоты з небам, зямлёй і вадою. Тут усведамляеш Лоеўшчыну як рубеж роднай Беларусі, за які аддалі жыцці тысячы салдат і камандзіраў, прадстаўнікі розных народаў шматнацыянальнага Савецкага Саюза.

Неаднойчы я, ураджэнец суседняй Хойнікшчыны, задаваў сабе пытанне: чаму так хутка парадніўся з гэтай зямлёй, жыву на ёй з адчуваннем яе святасці і, углядаючыся ў чарговы раз у дняпроўскія прасторы, лаўлю сябе на перажыванні таго патрыятычнага парыву, што ў кастрычніку 1943-га ўзняў самых розных людзей на фарсіраванне гэтай славянскай ракі. Міжволі згадваеш як рэтраспектыву дакументальных кадраў і падзеі сівой мінуўшчыны – XI–XIII стагоддзі, калі тут, на Лоевай Гары, узнікла паселішча. Пазней на гэтым месцы ўзнёсся адметны драўляны замак – важны абарончы фарпост на шляху татар Перакопскай арды, якія перапраўляліся тут праз Днепр падчас сваіх набегаў на землі Вялікага княства Літоўскага. Лоеў, дашчэнту спалены ў 1505 годзе воінамі Мехмет-Гірэя, быў адбудаваны па загаду магната Льва Сапегі. І зноў крывавы дзень у гісторыі горада – 31 ліпеня 1649 года, вядомы як Лоеўская бітва: войскі гетмана ВКЛ Януша Радзівіла разбілі казакаў гетмана Багдана Хмяльніцкага. А літаральна праз два гады каля Лоева – чарговая сутычка паміж воінамі Я. Радзівіла і палкоўніка Марціна Нябабы, гібель людзей і разбурэнні.

У чые толькі рукі не траплялі лоеўскія землі за сваю больш чым 500-гадовую гісторыю! У 1793 годзе, пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай, мястэчка Лоеў Рэчыцкага павета Мінскай губерні – у складзе Расійскай імперыі. Ва ўсе часіны гарадок славіўся лепшымі на Дняпры драўлянымі караблямі, бойкімі кірмашамі, якія мелі назву Лоеўскай Дзесятай, бо адбываліся на дзесяты тыдзень пасля Вялікадня.

Лоеў увайшоў у склад Гомельшчыны ў маі 1919-га. Свой летапіс савецкага часу ён адкрыў боем з белапалякамі («лоеўскі прарыў»), у якім удзельнічалі караблі Дняпроўскай флатыліі. У 1926 годзе быў створаны Лоеўскі раён у складзе Рэчыцкай акругі.

Бадай, самымі блізкімі і дарагімі для сучаснікаў з'яўляюцца старонкі Вялікай Айчыннай. Згадаем, як у лістападзе 1942-га партызанскія злучэнні Каўпака і Сабурава разграмілі фашысцкі гарнізон і правялі ў райцэнтры святочны парад, прысвечаны 25-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1943-м нашаму краю суджана было стаць плацдармам, з якога пачнецца вызваленне Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Тут войскі Цэнтральнага фронту фарсіравалі Днепр. 279 воінаў Савецкай Арміі праявілі на Лоеўшчыне ўзоры мужнасці і храбрасці, за што былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. 39 з іх пахаваны на нашай святой зямлі. Звыш трох тысяч ураджэнцаў раёна ахвяравалі свае жыцці на алтар Перамогі. Дарэчы, Лоеўшчына – радзіма пяці Герояў Савецкага Саюза: Кузьмы Грыба, Аляксея Казлова, Акіма Карпенкі, Дзмітрыя Марозава, Рыгора Пінчука.

Па суседству з райвыканкамам ёсць выдатны музей бітвы за Днепр, які ў дні святкавання 60-годдзя Перамогі адзначыў сваё 20-годдзе. Больш 3000 экспанатаў яго ўвачавідкі нагадваюць нашчадкам пра сілу еднасці і братэрства ў барацьбе з ворагам, узнаўляюць канкрэтныя эпізоды абарваных вайной біяграфій людзей. Штогод напярэдадні Дня Перамогі з розных рэспублік былога Саюза прыязджаюць, каб пакланіцца брацкім магілам сваіх родных і блізкіх, дзеці, унукі і праўнукі загінуўшых на нашай Лоеўшчыне. Прыемна, калі заходзяць і ў райвыканкам узбекі, туркмены, таджыкі, якуты і прадстаўнікі іншых народаў, каб у адпаведнасці са сваімі нацыянальнымі традыцыямі выказаць удзячнасць за захаванне ў належным стане помнікаў і абеліскаў. У такія хвіліны яскрава адчуваеш, наколькі надзейны мост пракладзены з мінулага ў сённяшні дзень праз воды Дняпра. Ён – з інтэрнацыяналізму, роднасці славянскіх народаў. У нашай генетычнай памяці пульсуе гэта патрыятычная повязь фарсіраваннем Дняпра. І ніякія межы не здольныя паўплываць на гэтую еднасць!

У ваколіцах Лоева шмат свяшчэнных мясцін, дзе ўстаноўлены адпаведныя памятныя знакі былых падзей. Там, дзе раней стаяла адна з дзвюх лоеўскіх цэркваў, у 2000-м паставілі драўляны крыж, каля якога штогод на дзесяты тыдзень пасля Вялікадня служыцца малебен, каб засцерагчы славянскія народы ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

У лесе паміж вёскамі Крупейкі і Шчытцы, дзе, па згадках старажылаў краю, напярэдадні вайны са шведамі святая вялікамучаніца Параскева з'явілася ў вобразе іконы на сасне, восем гадоў назад пабудавана прыгожая каплічка. Тут штогод праводзіцца хрэсны ход.

І яшчэ адна каплічка, ажурная, у стылі барока, узнеслася на высокім беразе Дняпра як даніна памяці храму святіцеля Мікалая, што быў разбураны ў 1936-м. Сённяшнія жыхары Лоева ўжо больш пятнаццаці гадоў маюць магчымасць наведваць Свята-Троіцкі сабор, які быў закладзены па благаславенню Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта.

У нашым краі жывуць шчодрыя на дабрыню, працавітыя і таленавітыя людзі. Здаўна Лоеўшчыну ўслаўляюць народныя майстры, мастакі, спевакі, танцоры, музыкі, навукоўцы. Напрыклад, пры сельскім Доме культуры вёскі Уборак адкрыты цэнтр рамёстваў, у якім сталыя майстры лозапляцення, разьбы па дрэву, ганчары вучаць моладзь гэтым старажытным справам. Каля 130 дзяцей займаюцца ў музычных школах Лоева, вёсак Бывалькі і Уборак. Дарэчы, педкалектыў і навучэнцы Лоеўскай дзіцячай музычнай школы актыўна выступаюць на сцэнічных пляцоўках раёна ў складзе аркестраў – духавога і народных інструментаў, інструментальных і вакальных ансамбляў, пастаянна ўдзельнічаюць у раённых і абласных мерапрыемствах, конкурсах і фестывалях.

Кожнае лета натхняецца на напісанне новых празаічных твораў на роднай зямлі ўраджэнец Ястрабкі, вядомы беларускі пісьменнік, аўтар 15 кніг Міхась Даніленка. Яго «творчая лабараторыя» цяпер у вёсцы Пустая Града, якую дасціпны творца сярод суседзяў перайменаваў у «багатую».

Дняпроўскія кручы, праўда ў Кіеве, нагадваюць нашаму земляку, мастаку Вячаславу Ігнаценку, краявіды вялікай славянскай ракі на Лоеўшчыне, дзе прайшло яго маленства. Карціны жывапісца зараз экспануюцца ў галерэях ЗША, Канады, Германіі, Румыніі і іншых краін.

Колькі радасці, святла нясуць сваімі выступленнямі нашы народныя калектывы: хор «Світанак», вакальны ансамбль «Жывіца», ансамбль народнай песні «Пралеска», фальклорны гурт «Лутава», тэатральны калектыў «Адлюстраванне»!

Далёка за межамі Беларусі ведаюць і наш дзяржаўны педагагічны каледж, у якім за 44 гады існавання падрыхтавана звыш пяці тысяч высокакваліфікаваных настаўнікаў пачатковых класаў. Высокімі ўзнагародамі Айчыны адзначаны педагогі – ураджэнцы Лоеўшчыны – Марыя Сурта, Юлія Калеснікава, Міхаіл Хамічэнка, Марыя Атрошчанка, Сяргей Сівуха, Таццяна Івахненка і многія іншыя.

У раёне 23 клубныя ўстановы, 27 бібліятэк і звыш 100 калектываў мастацкай самадзейнасці, якія беражліва захоўваюць і перадаюць новым пакаленням спеўную культуру бацькоўскай зямлі, яе абрады, звычаі, традыцыі. У скарбонкі гістарычнага мінулага, фальклорна-этнаграфічнай спадчыны Лоеўшчыны пільна ўзіраюцца навукоўцы ГДУ імя Ф. Скарыны. Свае археалагічныя раскопкі праводзілі экспедыцыі студэнтаў гістфака пад старшынствам кандыдата гістарычных навук Алега Макушнікава, а юнакі і дзяўчаты з філфака пад кіраўніцтвам прафесара Валянціны Новак, старшага выкладчыка філалагічнага факультэта Веры Генаш і аспіранткі ІМЭФ НАН Беларусі Алены Кастрыца запісвалі абрады і звычаі, песні і казкі, легенды і паданні і іншыя фальклорныя жанры. Частка сабраных у ходзе вандровак па вёсках Лоеўшчыны фальклорных матэрыялаў, а таксама журналісцкіх артыкулаў пра наш край увайшла ў кнігу, якую ты, паважаны чытач, трымаеш у руках, і якая, упэўнены, стане памятным падарункам. Прызнацца, натхнёны падрыхтоўкай гэтага выдання і я паспрабаваў свой паэтычны талент:

Ты ўслаўлены доблесцю нашых герояў,
Што мужна ступалі ў вогненны Днепр,
Мой светлы пасёлак, мой бэзавы Лоеў,
Ты не пасароміш ні сцяг наш, ні герб!

Сяргей Аляксандравіч МЯТЛІЦКІ,
старшыня Лоеўскага раённага
выканаўчага камітэта

РАССКАЖУ Я СЕКРЕТ

Расскажу я секрет,
Где всех ярче рассвет
И где выше днепровские кручи,
Облака голубей,
Солнце ярче, теплей,
Где расходятся темные тучи,
Где весной соловьи
Пеньем сводят с ума
И чаруют и сердце, и душу.
Тот секрет для себя я открыла сама,
Расскажу и тебе, ты послушай.
Там, где берег крутой
У седого Днепра,
Сож впадает в крутые объятья,
Дальше льется река,
Вдоль реки берега
Разделяют владения братьев,
Двух народов-славян,
Живших дружной семьей,
Где сближают днепровские воды,
А прибрежный бурьян
И таможенный стан
Крепче делают дружбу народов.
Где врагам не пройти,
Будет им по пути
Славы воинской прошлой преграда,
Кто с открытой душой
В место это пришел,
Будут здесь ему искренне рады.
Где закатным лучом
Золотится волна,
В пойме аист парит над разливом,
На плывущий паром,
Словно с чайки перо,
Пена с волн залетает игриво.
Лоев славный встает,
И славянский народ
В нем живет тихо, мирно, счастливо.
Может, это секрет,
А быть может, и нет...
Значим Лоев из древних времен,
Ему будет 500 или тысячу лет,
Но он молод, красив и силен.

Лидия ДОЛБИКОВА

АД АЎТАРА-ЎКЛАДАЛЬНІКА

Лоеўшчына... Жывапісны куток Прыдняпроўя, край, дзе шырока і вольна нясе свае воды Дняпро як сімвал нашага спаконвечнага славянскага адзінства, край, які кожнай вясною расцвітае блакітна-фіялетавымі гронкамі бэзу, адзін з тых раёнаў Гомельшчыны, што вылучаюцца багаццем і добрай захаванасцю народна-паэтычных скарбаў.

Працавітыя, сціплыя, спагадлівыя жыхары гэтага багатага на таленты краю ўвасобілі сваю спрадвечную мудрасць, жыццёвы вопыт у цікавых абрадах і звычаях, легендах і паданнях, замовах і казках, ва ўсім тым, што завецца духоўнамастацкай спадчынай. З яе шматстайнасцю, вобразнасцю, адметным мясцовым каларытам пазнаёмяць Вас, паважаныя чытачы, матэрыялы, сабраныя ў гэтай кнізе, у якую ўвайшлі як індывідуальныя, так і экспедыцыйныя запісы фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных звестак, у якіх ашчадна захаваны марфалагічныя, фанетычныя і сінтаксічныя асаблівасці мясцовага дыялекту. Кожная сустрэча з інфарматарамі, ад якіх вяліся запісы, стала і для выкладчыкаў, і для студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны сапраўдным адкрыццём багацця ўнутранага свету жыхароў Лоеўшчыны, яскравым пацвярджэннем невычарпальнасці духоўнай крыніцы беларусаў.

Фальклорна-этнаграфічная спадчына Лоеўшчыны – яскравае сведчанне непаўторнага лакальнага багацця традыцыйнай культуры гэтага краю, не толькі бэзавага, але і сапраўднага песеннага раю, да якогда душой і сэрцам мелі магчымасць далучыцца выкладчыкі, аспіранты і студэнты летам 2005 года ў час палявой экспедыцыі. Захаплялі не толькі шчырасць і гасціннасць людзей, з якімі сустракаліся, іх песенная спадчына, якой яны з намі шчодра дзяліліся, але і тая дзівосная прырода, што агарнула нас водарам буйна квітнеючага бэзу. Мы назіралі, як мясцовыя жыхары паступова саграваліся нейкім асаблівым унутраным цяплом шчымлівых успамінаў. І мы побач з імі, слухаючы іх, адчувалі непарыўную сувязь з гістарычным мінулым, сувязь і сумную, і радасную. Сумную, бо зразумела, што многае, верагодна, страчана. Радасную, бо мы па меры сваіх сіл будзем імкнуцца захоўваць гэтае багацце, не дадзім яму знікнуць, кануць у Лету. Вядома, што фальклор – гэта творчасць агульначалавечага і філасофскага гучання, а фальклор Лоеўшчыны як арганічная частка вуснай народнай творчасці Гомельшчыны вылучаецца рэгіянальна-лакальнымі асаблівасцямі, адметнымі абрадамі і звычаямі, творамі, у якіх увасобіліся ідэі і думкі, што спрадвеку хвалявалі людзей і ў якіх знайшлі адлюстраванне эстэтычныя, філасофска-этычныя ўяўленні, напоўненыя глыбокім роздумам аб месцы і ролі чалавека ў сусвеце, жыццёвай мудрасцю і духоўным святлом, стваральнай творчай сілай народнага духу і шчырым імкненнем захаваць свой непараўнаны моватворчы вопыт.

У гэтай кнізе, дзе кожны запіс фальклорных твораў – каштоўны дакумент па гісторыі народнай культуры, расказваецца аб надзвычай багатай фальклорнай спадчыне, прадстаўленай у разнастайных жанравых формах на Лоеўшчыне, яе літаратурных талентах, адметным моўным каларыце жыхароў. Асобныя артыкулы для кнігі падрыхтаваны намеснікам старшыні райвыканкама Л. Д. Долбікавай, галоўным спецыялістам абласнога цэнтра народнай творчасці Л. Г. Мельнікавай, выкладчыкамі філалагічнага факультэта У. А. Бобрыкам, к. ф. н., дацэнтам, А. А. Станкевіч, д. ф. н., прафесарам, У. І. Ковалем, д. ф. н., прафесарам, Л. П. Кузьмічом, к. ф. н., Н. А. Багамольнікавай, к. ф. н., дацэнтам, В. С. Генаш, ст. выкладчыкам, А. І. Халяўка, к. ф. н., дацэнтам, загадчыцай вучэбна-навуковай лабараторыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта Т. А. Марозавай, к. ф. н., дацэнтам, А. М. Воінавай, к.ф. н., дацэнтам. Руплівымі, дбайнымі гаспадарамі сваёй зямлі паўстаюць лаяўчане ў артыкулах журналісткі абласной газеты «Гомельская праўда» Т. В. Кручэнка.

У экспедыцыях на тэрыторыі Лоеўскага раёна працавалі студэнты-філолагі. Выказваем шчырую падзяку В. Аверчанка, Ю. Агеевай, А. Анікеенка, А. Бадзюк, А. Баевай, А. Бакланавай, Ю. Балакішыевай, Т. Бандарчук, К. Барадзіной, А. Баханцовай, Л. Бек, В. Берасневай, І. Буднік, І. Бялько, В. Бяляевай, А. Ваўчок, А. Волкавай, А. Ганчаровай, Ю. Гаўрук, В. Герасіменка, В. Грыгор'евай, Г. Грышчанка, Н. Дарашковай, Л. Дашук, Т. Дзмітрыевай, М. Драбышэўскай, Т. Елавой, К. Жогла, Н. Жук, А. Жукоўскай, В. Зайцавай, А. Захаравай, Н. Змушка, В. Зыбко, В. Іванцовай, В. Кабаевай, А. Казловай, А. Калеснікавай, І. Каляснёвай, А. Кандратовіч, М. Касюцінай, А. Кацярыніч, Т. Кашперка, Т. Кірыенка, С. Кір'яковай, Т. Клімашэўскай, К. Кралевіч, В. Кулагінай, А. Лазарэвіч, А. Лапіцкай, А. Ларчанка, К. Лемяшковай, К. Ліпавай, А. Літвінавай, Г. Логвінай, Д. Маісеевай, С. Маісеевай, С. Макеевай, А. Максіменка, А. Максімчык, С. Малашанка, В. Маркавай, Ю. Матонінай, Н. Мельнічэнка, А. Мішаковай, М. Мякіш, С. Мяньковай, Т. Навумчык, Н. Нікіценка, Г. Носка, В. Парахневіч, А. Прыходзька, К. Прыходзька, Н. Пятровай, С. Рабой, Г. Рабянок, І. Савінскай, Г. Саідавай, В. Сальнікавай, Ю. Старавойтавай, Г. Сямко, А. Тарашковай, А. Таргоні, Д. Тацоха, В. Трафіменка, Н. Удодавай, В. Унукоўскай, В. Фёдаравай, І. Халязнікавай, К. Харужэнка, А. Хархасавай, Н. Целяпнёвай, І. Ціваненка, Н. Цітарэнка, Я. Цугаевай, С. Цукаравай, І. Цярэнцьевай, І. Чайковай, М. Чамезе, Л. Чарновай, В. Шаўлоўскай, В. Швед, Г. Шукаловіч, Н. Шэўчык, А. Юдзянковай, Т. Юрасік.

Словы шчырай падзякі хочацца выказаць і самім носьбітам паэтычных скарбаў – сціплым і духоўна багатым жыхарам г. п. Лоеў і Лоеўскага раёна, сустрэчы з якімі пакінулі незабыўныя цёплыя ўспаміны і натхнілі на падрыхтоўку гэтай арыгінальнай кнігі, што ўвабрала ў сябе творчую спадчыну адной з найпрыгажэйшых мясцовасцей Гомельшчыны, дзе зачароўваюць водар бэзавых пялёсткаў і гнуткія вербы над Дняпром.

Валянціна НОВАК

Святлана ВЯРГЕЕНКА

ЗАМОВЫ ЛОЕЎШЧЫНЫ Ў СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ

Сучасная фальклярыстыка, якая імкнецца разабрацца ў надзённых з'явах, часта звяртаецца да вытокаў народнай творчасці. Ідучы ў мінулае па прыступках стагоддзяў, што адышлі ў нябыт, цікаўны і сур'ёзны даследчык фальклору звернецца найперш да аднаго з найбольш архаічных жанраў – замоў, асноўная функцыя якіх заключаецца ў магічным уздзеянні на пэўныя з'явы. Замоўныя формулы сакралізаваны: у іх заключана чароўная, магічная сіла слова. Эфектыўнасць уздзеяння замовы залежала ад дакладнасці прамаўлення тэксту і выканання пэўных дзеянняў. Таму нават нязначнае адхіленне ад цвёрда і назаўжды ўстаноўленай формы лічылася дэструктыўнай для ўсёй магічнай дзейнасці. Гэтым тлумачыцца той факт, што замова дайшла да нас у нязменным выглядзе, не абцяжараная напластаваннямі, і ў мастацка-вобразнай форме. У ёй яна ўвасобіла архаічныя ўяўленні продкаў на акаляючы свет і данесла да нас водгаласы пройдзеных этапаў развіцця чалавецтва, захавала не толькі светапоглядныя і рэлігійныя ўяўленні, але і эстэтычныя густы старажытнага творцы.

Замова – гэта заклінальны выраз, якому прыпісвалася звышнатуральная магічная сіла. Са старажытных часоў замова была ці не самым папулярным жанрам, бо іншых сродкаў уздзейнічаць у пажаданым накірунку на небяспечныя з'явы прыроды чалавек не ведаў. І тут можна было спадзявацца толькі на сваю фізічную сілу, а яшчэ болей – на магію слова, адпаведнага сакральнага дзеяння і абарону прадмета-апатрапея.

У адрозненне ад іншых фальклорных жанраў (песні, казкі, загадкі, прыказкі) замова лічылася носьбітам магіі слова, бо наш старажытны продак верыў, што ім можна або выклікаць, або знішчыць якую-небудзь з'яву. Таму замоўнае слова паступова вызвалялася ад усяго імгненнага, зменлівага, няўстойлівага, шукала, адбірала і пакідала бясспрэчныя мастацкія формулы.

Перш за ўсё ў замове нашу ўвагу прыцягвае тое, што замоўныя сюжэты, іх асноўныя персанажы і прадметы-артэфакты маюць строга акрэслены характар і значэнне. Варыянты замоўных формул адрозніваюцца не толькі ўмоўнымі месцамі дзеяння, якія не маюць характарыстычнай адзнакі «тут» і «цяпер», але і рознымі бытавымі рэаліямі. Не ўяўляецца магчымым, зыходзячы з тэкстаў, спрагназаваць тое канкрэтнае месца, дзе адбываецца дзеянне, калі многія з іх пачынаюцца «Ішлі тры калекі чераз тры рэкі...» («Як кроў замаўляць»), «Ішоў лях цераз шлях...» («Каб астанавіць кроў»), «Ехаў Гасподзь на лошадзі-шляці

через калінавы мост...» («Ад звіху»), «Чэраз поле шырокае, чэраз мора глубокае, тудою ішла Маць Божая...» («Перад Пасхаю (на Пасху)»).

Што датычыць акрэсленасці часу дзеяння, то яго таксама нельга вызначыць дакладна: «Іду я ў сераду, ідзе Ісус сзадзі і спередзі...» («Малітва»). Такія ж умоўныя і персанажы замоў, якія ў значнай ступені з'яўляюцца абагульненымі вобразамі, да якіх замаўляючы звяртаецца з просьбай: зара-зараніца, тры дзявіцы, тры Марыі, якія «нічога не робяць, урокі гаварылі» («Каб не сцацца»), «Ранняя зорачка, стань на помашч» («Ад скулы»).

Паводле зробленых намі статыстычных падлікаў, у рамках замоўнага універсума Гомельшчыны (у сучасных запісах) пераважаюць лекавыя замовы. Гэта найбольш старажытная група замоўных формул. Перш за ўсё чалавек клапаціўся (ды і цяпер клапоціцца) пра сваё здароўе, чым тлумачыцца больш шырокае бытаванне і сёння гэтай групы. У параўнанні з іншымі раёнамі Гомельшчыны, у Лоеўскім раёне такіх тэкстаў запісана 2,15 %. Са старадаўніх часоў чалавека таксама хвалявалі пытанні грамадскага і асабістага жыцця, стварэння і захавання добрых умоў жыцця. Таму невыпадкова важнае месца займалі і замовы, аб'яднаныя намі ў сямейна-бытавую і сацыяльную групу (у Лоеўскім раёне запісана 2,94 % замоў дадзенай групы).

Хаця слова ў замове выконвае перфаматыўную функцыю, г. зн. з'яўляецца не проста словам, а словам-дзеяннем, калі слова і ёсць дзеянне, тым не менш у замоўна-заклінальным акце вялікую ролю адыгрывае і дзеянне. Прызначэнне ўсяго, што здзяйснялася, бясспрэчна, заключалася ў тым, каб забяспечыць адэкватнасць акцыянальнай часткі вербальнаму суправаджэнню. Таму прамаўленне замовы абстаўлялася як пэўны рытуал, прычым важным было, хто і якім чынам замову шаптаў, улічваліся тыя абставіны, у якіх гэтае дзейства адбывалася. Пры шаптанні замовы здзяйсняліся дзеянні, якія мелі апатрапеічны, ахоўны сэнс: хрысціліся, сплёўвалі, дзьмухалі, здуваючы нячыстую сілу, звярталіся да прадметаў, якія ўпаміналіся ў тэксце і г. д.: «...Бяруць дзіцёнка, нясуць да парасёнка, бяруць пальцам макаюць у карыта і мажуць у роціку. А затым гавораць...» (Запісана ад Прышчэпавай Галіны Ціханаўны, 1934 г. н., «Ад плясняўкі»); «Берется платок, с которым выходят на улицу, произносят слова... и потом, придя домой, утираются тем платком, говоря...» (Запісана ад Максіменка Аніссі Цімафееўны, 1911 г. н., «Навести красоту»); «Завязаць вузлом нітку, пакласці цераз парог, сказаць і ісці» (Запісана ад Максіменка Аніссі Цімафееўны, 1911 г. н., «Каб дзела сышлося»); «Кагда гаварыш, нада крэсціцца самому і дарогу» (Запісана ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н., Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н.).

Лячэбныя або медыцынскія замовы сапраўды часта аказвалі пазітыўнае ўздзеянне на хворага, і гэта можна растлумачыць сукупнасцю некалькіх фактараў: апрача энергетыкі слова прамаўленне замоў ад хвароб часта суправаджалася элементамі гіпнозу, масажам, хвораму давалі піць «нагавораную» ваду (часта настоеную на лекавых травах), раілі яму прытрымлівацца тых ці іншых правіл, забаранялі нейкія непажаданыя ўчынкі і дзеянні. Таму, зразумела, гаварыць аб лекавых замовах як аб забабонах, перажытках няправільна, бо яшчэ стагоддзе таму пра сугестыўную функцыю замовы гаварыў А. Ветухаў: «Тая сіла, якая ў замовах мае першасную ролю – унушэнне і самаўнушэнне, разрастаецца зараз у навуцы ў цэлую тэорыю гіпнатызму з ягонымі разнавіднасцямі. Нават славуты «зглаз» («отвод глаз») атрымлівае цяпер сур'ёзныя асновы (пацверджанні) у дадзеных, якія здабываюцца эксперыментальнай псіхалогіяй і назіраннямі над нервовымі хворымі» [1, с. 3].

Па сваёй накіраванасці замовы могуць быць «пазітыўнымі» (белымі), якімі, верылі, можна было вылечыць чалавека, забяспечыць яму поспех, і «негатыўнымі» (чорнымі), пры дапамозе якіх імкнуліся наслаць на іншага хваробу, «зглаз», бяду.

У лоеўскай калекцыі замоў, як і ў большасці іншых, безумоўна, пераважаюць пазітыўныя творы. Але сустрэліся і такія, калі хваробу нагаворваюць на чалавека. Так, Максіменка Аніcся Цімафееўна падзялілася сваімі ведамі як «Ікоту напускаць».

Замова па сваёй прыродзе арыентавана на камунікатыўную сітуацыю. Л. Радзенковіч слушна заўважае ў гэтай сувязі: «Замовы функцыянуюць у асаблівай сітуацыі, якая адрозніваецца ад іншых камунікатыўных сітуацый. Яна прадугледжвае наяўнасць двух рэальных удзельнікаў (знахаркі або знахара і хворага) і аднаго «фіктыўнага» ўдзельніка – нячыстай сілы» [2, с. 76–77]. Антытэтычнасць, характэрная для светаразумення старажытнага чалавека, праяўляецца і тады, калі ў замове непасрэдна ўзнаўляецца, дзейнічае толькі адна з дзвюх антаганістычных сіл: або сілы дабра, боскія вобразы, або часцей – сілы зла, якія супрацьстаяць адна адной і выступаюць супраць чалавека. Але ў аналагічнай сітуацыі адна супрацьлегласць падразумявае другую. У самой жа замове найчасцей прысутнічаюць дзве групы вобразаў – прадстаўнік добрых і злых сіл, напрыклад: «Святы Юрай, Святы Мікола, Матка Хрыстосава, паня выцмяна, хадзі да мяне, дам табе сівога каня. Едзь на сіне мора. На сінім моры паны ў карты гуляюць, сталы засцілаюць, кубкі віна наліваюць, п'юць, гуляюць, пярэпалах у госці зазываюць. Ты ж, Пярэпаласе, па жывату не хадзі, у бачкі не ўпірайся...» (Запісана ад Прышчэп Марыі Ульянаўны, 1927 г. н., «Ад пужання, ляку»). Для замоў як для жанра вуснай народнай творчасці характэрна ўстойлівае кола вобразаў. Перш за ўсё звяртаюць на сябе ўвагу архетыпы (жывая і мёртвая вада і г. д.), сярод іншых класічна акрэсленых замоўных вобразаў пераважаюць хрысціянізаваныя персанажы (Госпад Бог, Божая Маці, Прачыстая, Ісус Хрыстос, Сіянская гара і інш.); вобразы, звязаныя з язычніцкімі прыроднымі культамі (сонца, месяц, зара-зараніца, зоркі і інш.); вобразы, якія сведчаць аб былых татэмічных уяўленнях людзей (міфічныя птушкі, жывёлы); вобразы народных вераванняў і дэманалогіі (дамавы, хлеўнік, лесавік, пакойнік і інш.); персанажы, якія суадносяцца з чалавекам (баба, дзеўка, дзявіца); вобразы-персаніфікацыі хваробы і стану чалавека (звіх, удар, прыстрэк, ліхаманка і інш.); вобразы злых дэманалагічных істот, якія твораць зло чалавеку (чорт, сатана і інш.).

Кожны вобраз у замове ўжываецца са строга адпаведнай і вызначальнай для яго магічнай мэтай. Зыходзячы з гэтага, усе вобразы можна падзяліць на два асноўныя тыпы: персанажы, якія дапамагаюць пазбавіцца ад зла, бяды, хваробы, і вобразы, сутнасць якіх заключаецца ў тым, каб іх наклікаць зло.

Апрача свайго прыкладнога, сугестыўнага прызначэння, замовы маюць і вялікую мастацкую каштоўнасць. Хаця «аблічча» замовы ў сваёй структурнай арганізацыі здаецца імперсанальным, г.зн. мала індывідуалізаваным, і прыведзена, так бы мовіць, да нямногіх варыяцый агульнага тыпу, тым не менш гэты агульны тып валодае высокай мастацкай ёмістасцю. У гэтай сувязі варта нагадаць слушную думку У. Анікіна: «Валявое слова ў замове – не проста выяўленне імператыву. Хоць замова і агорнута ў словы без намеру прадставіць мастацкі вымысел, але воля і пачуцці чалавека самі набываюць мастацкае ўвасабленне. Узнікае мастацтва высокае, тонкае, пранікнёнае. Замова – адзінства магіі і паэзіі» [3, с. 7].

Прыглядаючыся да замовы, заўважаем, што яна падпарадкоўваецца нейкім сваім кампазіцыйным правілам, і правілы гэтыя распрацаваны надзвычай дасканала, нават вытанчана. Яна ўражвае сваёй здзіўляючай зладжанасцю, знітаванасцю ўсіх структурных і стылістычных элементаў. Значная частка замоў вызначаецца аднатыпнай архітэктонікай: замовы, у якіх ёсць такія структурна-кампазіцыйныя часткі, як уступ-малітва («Ва імя Атца і Сына і Святога Духа»), а часта прамаўленне замовы пачынаецца чытаннем малітвы «Отча наш», зачын, у якім апісваецца месца дзеяння, або яго пачатак («На сінім моры, на беражочку, на жоўтым пясочку стаіць дуб...», «Стану я...», «Выйду я...»), асноўная частка, дзе выкладаецца сутнасць просьбы-зварота да звышнатуральных сіл, закрэпка, што выражае сілу слоў замовы («Я – з словам, Бог – з помаччу»), зааміньванне («Амінь»). Заўважым, што такая тонкая механіка не ўзнікае раптоўна. За ёю лёгка ўгадваецца старанны карпатлівы адбор і шліфоўка, падгонка кожнага звяна гэтага стройнага кампазіцыйнага ланцужка. Аднак усе гэтыя часткі ў адной замове сустракаюцца рэдка. Твораў няпоўнай, усечанай пабудовы ў актыўнай бытавой практыцы і пасіўнай памяці носьбітаў пераважная большасць. Заўважым, што ў кожным тэксце можна вызначыць апавядальную сюжэтную структуру, асноўнымі кампанентамі арганізацыі якой з'яўляюцца дзеянні, персанаж (суб'ект дзеяння), месца дзеяння. Гэтая «класічная» арганізацыя тэксту можа нават здавацца занадта стайнай, але гэта толькі на першы, ды і то павярхоўны погляд.

Крыху больш энергіі ў сінтаксічным паралелізме, а гэта лёгка вырашаецца пры дапамозе эліпсіса: «Стаіць куст на прытыцы, а ў тым кусце – гняздо, у гняздзе – тры змяі: адна – Шкурапіна, другая – Умляліна, трэцяя – Сем'яніна...» (Запісана ад Бойдак Елізаветы Іванаўны, 1926 г. н.), асіндэтона: «Выгаварваю скулу калючую, балючую, умоўную, прыгаворную, авечую, чалавечую» (Запісана ад Зязюлі Наталлі Пятроўны, 1949 г. н.) і ўжывання імператыўнай формы дзеясловаў – і перад намі строгая, рашучая формула замовы-загаду: «Закрыйцеся, жылы крывавыя, стань, не цячы, кроў чырвоная» (Запісана ад Шэўчык Ніны Рыгораўны, 1957 г. н.). Больш мяккасці, мілагучнасці, якой лёгка дасягнуць пры дапамозе полісіндэтона, або далучэння паўтораў прыназоўнікаў: «Как Господь Бог небо и землю, и воду, и звезду, и сыро-матерной земли твёрдо утвердил и крепко укрепил...» (Запісана ад Максіменка Аніссі Цімафееўны, 1911 г. н.) – і перад намі ўжо плаўная, праніклівая ў сваім лірызме, нават пяшчотнасці замова-апавяданне: «На море, на лукоморье лежит белый камень, белый, огромный. На том камне стоят три царевны, три королевны. Они не умеют ни шить, ни белить, только умеют рабе божей удар говорить...» (Запісана ад Максіменка Аніссі Цімафееўны, 1911 г. н.).

Варта нагадаць, што, калі родавай дыферэнцыяцыі яшчэ не існавала, замова ўзнікла і не ў празаічнай, і не ў вершаванай форме. Але элементы верша яскрава назіраюцца – гэта пэўны рытм, які стварае сінтаксічны паралелізм: «чтобы я от них был цэл и невредим, по пути и дороге, в дому и лесу, в чужих и родных, свадьбе и на обеде» (Запісана ад Максіменка Аніссі Цімафееўны, 1911 г. н.) і рыфма: «Богу памалюся – Прэчыстай Маці пакланюся», «ураджонаму – хрышчонаму», «не стаяць – не падпіраць – не падлягаць». А ў аснове застаецца ўсё той жа строга прапарцыянальны ў сваёй мастацкай выверанасці «класічны твар замовы». Зыходзячы з гэтых назіранняў, мы з упэўненасцю можам канстатаваць, што замова арганізавала сваю архітэктоніку, свой стыль, сваю мастацкую структуру, сваю мову і вобразнасць.

Як бачым, у замове як вербальна-акцыянальна-рэальным комплексе нішто не асемантычна: кожны жэст, слова, прадмет-артэфакт характарызуецца сэнсава-сімвалічнай напоўненасцю, важкасцю (паўнацэннасцю), а па багаццю і адметнасці лексікі, якая захавалася з даўніх часоў, па маляўнічасці і дакладнасці эпітэтаў, па гукавой тканцы мовы гэтыя творы з'яўляюцца сапраўднымі мастацкімі шэдэўрамі. І нішто не выпадковае ў гэтых шэдэўрах, усе сродкі накіраваны на ўзмацненне сакральнай сілы слова.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Ветухов А.* Заговоры, заклинания, обереги и другие виды народного врачевания, основанные на вере в силу слова. (Из истории мысли). – Вып. I–II. – Варшава: Типография варшавского учебнаго округа, 1907.

2. *Раденкович Л.* Структура южно-славянского заговора // Этнолингвистика текста. Семантика малых форм фольклора. Тезисы и предварительные материалы к симпозиуму. – М., 1988. – Т. 1.

3. *Аникин В. П.* Магия и поэзия // Русские заговоры и заклинания: Материалы фольклорных экспедиций 1953–1993 гг. / Под ред. В. П. Аникина. – М., 1998.

ЗАМОВЫ

Ад скулы

Первым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Ранняя зорачка, стань на помашч. Выгаварваю скулу калючую, балючую, умоўную, прыгаворную, авечую, чалавечую. Вам жа, скулачкі, не хадзіць, сэрца (імя) не таміць. Вызываю я вас на ніцыя лозы, там столікі засціланыя, там п'юць і гуляюць, і вас ажыдаюць. Госпадзі, любіш меня, любі мой дух. Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь.

Гэта замова нагаварваецца на ваду. Пасля таго, як памачылі ёю скулу (а таксама суставы на руках, нагах), яе выліваюць у вушняк (вугал, дзе адкрываюцца дзверы).

Ад уроку

Первым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Ранняя зорачка, стань на помашч. Ты, вадзіца-царыца, цякла ты з-пад ніцых лоз, вымывала каменне, краменне і жоўтыя пяскі. Адмый ты ў нашай (імя) урокі (або ў гэтай скацінкі, чарналысай шарсцінкі) прыгаворы: падумныя, пагадныя, мужчынскія і бабскія, дзявочыя, хлапочыя, дзянныя, полудзянныя, вячэрнія і раннія. Госпадзі, любіш меня, любі і мой дух. Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь.

Замова нагаварваецца на ваду, потым вадой памачыць рукі, ногі, шыю.

Ад іспугу

Первым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся і ўсім святым апосталам. Хто цябе радзіў, той цябе адхадзіў. Маць цябе радзіла, маць цябе адхадзіла. Не маць, дык пупарэзная баба. Госпадзі, я веру табе, памажы, Госпадзі. Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амінь.

Ад болю, вопухалі

Первым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся. Голуб, галубочак, ляці на дубочак, сядзь на пянёчак, боль разгані, вопухаль развядзі. Гасподзь Бог – з помашчу, я – з малітвай. Ва імя Атца і Сына і Святога Духа.

3 разы падуць на балячку і 3 разы плюнуць на сучок.

Малітва ў дарогу

ел насустрач, Гасподзь на пуці, Свяціцель Мікола, дарогу асвяці, Божая дзі ўперадзі. Все дарогі в пуці аградзі.

Малітва ў дарогу, лес

е густой, гаспадар часной, разрашы па тваім владзеньям пахадзіць, нідзе ніц тваіх не пераступіць. Упасі, Гасподзь, ад звера бягушчага, ад змея паўзушчага, ад злога чалавека на хаду. Госпадзі, памілуй і сахрані меня. Амінь. Амінь. Амінь.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюлі Наталлі Пятроўны, 1949 г.н., 1993 г.

Малітва-абярэг

Сахрані мяне, Госпадзі, рабу божую (імя) сілаю чэснага тваего крэста. Сахраняй мяне, Госпадзі, ад сільнага ўрага. Я етую буду малітву ўмаляць, не буду наглаю смерцю памірaць, у агне пагараць і ў вадзе патапаць. Сахраняй мяне, Госпадзі, рабу божую (імя) на святом месце, на залатом крэсле. Зашчыці мяне, Госпадзі, сваею сцяною нерушымаю, Госпадзі. Амінь.

Замова перад Пасхаю (на Пасху)

Чэраз поле шырокае, чэраз мора глыбокае, тудою ішла Маць Божая дай сустрэла трох ангелаў: «Вы, ангелы-архангелы, ці не чулі, ці не бачылі майго ж сына, вашага Бога?» Адзін гаворыць: «Мы не чулі». Второй гаворыць: «Мы не бачылі». Трэці гаворыць: «Стой-ма, братцы. Не тоймася, скажы ім праўду, не боймася. Твайго сына ж жыды ўзялі, на цярновы крэст разап'ялі, гваздзёмкап'ём прыбівалі, Хрыстовую кроў пралівалі. З Хрыстовай крыві рака стала, з Хрыстовага цела гара стала. На той гарэ царква стала, а ў той цэрквы тры прыстолы. Першы прыстол – Маць Божая, второй прыстол – Пятро, Павел, трэці прыстол – Гасподзь сядзіць. Гасподзь сядзіць, праўды глядзіць і гукае Пятра і Паўла: «Хадзіце сюда, бярыце ключы ад золата, адкрывайце раі, пеклы, выпускайце душы грэшны. Адной душы не выпускайце, і тая душа ўсім грашна. У пятніцу рана ела, а ў суботу рана пела, а на Пасху службу спала, большага брата абругала». Амінь.

Чытаюцца ўсе замовы і малітвы па тры разы.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Сідарэнка Г. Дз., 1930 г.н., 2000 г.

Прыгавор для зубоў

Калі ў дзіцяці выразаюцца зубы, дзісны прыпухлыя, тады жованым часнаком пажымаюць дзісны, гаворяць такія словы:

– Зубы-зубішчы, ідзіце на лясішчы! Родная мамачка радзіла, а бацюшка мірам міраваў, зубішчы (імя дзіцяці) зганяў. (3 р.)

Запісана ў в. Барэц Лоеўскага р-на
ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г.н., 1993 г.

Ад зубнога болю

– Маладзік, маладзік, дзе ты ўчора быў?
– На тым свеце.
– А што ты бачыў?
– Гроб.
– А ў гробе што?
– Раба божага цела мёртвае.
– Ці баляць у таго раба божага зубы?
– Не, не баляць.
– Каб жа і ў гэтага раба божага не балелі.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Савянок Марыі Рыгораўны, 1941 г.н., 1999 г.

Замова ад нагавору

Цару нябеснаму, уцешыцелю нябеснаму есі, прыдзі лячыць мяне ад усіх хвораў, спасі, сахрані душу маю. Першым разам, лепшым часам Госпаду памалюся, Маці Божай пакланюся. Маць-Гаспадыня, стань у помачы этай (каму імя) паражонай. Прымаўкі, урокі, прыстрэхі, нагаворы (2 р.) я і выгавараю: із устоў, з вушэй, з буйнай галавы, з румянага ліца, з сладкага носу, з грудзей, з сэрца, з почак, з лёгкіх, з кішак, з жэлудка, із рук, із ног, із пальцаў, з усіх сустаўцаў. А тады гэтыя ўрокі стаялі, як я іх не знала. А цяпер ім не стаяць, а цяпер ім не гуляць, і цела не пушыць, і крыві не сушыць. Я – з словам, Гасподзь – з помашчу.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г.н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Малітва

Иду я у сераду, иде Исус сзади и спереди. Исус Христос, спаси рабу божью (имя) от деда-колдуна и бабки-волшебницы, они будут её здоровье красть. Отними им руки, ноги и поставь глаза на месте.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г.н.
(перапісана з ліста бабулі), 2002 г.

Малітва ад хвароб

Госпадзі, памілуй, Госпадзі, спасі,
Крэст эты цяжолы памагі нясці.
Ты прайшоў з любоўю доўгія пуці,
Крэст ты нёс цяжолы на сваёй грудзі.
Уперадзі – Ісус Хрыстос,
Пазадзі – Прэсвятая Багародзіца, Божая Маць,
Па бакам – святыя Апосталы,
Пасярэдзіне – (імена).
Увядзі мяне ці нас, Госпадзі, у горад Іерусалім
Узяць ключы ад нашай жызні.
Амін.

Гэтую малітву нада чытаць перад іконамі з усімі тымі, хто хоча быць здаровым, чытаць 3 разы і заўсёды красціцца. Трэба, у хаце каб было ціха. Як прачыталі 3 разы, трэба сказаць такія словы:

– Крэст на мне, крэст у мне, крастом аграждаюся і табе, Ісусу Хрысту, пакланяюся.

Усягда нада красціцца, а потым пакланіцца.

Ад жаночых хвароб

Залатнік, залатнічок, залаценечкі ражок, сядзь на сваім месцы, як пан у крэсле.

Як гаворыш замову, трэба вадзіць рукой у жанчыны там, дзе баліць, і шэптам гаварыць словы, вадзіць па часавой стрэлцы і красціцца. Гаварыць замову, калі маладзік.

Ахова ад усякай навалы

Узяць любую пасудзіну, развесці там столькі солі, каб іголка дзяржалася на вадзе. Патом іголку выцягнуць, гэту воду дзяржаць роўна 13 дней, не болей, там, дзе ў аснаўном находзіцца хворы . Патом этую салёную воду выліць на мусарку, пасудзіну разбіць і сказаць пра сябе слава:

– Вада сія салёная, як слёзы маі, уносіць усе нашы печалі і напасці, балезні і няшчасці. Як пасудзіну сію не склеіць, так і не сабраць няшчасці на маю голаву і маіх блізкіх атныне і да веку.

З гэтага врэмені будзе ўсё добра. Толькі нада верыць у добрае, а дурное праганяць з галавы.

Ад сурокаў

На палосцы бумагі, як вы панімаеце, напішыце названіе балезні ці свае непрыятнасці. Кожны дзень атрывайце па адной букве і паліце яе. Добра будзе, калі вы сканцэнтруеце сваё вніманіе на букве і скажыце так:

– Ад праклянцця, порчы, зглаза дух святы ізбавіт зразу (перакрасціцца). Амін.

Пры просьбе

Калі заходзіш, дзе багата людзей, да начальства, трэба штосьці папрасіць:

– Хата ваша, крыша мая, хлеб з поля, мая над вамі воля (у мыслях перакрасціцца).

Да іконы Міколы Чудатворца падайці і сказаць:

– Ад Бога – спасіба, ад злога духа – аддай, Божа, яму. Амін.

Перакрасціцца, павесіць на любую ікону палаценца.

Ад храпення

Перад сном на ваду ці малако чытаюць «Отче наш», патом 3 раза загавор:

– Рыба ў вадзе не маецца, зубамі не кусаецца, чэлюсцю не скрыпіт, начамі ды днямі не храпіць. Як рыба маўчыць, так раб (імя) маўчыць. Ва імя Отца і Сына і Святага Духа. Амін.

Нагавораную воду ці малако незаметна даюць выпіць таму, хто храпіць.

Ад крывацёку

З-пад дуба караністага цякла Юрдань-рака, там ішоў Ісус Хрыстос і святы Ілля. Вадзяныя ключы закрываліся, Юрдань-рэчка станавілася. Закрыйцеся, жылы крававыя, стань, не цячы, кроў чырвоная.

Гаварыць адзін на адзін з бальным чалавекам, пры этым ён тожа доўжан красціцца. Усю замову сказаць да заходу сонца. Чалавек павінен прыйсці 3 раза да мяне.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на ад Шэўчык Ніны Рыгораўны, 1957 г. н., 2002 г.

Ад ведзьмаў

На гарэ Янскай, на гарэ Сіянскай там Мацер Божая стаяла, свой сон чытала. Хто эты сон будзе чытаць, ён не будзе ў вадзе патапаць, не будзе ў агне пагараць, яго не будзе гром пабіваць, ён не будзе наглай смерцю паміраць, яго не будзе гад пасасаць. Ва імя Айца і Сына і Святога Духа. Амінь.

Эта нада тры раза чытаць. Эта і ад ведзьмаў, і ад грому, і ад гразы, і ад усяго-усяго.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н. (нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

На любы час

Святыя ўгоднікі, святыя прыпадобнікі, кіеўскія, пячэрскія, чарнігаўскія, іерусалімскія. Прышлі, Госпадзі, к нам на дапамогу Мацер Божую, царыцу нябесную, і прышлі да нас, Госпадзі, спасіцеля і збавіцеля на дапамогу, і прышлі, Госпадзі, святога Панцелеміна, і прышлі да нас, Госпадзі, святога Міхаіла-архангела. Святы Міхаіл-архангел, памажы святым крылом, і прышлі нам, Госпадзі, святога Іллю-прарока. Памажы нам святым воздухам, і прышлі нам, Госпадзі, святога Аноха. Святы Анох, падай нам свае рукі, і прышлі нам, Госпадзі, святога Ніколу Чудатворца. Ты, Нікола Чудатворац, святы запаведнік, ты – вялікі заступнік, заступі, Госпадзі, закрый, Госпадзі, рызамі мутнымі і крылом жыватварашчым ад злога чалавека, ад напрасніка, ад цяжолай пасцелі, ад наглай смерці. Спасі, Госпадзі, нас!

Ад залатніка

Першым разам, божым часам памалюся Госпаду Богу, Прычыстай Святой Мацеры Божай. Зара-зараніца, божая памошчніца цару майму, цару-залатару, стань на сваё места, на залатое крэсла. Там залатніку не бываць, касцей не трывожыць, крыві не разжыжаць. Бог – у дапамогу, я – з духам.

Ад хваробы зубоў

Святы Кірыл, малі Бога за мяне, загавары маладніком зубы мне. Бог – з помашчу, я – з духам. Амінь.

Ад рожы

Первым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Маці пакланюся. Прычыстая Маць, ідзі памагаці сонцу яснаму, месяцу краснаму, яснымі зорамі, божымі дзеламі не я ўкрашаю, а сам Іісус Хрыстос, Хрыстова Мамка, божыя памочнікі. Стань, Бог, на помашч, ангелы – на радасць, і з трох-дзевяці жыл, і з трох-дзевяці суставаў, і з жоўтай касці, і з краснай крыві, і з румянага цела бярыце, нясіце на шчырыя бары, на сухія лясы, на жоўтыя пяскі, на цёмныя лозы, на бягучыя воды – там яму век-вяком прабываць, на бальным (...) прыстрашнага, прысмешнага, падзіванага не бываць, падуманаму, пагаданаму не бываць, агню і жару не бываць, касці не ламаць, нарыву не бываць, яду не пускаць, опухалі, краснаты не бываць, скулы і рожы не бываць, касцей не ламаць, крыві не размываць. Я – з духам, Бог – з помашчу. Амінь.

Ад укуса змяі

Первым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся, Святой Прычыстай Мацеры пакланюся. Абгаражу раба(у) божага(ую) жалезным тынам ад змея гарбатага, ад змяі чорнай, ад змяі белай, ад змяі рудай, ад змяі рудаватай, штоб раба божага (такога-та) не кусалі змеі. На сінім моры ляжыць камень, пад камнем вада бяжыць і рабу божаму ўсю хваробу зганяе.

Ад прыстрэку

Первым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Мацеры пакланюся. Прашу і ўгаварываю прыстрэк (дзённы і палудзённы, мужчынскі і жаночы) і прымоўку. Ранняю зарою, вячэрняю парою ўпрашываю і ўгаварываю прыстрэк і прымоўку ад касцей, ад быстрых ачэй. Не сама лячу – Госпада Бога прашу. Я – з словамі, Бог – з помашчу. Злюбі, Госпадзі, мой дух.

Каб астанавіць кроў

Ішоў лях цэраз шлях, кіёчкам папіраўся, платочкам уціраўся. Найшоў тры кубкі: адзін вадзяны, адзін медзяны, а трэці крывяны. Вадзяны выпʼю, медзяны выллю, а крывавым кроў замоўлю. Бог – з помашчу, я – з духам. Амінь.

Ад бяльма

Першым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся, Прычыстай Мацеры пакланюся. Беглі два бесы: адзін сівы, другі белы. Сівы бяльмо зганяе, белы слязу зганяе. Бог – з помашчу, я – з духам. Амінь.

Запісана ў п. Кашовае Лоеўскага р-на ад Малеевай Ганны Архіпаўны, 1938 г. н.

Каб не крычалі на цябе

Я іду на суд, наўстрэчу мне гроб нясуць. Уперадзе замок закрыты, на 12 дзвярэй – 12 замкоў, дык закрый ім, Госпадзі, губы і зубы. Амінь, амінь, амінь.

Каб расла добрая капуста

Капуста, не будзь цыбата, а будзь пузата. Не будзь красна, а будзь укусна. Не будзь пуста, а будзь густа.

Ад ліхога чалавека

Пайду, благаслаўлясь, з хаты дзвярамі ў сенцы, з сенцаў – у двор, з двара – у вароты, пад краснае сонейка, пад чыстае поле. У чыстым полі стаіць святая божая цэркаў. Самі царскія дзверы расчыняюцца, сам раб божы (імя) загаваруе ад 9 калдуноў, 9 калдух. Хто на мяне ліха думае, той шчытай у лесе – кусток, у моры – пясок, а на небе – звёзды.

Ад ліхіх вачэй

Умывала дзяцей цераз рэшата, прыгаворваючы пры гэтым:

– Як вада на рэшаце не дзержыцца, так бы не дзяржаліс на рабе божай (імя) ні ўрокі, ні прыкосы, ні прызоры, ні перапалохі.

Запісана ў в. Катловіца Брагінскага р-на ад Максімчык Алены Уладзіміраўны, 1932 г. н. (раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на).

Ад зубнога болю

Месяц да на небе, звяры ў лясу. Када месяц з небу сойдзе, зверы з лесу выйдуць, тада ў раба божага (імя) будуць зубы балець.

Ад болі ў спіне

Я лажу на парог чалавека з бальной спіной і каленамі ціхонька тапчу, прыгаворваю:

– Шла цераз мост, чатыры ногі, пяты хвост, а шостыя людзі. Будзь, (імя), як людзі.

9 раз тапчы і етае гавары.

Ад энурэзу

Первым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Прэчыстай Мацеры пакланюся. Я – з словам, а Гасподзь – з помашчу. Бог паможа (імя), і я памагу. На сінім моры, на жоўтым пяску сядзіць тры Марыі. Яны нічога не рабілі, урокі гаварылі: і жаноцкія, і дзявоцкія, і прырабоцкія, і душа за душой, і нага за нагой, а што думаем-гадаем, нясі ты за сабой. То ж табе возьме і за с.... кусне. Хватайце ўрокі, хватайце, сарокі, нясіце на маха, на балота, на ціхія воды, на ніцыя лозы. Там куры крыклівыя, а сабакі звярлівыя.

Ад зляку

Тры дзявіцы – пад ляк, тры дзявіцы – дзяцінцаў, а тры дзявіцы – прычынцаў. Штоб тут не стаяла, касцей не ламала, цела не пушыла, сэрца не крушыла, у

гарачку не кідала. Сыдзіце, злякі, на крутыя горы, на ніцыя лозы. Там куры крыклівыя, а сабакі звярлівыя.

Ад удару

Удар, удар, штоб ты тут не стаяў, касцей не ламаў, і цела не пушыў, і сэрца не крушыў, і ў гарачку не кідаў. Сыдзіце, удары, на крутыя горы, на ніцыя лозы. Там куры крыклівыя, а сабакі звярлівыя.

Ад грыжы

Я грыжу грызу, грыжу нада грызці. Бяры палена з сукам і гавары:
– Сучышча, сучышча, забяры грызішча (імя).
Тры раза пагрызці, а можа – хоць дзевяць. А той сук тады нада спаліць.

Ад грому

Як гром грыміць, трэба сказаць:
– Свят, свят Гасподні, успомні, неба і зямля. Слава табе, Госпадзі, слава ж табе, я.

Калі нешта табе падкінулі

Еслі, хто етае табе што падкінуў, ета нада несці на рэку, на бягучую воду. А хоць нясі на ростані ў дванаццаць часоў ночы да спалі там на растаньках. Каго ні стрэціш, маўчы, дажа еслі ён скажа табе: «Здароў!» Но то, што яно здзелана, нікагда не гарыць. Тады на рэку, шыбануць на рэку:
– Што ты дзелала мне, штоб была і табе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Трасцян Еўдакіі Іванаўны, 1930 г. н.
(нарадзілася ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ад удару

Вячэрняя зара-зараніца, памажы рабе божай (імя), і я памагу. На гарэ – сасна, на той сасне – ні ткаха, ні праха. Яна шоўкам шые, вышывае, гарачую кроў разганяе, удар і звіх выгаворвае. Я яго выгаварую ні сваімі славамі, а Божымі малітвамі. Бо̀г – з помашчу, а я – з словам. Божая помашч, а мой дух. Жыла на жылу находзіць, сустаў на сустаў; жыла з жылай начынаюць гаварыць. Госпадзі, прылюбі мой дух. Амінь.

Ад зубоў

Маладзік малады, твой рог залаты, на моры купаўся, на возеры паласкаўся, каб сыры зуб суняўся. У майго дзеда зубы не балелі, каб і ў мяне панямелі. Гасподзь – з помашчу, а я – з словам. Божая помашч, а мой дух. Амінь.

Ад сабакі

Сляпы радзіўся, у бані не мыўся, людзей не бачыў і нас не ўбачыш.

Ад ляку

Первым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Святая Маць Прачыстая, стань у помашч. На галевым балоце, на востраве, там ляжаў белы камень, пад тым каменем мохавая сарочка, лазой шытая. Я тую сарочку падымаю, раба божай (імя) ляк выгаварую: конскі, кароўскі, сабачы, авечы, чалавечы, птушыны, каціны, свініны – не сваімі славамі, а Божымі малітвамі. Бог – з помашчу, а я – словам. Божая помашч, а мой дух. Госпадзі, прылюбі мой дух.

Чытаюць замову тры разы. Пасля першага раза пачатак пачынаць так: другім разам, божым часам..., трэцім разам, божым часам....

Ад ліха ў каровы

Маць Прачыстая, саснавала ты ў сваім чрэве Ісуса Хрыста, саснуй маёй кароўцы (мянушка) 70 жыл, 70 суставаў, 70 чашак. Чашка ў чашку, сустаў у сустаў, жыла ў жылу, штоб маёй кароўцы ўсё на места стала. А ты, віхар, вазьмі ў маёй кароўкі ўсё ліха, а ты, кароўка, поільца пі, сенца еш. Амінь.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Цукаравай Феафаніі Іванаўны, 1931 г. н., 1996 г.

Каб дзіця было спакойным

Каб дзіця было спакойным, не крычала, яго клалі ля печы і гаварылі:
– Як печ маўчыць, так і дзіця маўчала.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

Ад рожы

Рожа-рожа, ты не прыгожа, ідзі ты на імхі, на балоты, на гнілыя калоды, на ніцыя лозы, на сцюдзёныя росы, на быстрыя воды. Я цябе славамі ўбіваю.

Ад лішаю

Лішай, лішаю, цябе я рашаю. Цябе я рашаю, як свінням мяшаю.

Ад ячменю (на воку)

Каб ячмень сышоў з вока, трэба яму паказаць тры дулі і сказаць:
– Ячмень, ячмень, на дулю.

Ад каўтуну

Госпаду Богу памалюся, старому каўтуну пакланюся. Старшы каўтун, сунімі сваіх слуг. Выгаворваю я цябе, каўтун рабы божай (імя), із костак, із мазгоў, із крыві, із усіх жыл, із усіх суставаў. Пастаў раба божага (імя) на стан. Выгаворваю я цябе, каўтун, пры ясным сонейку, пры трох зорах, пры вячэрняй, пры начной і пры ранняй. Амінь.

Памірыць мужа з жонкай

Как ішла Ева да Адама, так і ты, раба (імя), ідзі за рабом (імя). Каб век разам жылі, хлеб і ложак дзялілі, друг ад друга не адставалі, друг без друга спакою не зналі. Куды раба (імя), туды і раб (імя). Амінь.

Замова на сцаленне малака ў каровы

Першым разам, добрым часам Госпаду Богу і Мамцы Прачыстай пакланюся і Госпада Бога папрашу з усімі сіламі нябеснымі, кіеўскімі, пячэрскімі. А ўсе вы, прападобныя, станьце ж Госпаду на помач, божай кароўцы чорненькай. У полі стаяла богава сталіца, а ў той сталіцы богава кароўка, а ў тае кароўкі залатыя рожкі, мядзяныя ножкі, сярэбраны язык. Прыйдзі ж, кароўка, к маёй божай кароўцы, паліжы, кароўка, маю карову, ножкі, і рожкі, і вымечка. Як жа вадзіца ў моры прыбаўляецца, каб у маёй божай кароўкі, Божа, малако прыбаўлялася. Як жа ў моры бераг з бераżком не сходзяцца, каб і к маёй божай кароўцы ўрокі не прыходзілі: ні жаноцкія, ні хлапоцкія, ні дзявоцкія, ні схода, ні маладзіка і ні пад поўнае і ветрам ненаноснае. І дай жа ты, Госпадзі, маёй божай каровачцы белага малачка, а жоўтага маслечка, тоўстага сырцу. Не будзь жа ты ўрочна, а будзь жа ты малочна. Як было, так каб і было, каб даў Бог, каб яшчэ болей прыбыло. А хто завідуе дый прыглядаецца, дык соль яму ў вочы і галаўня ў зубы.

Запісана ў в. Новая Баршчоўка (раней Баршчоўка) Лоеўскага р-на ад Лаханька Нінъ Фядосаўны, 1937 г. н., 2001 г.

На ўраджай

Нада ўстаць да васхода сонца, трыжды перахрысціцца, сказаць, глядзя на расаду памідор:

– Нет чысла і шчоту веруюшчаму люду, ударам колакала цэркоўнага, мураўям в лесу. Так штоб не было шчоту прыбылі памідораў на маіх градках. Амінь.

Калі садзяць гарбузы

Трыжды перахрысціцца, стоячы на разоры каля градкі, сказаць:

– Колькі ў бабы на галаве валасоў, каб столькі расло гарбузоў.

Як карова не дае малака

Первым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Уладыка-царыца, божая памашніца, як памагала ты івам, ракітавым кустам свежым маслам, малакам. Як табе етага не браць, так маёй кароўкі малака не піць.

Ад залатніка

Угаварваю залатнік прыстрэшны, прысмешны, завязаны, падкованы, балованы. Залатнік, залатнічок, божы памашнічок, па жывату не хадзіць, сэрца не таміць, у балоты ступай, бакоў не закладай. Там на месцячкі, у залатым крэслячкі, месячка ўсходзіць, на сваё места становіць. Як я гаварыла – жывоцік балеў, перастала гаварыць – перастаў жывоцік балець. Я – са словам, Бог – з помаччу.

Ад рожы

Шла куніца, красная дзявіца. Як табе тут не бываць, (імя) цела не таміць, серца не таміць, крыві не сушыць. Стань на сваім месцячкі, жыватом к леснячкі. Там сядзяць, віно, водку п'юць, цябе ў госці завуць.

Ад прыстрэку (уроку)

Первым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся, святому святочку, этаму дзянёчку. Шол Ісус Хрыстос, залатой трасцінкай папіраючы. Шла Пресвятая Багародзіца, спрашывает у мяне: «Куды ты, бабка, ідзеш?» – «Я іду к рабе божай (імя) выгаварываць прыстрэк, урок і дзяцінец Колевы, балевы, гаручы, прымоўны, прыгаворны, парабоцкі, дзявоцкі, мужчынскі, жаночы, коньскі, карові, свіняцкі, сабачы, курыны, ветраны, земляны. Са ўсяго выгаварываю: з касцей, з машчэй, з жыл, полужыл, з буйнай галавы, з гарачай крыві, з румянага ліца, з шырокага серца. Бог – з помашчу, я – са словам».

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н., Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

Залатнік (ад жывата)

Госпаду Богу памалюся, Прэчыстай Мацеры прыкланюся. Угаварываю Колі (імя), ураджэнаму, хрышчэнаму. Залатнік, залатнік, божы чалавек, тут табе не стаяць, бакоў не падпіраць, грудзей не залягаць. Стань жа ты на месца, на залатым крэсле. Там табе піценне і ядзенне. Там мёд, віно п'юць, цябе ў госці ждуць. Залатнік з подзіўку, залатнік з прыгавору, залатнік ветраны, падуманы, пагаданы, із касцей, із гарачай крові і машчэй, із рыжага мяса, із жоўтай касці. Тут табе не стаяць і залатніка не бушаваць (3 р.).

Ад звіху, хвароб

Ох, ты, звіх, не будзь ліх, па касцях не хадзі, касцей не ламі. Тут табе не стаяць, касцей не ламаць! Ідзі на сваё крэсла, на сваё места. Там мёд, віно п'юць, цябе ў госці завуць.

Ад удару

Мар'ячка-панначка па гары хадзіла, траўку збірала, косці складала і ўдар угаварывала, і ссылала яго на мхі, на балота, дзе сабакі не брахалі і сарокі не шчабяталі. Я – словам, а Гасподзь – з духам! (3 р.).

Ад зразу (зглаз)

Ступаю на парог, на людское сэрца. Грыша (любое імя) – ні воўк, ні авечка, проціў Грышы – ніхто ні славечка. Вы, людзі – воўкі, а Грыша – чалавек! Ён вас сатрэ, самне і ў с... заткне (3 р.).

Ад іспуга

Першым разам, добрым часам памалюсь я Госпаду Богу, Святой Мацеры пакланюсь. Угаварываю я нежыць (яку нежыць, імя чалавека) із усіх пальчыкаў, із усіх сустаўчыкаў, із рабочых рук, із бягушчых ног. Я ўгаварывала, я ўмаўляла, Божая Маці памагала, на места нервы вастанаўляла. Я – словам, а Гасподзь – з духам!

Для скаціны (у калодзец на ваду)

Госпадзі, святая вада Ульяна, зямля Таццяна, прышла я к табе на белае малако, на жоўтае масла, на тоўсты сыр.

Для каровы (замова гаспадарчага прызначэння)

Першым разам, добрым часам памалюсь я Госпаду Богу, Святой Мацері пакланюсь. Дванаццаць ангелаў з неба злятайце, маім славам памагайце, ад маёй чарнарабой (масць каровы) каровы змей адганяйце. А вы, змеі, ад маёй чарнарабой каровы малако не адбірайце, вымю апухаць не давайце, на вочы страху не накідайце. Прыстрэчны, прысмешны, прыгаворны, жаночы, дзявочы, хлапочы, жаночы із-пад чэпца, дзявочы із-пад платка, хлапочы із-пад шапкі. Жыла на жылу, сустаў на сустаў. Яно з Госпадам. Георгі на крутой гары катаўся, ва святой вадзе купаўся і нам усім паказаўся, з Святой Мацерай в Божам рэчы гаварыў: «Святая Мацер Божая, ад маёй (рабой) кароўкі змей адгані з іхнімі злымі духамі ў цёмныя лясы, у чорныя бары іх сваім святым словам заключы». Я – словам, а Святая Мацер Божая всескорбяшчая – з помашчу (3 р.).

Ад завіці

Шла Маць Марыя ў горад. ...прыстала, прысела. Прыходзіць к ней Ісус Хрыстос. Маць Марыя, ты спіш, ай не соснілся сон обо мне, как маі ручкі і ножкі на крэсце распіналі, вострым колам галаву маю прыбівалі. З неба скала ўпала, увесь свет задрыжаў. Васільe, Васільe, услыш малітву маю. Хто гэтую малітву будзе маліцца ўранні і вечарам, таго Бог збераж ад усякіх напасцей, ад усякіх балезней, ад грома вялікага, ад стрэлы лятучай, ад гада паўзучага.

Завіць вырваць, прынесці дадому і запаліць над чугуном, штоб тлела, і казаць гэтую малітву. Хто зрабіў завіць, прыбяжыць штось прасіць. Нельга нічога даваць.

Ад гадзюкі

Першым разам, добрым часам, адкуль узялась шкаратая гадзіна – з арэшкавага куста, із гарэхавай шалупайкі. Шкаратая гадзіна, збірай сваіх гадаў, падкупных, падплатных, гаявых, лесавых, палявых, падтынных. І вымай із (каровы або імя чалавека) сваю балесць і ядрасць, і вымай із валос (або шэрсці), із жоўтай касці, із ляснога вымя, із малочных жыл. І вымай, і зубы вырывай, і набок адкідай (3 р.).

На суд

Іду я на суд, цяну нагу за нагою, увесь суд за мною. Не сама я іду. На ваўку еду, гадзюкаю паганяю, усім суддзям губы і зубы замыкаю. Мая хата, мая печ, гаварыце мне вольна рэч.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Нікіценка Праскоўі Іванаўны, 1925 г. н., 1993 г.

На жывёлу

Это ж не кажды чалавек загавор такі знае. А замова такая была, кагда первы раз жывёлу выганялі:

– Выганяю, усім вочы закрываю, штоб мая карова добра хадзіла, чараду блюдзіла і дамой прыхадзіла.

Святой вярбой пагоняць, а потым гэту ветку назад прынясуць і ў сараі ваткнуць.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Нікіцічны, 1928 г. н., 2002 г.

Ад зубнога болю

Калі на небе настане месяц-маладзік і, ішоўшы па вуліцы, ты першы раз пабачыш яго, а ў цябе баліць зуб, то, астанавіўшыся, паглядзі на яго і скажы:

– Маладзік, маладой, у цябе рог залатой. Быў на том свеце?

– Быў.

– Бачыў мёртвых?

– Бачыў.

– Баляць у іх зубы?

– Не, не баляць.

– Штоб і ў рабы божай Ганны (любое імя) не балелі (апошні сказ паўтарыць тры разы).

Пры выгане жывёлы на пашу

Ідзі, кароўка, у поле, ідзі, па чужых дварах не брадзі, сваёй хазяйкі прыбылі насі на малако, на сыр, на масла – сыру тоўстага, малака густога, масла жоўтага.

Абсыпалі карову свечаным макам, які да гэтага свецяць у царкве, і прыказулі:

– Як свечанага маку не сабраць, так ад маёй кароўкі прыбылі не адняць.

Ад звіху

Ехаў Гасподзь на лошадзі-асляці чэрэз калінавы мост. Выламаў ногі лошадзі-асляці, стаў ён страдаці. Выйшла Прэчыстая Маці, стала пытаці:

– Сын, мой сын, чаго не пагібаеш?

– Маці, мая маці, як мне пагібаці? Выламаў ногу лошадзі-асляці.

– Сын, мой сын, перастань страдаці. Удар загаварыла з ачэй, з румянага ліца. Я – з духам, Бог – з помашчу.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на ад Кашперка Надзеі Яфімаўны, 1930 г. н., Афанасенка Матроны Юр'еўны, 1931 г. н., 2000 г.

Ад зубнога болю

У родителя старшего, которого уже нет, болели зубы когда-то, теперь они и не болят, пусть и у его дочери (внучки или других родственников) зубы не болят.

То же самое говорили, когда у кого-то болели руки или ноги. Ходили и повторяли много раз.

Ад спалоху

Когда-то были кровати в деревне деревянные, вместо матраса лежали доски, и когда испугивался ребёнок, то убирали одну доску, и ребёнок пролазил под кровать, и через дыру его вытаскивали со словами:

– Пронимаю насквозь попа, с Танюшки – змеи да долу.

Целовали ребёнка и сплёвывали на пол. И так делали три раза.

Ад хворых вачэй

Ячмень, ячмень, на тебе дулю. Кабылка здохне – ячмень засохне.

Продували по глазам справа налево и сплёвывали. Так повторяли три раза.

Калі хлопец ідзе ў армію

Я в дорогу провожаю сына своего и тебе поручаю его, Божья Мать. Будь, заступница святая, на его пути, помоги ему в науке и труде, протяни святые руки при большой беде. И от пули-лиходейки на поле брани заступи, и в дороге, жизни трудной ему помоги. Аминь.

Запісана ў г. Гомель ад Юрасік Валянціны Савельеўны, 1946 г.н. (раней пражывала ў в. Рудня-Каменева (раней Папоўская Рудня) Лоеўскага р-на), 2001 г.

Ад ячменю

Ячмень, ячмень, на табе кукіш, што хочаш, то і купіш. Купі сабе тапарок, сячы ячмень папярок.

Ад зглазу

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Маці пакланюся. І Маць Прачыстая, стань жа ты на помач выгаварыць гэтыя суразы і мужчынскія, і жаночыя. За гарамі і за палямі ляжыць белы камень, і на тым камені сядзіць лебедзь без крылля і без пер'я. Як гэтаму лебедзю дзяцей не вадзіць, так гэтым суразам тут не быць. Загаварую і замаўляю пяць вок: адно карае, другое ярае, трэцяе шэрае, чацвёртае белае, пятае дзявочае сына Максіма.

Ад пужання, ляку

Святы Юрай, Святы Мікола, Матка Хрыстосава, хадзі да мяне, дам табе сівога каня. Едзь на сіне мора. На сінім моры паны ў карты гуляюць, сталы засцілаюць, кубкі віна наліваюць, п'юць, гуляюць, пярэпалох у госці зазываюць. Ты ж, пярэпаласе, па жывату не хадзі, у бачкі не ўпірайсь, у сярэдзінку не ўлягай, пад грудзі не падварачай, і костачак не крышы, і сэрца не тамі. Ідзі сабе, выкупайся, выгуляйся. Ёсць табе што напіціся і наесціся. Годзе гуляці, пара вопуху аблягаці.

Ад зубнога болю

О, вы, зубы, зубы! Чаму ж вы не белы, да руды? Хіба вы што кепска жавалі, што хваробы дасталі. Перастаньце ж вы хварэці, будзеце як велькі пан у карэце. А калі не перастанеце балеці, то мы будзем вас жалезам цягнуці. Ідзі ж ты, хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы да ў мокрыя балаты. А хваробы нам не трэба, бо яна прыйшла ад чорта, але не з неба. Маладзік малады, твой розум залаты. Як табе век на зямлі не бываць, так век хай зубы не баляць.

Ад нападзі

Адкуль ты, гора, узялося, туды ты і вярніся. Дзе ты, гора, было, туды і вярніся. Маладзік малады, по всему свету ходзіш, усім правду гаворыш, скажы мне, як будзе мне.

Малітва для маленькага дзіцяці

Прачыстая Маці, засцеражы маё дзіця з поўначы да свету, а з свету да веку.

Малітва в пуць

Ангел навстречу, Господь на пути, Светитель Микола дорогу свети, Матерь Господня, иди впереди, все дороги в пути огради.

Да каровы

Святы Юрай, святы Ягорый, святы Мікола. Па ўсяму свету ходзіце, усім праўду гаварыце, скажыце мне, буду я есці з кароўкі сваёй малако ці не?

Узяць цадзілку і 3 разы к сабе расы пацягнуць і цадзіць малако 3 разы і не паласкаць. Налятае туча і граза, налі вядро вады і набяры стакан вады ад сябе. На трэці дзень памыць цадзілку і воду выліць на машынную дарогу, а цадзілку павесіць над дзвярамі, каторыя ў хату ўваходзяць.

Як карову ў поле выганяць

Узяць булку хлеба, разрэзаць на тры куска. Туда маку свячонага, солі святой. Вярбічкай святой на крыжу тры разы ўдарыць у хлеве і сказаць:

– Ідзі, мая кароўка, на юраўскія росы, на мікольскія травы, і хадзі, мая кароўка, па лясам, па палям, траўку з'ядай, а расу співай, а ка мне з вялікаю карысцю

прыбывай. А ты, ведзьма-гадзюка, нажом разрэжся, на іголку наткніся, ты ж маёй каровачкі малака не наясіся. На маіх вароцях стаяць два суседы, хочуць з неба звёзды зняць, як ім з неба звёзды не зняць, так ім маёй каровачкі не пакушаць чужога спору. Не хачу свайго, не впушчу чужога, спору не жалаю, свайго не впускаю. Амінь.

Ад зглазу

Пляваць на караваць, ліж бы было дзе спаць.

– Заліжа сургучом – ета мне ўсё ніпачом. А наложана пячаць, а я сматру, як начаць. Угавараю прыстрыкі, падзівкі, прыстрычные, падуманые, пагаданые, таму назад аддадзены. Ідзіце ў прыстрыкі, падзівкі падуманые, пагаданые, таму назад аддадзеные. Хто аба мне падумаў, хто мне пагадаў, штоб ён сабе назад забраў. Яго душа яму в зева, его речі ему в плечі, яго надуманае, яго нагаданае яму назад аддадзена.

У дарогу

Ухожу от ворот, Мать Пречистая наперад залатую ризу расстилае, святою ризою прикрывает, и яна мяне сохраняет, золотым ключом спасает. Господи, помилуй (3 р.), Господи, спаси (3 р.).

Ад нападзі

Маня, га, падляж і к табе нуда, штоб ты сабе вешалку найшла, ад мяне атышла (3 р.). Лёня, га, падляж і к табе нуда, штоб ты сабе вешалку нашоў, ад мяне аташол (3 р.).

Для прысухі хлопца

З светлага веніка бярэцца пруток, які кладзецца на парог каля дзвярэй, там, дзе пройдзе той, для каго назначана прысуха. Як толькі перашагнуў праз прут, то ён хаваецца або кладзецца ў такое месца, дзе б яго ніхто не змог убачыць. Затым яго бяруць і кладуць у жарка натопленую баню на палок і прыгаворваюць:

– Как сохнет этот прут, пускай сохнет по мне раб божый (імя) (3 р.).

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на ад Прышчэп Марыі Ульянаўны, 1927 г. н.

Калі ідзеш у лес

Ад звера бягучага, ад гада пазучага, ад ліхога чалавека, ад усіх напасцей спасі і памілуй мяне, Мацер Божая, спасі і сахрані.

На сон

Лажуся спаць, нада мною Хрыстова пячаць, ангелы – па бакам, храніцелі – па галавам, Мацер Божая – у нагах. Храніце мяне днём і ноччу.

На загавіны радзілася, хрыстом хрысцілася. Хрэст на мне, хрэст нада мною. Ангелы-храніцелі, храніце маю душачку, упакой, Госпадзі. Слава Атцу і Сыну і Святому Духу. Амінь.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Зляк і нежыць

Первым разам, добрым часам Госпаду Богу памалюся, Прэчыстай Божай Маці пакланюся. Святы Юрай, Егорай, станавіцесь на помашч. Я буду з славамі, вы будзеце з духамі. Будзем (імя) раджонай, хрышчонай угаварываць зляк і нежыць. Святою серадою, вячэрняй зарою, гасподняй свячою. Табе тут не стаяць, агнём не паліць, нудой не нудзіць, опухаллю не пушыць, сном не бушаваць, ад яды не адбіваць, варот не засланяць, пад грудзі не падходзіць. Ідзі ты, нежыць, на мхі, на балота. Там табе гулянне, пітанне і красаванне. Я ж лячу, Госпада Бога прашу: «Злюбі мае слова, дай свой дух».

Расказвала мужыкова сястра.

Рожа

Первым разом, добрым часом Господу Богу помолюся, Святой Мацері пакланюся. Святы Юрай, Егорай, станавіцесь на помошч. Я буду з словамі, вы будзеце з духамі. Будзем Олі раджонай, хрышчонай уговарываць рожу святым авторкам, утренней зарою, господней свячою. Рожа, рожачка, красная дзевіца, табе тут не стояць, по ... не ходзіць, рабе божай Олі крыві не сушыць, косці не ломаць і румяного цела не сціраць. Ідзі, рожа, на ніцые лозы, на быстрые воды. Там табе гулянне, пітанне і красаванне. А ты, рожачка, па касці не ходзі, краснотой не гоні, не пушы. Е рожа калючая, балючая, прымовная, прыгаворная, прысмешная, прыстрэшная, падуманая, пагаданая, незавідная, незаглядная, летучая і ползучая.

Мне пераказвала адна жэншчына.

Ад зубнога болю

– Маладзік маладой, у цебе рог залатой, гдзе ты бывал?
– В море.
– А што ты відзел?
– Золоты рог в море відзел.
– А ў мёртвых бывал?
– Бывал.
– А іх ты відал?
– Відал.
– А што оні дзелают?
– Спят і лежат, іх зубы не болят.

Раб божы, штоб у Галі зубы не болелі, не шчымелі. Зара-зараніца, божая памошніца, ідзі да мяне на помашч. Я буду з духамі, а ты – з помашчу. Госпадзі, злюбі ты мой дух.

Расказвала родная сястра. Яна жыве ў в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна. А сястрэ расказвала баба Луца, якая ўжо памерла.

Ад звіху

Первым разам, гасподнім часам Госпаду Богу памалюся, Пречістай Божэй Маці пакланюся. Ехав Ісус Хрістос через каліновы мост на лашаці, на асляці на Ірусалім святкаваці. Устрачае Божую Маці.

– Чего, Маці, плачеш, рыдаеш?

– Сынку, мой сынку, звіхнув, звіхнув раб божы Ваня спінку.

– Не плач, Маці, не рыдай, я еду ўстановляць устав з касцей, з машчей, з сініх жыл. Як быв устав знов на месці став.

Расказвала сястра з Маскоўскай вобласці, дзярэўня Рахманова.

Грызь

Первым разам, гасподнім часам памолюся я Госпаду Богу, Пречістай Мацері. Грызь-грызішче, ідзі во лесішче. Там цебе ждуць-ажыдаюць, мёд вараць, сыту сыцяць. Тут табе не жыць, тут табе не быць, а в Олі, рабе божай, не бываць, косцей не ломаць. А мой душок ціхенькі, ліхенькі, Господзі, злюбі мой дух.

Пераказвала сястра. Жыве ў в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна.

Бельмо

Госпаду Богу памалюся, Пречістай Маці пакланюся. Пречістая Маці да чорнай коровы Галкі прыступала, гасподнімі рукамі за голаву брала, бельмо згоняць памагала. Ехав Ісус Хрістос на рданском коне. Канем разаб'ю, солью засолю, чорнай Галкі бельмо згоню.

Мне пераказвала замову суседка.

Ад залатніка

Залатнік, залатнічок, божы памошнічак, стань ты на своём месці, сядзь ты на залатом крэслі, залатою тростачкай ты падапрыся, шолкавым паясочкам подпережыся, па жывату не хадзі, варот не засланяй, баков не закладай, пад грудзі не падходзь.

Расказвала свякруха. Ужо памерла.

Ад скулы

Скула-скуліца, красная дзявіца, тут табе не стаяць, касцей не ламаць. Я цябе выгаварываю з касцей, з машчэй, з буйнай галавы, з белага мозга, з серага воласа, з карых глаз, з белага ліца, з розавай крыві, з сініх жыл. Ідзі, скула-скуліца, красная дзявіца, ідзі на густыя лозы, на топкія балоты, на высокія горы, дзе сонца не всходзіць, луна не заходзіць, пціцы не летают, сабакі не

лают. Там табе жыць-піраваць, сваіх дзетак даглядаць, расціць. Я – словам, а Гасподзь – дзелам. Не сама памагаю, а Гасподзь памагае, рабе (імя) всю гадасць выганяе.

Зрабіць з гарбушкі шарык, катаць вакруг костачкі і аддаць сабаку.

На поспех у судзе

Станаўлюся я на суд, не на суд, а на суддзёвы грудзі. Ты не воўк, я не авечка, дай, Бог, штоб не сказалі на мяне плахога славечка.

Расказваў бацька мой.

На поспех у судзе

Парогавае палена, як табе цяжка-важка тут ляжаць, так штоб цяжка-важка суддзям на мяне слова было сказаць. Чатыры сцяны, пятая печ, замаўляю суддзям рэч.

Расказвала адна жанчына.

Пры выгане скаціны

Госпаду Богу памалюся, Прэчыстай Маці пакланюся. Кароўка на лугу паслась, масці чорнай, па імені Галка. Табе, ведзьма, маёй кароўкі не з'ядаць, малако не забіраць, сасуды не зажымаць. Я к табе – з паскай, а ты ка мне – з ласкай. Я к табе – з пасвячонай вадой, ты ка мне – з жоўтым малаком, з густым сырам, з жоўтым маслам.

Пры выгане скаціны

Чытаюць замову ў першы дзень, калі выганяюць карову ў чэраду:

– Ідзі, Галка, не бойся прыстрэку, уроку, а бойся, штоб Пасха не была ў сераду.

Ад гадзюкі

На сінім моры стаяў дуб на 9–3 какаты. У тых какатах 9–3 гнязды. А ў тых 9–3 гняздах 9–3 гадзюкі падплотныя, падтынныя, вадзяныя, балотныя, сераныя, каменныя. Сунімайце губы, зубы, буду вам зелле ўсім даваць, буду вас на чатыры часці разрываць.

Расказвала дваюрадная цётка. Яна ўжэ памерла.

Ад агню

Святы Авдзей, што заняв, тым і владзей, і больша не занімай, і дым, ідзі в гару. Святы Ілля-прарок, адвядзі врага на бок. Штоб аглух, аслеп, анямеў, да мяне нічога не меў.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на ад Каваленка Галіны Мікалаеўны, 1939 г.н. (з сшытка), 2003 г.

Ад зубнога болю

Малады-маладзеча, а ці быў ты ў старэча? А ці пытаў стары ў мёртвага, ці ў яго зубы не баляць? Як у яго не баляць, то хай і ў мяне не баляць.

Госпаду Богу памалюся, Святой Прэчысце пакланюся. Маладзік маладзіка-ваўся, мне паказаўся.

– Ты на тым свеце быў?
– Быў!
– Мерцвякоў бачыў?
– Бачыў.
– У іх зубы не баляць?
– Не.
– Няхай не баляць і ў мяне. Я – са словам, Гасподзь – з помаччу.

Ад рожы

Ішлі калечкі чэраз тры рэчкі, неслі воду чэраз калоду. Вада разлілася, кроў замаглася. Госпаду Богу памалюся, Святой Прэчысце пакланюся. Жылі тры браты, тры Кандраты. Яны рубалі лазу, сеялі рожу. Рожа не ўзышла, а з раны кроў не пайшла.

Каб карова не брыкалася і не бадзялася

Госпаду Богу памалюся, Святой Прэчысце пакланюся. Ішоў Ісус Хрыстос праз рэчку, закруціў вяроўку на руку. Як гэтай вяроўцы на руцэ не рвацца, так маёй кароўцы не брыкацца, не бадзяцца, на ўсіх ведзьмаў, чарадзеяў забывацца. Я – са словам, Гасподзь – з помаччу.

Ад болю вачэй

Ехаў Ісус Хрыстос на залатым кані. Злез з каня, разлажыў касцёр. Касцёр разгарэўся, у рабы божай (імя) боль астановіцца.

Паўтарыць тры разы.

На шчасце

Першым разам, лепшым часам, лепшым найскарэйшым, памочнейшым, не я – Божа Маці з прэстола ўставала, рабе божай (імя) любоў прымаўляла. Сонейка-вярэдзейка, вуглень на неба, паглядзі на майго міленькага. Як ты светла, красна, міла, люба на ўвесь свет, каб так була (яму) светла, красна, міла, люба на ўвесь век.

Другім разам, лепшым часам...

Паўтарыць 9 разоў.

Ад удару

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Мацеры пакланюся. Прачыста Божа Маці з прастола ўставала, рабу божаму (імя) удар шаптала. Як пяньку

карою не абвалакацца, так і ўдару не ўспамінацца ні ў старом, ні ў маладом, ні ў перакроі да й ніколі.

Ад звіху

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Мацеры пакланюся. Прачыста Божа Маці прыступала, рабу божаму (імя) звіх шаптала. Жылы на жылы, кроў на кроў, костачка на костачку, сустаў на сустаў каб на места стаў.

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.

Ад крыві

Ішлі тры калечкі цераз тры рэчкі, секлі, рубалі, кроў замаўлялі.

Прысушка

Цераз 77 палёў, цераз 77 бароў, 77 лясоў пасылаю Міколу 77 кашоў, 77 чарвей. Вы, чэрві, бяжыце і Міколу на краваці ўдарце аб левую шчаку і ў сэрца, каб, жыўшы, не забыў, каб, хадзіўшы, не прахадзіў, каб, спаўшы, не праспаў, каб, думаўшы, не прадумаў, каб, еўшы, не праеў. Як жыве рыба без вады, а мёртвы без зямлі, так каб і Мікола жыў без Марынкі.

На жывёлу

Зара-зараніца, ты ёсць адзініца. Я – з малітваю тваёй, а ты – з помашчу. Рабая кароўка глазлівая, глаза сінія, глаза чорныя, касыя-раскосыя, вам у маёй кароўцы не стаяць, цела яе не прымячаць, крыві яе не снаваць. Ідзіце на мха, на балота, там вам стаяць столікі засціланыя, кубкі наліваныя. Там вам піць, гуляць, у маёй кароўкі не стаяць.

Ад укусу гадзюкі

Узыйду я на мора, зірну я на гору. Стаіць куст на прытыцы, а ў тым кусце – гняздо, у гняздзе – тры змяі: адна – Шкурапіна, другая – Умляліна, трэцяя – Сем'яніна просяць сваіх прыслугаў адной межавой, другой вадзяной, трэцяй сенажавой: да русай касці яду не дапускаць і вопуху палягаць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бойдак Елізаветы Іванаўны, 1926 г.н., 2005 г.

Благаслаўленне

Я ў дарогу (імя) праважаю, табе, Мацер Божая, даручаю. Будзь заступніцай на пуці (імя), памажы ў дарогі, памажы ў трудзе, працяні святыя рукі пры бальшой бядзе. Ты сама мела сына, шмат слязінак праліла. Толькі ты ж адна ты паймёш міня. Ты услыш маю малітву, благаславі (імя). І ў дарогі, і ў труднай жысці ты яму, Мацер Божая, памажы.

Як куды ідзеш, трэба гаварыць так:
– Ангел мой, хадзі са мной. Ты – упярод, а я – за табой.

Шчэ ў нас так гаварылі, када куды ідзеш:
– Навядзі, Госпадзі, пуць мой па благу.
Кагда гаварыш, нада крэсціцца самому і крэсціць дарогу.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

Як кроў замаўляць

Ішлі тры калекі чераз тры рэкі, канавы капалі, бярозы сажалі. Бяроза прынялась, кроў сунялась.

Каб гадасць не ўкусіла

Бярэш хлеб у карман і ўжэ тады не пабачыш яе.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

На здароўе дзіцяці

Если ребёнок болел, надо было выходить в поле и говорить:
– Месячка, месячка, табе – ясныя ночы, а мне – ясныя вочы. Месячка, месячка, табе – поўня, а мне – моцнага здароўя. Месячка, месячка, табе ноч хароша, а мне поўна грошаў.
Заговор этот детям всем рассказывать нужно, его здесь все знают.

На добры сон

А лажуся я спаць, на мне – Хрыстовая пячаць, ля мяне – Божая Маць, певень – у нагах, Хрыстос – у галавах, ангелкі – па баках. Певень запяе – Хрыстос засцеражэ, ангелкі засцерагуць. Ангелы, божыя храніцелі, храніце меня ад вечара да поўначы, ад поўначы да света, ад света да века.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Кудраўцавай Наталлі Данілаўны, 1972 г. н.

Валянціна НОВАК

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР ЛОЕЎШЧЫНЫ

Надзвычай багатая калядна-навагодняя абраднасць і паэзія Лоеўшчыны. У структуры святкавання Каляд важнае месца адводзілася рытуалам, звязаным з першай, другой і трэцяй куццёй. Як і ў іншых мясцовасцях Гомельшчыны, лаяўчане варылі кашу: «всягда з ячменя» (г. п. Лоеў); куццю «варылі з розных круп: ілі аўсянка, ілі пшано, ілі грэчка, ілі пярловая крупа» (в. Гарадок); «рабіла куццю свежанькую, з пшана варыла» (п. Пабядзіцель) і інш. Гаршчок з кашай абавязкова ставілі на сена, бо, падкрэсліваюць інфарматары, «Ісус радзіўся на сене». З цікавай інтэрпрэтацыяй вобраза павука звязваюць мясцовыя жыхары міфалагічны матыў спасення Хрыста: «І кажуць, што яго (Хрыста – *В. Н.*) ужо іскалі, павук заснаваў тое месца павуціннем». Гэтым і матывуецца распаўсюджаная на тэрыторыі Палесся прыкмета аб тым, што «павука біць нельзя, а еслі павук паўзе, то нада зняць і выкінуць» (г. п. Лоеў). Прыведзеныя народныя ўяўленні, звязаныя з павуком, які надзелены касмалагічнай сімволікай, абумоўлены яго «дэміургічнай роляй... Такая роля павука, заснавая на касмалагічным асэнсаванні ідэі пляцення і тканння як стварэння, падмацоўваецца сусветнай або нябеснай сімволікай...» [1, 647].

Рытуал загукання марозу выконвалі як магічны акт яго заклікання не марозіць пасевы, не шкодзіць ураджайнасці палёў. У в. Крупейкі Лоеўскага раёна загуканне марозу мела выразна акрэсленую славесную формулу: «Мароз, Мароз, не хадзі летам, а хадзі зімою. А як летам прыдзеш, дык будзем біць жалезнай пугаю». Рытуал заклікання марозу выконвалі на Лоеўшчыне і на першую куццю (вв. Крупейкі, Гарадок, Пярэдзелка, Рудня-Каменева, Страдубка і інш.), і на другую (вв. Удалёўка, Марс, г. п. Лоеў і інш.), і на трэцюю (вв. Казярогі, Ліпнякі, Бывалькі, Дзяражычы, п. Пабядзіцель і інш.). Жыхары в. Ястрабка адзначылі, што ў іх мясцовасці «мароз гукалі» на ўсе тры куцці: «На кожнаю куццю мароз звалі».

Пра рытуал заклінання неўрадлівага дрэва, блізкі да ўкраінскага звычаю, прыгадвалі многія жыхары Лоеўшчыны. Таццяна Міхееўна Пруднік, 1918 г. н., з в. Казярогі: «Яблыні ж сакірай (сякерай) страшаць, штоб яблыкі радзілі»; Вольга Мікітаўна Кардаш, 1927 г. н., з г. п. Лоеў: «А падходзіш к яблыне з тапорыкам да кажаш: «Не будзеш пладаносіць – ссяку цябе. Глядзіш, на следуюшчы год усё добра». З сякерай як вострым металічным прадметам была звязана не толькі ахоўная магія, але і прадуцыравальная – магія забеспячэння ўраджаю. У в. Крупейкі, паводле ўспамінаў інфарматараў, «калі яблакі і грушы не родзяць», таксама «падходзілі з сякерай і казалі тры разы: «Калі не будзеш радзіць, засяку». Рытуал абвязвання пладовых дрэў

сенам, якое ляжала падчас калядных святкаванняў на стале, павінен быў таксама садзейнічаць ураджайнасці: «каб радзілі яблакі і грушы» (в. Крупейкі).

У мясцовым абрадавым комплексе былі вядомы як абрад ваджэння казы, так і звычай хаджэння з мядзведзем. Паводле ўспамінаў лаяўчан, пераапраналіся «ва ўсялякіх жывёл: у казу, у мядзведзя, сабаку, у чорта» (в. Ручаёўка, г. п. Лоеў); «хадзілі з кабылай, ...бывала, зорку неслі» (г. п. Лоеў).

Шырока распаўсюджаным на тэрыторыі Лоеўскага раёна з'яўляецца і абрад засявання, калі выконвалі рытуальны пасеў зярнят, што, лічылі, садзейнічае багатаму ўраджаю збажыны (кантактная магія). Звычайна ў гэтым абрадзе ўдзельнічалі дзеці, якія, раскідваючы зерне па хаце, прыгаворвалі: «Сею, сею, засяваю, з Новым годам паздраўляю».

Разнастайныя віды навагодняй шлюбнай варажбы, прадстаўленыя ва ўсім багацці іх мясцовых варыянтаў, з'яўляюцца яскравым сведчаннем павышанай увагі жыхароў Лоеўшчыны да свайго асабістага лёсу і сямейнага шчасця. Важнае пытанне, якое хвалявала моладзь, – гэта будучы шлюб. Адсюль і падрабязная распрацаванасць у варожбах прыёмаў і спосабаў прагназавання будучыні. У рытуалах варажбы выкарыстоўвалі часцей за ўсё бліны, зярняты, дровы, абутак, штыкеціны, смецце, венік, свечкі, люстэрка, з дапамогай якіх расшыфроўвалі сімвалічны сэнс дзеянняў, тлумачылі магчымасць або немагчымасць шлюбу. Гэты від народнай культуры, арганічна ўплецены ў кантэкст калядных святкаванняў, дэманструе багацце фантазіі і вобразнасці, непаўторную паэтычнасць і смеласць асацыяцый мыслення нашых продкаў і сучаснікаў – мясцовых жыхароў.

З трэцяй куццёй, «поснай», «галоднай», «вадзяной» былі звязаны наступныя дзеянні: асвячэнне вады, акрапленне ёю хаты, гаспадарчых пабудоў, свойскіх жывёл і птушак, маляванне крыжыкаў («крэшчыкаў») на печы, варотах, хляве, высяканне крыжа на рэчцы, абліванне вадой і інш. Семантыка прыведзеных рытуалаў была звязана з імкненнем мясцовых жыхароў засцерагчыся ад уздзеяння звышнатуральных сіл, забяспечыць здароўе і дабрабыт.

У мясцовай традыцыі жыхароў Лоеўшчыны абрад гукання вясны вылучаецца цікавай абрадавай сістэмай, сярод складовых частак якой можна адзначыць, акрамя агульнабеларускіх традыцыйных (выхад на высокае месца, запальванне вогнішча, выпяканне абрадавага печыва – жаўранкаў, падкідванне іх угору з мэтай паспрыяць хутчэйшаму прылёту птушак, гушканне на арэлях і выкананне песень-вяснянак) і лакальныя структурна значныя элементы (выбар вяснянкі, запальванне старога кола, выкананне гульні «Гарэпня», танцаў і кадрылі, ваджэнне двухбаковага карагода вакол вогнішча).

Перад тым, як ісці гукаць вясну, дзяўчаты прасілі благаслаўлення ў маці або бабулі, якія гаварылі: «Благаслаўляем вас, дзеці, ідзіце, вясну гукайце, зіму праважайце». «Да хаты старэйшай матулі або бабулі адной са спявачак ішлі з песнямі, папярэдне выбраўшы вясноўку, прыгожую, працавітую дзяўчыну»:

Благаславі, маці, вясну заклікаці,
Вясну заклікаці, зіму замыкаці.
Зіму люту ў камору,
Вясну красну на вуліцу,
На цёплае лета,
На буйнае жыта.

(Запісана ад Берасневай В. У., 1939 г. н., г. п. Лоеў).

Жыхары г. п. Лоеў адзначылі, што ў іх мясцовасці, калі гукалі вясну, то спальвалі на вогнішчы саламяную ляльку. Лічылі, што гэтае магічнае дзеянне паспрыяе

адраджэнню раслiннага свету: «счыталася, што ў раслінах была сіла для жыцця. І калі палілі, то счыталі, што гэтая сіла вернецца ў расліны». Дзеці выконвалі рытуал падкідвання ўверх абрадавага печыва – жаўранкаў. Рыхтавалі не толькі «пранікі з фігуркамі жаўранкаў», але і пяклі бліны, якія елі і выконвалі вяснянкі «Ой, зіма з вясной страчаецца», «Ой, вясна, вясна вясёлая».

Паводле ўспамінаў інфарматараў, на Лоеўшчыне, калі гукалі вясну, то «падсцілалі салому і садзіліся на край гары», спявалі вяснянкі:

Ой, вясна, вясна, да вясёлая,
Ой, вясна, вясна, да вясёлая. – Гу!
Развесяліла да ўсе горачкі. – Гу!
Усе горачкі да даліначкі. – Гу!
А пайшоў Іван да дзяўчыначкі. – Гу!

Асаблівасць мясцовай традыцыі гукання вясны на Лоеўшчыне – гэта і своеасаблівы заклінальна-магічны дыялог паміж вясноўкай і дзяўчатамі:

– Дзяўчаты, а чаму гэта карова ў хляве раве?
– Вясну заве! – Гу!
– А чаму курка сакоча?
– Несціся хоча. – Гу!

Дзяўчаты выконваюць далей традыцыйную вяснянку:

Вол бушуе – вясну чуе. – Гу!
Воран крача – сыра хоча. – Гу!
Дзеўка плача – замуж хоча. – Гу!
Стары крэкча – жыці хоча. – Гу!

(Запісана ад Берасневай В. У., 1939 г. н., г. п. Лоеў)

Рытуал запальвання старога кола, якое «пускалі на плыце на ваду», суправаджаўся песеннымі загуканнямі дзяўчат, што ішлі па беразе і спявалі:

Чаго, вясна, на ніз пайшла?
Што крутыя горы. – Гу!
Чаго, дзеўка, замуж пайшла,
Што чорны бровы. – Гу!
Броўкі ж мае чарненькі,
Прапала я з вамі. – Гу!
Нельга выйсці на вуліцу
Да й за варатамі. – Гу!

(Запісана ад Берасневай В. У., 1939 г. н., г. п. Лоеў)

Абрад гукання вясны працягваўся ў лесе, дзе моладзь запальвала вогнішча, вакол якога вадзілі двухбаковы карагод, гулялі ў гульню «Гары, гары, пень» (Гарэпня), гушкаліся на арэлях, скакалі, танцавалі кадрыль «Ляцелі 2 пцічкі»:

І калена
Дзеньгі льюцца, дзеньгі льюцца,
Як у рэшаце вада.
Нашы хлопцы задаюцца,
З імі простая бяда.

ІІ калена
Ляцелі дзве пцічкі,
Ростам невялічкі,
Чарнявая мая,
Чарнаглазенькая.

(Запісана ад Берасневай В. У., 1939 г. н., г. п. Лоеў)

На Лоеўшчыне пашчасціла сустрэцца са старажыламі А. Ф. Герасіменка, 1911 г. н., і Т. Т. Санько, 1924 г. н. (в. Абакумы), якія пацвердзілі такія факты ў абрадзе гукання вясны, як «на дах залязалі, вясну гукалі, зіму адганялі»:

Ой, вясна-вясняначка,
Дзе твая дачка Ульяначка?
Дзень у садочку шые сарочку
Свайму сыночку Васілёчку.

Ой, Грыцу, на вуліцу
Вынесь гуселькі пад палою,
Зайграй, дудачка, пад вярбою,
А маладзічкам пад другою.

Акім Санько, 1921 г. н., жыхар в. Абакумы, праспяваўшы вышэйпрыведзеныя радкі, паведаміў, як ён «сам рабіў дудачкі з лазы і сам іграў».

Не менш цікавым у веснавой абраднасці Лоеўшчыны з'яўляецца і факт суправаджэння гушкання моладзі на арэлях адпаведнай песняй:

Я на арэлюшкі калыхалася,
Я з арэлюшкі абарвалася.
Ой, лі, ой, люлі.
Туда ішлі, прайшлі два малайцы,
Парні бравыя, кучаравыя.
Ой, лі, ой, люлі.
Яны ішлі, прыйшлі, астанавіліся,
За ту дзевачку пабраніліся.

Абрад гукання вясны ў в. Усход пачынаўся са «спальвання зімы» («за сялом сабіраліся маладыя ды палілі агні, дзе і палілі зіму, у агні палілі непатрэбны абутак, лапці, вешчы, якія ў хаце не нада» (Запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход). Жанчыны рыхтавалі абрадавае печыва – «конікаў», якіх начынялі кашай, а дзяўчаты ішлі ў лес, высякалі ёлку (хвою), прыносілі дадому і ўпрыгожвалі яе папяровымі кветкамі («нарадзім, капыткоў нацапляем»). Затым дзяўчаты, узяўшы з сабой гэту ўпрыгожаную ёлку, печыва ў выглядзе «конікаў», яйкі, шукаюць які-небудзь высокі пянёк, калі ж не знаходзяць, то залазяць на хлеў і выконваюць песню-вяснянку («Мы на хлеў лезум, і ту ёлку ўстаўляем, і співаем: «Гэй, вясна, гэй, красна. // Што ты там проці лета вунесла?» (Запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход). Выкарыстанне абрадавага дрэўца, ёлкі, мае шлюбную сімволіку. Такая семантычная скіраванасць пацвярджаецца і фактам паядынку паміж хлопцамі, якія «прыйдуць ды крадуць ёлку», і дзяўчатамі, якія яе сцерагуць як сімвал дзявоцкасці.

Гукалі вясну на Лоеўшчыне і на Стрэчанне (2 лютага, ст. ст.) – в. Крупейкі, і на Благавешчанне (25 сакавіка, ст. ст.) – в. Мохаў, 1 сакавіка – в. Вулкан і на Саракі (9 сакавіка, ст. ст.) – в. Лутава. Прыведзеныя факты дазваляюць лічыць пераканаўчым меркаванне даследчыка А. Ліса аб тым, што «пачатак «гукання вясны» на Беларусі ў розных яе шыротах меў лакальныя часавыя дэтэрмінанты», а таксама сведчаць аб багатай часавай варыятыўнасці перыяду гукання вясны нават у межах вёсак аднаго раёна.

У вёсках Лоеўшчыны абрад гукання вясны адбываўся ў розных месцах: на «бярвеннях» («садзіліся і пачыналі спяваць – «клікаць вясну» – в. Крупейкі); на «высокім месцы, на бугру» або «хто дома гукаў, то залазілі на вышкі» – в. Мохаў; над ракой («збіраліся на бугарок» або хадзілі гукаць вясну «ўкруг дзярэўні» – п. Пабядзіцель); на коле, якое клалі ў папярэдне выкапаную яму («выкопвалі яму і лажылі туды калясо і ўжо каталіся да самага вечара. Вось так мы вясну встрачалі» – в. Ручаёўка); на могілках («первага марта звалі вясну, прыйдам мы на кладбішча і всягда паём» – в. Вулкан).

Пра цікавую дэталь у мясцовым абрадзе гукання вясны паведамілі жыхары в. Крупейкі, продкі якіх здаўна лічылі, што асноўныя яго выканаўцы – жанчыны, а таму «калі хто-небудзь з мужчын падыходзіў, то яны адразу пераставалі спяваць, ...баяліся, каб «не спалохаў» хто-небудзь з іх вясну».

У вёсках Мохаў, Лутава, Ястрабка, Дзімамеркі, Удалёўка, Белы Калодзеж і інш., як і ў іншых мясцовасцях Гомельшчыны, бытуе агульнабеларускае павер'е, што менавіта на Саракі, 22 сакавіка, «пагіблі сорак мучанікаў», што ў гэты дзень прылятае сорак выраяў птушак. Невыпадкова з гэтай лічбай «40» былі звязаны такія магічныя дзеянні, як перакідванне «сарака піражкоў з макам», «сарака пампушак». Названыя абрадавыя дзеянні вяскоўцаў адпаведна прагназавалі знаходжанне «на балоце сорак яечак вуціных» (в. Мохаў), «40 кубел на лугу, кубло – гняздо вутак з яйцамі» (г. п. Лоеў, в. Дзімамеркі). Жыхары Лоеўшчыны верылі, што той, каму трапіць адзін выпечаны з сарака піражкоў, у якім будзе капейка замест маку, будзе шчаслівым на працягу ўсяго года (в. Мохаў), а калі ў абрадавым печыве, «жаўранках», знойдзеш зерне, спраўдзяцца надзеі лаяўчан – быць заўсёды з хлебам.

Добра вядома на Лоеўшчыне і свята Юр'я, якое адзначалі 23 красавіка па ст. ст. (6 мая – н. ст.). Паводле сведчанняў вяскоўцаў і жыхароў г. п. Лоеў, «Юр'я – гэта ўжо быў апякун жывёлы». Аднак мясцовы юраўскі абрадавы комплекс звязаны не толькі з першым выганам жывёлы на пашу, але і з клопатам пра добры ўраджай збажыны. Невыпадкова ў некаторых варыянтах юраўскіх песень Юр'я выступае таксама і апекуном нівы, магічна ўплывае на яе пладавітасць.

Важнае значэнне надавалі вяскоўцы рытуалам абходу поля, асвячэння жыта, што, несумненна, звязана з ідэяй урадлівасці. Звычай абходу поля на Юр'е ў мясцовай традыцыі в. Грамыкі Лоеўскага раёна з'яўляўся абавязковым. З Юр'ем, як апекуном земляробства, звязвалі добры ўраджай жыта:

Юрый па межах ходзіць,
Па межах ходзіць,
Жыта родзіць.
Радзі, жыта, ядраністае, каласістае.

Каб жывёла на падвор'і была здаровай, гаспадар уставаў рана і «пасвіў яе на расе». Паводле сведчанняў вяскоўцаў, немалаважнае значэнне ў рытуалах надавалася юраўскай расе. Да ўзыходу сонца трэба было выпусціць жывёлу на поле, каб «не прапала первая веснавая раса» (в. Страдубка), бо нашы продкі і іх нашчадкі верылі ў магічную жыватворную сілу расы. Невыпадкова сабранай расой «абціралі і коней, і кароў, каб не хварэлі, а каровы штоб давалі малака болей» (в. Страдубка).

Жыхары з п. Пабядзіцель растлумачылі сэнс абрадавых дзеянняў, звязаных з акрапленнем жывёлы «святой вадой»: «но каб адагнаць нячысцікаў, яшчэ могуць святой вадой папырскаць». Зыходзячы з мясцовых павер'яў, імкнуліся раніцай пахадзіць «па расе голымі нагамі, каб ногі не балелі» (п. Пабядзіцель).

У в. Страдубка таксама імкнуліся выкарыстаць гаючыя магчымасці расы: «Да сонца нада скаціну вывесці на поле, штоб не прапала первая веснавая раса». Каб дамашнія жывёлы не хварэлі, каб каровы давалі больш малака і таксама не хварэлі, пастухі, сабраўшы расу, абціралі іх ёю.

Калі выганялі першы раз карову ў поле, то гаспадыні ў в. Крупейкі імкнуліся прагнаць яе праз замкнёны замок, пакладзены на парозе хлява, а пры гэтым каб магічна ўзмацніць сілу названых дзеянняў, прагаворвалі замоўную формулу: «Святы Юрай, сайдзі з неба на зямлю, замкні маю кароўку ад змея лятучага, ад

гада паўзучага, ад ветра ліхога, ад чалавека злога». У в. Белы Калодзеж клалі каля варот, калі выганялі карову на пашу, два звараныя яйкі.

Устойлівай мясцовай традыцыяй з'яўляецца звычай падразаць хвост карове («У еты дзень кажды год абразала да ўсходу сонца хвост карові» – вв. Крупейкі, Сінск, Удалёўка, Вулкан і інш.). Як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, лаяўчане з асаблівай пашанай выконвалі галоўны рытуал, звязаны са святам Юр'я, – рытуал выгану жывёлы на пашу галінкамі пасвечанай вярбы. Чаму менавіта апошнім надавалася магічная сіла, тлумачаць самі жыхары: напрыклад, галінка пасвечанай вярбы, уторкнутая ў дзверы, засцерагала, паводле народных уяўленняў, ад злых духаў; калі ж «уторквалі» свячоную вербачку ў зямлю ў полі, то, меркавалі, што гэта з'явіцца добрым сродкам засцярогі поля ад граду (в. Рудня-Бурыцкая).

Зыходзячы з іншых аргументаваных народных крыніц, галінкі пасвечанай вярбы, якімі выганялі карову ў поле, «у хлеў вешалі, каб пажару не было»; «вывешвалі і ў дзвярах у сараі, хто дзе. Эта харашо і ад гразы» (г. п. Лоеў); пасвечанай вярбой выганялі кароў, «штоб яны самі прыходзілі дамой» (в. Рэкорд); «штоб карова назад не вярталась» (в. Ястрабка).

У нешматлікіх юраўскіх песенных тэкстах гучаць матывы адмыкання зямлі, выпускання расы. На думку Г. А. Барташэвіч, «матыў адмыкання зямлі, выпускання на свет расы і ўсялякай расліннасці наогул пашыраны ў фальклоры славян» [2, с. 99]. Мясцовыя песенныя варыянты пацвярджаюць выказванне беларускай даследчыцы, што «матыў загаду, зварот да Юр'я – адметная рыса менавіта беларускіх песень» [2, с. 100].

Аналіз сучасных экспедыцыйных звестак па юраўскай абраднасці і паэзіі Лоеўшчыны дазваляе адзначыць, якія кампаненты гэтага свята захаваліся да нашых дзён: выган жывёлы на пашу пасвечанай вярбой, акрапленне кароў і коней «святой вадой», абход нівы, «запасванне» жывёлы на расе, каб «здаровенькай была» (в. Рэкорд), частаванне пастухоў, прагон кароў праз пэўныя рэчы, пакладзеныя на парозе хлява, выпяканне абрадавага печыва – «храстоў», якія «скату давалі», правядзенне святарамі малебна ў полі, падразанне хвастоў у кароў.

Абрад праводзін русалкі на Лоеўшчыне вылучаецца полісемантычнасцю функцыянальнай скіраванасці. Цікавасць выклікаюць мясцовыя версіі інфарматараў наконт традыцыйных функцый русалак, іх месцазнаходжання, разнастайнасці міфалагічных уяўленняў. Падрабязна прааналізаваныя Л. М. Вінаградавай палескія запісы далі магчымасць даследчыцы зрабіць наступны вывад: «Такім чынам, месцамі знаходжання русалак у траецка-русальны перыяд звычайна называлі: жытнёвае або канаплянае поле і межы, лес, дрэвы, месца каля вады, балота, калодзежы, масты, могілкі і іншыя «нячыстыя» месцы (напрыклад, перакрыжаванні); а пастаяннай іх лакалізацыяй лічылі часцей за ўсё «той свет» (неба, рай, могілкі, магілы), куды яны адыходзілі пасля Русальнага тыдня, або ваду, мора – як мяжу паміж тым і гэтым светам» [3, с. 156].

Лакальная традыцыя г. п. Лоеў захоўвае міфалагічныя ўяўленні аб «магільнай» русалцы, якую, паводле меркаванняў жыхароў, бачылі на могілках. Калі «магільных» русалак надзялялі станоўчымі рысамі, то русалкі, якія «вадзіліся» ў вёсках Бывалькі, Дзімамеркі, Лутава Лоеўскага раёна, заманьвалі чалавека ў жыта і маглі заказытаць яго да смерці.

У 1998 г. ад Лізаветы Рыгораўны Самойленка, 1910 г. н., былі запісаны звесткі пра абрад ваджэння русалкі ў г. п. Лоеў, дзе калісьці жыў, паводле ўспамінаў інфарматара, пан Лашч, які заўсёды ў дзень праводзін русалкі сустракаў яе хлебам-соллю каля свайго маёнтка.

Абрад пачынаўся звычайна са збору кветак, пляцення вянкоў, з падрыхтоўкі вогнішча (хлопцы насілі галлё для кастра), з выканання русальнай песні на сюжэт «На граной нядзелі русалкі сядзелі»:

На граной нядзелі русалкі сядзелі,
Ой, рана-рана, русалкі сядзелі.
Русалкі сядзелі, на Бога глядзелі,
Ой, рана-рана, на Бога глядзелі.
А Бог сына жэне, Ілля дачку дае,
Ой, рана-рана, Ілля дачку дае.
Цяжка мне стаяці, каласком махаці,
Ой, рана-рана, каласком махаці.

У прыведзеным тэксце арганічна спалучаны шлюбныя і аграрна-магічныя матывы. Апошнія знайшлі адлюстраванне ў метафарычным звароце жыта да русалак («сястрыц») з просьбай зжаць яго і ў снапкі павязаць, змалоць і людзей накарміць.

Цікавымі мясцовымі дэталямі ў абрадзе праводзін русалкі ў г. п. Лоеў з'яўляюцца «гойданне хвартухамі ў бок лесу» з мэтай адагнаць ведзьмаў і нячысцікаў, а таксама зачэпліванне дзяўчатамі на галінках дрэў і кустоў сарочак, каб задобрыць русалак, вянкоў, каб паваражыць пра долю («чый вянок не завяне, у той і доля лепшая будзе»), зачэпліванне вянкоў жанчынамі «на крастах памерлых», ваджэнне карагода вакол насыпаных з пяска горак, на якіх сядзяць дзеці («каб іх русалкі не пахваталі»), абмыванне русалкі каля ручая з мэтай выклікаць дождж. Мясцовай адметнасцю ваджэння русалкі з'яўляецца «двухэтапнасць»: спачатку вялі русалку на могілкі, а затым – у жыта. Адпаведна на кожным з этапаў абраду праводзін русалкі мелі месца рытуальныя дзеянні з вянкамі: «Несешь веночки эти (на кладбище)... С каждого двора иде хто... Придём, повесим веночки на могилки, а потом назад. Их! Русалка за нами бежит... С могилок несут на жито веночки, и ей в жито несут по веночку – кинут и кричат: «Проведу русалочку...» (в. Сяўкі) [3, с. 180]. Паводле ўспамінаў В. Я. Буйніцкай, 1914 г. н., з в. Дзімамеркі, «на Ушэсце вадзілі русалку. Хлопцы надзявалі на дзяўчыну адзенне з альховых ветак, на галаву – вялікі вянок з бярозавых ветак. З двух бакоў ставалі ахраннікі-русалы з вялікімі пугамі для таго, хто паспрабуе сарваць зелень з русалкі. Ішлі да жыта і спявалі: «Выведу русалку са двара, // А сама вярнуся да двара». Вадзілі яе і ў капусту, каб «качан быў крэпкі». Апошнюю акалічнасць пацвердзіла Надзея Іванаўна Трушкова, 1911 г. н., з г. п. Лоеў: «Вадзілі русалку на капусту. У момант зняцця з русалкі адзежы людзі стараліся схваціць зелень і хутчэй несці к сабе ў двор, на агарод, у хлеў, каб усё было добра і быў добры ўраджай».

Ваджэнне русалкі ў в. Дзімамеркі суправаджалася песняй, у якой знайшлі адлюстраванне формулы пераліку тых месц («у цёмны бор, у жыта, у капусту, да ігрушкі»), куды імкнуліся прывесці русалку. На наш погляд, у гэтым песенным тэксце надзвычай выразныя амбівалентныя міфалагічныя ўяўленні пра русалку, з якой звязвалі ўраджайнасць жыта і капусты, з аднаго боку, а з другога – засцярогу ад шкоднага ўздзеяння гэтай істоты. Прыём антытэзы слоўных формул, пакладзены ў аснову кампазіцыі тэксту, дапамагае перадаць не толькі пладаносную семантыку вобраза русалкі, але і больш яскрава падкрэсліць матыў адмежавання ад гэтай дэманалагічнай істоты.

Выведу русалку ў цёмны бор,
А сама вярнуся к татку ў двор,
Ой, рана, не рана, к татку ў двор.

Выведу русалку са двара,
А сама вярнуся да двара,
Ой, рана, не рана, да двара.
Павяду русалку ў жыта,
А сама вярнуся да двара,
Ой, рана, не рана, да двара.
Павяду русалку ў капусту,
А сама вярнуся ў хату пусту,
Ой, рана, не рана, у хату пусту.
Павяду русалачку да ігрушкі,
А сама вярнуся да падушкі,
Ой, рана, не рана, да падушкі.

(Запісана ад Краўцовай І.Н., 1911 г.н., Пінчук М.С., 1912 г. н., в. Дзімамеркі)

Успаміны Яўгеніі Іванаўны Ігнаценка з в. Дзімамеркі даюць яскравае ўяўленне аб структуры абраду ваджэння русалкі ў гэтай мясцовасці: выразна акрэсліваюцца этапы «лоўлі русалкі», яе распранання, зняцця русальнага вянка. Мясцовай рысай у гэтым абрадзе з'яўляецца такі момант, як шэсце дзяўчат да могілак з вянкамі і іх зачэпліванне на крыжы магілак сваіх родзічаў, варажба на вянках, пакладзеных на магілах, выкананне каля капліцы русальных песень з мэтай «прызваць да сябе русалку»: «Пелі да цех пор, пака із гая не пакажацца русалка-дзевачка. Усе ў гэты момант крычалі: «Русалка гоніцца».

У в. Дзімамеркі вяночкі з могілак неслі на свае агароды, клалі на капусту, прыгаворваючы: «Які я вянок на капусту надзевала, штобы такое качанне радзіла». Калі клалі вянок на агуркі, то гаварылі: «Сколька тут на вянку цвяточкаў, штобы столька было гурочкаў».

Аб багатай лакальнай трансфармацыі рэгіянальнай абрадавай з'явы «пахавання стралы» сведчаць і запісы на Лоеўшчыне. Напрыклад, у в. Гарадок выкананне рытуальных дзеянняў было прымеркавана да Вялікадня, калі вадзілі стралу, вярнуўшыся з царквы: «сабіраліся на вуліцы, браліся за рукі і ішлі па дзярэўне з аднаго канца ў другі» (Запісана ад Лагута М. І., 1913 г. н., в. Гарадок). Гэты падрыхтоўчы этап завяршаўся за вёскай, у полі, дзе выконваліся кругавыя карагоды з дзецьмі ў цэнтры: «у карагод станавіліся і маладыя, і взрослыя, а дзяцей сажалі ў круг» (Запісана ад Лагута М. І., 1913 г. н., в. Гарадок). Вар'іраванне элементаў вербальна-музычнай структуры песенных напеваў стралы сведчыць аб уплыве канкрэтных сацыяльна-бытавых фактараў на складванне спецыфікі мясцовай традыцыі. У песенным варыянце «Як пушчу стралу да ўздоўж сяла», запісаным у в. Гарадок, фінальны матыў забойства стралой «добра моладца» знаходзіць працяг у фантастычнай сцэне падрыхтоўкі забітага моладца да пахавання:

Як пушчу стралу да ўздоўж сяла,
Як пайшла страла да ўздоўж сяла,
Убіла страла добра моладца,
Свайго браціка.
Убіла страла шчэй і салдаціка.
Ой, ніхто к целу не прыступіцца,
Прыступілася Анна Іванаўна,
Узяла цела да і на ручанькі,
Панясла цела да і да цэркаўкі.
Ой, сама цэрква да і адчынілася,
Ой, самі званы зазваніліся,
Ой, самі кніжкі разгарнуліся,
Самі паны ўшчыталіся.

(Запісана ад Лагута М. І., 1913 г. н., в. Гарадок)

Абрадам провадаў вясны называюць пахаванне стралы ў в. Дзімамеркі. Лялька ў дадзенай мясцовай лакальнай традыцыі сімвалізуе вясну. Развітваючыся з ёю, удзельнікі абраду «закопвалі ляльку ў жыце і спявалі: «Ты сёлета была нехарошая, сухая, // Каб ты такая не вярнулася. // Такая нам не нада, // Закапайце яе // Ды хадзіце на абед» (Запісана ад Буйніцкай Валянціны Акімаўны, 1931 г. н., в. Дзімамеркі) [4, с. 135–137].

Семантыка рытуальных дзеянняў была звязана з прадуцыравальнай магіяй, бо паводле тлумачэнняў інфарматараў, абрад гэты «паспрыяе добраму будучаму ўраджаю сена, хлеба» (Запісана ад Буйніцкай Валянціны Акімаўны, 1931 г. н., в. Дзімамеркі). Іншы раз абрад пахавання стралы ў Лоеўскім р-не, як адзначалі даследчыкі, называлі «вадзіць Вясну» [5, с. 45]. У якасці пацвярджэння спашлёмся на запіс гутаркі з Валянцінай Акімаўнай Буйніцкай з в. Дзімамеркі: «Вясну праводзілі на Ушэсце. Збіраліся жанчыны, адну адзявалі ў мужчынскае адзенне – гэта паніч. Выбіралі паненку, прыгожую, якая з панічом знаходзяцца пасярэдзіне, а астатнія паабапал. Пяюць песні, аж да ранку водзяць Таньку».

З абрадам ваджэння стралы звязаны ў г. п. Лоеў і цікавы гульнёвы карагод «Старыца», які складае мясцовую адметнасць гэтай традыцыі і прымеркаваны да другога дня Вялікадня. Ідэйная сутнасць гэтага унікальнага карагода – прадаўжэнне роду, услаўленне шлюбных адносін, трывалага сямейнага жыцця, асновай якога з'яўляюцца працавітасць мужа і жонкі, іх высокая мараль і чысціня ва ўзаемаадносінах. Карагод пачынаецца з выбару пары, імправізацыі яе ўмоўнага вяселля. А затым малады «ідзе маліцца Богу ў Кіеў і наказвае жонцы даглядаць гаспадарку, але тая не можа доўга сядзець дома, бо «сяброўкі клічуць яе на гулянку». Змест карагода, які ўяўляе сабой арганічнае адзінства слова з музыкай, танцам, гульнёй, складае дыялог паміж кумой і маладзіцай:

Кума, кума, дзе мой старац?
Да ў Кіеве ён, Богу моліцца. Гуляй!

Маладзіца скача ў цэнтры круга, а круг з дзяўчат рухаецца і спявае:

Ой, старац мой,
Вакамарац мой,
Усё ў келы сядзіць
Да ўсё моліцца.
А мне, маладой,
Гуляць хочацца.

(Запісана ад Берасневай В. І., 1939 г. н., г. п. Лоеў)

Удзельніцы карагода кожны раз дараць маладзіцы падарункі: «хустку, каралі, пярсцёнак». На пытанне гаспадара, які нечакана з'яўляецца, адкуль пярсцёнак, дзяўчаты адказваюць, што маладзіца з імі спявала і скакала. У адказ на гэта раз'юшаны гаспадар разганяе ўсіх.

Цікава назіраць за лакалізацыяй традыцыі нават у межах асобных вёсак раёна. Напрыклад, у в. Пярэдзелка адбываўся карагод іншай скіраванасці, вызначальнай рысай якога з'яўлялася ўслаўленне працалюбівага, добразычлівага і паважанага ўсімі вяскоўцамі чалавека, імкненне пазнаёміць з ім «усю вёску, старых і маладых, калі тыя яго не ведаюць».

Адметная і форма ваджэння гэтага карагода «Стралы», які адбываўся або на другі дзень Вялікадня, або за тыдзень да яго (на Звеставанне), калі раніцай выходзілі на вуліцу, заклікаючы:

Давайце карагод вадзіць,
Карагод вялікі, вуліца малая,
Старыя, гуляйце, на вуліцу пускайце.

(Запісана ад Пінчук Е.Г., 1927 г.н., в. Пярэдзелка)

Працэс ваджэння стралы ўяўляў сабой хуткі бег «з аднаго канца сяла ў другі» з выкананнем песні «Павяду стралу да па ўсяму сялу». Як засведчылі інфарматары, «на другім канцы вёскі складалі новы карагод. Бягуць людзі, прытанцоўваюць і спяваюць: «Як пушчу стралу да па ўсём сялу...» (Запісана ад Пінчук Е. Г., 1927 г. н., в. Пярэдзелка).

У абрадзе ваджэння стралы звычайна прымалі ўдзел жанчыны, але, як падкрэслівае Г. А. Барташэвіч, «...былі і выпадкі, калі «стралу» вялі разам з дзяўчатамі, жанчынамі і хлопцы». Даследчыца спасылаецца на звесткі пра гэты абрад, запісаныя ў в. Валкашанка, дзе існаваў цікавы звычай утвараць падвойны карагод: «...вялі стралу праз сяло, а ў канцы яго ўтваралі круг, дакладней, два кругі – вонкавы жаночы, а ў сярэдзіне мужчынскі – і спявалі такую песню:

Як пушчу стралу да й па ўсём сялу,
Ой, люлі, вада каля горада.
Упала страла пасярод двара,
Ой, ніхто к страле не прыступіцца,
Прыступіла Ганна Іванаўна,
Убіла страла Ганну Іванаўну.

Кожнае кола рухалася ў пэўным напрамку насустрач адно другому» [2, с. 118].

У песенных варыянтах абраду пахавання «стралы», запісаных у вёсках Пярэдзелка і Валкашанка, назіраюцца мясцовыя адрозненні ў сюжэце: у першым выпадку (в. Пярэдзелка) Ганна Іванаўна «прыступілася к страле» і панесла яе на канец сяла; у тэксце, запісаным у в. Валкашанка, гаворыцца аб тым, што страла «ўбіла Ганну Іванаўну».

Цікавую дэталь у абрадзе пахавання стралы вылучае даследчык В. Я. Гусеў, спасылаючыся на сведчанні жыхароў в. Дзяражычы: «...стралу тады вадзілі ў запаведны дубняк на беразе Дняпра, куды сыходзілася моладзь з беларускіх і ўкраінскіх вёсак» [6, с. 86].

Паводле ўспамінаў жыхароў Лоеўшчыны, на «стралу» ў вв. Крупейкі, Казярогі вадзілі «крывы танок», па-мясцоваму адметны: у Крупейках, напрыклад, «хадзілі вакол горак з пяска, а ў Казярогах – вакол шастоў, убітых у зямлю. Побач садзілі дзяцей, каб лепей было за імі назіраць. Калі вадзілі «крывы танок», то спявалі:

А ў крывога танка,
А ў крывога танка
Не выведу венца.
Завівалі вяночак
На добры гадочак,
На густое жыта.
Пшано залатое,
Ячмень каласісты,
Авёс залацісты.

(Запісана ад Анісавец М.Ф., 1913 г.н., в. Казярогі)

У в. Крупейкі быў вядомы і карагод пад назвай «Шума», які мае пэўнае падабенства з карагодам «Дрома»: «Шума – гэта высокі шэст, зверху салома. Дзяўчыну падсаджвалі к шасту, а тая павінна была падчапіць і закруціць саломіну, нібы прадзе кудзелю. Астатнія вадзілі карагод і спявалі:

Ой, нуце, нуце, я ў «Шуму» гуляці,
Я ў «Шуму» гуляці, «Шуму» заплятаці.
Ой, запляту лес – на дзевачак бес,
На хлопчыкаў роста, на дзевачак – кароста,
Штоб дзяўчаты не гулялі, на сабе каросту дралі.

А як карагод наблізіцца да дзяўчыны, яна б'е яго ўдзельнікаў тычкай па нагах, тыя ратуюцца» (Запісана ад Карась А. А., 1922 г. н., в. Крупейкі).

Сучасныя запісы абраду ваджэння стралы на Лоеўшчыне выразнага яго тлумачэння не даюць, але міфалагічны змест цэнтральнай песні «Як пушчу стралу да й па ўсяму сялу» дае магчымасць меркаваць, што ў асобных выпадках ваджэнне стралы ажыццяўлялася з мэтай засцярогі ад маланкі, грому, навальніцы, Перуна. Лакальнай адметнасцю семантыкі гэтага абраду ў в. Пярэдзелка з'яўляецца ўшанаванне найбольш паважаных працавітых вяскоўцаў.

У в. Суткова стралу вадзілі на Вялікдзень. Пачатак абраду суправаджаўся наступным песенным прыгаворам: «Давайце карагоды вадзіць! // Карагод вялікі, вуліца малая, // Старые, гуляйце, на вуліцу пускайце!» Мясцовая форма ваджэння карагода – гэта хуткі бег яго ўдзельніц з аднаго канца сяла да другога. У песні «Павяду стралу да па всём сялу», як і ў вышэйназваных лакальных варыянтах, гаворыцца пра Ганну Іванаўну, якая «взяла стралу, пайшла па сялу, прынесла стралу на канец сяла» (в. Суткова).

Вялікдзень як значнае хрысціянскае свята займаў важнае месца ў абрадавым фальклоры Лоеўшчыны. Велікодная абраднасць і паэзія, а таксама звязаныя з імі валачобныя абрады і песні дэманструюць арганічны сінтэз язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў. З самага пачатку ўзнікнення Вялікдзень быў звязаны са святкаваннем «вялікіх дзён» палявых работ. «Мяркуючы па вераваннях і звычаях Вялікадня, прататыпам яго была абрадавая ўрачыстасць стадыі развіцця грамадства і была заклікана стымуляваць урадлівасць збажыны на час веснавой сяўбы, пачатак прадуктыўнага года земляроба» [7, с. 235].

Калі звярнуцца да розных лакальных запісаў звестак пра велікодныя абрады і звычаі, то можна вылучыць наступныя традыцыйныя кампаненты абрадавага комплексу свята Вялікадня: рытуалы падрыхтоўкі да свята, звязаныя з навядзеннем парадку і чысціні ў хаце, на двары («усё на двары і хаці моем, усё перачысцім» – г. п. Лоеў; «полоценцэ развешывалі на образы, на портреты, белілі паталкі» – в. Рудня Каменева), фарбаванне яек, выпяканне «паскі», яе асвячэнне ў царкве, гульня з яйкамі «ў біткі», качанне яек з горкі і варожбы, хаджэнне валачобнікаў («дзеці, крэснікі хадзілі» – в. Вулкан), выкананне велікодных і валачобных песень, прыкметы і павер'і, выпальванне пасвечанай свечкай крыжыкаў, рытуальная трапеза, ваджэнне карагодаў. Яйкі (сёння вяскоўцы на Вялікдзень выкарыстоўваюць розныя колеры фарбы) сімвалізуюць найперш «першакрыніцу жыцця і пладароддзя« [8, с. 578]. Пацвярджэннем агульнапрынятага ў этналогіі прыведзенага тэзіса з'яўляецца меркаванне інфарматараў: «Яйцо – сімвал жызні» – г. п. Лоеў. Пафарбаванае ў чырвоны колер яйка з'яўляецца сімвалам крыві, пралітай Ісусам Хрыстом дзеля таго, каб адкупіць увесь свет ад граху.

У шматлікіх лакальных запісах мы сустракаемся не толькі з язычніцкімі, але і з устойлівымі хрысціянскімі матывамі, у прыватнасці, з тлумачэннямі, чаму менавіта ў чырвоны колер фарбавалі яйкі: «распіналі Ісуса Хрыста, кроў красная цякла, таму і яйца красныя« (в. Удалёўка); «кажуць, што не верыў адзін чалавек у Бога і кажа: «еслі ёсць Бог, то хай маё яйцо ў руцэ стане красным. І яно стала

красным»; «яйкі красілі ў красны колер, таму што калі к цару прыйшла жанчына і яму нешта даказвала, яна гаварыла, што Ісус Хрыстос уваскрэс, а ён кажа: «А паверу тады, калі гэтае яйка стане красным. І яно ў яго на глазах раз – і стала красным» (г. п. Лоеў).

Звернем увагу на семантыку рытуальных дзеянняў, звязаных з велікодным яйкам, у розных лакальных традыцыях Лоеўшчыны: закопвалі пасвечаныя яечныя шкарлупкі ў зямлю, каб «асот не рос на агародзе» (п. Пабядзіцель), клалі іх на падаконнік, каб засцерагчы хату «ад нячыстай сілы ды ад гразы» (в. Сінск), захоўвалі ў мяшочку, каб вясной падчас сяўбы закапаць у зямлю, каб «ураджай добры быў, каб вароны не нападалі разныя» (в. Гарадок), яечным шкарлупінням пасыпалі зямлю, каб «ураджай быў добры» (в. Мохаў), клалі яго ў зерне, якое было прызначана для пасеву, і верылі, што гэта паспрыяе ўраджайнасці (в. Карпаўка).

Важнае месца ў структуры велікоднай абраднасці належыць падрыхтоўцы абрадавага хлеба – «паскі», з выпечкай якой вяскоўцы звязвалі свае надзеі на добры ўраджай, дастатак у гаспадарцы, сямейны дабрабыт («...еслі пасха падымецца добра, красіва, выпечацца харашэ..., то і ўраджай у гэтым годзе Бог пашле добры, і ў гаспадарцы будзе поўна, у доме будзе ладна» (п. Пабядзіцель). Выпечаныя пасхі невыпадкова ўпрыгожваліся крыжыкамі, бо, як адзначылі інфарматары, «пеклі булкі і ўпрыгожвалі хрэстом, бо Хрыста ж на крысце распялі» (г. п. Лоеў).

Важны хрысціянскі атрыбут – пасвечаная ў царкве свечка – валодала, паводле вераванняў, магічнай сілай уздзеяння, таму і імкнуліся, каб «не патухла яна», бо «абладала тады магіяй, ёй можна было акурваць хату, вокны, рысавалі крэсцікі ў апошнюю нядзелю» (в. Мохаў).

Шматлікія матэрыялы па калядна-абрадавай паэзіі, сабраныя на Лоеўшчыне, упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак і з'яўляюцца важнай часткай банка навуковых звестак, якія даюць магчымасць ацаніць глыбіню калектыўнай памяці носьбітаў і істотна дапаўняюць уяўленні аб народнай традыцыйнай культуры Гомельшчыны.

ЛІТАРАТУРА:

1. Славянские древности. Этнолингвистический словарь под редакцией Н. И. Толстого. Т. 3. – М.: Международные отношения, 2004.

2. *Барташэвіч Г. А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – 168 с.

3. *Виноградова Л. Н.* Народная демонология и мифо-ритуальная традиция. – М.: Индрик, 2000. – 432 с.

4. *Гусев В. Е., Марченко Ю. И.* «Стрела» в русско-белорусско-украинском пограничье (к проблеме изучения локальных песенных традиций) // Русский фольклор. Этнографические истоки фольклорных явлений. – Л.: Наука. Ленингр. отд-ние, 1987. – Т. XXIV. – С. 129–143.

5. *Пашина О. А.* Календарные песни весенне-летнего цикла юго-восточной Белоруссии // Славянский и балканский фольклор. Духовная культура на общеславянском фоне. Отв. ред. Н. И.Толстой. – М.: Наука, 1986. – С. 44–62.

6. *Гусев В. Е.* На окраине Белорусского Полесья // Советская этнография. – 1982. – № 5. – С. 82–89.

7. Каляндарна-абрадавая паэзія. – Мн.: Беларуская навука, 2001.

8. Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.

ЗІМОВЫЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ

Піліпаўка

На Піліпаўку не елі нічога скаромнага. Елі толькі капустачку, гурочак, картошку, боршчык, грыбоў засмажым.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г.н. (раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Піліпаўка начыналася з 28 наября. Увечары збіраліся на попрадкі. Прыходзілі ўсякія: і маладыя, і старыя. Мужчыны таксама былі. Яны калёсы дзелалі. А жанчыны ткалі, і пралі, і вязалі. Казалі, што ў Піліпаўку спрадзеш, тое ў Вялікі пост сатчэш. А яшчэ казалі, што ў Піліпаўку ваўкі збіраюцца ў зграі. Песні спявалі розныя. Вось такую:

Сонца нізка, вечар блізка,
Мне на серцэ цяжало.
Кагда б знала сваё шчасцье,
Не влюблялася б в его.

Кагда б знала сваё шчасцье,
Не влюблялася б в его.
То не я его любіла,
А то он меня любіл.

То не я его любіла,
А то он меня любіл.
На последнем расставаніі
Са мной речі говоріл.

На последнем расставаніі
Са мной речі говоріл.
Прізабудзь маю паходку,
Прізабудзь мае слова.

Прізабудзь маю паходку,
Прізабудзь мае слова.
Прізабудзь, каго любіла,
Каму шчасцье аддала.

Запісана ў в. Новая Баршчоўка (раней Баршчоўка) Лоеўскага р-на ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1937 г.н., 2001 г.

На Піліпаўку збіраліся вечорыма жанчыны, дзеўкі і пралі кудзелю Збіраліся ў адной якой хаце, адзяваліся ў больш лепшае. Калі пралі кудзелю, спявалі песні.

Песні былі разныя: і жаласлівыя, пра цяжкую жаночую долю, і пра ўражай, і вясёлыя, і шутлівыя.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

Піліпаўка пачынаецца зімою. Тады воўк нема вые, таму што цемень кругом. Ваўкі хадзілі пад самыя сараі, свіней лавілі. У ета врэмя все пралі кудзелю. Маткі етаму нас вучылі. Разам не збіраліся, а хто калі можа: хто па суседству, хто каго знаў (рядом жылі), так і хадзілі, песні пелі, балакалі.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Таўкачэнка Аляксандры Ларыёнаўны, 1918 г. н., 2002 г.

ПІЛІПАЎСКАЯ ПЕСНЯ

Да было не спаць да піліпавай ночкі,
Было прасці тоненькія сарочкі.
Як пайду я да й у сад зялёненькі,
Сустрэў мяне да й казак маладзенькі.
Ён на мяне да й ківае, маргае,
Ён у мяне да й дарожкі пытае.
Ці ж ты, казак, ці розуму не маеш,
На дарозе ты дарожкі пытаеш?
Ці ж на гэта мяне мамка радзіла,
Каб казакаў па дарожках вадзіла?
Вой, на тое мяне мамка радзіла:
Тонка прасці, звонка ткаці
Да беленька бяліці.

Як я малада была,
Дык я рана ўставала,
Дык я рана ўставала,
Кашулю вышывала
Свайму большаму брату.
У каўнярочку вышыла,
Ай, я жаркае сонца.
У рукавочку вышыла,
Ай, я ясен месячык.
У падалочку вышыла,
Ай, я дробныя зоркі.
Ад сонейка, браток,
Табе відненька будзе.
Ад зорачак, браток,
Табе весела будзе.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Акуліны Дзмітрыеўны, 1940 г. н., 1999 г.

Піліпаўка бывае дзе-та ў дзекабрэ месяцэ. Пралі, ткалі. Не елі скаромнае. Збіраліся ў хаце, а пазней самі ткалі. Казалі, што на Піліпаўку ваўкі жэняцца.

На Піліпаўку жаніцца нельзя. Калісь на Піліпаўку, гаварылі, хадзілі ваўкі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н.,
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Гэта не празнік, гэта Піліпаў пост. Он дліцца 6 нядзель. У гэты дзень ткуць, прадуць. Кагда-та там было, дык лён, каноплі трапалі часамі, прыгатаўлялі, пралі.

А ўжо настаюць Каляды з Раждзяства, 2 нядзелі ўжэ нічога не дзелалі, а патом ужэ, после Раждзяства, кросна снавалі. Збіраліс у адну хату, пелі. На вячорках дзеўкі з хлопцамі мала былі, а больш ужэ такія жэншчыны, каторыя занімаліся гэтым. Маладзёж збіралася па хатах, там танцавалі.

У гэты пост рыбу елі, на падсолнечнам грыбы, картошку паджарвалі, кашу пярловую варылі, туда ўсе прыправы кідалі: і лаўровы лісцік, і ўкропчык, і марковачку, прытомленую лучком, – усё перамешваем, і нармальна будзе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1927 г.н., 2005 г.

Вячоркі

Ну, на вячорках дзеўкі пралі. Хто пеў, а хто не пеў. Калі была добрая жэншчына, то пускала 5–6 дзевак, мы ёй плацілі. Хлопцы прыходзілі гуляць туды ўжо.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Каляды

Да Каляд рыхтаваліся, як і да Пасхі. Каляды – эта ўжэ дзве нядзелі, патом вечарам нічога не дзелалі. Вечарам эта ўжэ спраўляюць Каляды, бралі семачкі там, арэхі, раньшэ в дзярэўне нічога вечарам не дзелалі. Во, дзве нядзелі – гэта ўжэ святыя вечары. Днём можна дзелаць, але толькі еслі што новае. Ну, вот напрімер, шыць новае нешта можна, а старое няльзя. Было тры пасты, але я не памятаю іх. Кашу ў нас варылі. А варылі всягда з ячменя ў нас. Кашу вараць, на кут (у дзярэўні ж куты такія былі) кладуць сена і патом на сена ўжэ ставяць гаршочак з кашай. Ну, калі яблакі ёсць сушаныя, дык вараць кампот з яблак. Ну, вараць усё такое поснае. Гэта на посную куццю. А другая – гэта ўжо багатая куцця, там ужо ўсё вараць. І на гэту куццю ходзяць калядаваць. Эта на стары Новы год, з 13 на 14 ходзяць калядаваць. А ставяць куццю на сена, бо лічыцца, што Ісус радзіўся на сене, то і кашу ставяць на сена. А ён жа нарадзіўся ў такім сарайчыку, а там жа сена было. І кажуць, што яго ўжо іскалі, павук заснаваў тое месца павуцінай. Яны сказалі: «Раз тое месца заснавана павуцінай, значыць, там нікога не будзе». І вот гэта такая прымета, што павука біць няльзя, а еслі павук паўзе, то нада зняць і выкінуць. Павука няльзя біць, бо павук спас Ісуса Хрыста. А калядоўшчыкі адзяваліся, як хто ў што хоча. І казу вадзілі, як хто. На шчадруху шчадравалі, но я то не хадзіла. Бацька быў камуніст, дык не разрашалі. А так хадзілі, у хату прыходзілі, песні пелі. Выносілі тады што-небудзь. Тады, знаеце, парасёнка білі, дык і каўбаса была, і сала. Дзенег не дарылі, да вайны дзенег жа не было, дык дарылі такое с'ядобнае: каўбаску там, хто спячэ што.

Гадалі дзеўкі. Усяка-усяка гадалі. Бралі во так бярэмак дроў, прыносілі і тады шчыталі. Калі парна – то будзеш у пары, калі не – то і не. Во так было.

Кідалі цераз забор башмачкі, как гаварыцца: і ў якую сторану нос пакажа, у тую сторану і пойдзеш замуж.

На двор выходзілі. Калі сустрэнеш жэншчыну, то не выйдзеш замуж, а калі мужчыну, то ўжэ ждзі вяселля.

Калі вот прыходзіш к каму-небудзь на парог, і еслі скажуць: «Праходзьце», то гэта харашо, а калі скажуць: «Садзісь», то гэта ўжэ не выйдзеш замуж.

Напякуць бліноў, гэта мой, а гэта мой блін, разложуць іх, а патом запусцяць петуха: і чый першы блін клюне, тая першая і пойдзе замуж.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Міхаленка Раісы Парфёнаўны, 1925 г. н. (раней пражывала ў в. Буда-Петрыцкая Лоеўскага р-на), 2005 г.

ШЧАДРОЎНАЯ ПЕСНЯ

А ў полі, у полі вішанька стаіць,
А на той вішаньцы свечачка гарыць,
Іскарка ўпала – возера растала.
А ў тым возеры сам Бог купаўся
Да й умываўся.
А Прачыстая па берагу хадзіла
Да й Бога прасіла:
– Ой, Божа, Божа, хадзем ка мне вячэраць.
– Засцілай сталы ўсе цісовыя,
Стаўляй кубачкі ў тры радочкі.
Первай кубачцы – віно-зеляно,
Другой кубачцы – мядок-саладок,
Трэцяй кубачцы – шчасця да долю.
Віно-зеляно – для пана сяго,
Мядок-саладок – для жаны яго,
Шчасце да доля – для дзетак яго.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на ад Цямляк Ульяны Пятроўны, 1923 г. н.

Сабіраліся і маладзёж, і старыя. Перад Калядамі ставілі куццю, варылі з розных круп: ілі аўсянка, ілі пшано, ілі грэчка, ілі пярловая крупа. Варылі кампот з груш, з яблык. Прыносілі ў хату сена, лажылі, патом ставілі на ета гаршчок з кашай і гукалі мароза, у акно стукалі, гаварылі: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці». Так рабілі для таго, штобы ў гэтае лета нічога не марозіў. Первая была посная куцця, а патом втарая была – багатая куцця.

Патом хадзілі шчадраваць: і бабкі, і хлопцы, і малая дзетвара тожэ хадзіла. Казу дзелалі. Гэта быў мужчына або жанчына, хто хацеў. Адзявалі проста маску ці парык яшчэ. Хлопцы дык кажух яшчэ надзенуць і бараду прычэпяць. Хадзілі ў каждую хату, пелі песні, і каза танцавала. Раньшэ насілі звязду, якую рабілі самі з хфанеры, красілі, разукрашвалі краскамі, лентачкамі разнымі.

Засявальнікі хадзілі на стары Новы год, засявалі, пелі песні і шчадравалі. Засявалі пшаном ці крупой:

Сею, сею, пасяваю,
З Новым годам паздраўляю.

А патом людзі давалі ім што-небудзь, угашчалі пячэннем ці канхветамі.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

КАЛЯДНАЯ

Была ў мамкі адна донечка Танечка.
Танечка-пані гаворыць з намі сціхеньку,
Ісціхеньку, памалюсеньку, Танечка,
Што татку шыла ўсё чорным шоўкам, Танечка,
А сама шыла шоўкам да беллю, Танечка.
Шаўком да беллю к сваяму вяселлю, Танечка.
Мы ж цябе, Танечка, не зневажаем,
Ды з Новым годам паздраўляем, Танечка!

Запісана ў в. Глушэц Лоеўскага р-на
ад Хлебін Т. Н., 1937 г. н.

КАЛЯДНАЯ ПЕСНЯ

А ў нашай казы шэрсць залатая,
Дзе каза нагою – там жыта капою,
Дзе каза топ, топ – там жыта сем коп.
Дзе каза рогам – там жыта стогам,
Дзе каза ўпала, здохла, прапала.
Устань, козанька, устань, расхадзіся
Па сему двару гаспадарскаму.
Гаспадар ідзе, каляду нясе.

ШЧАДРОЎКІ

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Яшчэ пашчадрую,
Калі дасі другую.

Шчадрыначка шчадравала,
Што ты, баба, гатавала?
Што варыла, што пякла
Давай зразу да вакна.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Кулага Веры Васільеўны, 1939 г. н.
(раней пражывала ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на)

КАЛЯДКІ

Ой, рана, рана куры запелі,
А раней таго Іванька ўстаў.
Іванька ўстаў, тры свечы ссукаў,
Тры свечы ссукаў да ўсе папаліў.
Первую спаліў, абуваючыся,
Другую спаліў, надзяваючыся,
Трэцюю спаліў – на двор пахадзіў,
На двор пахадзіў, званком пазваніў,
Званком пазваніў, гасцей пабудзіў:
– Уставайце, братцы, хадзець з намі,
Хадзець з намі Бога шукаці.
Ой, найдзём мы Бога ў пана Івана,
Мы ж цябе, пан Іван, не зневажаем,
Да і з Новым годам паздраўляем.

Ой, красна, красна ў лузе каліна,
А красней таго Танечка ў мамкі.
Да ішла ж яна лужком, бераżком,
Лужком, бераżком, калінавым мастком.
Дайшла да цэрквы, аж зара ўзышла,
У царкве стала – царква заззяла.
Там паны стаялі, шапкі здымалі,
Шапкі здымалі, у яе пыталі:
– Ці ты царэўна, ці каралеўна?
– Я ні царэўна, ні каралеўна,
Іванава дачка, красна панначка.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Дзедуновай Фені Аляксандраўны, 1923 г. н.

Пелі: «А ў хазяіна (імя) вумная жэна. // Бог яму даў вумную жэну, ля яго даму».

Хадзілі шчадраваць дзеці. Не перадзявалісь, хадзілі в абыкнавенным, у чом ходзіш, у том і хадзі.

Варылі куццю. Первая куцця посная. Жырная – эта втарая, а трэцяя – галодная, эта перад Крэшчэннем. Варылі яе з ячменя, пярлоўкі. Ставілі на сена, хлеб і соль лажылі. Сена лажылі на кут, ставілі куццю, хлеб, соль, варылі кампот із яблак, із груш. Сена лажылі, наверна таму, што Хріста нашлі на сене.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г.н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

На Каляды дзеўкі нам сыплюць семкі, арэхі. Танцавалі, хадзілі шчадраваць. Пераадзяваліся ў казу, мядзведзя. Казу дзелалі із саломы і вадзілі. Шчадравалі, у хату прыходзілі: «Шчадрую, шчадрую, калбасу чую».

На куццю дзеўкі варажылі: стаіць і кідае вобуў за вароты. Тады паглядае: еслі насок туды, значыць, туды замуж пойдзе.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Шчадраваць прыходзілі ў асноўным дзеці. У жывёл яны не перадзяваліся. Панапяльваюць бацькоўскую адзежу і ходзяць. Падыходзяць і крычаць: «Хазяін і хазяйка, выхадзі на лаўку» або «Шчадрую, шчадрую, каўбасу і сала чую. Адкрывайце сундукі, даставайце пятакі». А было такое, што яшчэ і грозіліся: «Не дасі сала, каб ваша свіння не ўстала». Тады мы ім давалі сала, пячэння якога, каўбасы калі. Што было, то і давалі.

А ў лузе, у лузе красная каліна,
Святы вечар!
Святы вечар добрым людзям!

Запісана ў г. п. Лоеў ад Барысенка Пелагеі Мікалаеўны
(нарадзілася ў в. Казярогі Лоеўскага р-на), 2005 г.

На Каляды днём збіраецца маладзёж. Гулялі, танцавалі, гарэлку пілі.

Куццю варыла матка. Варыла з ячмяню. Еты ячмень таўклі ў ступах да й варылі куццю. Первая куцця – посная, другая – багатая, скаромная, а трэцяя – таксама посная. Трэцюю дажа да сонца, пакуль сонца не зайдзе, не ядзяць. Первую днём звараць, а ўвечары ж вячэраюць. Павячэраюць, а тады паследнюю ж ужэ куццю ядзяць.

Куццю паставяць перад віконамі, на стол, сена кладуць пад гаршчок. А тады тое сена ляжыць на трох куццях на стале. Куццю тую ж звараць, кусочык хлеба адрэжуць, солькі пасыплюць, бяруць куццю. Тады ідуць курэй ганяць, штоб неслі яечкі. Да кажуць:

А вы, куры, не сядзіце,
А яечкі нясіце.

Яблыні ж сакірай (сякерай) страшаць, штоб яблыкі радзілі.

На первую куццю садзяцца, нічога не гавораць, маўчаць. Вячэраюць да і ўсё. А ўжо на трэцюю куццю звалі мароз:

Мароз, мароз,
Ідзі куццю есці.

Другая куцця багатая. Дак ужэ дзеўкі збіраліся, танцавалі, гулялі, пелі. А старыя павячэраюць да й нічога не дзелаюць.

Еслі куцця астанецца, дык курам аддаюць, каб яечкі неслі.

На Каляды здзелаюцца цыганямі, адзяюцца да і ходзяць, шамятаюць, шамяцікаў пяюць:

Шамяту мяту,
Кашалі пляту.
А ў той кашалік
Да смачны пернік,
Грудачку кашкі
Да адрэж каўбаскі.
Пажадайце: «Добры вечар!»

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Пруднік Таццяны Міхееўны, 1918 г. н., 2001 г.

Абрад абсыпання зернем суправаджаўся песняй: «Ходзіць Ілья каля Васіля. Як пугай махне, так жыта расце, а пшаніца ўлягае. А мы вас, людзі, паважаем дай з Новым годам і паздравляем. З Новым годам, з добрым родам, з Ісусам Хрыстом і з Святым Раждзеством. З Новым годам, з добрым родам».

На шчодрыкі адзяваліся казой, мядзведзем, хадзілі шчадраваць і пелі:

А ў пана Івана вумная жана, Бог яму даў.
Не завідуйце Івану, братцы, Бог дасць і вам.
Сенечкі мяла, шаляжок (капейку) найшла,
А ў том шаляжыку тры капейкі,
Дай купіла тры горада, Бог яму даў.
Што первы горад – лучшэй, і з панамі,
А другі – з мужыкамі, а трэці горад з суддзямі.

Што з панамі – нада служыць,
А з мужыкамі – нада рабіць,
А з суддзямі трудна жыць, бо нада людзей судзіць.

Ой, красна, ясна, каліна ў лузе,
Святы вечар.
А яшчэ красней дачка ў Івана,
Святы вечар.
Па двару ішла, весь двор скрасіла,
І ў сені ўвайшла, сені заззялі,
А ў хату ўвайшла – паны стаялі,
Шапкі знімалі, у яе пыталі:
– Чыя ж ты, дачка, красна панначка,
Святы вечар?
– Я – дачка Івана, красна панна,
Святы вечар.

КАЛЯДНАЯ

Ой, у полі, полі вішанька стаіць.
На той вішаньцы свечачка гарыць.
Іскра ўпала, возера растала,
У тым возеры сам Бог купаўся,
З Ісусам Хрыстосам, святым Ражаством.
Святое Ражаство радасць прынясло,
Святое Васілле нас развесяліла,
А Іван-красціцель воду пакрасціў.
Паздраўляем з святым Ражаством!
Ды з Новым годам!

ШЧАДРОЎНАЯ

Шчодры вечар! Добры вечар!
Ці дома, дома сам пан-гаспадар?
Дзе ён сядзіць? На покуце.
Што ён дзяржыць? Калітачку.
Што ў калітачцы? Шыляжочкі, піражочкі.
А нам, дзядзечка, па шыляжочку,
Добры вечар!

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Аніскавец Г. І., 1938 г. н., 1999 г.

На куццю ўносілі сена ў хату, клалі ў кут. Варылі куццю з ячменя, кампот. У кут ставілі ячную кашу і хлеб лажылі. Калі неслі ставіць кашу, кажуць: «Мароз, Мароз, не хадзі летам, а хадзі зімою. А як летам прыдзеш, дык будзем біць жалезнаю пугаю».

Садзіліся есці гушчу, а тую, што аставалася, давалі курам і казалі: «Кох, кох, кох». Так казалі для таго, штоб яны квакталі. Хлебец карове давалі.

На шчадруху была багатая куцця. На етую куццю звалі мароз гушчу есці. Па дзярэўні багата калядоўшчыкаў хадзіла, па 10–11 гурткоў. Шчадруха – гэта значыць, шчодры вечар. Трэба было ўсіх угашчаць. Калядоўшчыкі пелі песні:

Красна, красна ў лузе каліна,
Святы вечар!
А красней таго (імя) у мамкі,
Святы вечар!
(Імя) у мамкі па двару хадзіла,
Святы вечар!
Па двару хадзіла, увесь двор красіла,
У сені ўвайшла, сені заззялі,
Святы вечар!
Паны стаялі, у яе пыталі:
– Ой, ці царэўна ты, ці каралеўна ты, матчына дачка,
Красна ягадачка, бацькава дачка, як паненачка,
Святы вечар! Дай, Бог, добры вечар!
Штоб у вас вялося на стале, у дварэ і ў хляве!

Калі прыходзілі к нам первыя шчадроўшчыкі ў хату, то мы бралі і разбівалі на парозе гарбузу. Ета рабілі для таго, каб добра ўрадзілі гарбузы.

Перадзяваліся на шчадруху ў нас хто ў што. Хадзіла каза з маскай звязды, спявала, танцавала.

У еты вечар мы многа гадалі і гадалі па-ўсякаму. Увечары чырылі сярод хаты кружок і ў том кружку сыпалі зярно, напрымер, чатыры нас было дзеўкі, чатыры кучкі зярна насыпалі. Бралі пеўня ў хату, кружылі яго і пускалі. У чыю кучу клюнуў – тыя пайшлі замуж, а ў чыю не клюнуў, дык тая дзеўка і замуж не пайшла.

Яшчэ так рабілі: бралі смецце, выносілі яго на перакрэсную дарогу ў 12 часоў ночы і гукалі: «А ты, смецце, сыпся, рассыпайся, а дзе мой, адзывайся». У яком баку адзавецца, туды і замуж пойдзеш. А еслі на кладзьбішчы застукае, то значыць, дзеўка ўмрэ, жыць не будзе. У нас так было ў вёсцы.

У ету ноч яшчэ закладаюць на сон. Кажуць так: «Святы Восіф Снавідзімец, прад'яві мне ў ва сне, як прад'явіў фараону, так прад'яві рабе божай (імя) купіць ілі прадаць, найсці ці пацяраць». Еслі найдзеш ілі купіш што-небудзь, ілі пабачыш жывога друга, то за яго пойдзеш замуж.

Яшчэ бралі тарэлку, пісалі па краях алфавіт. Ставілі яе на стол, адчынялі комін у 12 часоў ночы і вадзілі пальцам па тарэлцы, і пужаліся. Тарэлка сама круцілася і атвячала. Палец паказваў на тую букву, дзе астанавілася тарэлка, і так чыталі атвет.

Назаўтра прыходзілі засявалі і дзеці, і ўзрослыя.

Запісана ў в. Катловіца Брагінскага р-на
ад Максімчык Алены Уладзіміраўны, 1932 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на)

Да Каляд варылі 3 куцці: Маланка, Аніcся, Юўга. Вараць куццю з ячменя. На кут кладуць сена і туды ставяць куццю. З куццёй выходзяць на парог і кажуць: «Мароз, мароз! Ідзі куццю есці. Бо не прыдзеш ты цяпер, а прыдзеш у маі, так буду біць пугаю».

Тады бяруць тое сена, на якім куцця стаяла, і абвязваюць ім грушы і яблані, каб радзілі. А калі яблані і грушы не родзяць, так падходзілі з сякерай і казалі 3 разы: «Калі не будзеш радзіць, засяку!»

На Каляды пераапраналіся і хадзілі шчадраваць. Песні былі смешныя і ўсякія.

Я табе, цётачка, пакалядую,
Дай мне, цётачка, свінню рудую.
А не дасі мне сала, –
Каб твая свіння не ўстала,
А ў полі свісток.
Няхай табе, мая цётачка,
Скула з гаршчок.

А яшчэ такую пелі:

А ў полі, полі плужок ходзіць,
А за тым плужком сам Бог з піражком.
Прычыста Маці есці носіць да Бога просіць:
– Урадзі, Божа, жыта-пшаніцу,
Жыта-пшаніцу, усякую пашніцу,
Ядраністую, каласістую,
У полі снапамі, у гумне стагамі,
А на стале пірагамі.

Казу ў нас не вадзілі. Хадзілі засяваць па хатах і казалі: «Сею, сею, засяваю. З Новым годам паздраўляю!»

А дзеўкі шчэ ў Ражаство гадалі. Разуюцца і перакідваюць праз забор чобаты. Куды чобат пакажа – туды і замуж пойдзеш.

А тады ўжо ідуць у пограб, стаўляюць свечку і зеркала і глядзяць: хто пакажацца, то жаніх, значыць, будзе.

Хлопцы і дзеўкі збіраліся і гулялі ў гульню. Пасядуць праз аднаго: хлопец – дзеўка, хлопец – дзеўка і пытаюць, ці харошы твой сусед? Калі кажаш, што харошы, так ён застаецца, а калі кажаш, што нехарошы, тады сам выбіраеш сабе другога суседа, і яны мяняюцца мястамі.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н., 2002 г.

Пост быў піліпаўскі. Ну што, гатовілісь. Хто е, дак убіў парася, ужэ там малако, усе ўжэ там ядзяць скаромнае, а то не елі перад гэтым.

Варылі куццю. З куцці было з ячменнай крупы. Первая ўжэ куцця сыходзіць (Ражаство). А то багатая куцця, а то ўжэ паследняя, посная куцця.

Адходзяць Каляды на тую ўжэ куццю, на паследнюю. Калісь празнік быў дзве нядзелі, смецце нясуць і ў адну кучу ссыпаюць. Тады ж ета галодная куцця. От дзяўчата такія былі, ужо варожаць, жаніхоў выбіраюць, а тады ўжэ етае смецце нясуць ужэ там куда далей ды і кажуць: «Сыпся, рассыпайся, ды мой ужэ адзывайся».

І ўжэ чэраз варота кідаюць чобат і глядзяць, куды ўжэ ўпадзе. А хлопцы падсцерагуць да ўхопяць.

Мы калісь такія былі, ну, ужэ взрослыя, гадоў нам было, можа, па чатырнацаць, мы мяшок назбіраем, а калісь жа было зерне ета, ад гарбузоў, так мяшок назбіраем, да ўжэ за той мяшок і кажу: «Давайце пасыпім да будэм шукаць, дзе сабака забрэша». А дзе ўжэ стукаюць, у яком баку ўжэ, туды ўжэ замуж пойдзеш. Я ўжэ не знала, а хлопцы паселі пад той вугалок, да за той мяшок, чуць мяне не павалілі. Тады ўжо: «Сып, рассыпайся, дзе мая – адзывайся». Я стаю, кажу: «Ета я знаю, штоб вас!»

Калісь дзеці гуртам збіраліс (было такое балавство), не баялісь нікога савсім, так весела было. Калісь о такой кучай пазбіраюцца па 12 дзевак, хлопцы прыйдуць.

Калісь хлопцы хадзілі, насілі звязду і пелі, і шчадравалі, во ўжо. А тады ўжо іх дараць, хлопцы хадзілі, шчадравалі, а ім грошы давалі.

І дарослыя хадзілі. Бяруць палку, крэпяць звязду і ходзяць па вуліцах, па дварах.

Не, казы не было ў нас, у нас у дзярэўні казы не было, толькі звязду насілі, а так хадзілі ўсе шчадраваць. У цыган не перадзяваліся, а проста хадзілі так.

А то ж дзеўкі маглі ў зеркала глядзець. Пасядуць і глядзяць жаніхоў. А іх жа ж там і нету. Стукаюць па куце: «Мароз, мароз, не марозь, не хадзі ўлетку, бо я цябе паб'ю».

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н. (раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Хадзілі калісь шчадраваць, з блінамі бегалі. Як прыйдзеш і скажуць: «Ідзі», – то выйдзеш замуж. Калі скажуць: «Сядзь», – то не выйдзеш замуж.

Таксама на Каляды кідалі сапагі цераз вароты. Калі сапог упадзе наском на вуліцу, то пойдзеш замуж. Калі наском к варотам, то будзеш сядзець у дзеўках.

Закалывалі грабяшок на чолачку: калі выпадзе першы грабяшок, то яна і пойдзе замуж.

Хадзілі ўвечары, сабіраліс, песні пелі:

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую,
Дайце каўбасу,
Дадому панясу.
Дайце шчадру,
Яшчэ пашчадрую,
Дайце трэцюю.

У хату заходзілі са словамі: «Добры вечар, добры вечар, добры вечар!» Таксама яшчэ паздраўлялі, пыталіся дазволу ўвайсці. Яшчэ казалі: «Залязайце ў сундучок, даставайце пятачок». Давалі грошы, сала, каўбасу. Усё, што было, тое і давалі. Багатая куцця ідзе перад Крашчэннем, да гэтага поствуем. Тады варылі куццю, ставілі на сена. Таксама звалі яшчэ мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці». А ён адказвае: «Спасіба, еў. На кабылку сеў, ідзі, вароты зачыні». На Каляды надзяваліся, ну, што было – штаны, шапкі – і хадзілі. Перадзяваліся і ў казу, і ў мядзведзя надзяваліся.

На зеркала гадалі. Ставілі зеркала ў 12 часоў ночы, але было апасна гэтае гаданне, штобы нідзе нікога не было, закрываліся так во.

А вот перад Калядамі, калі падмяталі ў хаце, то тым смеццем абсыпалі венік, а тады ставіш тое смецце ў пароге, а тады глядзіш, што табе прысніцца.

Калодзежы клалі з лучынак так во: так хто прысніцца, то таго і пабачыш.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на ад Каўтуновай Юліі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Каляды гулялі ў нашай дзярэўне. Хадзілі калядаваць, але толькі маладыя, старыя ўжо не хадзілі ў нас. Дзеці бегалі, такія дзецкія песні спявалі: «Калядую, калядую, каўбасу чую».

З казой, са звяздой у нас не хадзілі, не ведаю, чаму. У другіх, ведаю, што хадзілі.

Гадалі мы на Новы год. Цікава было. Сабяромся дзеўкамі і адну адпраўляем: «Ідзі, паслухай, што ў хаце гавораць». Ішлі ў вялікую сям'ю. Дзеўка там сядзіць, сядзіць, слухае – яна ж адна. Калі там скажуць: «Ідзі, вады прынясі» ці «Ідзі ты...», дык гэта значыць, што дзеўка замуж выйдзе ў гэтым годзе, а калі там дзеці гуляюцца і хто скажа: «Сядзь!», дык і ты шчэ год сядзець будзеш у дзеўках.

Ці бліны пячэш калі. Дзеўка блін спячэ, у грудзях яго схавае, а потым ідзе па вуліцы. Хто першы сустрэнецца, у таго імя пытае. Вось сяброўка мая спытала Васю, а потым замуж за яго выйшла.

Ну, там тухлі кідаюць. Куды тухвель носам падае, туды і дзеўка замуж пойдзе.

Ці сабака калі брэша – у якой старане брэша, у той старане і жаніх будзе.

Ды шмат такіх прымет было.

Забор абдымалі. Задам ужо забор абдымеш і шчытаеш ужо пары – пара да пары.

Дровы насілі. Дроў набярэш ахапку. Нясеш, а прыйдзеш ужо ў хату і разбіраеш – да пары ці не. Калі да пары – замуж выйдзеш.

Калі калодзеж быў у двары, дзеўкі сабяруцца, вады ў рот набяруць і нясуць, сплюнуць у кружку, і кожная булку маленькую пячэ. Потым выставяць іх у рад і сабаку завуць. Да якой булкі першай падыдзе і з'есць, тая дзеўка і замуж хутчэй скокне.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на ад Агалец Тамары Карпаўны, 1930 г. н.

ШЧАДРОЎКІ

У бары, бары пчолачкі гудуць,
Святы вечар.
Пчолачкі гудуць, цэркаў будуюць,
Святы вечар.
Збудавалі цэркаў з трыма вакнамі,
Святы вечар.
У первае акно – сонейка ўзышло,
Святы вечар.
У другое акно – месяц засвяціў,
Святы вечар.
У трэцяе акно – ангел уляцеў,
Святы вечар.
Ангел уляцеў, на прыстол сеў,
Святы вечар.
На прыстолі сеў, галоўку схіліў,
Святы вечар.
Галоўку схіліў, слёзачку пусціў,
Святы вечар.
З тае слёзачкі стала рэчанька,
Святы вечар.
А Іван-кресціцель ваду ахрысціў,
Святы вечар.
Ваду ахрысціў, на ўвесь свет пусціў,
Святы вечар.
Мы вас, хазяін, не абражаем,
А з Новым годам паздраўляем,
Да з Новым годам, да з Ісусам Хрыстом,
Да святым Раждзяством,
Да са святым Хрыстом.
Святое Раждзяство радасць прынясло,
Радасць прынясло, развесяліла.

Маладая Танечка пшанічку жала,
Святы вечар.
Пшанічку жала, у тры рады клала,
Святы вечар.
Прыйшлі да яе тры казачэнькі,
Святы вечар.
Тры казачэнькі, любыя мае,
Святы вечар.
Не бярыце мяне ў чыстым полі,
Святы вечар.
А бярыце мяне ў таткавым доме,
Святы вечар.
У майго таткі тры старожачкі,
Святы вечар.
Первая старожка – мамка ў парога,
Святы вечар.
Другая старожка – сястра на куце,
Святы вечар.
Трэцяя старожка – братка на дварэ,
Святы вечар.
Мамка ў парога падаркі кроіць,
Святы вечар.
Сястра на куце плацце шые,
Святы вечар.
Братка на дварэ каня сядлае,
Святы вечар.
Каня сядлае, сястру ўпраўляе,
Святы вечар.
Паедзем, сястра, да Ісуса Хрыста,
Святы вечар.
Да Ісуса Хрыста, да святога Раждзяства,
Святы вечар.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Такарэнка Лідзіі Антонаўны, 1932 г. н., 1992 г.

Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую,
Святы вечар.
Дайце каўбасу, дамоў панясу,
Святы вечар.
Дайце другую, шчэ пашчадрую,
Святы вечар.
Дайце трэцюю, хоць авечую,
Святы вечар.
Дайце пятую, хоць лупатую,
Святы вечар.
Дарыце, не барыце,
Кароткія кажушкі – памерзлі пятушкі,
Кароткія світкі – памерзлі лыткі.

Не дарылі нічога, дык гаварылі так:

Не дасі сала, штоб ваша свіння не ўстала,
Не дасі шкуркі, штоб вашы ўсе падохлі куркі.

ЗАСЯВАННЕ

Сею, сею, засяваю,
З Новым годам паздраўляю,
Цётку, дзядзьку і ўсіх вашых дзяцей.

Калі хто гаворыць гэтыя словы, то сыпле на падлогу зярно каля парога. Гаварылі на галодную куццю:

Мароз, мароз, ідзі куццю есці,
А ў Пятроўку не бывай,
Бо пад печ заганю, ступаю прывалю,
Таўкачом прытаўку.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Шастакова Уладзіміра Рыгоравіча, 1932 г. н., 1992 г.

Добры вечар, гаспадару!
Вынесь нам каўбас пару.
Ой, пахадзі каля печкі,
Пашукай нам перапечкі.
Ой, пахадзі каля кваскі,
Пашукай жа там каўбаскі.
Вынесь сала, не скупіся,
Каб твой ячмень урадзіўся,
Каб нажалі сто коп жыта,
Каб сям'я была ўся сыта,
Каб скаціна вадзілася,
Каб пшаніца радзілася,
Каб гарэлку выпівалі,
Каляднікаў частавалі.

Добры вечар таму, хто ў гэтым даму,
А ў гэтым даму сам пан-гаспадар,
Каля яго – жонка яго, каля яе – дзеці яе.
Жадаем табе, пані, пан-гаспадар,
Піва варыці, сынкоў жаніці,
Гарэлку гнаці, дачок аддаваці.
Залезь на баляску, дастань калбаску,
Залезь на драбінку, дастань саламінку.
Яшчэ і кошык маку на ўсялякія прысмакі.
Добры вечар і багаты вечар,
Добрым людзям на здароўе.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Германенка Фаціны Раманаўны, 1935 г. н., 2005 г.

На Каляды варылі куццю з пярлоўкі. Было тры іх: галодная – гэта перад Ражаством, багатая – на Каляды і бедная – паследняя. Мароз клікалі, каб ішоў куццю есці, каб ногі не марозіў.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н. 2005 г.



Прыходзілі ў госці адзін к аднаму. Адразу былі пераадзетымі, каб не ўзналі. Ставілі на стол бутэльку і ежу, спявалі песні і танцавалі.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Глушчанка Еўдакіі Сяргееўны, 1942 г. н., 2005 г.

Шчадруха

Хадзілі шчадраваць. Раньшэ абрады красівыя былі. Мы на вечарынкі хадзілі, песні спявалі. Шчадраваць хадзілі па людзях, па хатах. Піліпаўка да Новага года пачынаецца. Перад Ражэством шчэдрыкі пелі. Красівыя былі абрады, песні ўсякія спявалі.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Скачко Марыі Іванаўны, 1920 г. н.
(перасяленка з в. Мохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Чакаюць людзі гэтага свята, а найбольш першай куцці. Куцця – важны дзень, адзін раз у год бывае, трэба ж сустрэць яе хораша. Самы важны момант у калядныя святы – гэта куцця або калядны вечар. Уся сям'я стараецца сабрацца ў хату ў гэты вечар. Мыюцца цёплаю вадою ў ночвах старыя і малыя: трэба ж ахаяцца ад гразі і сустрэць важны дзень як мае быць. У хаце няма клопату будняга жыцця. Усё, што не патрэбна ў хаце ў свята, выносіцца вон, у сені або ў камору, каб не замінала. Нават на комінку не разложвалі агонь як у будныя дні. Гаспадыня ўходжваецца каля печы. Уся лава каля дзвярэй завалена ўсякімі прыпасамі. Тут стаяць і жаранка, і селядцы, і мак, каторы пяць месяцаў вісеў на гарэ, завязаны ў торбачку, і сухія грыбы. Накрываюць стол. Покуць займае самы старшы ў хаце – дзед ці бацька. З краю стала садзіцца сам гаспадар, каля яго ляжыць хлеб, каторы не крояць тонкімі лустамі. На покуце пад абразамі на мяккім сене даўно ўжо стаіць гаршчок з куццёю. З покуці бяруць па жменьцы сена і цярушаць яго на стале, а на сена засцілаюць чысценькі белы настольнік. Некалькі мінут у хаце наступае цішыня. Гаспадар хрысціцца і шэпча малітву, абярнуўшыся да абразоў тварам. А цэлы рад святых важна і строга пазірае на стол. Пасярэдзіне стала стаіць пляшка гарэлкі. Гарэлку п'юць па парадку: перш старэйшыя, затым малодшыя. На закусь ставіцца смажаная рыба, потым верашчака з грыбамі, квас, ягады, аладкі на салодкай вадзе, кісель, пірагі, а потым куцця. На куццю запрашалі мароз, каб ён ніколі не марозіў пасаджанага ў полі і на агародзе. А шчэ варажылі. Выцягвалі з-пад настольніка сена, якое ўказвала на высату ўраджаю.

Калядаваць хадзілі. Калядоўшчыкі пераапраналіся, казу вадзілі. Спявалі песні і палучалі падарункі. І звязду насілі, выразалі з бумагі і надзявалі на палку.

На шчадруху варажылі па-рознаму. Выкідвалі валёнак цераз плот і глядзелі, у які бок ляжа насок валёнка, у той бок і замуж пойдзеш. Пад вокнамі падслухоўвалі, абдымалі забор і лічылі, калі парная колькасць шчыкецін, то і жыць будзеш у пары.

Запісана ў в. Новая Баршчоўка (раней Баршчоўка) Лоеўскага р-на
ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1937 г. н.

Хадзілі на попрадкі. Хлопцы таксама прыходзілі пагуляць, у карты гулялі, песні пелі, дзеўкі пралі. Гуляць не было калі, трэба было прасці.

Первая куцця была перад Калядамі з 1 па 6 января. Куццю варылі з пярловых круп. У кут лажылі сена і ставілі туды куццю. На первую куццю ждалі дзядоў. Пасля снедання астаўлялі ложкі дзядам.

Другая куцця была 13 января. Яе яшчэ называлі багатай. Збіраліся толькі сям'ёй, нікога не звалі. На стале былі каўбасы, сала, блінцы, што ў каго было. У багатую куццю хадзілі калядоўшчыкі. Прыходзілі і спявалі бажэственныя песні. У казу пераапраналіся. Казе адзенуць кажух, яна пастаіць, патупае з бабамі.

Таксама варажылі 13 января. Дзеўкі кідалі сапагі цераз вароты, а хлопцы бралі і хавалі, хоць босы ідзі. А калі сур'ёзна, то калі сапог упадзе і куды пакажа носам, туды і замуж пойдзеш. А калі носам пакажа на свой двор, то замуж не пойдзеш. Бегалі і пад вокнамі, слухалі, што кажуць. Калі скажуць: «Ідзі сядзь», – то дзеўка замуж не пойдзе, а калі скажуць: «Ідзі», – то пойдзе. Яшчэ абдымалі забор: хто колькі абхопіць. Калі парны лік, то дзеўка будзе ў гэтым годзе ў пары, а калі не, то будзе адна.

Трэцяя куцця была перад Крышчэннем, 19 января. Амаль нічога не варылі. На галодную куццю нічога не сеюць. У гэты дзень свяцілі вадой жывёлу і збудаванні, хату. Пасля садзіліся ўсе за стол і елі.

Пасля Каляд наступаў Мясаед. У Мясаед гулялі свадзьбы.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г. н.
(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на).

І маладыя хадзілі калядаваць, і старыя. І зараз ходзяць і перадзяваюцца. Усе забаўляліся, а потым збіраюцца ў хатах. Калі п'яны мужык зайшоў, яго не білі, а трапкі на яго чаплялі.

Усе куцці былі. Первая была посная, ці то з вады да сахару. Елі яе перва-наперва. Перад первай постувалі. Усе постуюць. Так трэ було.

Другая – это багатая. А перад паследняй куццёю цэлы дзень постувалі.

І первую, і другую, і апошнюю куццю рабіў нехта адзін. Я ўсё жыццё сама рабіла. Як мая матка дзелала, так і я. Так нужна па Божаму закону. Я рабіла куццю свежанькую, з пшана варыла. А на паследнюю куццю Мароза гукалі.

Мароз, мароз,
Ідзі куццю есці.
А в Пятроўку не хадзі,
Будзем пугамі жалезнымі біць (3 р.).

Садзіліся есці, пасядзім на паследнюю куццю. Багата гатовілі чаго, не адну ж куццю.

Мароз гукалі ў хаце рукою. А было, што ў паследнюю куццю хадзілі ўкруга хаты з куццёй. Этак было. Хадзілі мужык ці дзед, дзеці. Куццю ставілі на кут, на сена, а эта сена патом пад курку лажылі. Сена лажылі моўчкі, не загаворвалі. Цэрква далёка была, паэтаму на Каляды ў цэркву не хадзілі.

Шчадраваць ходзяць і цяпер. Папрыходзіць маладзёж, песні пяюць у хаце, такія разныя. Цяпер у казла адзяваюцца, прыгаюць. Звязду не насілі, шчодры не было.

Засяваць хадзілі. Ето было на стары Новы год. Засявальнікі пасыплюць зерна жменьку, гаварылі: «Засяваем, засяваем, з Новым годам паздраўляем», каб давалі гасцінца. Маглі даць канфет, семак. Бралі, што давалі. Так шчадруху гулялі.

Хадзіла маладзёж у паследнюю куццю пад вокнамі і слухала. Еслі ты ўслышыш: «Ідзі», – то замуж пойдзеш у еты год, а еслі – «Сядзі», то будзеш сядзець цэлы год яшчэ ў дзеўках і замуж не пойдзеш.

Дровы насілі, сколькі ўхопіш, то і шчытаюць: як да пары, так і ў пары будзеш, а як не да пары, так і не.

І чобаты перакідалі ў паследнюю куццю цераз хвортку, цераз варота. Куда нос пакажа, туда і замуж пойдзеш. А хлопцы падглядвалі і кралі.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Таўкачэнка Аляксандры Ларыёнаўны, 1918 г. н., 2002 г.

На Каляды хадзілі пець, шчадраваць усе. Пад акно хадзілі, хто ў хату збіраўся. Многа чалавек было, усе пелі, хто як умее...

Шчодзер-бодзер, бацька твой злодзей,
Авечку ўкраў, пад печ захаваў,
Святы вечар.

Ці яшчэ так:

Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую...

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Нікіцічны, 1928 г. н., 2002 г.

У хаце чыста прыбіралі, мылі падлогу, стол шкраблі, мылі, засцілалі чыстыя палавікі, ручнікі чыстыя, святочныя даставалі. Білі свінню, у каго была, гатавалі каўбасы, сала, пяклі хлеб. Накануне Каляд, 13 студзеня, цэлы дзень нічога не елі. Самай галоўнай стравай было прыгатаўленне куцці. Усяго тры куцці. Первая куцця і другая былі багатыя. Варылі яе з пшанічных круп, грэчневых. Запраўлялі маслам, арэхамі, макам. Пад куццю засцілалі сена, засцілалі частку сена на стол, калі садзіліс спраўляць Каляды. Бралі яго із-пад куцці. Калі садзіліс есць куццю, гаспадар запрашаў да стала мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. Улетку каб да нас не хадзіў, жніво не губіў». І ўжэ пасля етага ўсе садзіліс есці. Астатак куцці астаўлялі на стале і другую (непаеўшую) яду для дзядоў. Яны тожа прыходзілі есці, калі ўсе лажыліс аддыхаць. Уранні астатак аддавалі курам, свінням. Сена аддавалі карове, каб усе былі здаровымі, сытымі, карова каб многа малака давала. Первая куцця была 7 студзеня, другая – 14 студзеня, трэцяя – 18 студзеня (галоўная куцця). Варылі з ячменнай крупы куццю, жарылі на посным масле рыбу, наліўку гатовілі з грыбоў, з сухафруктаў варылі кісель. Ставілі возле кута,

абрус накрывалі сенам, скацярцю засцілалі. Звалі есці дзядоў: «Дзяды, дзяды, хадзіце куццю есці».

Калі шлі калядаваць, перадзяваліся ў цыганей, мядзведзя, казу, ну, і ў розныя адзенні, каб не пазналі і смешна было. Мужчына выварочваў кажух, адзяваў маску ілі разукрашваўся краскамі – гэта была каза. Калі зналі, што ў двары ёсць халасты хлопец, пелі:

У (імя) пана явар ва двары,
На том яварку конічак стаіць,
На том конечку Яська сядзіць,
Ясечка сядзіць, ружэйко дзяржыць,
Хоча убіць зелен явар кудравой.

Калядавалі і другімі словамі: «Калядую, калядую, у хазяіна каўбасы чую, лажы ў руку каўбасу, я дадому панясу». Пры калядаванні каза забягала ў хату, брыкалася, жалала хазяявам здароўя, багацця, добрага жыцця ў хаце. Падала, затым дрыгала нагамі, мекала. Гаспадары далжны былі ўгашчаць казу і калядоўнікаў. На галаву казе прыцаплялі звязду. Казу людзі любілі. Яна прыносіла ў хату багацце, здароўе і дзеткам, і хазяявам. Звязда на ілбе казы несла нешта светлае, добрае. Калі казу надзеляць шчырымі пачастункамі, то і ўражай, і гаспадарка далжны былі быць багатымі (густымі).

Гадалі вечарам 13 студзеня, збіраліс дзеўкі і гадалі на сужанага. Выходзілі з хаты, абнімалі шчакеціны на плоце. Калі шчакеціны былі цотнага калічаства, значыць, у гэтым годзе яна будзе ў пары, можа, замуж пойдзе. Калі не, то не. Кідалі сапог цераз плот: у які бок быў павернуты нос сапага, у той бок замуж пойдзе. На сон закладалі, казалі, калі лажыліся спаць: «Божа Маці, прыйдзі на сон закладаці. Панядзелак са вторнікам, вторнік з серадой, серада з чацвяргом, чацверг з пятніцай, пятніца з суботай, нядзелька адна. Нядзелька, нядзелька, дай знак знаць, з кім век векаваць». Гаспадары такжа гадалі па вяршку куцці, калі яна варылася. Еслі каша падымецца над гаршком, будзе добры ўражай.

Засяваць прыходзілі, як толькі развідняе добра. Засявалі тыя, хто і прыходзіў калядаваць. Кідалі пшаніцу, ячмень, другое зярно па хаце, па хазяявах, дзецях, калі заходзілі ў хату, кажучы: «Сею, сею, засяваю, шчасця, здароўя, багацця гэтай хаце жадаю» і інш. Хазяява засявальнікам давалі пачастункі.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

Хадзілі, шчадравалі на Каляды. Шчадравалі, адзін к аднаму ў госці хадзілі. Нічога такога больш не было.

Шчодрыкі былі, пелі шчадроўкі. Напрымер:

А ў полі, полі вішанька стаіць,
А на той вішаньке свечачка гарыць.
Свечачка ўпала – азерца стала,
А ў том азерцы сам Бог купаўся,
З Ісусам Хрыстом святым павітаўся.

Пелі песні дачке абязацельна:

Красна, ясна ў лузе каліна,
Святы вечар.
Красней за таго Анька ў таткі,
Святы вечар.
Па двару хадзіла, весь двор красіла,
А ў хату ўвайшла –
Паны стаялі, паны стаялі,
Шапкі знімалі, шапкі знімалі,
У Анькі пыталі:
– Ці ты паноўна? Ці каралеўна?
– Я не паноўна, не каралеўна,
Я – Фамы дачка, красна панначка,
Як ягадачка.

Казу не вадзілі. Мо, дзе вадзілі? Казу раньшэ за ракой вадзілі. Ну, куццю варылі, з ёй мароз гукалі:

Мароз, мароз!
Ідзі куццю есці.
А ў Пятроўку не хадзі –
Будам жалезным кнутам біць.

Усе садзіліс ь за стол і мароза гукалі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Да Калядаў рыхтаваліся зараней. Прыбіралі ў хаце, гатовілі посную ежу і куццю, якую называлі поснай.

Уранку ішлі ў цэркву, а, памаліўшыся, прыходзілі дадому абедаць. Клалі на кут сена, кусочак хлеба, соль. Абедаць садзіліся ўсе разам. Адзін з членаў сям'і падыходзіў да печы, браў адтуль гаршочак з куццёй і з заплюшчанымі вачамі ішоў да стала і гаварыў: «Як мае свёкры (імя ўсопшага) нічога не бачаць, так каб пціцы майго зерна не бачылі». Вяршочак з кашы знімалі ў тарэлачку, а назаўтра раздавалі худобе. Астатнюю куццю елі самі. Даўшы потым куццю куркам, казалі: «Кох, кох, кох, чтоб мае куркі квахталі рана і позна». Гэта казалі дзеля таго, каб куры добра нясліся. Таксама клікалі мароз папробаваць куццю. Гэту куццю спраўлялі 6 студзеня.

Другую куццю спраўлялі 13–14 студзеня. Увечары прыбіралі ў хаце. Гатовілі ежу, але ўжо не посную. Другая куцця – багатая. Яна варылася на малаке. Спачатку маліліся Богу, а потым садзіліся есці. Пад абрус клалі сена, каб усё было.

Вечарам ішлі гуляць. Насілі звязду, пелі песні. Мужчыны дзелалі звязду і запальвалі яе, а пасля заходзілі ў хату, станавіліся вакол стала і пелі песню:

Дзіўная навіна ныне:
Дзева сына парадзіла,
Со всемі Марыя едзіна.
Не ў царскай палаце,
Не ў багатай хаце,
А ў верцепе между скацей,
І все будут знаці,
Я – дзева, чыстая Марыя,
Прэчыстая і раждала я яго,
Як нявеста, на руках
Качала, песенкі спявала,

Усемагушчым саздацелем
Сваім называла.
Галосіць дзева сыну:
– Будзь са мною побач,
Іба саздаў ты мяне,
Мацер на зямлі едзіну.
На цябе надзежу маю,
Дзе будзеш, вазьмі мяне з сабой.
Скажы, правасудный,
Дзе верныя будуць.
Да са мною, прад табою
Стануць тыя людзі,
Каб цябе маліці і цябе
Прасіці, даравaці ім
Царства, ва век векі жыці.

Пасля таго, як калядоўшчыкі праспявалі, ім давалі грошы, цукеркі – хто што мог. Таксама іх запрашалі за стол.

Таксама на другую куццю хадзілі варажыць. Звычайна варажылі дзяўчаты. Пад краваць клалі із спічак калодзеж і казалі: «Сужаны, ражаны, з кем век векаваці – прывядзі ка мне каня напаваці». І па таму, хто прыходзіў у сне, даведваліся, за каго пойдзеш замуж.

Таксама выходзілі на вуліцу і першага сустрэчнага пыталі імя. І па імені даведваліся аб імені свайго суджанага.

Бралі кольцы і клалі іх у талеркі з зярном. Потым бралі пеўня ці курку і станавілі к талеркам. З чые талеркі паспрабаваў зерне, то та дзяўчына выйдзе замуж, к чыёй не прытронуўся – тая не выйдзе.

Бралі ахапак дроў, пасля лічылі, калі парнае – будзеш у пары, а няпарнае – не.

Абдымалі забор, а потым лічылі колькасць абнятых дошак. Калі парнае – будзеш у пары, калі не, то не.

Брасалі сапог праз вароты. У якую сторану носам пакажа, у той бок дзяўчына выйдзе замуж.

Ложаць платкі ў начоўкі і падкідалі. Чый выпадзе першым, тая першая выйдзе замуж.

Пісалі на бумазе імя хлопцаў і клалі пад падушку. А ўраніцу, прачнуўшыся, выцягвалі адну і чыталі на ёй імя. Якое імя выцягнуў, так і будуць зваць твайго мужа.

Таксама, калі шчадравалі дзеці, то пелі і такую песню:

Покуль волікі напасаюцца,
Чорнае поле абсяваецца,
І туды ражок, і сюды ражок,
А ты, дзядзюхна, дай нам піражок.
Піражка мала, шчэ дай кусок сала.
Пажадаем: «Добры вечар!»
Скарэй дарыце, нас не барыце.
Кароткія кажушкі,
Памерзлі пятушкі.

На другі дзень пасля шчодрыкаў хадзілі засяваць. Пры гэтым пелі наступную песню:

Сею, сею, засяваю,
З Новым годам паздраўляю,
Многа шчасця вам жадаю,
Каб хлапчушкі хлопалі,
Каб нагамі топалі.

Пасля таго, як праспявалі, гаспадары іх частавалі.

Трэцяя куцця была 19 студзеня, калі адбывалася Водахрышчэнне. У гэты дзень свяціліваду, якой затым акраплялі хаты, жывёлу, птушак. Да Хрышчэння не хадзілі ў сваты.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Кашперка Надзеі Яфімаўны, 1930 г. н.,
Афанасенка Матроны Юр'еўны, 1931 г. н., 2000 г.

Когда я малая была, мама соблюдала все посты, праздники религиозные. Был колядный пост и с 6 по 7 января, с самого утра до появления первой звезды ничего не ели. Была постная кутья, и готовили постную кашу с мёдом или сахаром. Ставили эту кутью возле иконы на стол, на сено в горшочке. На сено ставили потому, что Иисус Христос родился в сарае, где были овцы, его положили в ясли на сено.

Постную кутью ели на ужин. Перед тем, как сесть за стол, открывали дверь и говорили: «Мороз, мороз, иди есть кутью нашу, а летом не ходи, не морозь посевы». И так повторяли три раза, после чего садились за стол, ели эту кашу, запивали компотом из сухих фруктов. Оставшуюся кашу отдавали утром скотине, которая находилась при доме.

На Коляды пели колядные песни, наряжались: кто наряжался в медведя, кто в козу. Выбирали парня, наряжали его в козу, одевали роги, шубу наизнанаку и ходили по домам. Подходя к дому хозяина, спрашивали разрешения петь. Если хозяин давал своё разрешение, пели такие песни:

Ластовочка прилетела,
Своего пана побужала:
– Устань, паничу,
Запали свечу
Красненькую, ясненькую.
Сама пчёлка – у медочку,
Сам хозяин – у дворочку,
Святый вечар.

Или такую пели песню:

Шчодрый вечар,
Дай вареник,
Ложачку кашки,
Наверх колбаски.

Люди к этому празднику били поросёнка, делали колбасы, пекли блины. Этим угощали калядуючых. А если хозяин не давал согласия, то и такую песню пели:

Шчодер-бодер
Кобылку украў,
Под печ схаваў.
Ноги торчали,
Собаки гирчали.

Потом все угощения складывались, и было гуляние до самого утра. Утром ходили опять по домам и носили в основном пшено и, заходя в дом, пшено это сыпали на пол и говорили: «Сею, сею, посеваю! С Новым годом поздравляю!»

Вечером на Коляды девчата гадали. Вот, например, так: выходили на улицу вечером, бросали сапог, и куда сапог носиком смотрит, в ту сторону девчина выйдет замуж.

Запісана ў г. Гомель
ад Юрасік Валянціны Савельеўны, 1946 г. н.
(раней пражывала ў в. Рудня-Каменева
(раней Папоўская Рудня) Лоеўскага р-на), 2002 г.

Як жа рыхтаваліся да Калядаў? Як і ва ўсіх вёсках, пачці адзінакава. Толькі ў нейкіх дзярэўнях яны атлічаліся. У нас было так. Каляды былі зімой, помню, як хлопцы ды дзеўкі (ды я шчэ сама) перадзяваліся ва ўсялякіх жывёл: у казу, у мядзведзя, сабаку, у чорта. Хадзілі ды шчадравалі па хатам, пелі песні калядныя. Гатовілі куццю – каша такая – з ячменю. Усяго іх тры было.

На Каляды, на Ражаство варажылі, што праўда, то праўда. Як мы варажылі? Памятаю, раз перад сном паставіла стакан вады, накрыла зверху палачкай. Гэта быў як быццам мост. Трэба было ўбачыць, хто перавядзець цябе цераз мост. А кролікі ўзялі і абярнулі стакан з вадой. Сніўся мне сон, як быццам вада разліта на траве пасля даждзя, і бачу, стаіць чалавек у шынэлі, без шапкі, высокі, слоўна салдат. Ён падаў мне руку, я і перайшла цераз мост. Началася вайна, нас асвабадзілі рускія. І прыйшоў да нас камендант, точна такі ж як ва сне. Судзьба ж, сушчая ж ёсць праўда. Яшчэ помню, як не хацела пераязджаць, падружылася з салдатам. А камендант кажа: «Ты падружылася, а я жанюсь».

Такжа, бывала, выйдзеш на Каляды ва двор, украдзеш першы блін у мамкі, які спякла, выйдзеш, возьмеш за пазуху блін. Ідзеш і, каго ўстрэціш першага, спытай, як завуць. Так і будуць званць твайго мужа. І, значыць, іду я з двара, а мне наўстрэчу брат мой Валодзя ідзе. Дык я пытаю: «Чаго ж ты ідзеш?» І верыце, дзяўчаты, мужа ж майго з Владзівастоку тожа Валодзяй звалі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Засяванне адбывалася адразу на другі дзень пасля шчадрухі. Засяваць людзі хадзілі як старыя, так і маладыя. Хадзілі да абеду. Для гэтага бралі з сабой жыта, пшаніцу, ячмень, грэчку. У каго што дома было, з тым і ішлі. Адчыніўшы дзверы ў хату, засявальнік казаў словы: «Сею, сею, пасяваю, з Новым годам паздраўляю. Усім людзям шчасця жадаю», – і рассыпаў па ўсіх комнатах жыта або ячмень, тое, з чым прыйшоў. Яго таксама гаспадар частаваў або даваў у кішэню цукеркі, семячкі, сала, каўбасу, грошы.

Была такая прыкмета: калі першы засявальнік прыйшоў хлопец або мужчына, то кароўка народзіць бычка, а калі ў хату прыйшла дзяўчына або жанчына, то кароўка народзіць цялічку.

Нельга было гэтае зерне змятаць да вечара. Трэба, каб яно паляжала. З гэтага часу людзі і лічылі, што настаў Новы год.

Заўсёды маладыя дзяўчаты гадалі на Ражаство Хрыстова. Цэлую нядзелю да Ражаства мялі хату. Смецце змяталі ў той вугал, дзе стаялі вілашнікі. Потым гэтае смецце дзяўчына, якая хацела пазнаць сваю судзьбу, змятала на савок і ў 12 гадзін ночы павінна была выйсці і выкінуць смецце за хвортку, прыгаворваючы словы: «А ты, куцця, рассыпайся, а дзе мой, адзывайся». У якую сторану смецце паляціць, адтуль трэба жаніха чакаць.

А Ў ПОЛІ, У ПОЛІ

А ў полі, у полі вішанька стаіць,
На той вішаньцы свечачка гарыць.
Іскарка ўпала, возерца растала.
А ў тым возерцы сам Бог крысціўся.
З Ісусам Хрыстом, Святым Ражаством!
Святое Ражаство нам радасць прынясло,
Святы вечар!

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Ганны Рыгораўны, 1930 г. н., 1993 г.

Куццю вараць. Е посная куцця, багатая ходзіць перад Новым годам. Шчадраваць пачці ўжэ не ходзяць. Перадзяюцца, з гармошкай ходзяць, з казой. Ну, чалавек перадзяецца, надзяе маску, платок длінны, чорны. Засяваць хадзілі ўвечары. Атмячалі Новы год мы з дзедам да з бабаю.

Гадалі на Каляды. Мамка пекла бліны, ну, я ж адзін, первы, украду – ды за пазуху і іду ўстрэціць каго-небудзь.

Выносяць мусар, і з якога боку сабака забрэша, то з тога боку мужык твой будзе.

Венікі перакідвалі чэраз вароты: у якую сторану ўкажа, адтуль і прыйдзе твой мужык.

І на свечкі гадаюць. У 12 часоў глядзяць у зеркала, каб убачыць сужанага.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

На Каляды гатуюцца. Абязацельна бабы палы памыюць, гарэлкі выганяць. Тры дні на Каляды не работаюць. Самі Каляды 7 января.

Абязацельна куццю ячменную вараць. Утрам паставяць на кут пад іконай, а вечарам уся сям'я садзіцца за стол, а патом бацька бярот кашу, і ўсе выходзяць у двор, а бацька і прыгаворвае: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці, а вясной тада не марозь палі».

Пад скацерць абязацельна сена падкладвалі. Хто і як гаварыл, зачэм, не знаю, але верылі, што будзет харошы ўраджай.

Каляды пройдуць, і на Крышчэнне тагда абязацельна хадзілі і каждаму на каліткі крэсцік ставяць.

На Каляды хадзілі цэлыя клубы ў госці то к таму, то к таму. Я, як помню, пашчытаў: 23 чалавекі ка мне хадзілі. Пелі, а помню, то ў казу пераадзяваюцца, а яна бекае, на пол падае і піць просіць. Глаўна, што не вады, а гарэлкі. І цыганкі маску адзявалі, бегалі вакруг, падманвалі, шчабяталі на вуха, гадалі на будушчае, і штоб паболей у карман лажылі, а то плоха ў гаспадарцы будзет.

Да, тагда маладыя гулялі ў фанты. Пасядуць кругом, насабіраюць фантаў і на кажды фант заданне. Што ззаду выцягнеш, то табе і дзелаць: табе пад стол залезці, табе з тае дзеўкай пацалавацца. Ай, так смешна было! Так разгульваліся, што ніхто не мог дадому выбрацца да звіднялку. А тагда спім цэлы дзень, аніякай работы.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2002 г.

Што ў нашага Івана
Вумная жэна,
Святы вечар!
Вумная жэна сенечкі мяла,
Сенечкі мяла,
Золата знайшла.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

ВІШАНЬКА

А ў полі, полі вішанька стаіць,
Святы вечар!
На той вішанькі свечачка гарыць.
Іскарка ўпала, свечачка заззяла,
Святы вечар!
А з тае свечачкі іскарка ўпала,
Азярцо заззяла.
А ў том азярцы сам Бог купаўся,
Сам Бог купаўся і ўмываўся.
А Прачыстая па беражку хадзіла,
З Богам гаварыла,
У Бога прасіла:
– Ой, Божа, Божа,
Хадзі ка мне вячэраць.
Засцілай сталы ўсе цясовыя,
Стаўляй кубачкі ў тры радочкі:
Перва кубачка – віно зеляно,
Друга кубачка – мядок саладок,
Трэйця кубачка – шчасце і доля.
Перва кубачка – для хазяіна,
Друга кубачка – шчасце для жаны,
Трэйця кубачка – шчасце для дзяцей.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Краўчанка Марыі Пятроўны, 1929 г. н., 2005 г.

Хочацца памыць у хаце і прыбраць, і смачна нагатовіць. Сена ў кут клалі, кусочык хлеба, соль на дабрабыт.

Было тры тры куцці. Першая куцця – багатая, 6 января. З ячменнай крупы варылі, таўклі ў ступе. Назаўтра бліны пяклі.

Другая – навагодняя куцця. Шчадравалі, кажухі навыварат адзявалі. Казу вадзілі. Насілі звязду, гаварылі: «Мароз, мароз! Ідзі куццю есці».

13 января ў госці хадзілі са сваімі гасцінцамі. У асноўным гатаваўся той, хто прыглашаў.

Трэцяя куцця перад Крышчэннем – галодная. Спявалі:

Молад Колечка коніка паіў,
З канём гаварыў.
Як прыехаў на мост – затрашчалі масты
З тонкае трасты,
Заззялі слупы ўсе залатыя,
Заззялі свечы васкавыя.

Шчадравалі ўзрослыя і дзеці па аддзельнасці. Заходзілі ў хату, жалалі дабра, здароўя.

Цераз зеркала варажылі. Паказуецца ў зеркале суджаны, а гавараць, што і плахое паказуецца.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

На Каляды шчадравалі. Кажухі надзявалі. Куцця была 3 разы. Першая – раждэственская. Варылі кашу ячную, посную, ставілі на стале. Сена бярэш трошкі, падлажуеш сена. Ясі куццю і курам даеш, штоб яічкі неслі. Сена етае бралі, калі курыца квокча, нада падлажыць ёй у кубло. Пад кароўку падкладвалі.

Наступная куцця была пад Новы год. Хадзілі, шчадравалі. Постувалі людзі, а патом усё елі. Дзеда Мароза звалі: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці». Далжна гаспадарка зваць да і гаспадар. Такая прыкмета была.

Дзеці хадзілі шчадраваць. Адзявалі ўсякую адзёжу, штоб смешныя былі. Пад акном гавораць: «Добры вечар!» Спяваюць песні хазяіну і хазяйке. Дарылі дзеньгі, калісь давалі хлеб, сала. Адзяваліся ў такую форму, як козка. Яна прыгала, танцавала.

Трэцяя куцця была на Крышчэнне. Вадзічку хадзілі свяціці ў цэркву. Вадзічку самі пілі 3 разочкі, усім давалі, штоб здароўе было. Пырскалі ў доме, ва дварэ, у сараі ад плахога, злога чалавека. Трэцяя куцця была багатая.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Звалі мароз: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці! Не марозь ні агурцоў, ні памідораў, ні пасеваў». На кожнаю куццю мароз звалі.

Тры куцці бывае: галодная, багатая, крэшчэнская.

На галодную куццю насілі зорку. На той дзень, калі пападала галодная куцця, нельзя сеяць нічога.

На Крэшчэнне мелам на хлеве, на варацях, на печы, ну, і кругом крэшчыкі малявалі. І казу вадзілі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Эта ўжэ хадзілі пасля Новага года. Хадзілі, песні пелі, расказывалі сцішкі. Заходзілі з адной хаты ў другую. Адны выйшлі, другія зайшлі. І тады ўжэ людзі закрываюцца, замыкаюцца, каб многа не даваць. Не дайце многа, а дай ты канфетак, дай ты чаго-небудзь прыгатоўленага. Дзеці насабіраюць, тады выйдуць ужо, пашчытаюць, ну, а ўзрослыя ўжэ тожа паходзяць, а тады ўжэ сабіраюцца ў каго-небудзь дома. На Каляды есць тры куцці. Я знаю, што перад Калядамі варылі кашу пярловую. На кут кладуць салфетачку і туды ставяць эту кашу. Патом можа эту кашу і скаціна есць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кукса Яўгеніі Паўлаўны, 1922 г. н., 2005 г.

Гадалі, як былі маладыя. На Каляды сабіраліся ў адной хаце. Рысуеш такі круг ды выбіраеш, каму які, пішам там па імені каждага. Тады пеўня паймаеш і пусціш у 12 часоў ночы: кучкі там насыпеш зярна, з якой певень возьме зярна, той першы замуж пойдзеш. А бувае так, што певень возьме да наробіць ў якую-небудзь кучу, астаецца тая маладая і не выходзіць замуж. Харашо гулялі тады ў старыну. Воск на воду растаплівалі. Тады самі разгадвалі фігуркі. На сцяне, на цяні ваўка так рукамі паказывалі, як бяжыць. А то замкі на калодзежах замыкалі: тады, хто прыйдзе ў сне размыкаць, таго і выберыш замуж.

Калі хадзілі калядаваць, то перадзяваліся ў мядзведзя, з гармошкай ідуць, бяруць звязду такую і ідуць па хатах. Ну, ужо прыйдуць, назбіраюць грошай, сабяруцца ды і п'юць тады.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Вілічэк Ефрасінні Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

КАЛЯДНЫЯ ПЕСНІ

А ў полі, у полі, а ў полі, у полі
Вішанька стаіць,
Святы вечар.
На той вішаньцы свечачка гарыць,
Святы вечар.
Іскарка ўпала, возера растала,
Святы вечар.
А ў том возеры сам Бог купаўся,
Святы вечар.

З Ісусам Хрыстом, з Святым Ражаством!
Святы вечар.
Пажадайце: «Добры вечар!»

Ой, дымы, дымы па-за лазамі,
Святы вечар.
Ой, то не дымы,
А хлопец ідзе,
Святы вечар.
Хлопец ідзе,
Коней вядзе,
Святы вечар.
На, табе, татка,
Гэтых конікаў,
Святы вечар.
А за гэтых конікаў
Аддайце Галечку,
Святы вечар.
Аддайце Галечку,
Красну панначку,
Святы вечар.
Пажадайце: «Добры вечар!»

Хваціць табе, бабка, па хаце хадзіць,
Хваціць табе, бабка,па хаце хадзіці,
Святы вечар.
Па хаце хадзіці, з Богам гаварыці,
Святы вечар.
Пара ж табе, бабка, нас падарыці,
Святы вечар.
Пажадайце: «Добры вечар!»

А ў нашага пана, а ў нашага пана
Вумная жана,
Святы вечар.
Бог табе даў вумную жану,
Святы вечар.
Вумная жана сенечкі мяла,
Святы вечар.
Бог табе даў вумную жану,
Святы вечар.
Сенечкі мяла, шыляжок нашла,
Святы вечар.
Бог табе даў вумную жану,
Святы вечар.
Да й закупіла ўсе тры гарада,
Святы вечар.
Бог табе даў вумную жану,
Пажадайце: «Добры вечар!»

Коляд, коляд, калядніца,
Добра з мёдам паляніца,
А без мёда не така,
Давай, цётка, пятака,
Не дасі пятака –
Вазьму вала за рага,
А кабылку за чупрынку,
Да й павяду на магілку.

Запісана ў г.п. Лоеў
ад Пікус Галіны Яўціхееўны, 1906 г. н., 1995 г.

У ноч перад Новым годам хлопцы надзяваюць на галаву «царскую шапку» і ходзяць з хаты ў хату, прыпяваючы:

Хрыстос нарадзіўся ў Віхліеме,
Прыйшло к яму тры цары,
Прынеслі тры дары:
Злата, піва і срабро.
Таго мы вам жадаем,
З Новым годам паздраўляем.

З хлопцамі хадзілі, пераадзеўшыся, маладзіца, цыганка, дзед, пеўчыя, гарманіст. Адна запявае «Вумную жану»:

Вумная жана сенечкі мяла,
Святы вечар.
Сенечкі мяла, золата знайшла,
Святы вечар.
Да купіла яна тры гарада,
Святы вечар.
Першы горад – слаўны Кіеў-град,
Другі горад – Гомель-град,
Святы вечар.
Трэці горад славен Лоевам,
Святы вечар.
Бог яму даў вумную жану ў яго даму,
Святы вечар.
А мы ж цябе, Сашачка, да не зневажаем,
Да з Новым годам паздраўляем.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.

Учора із вячора
У нас настала навіна –
Божа Маці Ісуса радзіла,
А парадзіўшы, у Ядрані скупавіла,
А скупаўшы, да ў шаўковае спавіла.
На заход сонца прыязджае тры цары
Да прывозяць Божай Маці тры дары.
Што едзін цар божым мірам міраваў,

А другі цар кветачкай надзяляў,
А што кветачка, то святое Ражаство,
То ўсяму свету весяленька і радасна.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канаплянік Л. С., 1940 г. н., 1999 г.

У гэты дзень нічога не рабілі. Тады хадзілі калядоўшчыкі. Уноч перад Новым годам хлопцы надзяваюць на галаву «царскую шапку», а з імі хадзілі пераадзетыя маладзіца, цыганка, дзед, гарманіст, пеўчыя. Усе яны жалалі ўсяго добрага гаспадарам у Новым годзе. Пасля пелі такія песні:

Вумная жана сенечкі мяла,
Святы вечар.
Сенечкі мяла, золата знайшла,
Святы вечар.
Да купіла яна 3 горада,
Святы вечар.
Першы горад – слаўны Кіеў-град,
Другі горад – Гомель-град,
Святы вечар.
Трэці горад славен Лоевам,
Святы вечар.
Бог яму даў вумную жану ў яго даму,
Святы вечар.
А мы ж цябе, Колечка, да не зневажаем,
Да з Новым годам паздраўляем!

А яшчэ дзеўкі варажылі. Яны абхоплівалі калы ў плоце і былі рады, калі іх аказвалася ў пару, значыць, будуць у пары ў гэтым годзе. А яшчэ кідалі сапог праз левае плячо. У якую сторану ўпаў сапог, адтуль і хлопец.

А яшчэ ў хату прыносілі петуха. Ставілі зеркала, ваду і зярно перад ім. Калі ён піў ваду – п'яніца будзе мужык, еў зярно – гаспадарлівы, сматрэў у зеркала – фанабэрысты.

А калі лажыліся спаць, то гадалі, каб прысніўся добры сон:

Андрэй первазванны,
Раскажы мне сон праваслаўны.
З кім мне жыць-пажываць,
Таго я хачу ў сне павідаць.

Нядзеля з панядзелкам,
Аўторак з серадою,
Чацвер з пятніцаю,
Субота – едзініца,
Што мне ў ва сне прывідзіцца?

А была яшчэ прымета, што калі многа зорак на небе, то будзе харошы ўраджай.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Елізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Гатовіліся багата да Каляд. Родзічы сабіраліся, спявалі песні. Крычалі дзеда Мароза, на куццю звалі.

Было 3 куцці. Багатая куцця 14 января. Сабіраліся радныя. Куццю гатовілі, сена на стол клалі. Я і цяпер еты абрад саблюдаю.

6–7 января была первая куцця, называлася нічэйная. 18 января – галодная куцця, была дажа без сахара, без нічаво.

Усе 3 куцці сена не знімалі са стала.

На багатую куццю было багата блюд: мясное і малочнае. На галодную куццю стравай была адна куцця, і кампот варылі к куцце. Яе варылі з ячной крупы, усе 3 куцці. Была і рысавая, але ў асноўным, пярловая (ячнёвая). Сена сахранялі. Калі заквахтала квочка (квактуха), етае сена падкладвалі пад яе.

На Каляды пераапраналіс, надзяваліс так, што і не ўгадвалі іх. Шчадравалі з 13 на 14 января. Прыходзяць і шчадруюць, такія песні красівыя пелі. Усё была вечарамі. Калядныя гульні былі. Радня сабіралася, дзеці прыходзілі к бацькам. А маладзёж аддзельна сабіралася: танцы, музыка была.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Вольгі Пракопаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Ого, на Каляды добра гулялі, елі добра, усё насмачнейшае шоб было: варэнікі варылі, пеклі калачы. Так і сустракалі Каляды, гулялі ў гульні, перадзяваліся, але тое была мужчынская работа, а бабы да дзеўкі ўжо песні пелі. Хадзілі па хатам, а як жа. То раней хадзілі толькі да таго, дзе свае, знакомыя. Гэта цяпер ідуць, дзе свет гарыць. Пелі песні, паказвалі прадстаўленні розныя. Хто ўгосціць калбасой, салам, а хто і чарку налье. Ну, вабшчэ, давалі, у каго што было. Гэта, значыць, калядавалі так. Мужчыны хадзілі з кабылай, з казой, бывала, зорку неслі. Да ў Бога прасілі:

Урадзі, Божа, жыта
Да на новае лета,
Штоб Машачка расла
Да жыта жала,
У снапочкі вязала.

Варылі жа кашу, на куццю саломку клалі. Гэта так рабілі, каб жыта добра расло, год багаты быў. Мароз звалі, у акно стукалі: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці!» І так тры разы гаварыць нада было.

Пелі песні калядныя:

А ў пана, у пана
Двор гароджаны вінаградам.
Прачыста Маці сына радзіла,
У рай узяла, Хрыстом назвала,
Святым Ражаством.

Ходзіць-паходзіць месяц па небу,
Святы вечар!
Ходзіць-папросіць зорак з сабой,
Святы вечар!
Пажадайце, мае зоркі,
Святы вечар!
Бога маліці і Бога прасіці,
Святы вечар!

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Хмелянок Марыі Яўсееўны, 1927 г. н., 2005 г.

Варылі куццю з пярловай крупы. Тады ставілі яе ў кут. Сена немножка туда, куццю эту становяць, і яна стаіць. Не пераадзявалі нікога.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

На Каляды варажылі: уносілі трэскі, заплюшчвалі вочы, неслі іх у хату, шчыталі: у пары ці не? Калі чотнае, то будзеш у пары.

Яшчэ на зеркала свечку палілі. Еслі пакажацца хто, той будзе сужаны, а калі страшнае пакажацца, то зеркала кідалі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

6 января – першая посная куцця. Рыхтавалі на вадзе. Нужна, штоб была пшанічная крупа.

А ўжэ на 13 января збіраліся на багатую куццю. На Шчадруху ўжэ тут расшчэдрываліс на ўсё: хто парасёнка зарэжа, хто што.

19 января – галодная куцця. Галодная, таму што, калі Ісус Хрыстос пайшоў па зямлі, дак ён спаткаўся з сваімі вучнямі. Патом в этат дзень едзят до асвешчэнія вады, а яно дзе-та ў час начынаецца. Ядзяць усё поснае, нічога не дабаўлялася.

Хадзілі калядаваць, пераапраналіся. У асноўным спявалі «Вумную жану» і хадзілі па знаёмым. Напрымер, заходзім (там Іван ілі Раман, як яго завуць) і пяем:

У нашага Івана вумная жэна,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Вумная жэна сенячкі мяла,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.

Сенячкі мяла – золата найшла,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Да купіла ж яна да 3 горада,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Первы горад славен, славен Кіевам,
Святы вечар.
Втары горад славен, славен Чарнігавам,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Трэці горад славен, славен Лоевам,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.

Я пераадзявалася ў цыгана. Казу не вадзілі. Звязду кагда-та даўно насілі. Яна сімвалізавала раждзеніе Ісуса Хрыста.

Потым ужэ ж пайшло Крышчэніе: вадзічку акрэшчвалі, красіва было.

На багатую куццю звалі мароза: «Мароз, мароз, хадзі кашу есці». А падходзіш к яблыне з тапорыкам да кажаш: «Не будзеш пладаносіць – ссяку цябе». Глядзіш, на следушчы год усё добра.

У нас пад куццю ложаць сена. Салому лажылі кагда-та, длінную такую, на ўвесь стол. Скацерцю закроют, ну і ставяць куццю. А патом хазяйка ўжо выцягвае, перакрэсціцца і выцягвае. Калі длінную выцяне – длінны лён будзе. Салома ляжала на стале, яе цягнулі на багатую куццю. Ну, хазяйка перакрэшчываецца і кажа: «Пашлі, Божа, лён высокі».

А ў нас ставілі куццю на сена, таму што Ісус Хрыстос радзіўся, в яслі палажыўся на сена. Вот мы і куццю ставім на сена.

Куццю ставілі ў кут на сена перад іконамі. А патом, када ўжэ ўсцілалі сенам стол на вячэру, дык ставілі на стол куццю. Усе па 3 ложкі куцці далжны былі ўзяць, таму што празнуем мы Ражджаство 3 дня, Пасху – 3 дня, Троіцу – 3 дня, крэсцімся-то мы трыма пальцамі.

Спачатку куццю пачыналі есць радзіцелі. Яны ўжо на Шчадруху збіраліся сваім сямействам кажды дома. А потым сабіраліся ўжо ў якую хату і дапазна гулялі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўна, 1931 г. н., 2005 г.

Усяк гулялі. І з падарожнікам варажылі, гаварылі: «Падарожнічак, падарожнічак! Ты стаіш ля дарогі, усё бачыш: і старога, і малога. Скажы імя сужанага майго».

Варылі на Каляды куццю, усё варылі. Потым накрывалі стол скацеркай, станавілі куццю і ўсю пішчу. А пад куццю сена лажылі. Уся маладзёж закрывала глаза і выцягвала сена. Значыць, длінная сена – длінны лён будзе, кароткае – кароткі лён.

Куццю гатавалі з ячменнай крупы. Абычна на Каляды пераапраналіся і ў казу, і цыганкамі былі. А я абычна цыганкай была.

Таксама на куццю запрашалі мароз. А як запрашалі, у акно стане ацец ілі кто і крычыць: «Мароз, мароз, прыходзь куццю есці!» А патом сабіралі яду і неслі ў рэку кідалі. А я ўжэ не знаю, чаго так рабілі. Мароза трэба было карміць, каб ён быў большы, штоб ураджай быў лучшы.

Казу на Каляды вадзілі, вядом яе з гармошкай, мужчына казу вёў з бубнам. Спявае, танцуе казёл, брыкаецца, па хаце бегае. А і звязда была абязацельна. Звязда сімвалізавала празнік.

Потым да каго-небудзь у хату заходзяць, паздраўляюць з Новым годам.

Казу вадзілі па ўсёй дзярэўні і калядавалі, а потым пакалядуюць дзяўчаты, а потым ужо встречаюць Новы год, гуляюць. А на каляду давалі (гэта ж пасля вайны) хлеб, там яшчэ чаго давалі: сала кусок, хто мяса дасць, хто сала дасць, хто калбасы дасць, хто капеек дасць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пожык Мар'і Сяргееўны, 1929 г. н., 2005 г.

Помню, хадзілі, пелі хлопцу адну песню, а дзеўкам – другую. Эта ў каго няма дзяцей, дак пелі:

А ў полі, у полі
Дрэвы стаялі.
Дрэвы стаялі,
Свечы гарэлі.

Іскра ўпала,
Рэчанька стала.
А ў той рэчанькі
Сам Бог купаўся.
Сам Бог купаўся,
З Ісусам Хрыстом.
З Ісусам Хрыстом,
Святым Ражаством.
Свята Ражаство
Радасць прынясло.

А ўжо вот як дзеўцы, дык пелі:

Маладая Марусенька
Пшанічку жала,
Святы вечар!
Пшанічку жала,
У снапкі вязала.
І прыйшло да яе
Тры сваты яе.
Не сватайце мяне
У чысценькім полі,
А сватайце мяне
У таткавым доме,
Так, каб за сталом,
З півам і з віном.
А матка ў парозе
Падаркі рэжэ,
Падаркі рэжэ.
А братка на дварэ
Коні сядлае,
Коні сядлае,
З двара выязджае.
Этым словам:
«Бывайце здаровы».

Было тры куцці. Варылі спачатку посную куццю. А ўжэ потым багатую гатавалі, дак кідалі сала, масла. А посную гатавалі на вадзе. Варылі з пярлоўкі. Накрывалі і прыходзілі госці свае ўжэ. Паміналі мёртвых. Пазбіраюцца свае, ужэ сядуць, павячэраюць. Казу вадзілі, як шчадруюць. Кажух выварачуюць і хадзілі. Прыдам пад акно і шчадравалі.

Варажылі на Каляды. Мы вочы пазаплюскваем, бяжым, сколькі схвацім тыну, глядзім: ці ў пары будзеш, ці не.

Скідалі з ног тапкі ці што і перакідалі цераз плот. Куды ўпадзе носам, у тую сторану пойдзеш замуж.

З блінамі бегалі пад хату. Хто скажа: «Заходзь у хату», – значыць, выйдзеш замуж, а еслі: «Не», дык будзеш сядзець.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Гадалі. Тухлі нада кідаць чэраз вароты.
Вынасіць нада смецце і слухаць, дзе сабака брэшыць, адтуль і суджаны.

Калісь я бегала з блінам. Мама іспекла першы блін, а я яго схапіла і пабегла. Іду і нікога не страчаю. Бегла, ідзе мужчына: «Дзядзечка, скажыце, як вас зваць?» Дык ён кажа: «Іван». Ды я і вышла замуж за Івана.

Кірпічыны кусочак, кусочак хлеба, гарошыну, а тады соль, ваду, а тады іголка на суровай ніткі – усё гэта ложаць на стале. Ложаць крэсцікам. А тады тая нітка будзе ўжэ ў старану круціць.

Прыйдзеш назаўтра ў хату і стой ля парога. Маўчаць, і ты стой. Скажа: «Праходзь», дзвярамі ляпнуў – значыць, пойдзеш замуж. А скажа: «Ідзі, садзіся», – то ўжэ ўсё, у гэтым годзе не пойдзеш замуж, то будзеш сядзець дома.

Кашу варылі. Абыкнавенную кашу із пярлоўкі звараць ды ўсё.

Было 3 куцці. Посная была куцця 6-га, а то такая багатая – ета перад шчадрухай, а тады трэцяя, гэта ўжэ тады хрэст пішуць на дзвярах у Ражаство.

На посную куццю ставілі картошачку посненькую, сена кусочак, гаршчочак кашы. Сена нада, каб на яго хлеб палажыць, соль паставіць, гэта карове аддавалі – гэта рабілі даўней.

Звалі мароз на Крышчэнне: «Мароз, мароз, ідзі к нам вячэраць. Летам не хадзі, грэчкі не марозь». І так 3 разы. Эта ўжэ на Крышчэнне.

Хадзілі шчадраваць. Пелі «Вумную жэну». Падходзяць звечара пад акно, дзе жылі мужык і жонка :

А ў нашага Івана была вумная жэна,
Вумная жэна сенечкі мела,
Сенечкі мела, шэлежок нашла.
За той шэлежок свечачку купіла,
Свечачку запаліла. Святы вечар!

А тады і зноў начынай.

Када-та хадзілі з казой, казу вадзілі: «Казе паскакаць, а нам паспяваць. Святы вечар».

Мы калісь на шчадруху (матка дае нам сумку) чэраз плячо яе павесім, як цяпер вешаюць еты рукзак. Хто што дае: хто кусочак сала, хто блінца, хто калбасы. А тады мы ўжо ідзём у адну хату і начынаем вячэраць. Ходзім можа да поўначы, можа, болей шчэ.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

На Каляды пяюць песні і пляшуць. На Каляды вадзілі казу, са звяздою хадзілі.

Дзелалі кашу-куццю. Калісь жа не так, як цяпер, а таўклі, ну, така ступа была. Пшана купіў, рыса, і каша гатова.

Першая куцця, наверна, жырна, а друга – такая абікнавенна, а паследняя – галодна. І на ту галодну куццю такая прыказка есць: нельзя нічога садзіць, не на саму куццю, а во быў вторнік, дык во запісала, памеціла сібе, значыць, у вторнік не будзе расці. А ў калхозе садзяць, не глядзяць на тое, што галодная ці якая другая.

На куццю мароза звалі: «Мароз, мароз, мароз! Ідзі куццю есці, а летам не прыходзь, не марозь, а цяпер прыходзь, еш з намі куццю, а летам шоб не прыходзіў».

Хадзілі, шчадравалі, пелі: «Шчодрык, Петрык, дайце варэнік...»

Я шчэ дзеўкай була, дык во гадалі.

Вот к забору падбягаеш, расстаўляеш рукі так, тады шчытаеш, колькі штакецін. Да пары – значыць, харашо, не да пары – не.

А патом шчэ бегалі: пад акно падбяжыш, як там знаеш такую сям'ю, шо дзяцей багата. Дзед да баба сядзяць ціха, а дзеці крычаць, да пачуеш пад акном: «Да сядзь, да пасядзі, не балуйсь!», – то будзеш сядзець і замуж не выйдзеш. Скажа: «Ідзі», – ну шо, дак пойдзеш замуж.

Так ужо на босу ногу нарошна абуешся. Ежалі цераз забор кідаеш, а хлопцы падсочаць ды ўкрадуць, тады ўжо босы дадому ідзеш.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Велігорскай Ганны Акімаўны, 1930 г. н.
(раней пражывала ў в. Вялікая Весь Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Каляды, бачыце, як былі. Каляды былі на Ражаство скрозь. А ў нас ужэ было на савецкі на Новы год. Усе дзеці ўжо на санках, там на канях па сялу ездзілі, па кожнай хаце, шо ў каго было, тым частавалі. Ну, і пляшку ж трэбавалі.

На сон закладала адна баба. Заклала мне на сон. Так мне і прыйшло. Я шла спаць, і сніцца мне такі парань, як у ваенным картузе, ваенна сарочка. Я ўстала і кажу: «Дурніца такая». Ну, аж я как-та была, не знаю, сколькі, і прыехаў мой хазяін, парэнь сей. І ён у хату зайшоў, я ж глянула – той хлопец, што сніўсь. Ужэ ён тут пабуў у мяне і жэніцца.

Куццю варылі. Було 3 куцці. Варылі із ячнай крупы куццю. Зварыцца тая куцця – нада рукавіцы. Як вынялі із печы, нада рукавіцы. Нада куццю браць рукавічкамі і несці да стала. Там на стале сянцо, і ўжэ куццю паложыш. А тады ўжэ ўвечары елі яе, і дзеўкі на куццю тады і варожаць.

Чобат перакідаюць чэраз вароты. Се ж галодная куцця, а се ж будзе шчодра куцця. Се ж первая куцця посная. Нада куццю вымаць із печы і несці рукавічкамі, а каб рукі не апекла, каб жа ўсё добра було, шоб куркі вяліся і ўсё шоб було.

Мароза клікалі. Як селі есці куццю, дак ужэ на паследнюю куццю гукаюць: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці, а летам не хадзі, не марозь ні кіяхоў, ні гуркоў, бо будзем жалезнымі пугамі біць».

Шчодрыкі былі, эта з 13 на 14. Дзеці хадзілі шчадраваць, песні пелі і хадзілі да каждага. Чэ ў каго було, давалі. А песні пелі не такія, як цяпер, а тады ж пелі так: то «Каліну», то «Маліну» – разныя. Якія хош, такія і пелі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Дзелалі куццю. Первую куццю дзелалі, калі таўклі гушчу. Первая – посная, а втарая – багатая.

Бліны пеклі, сала жарылі, кампот варылі, булкі пеклі.

А трэцяя – галодная. Да ужэ гушчу тожэ варылі, клалі на стол сена да вячэралі ўжэ. Кансерву куплялі, рыбу, гушчу палівалі вадой, сахарам саладзілі. Трэцяя куцця – сладкая.

Звалі мароза. Вот ужэ гушчу нясуць дык кажуць: «Кох, кох, кох. Кір-кір-кір. Кох-кох-кох». На кут ставяць.

КАЛЯДНЫЯ ПЕСНІ

Маладая Ніначка пшаніцу жала,
Святы вечар!
Пшанічку жала, у рукавец клала,
Святы вечар!
У рукаў сабрала, вяночак віла,
Святы вечар!
Віла вяночак, пайшла ў таночак,
Святы вечар!
Мы цябе, Нінка, не зневажаем,
Святы вечар!
І з Новым годам, Ісусам Хрыстом,
Святы вечар!
З Ісусам Хрыстом, святым Ражаством,
Святы вечар!
Святое Ражаство радасць прынясло,
Святы вечар!
Святы крэсціцель воду акрэсціў,
Святы вечар!
Воду акрэсціў, на весь свет пусціў,
Святы вечар!
Мы вас паздраўляем,
Штоб жылі вы багата,
Штоб усяго мелі,
І з Новым годам паздраўляем.

О-го-го, каза, о-го-го, сера,
Дзе рогі дзела? На соль праела.
Што, дарагая, наша залатая,
На печы авёс, а ў хляве парос.
На пашы жыта нагамі біта,
А ў тым жыце багатыя ліца,
Вывела дзеці, люба глядзеці.

Звязду рабілі, казу. Звязду зробяць хлопцы, носяць і пяюць. Казу прыбіраюць. Пяюць шчадроўныя песні. Шчадруюць, хто што дасць: сала, кусок хлеба, бліна, хто скварку. Тады два дні гуляем: п'ём, гуляем. Гарэлку давалі. Сена клалі пад куру.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Шчадравалі з 13 на 14. Варылі куццю з ячных круп, з пярлоўкі.

Першая куцця – калядная або посная. Другая – багатая, скаромная. Трэцяя – галодная або посная.

Бацька надзяваў рукавіцы і нёс гаршчочак кашы над галавой, ставіў на кут з сенам. Затым тое сена клалі ды на кубло. Як кура садзіцца, каб яечак было шмат.

Бацька стукаў у акно і зваў мароз: «Мароз, мароз, хадзем куццю есці».

І «Вішаньку» пелі:

У полі, полі вішанька стаіць,
Святы вечар!
На той вішаньцы свечачка гарыць,
Святы вечар!
З тое свечачкі іскарачка ўпала,
Святы вечар!
З тое іскарачкі рэчанька стала,
Святы вечар!
А ў той рэчаньцы сам Бог купаўся,
Святы вечар!
Сам Бог купаўся з Ісусам Хрыстом,
Светым Ражаством,
Святы вечар!
Святое Ражаство радасць прынясло,
Святы вечар!
Іван-крэсціцель воду акрасціў,
Святы вечар!
Воду акрасціў, на увесь свет пусціў,
Святы вечар, добры вечар!

Яшчэ во такую песню пелі, «Пава» называецца.

На той гары пава хадзіла,
Святы вечар!
Пава хадзіла, пер'я згубіла,
Святы вечар!
Ой, яна ішла, пер'я збірала,
Святы вечар!
Пер'я збірала, у рукаве склала,
Святы вечар!
З рукава сабрала, вяночкі спляла,
Святы вечар!

А я пела іншу «Паву», о то ў нас так пелі:

Калі пава хадзіла,
Пава хадзіла, пер'я згубіла,
А за ёю старуха – то шчадруха
З мужыком, беражком,
Святы вечар, святым вечарам!
Упрысядкі пайшоў,
Упрысядкі пайшоў,
Святы вечар,
Добры вечар вам у хату!

Запісана ў в. Трасцянец Лоеўскага р-на
ад Яшчанка Параскі Аляксандраўны, 1926 г. н.,
Выгляд Таццяны Максімаўны, 1925 г. н., 2005 г.

В ночь с 18 на 19 января мороза люди потчевали, ублажали, восхваляли его, чтобы он не заморозил ни худобу, ни людей с дороги, поэтому варилась кутья. Кутья варилась с изюмом, с чем есть. Варилось много блюд: баба говорила,

что двенадцать. А кутья выставлялась на окно. Потом брали кутью эту и шли к порогу или к окну, говорили: «Мороз, мороз, иди кутью есть! А не придёшь, мороз, будет горе тебе: кием ноги подсеку, пугой спину натолку!» Раза три так приговаривали. Потом эту кутью, которую приговаривали, всю съедали, сколько там есть. А та кутья до утра стояла, которая на окне.

Звезды на Каляды не было, была высокая такая палка, красивая, наверху наматывали яркий платок. Тупали с ней, спрашивали: «Есть кто дома?»

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Кудраўцовай Наталлі Данілаўны, 1972 г. н.

Шчадраваць хадзілі на стары Новы год у нас. Казу з сабой вадзілі, пелі песню:

А ў полі, у полі белая бяроза,
Святы вечар!
На той бярозе, залатое воблака.
Святы вечар!
Адкуль узялася дзеўка Іначка
Да пазбірала залатое голейка,
Пазбірала, вяночак віла,
Вяночак віла.
Звіўшы вяночак, пайшла ў таночак.

Тры куцці было: адна посная, другая багатая. Посная – эта перад Крашчэннем. А перад старым Новым годам – то багатая куцця. Мароз клікалі: «Мароз, мароз, ідзі кашу есці!»

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Рудак Ганны Пятроўны, 1923 г. н.,
Чаюк Любові Пятроўны, 1943 г. н.

Шчадраваць людзі прыходзілі перад старым Новым годам, 14 января. Вечарам ходзяць, песні пяюць:

Калядую, калядую,
Каўбасу чую.
Дай-ка шкуркі,
А то падохнуць твае куркі.

Вадзілі казу.

У нас было тры куцці, усе тры куцці варым. Ну, кажуць, гэту куццю трэба варыць і курам даваць, каб несліся. Клікалі мароз: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці. А ў Пятроўку не хадзі, не марозь пашні». Втарая ў нас называецца багатая, перад Новым годам. Увечары глядзіш, ці ё на небе зоры. Гаварылі, што тады грыбоў будзе багата. Еслі на первую куццю зоры, то первыя грыбы будуць. Еслі на втарую куццю неба такое хмарнае, цёмнае, не будзе грыбоў, а калі на трэцюю – не будзе ўсё лета грыбоў.

Первая куцця называлася Сачэльнік, втарая куцця – сытая, а трэцяя – посная, гэта перад Крашчэннем.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Нямлей Вольгі Іванаўны, 1928 г. н.

Зімой шчадраваць хадзілі. І я хадзіла. Я з сястрою цыганкай надзявалася і хадзіла. З гармошкай хадзілі, казу вадзілі.

Тры куцці е: сытая, багатая і посная. Куццю вару, сена кладу. Куццю ету абычна курам аддаюць, штоб куры неслісь. Мароз звалі: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, а ў Пятроўку не хадзі, а то будзем жалезнай пугай біць». Хадзілі раней і сварыліся людзі. Вароты трасуць: «Хай твае вароты трасуцца, а мае куры нясуцца».

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Кулага Валянціны Іосіфаўны, 1935 г. н.

ПРЫПЕЎКІ НА ШЧАДРУХУ

Шчэдрык-ведрык,
Дай варэнік.
А таго мала,
Дай кусочак сала,
А калі няма сала,
Дай грудачку кашкі,
А наверх каўбаскі.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Ганны Рыгораўны, 1930 г. н., 1993 г.

У полі вішня стаяла,
На той вішні свечанька гарэла.
Свечачка ўпала –
Возера там стала.
У тым возеры купаўся
Сам Ісус Хрыстос.
З Новым Рожаством!
Святы вечар.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н., 1993 г.

ШЧАДРОЎНАЯ ПЕСНЯ

А ў полі-полі вішня стаіць,
А ў полі-полі вішня стаіць.
На той вішаньцы свечачка гарыць.
Іскарка ўпала, возера там стала.
У тым возеры сам Бог купаўся,
Ісусам Хрыстом, Святым Ражаством называўся.
Святое Ражаство радасць прынясло.
Святое Васілле нас развесяліла,
А Іван Крэсціцель ваду пакрысціў.
Паздраўляем з Ражаством да з Новым годам.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Трасцян Еўдакіі Іванаўны, 1931 г. н., 1994 г.

Гаданні

Куру заносілі ў хату, насыпалі на пол зерня па горках: сколькі дзевак, столькі горак. Дзе кура дзеўбане, тая, чыя горка была, і першая выйдзе замуж.

У дванаццаць часоў ночы запальвалі свечку і падносілі к зеркалу. Абавязкова, каб не было ў хаце пастаронніх і не гарэў свет. Чакалі вобраз чаго-небудзь у зеркалі.

Ішлі ў дрывотню і бралі адным ахапкам дровы. Калі парнае чотнае, то ў гэты год будзеш у пары.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Глушчанка Еўдакіі Сяргееўны, 1942 г. н., 2005 г.

Пяклі бліны, клалі за пазуху на грудзі, выходзілі на вуліцу і пыталі імя першай сустрэўшайся жанчыны. Якое ў яе імя, так і будуць званаць свякруху тваю.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Грыб Ганны Якаўлеўны, 1923 г. н., 2005 г.

Кідаюць чэраз вароты сапог. Калі пераляціць, то выйдзеш замуж за таго чалавека, які жыве ў старане, куды паказвае носік сапага.

З закрытымі вачамі бягуць на лугавую дарогу і вырываюць ліст падарожніка. Хто первы вырве, той первы выйдзе замуж.

Кладуць сена на кут і стаўляюць кашу. Пякуць бліны, бяруць блін і бягуць пад вокны хат слухаць, што там кажуць. Калі гавораць пра грошы, то будзеш шчытаць грошы і мець у жыцці дзела з імі. Калі гавораць: «Ідзі», – то ў гэтым годзе выйдзеш замуж, калі «Стой», то не выйдзеш у гэтым годзе.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюля Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., 1993 г.

Перад заходам сонца на сена, на кут ставяць кашу і хлеб з соллю. Як сцямнее, кажуць: «Мароз, мароз, ідзі куццю есць, а ў Пятроўку не хадзі, майго пасева не марозь, бульбу, гуркі» і г. д.

Бралі кашу і падслухоўвалі ў суседзяў, што гавораць: калі кажуць пра ежу, то будзеш жыць добра і багата, калі сварка ў хаце, то гэта вельмі дрэнна.

Замыкалі калодзеж ключом і клалі пад падушкі, каб хто-небудзь прысніўся.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Карнавушанка Хрысціны Анісімаўны, 1904 г. н., 1995 г.

Выходзіш у двор і кідаеш чэраз калітку бацінкі: у каго ў якую старану ўпадзёт – у таго адтуль будзет і жаніх (нявеста).

Абнімалі забор: у каго парная колькасць штакет, той у етым гаду будзет у пары.

Ноччу ішлі ад калодзежа, набіралі ваду, чэрпалі столькі, колькі зачэрпнеш вады. Калі ішлі дамой, то не азіраліся. Дома этай вадой умываліся, ліцо выціраць не нада. Гэта рабілася для таго, каб убачыць свайго сужанага.

Цягнулі ахапку дроў: як выцягнеш парную, то будзеш у гэтым годзе ў пары, а як не – так не.

Цягнулі браўно. Калі яно было гладкае, без сучкоў, то і муж будзе добры, а калі сучкаватае, то і муж з дрэнным характарам.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Гэрманенка Фаціны Раманаўны, 1935 г. н., 2005 г.

На Ражджаство ўсе маладыя дзяўчаты гадалі. Гадалі на галодную куццю. Варыць маці куццю, а дзяўчына бярэ зверху жменю гэтай кашы і ідзе ў 12 часоў ночы на двор, сыпе яе і прыгаварвае: «А ты, куцця, рассыпайся, а дзе мой – абзывайся». Потым стаіць і слухае, у якім канцы хутара сабака забрахала, там і пойдзе замуж.

На Шчадруху пячэ маці бліны, а дачка бярэ першы блін і бяжыць на двор. Каго першага яна сустрэне, той і будзе яе парай, або імя гэтага чалавека будзе іменем чалавека, за якога пойдзе гэта дзяўчына.

У 12 гадзін беглі па воду з 2-мя вёдрамі. Калі ідзеш па воду, то нельга абарачвацца назад. Потым зачэрпывалі вёдрамі ў калодцы воду і беглі дадому, не абарачваючыся. Прыносілі гэтую воду дадому, ставілі воду побач з ложкам і сашчапалі іх замком і казалі: «Суджаны, раджаны, хто мне назначаны, прыйдзі да мяне вады напіцца». Лажыцца спаць і ключ кладзе пад галаву. Павінен прысніцца ёй чалавек.

А Ў ПОЛІ, У ПОЛІ

А ў полі, у полі
Вішанька стаіць,
На той вішаньцы
Свечачка гарыць.
Іскарка ўпала,
Возера растала.
А ў том возерцы
Сам Бог крэсціўся
З Ісусам Хрыстом
Святым Ражджаством.
Святое Ражджаство
Нам радасць прынясло,
Святое Васілія
Нас узвесяліла.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Максіменка Анісіі Цімафееўны, 1911 г. н.
(раней пражывала ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Гадание о доле

Находишь камушек и подходишь к колодцу. Кидаешь его в колодец и смотришь, какой булык получается: если он слабый, то у тебя спокойная жизнь, если сильнее – то у тебя неспокойная жизнь будет.

Дивчата подходили до забора, садились спиной и обхватывали его. Личили затем, сколько колышков они обхватили. Личили так: вдовец, старец, молодец. И вот кого уж назовешь, тот твоим муженьком будет. А было еще такое гадание: тоже садишься спиной к забору, обхватываешь руками его, потом считали колышки: коли четное – тады будешь в паре в этом году, если нечетное – то в этот год будешь одна.

Брали петуха и курицу с чужого курятника. Ложили зерно, воду и зеркало. Ну, и курицу ложили. Пускали петуха, девчина пускала петуха. Смотрели, к чему он быстрее подбежит: если к зерну – то муж будет богатый, если к зеркалу – красивый, к воде – будет пьяница, если к курице – будет гулящий.

Девушку заводили в комнату тёмную, завязывали ей глаза, крутили ее и разлаживали по углам тоже зеркало, бутылку, юбку и деньги. В какой она угол зашла, такой и муж будет: где зеркало – красивый, бутылка – пьяница, юбка – гулящий, деньги – богатый.

Замыкали колодец. Замок клали на вугал зруба. Ключ ложили под подушку. Кто первый придет отмыкать, тот в этом году замуж пойдет.

Так ворожила моя соседка. В двенадцать часов ночи пошла, поставила зеркало в помещении, где никого няма. И сказали: «Гляди, покуль убачишь его». «Ну, я, – кажа, – и гляжу. Аж идет. Ростом невяликий и с портхвелем. Портхвель я беру его, и он иде. Я сейчас же зеркало кинула, чтоб меня ужо там не ударили». Так и вышло. Пошла она замуж из Городка там за начальника. Он с портхвелем всю жизнь проходил.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пікас Варвары Пятроўны, 1927 г. н., 2005 г.

Калісь грэбяшкі палалі. Кладом грэбяшкі ў начовачку і палаем іх, і падкідваем. Чый наперад упадзе, тая наперад замуж выйдзе. Ён павін быў упасць назем.

Выбягалі, смецце выносілі. Вымяцеш і нясеш, і нясом на растанкі смецце, і гаворым: «Смецце, сыпся, рассыпайся, а дзе мой, дык абзывайся». З якой стараны сабака крыкне, дык у тую старану замуж пойдзеш.

Чобаты перакідвалі чэраз забор. Куды наском упадзе – туды замуж пойдзеш.

Пеклі бліны на багатую куццю ўвечары. І вот бярэ ўжэ дзеўка блін і на вуліцу бяжыць. Каго стрэне, так і будуць зваць сужанага.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Максіменка Варвары Анатольеўны, 1925 г. н., 2005 г.

Гадалі на Каляды. Перакідалі боты, каторая ўжэ далей кіне. Уперад – пойдзе замуж.

Дровы насілі. Ну, пойдзуць у сарай, набяруць абярэмак дроў, прынясуць у хату і шчытаюць. Еслі чотнае – замуж пойдзе, не – дык не.

Када первы блін бярэш, ідзеш на вуліцу, і каго встрэціш, пытаеш імя. То гэта сужаны.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

На Новы год ці на Каляды бярэш бацінак, становішся ў двары ля забору дык і кідаеш яго цераз забор. У якую старану павярнецца, там і жыве твой муж.

Забор абнімалі. Калі парнае чысло колікаў – будзеш у пары, няпарнае – адзін увесь год будзеш.

У міску ці сіта лажылі платочкі і падкідалі сіта высока, чый першы выпадзіць – хуччэй замуж выйдзе.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Кацярыны Васільеўны, 1920 г. н., 2005 г.

КАЛЯДНАЯ ПЕСНЯ

А Калядачкі, а вярніцеся,
А Калядачкі, а вярніцеся,
Ой, люлі-люлі, а вярніцеся.
У майго татулькі найміцеся,
Ой, люлі-люлі, найміцеся.
У майго татулькі трое варот,
Ой, люлі-люлі, трое варот
І ўсе на агарод.
У першых варотах – ясен месячык,
Ой, люлі-люлі, ясен месячык.
У другіх варотах – ярка сонейка,
Ой, люлі-люлі, ярка сонейка.
У трэціх варотах – дробныя зорачкі,
Ой, люлі-люлі, дробныя зорачкі.
Ясен месячык – то татулька мой,
Ой, люлі-люлі, то татулька мой.
Ярка сонейка – то матулька мая,
Ой, люлі-люлі, то матулька мая.
Дробныя зорачкі – браты-сёстрачкі,
Ой, люлі-люлі, браты-сёстрачкі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Насон Валянціны Міхайлаўны, 1956 г. н., 1994 г.

Варожбы на Каляды

Вочы заплюснуць да абхвацяць забор. Шчытаем палкі: ці да пары? Еслі адна лішняя, то той год замуж не будзеш.

Як пячэ матка бліны, то бярэш блін і кідаеш сабаку: чый блін першы схваце, тая і замуж пойдзе.

У калодзеж кідалі сахар: калі спакойна тоне, то муж п'яніца, а калі бурбалкамі, то наадварот.

Набярэш у кружку вады, з палачак мосцік робіш. Кажуць: «Сасніся мне той, хто будзе чэраз мосцік пераводзіць».

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

ВАРАЖБА

Андрэй Первазванны,
Раскажы мне сон праваслаўны,
З кім мне жыць-пажываць,
Таго я хачу ў сне павідаць.
Нядзеля з панядзелкам,
Аўторак з серадою,
А чацвер з пятніцаю,
Субота – адзініца,
Што мне ў ва сне прывідзіцца?

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.

ШЧАДРОЎНАЯ ПЕСНЯ

Шчодры вечар, добры вечар.
Шчодры вечар, добры вечар,
Ці дома, сам пан-гаспадар?
Дзе ён сядзіць?
– На покуце.
– Што ён дзержыць?
– Калішачку.
– Што ў калішачцы?
– Шыляжочкі.
– А нам, дзядзечка, па шыляжочку дай.
Добры вечар, шчодры вечар, святы вечар.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Анісавец Галіны Іванаўны, 1925 г. н., 1994 г.

ОЙ, КРАСНА, КРАСНА Ў ЛУЗЕ КАЛІНА

Ой, красна, красна ў лузе каліна,
Святы вечар!
Ой, красней таго Леначка ў таткі,
Святы вечар!
Леначка ў таткі подвар хадзіла,
Святы вечар!
Подвар хадзіла – увесь двор красіла,
Святы вечар!
У сені ўвайшла – сені заззялі,
Святы вечар!
У хату ўвайшла – паны стаялі,
Святы вечар!
Паны стаялі, шапкі знімалі,
Святы вечар!
Шапкі знімалі, у яе пыталі,
Святы вечар!
– Ці ты царэўна, ці каралеўна?
– Святы вечар!

– Я не царэўна, не каралеўна,
Святы вечар!
Таткава дочка, як вішанечка,
Святы вечар!
Таткава дочка, як ягадачка,
Святы вечар!

ОЙ, ДЫМЫ, ДЫМЫ ПА-ЗА ЛОЗАМІ

Ой, дымы, дымы па-за лозамі,
Святы вечар!
Ой, то не дымы, а Андрэйка ідзе,
Святы вечар!
Андрэйка ідзе, сто каней вядзе,
Святы вечар!
Сто каней вядзе, нявехну вязе,
Святы вечар!
На табе, татка сто коней у двор,
Святы вечар!
На табе, мамка, нявехну за стол,
Святы вечар!
Як сама знаеш, так і навучай,
Святы вечар!
Штоб цыд цадзіла, і не прасіла,
Святы вечар!
Штоб тонка прала і не варвала,
Святы вечар!
Штоб кросны ткала і не ўважкала,
Святы вечар!

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Максіменка Анісіі Цімафееўны, 1911 г. н.
(раней пражывала ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Молодые девки вечером перед сном на Коляды ближе к полуночи под подушку ложили гребешок, которым каждый день расчёсываются. Так гадали незамужние девушки. Ложили гребешок и приговаривали: «Суженый, ряженый, приди и расчеши меня». И верили в то, что он обязательно придет. После того, как слова будут сказаны, девушка не должна сказать ни слова, а обязательно сразу же заснуть, не пуская в голову лишние мысли.

Это гадание было у нас одним из самых известных. Ночью девушки выходили во двор, становились спиной к забору, закрывали глаза, брали в руки сапог и на счет «Один, два, три, милый, милый, выходи!» бросали через левое плечо через забор этот сапог. Потом немедля открывали забор, выскакивали на дорогу и смотрели, в какую сторону показывает носик сапога. И верилось в то, что из той стороны и покажется суженый. Потом брали сапог, несли его в дом, вымывали и ставили в угол.

На Коляды в одном доме собирались незамужние девчины. Брали зерно, каждая па жменьцы. Садилися кругом и возле себя насыпали кучки зерна. На середину круга пускали петуха. К чыей кучке он подойдет первый и у кого съест зернышко, та и выйдет в этом году замуж.

Еще и такое гадание было. После полуночи в комнате ставили тазик, напалову наполненный водой. Чуть-чуть подмочив края тазика, вешали на них листочки,

на которых писали имена хлопцев. Запаливали свечку, ставили ее на половинку яичной скорлупы или грецкого ореха. Ставили на воду посреди тазика. И, не допуская ветра в комнату (закрывались окна, двери), молча ждали, пока свечка приплывет к одной из бумажек и подпалит ее. Когда это случится, верилось в то, что суженого будут звать так, как написано на подпаленной бумажке. Остальные бумажки рвались и кидались в печь. На рассвете пепел от бумажек собирали в баночку и кидали в реку.

Зимой незамужние девушки с вечера в три збана наливали до верха воды. Ставили на ночь в сарай. Утром на рассвете забирали збаны етыя и смотрели, как мороз их приморозил. Если в одной из банок лед дал трещину, значит в семье случится несчастье. Но еще это гадание делали и незамужние. А если лед гладкий, прозрачный, значит, и в семейных делах будет все хорошо.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бойдак Лізаветы Іванаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Ставілі скавараду пад краваць маткі і гаварылі: «Сужаны мой, прыдзі да цёшчы бліны есці». Утрам спрашвалі матку, хто ёй сніўся.

З'есці нанач многа солі. Када лажышся спаць, гаворыш: «Суджаны мой, прынясі дзявіцы вадзіцы напіцца».

Лажыць пад падушку грэбень і гаварыць нанач: «Суджаны мой, прыдзі, мяне расчашы».

На Ражаство бяруць дзеўкі петуха, пшано і кружку з вадой. Да чаго пятух падойдзе, то ёй і будзе. Када да пшана, то ўсю жысць грошы вадзіцца будуць, да вады – муж чарку любіць будзе, то есць – п'яніца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

Мама нам пекла бліны на шчадруху, і мы з эцімі блінамі выскаківалі на вуліцу. Як встрэціш мужыка, то і прыцэпішся: «Скажы, як цябе завуць».

Выскачыш, закроеш глаза, дзверы толькі адкроеш, не бачыш, куды ляціш і абхваціш дровы. Інцярэсна было.

Сапагі кідалі чэраз забор. Бросіш і прыслухоўваешся: у якой старане сабака загаўкае, у ту сторану пойдзеш замуж.

Я баялась гадаць на свечках у бане. Эта нада абручальнае кальцо, каторае было пад венчаніем і страсная свечка.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Нікіцічны, 1931 г. н., 2005 г.

Мне расказвала бабуля, яна дзелала мост 18 января – эта перад Крышчэннем. Прышла з работы, святой вады наліла туда, ну, пад краваць паставіла. Здзелала такія дзве, як мосцік. Ну, мне нічо не прыснілась. Да і ўсё.

Вот так тапаць брасалі за калітку.

Маёй бабулі прыснілась, што едзе конніца какая-та і ўсё. І точна, гаварыт, ехала конніца, і ў неё был там сужаны. Он её падхваціл і забрал. І пажыніліся. Эта так мая бабуля пагадала.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

На печы прыпечак такі шырокі, паваражыла тамака, што ўжэ казалі. Дак варажыла, легла спаць, а ано мне нічога не саснілась.

Кажуць, первы блін з'еш – скарэй замуж пойдзеш. Гэта на багатую куццю.

Хадзілі шчадраваць. Песні спявалі.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Падкідаюць сапог. Там, дзе сабака загаўкае, туды замуж пойдзеш.

Стул паставіш, зеркала. У дванаццаць часоў будзеш глядзець: хто ў зеркала прыйдзе, які хлопец-та твой будзе.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Рудак Ганны Пятроўны, 1923 г. н.,
Чаюк Любові Пятроўны, 1943 г. н.

Бахілы за вароты шыбалі на багатую куццю. У які бок нос пакажа – туды замуж пойдзеш.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Нямлей Вольгі Іванаўны, 1928 г. н.

Дзеўкі, як замуж хочуць, дык бралі первы блін, выходзілі на вуліцу. Адкуль ідзе, дык чалавек будзе з таго боку.

Абдымалі шчыкет і шчыталі: да пары ці не.

Чэраз плячо кідалі абутак: валенак там ці што. Ну, куда кінулі, а ў тую сторану сабака загаўкае, у ту сторану замуж пойдзе. На Каляды гадалі.

Запісана ў в. Чаплін Лоеўскага р-на
ад Маджары Васіля Фёдаравіча, 1935 г. н.

Цераз вароты кідалі тухлі там і сапагі: куды павернецца, туды і замуж пойдзеш.

На ваду гадалі. Паставіш стакан вады, а тады ўжо ў стакан кідаеш ці манету, ці хлеба скруцяць. Куды ўжо павернецца, туды судзьба твая пойдзе.

Запісана ў в. Чаплін Лоеўскага р-на
ад Грыцковай Эмілії Яўхімаўны, 1933 г. н.

Ражаство

На Ражаство пелі:

Ішла звязда чудна
З вастока на палудна,
Над вярцепам сіяла,
Хрыста-цара яўляла.
Над вярцепам сіяла,
Хрыста-цара яўляла.

Дзе Хрыстос радзіўся,
Там і Дзева апладзіла,
Там чаламі з пеленамі
Прэд Богам явіўся.
Там чаламі з пеленамі
Прэд Богам явіўся.

Просім цебе, цару,
Прымі нашу ўхвалу.
Пашлі лёсу шчаслівага
Етаму гаспадару.
Пашлі лёсу шчаслівага
Етаму гаспадару.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Пруднік Таццяны Міхееўны, 1918 г. н., 2001 г.

РАЖЭСТВЕНСКІЯ ПЕСНІ

Хадзіў-пахадзіў месяц па небу,
Ой, зваў-перазваў зоры з сабою,
Хадзіце, зоры, услед за мною,
Услед за мною Бога шукаці,
Дай нашлі Бога за столікам,
Перад ім стаіць да 3 кубачкі:
Перва кубачка – мядок саладок,
Друга кубачка – віно зеляно,
Трэця кубачка – піва кудрава.
Мядок саладок самаму Богу,
Віно зеляно – то дзецям яго,
Піва кудрава – то жане яго.

Ой, у полі вішанька стаіці,
На той вішаньцы свечачка гарыці.
Іскарка ўпала – возера стала,
А ў тым возеры сам Бог купаўся,
Ісусам Хрыстом, святым Ражаством,
Свято Ражаство нам радасці прынясло.

Святое Васіля развесяліла,
А Іван-крэсціцель ваду пакрэсціў,
На весь свет пусціў,
Пажадай: «Добры вечар!»

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Анікеенка Кацярыны Пятроўны, 1933 г. н., 1998 г.

У Ражаство 13–14 января гадалі па-рознаму. Абхватвалі забор: калі парнае чысло штакецін, дак і буду ў парэ.

Тухель кідала цераз забор. А хлопцы возьмуць дый украдуць.

Матка пячэ бліны, ухопіш первы – і за пазуху. Выйдзеш на вуліцу, а няма нікога, і тут бачу, дзядзька ідзе. Я ў яго пытаю: «Дзядзька, як вас завуць?» – «Іван». Значыць, выйдзеш за Івана.

Калі смецце высыпала, слухала, з якой стараны сабака забрэша, з той стараны і жаніх будзе.

Набярэш вады ды паставіш пад пол і паложыш некалькі палачак. Хто цябе цераз мост правядзе, той і мужам будзе.

Шапку лажылі пад галаву бацькіну. І тады прысніцца муж твой.

З пярловай крупы куццю варылі. Сена лажылі, на сена трэба хлеба палажыць, патом куццю, кампот варылі. Было тры куцці: 6–7 января – посная куцця, 13–14 января – багатая куцця, 18–19 января – посная куцця. Паселі ўсе за стол, а дзед гаворыць: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці». Тры разы.

Сколькі дзвярэй ёсць, столькі ён крэсцікаў мелам малюе, а мы – пад пол з курамі і гаварылі: «А вы, куры, не спіце ды яечкі нясіце».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н., 2005 г.

А Ў ПОЛІ, У ПОЛІ

А ў полі, у полі
Вішанька стаіць.
На той вішаньцы
Свечачка гарыць.
Іскарка ўпала,
Возера растала.
Ісусам Хрыстом,
Святым Ражаством.
Свято Васілле
Развяселіла.
Свято Ражаство
Радасць прынясло.
Пажадайце: «Добры вечар».

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Прудзік Таццяны Міхееўны, 1918 г. н., 2001 г.

Хрышчэнне

Хрышчэнне, канешне, атмячалі. Раньшэ воду хрысцілі, хадзілі на рэку, бралі расол з буракоў і аблівалі хрэст, які высякалі з лёду і воду свяцілі. Ету воду людзі

дамой бралі. А цяпер ужэ ў цэркві воду свецяць. Раньшэ ніколі ў цэркаў не хадзілі. На рэчку ішлі, высякалі хрэст, ставілі яго, вадой аблівалі, самі аблівaліся.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Прасднік Хрышчэння або Богаяўлення праздноуюць 19 января. Ісус захацеў прыняць хрышчэнне не для свайго ачышчэння, а каб стаць прымерам для людзей.

Калі Хрыстос быў хрышчоны ў раке, то на яго зляцеў Божы Дух у выглядзе голубя, і пачуўся голас Бога Айца. Так была адкрыта на зямлі таемнасць святой Троіцы: Бог паказаў сябе ў трох іпастасях.

Перад прыходам праздніка людзі саблюдаюць пост. Яны не ядзяць да таго, пакуль не асвецяць воду ў храмах, рэках, калодцах. Для таго, каб асвяціць воду, ідзе Крэсны ход – таржэственнае шэсце з крэстом, калі званяць калакалы і пяюць. Свячоную воду яшчэ называлі крашчэнскай, і да яе людзі адносіліся з уважэннем. Яе давалі піць дзецям, умывалісь, крапілі жылішча, хлявы. Вада гэта шчыталась цэлебнай.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Лізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Каляды ў нас называюць хто як. Хто Калядкамі, а хто Ражаством Хрыстовым. Рыхтаваліся да Каляд так. Уранні, калі прыпораліся са скацінай, прыбіралі ўсю хату, каб чыста было. Мыліся ўсе ў сям'і. ну, а як усё етае зробім, тады ўжо і вячэру трэба было гатаваць. Усе вельмі ждалі Калядкі. Дзеці дык асобенна. Быў жа перад етым пост вялікі Піліпаўскі, а на Калядкі ўжо елі ўсё што было. На празнік, канешна ж, варылі і куццю. Яе варылі з пярловых круп. Таксама рабілі аўсяны кісель, кампот з яблыкаў, грыбы сушаныя варылі з бульбай ці ў супу. А вечарам, па ўзыходзі зорак на небе, ужо садзіліся вячэраць. Звалі абязацельна на етую вячэру і дзядоў, якія памерлі. А нанач яду, што заставалася, астаўлялі на стале, каб дзяды елі. Сена лажылі пад скацерку на стол. Яго лажылі, што ведалі, што Ісус Хрыстос нарадзіўся ж на сене, яго палажылі туды. А ўжо пасля етае сена аддавалі скаціне: каровам, авечкам, козам, калі тыя былі. Яшчэ песню такую спявалі ў еты дзень:

Ішла звязда чудна
З вастока на поўдзень.
Над вярцепам сіяла,
Хрыста-цара ўслаўляла.
Новая радасць стала,
Як на небе хвала.
Над вярцепам звязда
Ясна свяціла, вассіяла.
Дзе Хрыстос радзіўся,
Бог да дзевы ваплаціўся.
Там чалавек з пелянамі
Перад Богам явіўся.
Перад божым дзіцяткам
Пастушка з ягняткам

На калені ўпала,
Хрыста праслаўляла.
Просім цябе, цару,
Прасім нашу хвалу,
Пашлі ў гадах
Шчасце гаспадару!

Яшчэ верылі, што калі на Калядкі дзень будзе пагодлівы, то ўраджаю ў гэты год не будзе, а калі снег будзя ісці, то хлеба багата будзя. Калі вечарам зорак на небе багата, то грыбоў будзе багата ў етым годзе.

Калі шчадравалі, хадзілі хто як. Адныe, больш старэйшыя, перадзяваліся, каб не пазналі. Адзявалі кажухі навыварат, платкамі пазакручуюцца, сажай вочы пазамазуюць. А малыя дзеці хадзілі так. Яшчэ «казу» з сабой ужо старэйшыя дзеці цягалі. Ей кажух вывернуты надзявалі, рабілі з паперы, а калі былі якія рогі, дык тыя прывязвалі на галаву, а было, што з паперы рабілі маскі. Калі заходзілі ў хату, то прасілі дазволу. Такую песню спявалі:

З Новым годам, будзьце здаровы!
Жадаем дабра ў новым гаду
Таму, хто жыве ў гэтым даму!
Печь ці не печь?

Хазяіны ўпускалі ў хату. Ну, а тыя спявалі песні. «Казу» ў нас рэдка хто калі вадзіў, ета гаварылі ўсё ў Лоеве яе вадзілі. Песню, якую пелі пра казу калісьці чула:

– О-го-го, каза,
О-го-го, шэрая,
Дзе рогі дзела?
– На соль праела.
А соль дарагая,
А мера скупая.
– О-го-го, каза,
О-го-го, шэрая,
Дзе каза нагою –
Там жыта капою,
Дзе каза скок –
Там жыта сем коп.
Дзе каза праходзіць –
Там жыта родзіць.

Каза танцавала, як пелі ўсе. А тады падала, як яе паб'е павадыр. Пелі песню зноў, каб тая ўстала, ажывілася. І каза ўставала. Яшчэ пелі песні. А затым хазяіны давалі ім зернаты, цукеркі, аладкі, калі былі грошы, то і грошы давалі. Яшчэ казалі гаспадары, калі госці выходзілі: «Дай, Божа, даждаці і на тое лета спяваці». Ета так рабілі ў гэты вечар старэйшыя дзеці, а калі ўжо і дарослыя. А дзеці меншыя хадзілі, то спявалі розныя песні шчадроўныя:

Шчодрыкі, шчодрыкі, пабіліся вёдрыкі,
А ты, бабка, не зявай,
Ды па рубліку давай.

Хадзіў, пахадзіў месяц па нябу,
Святы вечар!
Зваў, перазваў зорак з сабою,

Святы вечар!
Хадзіце, зоркі, са мною Бога шукаці,
Святы вечар!
Бога шукаці, Ісуса Хрыста, святое Ражаство,
Святы вечар!
Святое Ражаство нам радасць прынясло,
Святы вечар!
Пажадайце: «Добры вечар»
Ды і нам дайце.

Яшчэ пелі такую песню:

А ў полі, полі вішанька стаяла,
А ў той вішаньцы свечачка гарэла,
Іскарка ўпала – возера растала.
А ў том возеры сам Бог купаўся.
Прыйшоў Іван Хрысціцель,
Увесь свет пахрысціў
Ды на белы свет пусціў.
Пажадайце: «Добры вечар»!

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
А ты, бабка, не зявай,
Ды канфеткі нам давай.

Шчадраваць хадзілі ўвечары, а на наступны дзень уранні ўжэ ішлі засяваць. Засявалі звычайна дзеці. Як засявалі? Бралі зерне: жыта, ячмень, а хто дык авёс, калі не было чаго другога. Заходзілі ў хату і раскідвалі зерне па хаце. На Новы год віншавалі ўжо хазяеў так. Калі кідалі, то спявалі: «Сею, сею, засяваю, з Новым годам паздраўляю». Так гаварылі тры разы. Ну, а тады хазяйка давала дзецям, калі пекла блінцы, то блінцы, а так канфеткі, зернаты, калі і сала.

На Новы год гулялі ў розныя гульні. Не помню, як называюцца. Абыкнавенна гулялі так, каб хлопец з дзеўкаю разам былі. Хто сабе пару знойдзе, той і замуж выйдзе, а хто не – тая застанецца дзеўка ў гэты год адна.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Смалянчук Кацярыны Сцяпанаўны, 1921 г. н., 2002 г.

Перш за ўсё да Каляд рэжуць кабана, гатовяць усе прысмакі: калбасы там разныя, хто там сільна так веруюшчы, той пост саблюдае. Песні спявалі:

А ў полі, полі
Вішанька стаіць.
На той вішаньцы
Свечачка гарыць.
Іскарка ўпала –
Возера стала.
А ў тым возеры
Сам Бог купаўся.
З Ісусам Хрыстом,
Святым Раждзяством,
Святы Вечар!

А як вадзілі казу? Кажухі вывярнуць другім бокам, маску казліную адзенуць, а хто сажай перамажацца ў чарцей, і ходзяць пад вокнамі, шчадруюць. У нас не насілі звязду. Я не помню етага. Сейчас ужэ шчадруюць у асноўным маладыя, яны ніякіх калядных песень не знаюць, ні гаспадару, ні гаспадыні, ні дачцэ, ні сыну, а крычаць, папрашайнічаюць:

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Шчадрую, шчадрую,
Гарэлку чую.

Дай усё. Я тожа ніякіх песень калядных не знаю.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Валасюк Таццяны Аляксееўны, 1952 г. н., 1999 г.

А ў полі, полі вішанька стаіць,
На той вішаньцы свечачка гарыць.
Свечачка ўпала – азярцо стала.
А ў том азярцэ сам Бог пакупаўсь
З Ісусам Хрыстом, святым Ражаством,
Святы вечар!

Красна-ясна ў лузе каліна,
Святы вечар!
Красней за таго Лена ў таткі,
Святы вечар!
Па двару хадзілі, увесь двор красіла,
Святы вечар!
А ў хату ўвайшла, паны стаялі,
Святы вечар!
Шапкі знімалі, у Лены пыталі –
Святы вечар!
Ці ты папоўна, ці каралеўна?
Святы вечар!
Я не папоўна, не каралеўна,
Святы вечар!
Іванава дачка, красна панначка, як ягадачка,
Святы вечар!

А пасля спявалі ўжэ, каб дарылі:

Скарэй дарыце,
Нас не барыце.
Кароткі світкі,
Памерзлі лыткі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Равянок Марыі Адамаўны, 1928 г.н.
(раней пражывала ў в. Першамайск Лоеўскага р-на), 1999 г.

Казу водзяць 13 января. Пелі навагоднія песні хлопцы, дзяўчаты ў хаце ў хазяіна. Хазяін падорыць, паблагадарыць, што спелі калядную песню. Хлопцы

пераапраналіся ў казу (маскі дзелалі з барадой, кажух навыварат). З палкамі заходзілі ў хату. Каза прыгала, танцавала. Спявалі: «О-го-го, каза, о-го-го, рагатая...» Патом шчадруюць і на дварэ гуляюць. Паляць смалу, танцуюць, пяюць. Давалі гасцінцы (семечкі, калбасу, калачы). Гэта сейчас гарэлку даюць, а раней не давалі.

Пад стары Новы год (13 января) гадаюць дзеўкі. У 12 часоў сабіраюцца ў адну хату і пачынаюць гадаць. Запальваюць свечку ў зярно, у банку і гадаюць на зеркала, тушаць свет. У зеркалі каго ўбачаць ці што пакажацца, то ўжэ і судзьба яе.

Паляць бумагу і глядзяць пры свечцы на сцяну. Якое атражэнне ад той бумагі на сцяне, такая і судзьба, што ўжо каму ўвідзіцца.

Курэй бралі ў хату. Насыпаюць кучкамі зярно каждая дзеўка. З чые кучкі ўперад пятух пачне кляваць, тая дзеўка раней замуж выйдзе.

Калі дзеўка лажылася спаць, то казала: «Суджаны мой, ражаны, прыдзі і разбудзі мяне».

Галошы кідалі чэраз забор. У які бок носам, у тую сторану замуж пойдзеш.

На перакростак хадзілі дзеўкі ў 12 часоў. Стануць і слухаюць, што каму пакажыцца. Калі сабакі ў якой старане забрэшуць, то ў той край замуж пойдзеш.

Хто прыйдзе первы на Новы год (14 чысла) у хату, таго ацеле карова (калі мужык – то бычок, калі жанчына – то цёлачка).

У хату прыходзілі з засяваннямі 14 января:

Сею-сею, засяваю,
З Новым годам паздраўляю.
У полі – вядром,
У доме – дабром.

21 января паследні дзень – правод Каляд.

За гарою ў калодца,
Гдзе студзёная вада,
Вслед за жнейкамі вязала
Снопы дзева малада.
Ой, вязала дзеўка, пела,
Што ў калхозе люба жыць.
Еслі чэсна дзела дзелаць,
Нада труд свой палюбіць.
А вакруг хлеба шумелі,
Гаварылі ей а том,
Што калхознае багацтва
Смела ўходзіт в каждый дом.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Цімошчанка Ніны Сцяпанаўны, 1944 г. н.
(раней пражывала ў в. Новае Места
Навазыбкаўскага р-на Бранскай вобл. РФ), 2000 г.

Ідуць шчадраваць хлопцы. Надзявалі на галаву «царскую шапку», надзявалі і «казла», якога вадзілі за сабой ад двара да двара, прыпяваючы:

Хрыстос радзіўся ў Віхліеме,
Прыйшло к яму тры цары,
Прынеслі тры дары:
Злата, ліван і срабро.

Таго і мы вам жадаем
Ды з Новым годам паздраўляем.

Або ў першы дзень старога Новага года заходзілі ў хату, рассыпалі пшано ці другую крупу, гаворачы:

Сею, сею, засяваю,
З Новым годам паздраўляю,
Каб былі на стале з піражкамі,
А на стале з пірагамі.

Насілі «звязду» і спявалі «Вішаньку»:

А ў полі вішанька стаяла,
На той вішаньцы свечачка гарэла,
Іскарка ўпала – возера растала,
А ў тым возерцы сам Бог купаўся,
Святое Ражаство нам радасць прынясло,
Іван Красціцель воду пакрасціў,
На ўвесь свет пусціў,
Пажадаў добры вечар.

У Каляды калядоўшчыкі падводзілі «казу» к гаспадару, затым да гаспадыні, і тая павінна пакланяцца, каб гаспадары былі добрымі на пачастункі. Прыпявалі:

Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе каза нагою,
Там жыта капою.
Махне хвастом –
Зародзіць жыта кустом.

У калядаванні прымалі ўдзел пераапранутыя людзі: цыганка, чорт, мядзведзь, казёл, цар з царыцаю. Збіралася моладзь у якойсці хаце, дамаўляліся і ішлі шчадраваць з торбай, гармонікам, бубнам. Спявалі:

Ой, смародзіна, ты зялёная,
Ой, чаго ж і ты рана расцвіла?
Добры вечар, шчодры вечар!
Расцвілі мяне люты маразы,
Добры вечар, шчодры вечар!
Люты мароз, буйныя вятры,
Добры вечар, шчодры вечар!
У нашага пана двор гароджаны,
Добры вечар, шчодры вечар!
Двор гароджаны, садам саджаны,
Добры вечар, шчодры вечар!
А ў тым садзе хадзіла зверка,
Добры вечар, шчодры вечар!
Гэта не зверка, маладая дзеўка,
Добры вечар, шчодры вечар!
Шыла-пашыла шоўкам кашулю,
Добры вечар, шчодры вечар!
Шчэ й на падолі буйныя арлы,
Добры вечар, шчодры вечар!
А на рукавах ясны сокалы,
Добры вечар, шчодры вечар!
Буйныя арлы хочуць сядзець,
Добры вечар, шчодры вечар!
Ясны сокалы хочуць сядзець,
Добры вечар, шчодры вечар!

А ў пана Івана вумная жана,
Бог яму даў вумную жану ў яго даму.
Вумная жана сенечкі мяла,
Бог яму даў вумную жану ў яго даму.
Семечкі мяла, кашалёк знайшла,
Бог яму даў вумную жану ў яго даму.
Што первы горад– усеслаўны Кіеў,
Бог яму даў вумную жану да ў яго даму.
А другі горад – славен Чарнігаў,
Бог яму даў вумную жану ў яго даму.
А трэці горад – усеслаўны Лоеў,
Бог яму даў вумную жану ў яго даму.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на ад Сідарок Т. В., 1969 г. н., 2004 г.

Куцця – гэта ячная крупяная каша, якую абязацельна гатуюць на куццю. Тады трэба гатаваць не толькі куццю, але і іншыя гатункі. У гэты дзень усе адзяваюцца па-святочнаму і мыюцца, вымываюць у хаце, вымаюць новыя набожнікі. Увечары вымаюць куццю, кладуць сена трошкі. Тады садзяцца вячэраць. Ядзяць ладкі з варэннем, суп з грыбамі.

7 студзеня ладзяць скаромнае, разгаўляюцца, бо перад куццёй быў пост, нельга было есці мяса, яйкі, малако, смятану, булкі. Потым дзеляць зярняты квартачкамі, штоб усім было пораўну. А пасля ўжэ дажыдаюць старога Новага года.

Другая куцця скаромная з салам. Усе ж стараліся нагатаваць паболей страў. Гатавалі смажаныя каўбасы, крывяную каўбасу, сальцысон, халадзец. Стараліся нагатаваць пабольш ежы, каб увесь год быў багатым.

Бегаюць дзеці шчадраваць. Дзелаюць «звязду», у хванар устаўляюць свячу і хочуць падняць што вышэй і пяюць «Ражаство»:

Ражаство твае, Хрысце Божа наш,
Васіяніе міра і свет разумам.
Неба звяздою чакуйся, звяздою служашчай.
Табе кланяемся, сонца праўды.
У цябе відзім высоты Вастока.
Госпадзі, слава табе!
Слава Айцу і Сыну і Святому Духу.
Ныне і прысна, і ва векі вякоў.
Амінь.

Дзева ва дне спрасцвеннага раждаець.
Зямля верцеп непрыступнаму прыносіць.
Ангелы з пастырамі слова славяць.
Волхвы жа са звяздой пуцяшэствуюць.
Наш Бог радзіўся.
Апрача прадвечны Бог
Хрыстос рождзён, славіце.
Хрыстос на зямлю вазносіцеся.
Пойце Госпадзева і ўся Зямля.

Ой, каля сяла грушка стаяла,
Ой, каля сяла грушка стаяла,
Шчодры вечар, грушка стаяла.
Да тое грушкі сцежка топтана,
Шчодры вечар, сцежка топтана.
Хто яе таптаў? – Пані Раечка.
Шчодры вечар, пані Раечка.
Яна таптала, грушкі збірала,
Шчодры вечар, грушкі збірала.
Грушкі збірала, у рукавец клала,
Шчодры вечар, у рукавец клала.
У рукавец клала, дзеткам давала,
Шчодры вечар, дзеткам давала.
Дзеткі паелі, яшчэ захацелі,
Шчодры вечар, яшчэ захацелі.

Хадзіў-пахадзіў месяц па небу,
Святы вечар!
Ой, зваў-перазваў зоры з сабою,
Святы вечар!
Хадзіце, зоры, услед за мною,
Услед за мною Бога шукаці.
Не найшлі Бога, а Ісуса Хрыста.
З Ісусам Хрыстом,
Святым Ражджаством.
Святое Ражджаство
Нам радасць прынясло.
А Іван Хрысціцель
Нам воду пахрысціў,
На белы свет пусціў,
Пажадаў: «Добры вечар».

Ой, смародзіна ты зялёная.
Ты чаго ж так рана расцвіла?
Добры вечар, шчодры вечар!
Расцвілі мяне люты марозы,
Добры вечар, шчодры вечар!
Люты мароз, буйныя ветры,
Добры вечар, шчодры вечар!
У нашага пана двор гароджаны,
Добры вечар, шчодры вечар!
Двор гароджаны, садам саджаны.
Добры вечар, шчодры вечар!
А ў тым садзе хадзіла зверка.
Добры вечар, шчодры вечар!
Гэта не зверка – маладая дзеўка.
Добры вечар, шчодры вечар!
Шыла-пашыла шаўком кашулю.
Добры вечар, шчодры вечар!
Шчэ й на падоле – буйныя арлы.
Добры вечар, шчодры вечар!
А на рукавах – ясны сакалы.

Добры вечар, шчодры вечар!
Бурыя арлы хочуць сядзець.
Добры вечар, шчодры вечар!
Ясны сакалы хочуць сядзець,
Добры вечар, шчодры вечар!

Пайшла Каляда, калядуючы,
Пайшла Каляда, калядуючы,
Эй, Каляда!
А за ёй дзеўкі, шчадруючы.
А пайшла Каляда ў адну хату,
А ў гэтай хаце куццю таўкуць.
Пайшла Каляда ў другую хату,
А ў гэтай хаце серабро звініць.
Пайшла Каляда ў трэццю хату.
А ў трэцяй хаце сала шыпіць.
Пайшла Каляда ў чацвёртую хату,
А ў чацвёртай хаце сала шыпіць.
Пайшла Каляда ў пятую хату,
А ў пятай хаце золата блішчыць.
Пайшла Каляда ў шостую хату,
А ў шостай хаце каўбасу пякуць.
Каўбасу пякуць ды й нам дадуць
Хоць па маленечкаму кусочку,
Каб любілі хлопцы вашую дочку.

ВІШАНЬКА

А ў полі вішанька стаяла,
На той вішаньцы свечачка гарэла,
Іскарка ўпала – возерца растала,
А ў тым возерцы сам Бог купаўся
З Ісусам Хрыстом, святым Ражаством.
Святое Ражаство нам радасць прынясло.
Іван Крысціцель ваду пахрысціў
На ўвесь свет пусціў.
Пажадаў: «Добры вечар».

Дзверы ў хату, гаспадар, адчыняй,
Нас хутчэй да сябе ўпускай.

Валачобныя – людзі добрыя,
Валачыліся, памачыліся,
У цябе прыпыніліся.

Ой, нясі, гаспадар, кварту гарэлкі,
Кварту гарэлкі, сыр на талерцы,
Чырвень злоты нам на боты,
Саракоўку на падкоўку.

Калядныя гаданні

На Ражаство ўжо павялося гадаць. Кожны гурт гадаў асобна: па сем – дзесяць дзяўчат у кожным гурце. Збіраліся ўвечары і варожылі.

Лажылі платкі ў начоўкі і гадалі. Чый платок першы ўпадзе, той першы з гэтага гурта замуж пойдзе. На шчадруху пеклі бліны ўвечары і дзяўчаты клалі блін за пазуху і ішлі на вуліцу. Калі дзяўчына ўстрачала мужчыну, яна пытала, як яго зваць. Так жа будуць зваць яе нарачонага.

На галодную куццю ідзе гаспадар у сад і калі ёсць дзерава, якое не пладзіць, дык бярэ сякеру, падыходзіць да дрэва і страшыць яго. Ходзіць вакол з той сякерай і кажа:

– Скажы, будзеш радзіць, ці не? Калі не будзеш, то зсяку.

Гэта трэба казаць тры разы. І тады лічылася, што дрэва спужаецца і будзе добра пладанасіць.

Было такое гаданне шчэ ў дзяўчат, што калодзец дзелалі з палачак, і хто ўжо пойдзе па ваду, дык той і суджаны твой.

Каб ужо ўзнаць сваю судзьбу, як у цябе далей у жыцці будзе, дык садзілася дзеўка перад грубкай ля акна і запальвала бумагу ад той грубкі. Пакуль яна гарэла, дык дзеўка глядзела на цені, якія астаюцца на грубцы і вось па гэтым цяням апрэдзяляла сваю долю.

Больш за ўсё дзяўчаты хацелі даведацца пра сваё будучае замужжа, як яго зваць будуць, які ён будзе – п'яніца ці добры гаспадар, ці скора яны пойдуць з матчынай хаты ў другую сям'ю. Збіраліся яны гуртам, бо па адному страшна было і беглі пад вокны да суседзяў, тады бралі з сабой авёс ці што іншае і пасыпалі гэтым зернем зямлю перад акном, і слухалі, што кажуць у хаце. Калі ў хаце казалі: «Хопіць сядзець, час ісці», «Пара збірацца» і г. д., то значыць, што дзяўчаты скора выскачаць замуж. А наадварот, калі чулі словы: «Паглядзі», «Яшчэ рана, вы паспееце дадому», то значыць яшчэ не час ісці замуж.

Гадалі таксама па льну. Бралі дзве сцяблінкі высушанага ільну, падпальвалі, а тады падкідвалі ўгору. Калі яны пераблытваюцца. То павяжуць рукі маладых вянчальным ручніком, а калі падуць ніц паасобку, то значыць сядзець у дзеўках год.

Дзяўчаты ішлі ў хлеў уцёмначы і хваталі авечак, калі трапляўся баран, дык будзе свадзьба, калі авечка, то не быць свадзьбе.

Куцця перад Крашчэннем строга галодная. З раніцы ўсе працавалі дзень ва-абшчэ нічога не елі. Дзецям разрашалася ў абед паесці толькі поснай кашы, бо дзеці малыя не цярпелі да вечара галодныя. Ждуць ваду хрышчоную з цэрквы, потым людзі ядзяць куццю, ядзяць ужо цёмна і завуць мароза:

– Мароз, га, мароз, хадзі ў хату, будзеш куццю есці. Ты ўлетку ў нас не бывай, нам травы не пужай, ярыны не марозь, нам бяды не прынось.

На стары Новы год дзеўкі гадалі, закладалі на сон і казалі:

– Андрэй Першазванны, скажы мне сон праваслаўны, з кім веку дажываць, таго ў сне павідаць.

І тады лажацца спаць і ждуць, хто ж ім прысніцца.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Фядосенка Вольгі Аляксееўны, 1931 г.н.,
Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г.н., 2004 г.

Пад назваю «Каляды» ў нас разумеюць усе дні з 6-га студзеня і да канца месяца. У нас на Каляды дзелалі фанар з бумагі, варылі буряк. Выразалі ўнутры буряк і ставілі туды свечку. Хадзілі з гэтым фанаром па вуліцах і пелі:

А мы Масленіцу пракаталі,
Усе святыя вечарочкі прагулялі.

Увечары 13 студзеня хлопцы і дзеўкі ходзяць шчадраваць. Яны пераадзяваюцца, намазваюць ліцо сажаю, каб не пазналі. Ходзяць яны з казою – адзяваюць хлопца ў вывернуты кажух, а на галаву адзяваюць маску казы. Яны ходзяць па дварах і спяваюць песні. Ходзяць па 5–6 чалавек. За праспяваную песню гаспадары ўгашчаюць іх, даюць пачастункі, гарэлку, грошы.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Рагачовай Марыі Іванаўны, 1936 г. н., 2004 г.

У 12 часоў ночы бралі зеркала, ставілі 12 свечак. Калі нешта пакажацца – накрывалі зеркала, каб страшнае не паказалась.

Было тры куцці. На першую варылі боршч, куццю, ладкі з макам, кампот.

Другую куццю называлі шчадрухай, на яе запрашалі мароз, на яе елі каўбасы, мяса, куццю.

Трэцяя куцця называлася крашчэнская (галодная). На яе елі ўсё поснае, куццю, боршч, грыбы, кампот. Увечары свяцілі ваду і трохі яе выпівалі. На хаці, на хляву рысавалі мелам красты.

На першую куццю лажылі ў кут сена, накрывалі палаценцам і клалі на яго куццю. Вяршок куцці аддавалі жывёле, на астатняй дзеўкі гадалі: бралі на сон і прыгаворвалі: «Жаніх, хадзі куццю есці».

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Дайце канхвет.
Не дасце канхвет –
Абярну бухвет.

Сею, сею, пасяваю,
З Новым годам паздраўляю.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Ксеніі Сяргееўны, 1920 г.н., 2005 г.

Гаршочак з куццёй (тры куцці) бяруць адным і тым жа сенам. Потым гэтым сенам садавіну падвязвалі, каб не памерзла. Гаршочак ставілі ў красны кут. Скату давалі вяршок, а потым самі елі, заклікалі мароз: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці. А на лета не бывай, кажухом ячмень укрывай». Перад Калядамі ўсе дні пралі. У апошні дзень, калі можна было прасці, палілі печ і варылі разгонную кашу. Моладзь збіралася ў гурткі. Спявалі, плясалі. А гэтую кашу сцераглі дзеўкі, бо прыходзілі хлопцы з гуртка і кралі гэтую кашу. Звычайна сцераглі гэтую кашу непрыгожыя дзяўчыны, якіх ніхто не запрашаў танцаваць. Каб не застацца гэтым дзяўчынкам у дзеўках – гэта быў добры момант знайсці сабе пару, бо хлопцам, каб атрымаць гэтую кашу, патрэбна было запрасіць дзяўчыну на танец.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крышак Ніны Сямёнаўны, 1935 г. н.,
перасяленкі з в. Каўпень Лоеўскага р-на, 2005 г.

КАЛЯДНАЯ ПЕСНЯ

А ў лузе, у лузе каліна стаіць,
Святы вечар!
А на той каліне свечачка гарыць,
Святы вечар!
Хлопчычак ідзе, коніка вядзе,
Святы вечар!
Дзевачка мая, напаі каня,
Святы вечар!
Напаі каня з поўнага вядра,
Святы вечар!

Ты, хазяін-мужычок,
Палязай ты ў сундучок,
Даставай нам пятачок.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Астаф'евай Аленьі Віктараўны, 1993 г. н., 2005 г.

Мы дык на Каляды перадзяваліся хто ў што мог. Надзявалі старыя кажухі, плацці, перадзяваліся ў цыгана, гаспадара, гаспадыню. Сажай красіліся. Абязацельна насілі звязду. Яна была сімвалам Ражаства. Як уваходзілі ў хату, пелі раждественскія песні.

Варылі 3 куцці. Первую з 6 на 7 января. Гэта была посная куцця. Гатовілі яе толькі з пярлоўкі, дабаўлялі трохі сахара ды масла падсолнечнага.

Другую куццю варылі з 13 на 14 января. Гэта – багатая куцця. Было мяса, яйцы. А трэцяя куцця тожа была посная. Перад тым, як есці куццю, прыгаворвалі: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. Не марозь нашых цыплятак, парасятак, курачак, каровак, а хадзі, палакаміся куццёй».

Як ставілі куццю, на стол клалі сена, паверх красівую скацерць. А ўжо наверх куцці клалі хлеб. Еты хлеб храняць увесь год да следуюшчых Каляд. Пелі:

Шчодры вечар, добры вечар!
Ці дома, дома сам пан-гаспадзін?
Шчодры вечар, добры вечар!
Што ён дзелае калітачку?
Шчодры вечар, добры вечар!
А ў той калітачцы тры селяжочка,
Шчодры вечар, добры вечар!
А нам, дзядзечка, па піражочку,
Шчодры вечар, добры вечар!
Пажадай: «Добрый вечар!».

Варожбы былі. Бралі 3 аддзельныя тарэлкі. Пад адну клалі хлеб куццявы, пад другую клалі куццю, пад трэцяю – куклу. Кожная дзяўчына падымала тарэлку і глядзела, хто ёй папаўся. Калі кукла пападалася, значыць байстручок радзіцца. Калі куцця пападалася – скора свадзьба. А калі хлеб – ждзі сватоў.

Яшчэ такое было. У начоўках паклалі платкі: у каго платок первы ўпадзе, тая замуж первай пойдзе.

Потым насілі дровы. Шлі ў сенцы, бралі ў ахапку дроў, прыносілі ў хату і лічылі: калі парнае чысло – будзеш год упары.

Первую ложку ад куцці клалі ў падол і насілі да трэцяй куцці, патом лажылі пад падушку і прыгаворвалі словы: «Хто будзе са мной куццю даядаць, той будзе са мной век векаваць».

Канешне ж, абхватвалі забор. Калі парнае чысло – пойдзеш замуж.

Сапог цераз забор перакідвалі. У якую сторану павернуты будзе сапог, у той бок і замуж пойдзеш.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Паўлавай Марыі Мікітаўны, 1935 г. н., 2005 г.

На галодную куццю мятуць смецце з хаты і выносяць яго на перакрыжаванне дарогі. Становяцца на гэтае смецце і кажуць: «Хто ў лесе заблудзіўся, адзавіся, гу –у –у». Адкуль пачуецца гук, адтуль і прыйдзе нарачоны.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крышак Ніны Сямёнаўны, 1935 г. н.
(перасяленкі з в. Каўпень Лоеўскага р-на), 2005 г.

О! На Каляды ў нас была прыстолышчына калісь. Паз'язджаюцца сюды, сабіраліся хлопцы, папрыглашаем хлопцаў у хату якую, ды пазносімся, павячэралі, гулялі, пашлі ў клуб. О! Каляды ў нас атмячалі цэлую нядзелю.

Перад Калядамі ў нас была посная куцця, тады галодная, тады піскуха. На піскуху звалі мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці. А летам не ідзі, бо будам біці».

А на галодную куццю ўжо цэлы дзень не ясі. Тады пасля абеда становішся, матка ўжо запісвае Каляды, тады ўжо куццю гэту ўвечары дастае, вячэраем сям'ёй усёй. Павячэралі і ніхто нікуды, нельзя абы-куды ісці на гэту куццю, усе дома, саблюдалі. А тады абязацельна, штоб куццю паелі. Варылі куццю з ячменных круп, з пярлоўкі. Варылі і ставілі на кут, а тады клалі на сена, а тады на тым сене, як толькі Каляды начынаюцца, кажа: «Пайду, Каляду паймаю». І тады ўжо сена ўскубнеш і ложаш тады, а на тое сена ставіш тры куцці. Ну, цяпер я тожа саджу курэй туды, каб харашо вывеліся кураняткі.

Кашу елі ўсёй сям'ёй. Вот перад Новым годам куцця тая – гэта багатая куцця, ужо гатовіш і ладкі, і што ё ўжо, і матка ўжо і блінчыкі, і разнае ўсё такое. Яешня ўжо калі ё, каб багата ўсяго было, і сала, перва-наперва штоб па ложцы куцці ўзялі. І канчалі куццёй. Паелі – гэта была багатая куцця. На галодную, ваабшчэ, адна куцця была, ні скаромнага не елі, нічым нічогенька. Мяса ставілі ж на багатую куццю, а на етым ужо гэта піскуха была, так яна называлася.

Калядавалі, хадзілі шчадраваць. Пераадзяваліся, як хто сумее. Была настаўніца ў мяне, Юлія Аляксееўна, хадзілі мы з ёй калядаваць, дык яна ўжо нарадзілася ў прынца, а я Бабай Ягой была, і пайшлі ўдвух. Увесь вечар абхадзілі, і нас ніхто не ўгадаў. Давалі і семак, і канфет. А мы і песню харошую спяём, мы ж не то што пад дзверру «га-га», а акуратна спяём. І пелі песню такую «А ў лузе, лузе галубкі гулі»:

А ў полі, полі свечачка гарыць,
Святы вечар!
З той свечачкі іскарка ўпала,
Святы вечар!
Іскарка ўпала, рэчачка ўстала,
Святы вечар!
А ў той рэчачцы чаўночак плыве,
Святы вечар!
А ў тым чаўночку Ванька сядзіць,
Святы вечар!
А за ім ідзе яго дзевачка,
Святы вечар!
Маладая дзевачка пер'е збірае,
Святы вечар!
Пер'е збірае, у рукаве кладзе,
Святы вечар!

А калі просяць яшчэ праспяваць, дык пастаіш яшчэ, папрыдурваешся. Карты возьмеш, пагадаеш. Было інцярэсна, інцярэсней, як цяпер. Прыходзяць да ў акно палкай: «Давай гарэлку скарэй, да тарэлку давай». А мы ж такога не прасілі.

Варажылі. Загадывалі хлопца якога, пад галаву клалі то платок які насавы, то грабяшок. І тады ўжо кажа: «Сужаны, ражаны, як зімой». Прысніцца што такое

пра хлопца, дык тады ўжо і замуж пойдзеш у гэтым гаду, а як не прысніцца, дак ужо і не.

Гульня «Свіння». Разлажывалі, такая была здзеланая з палкі, вот палка, а тады, штоб кручкі вешаць на тую палачку. А тады каму паследні кручок пападзецца, той хаваўся са свіннёй, а хто не найдзе, той свіння ўжо. Ілі загадваюць ужэ: з тым ці з тым, а ўжо знаюць, што яна не любіць, штоб ужо абязацельна пацалавалась з тым хлопцам ці што.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1938 г. н., 2005 г.

Зеркала ставілісь у цёмным кутку на стале. Побач паляць свечку. У 24.00 садзіліся насупраць зеркала і гадалі на сужанага, гаварыўшы такія словы: «За каго я пайду замуж, хай пабачыцца».

Бралі блін і клалі за пазуху, і выходзілі на агарод, кідалі блін, і ў якой старане сабака загаўкае, туды і замуж пойдзеш.

Венікам вымяталі хату, потым з веніка выцягвалі веткі, з якіх рабілі мосцік, які клалі ў кут і загадвалі жаніха. Потым клаліся спаць і нельга было размаўляць.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Алімпіяды Рыгораўны, 1922 г. н., 2005 г.

ВЕСНАВЫЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ

Стрэчанне

Зіма з вясной встрэчаліся. Прыкмета была: тае снег, і калі петушок вады нап'ецца, то ўжэ будзе цяпло.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Праходзіла 15 февраля. Качэлі былі да вайны, калі былі ярмалкі. На Стрэчанне бальшая ярмалка была, там ужо ўстанаўлівалі качэлі.

Рэлігіозны празнік. Встрэча, кагда Іісуса прынеслі ў храм, і яго ўстрэціў старац, яму было 300 з чым-та лет. Яму прэдсказалі ва сне, што ён умрэ, кагда ўвідзе Іісуса Хрыста. І вот, када яго прынеслі, і ён пачувствавал, што гэта будзе Іісус Хрыстос, ён яго ўнёс у храм, перакрэсціўся і сказаў: «Шчас я адхажу ў мір іной». Вот эта называецца Стрэчанне. Стрэчанне пападала ў аснаўном у пост. Прымета: якая пагода на Стрэчанне, такое лета будзе, а еслі сняжынка ўпадзе, значыць, будзе праходзіць дождж.

Са Стрэчання астаўлялі свечку, якая мела магічныя свойствы. Былі тры свечкі – страсная, вербная і з чыстага чацверга. Вот началась Евангелле на страсць. Як начнёцца Евангелле, ну, мінуты 2–3 пагарыць – патушыце свечкі. Страсць – на чысты чацверг. На каждыя дванаццаць Евангелій рабіць гэта. Гэту свечачку храніце. А калі парэжыш пальчык, запаліце свечачку (страсную, вербовую, стрэчанскую) і прыпякіце ёй пальчык, і назаўтра нідзе нічога не будзе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

Стрэчанне – гэта наш любімы празднік. В народзе гавораць, што на Стрэчанне зіма і вясна встрэчаюцца. У гэты дзень у царкве было асвячэнне свечак. Шчыталася, што яны набывалі сілу. Калі пачыналася навальніца, то іх запальвалі, каб маланка хату не спаліла. Яны як бы зберагалі нас ад нячысцікаў. Свечы гэтыя вешалі над хлевам, каб ведзьмы не забралі малако ў каровы.

Калі на Грамніцы вялікі мароз, то снег будзе ляжаць нядоўга, а лета не абяшчае нічога добрага.

Ой, зіма з летам страчаецца,
А Іван дачкой набіваецца.
А яго дачка ў садочку
Шые сарочку Васілёчку.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

Гуканне вясны

Вясну гукалі на Стрэчанне, калі зіма з летам сустракаліся, у сакавіку гэта было. Жанчыны і дзяўчаты выходзілі на вуліцу і клікалі адна адну: «Выходзьце, дзяўчаткі, к нам на вяснянкі».

Яны садзіліся на бярвеннях і пачыналі спяваць – «клікаць вясну». А калі хто-небудзь з мужчын падыходзіў, то яны адразу пераставалі спяваць. Такі быў звычай, баяліся, каб не «спалохаў» хто-небудзь вясну. Часцей збіраліся на якой-небудзь горкі, бо яна хутчэй прагравалася сонцам, з яе было далёка відаць і чуваць. Таксама дзеўкі збіраліся і пад вялікім дрэвам каля гумна, клалі салому пад ногі, садзіліся радам і спявалі да позняй ночы. Гэтыя дзяўчаты і жанчыны прасілі ў Бога, бацькоў і ўсіх людзей благаслаўлення.

Гукалі вясну так:

Ой, выйдзем мы на горку
Да паклічам Бога
Адамкнуць зямліцу,
Выпусціць расіцу.
Будзем зімку замыкаці,
Цёплае лецейка адмыкаці,
Штоб нам, дзевачкам, цёпла гуляці.

Благаслаўлення прасілі:

Благаславі, Божа,
Вясну заклікаці,
Зіму забываці.
Благаславі, маці,
Вясну гукаці
На ціхае лецечка,
На буйное жыта.
Благаславіце, старыя дзяды,
Вясну-красну пагукаці.

А яшчэ клікалі птушак у госці:

Жавароначкі, прыляціце, гу!
Цёпла лецечка прынясіце, гу!
А зімачку прыбярыце, гу,
Бо зімачка надаела, гу,
Нам хлебушка пераела, гу!
Жавароначкі, прыляціце, гу,
Землю-матушку абудзіце, гу,
І дожджыкам напаіце, гу!

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н., 2002 г.

ВЯСЕННЯЯ ПЕСНЯ

Ой, на гаре каліна, (2 р.)
Каліна, каліна,
Чубарікі, чубчікі, каліна. (2 р.)
Пад горою маліна,
Маліна, маліна,
Чубарікі, чубчікі, маліна.
Там гуляла дзівчіна,
Дзівчіна, дзівчіна,
Чубарікі, чубчікі, дзівчіна.
Цвет каліны ламала,
Ламала, ламала,
Чубарікі, чубчікі, ламала,
Ва пучкі вязала,
Вязала, вязала,
Чубарікі, чубчікі, вязала,
На дарожку брасала,
Брасала, брасала,
Чубарікі, чубчікі, брасала,
Маладога парня ўсё ждала,
Паджыдала, паджыдала,
Чубарікі, чубчікі, паджыдала.
Ты, казача, маладой, маладой,
Правадзі меня дамой,
Чубарікі, чубчікі, дамой.
Ой, на гаре каліна,
Каліна, каліна,
Чубарікі, чубчікі, каліна.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Дземідок С. А., 1920 г. н., 1999 г.

ВЕСНАВАЯ ПЕСНЯ

Жавароначак, ранняя птушачэчка,
Чаго так рана з выраю вылятаеш?
А там пры даліне, там ляжаць крыгі,
А там пры дарозе – снягі і марозы.
А я тыя крыгі крыллямі разаб'ю,
А я тыя марозы нагамі растапчу.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Насон Валянціны Міхайлаўны, 1956 г. н., 1994 г.

Сабіраліся ў сярэдзіне дзярэўні, станавіліся ўсе ў круг і ішлі па дзярэўні.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

ВЯСЕННЯЯ ПЕСНЯ

Як паехаў Сямёну дый у поле араці,
Дый забыўся хлеба, солі з сабой узяці.
Ох, і гора Сямёну, дый на шлях паглядае,
А ўсе жынкі абед нясуць, а яго не мае.
Дараўся Сямёну да зялёнай дубравы,
Выпраг волы срэдзь дубравы, сам пайшоў дадому.
– Ой, пасіцеся, волы, ды не бойцеся воўка,
А я пайду дадомачку, бо баліць галоўка.
Як прыходзіць Сямёну ды да роднае хаты,
Пытаецца дробных дзетак: «А дзе ж ваша маці?»
– Ой, пайшла наша маці ды ў луг па каліну,
Нам казала-гаварыла, што я вас пакіну.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на ад Поўжык П. П., 1925 г. н., 2000 г.

ВЯСНЯНКА

Ой, вясна, мая вясняначка,
Дзе твая дачка Ульяначка?
У садочку шые сарочку
Свайму сыночку Васілёчку.
Дзесь у даліне шые пярыну
Сваёй донечцы Кацярыне.
Ой, выйду, выйду я на вуліцу,
Выйдзі, выйдзі, мая маці,
З вялікай лазінаю мяне заганяці.
Як пайшла я ўцякаці цераз 3 гароды,
Патаптала руту-мяту, нарабіла шкоды,
Ой, выйду я на гору, ды гукну Хадору.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на ад Поўжык Г. І., 1914 г. н., 2000 г.

ВЯСЕННЯЯ ПЕСНЯ

Ой, вясна, вясна вясёлая,
Развесяліла ўсе горачкі,
Усе горачкі, даліначкі,
Усе горачкі да даліначкі,
А пайшоў бы я да дзяўчыначкі.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на ад Краўчанка С. А., 1915 г. н., 1999 г.

Вясну гукаці хадзілі. Было і такое. Абычна дзесь на Благавешчанне, а мо і раней, забулась, даўно було. Нада було на высокім месці гукаць. Выходзілі на

Шопахаў бугор, песні пелі. На бугру етым дак і агонь палілі. А так хто дома гукаў, то залазілі на вышкі, ну, садзіліся на сене ў адкрытыя дзверы і пелі песні.

Благаславення ж нада було папрасіць дома, каб вясну заклікаць іці. Прасілі ў бацькі і мамкі. Гаварылі так: «Благаславіце, бацька, маць, вясну ўстрачаць». Калі радзіцелі благаслаўлялі, тады ўжэ ішлі зазываці вясну.

Па вясне пеклі з мукі жаваранкаў маленькіх. Помню, ішчэ малыя былі, дак мамка пекла з цеста такіх жа, давала нам і казала: «Ідзіце, дзеткі, у неба запусціце птушачак, каб скарэй вясна прыйшла». Мы хадзілі і закідвалі іх у неба. Паднімем уверх еты рагалік і крычым ужэ, як дух е: «Вясна, вясна, прыйдзі, жаваранак, прыляці». Так пагуляемся, а тады ўжэ з'ядалі етых жаваранкаў і ждалі, калі прыляцяць жывыя.

На Благавешчанне песні дык днём пелі, а ў буднія дні вечарамі збіраліся.

Удзень работалі. Збяромся на двары ў каго-нібудзь на кладцы. Гармонь хлопцы прыносілі і пяем:

Ай, вясна, вясняначка,
Пчолачка ты сізакрылая,
Выляці з-за мора,
Вынясі ключыкі залатыя,
Замкні зімачку халодную,
Адамкні вясну і лецейка цёплае.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Смалянчук Кацярыны Сцяпанаўны, 1921 г. н., 2003 г.

Гуканне вясны было перад Іванам Купала. Так, асоба нічога не было. Хадзілі гукаць вясну ўкруг дзярэўні, але на высокае месца не выходзілі. А гаварылі так:

Вясна, вясна, на ніз пашла,
Што крутыя горы.
Чаго, дзеўка, замуж не пашла,
Што чорныя бровы.
Маі бровы калясамі,
Худа жыці з вамі,
Нельга выйсці на вуліцу,
Што за варатамі.
Ворагі мае спаць палягуць,
Выйду я, выйду я пагуляць,
Выйдзе мая маць
З вялікаю ласкаю
Мяне заганяці.

Вогнішчы яшчэ распальвалі, карагоды вадзілі, но я не хадзіла.

Людзі збіраліся на бугарок над ракой, мы ж над Дняпром жывем. Весела було. Калі разліў буў, каталіся на лодках, хлопцы на балалайках ігралі, весяліліся. Вадзілі хараводы, пелі песні, танцавалі. Арэлі дзелалі і качаліся.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Мікітаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Вясна пачыналася так. Ішла вуліца, і там выкопвалі яму. Лажылі туды калясо і ўжо каталіся да самага вечара. Вось так мы вясну встрачалі. У круг свой сабіраліся хлопцы, дзяўчынкі ды песні пелі: «Вясна, вясна, вяснянушка...» Карагоды вадзілі, гулялі ў гульні, у «Трэці лішні».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі мы булі маладыя дзеўкі, то гукалі вясну, а зараз жа – ста́рыя. Пачыналіся вясеннія святкаванні са спальвання зімы. За сялом сабіраліся маладыя ды палілі агні, дзе і палілі зіму. У агні палілі непатрэбны абутак, лапці і вешчы, якія ў хаце не нада.

Канешна, прыгалі праз вагонь, а такжа з рогатам гулялі ў гульні і песні спявалі:

Благаславіце, старыя людзі,
Ай, вясну загукаць,
Загукаці,
Люту зіму замыкаць,
Замыкаці.

У еты дзень маці варыць кашу, цеста месіць, пячэ конікі, іх кашай той начыняе, залузкі такія лепіш. А мы з дзеўкамі збіраемся, в лес ідом да вырубаем ёлку, а ёлкі няма, то хвою. Ёлку наражаем, цвяты вешаем туды, з бумагі цвятоў наробім, нарадзім. Все мы ету ёлку бяром і етыя конікі бяром, што маці напячэ з цеста, яйца бяром і ідом, глядзім, дзе які пянёк вісокі. А як няма пянька, то мы на хлеў лезам, тую ёлку ўстаўляем і спяваем:

Гэй, вясна!
Гэй, красна!
Што ты там
Проці лета
Вунесла?

Пойдум співаты, а хлопцы прыйдуць ды крадуць ёлку, а мы ж не даём. От так співаем да і танцуем, вакруг ёлкі бегаем, да шмыгалі со хлева дадолу з рогатам. Так гулялі адзін дзень гэты перад пастом.

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.

Гукалі вясну ў той час, калі вясна і зіма сустракаюцца. Тагда рабілі з саломы куклу і палілі яе. Шчыталася, што ў раслінах была сіла для жыцця. І калі палілі, то шчыталі, што гэтая сіла вернецца ў расліны.

А яшчэ пяклі пранікі з фігурамі жаваранкаў. Так дзеці звалі вясну. У гэты дзень пяклі бліны і елі іх, спявалі песні:

Ой, зіма з вясной страчаецца,
А Іван дачкой набіваецца.
А яго дочка ў садочку
Шые сарочку Васілёчку.

Ой, вясна, вясна вясёлая,
Развесяліла ўсе горачкі,
Усе горачкі, даліначкі,
Усе горачкі, даліначкі,
А пайшоў бы я да дзяўчыначкі.

Так у нас гукалі вясну.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Елізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Пелі дзеўкі песні-вяснянкі. Я не пела, а дзеўкі, большыя за нас, гукалі вясну. Як выйдуць на гару ды загукаюць тых вяснушак. Ой, ужэ накаталіся на качэлях. Там дубы растуць і была плашчадачка такая. І музыка там, і танцы. Гулялі пасля абеда і часоў да 10–11 вечара.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

На гэтае свята спявалі:

Вясняначка, і дзе твая дочка Мар'яначка?
Пагнала бычку, узяла мычку,
Бычка пасецца, мычка прадзецца,
А стараму дзеду на рукавічкі.

Кажды год лажылі касцёр. Кагда-та пцічак пеклі, но патом яно ўжо аташло. Іх лёгка катаць: так палажыў, скатаў, так эту раскатаў трошкі дліней, тады раз пералажыў, лапкі здзелаў, а тут глазкі здзелаў. Птушак елі. Выходзілі на высокае месца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

Первага марта звалі вясну. Прыйдам мы на кладбішча і всягда паём. Кругом кастра хадзілі, птушкі пеклі. На качэлях каталіся. Качэлі дзелалі высокія, метраў восем-дзевяць. Вянкі пускалі на ваду.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Я НА АРЭЛЮШКІ КАЛЫХАЛАСЬ

Спявалі, як вясну праважалі. Рабілі качэлю, пелі на лугу.

Я на арэлюшкі калыхалась,
Я с арэлюшкі абарвалась.
Ой, лі, ой, люлі.
Туда ішлі, прайшлі два малайцы,
Парні бравыя, кучаравыя.
Ой, лі, ой, люлі.
Яны ішлі, прайшлі, астанавіліся,
За ту дзевачку пабраніліся.
Ой, лі, ой, люлі.
Вы ж не біцесь, не браніцесь,
Вы па совесці разайдзіцесь.
Ой, лі, ой, люлі.
Аднаму каму я астанусь,
Астануся я Ваньку браваму-кучараваму.
Ой, лі, ой, люлі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.

ВОЛ БУШУЕ, ВЯСНУ ЧУЕ

Вол бушуе, вясну чуе,
Дзеўка плача, замуж хоча.
Не бушуй, воле, наарэшся,
Не плач, дзеўка, нажывешся.
Воран крача, сыру хоча,
Дзеўка плача, сына меўшы,
Воран крача – сыр бяленькі,
Дзеўка плача – сын маленькі,
Воран крача паляцеці,
Дзеўка плача, куды сына дзеці.

Запісана ў в. Буда-Петрыцкая Лоеўскага р-на
ад Захарэўскай Еўдакімы Мяфодзьеўны, 1927 г. н., 1994 г.

Масленіца

Сабяруцца ды ў дзесяць вечара і цягаюць тыя калодкі, песні паюць. Папераду бягуць і санкі шчэ прычэпяць, яшчэ і ступу.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

У пост постувалі, а на Масленіцу разгаўляліся, елі жырнае. Гулялі, спявалі, аддыхалі. Увечары палілі кастры маладзёж, прыгалі цераз іх. Удзень на базар

ездзілі, ігрышчы разныя там былі. Па стаўбах лазілі, петухоў знімалі прычэпленых, на гармошцы ігралі і песні пелі.

Запісана ў в. Катловіца Брагінскага р-на
ад Максімчык Алены Уладзіміраўны, 1932 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на)

І цяпер, як то Масленіца, так і пякуць бліны, і базар такі, што ой-ёй-ёй. На бліны кладуць масла, ну, ужо варэння накладуць, макам пасыплюць, як шо ё.

Калісь старыя людзі вадзілі харавод. Ета было ў пост на Благавешчанне, мы шчэ былі падлеткі. І з коньмі каталіся, прыязжалі там. Калісь старыя людзі хадзілі на поле, а цяпер не.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.



Сабіраліся кумаўя, сваты, родственнікі, саседзі. Гатавалі бліны, затым раздавалі другім людзям, дзецям, таксама гатавалі здобу, мясное блюда з рэзаных блінчыкаў, масла і малака.

Гулялі ў ігру, у «Юрка».

Гару, гару, пень,
Чаго гарыш?
Красну дзявіцу хачу.
Якую? Цябе, маладую!

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Грыб Ганны Якаўлеўны, 1923 г. н., 2005 г.



На Масленіцу пяклі бліны, перамазвалі іх салам ілі мёдам. Жарылі шкваркі, ета была самая галоўная яда. На Масленіцу хадзілі к родным ў госці. Также збіралася некалькі чалавек і цягалі дзеравянную калоду, украшаную лентачкамі. Калі заходзілі ў хату, к руцэ хазяіна прывязвалі палку, украшаную лентамі ілі прыгожай бумагай, і не адпускалі, пака хазяін не пакорміць блінамі і шкваркамі. Пры гэтым жалалі дабрабыту, здароўя і інш.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

На Масленіцу гулялі, санкі па вуліцы вазілі. Усе сядуць і санкі возяць. Санкі нічым не ўпрыгожвалі.

Масленіца ходзіць паследняя, пасля Каляд. Гатавалі ўсё: і мяса, і бліны, і каўбасы. Гатавалі, каб усяго было многа. Песні спявалі, дык я ўжо не помню ўсіх. Ой, сільно добра гулялі і старыя, і маладыя.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Таўкачэнка Аляксандры Ларыёнаўны, 1918 г. н., 2002 г.

Масленіца зразу пасля Хрышчэння ішла. Ну, што раньшэ рабілі? Тутака на Масленіцу то на стоўп залазілі, то ўсякія етыя гульні былі. Правод Калядаў, а цяпер усё адмірае.

За ракой, у Папоўке, на маёй памяці, бліны не пеклі. Тутака пеклі, а так нічога больш не рабілі. Сабіраліся, песні пелі. Калісь пелі песні пра вясну:

За крутыя горы
Чаго, дзеўка, замуж не пайшла,
Ды чорнаброва?
Мы ў горкі сустракаліся,
Гора не зналі.
Нельзя выйці на вуліцу
Ды за варагамі,
Ці варагі палеглі спаць?
Пайду, пагуляю,
Кліча маці вячэраць,
Усё гуляю, гуляю.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Мы, калі вясну гукалі, дак казалі: «Благаславі, маці, вясну гукаці, // Цёплага лета дажыдаці, // Вол бушуе, вясну чуе».

Да ў нас сягодня Масленіца,
Да вылецела ластавіца.
– Да што ж нам вынясла?
– З карабоў жыта вытрасла,
На ўсё жыта-пшаніцу,
Да ўсякую пашніцу.

– Ой, вясна мая, вясняначка,
Вясняначка.
Дзе ж твая дачка Мар'яначка,
Мар'яначка.
– Ах, у садочку шыла сарочку,
А сарочку свайму сыночку Васілёчку.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Краўчанка Марыі Пятроўны, 1929 г. н., 2005 г.

А мы Масленіцу дажыдалі,
А мы Масленіцу дажыдалі,
Дажыдалі, люлі, дажыдалі.
Усе на горушку выбягалі,
Выбягалі, люлі, выбягалі.
Гору масліцэм палівалі,
Гору сырніцэй пасыпалі,
Пасыпалі, люлі, пасыпалі.
– А ты, горушка, будзь катліва,
Будзь катліва, люлі, будзь катліва.
Нашы бабушкі вуркатлівы,

Вуркатлівы, люлі, вуркатлівы.
Мы думалі, Масленіца – сем недзелек,
Ажно Масленіца – сем дзянёчкаў,
Сем дзянёчкаў, люлі, сем дзянёчкаў.

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.

Масленіцу атмячалі. Пяклі бліны да бегалі з блінамі. Блін схапіў, паклаў за пазуху ды пабег. Еслі дзевушка ўстрэце на шляху мужчыну, то яна ў етым гаду замуж пойдзе, а калі не, то, значыць, замуж пойдзе не скора. Хлопцы рабілі тое самае.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Хлопцы калодкі цягалі, а дзеўкі ўжэ сароміліся.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н., 2005 г.

Праводзілі Масленіцу. Лошадзь запрагалі, каталіся, самі садзілісь, была гармонь, было і чучала.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

Масленіца – цэ ж харашо. На Масленіцу гарэлку пілі. Хто не ажаніўсь ішчэ, от тому калодку прыв'язуюць, шоб ажаніўся быстрэй. Так от хоць трохі, шоб пацягаў. А заплоцяць няхай, тады і знімаюць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

На Масленіцу чучала спальвалі. Пелі абыкнавенныя старынныя песні.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Масленіца, Масленіца,
Хто первы пападзе,
Таму блін перападзе.
Пелі песні всякіе.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Нямлей Вольгі Іванаўны, 1928 г. н.



Хто ўжо пажаніўся да Масленіцы, то добра. А хто не пажаніўся – браўно вязалі. Адкупляюцца тады ўжо: грошы даюць, водку. Калодкі вязалі дзеўкам, хлопцам.

Запісана ў в. Чаплін Лоеўскага р-на
ад Маджары Васіля Фёдаравіча, 1935 г. н.

На Масленіцу ўсё ўпрыгожвалі кругом вёскі, рабілі чучала з саломы ў цэнтры. На санках цягалі дзяўчынку і пелі:

Наша Масленіца-баламутка,
Пракатала сыр і масла дай няхутка.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Карнавушанка Хрысціны Анісімаўны, 1904 г. н., 1995 г.

На Масленицу ворожили так. Девки собирались у кого-нибудь у доме и пекли блины. Самые первые блины брали, выносили на ганак, клали его. Пускали собаку и уже смотрели: до чьего блина подбежит она первее и съест его – та девушка и выйдет замуж.

А на Масленицу было так: спекли блины. Я первый блин схватила и побежала. Добежала аж до школы. И встретила по дороге Рыгора. Ну, думаю, значит, он моя судьба. И на самом деле. Мы с ним поженились.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пікас Варвары Пятроўны, 1927 г. н., 2005 г.

Саракі

Саракі вясной былі. Празнавалі Саракі ў сакавіку 22 чысла. У еты дзень пагіблі сорак мучанікаў. На Саракі, казалі, прылятае сорак відаў пціц усякіх. А ішчэ гаварылі, калі ў еты дзень будзе мароз, то ішчэ сорак маразоў трэба ждаць.

На Саракі мамка ўранні пекла сорак піражкоў з макам, а ў адзін лажыла ўместа маку капейку, і каму пападзе яна, то той будзе шчаслівы ўвесь год.

Калыхаліс у еты дзень і на арэлях. У нас арэля вісела на вярбе, дак усе з вуліцы к нам прыходзілі, качаліс, песні пелі.

Ішчэ на Саракі трэба было ўранні прыцемкам прыйці ў павець і, не гледзячы, загрэбці рукамі абярэмак трэсак. Тады прынесці ў хату і пашчытаць. Калі

будзе сорак трэсак, то, значыцца, у етым годзе найдзеш на балоце сорак яечак вуціных.

У еты празнік і дзеўкі гадалі. Пяклі каждая па каржу. Тады памячалі, дзе чый, лажылі на зямлю, выпускалі сабаку да каржэй: і чый корж сабака первы з'есць, значыцца, тая дзеўка замуж первая пойдзе.

А ішчэ з крышы выцягвалі саломіны. Раней жа крышу з саломы рабілі. Дак калі доўгую саломінку выцягнеш, то доўга жыць будзеш, а калі кароткую – мала.

Прыказак на Саракі багата якіх е: на Саракі сарока звівае кубло з сарака галінак; на Саракі прылятае сорак жаваранкаў; на Саракі прылятаюць з выраю шпакі.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Смалянчук Кацярыны Сцяпанаўны, 1921 г. н., 2003 г.

На Саракі 40 выр'яў прылятае. Дзелалі скокалку. Гулялі ў 5 камушак, лавілі іх. Хрэшчыкі пяклі.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Саракі – гэта ў марце месяцэ, 22. Назва ад 40 мучанікаў. У еты дзень асоба нічога нельзя было дзелаць. Перад эцім ткалі, пралі палатно, бялілі яго для таго, каб 40 выраяў прыляцела, пеклі 40 пампушак.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Соракі – гэта вясной было. На Соракі сорак вур'яў прыляціць.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

А на Сарака чэраз крышу перакідалі сорак палак. Саракі (22 марта) – рэлігійны празнік сарака мучанікаў. Гэта рабілася, штоб 40 кубел найці на лугу. Кубло – гняздо вутак з яйцамі. Тады ўжо бачыш, што вуткі начынаюць ляцець. Чэраз нядзелі 3 пайдзёш па лугу, глядзіш, дзесяткі 2–3 прынясеш.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

На Соракі пяклі ладкі бабы. Пякуць сорак ладак, а потым перакідваюць іх чэраз хату. Казалі, што калі пойдзеш па балоце, уціных яечак набярэш багата.

На Соракі гулялі ў гульні.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Фурс Праскоўі Лявонцьеўны, 1925 г. н.

Благавешчанне

На Благавешчанне хараводы вадзілі, пелі. А так больш нічога тутака не рабілі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Было Благавешчанне 7 апрэля. Нічога нельга рабіць. Еслі курыца знясе яйцо, то нельзя пад сядушку лажыць, а то будзе калекай цыплёнак.

Дзеўка касу не пляце, а пціца гняздо не ўе.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Благавешчанне было перад Паскай, 7 апрэля. У еты дзень нічога не рабілі: пціца гнязда не ўець, воласы жэншчыны не закручвалі. Да Благавешчання заборы не гарадзілі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Трэба, штоб чыста было ў хаце. Нельзя да Благавешчання забор кутаць, а то дажджу не будзе.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Адным са значных празднікаў было Благавешчанне. Празднавалі яго 7 апрэля. У гэты дзень як бы вясна прыходзіла. Гаварылі, да Благавешчання зямля спіць, таму ніхто не капаў зямлю, не паліў мусар, не гарадзіў заборы, нельзя была окны выстаўляць, адкрываць іх.

Якая пагода на Благавешчанне, такая далжна быць пагода і на Пасху. А ўжо пасля Благавешчання людзі пачыналі веснавыя работы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Лізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

КОЗЛІК

Спявалі і вадзілі козліка на Благавешчанне.

Як вазьму я козліка да за рожачкі,
Павяду я козліка па дарожаньке.
Ой, так, так, паціхонечку,
Ой, так, так, памалесеньку.
Скажы, скажы, козлічак, як хлопцы скачуць,
Пакажы, пакажы, козлічак, як дзеўкі плачуць.
Ой, так, так, паціхонечку,
Ой, так, так, памаленечку.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.

АБРАД «ВАДЖЭННЕ ТАНКА»

Гэты абрад рабілі на Благавешчанне. Сабіраліся ўсе: і старыя, і маладыя. Станавіліся ў хараводы, браліся за рукі і выводзілі «васьмёркі». Танок называецца «козлік»: рабілі круг, а пасярэдзіне сядзіць дзед і баба. Гэта быў шутніцкі танец.

Баба пяе:

Як жа мне, як жа мне
Старога любіці?
Ой, гора! Ой, гора!
Кручына вяліка!
Як жа мне, як жа мне
З старым абнімацца?
Ой, гора! Ой, гора!
Кручына вяліка!
Як жа мне, як жа мне
З старым цалавацца?
Ой, гора! Ой, гора!
Кручына вяліка!

Усе бяруцца за рукі, водзяць танка ў васьмёрку, з васьмёркі – у круг, і зноў – у васьмёрку.

Баба з дзедам цалуецца, дзед пяе:

Да вазьму я козліка
Да за рожанькі,
Павяду я козліка па дарожанькі,
Прывяжу я козліка к дубоваму кусту,
Да дам жа я козліку
Ячную лусту,
Да буду я козліка біці, ругаці,
Да буду ж я ў козліка
Праўды пытаці.
– Скажы, скажы, козлічак,
Як дзеўкі плачуць?
– Вот так, так памалесеньку,
Вот так, так паціхесеньку.
(Усе платком выціраюць слёзы).

Да буду я козліка біці-ругаці,
Да буду ж я ў козліка
Праўды пытаці.
– Скажы, скажы, козлічак,
Як дзеўкі плачуць?
– Вот так, так памалесеньку,
Вот так, так паціхесеньку.

Усе скачуць і танцуюць. Дзеда наражалі козлікам: бараду нацаплялі і рогі з бумагі рабілі, і дзед таксама плясаў.

ХАРАВОД «ДРАМА»

Сядзіць Драма на скамейкі за кудзеляй. Яна чутачку напрала і заснула. Вакол яе ідзе харавод.

Сядзіць Драма, пад кужалём дрэмлючы,
Пад кужалём седзячы.
Устань, Драма,
Устань, прадраміся,
Ідзі, Драма, вадзіцы напіся.

Парэнь падносіць ёй вады, а яна спіць далей і не прасынаецца, і не п'е. Апяць танок:

Устань, Драма,
Устань, прадраміся,
Ідзі ў шынок,
Гарэлкі напіся.

Хлопец падносіць ёй гарэлку, а яна зноў не п'е і не прасынаецца. Тады хлопец падыходзіць да яе ў трэці раз, а танок пяе:

Устань, Драма,
Устань, прадраміся,
Прыйшоў дружок,
Ідзі, палюбіся.

Тады яна прасынаецца і ідзе з ім танчыць.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н., 2002 г.

ЮР'Е

На Юрэй выганялі жывёлу ў поле, абразалі хвасты. Такая прымета была – кароткія хвасты. Дымам абкурвалі і сараі, і жывёлу. Ад маланкі пад страху вешалі асінавыя ветачкі.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Юр'я было ўжо 6 мая. Юр'я – гэта ўжо быў апякун жывёлы. Вось на Юр'я абязацельна абходзілі поле. Нагатуюць смачных страў, а ўвечары ўжо гуляюць. І таксама песні спявалі на Юр'я.

Юрый па межах ходзіць,
Па межах ходзіць,
Жыта родзіць.
Радзі, жыта,
Ядраністае, каласістае.

Таксама на Юр'я гаспадар устае рана і пасвіць жывёлу на расе, каб жывёла была здаровенькай.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Кулага Веры Васільеўны, 1939 г. н.
(раней пражывала ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на)

ЮРАЎСКАЯ ПЕСНЯ

Юрай, уставай рана, адамкні зямлю,
Выпускай расу на цёплае лета,
На буйнае жыта.
Завівай вяночкі на гады добрыя,
На жыта густое, на ядраністае,
На каласістае.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Пілека Ганны Мікалаеўны, 1937 г. н., 1999 г.

Юр'я – 6 мая. Ну, эта ж кароў выганялі первы раз. І абязацельна святой вярбой нада выганяць у чэраду. Давалі пастухам, шо была ў каго.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Шэстога мая Юр'я быў. Выганяюць кароў, каб яны да ўсходу сонца расы папілі. Выразалі хвасты ім. «Юр'ева раса лучшая аўса», – гаварылі. Еслі жыта заламалі, гэта шчытаецца, што эта ўжэ паддзелалі табе. Када карову выганяюць, то свячонай вярбой яе трэба выганяць.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Выганяю карову на пашу, замыкаю замок і кладу на парог, штоб карова перайшла, і тады кажу: «Святы Юрай, сайдзі з неба на зямлю, замкні маю кароўку ад змея лятучага, ад гада паўзучага, ад ветра ліхога, ад чалавека злога».

Яшчэ ў нас казалі так: «На Юр'я сена нада, штоб было і ў дурня». У еты дзень кажды год абразалі да ўсходу сонца хвост карове.

Запісана ў в. Катловіца Брагінскага р-на
ад Максімчык Алены Уладзіміраўны, 1932 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на)



Юр'я – эта яно 6 мая. Старыя ж людзі калісь абыходзілі поле. Нажнуць таго ж жытца, напякуць такія храсты і скату давалі. Ну, такой калісь абычай быў.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Каб выгнаць першы раз жывёлу ў поле, святілі вербу, і ёй гналі жывёлу з словамі: «Ідзі з Богам, кароўка».

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

ЮРАЎСКАЯ ПЕСНЯ

Зарадзі, Божа, жыта
Ды на новае лета,
Юр'я, юр'ева.
Коласам каласіста,
На ядро ядраніста,
Юр'я, юр'ева.
На таку ўмалотам,
На млыне прымолам,
Юр'я, юр'ева.
У печы румяна,
А на стале жадана,
Юр'я, юр'ева.

Юр'я, устань рана,
Юр'я, умыйся бела.
Юр'я, ідзі ў стайню,
Юр'я, сядлай каня.
Юр'я, едзь у поле,
Юр'я, адамкні зямлю.
Юр'я, пусці расу,
Юр'я, цяпленькую,
Юр'я, бяленькую.

Запісана ў в. Алішэеўка Лоеўскага р-на
ад Прымак Надзеі Фёдараўны, 1939 г. н., 1999 г.

Як пасвецяць вярбу, то яе ставяць у хляве, а пасля на Юрая гэтай ветачкай выганялі кароў, штоб яны самі прыходзілі дамой.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г. н.
(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на)

Юр'я так святкуюць. Празнік – значыць, не работаць. Утрам пасеюць агурцы. А так яшчэ ўтрам устаюць, жывёлу выганяюць. А перад тым ім хвасты падразаюць. Гэта нада здзелаць да васхода сонца. Не знаю ўжо для чаго, но так трэба было. Но каб адагнаць нячысцікаў, яшчэ могуць святой вадой папырскаць. Хто святкуе Юр'е, а хто і не святкуе. Кажуць: «Юр'я, каб было сена ў дурня, // А на Міколу падавай // Да і вілкі захавай».

Ходзяць утрам па расе голымі нагамі на Юр'я, каб ногі не балелі, умываюцца там расой той жа. Кругом поля абходзяць, хто моліцца, а хто не, хто другое што знае.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н., 2002 г.

Было Юр'е шостага мая. С утра ходзяць у царкву. Бацюшка ідзе за дзярэўню і свеціць жыта, ідзе з пеўчымі, а потым назад ідуць. І ўсё – празнік канчаецца. Кароў выганяюць, калі цёпла вясна, як калі. Гатовяць на Юр'е, як і цяпер, усё што лучшае.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Так не работаем на Юр'е, але гуркі саджаюць, каб яны добра раслі. Каровам хвост падразаюць, сена трэба штоб хваціла. Ходзяць у цэркву.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

На Юр'е карову гонім у поле, бацюшка свеціць худобу, хвост падразаем худобе да сонца. Як кажуць: «Да Юр'я штоб сена было і ў дурня».

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

Па завядзёнцы святога Юр'я адзначалі 6 мая. Да Юр'я і каню ні хваста, ні грывы не абразалі.

Да сонца нада скаціну вывесці на поле, штоб не прапала первая веснавая раса. Пастухі сабіралі гэтую расу і абціралі і коней, і кароў. Зачэм? Каб не хварэлі, а каровы, штоб давалі малака болей. Пастухі абязацельна бралі з сабой на ноч каўбасу, лажылі крэст у карман і высокі каравай. Такая завядзёнка была.

У эты дзень паглядалі ў неба і чакалі дожджык: гаварылі, што еслі будзе лівень, тагда вырасце вялікае жыцейка.

Мамка мая абязацельна казала, што еслі будзе раса, тагда будзе коням даволі аўса. Эта яе любімая пагаворка ў дзень Юр'я.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2002 г.



У Юр'еў дзень кароў нада выганяць у поле да сонца, абразаюць ім хвасты. Абыходзілі поле на Юр'е.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Да 6 апрэля трэба выгнаць кароў. Нада вербічку браць. Калі лук пляцеш, то етай пляцёнкай выганяюць, штоб карова назад не верталась, паслась добра. Як пастухоў угашчалі? Яічкамі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Выганялі кароў у поле. Бярэш ніты, вешаеш замок, кладзеш на парог, кудой карова ідзе. Свечанай вадзічкай кароўку абліваюць, вярбой паганяюць. Калі первы раз гоніш карову, то каждая хазяйка ідзе на поле з каровай.

Верылі, што малако адбіралі ведзьмы.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

З Юр'я начыналася вясна. Ужо выганялі скот пасля зімы на пастбішчэ. Але сначала хазяін запаліваў свечку і тры разы абыходзіў, патом апырскваў свячонаю вадзічкай. Патом браў свячоную ветку вярбы і падганяў жывёлу з хлева, а ветку ўтыкаў у дзверах яго. Гэта азначала, што ніякія злыя духі сюды не пройдуць. Яшчэ свячоная вербачка ўторквалася ў землю ў полі. Так людзі надзеяліся, што яна ўбераж гэта поле ад граду.

На Юр'я людзі пелі песні і весяліліся.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.



Юрэй вясной быў. Гулянне спраўлялі, хадзілі к рэчкі, хадзілі ў храм. Жылі мы хутарамі. Самапасам кароў ганялі. На Юр'я свяцілі каровак, бацюшка прыязджаў.

Тых, хто яйца закопваў, дык іх называлі калдунамі. Яйца падкідвалі, каб што-та плахое здзелаць ці худобе, ці чалавеку.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Вольгі Пракопаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Калісь святілі ваду, кароў святілі гэтай вадой. Кароў на поле выганялі. У вербную нядзелю вярбу святілі. Каб карове добра было, вярбу ў хлеў вешалі. Так рабілі, каб пажару не было.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

На Юр'я первый дзень выганялі карову на поле. Нада абязацельна выганяць яе пасвяцонай вербай. Вербы ў нас всегда ў сараі пад страхой былі. Вывешвалі і ў дзвярах у сараі, хто дзе. Эта харашо і ад гразы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

На Юр'я ранечка ўстанеш утрам і выганяеш скаціну, каб яна ўжэ па расе пахадзіла. Выганялі пруцікам. Як вярбу пасвеціш, пруцік бярэш, скаціну выганяеш і як прыгоніш – назад у сарай, каб яе скот не калоў. Праганялі, а той пруцік бераглі ўсё ўрэмя.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кулеш Валянціны Сцяпанаўны, 1940 г. н,
Самуенка Любові Аляксандраўны, 1938 г. н.

Юрый – гэта Георгій Пабеданосец. Он шчэ ізабражаецца на іконе, как таго змея ўбівае. На Георгія, 6 мая, всегда ходзяць у храм, набіраюць святую ваду і легонька абмываюцца. Не выціраюцца, штоб гэта ўсё вайшло. І вы пачуствуеце себя гаразда лучшэ.

На Юр'е бацюшка воду асвеціць, потым ідзе на выганы. А там на каждым выгане скот асвеціць, а патом ідзёт на жыта.

Юрый – зашчытнік жывёл. Запальвалі стрэчанскую свячу і абходзілі вакол хлява. Абязацельна паганялі жывёлу галінкай пасвяцонай вярбы. Галінка засталася з вербнай нядзелі. З вярбінкай скаціну праважалі і прыходзілі з ёй. Вярбінку потым тыркалі ўнутры хлява, каб засцерагчы ад грома, ад града.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

На Юр'я первый раз кароў выганяюць. Нада хвост ім падразаць. Ікону бяруць, вярбу свечаную. Хвост падразаць нада, штоб ведзьма не ўкусіла. Эта ад ведзьмаў, каторыя шкоду робяць. Яйка свечанае дзержаць у хаце ад гразы.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Юр'я – ета первы празнік. Лета пачынаецца. На Юр'я ета вельмі ўсё добра сеяць: і гуркі, і буракі. Само галоўнае – гуркі.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

А тэ ж яно Юр'е 6-га даўжно быць. Жывёлу выганялі на пашу, а як жа!

Карову на Юр'е нада выганяць зрання. На пашу выгнаў, ды няхай ідзе. Пастуху нада штось вынесць, выганьшчынку якую. Хто выганяе карову, той і нясе, што е ў каго.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Дак эта ж 6 мая Юр'я. Вярбу свяцілі. Вербачкай і пагналі карову. А пастуху выносяць жэ хлеба там, сала кусочак, як выганяюць кароў. А на Юр'е ідзе бацюшка з цэрквы за дзярэўню і свеціць жыта.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

Вербная нядзеля

Перад Пасхай дзяцей вярбой так білі. Ну, ета ж вербная нядзеля. Эта калісь казалі, нарадзіўся Ісус Хрыстос. Ён нарадзіўся ў пяшчэры, а там пастухі паслі ўжо скот, там была іхняя пяшчэра. Дык ён хаваўся, яго ж лавілі. Мацер Божая ў той пяшчэры радзіла. Дык пастухі агледзелі, ну, а іх ужо шукалі. Пастухоу пытаюцца, штоб ужо Ісуса Хрыста ўбіць. Во дак тыя пастухі падказвалі, дык ён ужэ пасадзіў яе на асла, пав'ёз яшчэ, шчытай, у Палесціну. Дак вёз па такой дарозе, што ўжэ трэба дарогу слаць, дык ён ламаў вербу і масціў дарожку, і вёз яе з дзіцём. Яна на асле сядзіць, а ён яго вядзе.

Так, а цяпер Вербная прыйшла. Ужэ берут вербачку ломяць, бо эта верба Ісуса Хріста. А цар Ірад убіў 40 тысяч дзяцей, а Ісуса Хріста не найшоў. Вот усіх народжаных убіваў, убіваў, а яго не найшоў.

Ісус прыйшоў у нашу веру, тады ж яго распіналі, а ён жа васкрэс. Эта ў тую ноч, каторую Пасха была, не на тую, а на страсную. Свечкі палілі. Страсныя, казалі, свечкі. Эта ўжо ноччу пойдзеш, пазапальваеш. Эта ўжо страсная свечка. Да эта, шчытай, яго закапалі, прыкапалі, паклалі камень.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Вербная нядзеля азначалася святкаваннем пачатка вясны. Заўсёды рвалі веткі вярбы, а яна толькі пачынала распускацца ілі саўсім яшчэ не распускалася. Потым разам з дзяўчатамі або іншы раз з мамай ішлі ў царкву, каб пасвяціць гэтыя розкі. Паднімаліся вельмі рана, каб не самай апошняй прыйсці ў царкву. А свяціць хадзілі ў Лоеў, гэта заўсёды для нас было свята, хоць трэба было ісці вельмі далёка, 12 кілометраў.

У гэтую нядзелю працаваў базар, вяртаючыся дадому, куплялі канфеты, у каго, канешне, былі грошы.

У Вербную нядзелю, вярнуўшыся з царквы, маці хлястала нас гэтай вярбой і прыгаворвала: «Верба хлешча, бей да слёз», або «Вярба б'е, вярба б'е, слухай бацьку і мяне».

Потым маці ўтыкала гэтую вярбу ў хляве адразу ў двярах, а калі выганялі кароў першы раз на выган, то маці заўсёды брала гэтую вярбінку і праганяла ёй карову і перад выхадам са двара пасыпала свячонай соллю, якая засталася пасля Пасхі.

Таксама ўтыркалася вярба і ў дзверы хаты, у іконы. І яны там віселі круглы год да Георгіева дня. Гэта вярба спасала ад усякіх напасцяў: маланкі, грому, ад хвароб у двары і ў хаце.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Прышчэп Марыі Ульянаўны, 1927 г. н., 1993 г.

Да, мы верылі ў Бога, да і сяйчас верым. У царкву ездзім, свецім і ваду. Гэта як жа. На Вербную нядзелю абхаждзенні рабілі – усе з цэрквы выходзяць, бацюшка тры разы абходзіць усіх. Людзі моляцца. Вербачку прыносяць дамоў, стаўляем у цвяты, што на Макавея свяцілі. Тады гэтай вербачкай, першы раз як кароў выганялі пасвіць, памахаем па спінцы, каб добра было. Ставілі на акно да следуюшчай Пасхі.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Валянціны Мацвееўны, 1935 г. н., 2005 г.

Вярба, кажуць, ад гразы. Цопалі людзей этай вербай. Казалі: «Вярба б'е, я не б'ю». На вербную нядзелю штоб чыста было ў хаце, сам штоб чысты быў.

На Пасху свецяць паску, валачобнае давалі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

На Вербную нядзелю вярбу свяцілі ад молніі. Свечкі палілі. З цэрквы нада прынесці свечку, штоб ана гарэла. Зразу ж, пасвяціўшы, нада пасцёгаць, штоб здаровыя былі, і казалі: «Не я б'ю, вербічка б'е». Раней былі абажуры, уверху на паталке крэсцік дзелалі свечкай. Захоўвалі свечкі ад усякага нядобрага.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Страсная нядзеля

У Чысты чацверг трэба было мыцца. Грэлі ваду дома, і не ідуць нікуда. У каго была баня, дак тамака мыліся.

У пятніцу ўжо нічога нельзя было рабіць. Ну, таму шта Хрыста распялі і есці ўжо нельзя. У пятніцу, суботу гатовілі ўжэ, усё на сталах стаіць падгатоўленае.

Ну, а то ж на ўсе гэтыя куцці вячэрнія вызываюць сваіх радных, пакойных і ставяць куццю, сахарам пасыпаюць, вадзічкай кіпячонай паліваюць і гукаюць памершых. Бог мілавал: не прыходзяць яны. А на стале заўсёды астаўлялі нешта.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Чысты чацвер

У Чысты чацвер штоб усё ў доме было чыстае. Да ўсхода сонца ўмываліс. Штоб дзяжа чыстая была, яе ставілі на двары, адкрытую да сонца.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Вялікдзень

Накануне Вялікадня пяклі пасху, красілі яйкі ў красны цвет, а хто хацеў, дык і ў зялёны, розавы, сіні. Вечарам ішлі ў царкву на ўсяночную (на службу). Уранні, калі служба канчалася, свяцілі пасху. Дома з самага ранку ўсім дамашнім давалі па кавалку свяцонай пасхі, яек, вады. Збіралі багаты стол і частавалі радных. Такжа запрашалі ў госці сваякоў, розную радню. Самі хадзілі да радні з пачастункамі і маленькімі падарункамі (ці то кусок матэрыі, ці яшчэ што) з самымі добрымі пажаданнямі. У гэты дзень не здаровалісь адзін з адным, а казалі: «Хрыстос васкрэсен», ім адказвалі: «Ваісціну васкрэсен», перахрышчваліся і цалаваліся. Калі пяклі пасху, глядзелі: еслі пасха падымецца добра, красіва, выпечацца харашэ (каб не была глёўкая), то і ўраджай у гэтым годзе Бог пашле добры, і ў гаспадарцы будзе поўна, у доме будзе ладна. Пасвяцоную гарбушку аддавалі худобе, каб здаровая і сытая была.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

У нас Пасху святкуюць, калі падходзіць па чыслу календара, а не ў адно і тое ж врэмя. У маі, калі ў апрэлі святкуюць, яна не ходзіць у адзін дзень.

На Вялікдзень яйцы красныя качалі ды гулялі, карагоды вадзілі. Яйкі фарбавалі ў хто які хацеў колер, але часцей ад луку шалуху бралі і варылі ў ёй яйкі. Ета быў красны цвет.

Хадзілі на ўсеначную ў цэркву, свяцілі ўсё, што бралі з сабою. Бралі хрэн, соль, пасху свяціць, мак бралі, але не знаю, для чаго.

З пасвячоных яечак святую шалуху закапвалі ў землю. Ета ад асоту, каб не рос на агародзе.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Мікітаўны, 1928 г. н., 2002 г.

На Пасху людзі весяляцца, спяваюць, у біткі гуляюць. Ета ж галоўны дзень, ніхто не працуе. Яйкі красілі перкамі з лука ў аранжавы цвет. Валачобнікі на Пасху не хадзілі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Великодный день (по-нашему Паска) отмечается три дня. К ней готовятся задолго, за месяц. Перед Паской идёт большой пост, а поэтому молочное, мясные и яйца не едят в пост и собирают к Великодню.

Четверг называется чистым, поэтому к этому дню всё должно быть убрано, вымыто, развешено. Полотенце развешивали на образы, на портреты, белили потолки.

В субботу (она называлась красная) с самого утра выпекали паски, красили яички, готовили мясные и всевозможные блюда.

В субботу ходили в церковь на всюночную. Шла служба, посвящённая Великодню. Святили паски и всё, что приносили с собой, и рано утром расходились по домам. Когда приходили домой с церкви, говорили: «Христос воскрес», а домашние говорили: «Воистину воскрес». Повторяли три раза и христосовалися. Домашние накрывали стол. Первым ели то, что принесли с церкви, потом это же ели утром на второй и третий день. Потом брали яички, выходили на улицу и играли у битки: один держал яйцо, а другой ударял. Чьё яйцо разбивалось, тот отдавал его другому. А поэтому старались с дому брать яйца покрепче.

Запісана ў г. Гомель
ад Юрасік Валянціны Савельеўны, 1946 г. н.
(раней пражывала ў в. Рудня-Каменева
(раней Папоўская Рудня) Лоеўскага р-на), 2002 г.

Ідзець сначала Чысты чацвер. Усё на двары і ў хаці моем, усё перачысцім. А ў красную суботу красілі яйцы. А чаму красілі? Вось легенда ёсць. Калі мучылі Ісуса Хрыста, узялі жэншчыну і рабёнка, спраталі пад карыта. І гаварат Ісусу: «Калі ты Бог, скажы, хто пад карытам». Ісус гавора: «Свіння і парасёнак». Яўрэі перавярнулі карыта, а там точна, свіння з парасёнкам. З тых пор яўрэі не ядуць свініны. Вось і на ўтра етае, трэба каб усё чысценькае было. Нас, дзяцей, у чыстую сарочку ды штанішкі адзенуць. Пойдзем у школу, яйкі вазьмём, у біткі гуляем. Калі ў цэркву хадзілі пры савецкай уладзе, дык наказвалі, не разрашалі етае. А ўсё раўно ў цэркву хадзіць нада.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Пяком паскі, яечкі красім, гатовімся. Ета ж усё заранее. Дзелаецца ўсё за дзень. Утрам печ нялъзя тапіць, нанач усё рабілі. У цэркаўку хадзілі. Ад нашай дзярэўні цэрква далёка, дык мы сабярэмся гуртком, каб разам ісці, а там ужо раніцою дамоў ідзем. Пасвецім яйкі, паскі. Ды ўтрам і гавораць усе: «Хрыстос уваскрэс!» – «Ваісцінна ўваскрэс!» Елі тады ўжо, садзіліся, накрывалі стол. Кажуць: «Як святога паясі, так разгавеешся».

Калі астануцца шкарлупкі ад яек ды ад луку, дык не выбрасываем. На акне пакладзем. Кажуць, дом асвяшчае ад нячыстай сілы ды ад гразы. Вада свячоная стаіць у мяне ўжэ колькі год, а асадку няма.

Калі з цэркві ішлі, дык свечкі няслі дадому запаленыя.

Празнавалі добра. І парасят б'ют, і яечкі красяць, булкі пякуць, мяса вараць. У царкву хлеб, соль, яечкі пасвяціць ходзяць. Бяруць усё: і канхфеты, і пячэнне. Пасвеціць бацюшка ў п'яць часоў да шасці. Усе збіраюцца, прыязджаюць у хату, гавораць: «Хрыстос васкрэс!» Умываюцца яічкам красным, ліцо умываюць. Садзяцца за стол, прыязджае радня. Гуляюць у біткі. У Чысты чацвер убіраем у хаце, памыюць усё. У Красную Суботу булкі пякуць, яечкі красілі.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Валянціны Мацвееўны, 1935 г. н., 2005 г.

ВАЛАЧОБНАЯ ПЕСНЯ

Валачобнікі валачыліся,
Хрыстос васкрэс,
Сын божый.
Валачыліся, намачыліся,
Зайшлі к бабцы, пасушыліся.
Была ў бабкі курка-рабушка,
Нанесла яечак поўны запечак.
Усім валачобнікам па яечку,
Аднаму Ванечку не выстаралася.
Дам табе, Ваня, пару коней.
Ён коней не бярэ і дамоў не ідзе.

Дам табе, Ваня, стада авечак.
Ён авечак не бярэ і дамоў не ідзе.
Дам табе, Ваня, красную дзеўку.
Ён дзевачку ўзяў ды дамой пайшоў.
Хрыстос васкрэс,
Сын божый.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Яйца красілі, булкі пяклі. У красны колер фарбавалі. Распіналі Ісуса Хрыста, кроў красная цякла, таму і яйца красныя. Казалі: «Хрыстос васкрэс». 6 нядзель ад Паскі да Ушэсця казалі гэта.

Гулялі ў біткі за сталом, аддавалі тое бітае. Качалі яйцо з горачкі: чыё дальшэ пакоціцца, таго і лёс длиннейшы.

Хадзілі чэраз нядзелю на кладбішчэ. Мёртвых вялікдзень пасля Паскі. У чацвер, Чысты чацвер мыліся ў бані ці ў хаце ў балее, убіралі ў хаце.

Хросныя прыносілі валачобнае і гасцінцы. Баба прыходзіла, якая на хрэсьбінах была. Частавалі яе.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.



Ну, на Пасху абычна (шчэ мама мая была) ужэ всягда пеклі паскі. А то былі такія высокія макотрыкі, спецыяльна для Пасхі. І вот ложаць у печ, і яны вялікія выраставалі. Патом яйкі красілі, больш лукам красілі, у такі колер красна-карычневы. А цяпер ужо красяць разнацветныя, спецыяльна прадаюць парашок.

Да Пасхі стараліся і пабяліць, і памыць, і кругом парадкі навесці. А перад Пасхай быў пост. Жэншчыны ўсе пасціліся. Сейчас ужэ шчытаюць эта лішнім, ну, а раньшэ самі былі ўвераны людзі, што гэта аберагае. Некаторыя хадзілі ў царкву, насілі паскі свяціць. Прыносілі паскі, утыркалі свечкі і стараліся, каб не пагасла, пакуль данясуць дадому. Хто ў фанарык ставіць, а хто ў сцякло лампавае. А патом на сцяне чатыры точачкі дзелаюць.

Ужо после, калі Радуніца, на кладбішча ідуць, навяшчаюць сваіх мёртвых.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кукса Яўгеніі Паўлаўны, 1922 г. н., 2005 г.



Перад Пасхай быў Вялікі пост. Паследняя нядзеля перад Пасхай называлася Вербнай нядзеляй. Тады свяцілі вярбу і ставілі яе ў хаце. Потым быў Чысты чацверг. Тады прыбіралі хату, двор, а хто вымыецца да таго, як сонца ўзойдзе, то не будзе балець цэлы год.

Пасха – то вялікі праздник. Тады пякуць булкі, красяць яйкі звечару. А патом, ужо ўвечары або рана ўтрам ідуць у цэркву і свецяць іх. Яйкі кладуць у ваду, а

вадой умываюцца, каб быць румяным увесь год. Так, патом уся сям'я садзіцца за стол, сначала ядуць свячонае, выпіваюць, а патом ядуць астатняе. Малыя ў біткі граюць. Тады нельзя было нічога рабіць, і ўсе былі добрыя і ласкавыя.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Лізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Прыкметы на Пасху былі не такія, як цяпер, а старынныя.

Паску свяцілі, прыходзілі, разгаўляліся. 3 дні не работалі, пака празнікі былі. Яйкі фарбавалі ў шалухе з цыбулі. Гулялі ў біткі. Хто выб'е, той забірае яйка сабе.

Качалі яйкі. Ідзеш на кладбішча на дзень мёртвых, качалі па магілцы і закопвалі.

Паску ў пятніцу рашчынялі, у суботу пяком, а тады ідзём у цэркву на ўсяночную. Раньшэ хадзілі шчадроўнікі, нашчадруюць хто што: хто калбасу, хто сала. Дарослыя гуртком хадзілі, чалавек 5–6 заходзіла ў кожную хату.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Пасха – бальшой празнік. Яечкі красілі, паскі пеклі – гатовіліся, у біткі гулялі. Чысты чацвер быў – штоб чыстата была ў хатах і вяздзе. У Красную Суботу красілі яечкі. Чаму красілі ў красны цвет? Кажуць, што не верыў адзін чалавек у Бога і кажа: «Еслі есць Бог, то хай маё яйцо ў руцэ стане красным». І яно стала красным.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Яйца красілі ў разныя цвета, шкарлупой з лука абычна ў красны цвет. У біткі гулялі на первый дзень, на Пасху. У асноўным мужчыны гулялі. Жэншчыны этым не занімаюцца. Жэншчыны перад Пасхай натрудзяцца, нада ж гатовіць. А патом на ўсюначную ідуць ў цэркаў да пасвецяць пасхі. А патом прыходзяць да разгавеюцца. А тады лажацца спаць, аддыхаць. А мужчыны пашлі, мужчыны гуляюць. Сначала ўтрачкам святога кушаеш, а патом ужэ всё астальное. А патом можна аддыхаць ужо. Паску пеклі з ізюмам, а пірагі – з макам, з карыцай. На верх клалі крэсцік, пляцёначку, штоб было красіва. Хадзілі к родственнікам, каб абязацельна іх паздравіць. Песні не пелі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.



Эта очань вялікі празнік. У гэты дзень Хрыстос уваскрэс. Пост да Пасхі дліўся 50 дней. У нас гавораць, калі мясаед малы бывае, значыцца, пост будзет бальшой,

длінный. А еслі мясаед быў балышой – 6, пачці 7 нядзель быў, значыць, у нас Пятроў пост усяго 3 нядзелі. На пост елі і рыбку, і ўсё, што Бог пашле. Мяснога не елі, малочнага тожа.

Да Пасхі рыхтаваліся ў Чысты чацвер. У чацвер я абычна пачынала пекці поснае, а назаўтра здобнае.

У Чысты чацвер стараліся ўжэ, штоб было чыста. Уставаць трэба ўсягда да солнышка, умыцца, пратрыце ручкі свае і не выцірайце. Гэта рабілася, штоб цела было чыстае, штоб не было ніякіх балячак.

У пятніцу ўжо пеклі здобныя булкі. Пятніца называлася Вялікай. Яйкі красілі ў красны колер, таму што калі к цару прыйшла жанчына, то яму нешта даказвала. Яна гаварыла, што Ісус Хрыстос уваскрэс, а ён кажа: «А паверу тады, калі гэтае яйка стане красным». І яно ў яго на глазах раз – і стала красным.

Перад тым, як ставіць булкі ў печ, трэба перакрэсціцца і паставіць іх. Абавязкова ставілі крэсцік на пасхе. Крэст ёсць крэст.

На Пасху гулялі ў біткі. Яйцы не каталі.

На трэці дзень Вялікадня хадзілі на могілкі. Хадзілі на ўсеначную. У цэркві свяцілі яйкі, булку, соль, хрэн.

Пасха празнавалась 3 дні. Первы дзень Пасхі – гэта сугуба сямейны дзень, а на втары дзень хадзілі ў госці.

На трэці дзень ужэ збіраліся ў нас абычна. Гуляем, пяём, танцуем кампаніяй.

Хранілі кусочак булкі і аркуша – эта на втарой нядзелі па Пасхе.

Валачобнікі і зараз ходзяць. Эта месныя людзі, якія ходзяць па хатах і паздраўляюць. Пелі велікодныя песні.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

Яйкі цыбуляй красілі. Булкі ўчынялі, дзелалі запарку. У біткі гулялі, хадзілі валачобнікі – дзеці, крэснікі, і булку даеш, і яйцо, і канхветы. Ужэ родзіцца дзіця, дак і кума, куму бярэш. Прыходзіш ужэ, угашчаеш іх. На Пасху дзеўкі гадаюць: мосцік здзелаюць такі да пад краваць ставяць, ложаць. Прыходзіць сон, які заказуеш сабе.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Пасха – эта быў такі рэлігіозны самы бальшы празнік. Да Пасхі быў Чысты чацвер. Эта ўжо ўсё робяць да Чыстага чацверга, у Чысты чацвер штоб усё было чыста. У Чысты чацвер была такая вячэра. Ну, я так не дзелала, што ўжо паелі пакуда да Пасхі. Калі атмецяць Пасху, тады ўжо прыходзяць і разгаўляюцца. У пятніцу была тайная вячэра. Павячэраюць, а тады ўжо ў васкрэсенне ўтрам, як пасвецяць пасху, тады ўжо разгаўляюцца. Пасха была тры дня, тры дня нельзя нічога рабіць. Ну, а цяпер робяць, а тады пасля Пасхі тры дня нельзя было нічога рабіць.

Яйца красілі ўсягда лукам – гэта называлася Красная субота. У суботу красілі яйца, пеклі пасхі. Цеста ўчынялі, потым клалі ўсё здобнае: туды і яйцо, і масла,

і смятанку. І пасхі палучаліся харошыя такія. Хто прыходзіў, усіх угашчалі (у нас ва дварэ было многа дзяцей, і ў мяне была руская печка такая). І ўсягда дзецям раздавала іх і на Пасху, і после Пасхі. У мяне было двое дзяцей, дак я раздавала іх дзеткам усягда.

На Пасху ўсягда абавязкова здароваліся: «Хрыстос васкрэс!» – «Ваісціну васкрэс!». Я-то не хадзіла, а саседзі маі ўставалі ў чатыры часы і ішлі свяціць у цэркаў. Там ужо ўсё расстаўляеш: ставіш пасху, яічкі, у пасху свечку ўтыркаюць, а бацюшка потым ходзіць і свеціць. Красіва, дзеткі, людзей многа-многа. З усяго раёна з'язджаюцца. А там ужо ў пяць такіх кругоў у цэркві сядзяць людзі і бацюшка выходзіць, і ў пяць радоў свеціць. Адных пасвеціць, другія падыходзяць. Красіва так было.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Міхаленка Раісы Парфёнаўны, 1925 г. н.
(раней пражывала ў в. Буда-Петрыцкая Лоеўскага р-на), 2005 г.

У Чысты чацвер пачынаюць гатовіцца к Пасхе. Усе ўбіраюць у хатах, у хлявах, самі моюцца, каб усё чыста было.

У суботу ўжо гатовяць на Пасху. Красяць яйца ў красны цвет лукам. Красілі і ў другія цвята. Мы, малыя, сабіралі падснежнікі і красілі яйца. То быў светла-галубы цвет, красівыя яйца былі. З яец клалі шкарлупкі ў мяшочак і хранілі іх для таго, каб з вясны перад тым, як сеяць, закапвалі ў зямлю, каб ураджай добры быў, каб вароны не нападалі разныя.

Ад ведзьмаў абараняліся: Пасху замачвалі ў вадзічку, накрывалі крышкай, і стаяла гэта амаль цэлы год. Скацерць, на якой елі, не сціралі, а так астаўлялі, каб усё ў сям'і нармальна было. А як пройдзе паўгода і ў сям'і ўсё добра, то можна ўжэ і пасціраць.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

А на Вялікдзень сальцясоны пеклі і ўсё такое сур'ёзнае. Яйкі фарбавалі па 500 штук. Яйкі фарбавалі ў красны цвет адтаго, што Ісуса Хрыста як распялі, дык Маці Божая ўзяла яйцо і сарвала з цыбулі шалуху гэтую красную, закіпяціла і красіла. Яйка хранілі да следуюшчага Вялікадня, бо яно засцерагае ад злых духаў, ад вражых душ. Таксама кусочак булкі храніла – абараняе, думалі, ён. Пеклі булкі і ўпрыгожвалі крыстом, бо Хрыста ж на крысце распялі.

А народу ж было! Мамачка мая! Аж цяжка было зямлі. І тады бацюшка ўжо да 12 паўпраўляўся, а тады ўжо ў 12 з крыстом выходзіў, з евангеллем і крычыць: «Хрыстос уваскрэсень!» А мы ўжо, хто тут стаіць: «Ваісціну васкрэсень!»

На Пасху валачобнікі хадзілі, песні спявалі, а ім давалі калбасу, давалі паску, а яічак – ужо як набяруць, да елі цягнуць іх.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ніхто не садзіўся есць да абеда, пакуда не адправіцца ў цэркаў. Калі адправа прайшла, калі ўжо пастаялі там тыя, каторыя не елі, жэншчыны асобенна, тады ўжо на Пасху ставілі стол харошы. Яйца ў аснаўном у красны цвет красілі. У біткі гулялі. Пад шапку ложаць яечка. Ёсць пуха і дзюбка ў яечка. Ты ўжо гаворыш: «Пуха», паглядзеў – пуха, значыць ужо тваё яечка. Не, значыць, не тваё. Валачобнікі хадзілі ў гэты дзень і валачобнае насілі. Напрімер, еслі мае эта ўнукі, праўнукі, абычна давалі ім валачобнае на Пасху. Патаму што прынята было так. Якой-та апостал быў, бег, і яму далі яечка, крашанае яечка і сказалі, што ідзі і гавары: «Хрыстос васкрэс!» І эта яечка паказывай, што Ісус васкрэс. Краснае яечка было. З етага пайшло валачобнае.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Васкрасе, васкрасе,
Хама пасху прынясе,
А Хаміха-парася,
Ды задрыпалася.

На Пасху ўбівалі парася, пеклі пасхі і красілі яйкі ў кажуры ад цыбулі. Пасля Пасхі хадзілі на Мяртвых вялікдзень, дзе крыжом качалі па магілках пасвяцонымі яйкамі і пелі такія песні:

Жыта ў полі, (2 р.)
Жыта засявалі.
Ну, а маці з сваім сынам
Ціха размаўлялі.
Жыта, сынку, (2 р.)
Жыта не пшаніца.
Як ту дзеўку не хваліці, –
Яна чараўніца.
Жыта, маці, (2 р.)
Жыта не палола.
Як ту дзеўку не любіці,
Яна чарнаброва!
Жыта, сынку, (2 р.)
Жыта пара жаці.
Калі дзеўку верна любіш,
Трэба яе браці.
Жыта ў полі, (2 р.)
Жыта ўсё пажалі.
А ў нашым у сяле
Трэці дзень гулялі.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н.

Эта быў самы лучшы празнік. Напярэдадні забівалі свіней, каб на стале сала, мяса было. Тыдзень сабіралі яйкі, штоб было што пакрасіць. Мамка ўсегда паску

пякла, а мы з дзеўкамі-сястрамі ўжо ўкрашалі крастамі, ляпілі разныя «закулюшкі». Нада ж было не адну паску спеч. Эта ж нада было пачаставаць родных, саседзяў. А шчэ ж усегда маладыя хлопцы хадзілі па дзярэўні з песнямі і заходзілі ў кожны двор, дак ім нада была даць на шчасце.

Яйца красілі ў красны цвет: кідалі ў каструлю цыбулю і яйца, і, калі набярэцца цвету яйкі, вымалі іх.

На бальшых плашчадках сабіраліся ўсе і карагоды вадзілі, яйца качалі. Возьмуць лубок і качаюць яйкі, глядзелі, хто выйграе.

Малыя і маладзёж дзелалі качэлі і качаліся аж пад самую небу. Ой, так, помню, вясёла было: пасабіраюцца ўсе, смяюцца, крычаць, у біткі гуляюць, толькі трэск яіц чуцен.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Белянковай Веры Трафімаўны, 1918 г. н., 2002 г.

На Пасху прыбіраліся, ну, і цяпер жа прыбіраюцца. Сціраеш, прыбіраеш, мыешся. Усягда жджэш гэту Пасху, дык прыбіраешся. Быў Чысты чацвер. Калі ж то былі дзежкі такія, дык ужо і вышкрабалі іх. Павышкрабаеш іх, вымаеш і лапатачкі, і бочачкі гэтыя. Яно-то і цяпер стараешся, штоб да Чыстага чацвярга ўсё падзелаць. Пасха – і ўсюды чыста. У пятніцу пачынаеш пасхі ўчыняць, яечкі красіш, печ топіш. Хадзілі на ўсяношчную. Сабіраліся, сядзелі дзе-небудзь, а тады ўжо, як пасху свяціць, у цэркву ішлі. Пасху свяцілі ў 12 часоў. А патом ужо прыходзіш дамоў, прыносіш тую пасху, ставіш на стол і разгаўляешся, еш тады ўсё. Гулялі ў біткі. Латкі такія ставілі на вуліцы. Госпадзі, як мы ждалі, калі былі малыя, штоб новае плацце было, прыбіраліся. Эта цяпер усягда прыбраўшыся, а раней мы хадзілі ў палатняных плацішках, палатняная сумка ў мяне была. Госпадзі, калі маці скажа вычысціць пад печчу, тады ўжо лезеш, і табе дасць яечка. А цяпер хто палезе? Калі скажаш, што там грошы ляжаць, тады можа і палезе хто. А тады былі марозы, халодна, дык куры пад печчу сядзелі. Палезеш, вынімеш і даш матке, каб пасвяціла. А цяпер, мае дзеткі, ніхто не хоча гэтага. Валачобнікі хадзілі. А што яны казалі, не памятаю. Пасля Пасхі можна было рабіць, а калі Пасха – тры дні – то ўжо нічога не рабілі.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Каўтуновай Юліі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Паска – ета самы вялікі празнік з усіх празнікаў. У еты ж дзень уваскрэс Ісус Хрыстос.

Да Паскі гатовіліся за нядзелю, а то і болей. Бялілі печ, сцены, столь, мылі вокны, пасцель усю, мост вышкрабалі, ён жа тады быў някрашаны, дак дзяркачом яго мылі, каб жоўценькі быў. На дварэ ўсё смецце падмяталі, нятрэбныя рэчы спальвалі. У Чысты чацвер усё прыбіралі, самі мыліся, каб увесь год чыстым хадзіць. А ішчэ ў еты дзень на гародзе добра б было што пасеяць, кажуць, тады трава не зарастае так. І што пасееш, то і палоць трэба.

Якое надвор'е ў Чысты чацверг стаіць, такое і на Паску будзе.

У пятніцу гарох і хлеб добра сеяць. Вельмі вялікі ўраджай будзе.

У суботу ўжэ яду гатавалі. Учынялі паскі, піражкі ўсялякія. Да Паскі ж пост быў вялікі, дак нічога скаромнага не ядзяць. А на Пасху ўсё можна. Дак і каўбасы, і мяса гатовілі, і ішчэ ўсякую ўсячыну, у каго што было.

Усе баяліся, хацелі, каб паска ўдалася. А то бывае, што ў печы не падойдзе ці патрэскаецца. Тады, гавораць, што ў сям'е год цэлы разлад будзе.

Ішчэ ў суботу вечарам ішлі ўжэ ў царкву і там аставаліся да самога рання. Маліліся, Хрыста ўсхвалялі, ён жа ў еты дзень, у нядзелю, уваскрэс. Таго ж цэлы тыдзень і здароваюцца так: «Хрыстос уваскрэс». А адказаць нада: «Ваісціну ўваскрэс». І пры етым тры разы пацалавацца трэба.

Уранні ў нядзелю, як пасвеціць бацюшка тое, што прынеслі, усе скарэй беглі дадому. Хто первы прыбяжыць дадому, той первы будзе цэлы год ва ўсіх работах. Уранні перад ядой абязацельна нада з'есці свяцонае яйцо, хлеба кусочак, а ўмывалісь у вадзе, у якой пакачаюць свяцонае яйцо. Ета каб ліцо было такое румянае і круглае, як яечка. Яйцы ж на Пасху красілі ў красны цвет. Шкарлупінне з іх не выкідвалі, а неслі на поле і пасыпалі ім землю. Ета рабілі, каб ураджай добры быў. Ішчэ цэлае яйцо лажылі на хаце, каб гром у хату не ўляцеў. Хлеб свяцоны давалі скаціне з'есці, ад нячыстай сілы зашчышчалі. А калі карову выганялі на пашу ў первы дзень, то яйцом, з Паскі якое засталося, качалі паміж рог, прыгаворвалі пры гэтым: «Будзь, мая кароўка, такая круглая, як яйка».

На могілкі хадзілі да памёршых і качалі яйкі. Прасілі памёршых устаці і вярнуцца дадому.

Паска ішла тры дні, і ўсе етыя дні нічога няльзя рабіць. Усё загатаўлялі раней, у суботу. Хлеб і той рэзаць няльзя, грэх вялікі.

Гулялі етыя дні на вуліцы, песні пелі, у біткі з яйкамі гулялі. У каго самае крэпкае яйцо, яго называлі мацаком.

На арэлях качаліся ў етыя дні. Няльзя было ні ругацца, ні плахога жадаць нікому, бо ўсё звернецца да цябе.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Анікеенка Марыі Маркаўны, 1913 г. н., 2003 г.

У Пасху яйкі красілі толькі ў красны цвет, шалухой ад цыбулі. Булкі пеклі з дражджавога цеста, абавязкова крэсцікам упрыгожвалі, таму што крастом хрысцяцца. Перад Пасхай апраналіся толькі ў новую вопратку.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

Перад Пасхай ёсць нядзеля посту, скаромнага не есці, у Суботу Красную яйкі красяць. Каб пасвяціць яйкі ў Пасху, трэба ноч у царкве пастаяць. Свечку запальвалі, трэба было яе пранесці ад царквы да самай хаты, каб не патухла яна, абладала тады магіяй. Ёй можна было акурваць хату, вокны, рысавалі крэсцікі ў апошнюю нядзелю. Хрэставанні насілі сваім хрэснікам. Хрэн хрысцілі і елі з мясам вароным.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Грыб Ганны Якаўлеўны, 1923 г. н., 2005 г.



На Пасху не вымяталі хаты, печы не тапілі. Спачатку перад ядой разгаўляліся пасвяцоным яйцом.

Днём ідуць гуляць на ўбіткі. Чыё яйцо разбіваецца, той аддае яго. Шкарлупкі з крашаных яіц сыпяць у зярно, якое вясной трэба сеяць, штоб быў харошы ўраджай. Пры сустрэчы гавораць: «Хрыстос васкрэс». Так робяць 6 нядзель, пакуль падымуць плашчаніцу – як бы цела Хрыста.

Запісана ў в. Картаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюля Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., 1993 г.

Напяком пасхі. Свіней жа дзяржалі, окарак напяком, халоднае, яечак накрасім. Красілі ў шалуху лука. Булкі ж украшалі. Ну, як украшалі? Пасвецім, свечку ў сярэдзіну ставім – і ўсё.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

А вот ужэ на Пасху прыйдзеш, дак ужэ, шчытай, такое. Ёлкі стаяць, як пастаўлялі ўжэ на страсную, а так ужо як палучыцца. Ета када ўжэ было васкрэсенне Ісуса Хрыста, такая бура падхапілася, што ўжэ Гасподзь так асвабаджаў, так усе каменкі звярнуў і адкрыў гроб, што ён падняўся і пайшоў у небеса. Када ўжо прышлі тыя паглядзець, кажуць: «Гроб адкрыты, а яго няма, ён ушол». Вот это і кажуць: «Хрыстос васкрэс!» У тую ноч пашоў на небеса.

На Пасху яйца красілі калісь, што ў каго было. Ходзяць, гуляюць у біткі. Хто пасіліў, разбіў яйцо, таму аддавалі. Пасядуць, гуляюць. Пасха тая ж, шчытай, уваскрэсла так, шчытай, закрасіла. Так яно і палучылася. Таво і краснае яйцо.

Зверху на булку крэсцік дзелалі, хто як мог. Касічку, вяночак вакруг, сахарам пасыплеш, яйцом памажаш.

У цэркаў ідзеш абязацельна. Песні не пелі, но хадзілі ў госці к хрэснікам. Я не хадзіла.

На Пасху не хадзілі шчадраваць. На Пасху ў нас там кладбішча е, так ужэ хадзілі людзі. Яечкі пакрасяць і хадзілі ў чацвер после Пасхі іх качаць, так ужо там збіраліся бедные. Пакачалі, аддалі ім Пасху, яечка. Ну, так хто што ўжо мог. Там хто ўжо якой каўбасы, хто жыроў давалі ім ужо.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.



На Красную Суботу яічкі красілі, паску пяклі. Красілі з лука шалухой. Ну, у біткі гулялі і дзеці, і самі гулялі. Выіграеш, дык забіраеш яічка. На первы дзень Пасхі нельзя хадзіць нікуда. Насіць нада валачобнае крэснікам: яічкі, паску.

На Пасху разгаўляліс. Мяса, усякія прадукты гатовілі. Ездзілі свяціць паску ў цэркву. Яічкі качалі, калі ўжо на кладбішча нада схадзіць к мёртвым. Чацвер – дзень мёртвых. Убіралі магілкі. Свечкі на стале стаялі. Соль свяцілі, паскі, прадукты якія.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

На Пасху я сматрэла васход сонца, як сонца іграет.

У нас яйца красілі шалухой лука. Нанач настайвалі і красілі, варылі там. Пасха рашчыняецца вечарам, утрам дабаўлялі сахар, смятану. Кагда сонца зашло, у формах ставілі ў печ. Кагда ставілі ў печ, памазалі жоўтым яйцом, а яйкі красілі ў красны, таму што красны – эта сімвал Пасхі, а яйцо – сімвал жызні. Кагда Марыя прыйшла к цару, яна сказала: «Хрыстос васкрэс». Ён не паверыў. Яна сказала: «Да», і яйцо стала красным у яго руках. Калі садзяцца за стол, ядзяць свяцонае яйцо, пасху, а патом усё астальное.

Свяшчэннік у 12 часоў паднімае крыста, і паецца «Трапарь пасхальны»:

Хрыстос васкрэс із мёртвых,
Смерцю смерць паправ,
Ісус ва грабе жывым дараваў.

Паўтаралі, ну, хто як хоча: хто тры, хто адзін, а ў храме многа раз паўтаралі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Пяклі пасхі, яечкі красілі ў луку, у шалупайках у красны цвет, таму што Ісуса Хрыста распіналі, кроў красная цякла. Калі дажэ хто памер, то ўсё роўна красяць яечкі. У біткі гулялі, б'юць яечкі. Каторыя ідуць з цэрквы, заходзяць на кладбішча і качаюць яечкі па магілцы пакойніка.

І на Раданіцу эта робяць. Эта само сабою. Гавораць на Пасху: «Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс».

І што ні дзелаюць (во ты збіраешся першы раз на агарод), гавораць: «Госпадзі, памажы мне, Госпадзі». Кончыла работу: «Благадару цябе, Хрысце Божэ».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

Пяком паскі, красім яйца, эта ж усяго патроху: і мяса, і сала, і хлеб, і соль. Ну, усё свецяць. Беляць, чысцяць да Паскі ўсё ў хаце.

Да Паскі так нічога не гатовяць, як на другія празнікі. Лук у шалупайках бралі, красілі яйцы. Так нада, наверна, рабіць і тыжэнь после Паскі. Захочаш ты яйцо зварыць, дак грэх варыць белае. На клеці стаіць тая вада цэлы тыжэнь, еслі нада, то і яйцы такія красненькія робіш. Носяць хрэснікам, хрыставанне кажуць, паскі

ўжо, яечка бяруць. Ну, эта ў дзярэўні ў нас дык хадзілі ды крычаць, шчадруюць, васхваляюць хазяіна, ён ужо ўгашчае іх. На Пасху хрыстуюцца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Велігорскай Ганны Акімаўны, 1930 г. н.
(раней пражывала ў в. Вялікая Весь Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Пасху празнавалі харашо. Гатовілі, прыгатаўлялі. Не елі перад Пасхай, трохі прыдзержываліся. А тады ўжо на Пасху паскі пеклі, яйца красілі. Мы ў красны цвет красілі яйца, толькі цыбулькай, цыбулькай. Булкі ўкрашалі, як хто чым умеў. Хто калісь жа мак сеялі (цяпер жа ўжэ няма маку), то макам украшалі, макаўкай, то тым, то тым. Ну, а цяпер жа па-другому. Зараз разнымі пасыпаюць, а тады – хто чым прыдумаў.

У біткі гулялі. На ўліцы ж столькі людзей, грамада вялікая. І там сабяруцца людзі і гуляюць у біткі. Ужэ гуляюць адзін з адным. Сей разбіў – давай бітку. Забраў, да і ўсё.

К хрэснікам хадзілі па Пасху, падаркі дарылі хросныя. Хто што прыдумае: мо, пяцёрку, мо, яечак, мо, канхфет.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Яйца красілі, прыбіраеш у хатах, булкі пяком. Пасхі ўкрашалі: із цеста дзелалі крэсцікі, цвяткі разныя, то пудрай пасыпаюць.

Хадзілі шчадраваць. Кум да кума перазываліся.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Ну, на Паску пяклі пасак, красілі яйкі. Яйца красілі ў цыбулі і толькі ў ёй. Не тое, што зараз у ўсялякія колеры. А красныя ж – то шо красіва, эта ж празнік вялікі.

У нас гулялі ў каток і ў біткі. Пакладуць яечкі на достачку і кацяць. Хто чыё паб'е, дык забірае. Так і выігрывалі мужыкі.

Хадзілі ж шчадраваць, эта шчадроўшчыкі. А назаўтра засяваць хадзілі. Прынята ж было хадзіць да хрэснікаў.

Запісана ў в. Трасцянец Лоеўскага р-на
ад Яшчанка Параскі Аляксандраўны, 1926 г. н.,
Выгляд Таццяны Максімаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Пасха

Пасха празнуецца 3 дні. Пасха ж была ў панядзельнік, васкрасенье, вторнік. Чысты чацвер быў перад Пасхай. А ў дзежы хлеб мясілі і ў чацвер хлеб пяклі. Дзежу выносілі: абвяжыш скацерцю палатнянай, яічка пакладзеш зверху і на вазвышэннасць куда-небудзь ставіш. Што ж, Пасхі дажыдае дзяжа, штоб чыстая была, штоб Бог побачыл. Яе дзе паставяць на зямле, пустую, да хлеба кусочак, наверх трошку хлеба і солі.

У Чысты чацвер самі ж мыліся, канешна, да сонца ў бане, штоб чыстые былі. Абычая такая. Калісь так казалі, на чалавека напала кароста. У еты чацверг ён устае, а тутака тапіла было. Тадысь не было гэтай рэчкі. Тапіла – гэта так называлася балота. Ну, дык у еты чацверг ён пабяжыць, і тое, і абмыецца да сонца. І ўсё добра.

У Чысты чацверг яшчэ ўбіраць можна. А тады ўжо ў Чысты чацвер ходзяць за агнём. А наўпроці ў цэркаў ідуць за агнём. Ну, дак вот, шчытаецца, што гэта благадатны агонь у цэркві правіцца і едуць ужэ жэншчыны, там, ну і мужчыны хадзілі. Бярэ фанарык такі свечачкаю, атсюда ў цэрквы ад свячэй агонь, і прыносяць падкурваць хрэсцікі, вокны, дзверы, печ гэта руская, дык і на печ.

Гэта ўсё ад грому на столі, на вокнах, на дзвярах. Ну, свяча гарыць дымком, дымком, копаццю этай. Крэсцікі ставілі. Хто-та кропачкі накапае і крэсцік, бывала, кропачкамі. Як хто на што гаразд.

У пятніцу ўжо плашчаніцу выносілі (гэта мацерыял такі). Вынясуць ужэ, пабыла, потым плашчаніцу ўжэ схаваюць. Шэсць нядзель яна стаіць, а потым хаваюць (у Красную суботу). Пятніца называецца Вялікай. У пятніцу булкі ўчыняюць. Субота называецца Краснай, таму што яічкі красяць у красны цвет. Краскай не красяць, а цыбуляй толькі. У красны красяць, дык гэта Ісус Хрыстос кроў праліў, і сірата пайшла ўжо к Богу прасіць, што яна ў яго прасіла, дык ужэ яечка стала краснае.

Манечка ўсім па яечку,
Адной сіраце да не дасталася,
Пайшла сірата, дый заплакаўшы,
Не вазрадаўшы.
Пастой, сірата, цябе Бог кліча,
Дае табе Бог каня варанога.
Пайшла сірата, не аглядваўшы,
І не ўзрадаўшы.
Пастой, сірата, цябе Бог кліча,
Дае табе Бог краснае яечка.
Пайшла сірата, дый падскакваючы,
Дый узрадаўшы.

Пакуль яечка краснае не будзе, ніхто не кажа: «Хрыстос васкрэс».

Да Пасхі скаромнага не елі, толькі поснае (7 нядзель паста). А вот ужэ мясаед шчытаецца, дык усё раўно і ў сераду не елі скаромнага, і ў пятніцу ж не елі скаромнага. Вот эта Пасха, это і мясаед, а то ўжо будзе Пятроў пост ужэ. 12-га будзе, а тады ўжо будзе Пятро, а тады ўжо Спасаўка. Тож не ядзяць. Яны гавораць: «Як Спасаўка-ласаўка, і гурочак, і кіёчак – ужо ўсяго». Тож не елі, толькі парожняе елі.

Пасху гатовілі – хто як прыдумае. На ёй крэсцік ставілі. Упрыгожвалі тую, якую свяціць ужо: крэсцік, цвяточкі, вяночкі, яічкам падмажым. Гулялі ў біткі. А на другі дзень Пасхі танка вадзілі: бяруцца за рукі, багата, саджаюць тры чалавекі і водзяць танка кругом, і пяюць:

А ў крывога танка
Хто не вывядзе вянка.
Ой, венча, мой, венча,
Прашчай ты, барвечна.
Я ж цябе давяла, пляла,
Узяла цябе, дый павесіла.
Церане дый на дзераве,
На дубовам калочку,
Шаўковым шнурочку.
Тудою мамка ішла,
Мой венчык знайшла
Да нялюбаму аддала.
Я ж ня люблю спаці,
Не ўстань з краваці,
Не ўзбудзі дзіцяці.

Дык яго трудна той танок вывесці, эта нада чалавек 30, колькі будзе. Або саджаюць дзеда і бабу і карагод водзяць, пяюць:

Як жа мне, як жа мне старога любіці,
От гора, от гора, кручына вяліка.
Як жа мне, як жа мне пасцель белу слаці.
От гора, от гора, кручына вяліка.
Як жа мне, як жа мне з старым спаць лажыцца.
От гора, от гора, кручына вяліка.

Ужо мала бяруцца, карагод і ў чатырох, і ў шасцёх можна вадзіць. Пасадзяць ужо дзеда і бабу. Баба дзеда абніме ўжо і гаворыць:

Як жа мне, як жа мне старога любіці,
Сядзіць дрома, пад кужалём седзячы.

Ставяць ужо кудзелю, і яна прадзе.

Сядзіць дрома, дрэмле, пад кужалём седзячы.
Устань, дрома, устань, прадраміся,
Ідзі ў шынок гарэлкі напіся,
А за пані не ганіся.

Шуцілі так.

На Пасху яйкі не каталі. Нічога нельга было рабіць. Гулялі 3 дні. Хадзілі на ўсеначную. Свечачкі бралі, хлеб, сала, мяса. Свечачку тую прыносілі назад, ставілі к іконам. І страсную свечачку абязацельна сахранялі. Калі ўмрэ чалавек, яе ставяць у рукі. Святую ваду ставяць на вокны ад гразы. Шалушкі ад яіц нельга было выбрасываць, святое таму што. Ілі ў печ, ілі калісь у воду кідалі. Нічога пры гэтым не гаварылі.

Пасвяцоны хрэн трэба грызануць, каб гадзюка не ўкусіла, і на акно палажыць ад нячыстай сілы.

На Пасху на могілкі хадзілі. Пасвяконую пасху насілі туды на первы дзень. На ўсеначную нясуць, ужо там разгаўляюцца.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г.н., 2005 г.

Да Пасхі гатаваліся ў суботу. Білі маленькае парася, пяклі блінцы з сырам, гулялі ў біткі, бралі латок і кідалі яйкі. Чыё разаб'ецца, той выходзіць з гульні.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Ксеніі Сяргееўны, 1920 г.н., 2005 г.

Пасху ждалі ўжэ. Так мы ждалі, як матка здзелае шалупайкі, ладкі. Дак ужо тое матка акрасіць, а тады накрасіць тых яіц, ды ўжо ў біткі. Я ўжо выбіла сабе яйцо, дык гэта якая радасць была. І плацце сабе ўжо якое пашыю. А якое там плацце, сіцец які-небудзь ці што.

Паску спраку з веку ў цэркаў насіла. На паске крэсцікі, пляцёначкі дзелалі такія. Маладзёж хадзіла на ўсеначную. Палілі ўжо касцёр, і ніхто не спаў. Ужо ўсю ноч гарэў агонь, ці лампадку, ці свечку запаляць. Ну, а цяпер, дык ужо свет гарыць, да 12-ці, да часу дзета, а тады ўжо выключаем.

У чацвер перад Пасхай прыносілі (хадзіла матка на ўсеначную) агонь святы. Дзелалі крэсцікі на вокнах, на дзвярах, ужэ ўродзе ад гразы лічылася.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1938 г.н., 2005 г.

Радаўніца

Адзначаецца Радаўніца ў аўторак пасля Вялікадня. У гэты дзень успаміналі сваіх памёршых. Пасля паўдня звычайна хадзілі на могілкі і там ужо паміналі. Могілкі да Радаўніцы прыбіралі.

Рыхтавалі шмат страў: кулічы, мяса, яйкі былі пафарбаваныя, гарэлка. Таксама клалі і памёршаму гэтыя стравы. Сядзелі на могілках доўга. Хтось аж да начы засіжываўся.

Забаранялася ў гэты дзень сеяць, садзіць.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Кулага Веры Васільеўны, 1939 г. н.
(раней пражывала ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на)

Радуніца – ета на кладбішча ходзяць сматрэць. Хто када ходзіць, дзе прынята. Есць после Радуніцы чацвер – мяртвых дзень – так называецца. У еты дзень ідуць мёртвых атвядаць. Некаторыя после Пасхі ідуць у панядзелак чэраз нядзелю. У васкрасенье ідуць. На кладбішча прыйдзеш, абычна па магілцы яічкам катаем. Крэст на магіле яечкам дзелаем. Бяруць гарэлку і ўспамінаюць.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Перад Радуніцай ішлі людзі на могілкі і ўбіралі там: красілі аграду, вешалі рушнікі. А ўжэ на Радуніцу сначала шлі ў царкву памінаць родных, а потым на кладбішча. На магілу клалі свячоныя яйкі, пасху, у кубак налівалі гарэлкі, і ўсё гэта астаўлялі там. Потым ішлі дахаты, накрывалі на стол, але не толькі для сваіх, але і для памёршых. У гэты дзень душы памёршых прыходзяць к сваім блізкім і ядуць разам са сваёй сям'ёй.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

Увечары нясеш у цэркву бумажку, каб памянуць памерлых. Таксама з сабой бярэш хлеб, стакан сахара. Патом на магілкі ідуць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н., 2005 г.



На Радаўніцу дак у зялёны цвет красілі яйца, у крапіву. Нарві крапіву, пастаў, яна настаіцца.

На Радаўніцу на магілку яйца крашылі, канфеты клалі. Бацюшка казаў, што не паложана астаўляць чарку.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Абрад «Пахаванне стралы»

Сама я не помню гэты абрад. Але бабка расказвала. Стралу дзелалі на Пасху. Вадзілі па дзярэўні. Браліся за рукі адзін за аднаго і ішлі ўздоўж дзярэўні, і спявалі песні.

Калі не было доўга дажджу, то хадзілі па дзярэўні і здымалі гладышкі. Калі багата іх вісела, то ўсё паздымаюць, а адну аставяць і кідалі ў калодзеж. Узрослыя кідалі.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г. н.
(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на)

Ляльку здзелаюць з барахла якога, платок завяжуць. Возьмуць, калясачкай вязуць, штоб дождж прайшоў. Вязуць ужэ ўродзе на кладбішча. У канцэ дзярэўні крэсцік стаіць, ён засцерагае дзярэўню. Бабы кросны ткуць, штоб дождж ішоў.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

У нас страла называлася завадка. 10 чалавек бяруцца і бягуць, бягуць, а паследняя адстае і ўпадзе.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнкі Мікалая Сямёнавіча, 1917 г. н., 2002 г.

Нічога не рабілі, а толькі хадзілі па сялу і пелі. Гэта вясной было.

Ой, пушчу стралу
Ды па ўсяму сялу.
Ох, і я ўмею,
Ды па ўсяму сялу, у-у-у!
Упала страла
Ды на канец сяла.
Ох, і я ўмею,
Ды на канец сяла, у-у-у!
Ды ўбіла страла
Добра моладца.
Ох, і я ўмею,
Ды добра моладца.
Ой, ляжыць цела,
Як папер бела.
Ніхто к целу не прыступіцца,
Ніхто к целу не прыменіцца.
Прыступілася, прымянілася
Ганна Іванаўна.
Узяла цела да на ручанькі,
Панесла цела да й да цэркаўкі.
Сама цэрква адчынілася,
Самі кніжкі зачыталіся,
Самі папы заўспяваліся.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н.

Вадзілі стралу. Паўбіраюцца дзеўкі, хлопцы становяцца ў шэрэнгу, па дзерэўні вадзілі. Песні розныя спявалі. Па-за гумнамі бегалі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Абрад «Пахавання стралы» быў на Русалку. Ідуць па дзярэўне і пяюць: «Ой, пушчу стралу ды па ўсім сялу...» нікуды не хадзілі, толькі пелі.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Пінчук Ганны Лявонцьеўны, 1920 г. н.

Стралу пускалі на Благавешчанне. Хадзілі па дзярэўне і пелі песню:

Ой, пушчу стралу
Да па ўсяму сялу,
Да каля горада.

У жыта не хадзілі і ў зямлю нічога не закапвалі. Толькі песні пелі.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Яўгеніі Іванаўны, 1925 г. н.

Кагда-та правілі Ушэсце. Іменна перад етымі празнікамі насілі па дзерэвне ікону. Ушэсце празнуецца толькі в чэцвер.

На втары дзень Ушэсця немцы палілі эту дзерэвню, людзей всех гналі чэраз парцізанаў. Парцізанскі лагер быў на Зялёным востраве.

А после вайны сталі празнаваць Прачыстаю. Гналі многа самагонкі і чэраз рэчку ездзілі.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Гэрасіменка Івана Васільевіча, 1927 г. н.,
Гэрасіменка Юліі Лявонаўны, 1927 г. н., 2005 г.

Троіца

У БАРЫ САСЁНКА КАЛЫХАЛАСЯ

(карагодная песня, спявалі ў выхадныя і троіцкія дні)

У бары сасёнка калыхалася,
Дачка к матачцы сабіралася,
Трыма мыламі ўмывалася.
Перва мылачка – родна мамачка,
Друго мылачка – родны татачка,
Трэця мылачка – дружок Ванечка.
Ён павёў мяне ў сад зялёненькі.
Мы ў саду любаваліся
Дый з падругаю паўстрачаліся.

Запісана ў в. Абакумы Лоеўскага р-на
ад Санько Т. А., 1922 г. н., 1999 г.

Празнік Троіца ў нас так і называецца. Па-другому ніхто не называе. Троіца прыходзіцца на пяцьдзесяты дзень ад Пасхі.

У нас на Троіцу гулялі ўсе дома абычна. У лес ці так куды не хадзілі. Рабілі застолле ў хаце. Збіралася ўся сям'я. Памерлых паміналі. Троіца цягнецца тры дні. Таго так і называецца. У етыя дні нічога не трэба рабіць.

На Троіцу ў хаце ставяць «май». Е дзерава такое, дак галінкі з яго і вешалі. А дзе не нойдзеш еты май, то можна браць і галінкі з каліны, бярозы, клёну, ліпы. Перад празнікам хату чыста прыбіралі. Мост мылі і вешалі май на дзвярах, над вокнамі. Лажылі яго і пад абразамі, пад іконамі. На вуліцы ставілі на фортках, на ўваходзе ў хату. Калі е скаціна, май вешалі і на дзвярах хлява і на шулах. Калі тыя веткі высахнуць, то іх не выкідувалі. Етыя, шо пад іконамі ляжалі, там і пакідаюць. Яны ад маланкі спасалі, каб тая ў хату не ўляцела. А як астаўся май, то яго на Купалу спальвалі. Бралі засохлыя галінкі з сабой на раку, а там у агне вялікім і палілі. Агонь жа той святы.

Песень такіх ніякіх не пелі. Толькі калі вешалі май у хаце, то гаварылі словы, для ўражаю добрага нада было так рабіць:

Троіца, Троіца, прасвятая Багародзіца,
Да насей лянку, ды няхай зародзіцца.

Як зародзіцца – для мяне маладой,
Не зародзіцца – для бабы старой.

Запісана ў п. Арол Лоеўскага р-на
ад Падбярознай Ганны Фёдараўны, 1932 г. н., 2003 г.

Троіца – эта ўжо такі празнік, на які дзярэўя ставяць, ломяць ліпу, дажа бярозу, і ўсякія расліны ставяць. У цэркві свецяць гэта звечара. У нас гэта ўсё ўрэмя было. На Троіцу ў нас дзеці выбіралі ўсю гэтую зелень і ставілі ўсюды. Троіца – эта тожа тры дня.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Міхаленка Раісы Парфёнаўны, 1925 г. н.
(раней пражывала ў в. Буда-Петрыцкая Лоеўскага р-на), 2005 г.

На Троіцу нарывалі розных ветак – называецца май. Ветачкі з клёна, ліпы, явар рвалі, што на балоце расце. Іх на вокны ставілі. А потым, калі ўсё гэта высахне, звязвалі ў пучкі, вешалі на чардак для таго, каб усё добра было ў хаце і з жывотнымі. Так старыя гавораць.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

ТРАЕЦКАЯ ПЕСНЯ

Божа ж мой,
Хадзіла Тройца каля аконца,
Божа ж мой!
Божа ж мой,
На таргу была, торгу слухала,
Божа ж мой!
Божа ж мой,
А хто ж дораг, а хто ж дзешаў?
Божа ж мой!
Божа ж мой,
За дзевачак тысячы даюць,
Божа ж мой!
Божа ж мой,
А хлопчыкаў дарма не бяруць,
Божа ж мой!

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Філатавай Наталлі Міхайлаўны, 1943 г. н., 1999 г.

Ну, на Троіцу гэты во явар ставяць, цяпер з клёна бяруць веткі і ў доме ўкрашалі, у цэркві свяцілі. Клён і явар паставяць на вокны, за іконай.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Пра Троіцу гавораць, што эта Ісус Хрыстос, Мацер Божая і Гасподзь сам сышліся ўсе ўместа. Па случаю этага сабыція спраўляюць бальшой празнік. На Троіцу ўжо носяць май і ставяць. У асноўным эта клён, ліпа. У хаты ставяць, на вароты вешаюць, дзе жывуць. Этыя веткі счыталіся как бажэственныя. Эта ад плахога чалавека, ад гразы, штоб гад не запаўзаў у двор. Штоб проста як свяшчэннае такое было ў хаце.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

На Тройцу явар свяцілі і клалі каля іконы, кляновымі галінкамі ўпрыгожвалі забор, калітку, дзверы. Білі вербай дзяцей з словамі: «Вярба б'е, вярба б'е, слухай бацьку і мяне». Свяцонай вадой абрызгвалі агарод, каб быў добры ўраджай.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

Дзень святой Троіцы называюць Сёмухай. Гэта свята ў гонар вясны, як апекуна шлюбаў і любоўных асалод, вясны-нявесты, упрыгожанай кветкамі і зелянню, якая ішла насустрач свайму жаніху Семіку. Таму і свята гэта лічылася лепшым у годзе часам для кахання і варажбы аб будучым сямейным шчасці.

У гэты дзень дзяўчаты ішлі ў лес завіваць вянкі. Яны бралі з сабою калбасу, яйцы. У лесе смажылі яешню і елі. А потым варажылі. Кожная шукала дзве маленькія бярозкі і звязвала іх вярхушкі ў выглядзе вянка, праходзіла пад імі і пела:

Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,
Зялёныя вянкі завіваць.
Заўём вянкі на ўсе святы,
На ўсе святы, на ўсе празнікі.

Потым адломвалі са сваіх бярозак галінкі, рабілі з іх вяночкі і кідалі іх у ваду. І варажылі: калі вяночак паплыве – добры знак, калі патоне – дрэнны. А ў дворы ўсе пабудовы прыбіралі маем.

Запісана ў в. Новая Баршчоўка (раней Баршчоўка) Лоеўскага р-на
ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1937 г. н., 2001 г.

На Сёмуху стаўляюць май і кладуць ета ад гразы. Кажуць, і ад грызуноў, і ад усяго так рабілі.

На Сёмуху стаўляюць нейкія дрэвы: і бярозу, і ліпу, і клён амерыканскі, усе стаўляюць, хто што хоча.

Святкавалі ў васкрасенье і потым 3 дня яшчэ. Хадзілі адзін да аднаго. Зайдуць, вып'юць, пакумяцца. А ў лес не хадзіў ніхто.

Тую зелень, што пасохла, яе на сёмы дзень забіраюць і, калі картошку закапваюць, дык кладуць туды ветачкі етыя, каб грызуны не лезлі. Бярозу вешаюць пад страху ў сараі ці хаце, каб не было пажару.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Нікіцічны, 1928 г. н., 2002 г.

Заўсёды ў хаце гулялі. Ставілі бярозу ці любое нешта. Ета шчыталі маем. Ставілі ета ў хаце, на вуліцы, на дварэ. На вокна явар ставілі, вешалі рушнікі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Тройца – большой праздник. В домах убирали, готовили. Ходили в лес, ломали ветки берёз или клёна и украшали на улице и в доме. Ломали в болоте аер, ставили на окна и под стол ложили. В этот день никаких работ делать нельзя было.

Отмечали три дни. Приглашали кумовьёв, те шли и брали с собой что-нибудь, и отмечали. Потом собирались на улице и водили хороводы.

Запісана ў г. Гомель
ад Юрасік Валянціны Савельеўны, 1946 г. н.
(раней пражывала ў в. Рудня-Каменева
(раней Папоўская Рудня) Лоеўскага р-на), 2002 г.

Усягда на Троіцу не рабілі. І ўсягда бацька ставіў клён ва дварэ, і пад ім абедалі.

Матка мне расказывала, што жыў адзін яўрэй, а Бог хадзіў па зямле і глядзеў на людзей. І прыйшоў Бог да яўрэя гэтага, а яўрэй яму гаворыць, каб ён садзіўся есці з ім і яго жонкай. А Бог гаворыць: «У вас радзіцца сын». А яны былі ўжо пажылыя і падумалі, куды ім дзіцёначак. І праўда, радзіўся ў іх сын – Маісей.

Гавораць, што Троіца – гэта Бог у трох ліцах. Тутака, у Лоеве, кладуць на вокна яр, а тут клён. Ва ўсіх па-рознаму. Я сама з Ручаёўкі, а тут ужо 60 гадоў жыву.

На Троіцу мы стараліся пайці ў лес, наламаць ветачак клёну, ліпы, ясеня, бярозы. Ёсць такая трава пахучая – яр, то яе тожа ставілі на вокны. А астальнымі травамі ўкрашалі ўвесь дом, вароты. І можа тры дні гулялі – нядзелю, панядзелак, аўторак. А так, як абычны празнік.

Асінай дом не ўкрашалі. Я не знаю, пачаму, дзетачкі, но не ўкрашалі ў нас ніхто ёй. Асіну дажа ніхто не хацеў браць сабе на дровы, не то, што ўжэ ўкрашаць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ламілі ліпу ды ставілі ў хату. На трэці дзень Троіцы прыязджаў бацюшка, свяціў худобу, жыта. Потым тры хаты сталы выносяць і гуляюць ужо. Асінай дамы не ўкрашалі. Болей бярозы, ліпы пад акном сажалі.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

У суботу перад Тройцай паміналі памёршых, у нядзелю дзеўкі ішлі на поле і завівалі вянкі, спявалі песні.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Краўчанка Марыі Пятроўны, 1929 г. н., 2005 г.

Нада, штоб абязацельна была маладая асінка. У сарая тыркалі яе: прадахраняла скаціну. Эта бальшы празнік Троіца.

Прасвятая Троіца, памілуй нас, Госпадзі!
Владыка, прасці беззаконіе нашэ.
Святы, пасеці і ісцэлі немашчы нашы,
Уменіем твайго радзі,
Госпадзі, памілуй (3 р.).

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Бальшы празнік. Збіраліся, гулялі, спявалі, на кладбішча хадзілі на саму Троіцу памянуць усіх сваіх усопшых.

Перад Троіцай у суботу галінкі ламалі з ліпы, з клёна. З асіны закопвалі каля сарая, штоб ніхто нехарошы не хадзіў. Галючкі і ў ва дварэ, і на калодцы, і ў хаце вешалі. Бярозка – штоб дзеці красівыя былі. Дуб – каб здароўе крэпкае. Аблажвалі гэтымі веткамі патом картошку, каб мышы не вялісь.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Хадзіла май ламаць і ліпу. Нада, штоб асінка была ў дварэ, калі ёсць худоба.

Калі садзілі картошку, то ў капец кідалі кусочак гэтай палкі, каб мышы картошку не паелі.

Прыносілі аер і клалі на пол.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

На сёмую нядзелю ад Пасхі пачыналі прасднаваць Тройцу. Прасднавалі яе тры дні.

На Тройцу прыбіралі хаты зялёнымі веткамі бярозы ці клёну. Іх вешалі на вокны, на дзверы, за іконы. А на пол клалі траву чабрэц, мяту. У збаночках ставілі цвяты. Бяроза счыталась святым дрэвам. Дзеўкі ўпрыгожвалі яе лентамі, цвятамі, вадзілі хараводы, спявалі. Яйцы к Тройцэ красілі ў зялёны цвет.

Прасднавалі свята на прыродзе: у садзе, у полі, у лесі. На траву клалі белую скацерць і даставалі яду. Гэта былі тройцкія караваі, бліны, пірагі з ягадамі і зеленню, дамашні квас, халодныя супы. Такая во была ў нас Тройца.

Бяроза мая, бярозанька,
Бяроза мая, белая.
Пад табой, бярозанька,
Красны дзевіцы
Вянок плятуць,
Песні пяюць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

На 50-ы дзень пасля Пасхі была Троіца. Лічылася, што Гасподзь вазнёсся на неба, гэты дзень называўся пяцідзесятніца.

У нас аір нясуць у храм перад Троіцай у суботу, а патом раздают вечарам ілі на другой дзень Троіцы – дзень Святога духа.

Дом украшалі зялёнымі веткамі, якія адганялі нячыстую сілу. Свяцілі аір, таму што на гарэ Сінайскай Госпада встрэцілі эцімі веткамі, кагда он васкрэс.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Спраўлялі Троечны тыдзень. Бальшы празнік гэта. Няльзя рабіць анічога – грэх вялікі. Украшалі хаты зелянінай. Ламалі веткі клёну, вярбы, ясеню. А вось асіну нельга было ставіць. Дурное гэта дзерава. У царкву хадзілі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Хмелянок Марыі Яўсееўны, 1927 г. н., 2005 г.

Троіца – вялікі празнік. Нічога такога рабіць нельзя. Богу маліліся, у цэркву хадзілі. Колісь прыязджалі ў госці, гулялі, па хатам хадзілі. Украшалі хату ярам свяцоным ці ліпай, бярозай, вобшчэм, зелянінай. І ў хаце, і на двары, на варотах. А асінай няльзя было ўкрашаць, не ведаю, чаму.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Нарвём ярый этат, на палу параскідаем, на окны становім па тры і к іконам кладзем тожэ па тры. У цэркаў ідзем, пасвецім там, а патом прыходзім ужэ і б'ем каго, штоб здаровыя былі. Прыгаворваем: «Вярба б'е, вярба б'е, дай, Бог, здароўе». Тры дні нічога нельзя было дзелаць, і расчосвацца на первый дзень няльзя было. Сабіраліс сваёй сям'ёй.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

Троіца называецца па-рознаму: сёмуха, зелянуха (зелянцы), пяцідзесятніца. Сёмуха, таму што 7 нядзель па Пасхе. У нас завуць Троіца, у Магілёўскай вобласці – зелянуха.

Троіца, таму што ёсць 3 святыя: сын, ацец, дух святы. А зелянуха, таму што людзі ўпрыгожваюць дама свае да таго, што і не відна, што гэта дама.

Пяцідзесятніца, таму што 50 дней па Пасхе.

Хату я сваю ўпрыгожвала клёнам, ліпай і бярозай, таму што гэта бажэственныя дзярэўя. Гэта, кажуць, любімыя дрэвы Ісуса.

Дзень, у які празнуюць Пасху, абязацельна васкрасенье. Работаць нельзя было, бярозкі не завівалі.

Абрад куста праводзіўся ў Лельчыцкім, Мозырскім, Тураўскім раёнах. На Траецкай нядзелі на зямлі нічога не дзелаюць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

Насілі ў хату ўсякую зелень. Глядзелі, каб каля хлява карове асіну паставіць, каб кроўю не мачылась. Дак ужо забіваюць кола з асіны. Зелянню ўсе хаты абвешваеш. А тады этае пазбіраеш і, як закапую картошку, кідаю эта: мышы не вядуцца.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.



Украшалі дама м'ятай, патом такой ярый ставілі ў доме, штоб аберігал, а ў хлеў не ставілі. Пастаіць, а патом знімаюць. А што пахне, то ў падушачку пакойніку клалі. Песні пелі ўсюды і ўсякія.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

Ну, зялёный аяр парвём дзе-та ў рэчке. Ну, украсім ліпай, вязам. Украшалі дама. О, і клёнам тым украшалі, аярам, і м'ятай, усякаю травою. У лес не хадзілі, я хадзіла ў храм на Троіцу ў другое сяло. Эта такі буў прыстольны празнік.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Ліпай украшалі. Мы самі з Брагіншчыны, у нас украшалі ліпай дама. А тут мы пераехалі, так ані клёны рвуць і клён вешаюць у хаце. А тады яны ўжэ як павесяць на нядзелі дзве, дык добра.

Гулялі, у госці хадзілі друг да друга. І машыны, вазы панаязджаюцца.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Троіца ў нядзелю ўсягда пападае. 2 дні Дзяды Траецкія. Ну, мы яды нагатовім, шоб наесціся. Нанач астаўлялі ім усё на стале: і ложкі, і вілкі, і чарачку. Яны прыйдуць, паядзяць.

Украшалі дом і ў самім доме.

Запісана ў в. Трасцянец Лоеўскага р-на
ад Яшчанка Параскі Аляксандраўны, 1926 г. н.,
Выгляд Таццяны Максімаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Святілі жыта на Тройцу. Гэта дзімамерскі празнік. Тройцу (гэта ікона) насілі вакруг дзярэўні. Дзеці і старыя падлазілі пад гэту тройцу.

Украшалі маем хату. Май быў з ліпы, клёна. Мой муж тоненькія бярозкі патыркаў, утыркваў іх каля хаты. У хату вешалі, а потым выкідвалі.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Пінчук Ганны Лявонцьеўны, 1920 г. н.

На Тройцу рвалі ярай, ставілі на вокны, у вароты, у кут. Хадзілі ў госці, к суседзям, к кумам.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Карнавушанка Хрысціны Анісімаўны, 1904 г. н., 1995 г.

Мікола

На Міколу сена падавалі віламі і казалі: «Сена падавай ды вілы пахавай». Мікола два раза ў год: 22 мая і 19 дзекабра. Вараць кашу, бліны робяць.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.



Мікола – вялікі чудатворац. Яму нада вельмі маліцца. Еслі чалавек утапае, спасці Мікола можа, выкідвае на бераг. Нельзя нічога гаварыць на Міколу. Раз чуда было. З унукам сварыліся, і ён кажа: «Мікола, адвярні ўрага». Дык Мікола абідзеўся, і тхор раніцой патравіў шасцёх курэй. Вот як.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Русальны тыдзень

Праходзіла пасля Тройцы. Ходзяць у падобіі людзей у белай адзежы мужчыны і жанчыны. Еслі чалавек памірае на русальнай нядзелі, то ён будзе русалкай. Хадзілі русалкі толькі па жыту. На русальную нядзелю людзі адзяваліся ў белае, хадзілі і пелі па дзярэўні: «Правяду русалачку да бору, а сама вярнуся дадому...»

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пятровай Марыі Раманаўны, 1932 г. н., 1995 г.

РУСАЛЬНАЯ ПЕСНЯ

Правяду русалачку за руку,
А сама вярнуся да дому.
Правяду русалачку за лясочак,
А сама вярнуся ў падушку.
Правяду русалачку ў зялёны бор,
А сама вярнуся к татку ў двор.

РУСАЛЬНЫЕ ГАДАНИЯ

Шли за венками на кладбище, которые ранее оставили на могилке. Потом их бросали в реку. Если венок поплыл, то выйдешь замуж, а если у берега остановится, то уже замуж в мясоед не выйдешь (ведь замуж выходили только в мясоед).

Шли, шли туда, где растут подорожники. Срываешь их ртом. В случае, если срывали один, три, то тогда в паре не будешь, а если два, то выйдешь замуж.

ВОЖДЕНИЕ РУСАЛКИ

С давних времен люди боялись идти в жито, рвать волошки (васильки). Причина боязни – русалки. Русалкой могла быть любая женщина, девушка. Люди говорили: «Там русалка, она в жите сидит». Люди не знали, кто она. Бывало, кто-то невидимый держит в жите парня или девушку.

Со своей деревни народ водил русалку. Отсюда и название обряда: вождение русалки. В деревне были свои смельчаки, которые выворачивали кожух наизнанку, одевали его на себя и шли пугать русалку. Девушки в этот день плели венки из васильков, хмеля, листьев березы и шли с ними на кладбище гурьбою, потому что боялись русалок.

На кладбище вешали венки на кресты своих родственников, а те девушки, которые хотели потом себе погадать, ложили веночки на могилы. Потом шли и пели «русалку», т. е. русальные песни, тем самым призывая к себе русалку. Пели до тех пор, пока из гая (леса) не покажется русалка – девочка. Все в этот момент кричали: «Русалка гонится!» В случае, если она кого-нибудь словит, то начинала этого человека щекотать. Тогда кто-нибудь из парней начинает ловить русалку. После того, как её словит, он начинает «раздевать» русалку. Это значит, что он должен снять с неё венок и привести ко всем. Тогда она начинает со всеми дружить и петь не только русальные, но и жнивные песни – «Гурочки», «В озерушке плавала ведёрышко». Потом гадали на веночках и на подорожниках.

Веночки с кладбища несли домой во двор и клали на капусту, и говорили: «Яки я венок на капусту надевала, чтобы такое качанне родило». Или на огурцы: «Сколько тут на венку цветочков, чтобы столько было на гряде гурочков».

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Яўгеніі Іванаўны, 1925 г. н., 1997 г.

Послі Тройцы збіралі май з хат і гэтым маем праводзілі русалку. Бралі яшчэ тыя бярозкі, што стаялі пад вокнамі, на іх сажалі русалак і па дзярэўні цеглі іх у лес. У асноўным удзельнічала маладзёж.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Фядосенка Вольгі Аляксееўны, 1934 г. н., 2001 г.

Дзеўкі ў русалак не перадзяваліся, а так ішлі гурбой па вёсцы ды пелі песні:

Правядзём русалак
Із бору да бору
Ў зялёну дуброву,
Штоб не ласкаталі
І зіму не лякаталі,
Улетку не пужалі.
Правядзём русалак
Із бору ў жыта.
У муроным жыце
Там русалкам жыці.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н.

Русалку калісь вадзілі. Радзяць дзеўчыну, дак яна ўжо ў жыта захаваецца, дак яна ўжо лякае людзей.

Ужо, казалі, ходзіць русалка. Ну, так было. Захаваецца і ходзіць. Калі шукалі дзеці папараць, дак е такія людзі, яны нараждзёныя. Што папараць-цвяток ніхто не бачыць, а яна найдзе. І тада яна ўжэ ўсё, усё, што на зямле ё, яна знае. Можа, на мільён адна такая душа.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Русалкай адзявалі хлопца ці дзяўчыну і вялі па дзярэўне, а потым у жыта. Там спяваюць і кладуць агонь. Хлопцы і дзеўкі прыгаюць чэраз яго, а русалка ловіць іх. Калі паймае, то апячэ крапіваю, якую зараней прыгатаўліваюць. Патом русалка выбірала сабе хлопца і цалавала яго, калі хлопец любіў яе, то цалаваў тожа, а калі не, то кідаў русалку ў воду і казаў: «Ідзі да лешага, яго сватай». Патом русалку вымалі з вады, і яна павінна была адамсціць хлопцу: кінуць яго ў ваду, вымазаць у гразь, надзець сваю юбку, пацалаваць без разрашэння. Спявалі песню:

Ой, рана-рана, русалкі сядзелі,
На граной нядзелі русалкі сядзелі,
На дзевак глядзелі.
Павяду русалку за цёмны лясок,
Ад бору да бору ў бацькаву камору...

Запісана ў в. Каплічы Калінкавіцкага р-на
ад Кулага Таццяны Пятроўны, 1942 г. н.
(раней пражывала ў в. Гарадок Лоеўскага р-на), 1999 г.

Раней нас пугалі, каб не хадзілі ў лес, бо там жывуць русалкі. Яны хаваюцца за дрэвамі і могуць напугаць, забраць у глыб леса. А мы баяліся.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

На русальны абрад песні пелі:

Правяду русалку
Да цёмнага бора,
Сама вярнуся
К татку ў двор.
Правяду русалку
У цёмны лес,
Ды зноў звярнусь
Да роднага месца.

Русалкай была дзевачка-студзентка. Адзежда спецыяльная была, касцюмы для народных арцістаў. Красівыя касцюмы былі, помню, красачныя, з вышывкамі разнымі, узорамі. Хвартукі, касыначкі разныя – всё было. І юбкі ў нас красівыя какіе былі! Хто з нашых сам умел вышываць, це ўкрашалі самі касцюмы. А хто не ўмел этага, то проста заказывалі іх, етыя хвартухі, юбкі все былі расшыты. Юбкі нам прысылалі дажэ, самі не шылі іх.

Сначала мы на кладбішчэ на тое ездзілі. Там за Лоевам есць кладбішча новае. На етым кладбішчы мы дзелалі што: пелі песні. Вот такую: «У крывога танка». Танка этого сама і вадзіла вперёд. Кругом мы шлі. Круг такой был, крывой как будта.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Аляксандры Самойлаўны
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Русальная нядзеля яшчэ была. Песні пелі. Такая песня была: «Правяду русалку ў мора...». Далей, дзяўчаткі, ужо не помню, старая стала, да і голаса ў мяне нікагда не было. Хаця песні знала і любіла. Такжа к жыту хадзілі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Выбіралі на русалку дзеўку, хлопца. Хваста не дзелалі. Вадзілі па жыту. Песню пелі пра русалку. Падвяжуцца поясам, галля настракаюць. Штоб агуркі радзілі, потым кідалі галлё ў агароды, у грады, штоб ураджай быў.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Калі-то бегалі па жыту. Русалку ганялі, сабіраліся дзеўкі – і па жыту. Адзенемся так, вяночкі з васількоў падзелаем. Каго-небудзь выбярэм, а тады ўжэ наблюдаем, дзе яна прачацца. Шукаем, дзе яна дзелася.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Русалка была пасля Тройцы праз нядзелю, у наступны панядзелак.

Дзеўкі рабілі вяночкі, у жыце валошкі рвалі. Вунь, з пачатку сяла хадзілі з могілак на жыта. Песні пелі. А потым – на рэчку, а там і варожаць. Кідаюць вяночкі ў рэку: каторы паплыве, а каторы к берагу. Калі к берагу, значыць, жаніх прыдзе.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Уласенка Любові Кузьмінічны, 1918 г. н.

Русалку спраўлялі ў панядзелак. Русалка – маладая дзеўка. Хлопец ганяў яе па жыту, а сначала – на могілках, потым усе ішлі на рэчку, кідалі вянкі. Калі вянок прыплыве к берагу – у гэтым годзе замуж не возьмуць.

Варажылі яшчэ так: нада было вырваць падарожнік зубамі. Калі два – будзе пара, замуж выйдзеш.

Вось яшчэ адна варожба: дзеўкі клалі грабяшкі ў начоўкі, потым падкідвалі іх. Які ўпадзе, дык тая замуж выйдзе.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Яўгеніі Іванаўны, 1925 г. н.

Дзесятуха

Пасля Пасхі была Дзесятуха, гэта значыць, што пасля Пасхі ўжо прайшло дзесяць нядзель. На гэты празнік нічога нельга рабіць. На гэты празнік з Краснай Гары выйшла ікона святой Параскевы. Гэтае месца лічыцца святым.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Барысенка Пелагеі Мікалаеўны
(нарадзілася ў в. Казярогі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Гэты празнік толькі ў нашай вёскі гуляюць. Сёння яно, васьмога іюля. У лесе на сасне абразавалася ікона, капліца яе называлі. Туды прыязджалі дзесяць бацюшак, вось і абразавалася ікона. Ужо з'язджаліся многа людзей, нішчых многа.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Валянціны Мацвееўны, 1935 г. н., 2005 г.

Была толькі ў Лоеве Дзесятуха. Прыязджалі дзесяць бацюшак, свяцілі ваду.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

Эта 10 нядзель пасля Пасхі. На Дзесятуху ходзяць у цэркаў, свечкі ставяць абязацельна, дажэ не адну. Я стаўлю каля Хрыста, каля Мацеры Божай, стаўлю пару свечак, а калі і тры.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

У нас ёсць месны празнік – Дзесятуха, 10 нядзель па Пасхе. У нас была в эта врэмя в 10 нядзель найдзена ікона з крупейкамі на дзераве. І сколька раз яе знімалі. Памешчык к сабе ставіў, патом ешчё куда-та, а яна за нач апяць вазвращчалась сама па сабе. І эта не сказкі.

Свята прыпадае на 8 ліпеня. Эта ікона іграе важную роль. Калі асвабаждалі Лоеў, дык разведка ішла. Сядзелі людзі там у гарах, а тут – у равах. Усе беглі і крычалі: «Ура!» Памагала ім ікона, яна называлася «Незгараемая купіна». Яна памагае так: в случае пажара, буры трэба дом абхадзіць з іконай.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

ЛЕТНІЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ

Купалле

Купалле і ў нас так называецца. А ішчэ гавораць Іван Купала. Еты празнік улетку ідзе з 6 па 7 іюля. Уночы празнуюць абычна маладыя, а старыя ўжэ пасядзяць на лаўках, пагавораць. Раней дык хадзілі ўранні збіралі траву ўсякую лячэбную. А то, гавораць, после Купалы нялъзя збіраць. Ведзьмы ў етую ноч усе травы папорцяць. Імі тады ўжэ лячыцца нялъзя, урэдныя становяцца. Траву етую сушылі тады. А калі гулялі ўжэ ўвечары на Купалу, то і ў агонь кідалі, вянкі дзеўкі сабе плялі, на вянках етых і варажылі.

У ноч на Івана Купалу ўсе ведзьмы вылятаюць і шкоду робяць. Дык ад іх крапіву рвалі і на дзвярах, на вушняках, на плоце вешалі. А то ж і малако могуць адабраць у каровы.

На Івана Купалу ішлі гуляць на раку. Туды ўсе зносілі ламачча, паломаныя старыя калёсы, якія ўжэ не нада, трапкі, а хто дак і дровы прыносіў. Дзеўкі ішлі, дык яду бралі з сабой, а хлопцы – выпіўку. Калі гармонь была, то і гармонь прыносілі. Вясёла было. Агонь распальвалі вялічэнны, там і бульбу пяклі, жарылі яечкі. Ну, і празнавалі.

Ведзьмаў вельмі баяліся. Дак тыя, хто смялейшы і крапівы не баяўся, рабілі паясы з травы і вешалі туды ішчэ крапіву. А так з палыну вязалі паясы. Ён жа горкі і нясмачна пахне. Ішчэ правяралі: е ведзьмы пасярод нас ці няма. Для етага нада было праз агонь скочыць. Калі ў табе нячыстай сілы няма, то праз агонь лёгка пераскочыш. А бывае, што хто і не пераскочвае.

Калі я дзеўкай гуляла ішчэ, дак адзін раз усе скакалі-скакалі, а адна як скочыла, то рукою ў агонь і ўвалілася. То ведзьма была, з ёй тады ніхто і не гуляў болей, баяліся. Дзеўка тая дадому пабегла. Во як бывае.

Вот так мы гулялі. У етую ноч, гавораць ішчэ, што папараць цвіце, і хто найдзе цвет, той шчаслівы ўсягда будзе. Было што і нашы ў лес хадзілі, шукалі. Ды нічога шось не находзілі. Я сама не хадзіла, баялася. То хлопцы ўсё хадзілі шукаць, а дзеўкі дак не. Дзеўкі болей варажылі на Купалу. Варажылі абычна на тое, выйдзеш замуж у етым годзе ці не. Бралі свой вянок і пускалі яго па цячэнню ў рэку. Пры етым прагаворвалі: «Плыві, плыві, мой вянок, то ўніз, то ўверх, да свякровіна двара». Па тым, што стане з вянком, і гадалі, якая будзе судзьба. Калі вянок на месці стаіць, то ў еты год замуж не пойдзеш, калі паплыве, то пойдзеш, а калі на адным месцы круціцца начынае, то будзеш у старых дзеўках хадзіць.

Ішчэ гадалі, ці доўга жыць будзеш, ці скора памрэш. Знімалі з галавы вянок, лажылі на яго лучыну накрыж, ставілі на яе свечку запаленую. Тады пускалі еты

вянок на воду. Калі вянок далёка паплыве і свечка не пагасне, то чалавек доўга жыць будзе. Калі трохі праплыве і свечка патухне, то ў сярэдніх гадах памрэ. А калі свечка зваліцца з вянка, то вельмі скора еты чалавек адыйдзе на той свет.

Была і такая варажба. Дзеўка з хлопцам браліся за рукі і скакалі праз агонь. Калі расчэпяць пры скачку рукі, то, значыць, яны не пажэняцца, а калі не расчэпяць – пажэняцца.

У ноч на Купалу абязацельна нада было пакупацца ў рацэ ці ў возеры. Той чалавек, які пакупаўся, балець не будзе, да яго ніякая хвароба не прыстане. Купацца нада было на зарэ после таго, як сонца пакупаецца. Тады вада нясе ў сабе незвычайную сілу. Хто балеў якой хваробай, то скора здаровым рабіўся.

Пелі на Купалу і песен многа якіх. У гульні гулялі. Прыказкі ішчэ пра Купалле такіе е: авёс да Івана балее, а пасля Івана шалее; на Купалу чэрці ў вадзе купаюцца.

Калі на Купалу раса вялікая, то будуць агуркі.

Песен мы зналі багата якіх пелі «Ой, рана на Йвана»:

Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Проціў Йвана ночка мала.
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Дзе Купала начавала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Начавала ў чыстым полю.
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Што Купала вячэрала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Вячэрала белы сыр.
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Чым Купала запівала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Запівала гарэлкаю.
Ой, рана на Йвана.

Запісана ў п. Арол Лоеўскага р-на
ад Падбярознай Ганны Фёдараўны, 1932 г. н., 2003 г.

З 6 на 7 чэрвеня празнуюць у нас Купалу. Там красіва тожа. Там і чэрці, і агонь будзе гарэць, і касцёр будуць паліць, такі стог будзе, красіва-красіва. Я на Купалу не хадзіла, але маладзёж у нас вянкі пускала на Дняпры. Я толькі сматрэла. А тое, што расказваюць пра нейкую папараць-кветку, я ў гэта не веру. Эта кветка не цвецёт, эта легенда. Эта, як гаварыцца, ужо спракавеку. Но она не цвецёт. На Купалу чэраз агонь прыгалі, карагоды водзяць.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Міхаленка Раісы Парфёнаўны, 1925 г. н.
(раней пражывала ў в. Буда-Петрыцкая Лоеўскага р-на), 2005 г.

КУПАЛЬСКАЯ ПЕСНЯ

Да сёння Купала, заўтра – Ян,
Будзе, дзецюкі, ліха вам.
– А якое ліха ліхое?
– Пагоніце сабакі ў поле,
Да ад свіныя лебядзіцы
Пагоніце сабакі да вадзіцы.
Невялічка ночка Пятроўка,
Ды не выспалася малодачка.
Ты ж, маладая малодка,
Ты схадзі з намі на Купала.
– Ай, жа вы, дзевачкі, дзіўнесенькі,
Ёсць у мяне дзіцятка малесенька.
– Уж, маладая малодка,
Да сваёй свякроўцы пакарыся,
Няхай тваё дзіцятка пакалыша.

На Йванаўскую ноч адначасова з папараццю а 12 гадзіне ўночы цвіце «арэхава дрэва». Калі кветку гэту адарваць і ісці туды, куды яна будзе нахіляцца, то можна знайсці клад.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Савянок Марыі Рыгораўны, 1941 г. н., 1999 г.

Счыталася, што на Купалу ведзьмы забіраюць малако. Каб засцерагчыся, вечарам ставяць вездзе крапіву ў сараях, ва ўсе дзіркі. Яны тагда не могуць прайсці.

На Купалу шукалі папараць-кветку. Еслі хто ўбачыць, як яна зацвітае, той шчаслівы будзе. Маладыя хлопцы і дзеўкі яе шукалі.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Купаліся асобенна, кастры дзе-небудзь возле азярца дзелалі, перапрыгвалі етые кастры. Кідалі ў етые кастры нешта. У аснаўном эта перапрыгвалі, штоб разная нечысць з чалавека згарвала ў полымі .

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

НА ІВАНА КУПАЛУ

Да я жала дай буйное жыта дай успаміналася,
Ды перайшла ў шырокую постаць ды і павалілася.
Ды прыйшла ка мне родная маці постацьку падагнаці.
Ды ты, сонейка, ды ты, яснае, ды прыйдзеш ка мне.
Да ўсе людзі дадому ідуць, а я не пайду,

Да і буду ў полі ночку начаваць, як зязюлька кукаваць.
Хто мой голас пачуе, той мене пажалее,
Дай зачула галасочак родная маці.
Дай пойдзем, роднае дзіця, будзем размаўляці.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Карнавушанка Хрысціны Анісімаўны, 1904 г. н., 1995 г.

На перакроснай дарозе кладуць дровы і калясо. Запаляюць агонь і гуляюць ноччу. Агонь гарыць, і дзеўкі пераскокваюць чэраз яго. Хто первы пераскоча, той первы замуж выйдзе. Потым ідуць к рацэ і кідаюць вянкі. Калі вянок паплыве, то дзеўка скора выйдзе замуж, калі патоне, то няскора выйдзе або зусім не выйдзе.

Водзяць карагоды, пяюць песні.

Ой, рана на Івана
Я ўсю ночку не спала.
Двух сыночкаў радзіла,
Сама імя ім дала –
Іваначку, Васіля.
Іваначку і Васіля
Я на ручачкі ўзяла,
К Дунай-рэчке панясла.
К Дунай-рэчке прынясла,
У Дунай-рэчке ўтапіла...

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюлі Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., 1993 г.

Купалле празнавалі мала. На Купалу кучаравую крапіву (яе называлі «жычка») на вароты вешалі. Гэта, казалі, ад ведзьмаў, якія перад Іванам, як верылі людзі, збіраліся і ляталі на Лысую гору. Дык крапіву вешалі, каб яны не заляцелі.

Пелі розныя песні.

Ой, на Купалле, на Яна
Дзевачкі зелле збіралі.
Яны збіралі, не зналі,
У старога дзеда пыталі:
– Што гэта, дзядулька, за зелле,
Чорны галоўкі насення?
– Нашто вы яго збіралі,
Калі вы яго не зналі?
Ваша дзявоцкая красата
Вашаму сэрцу сухата.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н.

На Купалле купаліся, кідалі вянкі: куды ўжэ паплыве, туды замуж пойдзе. Кастры палілі, дак раньшэ і прыгалі праз іх. Еду ж папараць тожа шукалі на Купалле. Да эта рэдка такое бывае. Ну, так і гулялі, не так сяйчас.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Усе празнікі ў сямейным кругу былі ўжэ. Грэх там було робіць: ці копаць, ці жаць там. Ой, вось Купалле мы красіво адзначалі: песні пелі там, частушкі, танцавалі. Да касцёр вялікі гарэў – так ужо жарка было, агонь той гарэў. І прыгалі мы, і кветку шукалі.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Агалец Тамары Карпаўны, 1930 г. н.

На Івана Купала перад ноччу трэба рваць усе лячэбныя кветкі (зверабой, серпарэзнік, маць-і-мачыха), так как яны абладаюць магічнай сілай і добра ізлечваюць.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

На Івана Купалу збіраліся ў час дня людзі на свята. Праводзіўся такі як бы кірмаш, прадавалі розныя стравы. На рацэ пад вечар збіралася моладзь, палілі вогнішчы на берагу, дзелалі невялічкія плоцікі і на іх тожа раскладвалі вогнішчы, і пускалі па рацэ. Дзяўчаты плялі вянкі і пускалі іх па вадзе, гадалі: чый вянок паплыве, тая ў хуткім часе выйдзе замуж, чый будзе стаяць на адным месцы, тая выйдзе няскора, чый патоне, тая зусім можа замуж не пайсці і доля яе будзе нехарошая. Прыгалі цераз вогнішча, такім спосабам ачышчалі сябе ад нячыстай сілы. Дзяўчаты з хлопцамі хадзілі ў лес шукаць папараць-кветку. Лічылася, што той, хто знойдзе яе, будзе самым шчаслівым. Пераадзяваліся ў Нептуна, русалак. Няптун з русалкамі хапалі дзевак з хлопцамі і цягнулі к вадзе, тыя вішчалі, абараняліся і ўцякалі. Вакол вогнішча пелі песні, вадзілі карагоды.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

На Купалу агні не палілі. Шкоду рабілі: калоды раскацім па вуліцы, плот раскутаем, провалкай перагародзім вуліцу, лавачкі павырываем, фортачкі.

Папараць-кветку не шукалі, баяліся ў лес хадзіць, бо то ж ў 12 часоў ночы.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г. н.
(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на)

На Купалу касцёр палілі, маладзёж збіралася, карагоды вадзілі. А патом ноччу хадзілі, сматрэлі, дзе там папараць цвіце, но ето страшна было, бо ў лесе ноччу страшна. Дзе хто ўбачыць, як цвіце папараць, то шчасце будзе ўсю жызнь. Калі каля ракі жылі, то вянкі плялі, пускалі на раку.

На Івана ведзьмы маглі забіраць у кароў малако. Таму крапіву-жгучку вешаюць усюды ля хлява ад ведзьмы.

На Купалу сабіраліся, адзяваліся, дзелалі русалку, вадзілі ў поле, у жыта, а яе надзявалі, як прыходзіцца, а патом яна выскаквае з жыта і гоніцца за намі, а мы ўцякаем, бягом па дзярэўні. Для русалкі бралі любую дзяўчыну, галоўнае, каб яна была смелая, бойкая, магла што-небудзь цікавае прыдумаць, магла дагнаць і паслакатаць. А калі цябе паймалі, то ты падмяняеш яе, ідзеш у жыта і тожа бегаеш, і ловіш усіх. На рацэ, на берагу раскладвалі агонь, палілі, прыгалі: «Купаўся Іван да і ў ваду ўпаў».

На Купалу купаліся, пяклі пячэнне, кулікі называліся. Гаварылі: «Куміцеся, галубіцеся ды й прыміце мяне».

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Нікіцічны, 1928 г. н., 2002 г.

Купалле празнавалі ў ноч з 6 на 7 іюля. Хлопцы сцягвалі адусюды старыя вешчы, колы нянужныя. Усюды сабіралі. Усё гэта вывазілі за сяло, дзе далжно было быць гулянне. Увечары гэта запальвалі, вадзілі хараводы, прыгалі праз касцёр. Дзеўкі збіралі кветкі і плялі вянкі. Потым гадалі, пускаючы іх на воду, і гаварылі:

Плывіце, вяночкі,
К цару вадзяному,
Няхай ён укажа,
Дзе шчасце наша.

Так, куды вянок паплыве, туда дзеўка і замуж пойдзе. А ў 12 часоў шукалі папараць-кветку. Счыталі, што хто яе знойдзе, у таго будзе ўсё і той будзе шчаслівы. А яшчэ кажуць, што ў гэтую ноч гараць агні там, дзе клад закопан, рэкі свецяцца серабром, дрэвы ходзяць з аднаго места на другое, пціцы, зверы і расценія разгаварываюць друг з другам. А ведзьмы, вадзяныя і русалкі дзелаюць вялікія справы, насылаюць балезні, адбіраюць у кароў малако, мяшаюць людзям шукаць папараць-кветку.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

На Купалле пелі:

Мы на Йвана
Пойдзем на Купала.
Ой, рана маё,
На Купала.
Да цягалі Йвана
Да вяроўкамі,
Да цягалі яго
Да нялёгкімі.
Да хто ж пойдзе

Агеньчык класці,
Той не пойдзе
У клець красці.
А хто ж не пойдзе
Агонь класці,
Той пойдзе
У клець красці.
Ой, хто ж не пойдзе
На Купала,
Штоб яго заўтра прыбіла.
Хто не пойдзе
Агонь класці,
Ды вядзі, Божанька,
У клець красці.

Русалачка-купалачка
Ды на рэчкі купалася,
Край беражэчку сушылася,
Ды ў мамкі дачка прасілася:
– Адпусці ж мяне пагуляці,
Бо мне хлопцаў не відаці.
Ой, яе не пускала маці
Да ў пакойчыку замыкала.
Да ў пакойчыку акенечка,
У акенечка відненечка,
Дзе мой любы пахаджае
Да з нялюбаю размаўляе.
– Дай мне, любы,
Руцяны вяночак,
Каб яна яго не знасіла,
Як мяне з табой разлучыла.

Купалка Івана
На вуліцу звала:
– Іван, Іванка,
Хадзі на йгрышча.
– Гуляй, Купалка,
Здаровенька.
Некалі ўжэ здзесь
Ігрышча мне гуляці,
Нада жыта пільнаваці,
Каб дзяўчыны не хадзілі,
Майго жыта не тапталі,
І красачак не шчыпалі,
І вянок не завівалі,
На галовачцы не насілі,
Па вулачцы не хадзілі,
Малойчыкаў не завадзілі.

Купалка Івана
На вуліцу звала:

– Ваня, Ваняшча,
Пайдзем на йгрышча.
– Купалачка, гуляй адна,
А мне нада
Жыта пільнаваць,
Ды каб бабы не ўляцелі,
Жыта калоссе не пазразалі
Ды самагонку каб не гналі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Аляксандры Самойлаўны, 1914 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Школьніцай я тады была, і ўжо ў наша ўрэмя запрашчаліся гэтыя празнікі. Хадзілі, у нас там рэчка недаляко была. Каля рэчачкі палілі етыя агні, перапрыгвалі іх. Перапрыгвалі агні і як бы прыдумлялі сабе шчасце, і вянкі пускалі па вадзе. Як бывала, сабяруцца хлопцы ды дзеўкі (я тада малая была), і гулялі яны ўсю ноч гэтую, папараць-кветку шукалі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Купалле было такім: перадзяваліся дзеўкі ў белае адзенне. За дзярэўняй жыта було. Пераапрануцца – ды ў жыта. Дык пугалі адзін аднаго. Да касцёр палілі. Верылі, што калі пераскоквалі, то ачышчаліся ад нечысці.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

У нас Купала адзначалі 7 іюля. Помню, весела было, я тутака кабылу запрагаў, гармонь браў. Бліжэй к вечару ўся дзярэўня сабіралася ля клуба, запявалі песні, кастры палілі абязацельна. У самы бальшы касцёр кідалі звёрткі, а заўклуба кідала туда чучала.

Русалкамі пераадзяваліся нашы дзеўкі, у вадзе песні пелі, за маладымі хлопцамі бегалі, рагаталі, у раку завалоквалі і казыталі.

Людзі верылі, што папараць-кветка зацвітае. Хто яе знойдзе, той шчаслівы будзе – усе ж шчасця хацелі, вот і шукалі, бегалі па лесе, а за імі чэрці, русалкі праходу не давалі. Не помню, што хто-та знаходзіў, але абязацельна на будушчы год хацелі знайсці сваё шчасце.

А малыя мы дак абязацельна цераз кастры прыгалі, забаўляліся так, штоб ніколі не хварэць, а бацькам заўсёды ў помач быць. А хто гаварыў, што гэта ад чумы, хто якое прыдумае. К канцу садзілісь усе ў кружок, жартавалі, смяяліся, песні пелі:

Там за лугам зеляненькім
Брала ўдова лён драбненькі.

Набрала, выбірала,
Тонкі голас падавала,
Тонкі голас-галасочак
Цераз цёмненькі лясочак.
Там за лугам зеляненькім
Брала ўдова лён драбненькі.

Развідняла, тады дамоў шлі і з песнямі. Хлопцы дзевак вялі.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2002 г.

На Купалле мы ад ведзьмаў засцерагаліся, клалі ў парожнія пасудзіны ад малака папаратнік і дзяржалі дзень. Збіралі на Купалле зёлкі, шукалі скарбы. Хто знойдзе кветку папараці, той скарб знойдзе.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Краўчанка Марыі Пятроўны, 1929 г. н., 2005 г.

Дзярэўня была густая на травы. Травы сабіралі як лякарственныя. Відно хадзілі і вечарам людзі. Лічылася, што хто папараць знойдзе, той будзе шчаслівы. Эта ж нада ноччу іці, калі ён, месяц, свеціць.

Кастры ж палілі ды перапрыгвалі. Сабіралі старое, сухое і палілі. Пераварочвалі лаўкі, дзверы падпіралі. І на Купалле, і на Каляды ваду ставілі пад стол і зярно, свечы гарэлі. Курыцу пускалі, глядзелі, куды курыца клюне: калі ў ваду, то муж будзе п'яніца.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Сабіраюцца, паляць касцёр. Наражаюць такую Бабу Ягу, чэрці вакол кастра скачуць. На гэты празнік ходзяць у лес і цвяток шукаюць, папараць-кветку. Але мала хто ходзіць, хіба хто пойдзе ў дванаццаць часоў ночы. На беразе, дзе шчас набяражная, паляць касцёр.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Вілічэк Ефрасінні Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Цяпер у нас на Купала пускаюць вянкі. Як да яго рыхтаваліся, не помню. Маладзёж сабіралася, кастры клалі, песні спявалі. У каго больш хата, то хадзілі туда на танцы. Вадзілі карагоды, без карагода ж песня не пелася. Яшчэ прыгалі праз касцёр.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Вольгі Пракопаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Хараводы дзелалі, вадзілі хараводы. Плялі вянкі і з васількоў, і з усякіх цвяткоў. Надзявалі вянкі з усякіх кветак: і розавых, і жоўтых. Пускалі па вадзе, там і рэчка блізка. Калі хто з хлопцаў зловіць вянок, будзіць з той дзеўкай. Касцёр палілі, прыгалі чэраз агонь. Гаманілі, што папараць-кветка цвіце ў 12 ночы. Хто знойдзіць, будзе шчаслівы. Ад людзей ужо чула, як гадалі дзеўкі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Гэты празнік завецца Ражджаством Іаана Прадцечы, а ў народзе – Купала. Іаан Прадцеча крысціў Ісуса.

Раней пускалі вянкі ў воду. Гэта было так: адвозяць ад берага і пускаюць вянкі са свячой. Абязацельна са свячой. І чыя свяча быстрэй патухне, той не пойдзе замуж в этат год. А чыя відна гарэла, значыцца пойдзе замуж.

Прыгалі чэраз кастры. Гэта было такое развлечэніе!

Шукалі папараць-кветку. Хто знойдзе яе – будзе шчаслівы. Але яе немагчыма знайсці, бо яна ніколі не цвіце.

На Купалле вадзілі ў лес русалку. У лесе качэлі дзелалі ўрэменна. Там было гулянне.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

У нас на Купалле мы рвалі ўсякую траву. Этая трава памагала ад усяго. Кастры паляць ноччу ўжэ, кветку-папараць шукаем. Дзеўкі плялі вянкі і кідалі ўжэ на ваду.

Варажылі на Купалле: у яку сторану вянок паплыве, у ету сторану пайду замуж.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.



Кастры паляць, прыгаюць чэраз іх. Дзевачкі будуць плесці вянкі і кідаць іх на рэку. У якую сторану паплыве – там і суджаны.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

Хадзілі на Івана ў луг, і ў лузе такія цвецікі растуць, вот такія во. І этымі цвецікамі варажылі на сужанага. Прынясе ўжэ, паставіць на акно. Як етыя цвецікі расцвітуцца ўжо, то ўжэ харашо.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.



Бралі кветкі на Купалу і плялі вянок, пускалі ў рэчку. Калі вянок прыстане к берагу, то не жэнішся, калі паплыве ўніз па раке, то жэнішся і з'едзеш з родных мясцін. Ну, а калі вянок ужо верціцца на месце, то жэнішся і застанешся ў гэтай мясцовасці.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Супруненкі Аляксандра Рыгоравіча, 1943 г. н.
(раней пражываў у в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на), 2005 г.

В ночь на Купалу девки ходили в лес и там собирали травы, не перебираючи, все подряд, побольше, в жменьку. Бегли домой быстренько, ложили под подушку и засыпали. Утром вынимали эти травинки и, если там оказывалось ровно по 12 разных трав, верилось в то, что в этот год они обязательно выйдут замуж.

Ночью рвали листы подорожника и ложили на ночь под подушку. И делалось это для того, чтобы ночью приснился будущий муж. Кто приснится, за того и выйдет девушка замуж.

Еще и верили в то, что тот человек, который сумеет найти клевер с четырьмя листочками, у того и будет в жизни все хорошо: и доля хорошая, счастье будет и богатство. Клевер срывали и несли домой, сушили его и хранили в шкатулке. Долго хранили, а кто потеряет его, тот и счастье потеряет.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бойдак Лізаветы Іванаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Зажурылася да маладая ўдовачка,
Да шчэ й не кошаная зелена дубровачка,
Зелена дубровачка.
Да найму касарыкоў 74,
Да няхай пакасаюць усе горы да даліны.
Да касарыкоў, а вецер павявае,
Да шаўковая трава на косу палягае,
На косу палягае.
Да дзесь мой міленькі з чужою размаўляе,
З чужою размаўляе.
Да пакінь, мілы, з чужою размаўляці,
Да хадзем са мною вячэраці.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Дзядуновай Ф. А., 1922 г. н.

У полі, у шырокім раздоллі,
Там касары сена косяць.
Яны косяць, кос сваіх да не востраць,
З іх крававы пот ільецца.
Едзе чумак на сваёй фурманцы
Да з касарыка смяецца.
Ой, хоць смейся, ой, хоць жа не смейся,
Бо за смех жа табе будзе.
Прайшло лета, наступае зіма,
А ў чумака сена няма.
Бярэ чумак карбованец у рукі,
Едзе сена купаваці.
Прадай сена, а хоць жа салому,
Бо стаяць валы галодны.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад удзельнікаў хору

Пятро

Пятро – гэта дванаццатага іюля. Апостал Пятро і Павел былі такія. Гуляюць да і ўсё. Нічога не дзелаюць. У цэркву хадзілі. Абязацельна штоб вада святая стаяла ў хаце багата гадоў.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

У «кумкі» гулялі мал і стар. Збіраліся, віна тады не пілі. У баначку чарніку настайвалі. Сабіраліся ў хату. Хто што прынясе. Пад'ядалі, вып'ем і гуляем. Бацюшка к нам прыязджаў, свяціў хату.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Валянціны Мацвееўны, 1935 г. н., 2005 г.

Пятроўка – галадоўка, а на Пятра агурочкі, бульбу маладую капаем.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Нямлей Вольгі Іванаўны, 1928 г. н.

Ілья

Ілья – эта ідзе асенні празнік. Ілья, как-то гаворыцца, калі прыдзе Ілья, так ужо надзелае гнілля. После яго дождж ідзёт. Ілья – это быў очэнь божэственный чалавек. Када пераходзілі, расказвалі: рака была, і вот заблудзіліся етыя людзі і

стрэцілі етага старыка. І ім нада перайсці раку. І Ілья, эты божы чалавек, махнуў рукой, і па этай рацэ абразаваўся мост. І тыя пашлі па масту.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

У гэты дзень на Іллю нічога нельзя было рабіць. Людзі гаварылі, што «Ілля наробіць гнілля». Гэта значыць, што будзе дождж у гэты дзень, а калі пойдзе дождж, то жыта ўрадзіць добрае, калі ж будзе жарка, то зіма будзе длінная.

Пасля Іллі начынаюць убіраць цыбулю, чэснок. Тады дзень станавіўся карацейшы за ноч. Пасля Іллі пачыналі жаць жыта. Казалі, што лета ўжо адыходзіць, а осень ужэ на парозе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

Спас (макавей)

Макавей празнуецца 14 аўгуста. Цвяты свецяць усякія, якія ёсць на двары, і жыта, і моркву: «Ой, красіва, снапкі цвятоў». І ў тым пучку свечачка далжна тарчаць. Патом засушуем етыя цвяты і мертвяку пад падушку ложым у гроб, а яшчэ ад гразы етыя цвяты памагаюць.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Спас

У нас у гэты час збіраюць ураджай, жыта жнуць. Устаюць рана, ідуць у поле, аглядаюць яго, каб не было заломаў каласкоў. Перавязаўшы, нясуць дадому. А калі ішла ў царкву, асвячала іх, каб ураджай з зерня быў добры.

Дзяўчыны заўсёды ў гэты час пробавалі варажыць на маку, кажучы: «Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі вею. Скажы мне, Макавею, дзе мая пара, каб я з ім у гэту ноч канапельку брала».

Яшчэ спявалі такую песню ў нас:

Спасаўка, пералётная пташка,
Дзе лета лятала?
Дзе будзеш зімаваць?
– Ляжала ў пшаніцы,
Зімавала ў крыніцы,
У студзёнай вадзіцы.

Пасля Спаса мы ўсягда з хлебам. Таму пірагі гэтыя з новага ўраджаю такія смачныя. Хто не знае, што «трэці спас хлеба прыпас»?

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Германенка Фаціны Раманаўны, 1935 г. н., 2005 г.

Спас быў яблачны і мядовы. 19 аўгуста атмячалі. Свецяць яблыкі і мёд. Ходзяць у царкву, прыносяць дадому. Калі ўжо хто памёр, прыносяць на кладбішча. Гулялі, нічога не робяць, бацюшкаў прызджала багата.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Валянціны Мацвееўны, 1935 г. н., 2005 г.

Спас – гэта бальшы празнік. Атмячалі 19 аўгуста. Яблачкі можна есці. А ў каго дзеці ўмерлі, да Спасу не елі яблакі.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Первы дзень мядовы, а тады макавы. На мядовы спас мёд выкачвалі з вуллей. Мёд свяцілі, яблакі свяцілі. Нельзя яблыкаў есці, у каго дзеці памерлі. Еслі маць паесць яблыка, значыць, на том свеце яму не дадуць яблычка.

Трэці – яблычны Спас. На макавы Спас мак свецяць, сеяць яго.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Бывае Спас 19 аўгуста. Свяцілі яблыкі. Нельзя была яблыкі есць таму, у каго дзеці памерлі, бо на том свеце яму не дадуць яблачка, а скажуць: «Тваё яблака з'ела свіння».

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Было ў нас тры Спаса. Першы Спас – Макавей. У гэты дзень у цэркве свяцілі мак. Свячоны мак должэн быў быць у кажнай хаце, бо ён быў для ахраны чалавека ад злых людзей, ад зглазу, нячысцікаў. На Макавея падкопвалі бульбу, каб пасматрэць, урадзіла яна ці не, а пасля варылі салонікі.

19 аўгуста – другі Спас, яблычны Спас. У гэты дзень свяцілі яблакі ў царкве. Да Спаса жэншчына, якая пацярала малога дзіця, не далжна есці яблакі, бо счыталася, што дзіця на тым свеце без яблак будзе, Гасподзь яму нічога не дасць.

Трэці Спас – арэхавы. Тады зрэлі арэхі і людзі ўжэ хадзілі па іх.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

Спас бывае яблачны і мядовы. Празнаваць нада. Яблыкі есці. Але ж, калі ў каго памерлі дзеці, да спаса яблак есць нельзя, а асобенна, як малыя дзеці.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Прачыстая

Валачобнікі хадзілі. Вось жыла я за ракой у Папоўке, так у нас Прэчыстая была, яе атмячалі 28 аўгуста. Ета ў нас толькі. А другія Прыстольшчыну атмячалі. На Міколу, на Тройцу нават гулялі, па дамах хадзілі, гарэлку пілі. Два дні гулялі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

З раніцы ішлі ў царкву, маліліся там. Пасля прыходзілі дадому, елі, пілі, песні спявалі. Святкавалі як нада. А хто ездзіў у капліцу ў Крупейкі, дзе явілася ікона Параскевы Пятніцы. Падлазілі пад капліцу, каб спіна не балела. Пеклі пеўнікаў, размалёўвалі іх рознымі краскамі. Уверх іх падкідвалі, спявалі песні. Прынята было пакідаць запаленую свечку ў куце.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пікас Варвары Пятроўны, 1927 г. н., 2005 г.

А ў нас усёй вёскай празднуюць 21 сенцябра Прачыстую. Збіраюцца, ідуць да іконы, там моляцца. Гатовіцца бальшой абед і прыходзяць са ўсіх дзеравень госці. Усе родственнікі збіраюцца ў адным доме, дзе б далёка ні жылі, і комплексны абед палучаецца. Называецца – Прыстольшчына. Тут ужэ і танцы, і песні, і п'янкі. Песні пелі.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Мікітаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Втарая Прачыстая – 21 сенцябра. Сабіраліс на пяску, танцавалі ды гулялі. Гэта прыстольны празнік быў. Хадзілі, як правіла, у царкву. Ніхто нічога не дзелаў.

Кабанчыка білі, самагонку гналі. Пелі песні абыкнавенныя, песні застольныя пелі. Да вайны было Ушэсце, а после вайны Прачыстаю правілі. На іконы вешалі ручнікі, на вокны – занавескі.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Дажынкі

АБРАД «БАРАДА»

Бяруць жыта ў пучок і звязваюць, потым яго ставілі, і ён у нас называўся «барадой». Потым з «барады» дзяўчаты пачынаюць плесці вянкі і прыпяваць такія словы:

У полі дажынкі,
У доме радзіначкі.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Алімпіяды Рыгораўны, 1922 г. н., 2005 г.

Пара, маці, жыта жаці,
Салома паўяла,
Жаль мне вечарочка,
Што я не гуляла.
А таго я не гуляла,
Што я была дома,
Што балела галовачка,
Была нездарова.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнкі Мікалая Сямёнавіча, 1917 г. н., 2002 г.

А я жала ды буйна жыта
Дый утамілася.
Да падышла пад шыроку постаць,
Да павалілася.
Да ўсе людзі дадому ідуць,
А я не пайду.
Да я ж буду ў полі ночку начаваць,
Як зязюлька, буду кукаваць.
Да зачула галасочак маці,
Да стала мяне гукаці.
Да ідзі, дзіця, ка мне начаваці,
Будам ночку з табой начаваці.

Запісана ў в. Абакумы Лоеўскага р-на
ад Санько Т. А., 1922 г. н., 1999 г.

Няхай будзе пагодачка,
Няхай будзе пагодачка,
Хай спорыцца работачка.
Пагодачка канчаецца,
Пагодачка канчаецца,
Работачка спяшаецца.
Жніце, жнейкі, у мяжу, у мяжу,
Жніце, жнейкі, у мяжу, у мяжу,
Там знайдзіце мёду дзяжу.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Кулага Веры Васільеўны, 1939 г. н.
(раней пражывала ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на)

Жыта жалі, снапы звязвалі, рэзалі гэтае сцябло, жніцы забіралі, дадому з песнямі ішлі. Там ужо встрэчалі з бутылкамі. Выпілі трохі да і ўсё. Пелі песні, толькі не нашыя, а зарэчныя.

Зажынкі

Ну, зажыналі з песнямі, штоб харошы ураджай на лета быў. Калі дажджы ідуць, не пелі.

Першым у зямлю кідаюць грэчку. Грэчку тады ўжо ўбіралі калхозам. Пагружалі на вазы, везлі на двор, там взвешвалі, колькі. Рабілі з песнямі.

Дажынкі

Ну, дажынкі дажынаюць памаленьку, з песнямі, а патом прыязджаюць машыны, грузяць тыя снапы і вязуць у адно места, а патом стаяць такія камбаіны. На полі астаўлялі бараду, не дажыналі, каб добры ўраджай быў. Нельзя было зрываць гэтую бараду, для чалавека гэта вельмі дрэнна, аж да смерці.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Згубіла зара ключы,
Каля постаці йдучы,
А месяц за ёй ішоў,
Залаты ключы знайшоў.
Ой, месяц, месяцу,
Аддай мае ключыкі,
Буду зямельку замыкаць,
Жней дамоўкі распускаць.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Філатавай Наталлі Міхайлаўны, 1943 г. н., 1999 г.

Ой, шкада мне вечарочка,
Ой, што я і не гуляла.
Шкада, шкада паренёчка,
Што любіла, пацярала,
Ой, што дома не бывала.
Да сіняга Дуная я коніка напавала,
Покуль каня напавала, я мілага пацярала.

Да няма маёй маці
Да мне постаці падагнаці.
Да няма маёй сястрыцы,

Няма маёй памачніцы.
Ой, я жну, не лянюся,
У баразёнку завалюся.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Краўцовай-Буйніцкай В. Я., 1920 г. н.

На тым боцы за ракою
Родзіць жыта з лебядою.
Родзіць жыта з лебядою,
А пшаніца з асакою.
Там Таццяна жыта жала,
У правай ручцы серп дзяржала,
А леваю ў жменю брала.
Там Раман з канём іграе,
На Таццяну паглядае.
Кінь, Таццяна, жыта жаць,
Будзем з табой размаўляць.
Будзем з табой размаўляць,
Калі будзем свадзьбу граць.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Мінчуковай М. Х., 1938 г. н.

Сноп дзелалі такой. Ставілі еты сноп. Абычна к этаму снапу падносілі гуркі, чарку пілі. Эта дзелаліс такіе дажынкі. Абычна першым кладуць авёс. «Сей авёс у гразь, дак будзеш князь». Калі дажынкі дзелаюць, дажынаюць, дык астаецца на жменю, не зжынаюць сцебляў етых. Эта называлася «на бараду», штоб у цябе не зводзіўся ўраджай.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

У нас так. Ішлі вечарам зажынаць. Снапок нажне і нясе, і стаўляе на куце. Ну, а тады ўжо, як высахне, яна абмалоціць і нясе ў цэркву свяціць. Эта, казалі, – «вянок». Той «вянок» первым рассявалі.

Канчаюць жаць, дзевяць каласкоў астаўляюць. І звязувалі, і цвяты туды клалі, і хлеба, і солі наверх клалі. Вот ета называлася «барада». У панядзелак не зажыналі. Ішлі ў пятніцу, суботу – вот у такія дні.

Адзяваліся чыста: палатняная рубашка, чысценькая юпка, запонка, казалі, палатняная, чысценькая. А як жарка, дык і ў сарочках жнуць. Гаварылі так:

Ой, чыя то макатыра
Дадому пакаціла.
Ой, пакуль яна дайдзе,
Дык і сонейка зайдзе.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н., 2001 г.

Абжынкі. Уж вот дажынаем і даем колькі кускоў каласоў. Пакладзеш хлебца, краснай нітачкай зав'яжэш. А хлебец еты – ета ўжэ закончылі. І ўжэ песні пяюць там. Яны ж тую бараду робяць і пяюць толькі песні.

Закончылася жніво, кожная жняя на сваёй паласе ўжо бараду дзелала, каласкі кідае і хлеб пакладзе. Абы-хто рабілі, балышынство – старыя жанчыны.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н. (раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Бяром серп, жнём. Мы пелі толькі, калі ішлі дадому. Трэба было зжаць, звязаць, знасіць.

Жыта жаці – не ляжаці,
Нам будзе зажон,
Штоб жа нашым варажочкам
Пад бакі ражок.
Аж наша макатыра
Ды дадому пакаціла,
Пакуль дадому дойдзе,
Дык і сонейка зойдзе,
Пакуль нагатуе,
Дык і там заначуе.

У багатага хазяіна палудкаваць пара,
А ў нашага маландрылы ды і хлеба няма.
Дык забылася сярпа ўзяць,
Серп узяла – хлеб забыла.

Зерне ў зямлю кідалі з каробак і казалі: «Радзі, Госпадзі, на кожнага долю». На жыце ад птушак ставілі пугала. Станавілі граблі, надзівалі на ніх плацці старыя, картузы і яшчэ што-небудзь.

Бораду астаўлялі на полі. На дажынкі к нам з калхоза давалі віно. Мы ўжо сабіраліся і выпівалі, і дажынкі гэтым замочвалі з музыкай і песнямі. Жняя на дажынкі астаўляе кусцік жыта і тады перавязвае яго лентаю, той кусцік, і ўнутр кладзе хлеб і соль, і вадою палье. Тады казалі: «Ты ўжо з барадою», – гэта ўжо значыць, што ты ўжо дажала.

Вот табе, барада, хлеб, і соль, і вада. І вадзіла маладзіца.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на ад Максіменка Варвары Анатольеўны, 1925 г. н., 2005 г.

Пара, маці, жыта жаці,
Салома павяла.
Ой, жаль, жаль мне вечарочкам,
Што я не гуляла,
А чаго ж я не гуляла,
Што не была дома,
Забалела галовачка,
Была нездарова.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на ад Качалавай Алены Мікалаеўны, 1912 г. н., 1992 г.

Свята зажынак! Свята зажынак!
Хай радаснай працай напоўніцца
Малінаўскі край!
Свята зажынак! Свята зажынак!
Багаты чакае ўсіх ураджай,
Хваля ўрачыстага буйнога жыта,
І песня льецца ўголас,
Свята зажынак, к табе прыбывае
Выспеўшы добры колас.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на ад Германенка Ф. Р., 1935 г. н., 2005 г.

Жніво начыналі перад Іллёй. Бацька ідзе поле глядзець: паспела жыта ці не? Паходзіць, паглядзіць сваё поле: як урадзіла жыта, ці добрае, ці паганае? Усё абгледзіць. Тады дадому прыходзіць і саветуе матцы, адкуль жаць пачынаць.

Збіралі тады ўжо жней, шо жаць будуць. Бацька ішоў па іх. А мама ў еты час ідзе ў поле і зажынае. Первы сноп нажне і дадому нясе яго. От тады ўжэ можна жаць іці і жнеям. Сноп еты завязвалі лентай краснай і на кут пад іконы ставяць. Тады абедаць садзіліся ўсе разам і жнеі. Паабедаўшы, ішлі ў поле жаць ужэ. Калі жнеі прыходзілі на поле і жалі первы сноп, то прыгаворвалі: «Дай жа, Божачка, каб лёгка жалась, сярэдзінка не балела, ручачкі не млелі, ножачкі не дзервянелі, галава не гарэла». Ну, а тады ўжэ і жалі.

Калі жалі, то і песні пелі.

А я жыцечка жала
Дай на хату паглядала.
Ой, ці топіцца хата,
Ці варыцца каша?
Наварыла мамка боршчу
Дай накідала хвошчу.
Наварыла мамка кашы
Дай накідала сажы.
Ешце, дзевачкі, боршч, боршч,
А вы, маладзічкі, хвошч, хвошч.
Ешце, дзевачкі, кашу,
А вы, маладзічкі, сажу.

Калі ішчэ толькі начыналі зажынаць жыта, то пелі, каб дажджу не было.

А дай, Божа, пагодачку
Да й на нашу работачку.
Мы ў пагодку парабляем,
А ў нянасце пагуляем.

Так і жалі, пакуль не заставаўся малы зусім кусок. А калі ўжо трохі асталось, то нада было ўпасці і пакачацца па іржышчу, прыгаворваючы: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку на другую ніўку».

Ета рабілі, штоб нічога не балела і хваціла сілы дажаць ішчэ не адно поле. Жаць хадзілі адны да адных, бо ж сеялі багата.

Як пажнуць, аставяць трохі каласоў, іх ужэ хазяйка падвязвала і перагінала да зямлі, выкопвала там ямку, лажыла туды соль і хлеб, каласы нагінала і прыкопвала. Етыя каласы называюць «барадой». Казалі пры етым, як закопвалі:

Ой, чыя там барада,
Палатном абвітая?
Ой, дзіва, дзіва мне,
Дзіва етай барадзе.

Завівалі бараду для таго, каб у наступным годзе ўраджай добры быў і каласы ад цяжкасці гнуліс ь так да зямлі, як етая барада.

Было і такое, што заломы находзілі ў жыце. То іх ведзьма рабіла. Яна, гаварылі, на кагось порчу наводзіла. Дак залом еты, не дай Бог, чапаць, а то гора здзелаецца. Я такі залом і сама бачыла. Жалі калісь жыта ў суседкі, ну, тут адна кажа: «Паглядзіце, кубло чыё ці што?» Аж то не кубло было, а залом. Жыта цэлы пук звязаны паміж сабою, перакручана, а каласкі пазаломваны ўніз, і ўсе па кругу так і ляжаць. А жала была з намі і цётка адна. Дак гаворыць: «Не чапайце, а то гора будзе, я сама ета ўбяру. Міне нічога не будзе». Узяла сама і ўбрала ўсё. Сказала, каб ніхто не падыходзіў. Яна забрала дадому тое жыта. Што рабіла з ім, ніхто не знае. Гавораць, што ведзьмы заломы робяць, і яны іх толькі самі могуць і ўбраць.

Сноп той, што на кут ставілі, на Спаса свяцілі, і тады етым жытам начыналі сеяць.

Такіе прыказкі былі: хто ў жніўні гуляе, той зімой галадае; закончыш жніво ўпору – будзе хлеба ўгору; жні жыта ўпару – будзе што варыць к двару.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Смалянчук Кацярыны Сцяпанаўны, 1921 г. н., 2003 г.

Гэта свята празнавалі, калі ўсё жыта была сабрана з палёў. Раней жалі сярпамі. Уставалі рана, да ўсходу сонца, часта начавалі ў полі, каб не цяраць час на хадзьбу да сяла і абратна. Жалі ўсе разам, памагая друг другу, а каб было весялей, то людзі пелі песні:

Давайце мы жаці, не ляжаці,
Да дажномся ў рог,
Да будам мы вячэраці
Пшанічны пірог.
А ўжо сонца на захадзе, а мы на мяжэ,
Перакіслі варэнікі, стоячы ў дзяжэ,
Бяжы, бяжы, Манечка, дзяжу замясі,
Да свайму Ванечку вячэраць дасі.

У нядзельку сплю, сплю,
У панядзелак жну, жну.
А ва ўторак снапоў сорак
Пшанічанькі нажну.
У сераду вазіла, а ў чацвер малаціла,
У пятніцу веяла, а ў суботу мерала,
А ў нядзельку прадала,
З хлопцамі прапіла.
Слава табе, Госпадзі, што да дзела давяла,
Ні да дзела ж я, ні да работы я,
А з хлопцамі пагуляць –
То ахота мая.

Пасля ўсех работ святкавалі: накрывалі стол, радаваліся добраму ўраджаю, завязвалі лентай сноп жыта і пелі песню:

Ой, чыя то барада красным шоўкам абвіта?
Эта мая барада красным шоўкам абвіта.
Да павей, вецярочку, да паддай халадочку
Да па чыстаму полю, да па жыцечку яравому.
Пара жыта жаць, ужо салома павяла,
Да ў снапочкі вязаць.
Да ўжо жыта пажалі, у снапочкі павязалі.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

Есць песня, когда жыто жалі:

А ўжэ сонца на захадзе,
А мы на межэ,
А мы на межэ.
Перакісла ўжэ цеста,
Стоячы ў дзежэ,
Стоячы ў дзежэ...

Вы знаеце, што такое дзежа? Дзежа – это такая маленька бочэчка. І ў ней мешают муку, размешывают, воду льют, дрожжы. Цесто подходзіт, выхажываецца, і вот поёцца в песне. Значыт, это цесто ўжэ вкісло.

– Ідзі, ідзі, Мар'яначка,
Дзежу замясі,
Што ж ты свайму Іванечку
Вечарам дасі?
– А я свайму Іванечку
Варэнечкі паднясу,
Варэнечкі паднясу...

Бралі гэтае цеста, ано такое кісленькае. Не такіе варэнікі, как сейчас пельмені, а цесто раскатывалі і в сярэдзінку лажылі што-небудзь, грушы, напрымер. Обычно грушы, а патом мы іх потолочэм. Была такая ступа, мы ў ёй толклі. Мы іх кіпятком ошпарывалі, грушы, оні такіе вкусные получаліс. В цесто ложылі, закатываем. Это называлася нашэ беларускае об'ядзенне.

...Заплялі вяночак,
Заплялі вяночак
На доўгі гадочак,
На жыта густое,
Проса залатое...

Эту песню пелі, кагда жнут жыто, убірают ураджай. Когда ўбіралі ўраджай, мы ездзілі туда на ферму, і там тожэ песні пелі абрадавые, посвяшчоные ўборке ўраджая.

...Ячмень каласісты,
Ячмень каласісты,
Авёс залаціcты.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Аляксандры Самойлаўны, 1937 г. н.,
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Дзелалі дажынкі, гарэлку пілі. Калі ўсё пажалі, пакідалі 3 каласы, звязвалі іх лентачкай краснай. Гэта называлі «жураў». Потым сабіраліся ў хаце, спраўлялі дажынкі.

Гуляй, гуляй, радзіна,
Штобы жыта радзіло,
Штобы жыта і авёс,
Штоб гуляў увесь наш род.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Сіроточка жыта жала,
К сырой земле прілігала.
К сырой земле прілігала,
З сырой зямлёю гаворіла.
З сырой зямлёю гаворіла:
– Ты, сырая маць-зямелька,
Ты, сырая маць-зямелька,
Узяла майго бацьку й маці,
Узяла майго бацьку й маці,
Узяла маю ўсю радзіну,
Узяла маю ўся радзіну.
Вазьмі мяне, сіраціну,
Вазьмі ж мяне, сіраціну.
– Ня буду я цябе браці,
Ня буду я цябе браці,
Хачу табе долю даці,
Хачу табе долю даці.
Хоць і не такой, як людскою,
Не такою, як людскою,
Хоць табе сіроцкай.

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.

Да на дабранач табе,
Да шырокае поле,
Да жыцечка едраное,
Да добры вечар табе,
Да халодная хатка,
Да няродная матка.

Не путае ў мяне,
Ці востры сярпочак,
Ці баляць твае ручкі.

А путае ў мяне,
Ці вяліку ніву зжала,
Ці багата коп наклала.

Што на двары вечар вечарэе,
А ў казака сярдзехенка ные.
Яно ж ные, панывае,
Казак дзеўку любіць, пакідае.
Эх, запрагу каня варанога
Ды паеду к дзеўцы на размову.
Здароў, дзеўка, здароў, мая люба,
Ох, ці дома твая горда доля?
Мая доля вячэру варыла,
Наварыўшы, села я аддыхаць,
Аддахнуўшы, пайшла гуляць.

Запісана ў в. Цясны Лоеўскага р-на
ад Чучвага Праскоўі Піліпаўны, 1919 г. н., 1999 г.

Як зачынаюць жаць, нажынаюць такі маленькі снапок і ставілі ў хаце. Нада, штоб зажынала сільна крэпкая жэншчына і не бальная, штоб усім добра было.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Астаўляеш «бараду» – 3 каласкі і стаўляеш палку. Завязвалі красівымі лентачкамі і клалі радам хлеб, соль. Каб спіна не балела, калі першы гром пачуеш, падысці да ўшулы, і паднімаюць яе спіной.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

А я жала ды буйное жыта дый утамілася,
Ды падышла пад шырокую постаць, а і павалілась.
Да ўсе людзі дадому ідуць, а я не пайду,
Да я ж буду ў полі ночку начаваць,
Як зязюлька, буду кукаваць.
Да зачула галасочак маці,
Да стала мяня гукаці.
Да ідзі, дзіця, ка мне начаваці,
Будам ночку з табой начаваці.

Апошні сноп дажалі – завязваюць бараду. Гэта сноп, аплецены красным шоўкам. Жанчыны ўпрыгожваюць апошні сноп і спяваюць:

Ой, чыя й то барада, а-у!
Красным шоўкам абвіта?
А то мая барада, а-у!
Красным шоўкам абвіта, а-у!

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.



Да павей вецярочку, да падай халадочку,
Да па чыстаму полю, па жыцечку ядронаму.
Да пара жыта жаці, да ў снапочкі вязаці,
Да ўжо жыта пажалі, у снапочкі павязалі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай А. С., 1937 г. н., 1999 г.

Як канчаюць жыта жаць, жыта сцеблік астаўлялі. Іх каласкоў пяць, етых жыцін. Дак завяжэ краснай лентай. І яно стаіць, і эта ўжо дажынкі. Эта называлі «журава завязаць». Жнеі кулікаліся на полі.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Завівалі бараду, прыгаворвалі: «Каб на стале быў і хлеб, і соль, хто на полі быў, а хто не быў, каб у таго нічога не было».

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Карнавушанка Хрысціны Анісімаўны, 1904 г. н., 1995 г.

ВОСЕНЬСКІЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ

Здвіжанне

Было прыстольнае. Вужы збіраюцца ў кучу, на зіму хаваюцца. Ікона здвігаецца на Здвіжанне, поп здвінаецца і сонца таксама.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Перадзвігаецца зямля ў этат дзень. І сонца так жа ж сама.

У дварэ кідалі крапіву, дзе ходзіць скаціна. Зерном вакруг хаты абкідвалі ад врагоў. Змеі ползаюць, у лес нельзя хадзіць.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

ЛЬНЯНАЯ ПЕСНЯ

Штой за гаем зеляненькім,
Штой за гаем зеляненькім
Брала ўдава лён драбненькі,
Брала ўдава лён драбненькі.
Яна брала, выбірала,
Яна брала, выбірала,
Тонкі голас падавала,
Тонкі голас падавала.
Там Васілю сена косіць,
Там Васілю сена косіць,
Тонкі голас пераносіць,
Тонкі голас пераносіць.
Кінуў касу да доланьку,
Кінуў касу да доланьку,
А сам пайшоў дадоманьку,
А сам пайшоў дадоманьку.
– Пазволь, маці, удаву браці,
Пазволь, маці, удаву браці,

Тагда будзем піць, гуляці,
Тагда будзем піць, гуляці.
– Не пазволю ўдаву браці,
Не пазволю ўдаву браці,
Удава будзе чаравaці,
Удава будзе раўнаваці.
Чаравала майго мужа,
Чаравала майго мужа,
Чаравaці будзе майго сына,
Чаравaці будзе майго сына.

ПАСТУХОВА ПЕСНЯ

Той на гары крынічанька,
Там халодна вадзічанька,
Там Раман валы пасе,
Кацярына ваду нясе.
Раман волы пакідае,
Кацярыну пярэймае,
Кацярыну пярэймае,
З вёдзер воду вылівае.
О, Раману, маё серцэ,
Астаў вады хоць вядзерцэ,
А вадзіца халодная,
У мяне маці не родная,
Будзе біці, шчэй лаяці,
Шчэй Раманам дакараці.
Дзе ж ты, доню, барылася,
Што вячэра зварылася.
Ой, та маці каля броду,
Скалацілі гусі воду,
Пакуль вада ўстояла,
Я з Раманам пастаяла.
Брэшаш, доню, не каешся,
Ты з Раманам кахаешся.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Такарэнка Лідзіі Антонаўны, 1932 г. н., 1992 г.

Свята «Цуда»

Гэта свята спраўлялі ў верасні, з 19 на 20 верасня. Гэта не было такім вялікім святам, як Ражджаство, Пасха, Благавешчанне. Гэта свята адбывалася ноччу. Збіраліся маладыя хлопцы і дзяўчаты ў гурткі, пераапраналіся, каб не пазналі. Бралі з сабой вялізную гарбузу, выразалі вочы, рот, рабілі нос, а ў сярдзіну гарбузы ўстаўлялі свечку або яшчэ што-небудзь такое, каб гарэла. І потым хадзілі па вёсцы і пужалі, палохалі, дзівілі людзей. Хто-небудзь з хлопцаў або дзяўчат стукаў у акно ці дзверы, калі гаспадар абзываўся ці выходзіў на ганкі, пераапрануты чалавек з гарбузой стараўся напужаць гаспадара. Або ў гэтую ноч рабілі самыя розныя цуды. Маглі зняці калітку і занесці яе ў другі канец вёскі. Вядро з калодзежа выцягвалі, разматвалі цэп і працягвалі праз дарогу. Дзверы ў хату падпіралі чым-небудзь, каб хазяін раніцай не адчыніў.

Але ў гэты вечар нічога дрэннага не рабілі старым, адзінокім людзям.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Ганны Рыгораўны, 1930 г. н., 1993 г.

Святкавалі Цуда 19 верасня. Чудзілі людзі: хвортку знімалі, коміны затыкалі. Нельзя работаць у гэты дзень. Адзін мужык работаў – снапы звозіў. Паставіў валоў, пасля вярнуўся, а валы без рог і кроў ідзе. Вось што значыць у гэты дзень работаць.

Запісана ў в. Старая Лутава Лоеўскага р-на ад удзельніц фальклорнага гурта «Лутава»

Пакроў

Гэты праздник устаноўлен у памяць аб цудоўнам яўленні Божай Мацеры ў храме.

Быў чацвёрты час ночы, храм быў перапоўнен маляшчыміся. Тут быў і Андрэй Хрыста, юродлівы, са сваім учэніком Епіфаніем. Калі ён падняў глаза, то ўбачыў Мацер Божую, якая ішла па воздуху з ангеламі і святымі. Прэкланіў калена, яна доўга малілася, а потым падашла к прэстолу храма, зняла са сваей галавы пакрывала (пакроў) і раскінула яго над маліўшыміся ў храме людзьмі, захоўваючы іх ад відзімых і нявідзімых ворагаў. Гэты праздник адзін з вялікіх. Ужо пасля Пакрова нельзя было выганяць жывёл на пастбішча, яна ўжо стаяла ў хляве. Старыя людзі счыталі, што калі на Пакрова снег не пакрые зямлю, то і на Каляды не будзе снегу. Хлопцы ў гэтую пару выглядалі сабе нявест.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Грышчанка Лізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Дзяды

Ну, Дзяды ж харашо. Ужэ ўсе сабяруцца ў кучу каля сваіх. Ну, кожан жа ідзе да сваіх, бо каждаму нада. Крэпка добра ўжэ было.

Абед жа нада гатаваць. Абед нада гатовіць посны к Дзядам. Ну, мае дзяды елі ўсё, і я ем, я не пашчусь, дак няхай і яны ядзяць. Пост тады, калі ў мяне няма нічога. Нада ж ужэ астаўляць дзядам што-небудзь з яды. Што аставіш, тое ўжэ і стаіць, а дзяды ўжэ ядзяць. Так калісь ужэ рабілі.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н. (нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Дзяды могуць быць і ў феўрале, і ў марці, патаму што залежыць гэта ад «мясаеда» каляднага.

Другія Дзяды траецкія, на Троіцу. Тожа завісяць, еслі ранняя Паска, то ў канцы апрэля, а еслі позняя Паска, значыць на дзве нядзелі могуць быць пазней – у маі.

І трэція Дзяды – ілі сядзьмога, ілі шэстога наября.

На ўсе Дзяды роўна. Вараць посны абед, вячэру. Боршч, кашу, картошку і абязацельна штоб «сыта» была: ілі з сахару, ілі з мёду. Ставяць «сыту» ўперад, часоў на два, на тры. Патом ужэ вымаюць абед увесь, стаўляюць. Старыя доўга Богу моляцца, ну, а маладыя перахрысцяцца, помоляцца і садзяцца. Уперад падаюць «сыту». Ложку набярэш і зразу на скацерку, на стол, не выліваюць, а прытуліць

трэба. Астатак «сыты» пакідаюць на стале. Тады ўжэ боршч, картошку падаюць, тожа так робяць. Ужэ ў суботу вараць скаромнае. І абедаюць у полпервага, у дзвянаццаць. Рана абедаюць. Ужэ блінчыкаў усякіх напякуць – усё скаромнае.

Дзяды ўсегда два дня: увечары ў пятніцу і да абеда ў суботу.

Са стала ў пятніцу нічога не ўбіраюць, начуе да суботы. А ў суботу яшчэ да вечара. Увечары ўжэ сабіраюць, мыюць. Ета штоб прышлі дзяды.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н., 2001 г.

Ну, то ўжэ вараць жа абед. Посную ж робяць вячэру, гукаюць усіх сваіх радзіцелей: «Ка мне прыходзь». І ўжо ўвечары вячэралі, тое закрылі і не скідаюць са стала. Толькі накрылі. Зварат ужэ што паложана: і кашу, і баршчы, там і картошку, і ўжэ сытае там, салодкае абязацельна, і хлеба пакладуць. І ўжэ тады павячэралі, а тое ўжо назаўтра. І зноў пакладуць трошку гарачага на стол, да абеда стаіць, а тады прыбіраюць са стала.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Другі раз паміналі памёршых на Дзяды, гэта ўвосень. Гэта свята прасднавалі на трэцюю нядзелю пасля Пакрова. Людзі шлі ў цэркаў, пісалі запіску з імёнамі мёртвых, каб іх памянулі, і ставілі памінальную свечку. Потым вярталіся дадому і накрывалі памінальны стол. Гатавалі многа разнай еды, а яшчэ гатавалі тую яду, якую любіў памёршы. Калі што падала са стала (хлеб, лыжка або шчэ што), то гэта не падымалі, бо счыталі, што гэтым памёршыя пакарыстаюцца.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

Калі дзядоў памінаюць, у цэркаў ходзяць. Гатовяць тры стравы: боршч, каша, аладдзі ну і кісель. І ўсё ставяць на стол. Паядзім, памянем за чарачкай. Хто яго знае, ці трэба варыць на Дзяды эту ежу. Вот я раз не наварыла на Дзяды, дык ніколі не забуду, як снілася мне маці: матка стаіць каля стала і так есць, так есць! Значыць, нада ета абязацельна ўспамінаць памершых.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Стаўляюць ужо картошку з грыбамі, абязацельна «сыту» – вада, булка і сахар – тры ложачкі. Астаўлялі на нач і гаварылі: «Прыходзьце, дзяды, на вячэру». Нада абязацельна белыя семечкі (зернаты, як у нас называюць), сялёдку. Ходзяць на кладбішча, убіраюць там ужэ. Я веру ў тое, што абязацельна нада сыту ставіць. Раз не паставіла,

дык як легла спаць, закрываю вочы – стаіць баба мая перада мной. І так усю ноч. Дык я ўжэ ўсягда стаўлю.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Лемех Ганны Паўлаўны, 1927 г. н., 2005 г.

Спраўлялі Дзяды ўвосень. Вячэру варам. Увосень 8 наября ўвечары робім «сыту» якую, грыбы падаем, кісель варам. А ўжо ў абед багата яды гатовім. Стаіць усю ноч яда, таму што дзяды прыйдуць. Іх пачынаюць званць: «Дзяды, сабірайцесь, і дальнія, і блізкія».

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

На дзяды варылі ежу, пакідалі ежу на стале. Казалі: «Дзяды і бабы, усе свае і чужыя, прыхадзіце ка мне вячэраць». Бутылку трэба паставіць. Аднойчы брат мой сказаў, што не верыць у дзядоў. Лёг спаць, а над ім на печы ляжалі адзенне, трапкі, аднім словам – барахло. І як толькі сказаў, усё ўпала на яго.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

Ну, як праводзіліся дзяды? Гэта ж памінанне душ памёршых. На стол накрываюць, гарэлачку абязацельна ставяць, насмачнейшую штоб яду. Абязацельна каб боршч быў, каша, кісель варылі. Так і памінаюць дзядоў. Просяць, каб прыходзілі дзяды вячэраць. Яшчэ ёсць троечныя дзяды – Троіца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Хмелянок Марыі Яўсееўны, 1927 г. н., 2005 г.

Яшчэ Дзяды «помінкі» называюць. Дзяды бываюць Троецкія і Міхайліны. Усягда запіскі пішуцца, у цэркаўку носяць, за ўпакой свечку ставілі. Дома гатовілі коліва – паследнюю яду мертвяка. «Сыта» яшчэ яе называюць. Гатовілі ў пятніцу і ў суботу. У пятніцу – поснае коліва, а ў суботу – скаромнае ўжэ. Што ставілі на стол? Як усягда. Што самі елі, то і гатовілі – боршч, кашу, аладкі. Хлеб і вада – апошняя яда.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Называюцца Дзяды па-цяперашняму «Усопшая нядзеля». Эта нясуць у цэркву дань, бацюшка адпраўляе. Бумажачку напішаш, і ён прачытае. Дома астаўляюць абязацельна яды на стале. Еслі ў п'ятніцу – посная ежа, еслі ў суботу – не.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

На Дзяды каталі яйца. Гэта празнік, калі на кладбішча ходзяць. К Дзядам рыхтаваліся лучшэй за ўсяго. Тэж прыязджаюць дзеці адусюль туда, на кладбішча. А гатаваліся ўсе ж свае родзічы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Бліны пеклі, на акошка іх клалі. Прыходзяць дзяды, дык эта ўжэ клалі блін. Ладкі пячэш, ложаш на акно. Там ужэ сала, калбасы. Увечары сладкай вады, пячэння туды пакрышыць, кансервы, рыбы – такое ўсё ставяць на стол.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Восенню спраўлялі спачатку Дзмітравы, затым Кузьміны, потым Міхайліны Дзяды. Гатавалі ўсё, што маглі. Калі Дзяды ў пятніцу, то гатавалі поснае, а калі ў суботу – то скаромнае.

Запісана ў в. Трасцянец Лоеўскага р-на
ад Яшчанка Праскоўі Аляксандраўны, 1926 г. н.,
Выгляд Таццяны Максімаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Валянціна НОВАК
Марыя КАСЦЮКОВА

МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ ЛОЕЎШЧЫНЫ

Структуру радзінна-хрэсьбіннага комплексу Лоева і Лоеўшчыны складаюць такія кампаненты, як прыкметы і павер'і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны; абрады і дзеянні, што адбываліся падчас родаў; наведванне жанчыны-парадзіхі сваякамі і іншымі блізкімі людзьмі; абрад хрышчэння, адорванне бабкі-павітухі і кумоў падарункамі, хрэсьбіннае застолле, абрад разбівання «бабінай кашы», частаванне бабкай-павітухай гасцей, выкананне радзінна-хрэсьбінных песень. Галоўная мэта рытуалаў дародавага перыяду – засцерагчы жанчыну-парадзіху ад уздзеяння злых сіл.

Згодна з мясцовымі ўяўленнямі, шчасце і здароўе дзіцяці залежаць ад правільнага выканання ўсёй сістэмы правіл, народжаных народнай мудрасцю на працягу шматлікіх стагоддзяў: лічылі, што «нельга было, каб свет ад луны падаў на яе (цяжарную жанчыну – *В. Н.*), бо дзіця «па начах хадзіць будзе», пераступаць праз вяроўку і калыхаць пустую люльку, бо памрэ» (г. п. Лоеў). Мясцовыя традыцыі забаранялі цяжарнай жанчыне «глядзець на мерцвякоў, нада засцерагацца ад зглазу, ліхіх вачэй, нельга наступаць на нешта крывое», бо лічылі, што «дзіця магло быць гарбатым» (в. Сяўкі), забаранялася цяжарнай жанчыне «сматрэць на агонь ці пугацца агня і хватацца за цела, бо пятна аставаліся» (г. п. Лоеў). Жыхары в. Рэкорд прытрымліваліся наступных прыкмет і павер'яў, звязаных з цяжарнасцю жанчыны: «каб дзіця разумным было, нельга было стрыгціся маці, пакуль яна носіць дзіця», забаранялася што-небудзь пазычаць, каб дзіця не жыло ў беднасці, нельга было «браць за куму незамужнюю, бо тады яна не выйдзе замуж».

Верылі на Лоеўшчыне, што развязванне вузлоў, калі адбываюцца роды, аблегчыць пакуты і паспрыяе здароўю жанчыны-парадзіхі і нованароджанага. «Роды звычайна прымала бабка-павітуха. Як толькі яна прыходзіла ў хату да парадзіхі, развязвала хвартух, «каб хутчэй развязалася маці з плодам» (Рэчыцкі павет), здымала з сябе пояс і абводзіла ім тры разы вакол жывата парадзіхі, кідала яго на падлогу, дзе ён ляжаў да нараджэння дзіцяці (Мазырскі павет)» [1, с. 29].

Будучы дабрабыт і шчасце дзіцяці залежалі, паводле народных уяўленняў, ад удалага выбару кумоў і бабкі-павітухі. Без гэтых галоўных герояў не ўяўлялі

радзінна-хрэсьбінных святкаванняў. Кум і кума абавязкова ўдзельнічалі ў абрадзе хрышчэння дзіцяці: «крёсные дарили подарки креснику, а мать ребенка дарила подарки кумовьям» (в. Рудня-Каменева). Важны абрад разбівання «бабінай кашы» выконваў, як сведчаць жыхары Лоеўшчыны, кум: «на хрысцінах хросны должан выкупіць кашу. Калі ён кашу выкупіць, гаршчок разбівалі» (в. Мохаў). Ад таго, як зварана каша, лічылі, залежаць асаблівасці фізічнага развіцця дзіцяці: «а кашу нада такую варыць, штоб гаршчок разбіваўся, а каша стаяла». І малой будзе крэпкім тады» (в. Пярэдзелка). Хрэсьбінны звычай класці чарапкі ад разбітага гаршка на галовы маладых людзей – распаўсюджаная традыцыя на Лоеўшчыне. З гэтым абрадавым дзеяннем звязвалі магію дзетанараджэння: «чарапкі надзявалі на голаву маладым, штоб ражалі дзяцей» (в. Ястрабка), «каму чарапок надзенуць, у таго будзе дзіця скора» (в. Дзімамеркі), гаршчок «тады б'юць і чарапкі на галаву ложаць, каб дзеці вялісь» (в. Вулкан), «лажылі маладым на галаву чарапкі, каб дзеці былі» (в. Удалёўка) і інш. Як адзначыла Ксенія Іванаўна Карась, 1922 г. н. з в. Казярогі, «чэрап'янкі (ад гаршка) кідалі ў парог і гаварылі тры раза: «Чарап'янкі, біцесь, // А дзеці, вядзіцесь». Жыхары в. Мохаў пацвердзілі, што да сённяшняга часу бытуе ў народзе звычай запрашаць у якасці кумоў першых сустрэчных людзей, калі ў сям'і паміралі дзеці: «Там ім сказалі, каб яны па дарозе найшлі хросную, каб дзеці не ўміралі. Хросную – незнаёмую жанчыну, першую сустрэўшуюся». Бабка-павітуха, як ганаровая асоба, на хрэсьбінах звычайна ўшаноўвалася, бо ёй «надавалася асаблівая роля – роля пасрэдніцы паміж таямнічымі сіламі прыроды і чалавекам, пры гэтым неабходна дабавіць: таксама пасрэдніцы паміж Богам і чалавекам, што з'явілася вынікам уплыву на радзінныя абрады і хрэсьбінную паэзію хрысціянскай рэлігіі» [1, с. 35]. Невыпадкова так адказна адносілася яна да падрыхтоўкі кашы: «Калі каша цэлая – жыццё ў дзіцяці будзе доўгае і шчаслівае» (г. п. Лоеў).

Бацькі дзіцяці былі заклапочаны і тым, якімі вырастуць іх дзеці, ці будуць яны гаспадарлівымі, працалюбівымі. Устойліва захоўваецца на Лоеўшчыне традыцыя класці на парозе роднай хаты пэўныя прадметы падчас сустрэчы кумоў з нованароджаным, калі тыя ўжо ішлі або ехалі з царквы: «Если мальчика встречали, ложат на пороге молоток, пилу, гвозди, если хотят, чтоб хозяин был. Если девочку встречают, ложили вилки, чтоб хозяйкой была, иголку с ниткой, чтоб вышивала» (в. Дзяражычы).

Як бачым, мясцовыя радзінна-хрэсьбінныя абрады захоўваюць агульнаэтнічную аснову і вылучаюцца лакальна-адметнымі рытуаламі, цікавымі магічнымі дзеяннямі, прыкметамі і павер'ямі.

Надзвычай складаны і цікавы вясельны абрадавы комплекс Лоеўшчыны, які складаецца з давясельнай, уласна вясельнай і паслявясельнай частак, як і традыцыйнае беларускае вяселле. Асноўныя абрадавыя этапы лоеўскага вяселля – гэта сватанне, заручыны, «дзявішнік», каравай, вянчанне, вяселле ў хаце маладой, вяселле ў хаце маладога, паслявясельная цырымонія. Звернемся да характарыстыкі асноўных рытуалаў і вераванняў, звязаных з вясельнымі абрадамі, якія маюць у кожнай канкрэтнай мясцовасці сваю адметную спецыфіку, дасканала распрацаваную сістэму пэўных абрадавых дзеянняў, вялікую тэматычную разнастайнасць песенных матываў.

Увогуле «вяселле – комплекс абрадаў і звычаяў у спалучэнні са шматлікімі фальклорнымі элементамі (песні, музыка, танцы, гульні, прыгаворы і інш.), якія суправаджаюць урачыстасць заключэння шлюбу і з'яўляюцца няпісаным юрыдычным актам зацвярджэння новай сям'і. Жывучасць вясельнай абраднасці тлумачыцца

вялікай важнасцю сям'і, звязанай з асноўнай умовай існавання народа – яго ўзнаўленнем» [2, с. 126].

Сватанне – гэта адзін з важнейшых абрадаў перадвясельнага перыяду, мэтай якога было дасягнуць дамоўленасці аб шлюбе маладых. Важныя рытуальныя дзеянні гэтага абрадавага этапу давясельнай часткі – іншасказальны дыялог паміж сватамі і бацькамі маладой, сімвалічныя дзеянні маладой пры ўмове згоды або нязгоды на шлюб, перавязванне сватоў ручнікамі. Адметная асаблівасць сватання на Лоеўшчыне – бутэлька гарэлкі, перавязаная «чырвонай або розавай лентай з бантам», якую прыносілі сваты. Як сведчаць жыхары, такі звычай быў шырока распаўсюджаны ў іх мясцовасці (вв. Сінск, Бывалькі, Дзяражычы, Вулкан, Каўпень і інш.). На Лоеўшчыне, як сведчаць інфарматары, колькасць людзей, што ішлі ў сваты, звычайна абмяжоўвалася наступнымі асобамі: «бацька, маці, хросная маці, хросны бацька, яшчэ якія родныя» (Запісана ад Сідарэнка Ганны Дзмітрыеўны, 1936 г. н., в. Бывалькі). Аднак у іншых вёсках маглі ісці ў сваты толькі бацька, брат і хросны жаніха (в. Дзімамеркі), або бацькі, хросная маці і родны дзядзька (в. Вулкан), або жаніх, дзядзькі і жанатыя браты (в. Казярогі), бацькі, хросныя і сваты (в. Каўпень). Вар'іруецца ў мясцовай традыцыі і час сватання: хадзілі ў сваты «пасля пакопвання картошкі» (Запісана ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г. н., в. Дзімамеркі), позна вечарам, «часоў у дзвянаццаць» (Запісана ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н., в. Казярогі), пасля заходу сонца (в. Мохаў). Як адзначылі вяскоўцы, вяселля ў пост не спраўлялі (вв. Рэкорд, Крупейкі). Пасля «куплі-продажу» нявесты (звычайна ў алегарычных дыялогах – «цялушкі») дзяўчыну прасілі пацвердзіць сваю згоду на шлюб. Калі нявеста была згодна выйсці замуж, то выконвалі наступныя дзеянні: яна перараэала хлеб папалам (г. п. Лоеў, вв. Бывалькі, Вулкан), адорвала падарункамі сватоў (в. Дзяражычы), уласна вышытымі ручнікамі (в. Крупейкі), бацькі маладой запрашалі сватоў за стол (в. Каўпень), прымала хлеб ад хроснага бацькі жаніха (в. Пабядзіцель). Часам у знак згоды бацькі нявесты і сваты выпіваюць «па першай чарцы-заручыны» (Запісана ад Зязюлі Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., в. Карпаўка). Калі ж дзяўчына не хацела ісці замуж, то яна выходзіла ў апранутым навыварат кажусе (в. Малінаўка), выносіла сватам «гарбузу вараную» (вв. Мохаў, Дзімамеркі і інш.) альбо пачынала месці падлогу ў хаце, што таксама сведчыла пра тое, што яна адмовіла сватам.

Заручыны («запоіны» ў в. Бывалькі) як наступны абрадавы этап вяселля мог адбывацца адразу ж пасля сватання, у той жа дзень (в. Бывалькі, г. Лоеў) ці праз некалькі дзён (в. Карпаўка). Часам «заручынамі» называлі вечар перад вяселлем, калі збіралася гуляць моладзь: «заручыны – ета толькі маладзёж» (Запісана ад Карась Ксеніі Іванаўны) (вв. Вулкан, Казярогі). На заручынах «перавязваюць ручнікамі сватоў» (в. Каўпень). Асноўная ж мэта дадзенага этапа – канчаткова дамовіцца наконт тэрмінаў і вырашыць арганізацыйныя пытанні вяселля (в. Ліпнякі).

Галоўным атрыбутам нявесты быў вянок, які яна разам з сяброўкамі рабіла з кветак і стужак (в. Бывалькі, Казярогі і інш.). Сяброўкі таксама дапамагалі нявесце і ў дзень вянчання: апраналі, заплятапі касу, прычым апошняе рабілі, пасадзіўшы дзяўчыну на вывернуты кажух або падушку (в. Малінаўка). Каб не сурочылі маладых, нявесце «затыкалі ў плацце іголку», «хросная маці маладой тройчы аббягала вакол машыны» (в. Казярогі).

Распаўсюджаным на Лоеўшчыне з'яўляецца і абрад вянчання, які праходзіў у царкве (в. Карпаўка і інш.). Ён таксама меў свае адметнасці. Нельга было пераходзіць дарогу маладым, калі тыя ехалі ў царкву, нельга было спяваць па дарозе да вянца (в. Каўпень). У царкве маладыя станавіліся на ручнік – «падножнік»

(в. Карпаўка) і падчас абыходжання вакол іконы павінны былі «цягнуць» яго за сабой (вв. Карпаўка, Крупейкі). Рабілася гэта дзеля таго, каб сяброўкі маладой таксама выйшлі замуж.

Асцерагаліся, каб падчас вянчання не патухлі свечкі ў руках маладых: «калі агонь патушыцца, то той, у каго патухла, доўга жыць не будзе і скора памрэ» (в. Мохаў).

Пасля вянчання, калі бацькі маладога сустракалі маладых, то нявеста, ступіўшы на парог, на некалькі хвілін спынялася і прамаўляла ўціхую ад усіх: «Ваша хата, ваша печ, маё слова, мая рэч». Гэта можна растлумачыць імкненнем маладой заручыцца падтрымкай духаў продкаў. «Парог – найбольш рытуалізаваны сімвал мяжы паміж хатай як максімальна засвоенай, «акультуранай» чалавекам частка прасторы, і навакольным, патэнцыяльна варожым светам (іншасветам), светам памерлых» [3, с. 366].

Пасля вянчання маладых сустракаюць бацькі з хлебам-соллю і іконай (в. Карпаўка). Рытуал абсыпання жытам жаніха і нявесты выконвалі, каб яны жылі багата, калі ж іх благаслаўлялі бацькі, то ім трэба было выпіць прапанаваную гарэлку, а чаркі разбіць: «Калі чарка не разаб'ецца, то дрэнна будуць жыць» (в. Ліпнякі). Лічылі, што чарку трэба разбіваць праз плячо, а не пад ногі, бо «гэта значыць – шчасце пад ногі» (в. Ліпнякі).

У некаторых вёсках (в. Бывалькі) бытаваў звычай карміць маладых мёдам, каб такім жа салодкім было іх жыццё.

Напярэдадні вяселля выпякалі два караваі (з боку жаніха і з боку нявесты), якія аздаблялі разнастайнымі ўпрыгожваннямі. Пеклі каравай толькі замужнія жанчыны, добрыя гаспадыні (в. Дзімамеркі і інш). Каравай выпякалі круглым, каб «дарога жыццёвая ў маладых была чыстая, шырокая» (п. Пабядзіцель). Каравай, як сведчаць інфарматары, мог мець такія памеры, што даводзілася нават разбіраць печ (в. Мохаў). Дзяліў каравай або сват (вв. Дзімамеркі, Крупейкі), або хросныя бацькі (вв. Бывалькі, Вулкан). Верх каравая адразаюць і даюць маладым, а тыя яго «даюць у платочак дружкам, штоб скора замуж ішлі» (в. Казярогі). У в. Крупейкі «вярхушку» каравая аддавалі малым дзецям, а маладым забаранялі есці («Можа хто на каравай жадае шчасця, а другія – не, дык вот не бяры свайго каравая»). Не дзялілі каравай толькі «ўдаўцы» (в. Бывалькі). Маладым аддавалі верх каравая, яго сярэднюю частку, каб такім жа «мяккім» было іх сумеснае жыццё (вв. Казярогі, Ліпнякі і інш.). У в. Бывалькі перад тым, як пачаць дзяльбу каравая, галоўны сват, як сведчаць інфарматары, браў качаргу ці нейкі іншы прадмет і пачынаў стукаць ім па сцяне, запрашаючы гасцей «на ўспамаганне», г. зн., што госці павінны былі адорваць маладых.

Падчас вяселля з маладой здымалі вянок, расплятралі касу і завязвалі хустку, што сімвалізавала пераход ў новае для яе становішча – замужняй жанчыны. Касу дзяўчыне мог расплятаць старэйшы брат ці малады хлопец, якому сваты давалі выкуп за стужкі (в. Крупейкі). Аднак у мясцовых апісаннях вяселля сустракаецца варыянт, калі касу расплятала маленькая дзяўчынка 5–6 гадоў (г. Лоеў). У в. Карпаўка стужкі вешалі на вокны, а ў в. Бывалькі іх кідалі гасцям: калі яны траплялі ў рукі сяброўкі нявесты, то, лічылі, шлюб будзе ўдалы, а калі – у рукі сябра жаніха, то «мужык будзе біцца» (Запісана ад Сідарэнка Ганны Дзмітрыеўны).

Існаваў на Лоеўшчыне і звычай садзіць маладых на кажух, каб жылі яны багата. Каб маладыя заўсёды былі разам, ім на галовы клалі века з дзяжы (вв. Крупейкі, Бывалькі, Мохаў і інш.).

Вечарам маладыя накіроўваліся да бацькоў жаніха. Дзяўчына везла з сабой пасаг, які размяшчалі ў хаце жаніха. Туды ж маглі прыйсці і аднавяскоўцы, каб паглядзець, ці багатая нявеста (в. Бывалькі). Уваходзячы ў дом свякрухі, нявеста «становіцца на парог і спрыгвае з яго, каб яе любілі ў этым доме» (в. Дзімамеркі). Хто першы з маладых пераступіць цераз парог, той будзе гаспадаром у доме (в. Дзімамеркі). Хто больш адкусіць хлеба, якім сустракаюць маладых іх бацькі, той таксама будзе верхаводзіць у сям'і (в. Дзімамеркі). Каб не было сварак, маладыя пераступалі разам праз «асколкі разбітай нявестай тарэлкі» (в. Дзімамеркі). На другі дзень вяселле працягвалася ў хаце маладога.

Паслявясельная частка вядома на Лоеўшчыне пад рознымі назвамі: «Куры» («па ўсёй дзярэўні ў тых людзей, што булі на свадзьбе, збіраюць курэй і гуляюць» (в. Дзімамеркі); «Папялішча» (курэй, бутэлькі гарэлкі і інш., што збіраюць па дварах удзельнікаў вяселля, «зносяць у адзін двор к маладой ці к маладому. Папялішча дзелаюць такое» (в. Вулкан); «Збіраць курэй» («У канцы вечара на жываце бацькі маладога білі гаршчок з попелам», што абазначала канец вяселля (в. Ліпнякі); «Галоўні» («збіраюць курэй у тых людзей, хто ўчастваваў у вяселлі» (в. Каўпень); «Пярэзвы» («чэраз адну нядзелю едуць к маладой, каб паглядзець, як жыве яна. Первы дзень гуляюць у маладой, другі – у маладога, ну, а трэці – гэта апахмелка» (г. п. Лоеў); «Разгрэбіны» («кажды, хто гуляець, дае курыцу ці петуха. На палку павесяць і ідуць ужэ. Гулялі, пераадзяваліся ў цыганей» (в. Вулкан, п. Кірава).

Фальклорна-этнаграфічныя звесткі па вясельнай абраднасці Лоеўшчыны дазваляюць сцвярджаць, што мясцовыя варыянты вяселля вылучаюцца разнастайнасцю дзеянняў, рытуалаў, багаццем музычна-песеннага суправаджэння. Гэты факт яшчэ раз падкрэслівае значнасць лакальнага вывучэння фальклорнай спадчыны Лоеўскага раёна.

ЛІТАРАТУРА:

1. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, А. С. Емяльянаў, У. М. Сысоў, М. А. Каладзінскі; Навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 422 с.

2. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.: іл.

3. Беларуская міфалогія. Энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.

РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННЫЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ

Хрэсьбіны

У дзярэўню прыглашалі бацюшку. Бацька і матка не прысутнічалі на хрышчэнні, толькі хосныя бацька з маткай.

Баба варыла пшонную кашу. Калі ўсе сядуць за стол, дык кідалі грошы на кашу. Кум должэн быў кінуць большэ. Білі гаршок з кашай і ўсім дзялілі. Кума падарак давала бабе на плацце і дзіцяці падаруначак.

Як прыязджалі ад Хрыста, то пілі і гулялі, а назаўтра прыходзілі пахмяляцца, маглі і на трэці дзень прыці.

Была такая гульня. Бабу вазілі па вуліцы на баране. Везлі і рагаталі. А пасля бабка вяла тых, хто цёг, да сябе ў хату і там угашчала іх. Усё яна павінна была прыгатовіць раней.

Яшчэ маглі ўзяць палку ў хаце, дзе былі хрысціны, і чырыць столь.

Для таго каб дзіця было разумным, нельга было стрыгціся маці, пакуль яна носіць дзіця. Таксама нельга было пазычаць нічога, бо тады дзіцё будзе жыць у беднасці. Нельга было браць за куму незамужнюю, бо тады яна не выйдзе замуж.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г. н.
(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на)

Хрэсьбіны заўсёды гулялі. Пелі, кашу варылі. На кашу грошы збіралі. Хто больш грошай дасць, той і кашу б'е, ета значыць разбівае гаршчок. А кашу нада такую варыць, штоб гаршчок разбіваўся, а каша стаяла. І малой будзе крэпкім тады.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Обычно на роженицу и ребёнка одевали рубашку наизнанку или на внутреннюю сторону рубашки прикалывали булавку: так защищали от злых духов.

На хрэсьбины звали кумов. Присутствовала бабка-повитуха. Бабка готовила кашу пшённую или рисовую с молоком, много яиц, сахара и масла. Крёстные дарили подарки креснику, а мать ребёнка дарила подарки кумовьям. Потом

садились за стол. Крёстный должен был выкупить кашу, а если он не мог выкупить, то бабка-повитуха разбивала горшок и делила кашу, а если кто мог выкупить – выкупал и сам делил. За это он получал подарок.

Запісана ў г. Гомель ад Юрасік Валянціны Савельеўны, 1946 г. н. (раней пражывала ў в. Рудня-Каменева (раней Папоўская Рудня) Лоеўскага р-на), 2002 г.

Нада ўжо, шоб ребёнак запісаны быў у метрыкі. Выбіралі хроснага і хросную. І едзеш у царкву к бацюшку, гаворыш, што трэба дзіцёнка пахрасціць. Но мне ўжо нельзя ідці ў цэркаў после родаў. Як жа ж эта я без дзіцёнка свайго пайду, я ж хочу сама ўнесці яго. А мне бацюшка гаворыць, што заходзіць у цэркаў можна, но нельзя пад іконай пралазіць. Гэта як бы прычашчаліся. Хросная і хросны падлязалі пад іконай. Кум купляе крэсцік. Ну, а патом едзем дамой. А бацюшка палівае вадой дзіцятка, малюе яму крэсцікі на лабу, руках, нагах. Іх нельзя сціраць. Патом уносім яго ў цэркаў. Як хлопчык, дык бацюшка ўносіць яго ў комнату сваю і нікога не пускае туды, а дзевачка калі, дык абходзяць тры раза.

Кашу варылі, патом дзялілі. Трэба чужую бабу выбіраць. Патом сарэўнуюцца кум, кума і баба, выкуплёўваюць гэту кашу. Ложаць грошы: сначала, напрымер, пяць тысяч, другі раз – ужо большэ і так да таго, хто ўжо паследні. Паследні бярэ гаршок з кашай і разбівае яе. І ўсе ядуць гэтую кашу. Патом садзілі бабку ў цялегу і вязлі па ўсёй дзярэўні.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на ад Гаўрык Зінаіды Сцяпанаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Як толькі дзіця народзіцца, дак абязацельна бабу звалі. Баба перабабіць, на 2 пальцы прыложыць, пупок завяжа ніткай сыравой (льняной). І на ўсё врэмя бабай завецца.

Ужэ ж акрэпне рэбёнак, то крэсьбіны назначаюць. Раньшэ тайком красцілі. Назначаюць крэсьбіны чэраз 10 дней пасля радзін ці ў той жа дзень. Сабіраюць усіх радных, выбіраюць кума і куму, звалі бабу.

Гатуюць стол і ўсялякія блюды. Кашу вараць абязацельна пшонную. Кашу варыла абязацельна баба, а разбівае гаршчок кум . Усех гэтай кашай угашчаюць, а хто болей грошай дасць за кашу – таго і каша. Вось кагда дасць 10 рублёў кума, тагда каша будзет яе. Але абязацельна нада было, штоб каша аставалася бабе. Яна ж яе варыла, значыць, ніхто не даўжон перашчэгаляць. Такая завядзёнка вялася. А хто не меў грошай, падарак лажылі: хто пялёнку паложа, хто рубашку – у каго што было.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на ад Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2002 г.

ПЕСНЯ НА ХРЭСЬБІНЫ

Ну, кукуй, зязюлечка, рана,
Не кажы, што ночачка мала.
Аленка тую ночку не спала,

Яна к сабе госцікаў звала,
Любых госцікаў ды бабулю.
Столікі абрусам засцілала,
Талеркі сухароў накладала
Ды гасцей і бабку частавала.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Бяруць кумаўё, хто каму нравіцца. Бацькі не ездзілі ў царкву.

Рабілі кашу бабіну. За бабу бяруць, хто панаравіцца. Баба прыносіць падарачкі, гасцінцы, яна гатовіла кашу.

Каша была сладкая, штоб калі гаршок разбівалі, трэба, каб яна не рассыпалась. Хто болей на кашу паложыць, той кашу разбівае, часцей кума. Чарапкі надзявалі на голаву маладым, штоб ражалі дзяцей.

Прыводзілі бабу дадому, штоб угасціла дома. Садзілі на барану і каталі, штоб магарыч давала. Падаркі давалі. Кашу кралі пад сталом. Калі кашу ўкрадуць, баба павінна яе выкупіць.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.



Был такой обряд. Родители встречают, когда с церкви идут. Если мальчика встречают, ложат на пороге молоток, пилу, гвозди, если хотят, чтоб хозяин был. Если девочку встречают, ложили вилки, чтоб хозяйкой была, иголку с ниткой, чтоб вышивала. В общем, кем хочешь, чтоб твой ребёнок стал, то и ложи. Чтоб красивая была, можешь розу положить.

В церковь ходили только кум и кума, родители не ходили, а дома уже родители встречают.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Кудраўцавай Наталлі Данілаўны, 1972 г. н.

Перад хрысцінамі хросная бярэ пялёнкі, рубашачкі. Адзяюць дзіця ў рубашкі, пялёнкі аддаюць хроснай і вязуць у цэркву. Еслі дзевачка, поп у алтар не нясе, а калі мальчык, заносіць у алтар. Пахрысцяць дзіця, прыязджаюць да хазяеваў. Садзяцца за стол.

Баба варыць кашу. Спярва даюць хроснай і хроснаму. Хроснай і хроснаму даюць і падаркі.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пятровай Марыі Раманаўны, 1932 г. н.

Хрэсьбіны мы спраўлялі весела. За стол сабіраліс госці і паздраўлялі маці з навароджаным. Потым дарылі ім падаркі, а таксама дарылі бабе, якая варыла

кашу. Гучалі пажаданні маці навароджанага, навароджанаму, куме, куму. Потым выносілі кашу, і кожны стараўся яе перакупіць, але рабілі так, каб выкупіў яе кум. Кум біў гаршчок з кашай, і госці яе елі. Але, акрамя кашы, на стале даўжна стаяць юшка і хмыз, каб навароджаны быў багатым і не хварэў.

Выйшла хмарка, выйшла цёмна,
А за ёю сіва.
Ці хто есь такі на свеце,
Як я, нешчасліва:
– Ці ты мяне, мая мамко,
У купелі не купала,
Ці ты бо мне, мая мамко,
Шчасця не прошала?
– Ей Богу, мая доня,
Ей Богу, купала,
Толькі твая горка доля
У купель заглядала.
– Ці ты мяне, мая мамко,
У цэркву не насіла,
Ці ты бо мне, мая мамко,
Шчасця не прасіла?
– Ох, насіла, мая доня,
Ей Богу, насіла.
Толькі твая горка доля
Следочкам хадзіла.

Запісана ў в. Каплічы Калінкавіцкага р-на ад Кулага Таццяны Пятроўны, 1942 г. н. (раней пражывала ў в. Гарадок Лоеўскага р-на), 1999 г.

Ну, перш ражаецца рабёначак. Находзяць бабку абязацельна, павітуху. І вот, тая бабка бярэ ўжо багаты гасцінец: адзеялы, платочкі, канфеткі, пячэнейка. Усё гэта павінна баба гэтая прынесці. Ну, а потым ужо прыходзяць, танцы заводзяць. Кум і кума, і ўся ўжо маладзёж, якую прыглашаюць, вядуць танцы да пабеды.

Калі рабёначак раждаецца, сюды вязуць, у Лоеў. Пакуль яна ражае, усе сядзяць. Каб дзеўка харашо радзіла, баба падавала ў царкву запісачкі, а ён, свяшчэннік, ужо гаварыў, у які дзень прыехаць перахрасціць. Потым ідуць да кумы і да кума, і там ужо танцы галавамі ходзяць.

Калі дзеўка ражае ў хаце, развязваюць усе ўзлы. Бабка прыносе ўсё сваё: бутылкі, міскі, тарэлкі, стаканы. Калі ўжо ўсё, радзіла, усе яны ўходзяць, штоб ужо ні звука не было, штоб дзіця спакойна ляжала.

Баба-павітуха варыла сваю кашу, брала здаравенны гаршчок такі, прыносіць кашу. А патом садзяцца за стол, вып'юць і б'юць тую кашу на стале, а тады хто куда расхватае і ядзяць. Благадараць Бога і ўжо хазяіна. Разбівае гаршчок баба, стукае бокам, не цэліком, а так, бачком, гэта ж гліна, чуць-чуць – і яна распалася. Хранілі кусочкі ад гаршка абязацельна, каб багата была ўнучак і ўнучок.

Кашу выкупал кум. Такжа бярэ той гаршчок, які ляжыць разбіты, ніхто яго не трогае, а прыходзіць кум і па сталу крэпка кулаком – і на кусочкі. Тады хто што бярэ: хто кашу, хто кусочкі – такія шкрабячкі ад гаршка. Каша пшонная, падкідваюць яе, і пачынаецца п'янка-гулянка.

Па дароге ў царкву песні не паюць. Бабе-павітухе дараць матэрыял, пялёнкі, бутылачкі.

Калі жэншчына была яшчэ цяжарная, ёй нельзя была сматрэць на агонь ці пугацца агня і хватацца за цела, бо пятна аставаліся.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі нараджалася дзіця, то каб яго ніхто не сурочыў, надявалі наізнанку распашонку ілі шапку, а яшчэ булаўку ў верхнюю адзежду прышчаплялі. А калі дзіцёнка сурочылі і ён не спіць, капрызнічае, нада ўцерці яго левай стараной сваёй ісподней рубашкі. Каб у дзіцёнка ўсё было добра, не нада астаўляць на нач яго вешчы на вяроўцы ў дварэ. После захода сонца не нада паднімаць дзіця вышай галавы, бо будзе неспакойна спаць.

На хрэсьбіны зараней выбіралі кума і куму, каго хацелі. І цяпер так робяць. У аснаўном бралі са свайго круга, родных. Бралі палаценца і неслі да кумоў. Калі сагласны былі быць кумам ці кумой, то яны бралі хлеб, а калі не – аддавалі назад хлеб. Выбіралі бабу. Патом выбіралі дзень, абычна еты дзень быў васкрасенне, бо ў гэты дзень нельга было рабіць. Кум і кума везлі дзіця ў цэркаў, там бацюшка вёў абрад крашчэння. За абрад плаціў кум, бацюшка вёў у аддзельную комнату і там чытаў малітву спецыяльную. Патом едуць дадому і гатовяцца. Садзяцца за стол, выпіваюць, гуляюць, танцуюць, спяваюць песні. Но я не знаю, якія спявалі, забылася.

Радзіцелі дзіцяці дараць падаркі куму і куме, бабе, а яны, наадварот, – дзіцяці. За сталом п'юць гарэлку і гавораць усё добрае для дзіцяці.

Патом дзеляць кашу, яе гатовіць баба. Сначала могуць унесці замест кашы ката, патом петуха, а на трэці раз кашу. Кажды раз спрашваюць: «Баба, твая каша?» Баба яе угадвае, дзержыць, а кум доўжан заплаціць. Калі панаравіцца плата, баба аддае кашу, а калі не – кум плоціць грошы. Баба аддае кашу, і кум разбівае гаршок аб угал ці край стала, чарапкі адзяюць перваму папаўшаму. Каму чарапок надзенуць, у таго будзе дзіця скора. Патом ложаць на кашу падаркі, бо іх кашу есці не даюць. Патом везлі бабу на карыце дадому. Як добра яна заплоціць, дак добра правязуць, патом яна ставіць магарыч.

Калі дзіця нараджалася, то першы раз даўжна памыць яго бабка, а не радзіцелі. Дзіця мылі ў пялёначках, каб яно не іспугалася. Патом нада абязацельна даць бабе выцерці палаценцам новым рукі і даць у падарак.

Раней, каб дзеці не былі труслівыя, ім пры раджэнні давалі ў рукі шпагу.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г. н., 2002 г.

Бабу бяруць. Яна пуп адразае. Эта баба, када ўжэ хрэсьбіны, варыць кашу. Абычна кашу вараць у гаршках гліняных з пшана. Кум купляе эту кашу. Ложаць грошы. Хто больш паложыць грошай, таго ўжо каша. Абычна паддзержываюць кума. А тады б'юць і чарапкі на галаву ложаць, каб дзеці вялісь. Бабе, куме, куму дараць падаркі, но дзеньгі ні даюць.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Як дзіцёнак радзіцца, так бралі таго маленькага, везлі ў цэркву. У цэркву ехалі толькі хросны і хросная, і дажа матка не ехала. У хосныя бралі, каго зажалаюць. У цэркву як едуць, трэба хросны штоб хрэшчык купіў. А хросная бярэ метру-дзве палатна. А еслі шыць умее, дак ужэ бяруць адзежынку якую, рубашачку, шапачку, шчэ ж маленькае.

Прыглашалі бабу. У бабы бралі тожа, хто панаравіцца, шчэ ж выбіралі багацейшых. Баба кашу вара з пшана, боршч, пака тыя ў цэркві.

Як прыехалі ад Хрыста, ужэ сабіраецца радня, ядзяць, выпіваюць, а патом ужэ баба ставіць кашу, і колькі хто дасць. Хто болей. Кум – эта ўжэ аўтарыцет. Ён даўжон кінуць болей грошай. Вот калі дагодзяць яму (дык і кума памагае, куму грошы дае, перадае пад сталом), ён патом разбівае кашу. Разбівае той, хто купіў. Чэрап'янкі кідалі ў парог:

Чэрап'янкі, біцесь,
А дзеці, вядзіцесь.

Так гаварылі тры раза. Патом ужэ паядзяць кашу, на кашу – па сто грам, і хрысціны кончылісь. А тады ўжэ выходзяць, бабу садзяць на саначкі на малыя (і летам) і цягнуць да яе дому. А баба ўжэ дзелае абед, тожа ўжэ садзяцца, выпіваюць. А то садзілі бабу і на барану. На барану пасадзяць на красцы, ну і мужчыны цягнулі, яны крапчэйшыя. І к бабе як прыцяглі, баба ставіць ім магарыч. Там ужэ збіраюцца і падаркі куму, куме, бабе дараць.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н., 2001 г.

Збіраюцца кумаўё. Вязуць дзіця ў цэркву крысціць. Бацюшка галоўку дзіцяці мочыць, потым купае яго, выразае коскі на галаве крастом. Баба прыносіць кашу. Гэту кашу выкупляюць. Хто больш грошай за яе дасць, таму яна і дастанецца. Стараецца выкупіць кашу кум. Кашу могуць украсці, дак кум і баба пільна глядзяць за ёй.

Хто выкупіў кашу, той разбівае яе, і пачынаюць есці. Радзіцелі дзіцяці дараць падаркі бабе, куму. Яны таксама дараць падаркі крэсніку.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюля Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., 1993 г.

Баба, што прыходзіць, яна ўжо варыць кашу і прыносіць. Вараць абыкнавенную кашу. Хрэсьбіны гуляюць, прыносяць патом кашу і б'юць. Ну, разбіваюць, яна ўжо рассыпалась. Б'е той, хто купіць, эта хто пасілее выкупіць. Нада перш куму выкупіць. А як кум не пасілее, то хто выбіў, той і разбівае. А тады ўжо бяруць кашу, грошы кладуць. Кашу разбівалі таго, што ты купіў. А тады ўжэ эту кашу рэжуць і кладуць на тарэлку – бярыце.

Ваабшчэ-та, кашу дзелалі з пшана. А падаркі дак дарылі, што ў каго было, усякае, карочэ, клалі. Хто багаты быў, той дажа бабу вазіў на канях, нада, шоб ужэ былі і кум, і кума.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі родзіцца дзіцятка, бацькі ідуць, прыглашаюць бабку. Заходзяць да яе з хлебам-соллю. Бабка вядзе рожаніцу ў баню і мые яе і дзіця. На следующчы дзень гуляюць ужо хрысціны. Бабка далжна на хрысціны зварыць кашу з пшана. На хрысцінах хросны должан выкупіць кашу. Калі ён кашу выкупіць, гаршчок разбівалі. Бабка зразае верх з кашы, кладзе на тарэлку, кладзе туды грошы, канхветы, падарак і гаворыць: «Бабіна каша з канапелькамі, а вы, людзі, з капейкамі». І тады ўжо ўсе кладуць грошы, падаркі. Потым бабу прыбіраюць абы-як і вязуць яе дадому на калясцы. Дома яна ўгашчае тых, хто яе прывёз.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Драмач Ірыны Яфрэмаўны, 1932 г. н., 2004 г.

На хрысціны варылі кашу, разбівалі гаршок, адразалі верх і аддавалі маці, лажылі грошы, дзялілася каша. Выбіралі бабу, каб бабіла.

У адной сям'і не было дзяцей доўгі час. А калі нарадзіўся першы, то праз пару дзён ён памёр. Затым памёр і другі. Яны не ведалі, што ім рабіць. Плакалі, гаравалі. Нарадзілася трэцяе малое, панеслі яго хрысціць. Там ім сказалі, каб яны па дарозе найшлі хросную, каб дзеці не ўміралі. Хросную – незнаёмую жанчыну, першую сустрэўшуюся. І панеслі дзіця хрысціць у царкву. Неслі яго, а ён плакаў дужа моцна. Тады дзяк сказаў, каб яго хросная на рукі ўзяла, а як узяла, так ён і замоўк. У тазе нейкім вада была наліта, але яна (хросная) яго ў гэтую ваду не апускала, а дзяржала над ёй (вадой). Дзяк крэст узяў, намачыў у ваду, а тая вада святая, да перахрысціў тры разы малога. Гавораць, цяпер у гэтай сям'і вялікі род выдаўся. А хросную і па гэты час цяпер ужо маладыя з гэтага роду на дарозе шукаюць.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

Варылі кашу. Каша была пшонная, харошая каша, не якая ж зря, а багата клалі яец у яе.

Кум разбіваў гаршчок. Разаб'е гаршчочак – той пасыпаўся, а кашка стаіць. Кум жа плаціў грошы. А тады ж баба кашу рэжэ трошку і каждаму падае, і тады за кашу кожан бабе плоціць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Бандарэнка Ніна Рыгораўна (1927 г. н.) з в. Ястрабка ўспамінае, як раней святкавалі Каляды, Вялікдзень, Купалле

Марыя Паўлаўна Казмярчук (1928 г. н.) і Ганна Якаўлеўна Шамела (1914 г. н.) з в. Рудня-Бурыцкая шчыра вераць у прыкметы і павер'і

Акуліна Парфёнаўна Старажова (1934 г. н.) з в. Рудня-Бурыцкая распавядае, як вадзілі казу і варажылі на суджанага

Тамара Сяргееўна Шапавал (1941 г. н.) з в. Старая Лутава ўжо шмат гадоў з'яўляецца мастацкім кіраўніком народнага фальклорнага гурта «Лутава»

Цікавыя звесткі пра абрады і звычаі в. Ястрабка паведаміла Ганна Рыгораўна Коўзік (1928 г. н.)

Шчодра дзеліцца ўспамінамі пра народныя святы Дзмітрый Паўлавіч Бартнеўскі (1930 г.н.) з в. Страдубка

Мудрыя народныя традыцыі – гэта заўсёды добры настрой.
Анастасія Сяргееўна Паўлюшчанка (1925 г. н.),
Марыя Аўрамаўна Бецікава (1941 г. н.), г. п. Лоеў

З народнай філасофіяй сямейнага жыцця знаёмяць студэнтаў жыхаркі
в. Пабядзіцель Ніна Сямёнаўна Гаўрыленка (1928 г. н.)
і Вера Васільеўна Кулага (1939 г. н.)

Свой мясцовы каларыт маюць абрады і звычаі ў в. Дзімамеркі.
Праскоўя Лявонцьеўна Фурс (1925 г. н.), Любоў Кузьмінічна Уласенка (1918 г. н.),
Ганна Лявонцьеўна Пінчук (1920 г. н.)

З добрымі народнымі традыцыямі і вясёлай песняй крочаць па жыцці
Марыя Міхайлаўна (1936 г. н.) і Якаў Сямёнавіч Грышкаўцы (1937 г. н.)
з в. Рэкорд



Лізавета Антонаўна Грышчанка (1933 г. н.), жыхарка г. п. Лоеў – аматар беларускай народнай песні

На надзейным вясковым транспарце з'язджаюцца на рэпетыцыю ўдзельніцы фальклорнага гурта «Лутава»

Гасцінна сустрэла ўдзельнікаў фальклорнай экспедыцыі жыхарка в. Пярэдзелка Марыя Адамаўна Травянок (1928 г. н.)

Парадавалі цікавымі ўспамінамі пра абрады і звычаі в. Дзімамеркі Яўгенія Іванаўна Ігнаценка (1925 г. н.) і Валянціна Ларывонаўна Ігнаценка (1928 г. н.)

Абрад праводзін русалкі ў в. Дзімамеркі

Святкаванне Масленіцы ў г. п. Лоеў



«Купалінка, купалінка, цёмная ночка…»

Адзін з фрагментаў вясельнага абраду ў в. Сяўкі.
«Да благаславі, Божа, благаславі, Божа…»

Уладзімір Рыгоравіч Бабраўнічы –
дырэктар Уборкаўскага СДК



Васіль Васільевіч Вінічак –
таленавіты мастак

Валянціна Мікалаеўна Бярнацкая –
майстар-метадыст па лоза- і саломапляценню

Народны ансамбль «Жывіца» Дома культуры Лоеўскага раёна

Фальклорны гурт «Лутава»

Інструментальны ансамбль выкладчыкаў дзіцячай музычнай школы г. п. Лоў

Народны хор «Світанак» Лоеўскага раённага Дома культуры

Народны ансамбль народнай песні «Пралеска»

Праскоўя Пятроўна Хлебіна –
старэйшая ўдзельніца калектыву
мастацкай самадзейнасці Сяўкоўскага СДК

Мікалай Цімашэнка,
Уборкаўскі СДК

«Не старэюць душой ветэраны...»

Ім, дзецям лоеўскай зямлі, лёсам наканавана зберагаць і захоўваць невычэрпныя скарбы роднай старонкі!



Калі выбіралі дзіцяці імя, то пелі песню:

У полі гаёк расшугаўся,
Іванька з жонкай разругаўся:
– Ой, жана мая дарагая,
Дзе ўсю красу сваю дзела?
Ці з малайцамі прагуляла,
Ці з дзевачкамі прапяяла.
– Ой, муж ты мой, муж маладзенькі,
Які ж ты ў мяне яшчэ дурненькі.
Калі сам не знаеш, не ведаеш,
То ў добрых людзей папытайся:
Як табе сыночка я радзіла –
Усю сваю красу я загубіла.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Вось цяжарнай жэншчыне нельга было глядзець на мерцвякоў, нада засцерагацца ад зглазу, ліхіх вачэй, нельга наступаць на нешта крывое, бо дзіця магло быць гарбатым.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., 2005 г.

Работаць па празнікам нельзя бярэменным. Праклінаць цяжарнай нікога нельзя.

Баба, што купала ў первы раз, кашу варыла. Баба-прыродуха – старая баба, баба-павітуха. Яна прыходзіла ў ответкі 3 разы, прыносіла падаркі. Жалалі дабра і дзіцёнку, і маці.

У цэркву хадзілі кум і кума. На хрэсьбіны бабе, куме і куму падаркі давалі. Сядзем на куце, кум разбіваў гаршок аб край стала. Лажылі маладым на галаву чарапкі, каб дзеці былі. Каталі ў калясцы ці ў балеі якой, гаварылі: «Давай, баба, магарыч за то, што вазілі!»

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Паехалі, перакрысцілі, падаркаў налажылі, кашу падзялілі. Кашу на ўсе сталы разносілі і глядзелі, хто болей паложыць. А кум стараецца заўсёды больш палажыць, каб у яго была каша.

Вось я была хроснаю, тожэ старалася, сваю кашу выкуплёўвала, бабіну кашу кум выкуплёўваў. Называлася то бабіна каша, то кумава каша. Вот так і называлася. А раней мо на 10 сталоў збіралі і гулялі. Во раней гулялі! Я сама так гуляла. У мяне былі хрэсьбіны – дзве хаты былі забіты, да яшчэ і трэцяя поўненькая.

Кумаўю дарылі падаркі. Я, напрыклад, лажыла куме, куму і бабкі. А еслі я шла хрысціць, то мне давалі падаркі.

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.



Утрам прыязжае кум з кумою, маці аддае дзіця і гаворыць: «Даю табе нехрышчонае, а ты мне прывязі хрышчонае».

Кум з кумою едуць у цэркву, а маці, бацька, усе родныя застаюцца дома. У царкве дзіця хрэсцяць. Потым яны едуць дадому. Маці з бацькам сустракаюць і, калі дзіця – дзеўка, то кума, а калі хлопец, то кум, гаворыць: «Брала ў цябе дзіця нехрышчонае, даю хрышчонае».

Усе садзяцца за стол, жадаюць дзіцяці здароўя, шчасця. Галоўная ў застоллі баба, якая варыць кашу і ў канцэ застолля прыносіць яе. Кожны з гасцей кладзе грошы «на кашу», а патом кум купляе яе і разбівае гаршок. Калі каша цэлая – жыццё ў дзіцяці будзе доўгае і шчаслівае. Усе ядзяць кашу, і застолле працягваецца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.

Калі дзеўка ждала дзіця, то было багата прымет: нельзя было, каб свет ад луны падаў на яе, бо дзіця па начах хадзіць будзе; пераступаць праз вяроўку, бо памрэ; калыхаць пустую люльку, бо тожэ памрэ. І гэтых прымет багата.

А как народзіцца дзіця, то трэба было хрысціць. У кумаўя трэба было званць чужога чалавека, але ішлі родныя. У цэркаў ехалі толькі радзіцелі і кумаўя. Пасля прыязджаюць дахаты і садзяцца на кут, ядуць і выпіваюць. Патом робіцца напад на бабку з кашай. На гэтую кашу клалі грошы, каб выкупіць. Больш за ўсіх клалі грошы кумаўя. Так, хто большэ ўсіх пакладзе, той і б'е гаршчочак. Грошы аддавалі радзіцелям для дзіцяці. А яшчэ так шуцілі: клалі ў гаршчок не кашу, а ката. І, бывала, што выкупалі ката, а патом зноў выкупалі кашу. Во так было ў нас.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

На крэсціны варылі кашу. Бабушка далжна варыць. Кашу варылі з пшана і немножка рыса. Як каравай дзеляць, так і эту кашу дзеляць. Разбіваюць гаршчок, і кум должэн выкупіць эту кашу. Сначала прадстаўляем кашу, таргуемся, сколькі та каша стоіць. Дзед кажа: «Через мора Вітацкае, через акіян Любімы, через дзве ракі Днепр і Сож дабіралась наша з бабушкай каша. Прашла пуць нялёгкі, бальшой». Бабушка выставіла кашу на аўкцыон. Пачалі таргавацца. Бабушка ўстанавіла сваю цэну. І тада началі таргавацца. У дзеда быў малаток. Па правілу должэн выкупіць кум. Кум тады выкупіў тую кашу, разбілі гаршок. На кусочкі падзялілі, парэзалі, каждаму ўжо падносяць, і яны ўжэ благадараць крэсніцы, этай дзевачкі. І на эту кашу ложаць дзеньгі, падаркі. Пасля этага гульня, танцы, песні. Было такое, што радзі шуткі садзілі ў гаршчок кошку. Бабушку нада была

вазіць. Калісь вазілі на санях, еслі зімой, летам – на калёсах. Летам вязуць яе «ўтапіць». А бабушка ўзяла венік з сабой, к вадзе падвазілі, яна венік ужэ мачае і па ўсім махае, адбіваецца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

Раней было так: бабку звалі. Баба прымала роды. Баба й купае, баба й пялёнкі дае палатняныя. Маладыя ўжэ панімалі, што эта бабушка іхняя. І дзеці яе завуць ужэ: «Бабушка наша». Бабке маладыя давалі падаркі, даравалі мацерыі кусок якой. Пекла ў гаршку кашу. А тады насілі па парадку, хто ката пасадзіць да прынясе, хто цыпляня. Ну, хто што ўжэ. «Вот это во ваша каша? Ваша каша?» – «Не. То не наша. Не наша». Тады ўжо кажуць: «Ото панеслі, глядзіце». Ну, тады яны ўжо укупляюць тую кашу. Грошы кідаюць на тарэлку. А тады ўжо, хто болей кіне, б'е кашу тую. После выпіваюць ужэ. Гаршок б'юць. Чарапочкі на голавы адзяваюць, штоб дзеці былі.

Роды прымала бабка. Яна перараэала пупавіну. Нельзя, штоб была пры этым удава. Бабу бралі пажылую. Бабка адна была.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі рэб'ёнак нараджаўся, дык кумы гатовілі кашу або ў чыгунцы, або ў гаршчочку. Часцей у гаршчочку, бо яго можно разбіць. А гаршчок падаш, ды у яго можна ката пасадзіць. Мне кум першы раз ката прынёс, а куме сказаў: «А ты, кума, грошы гатоў».

Кашу павінна бабка варыць. Абычна кум плоціць за кашу, а калі хочаш болей грошай забраць, рублік палажы і па кругу пусці, і пачынаецца: «Ты столькі палажыў, а я болей».

Была раней бабка-павітуха. Ета зараз усе ў бальніцах ражаюць, а раней прыходзіла і адразала пупкі. І баба павінна быць не родная, а чужая. Падаркі абавязкова дарылі і бабке-павітусе, і куму, і куме. Дарылі хто што можа. Куму дарылі рубашку, куме даюць палаценца або пакрывала, ілі простынь. Раньшэ так, а цяпер хто што, тое і дараць.

Каб ражаць было лягчэй, трэба больш двігацца, работу рабіць. Яшчэ калі прыходзіш у роддом, трэба ўсе заколкі з галавы зняць, валасы распусціць. Нада, штоб рот не буў адкрыты, патаму што есць разрывы, а када рот закроеш, всё ціхонька будзе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н. , 2005 г.

ВЯСЕЛЛЕ

Пажаданне нявесткі маці

Будзь здарова, мама,
Як цябе не знала,
Дык мамаю не звала.
Як цябе пазнала,
Дык мамаю назвала.

Пажаданне маці нявестцы

Будзь здарова, нявестка,
Як цябе не знала,
Так нявесткай не звала,
Як цябе ўзнала,
Так нявесткай назвала.

Пажаданні маладым

Дарую я вам шчасце і долю,
А яшчэ дару медзі,
Каб дзеці былі, як мядзведзі.

Каб жылі багаты, як восень,
Каб былі красны, як вясна,
А дужы, як вада.
Каб разам усё жыццё ішлі,
Шчасце, долю сабе знайшлі.

Дару платочек, штоб была, як цветочек,
Нас не забывала да в госці пріглашала.
А цебе, маладой, дару жалезнага рубля,
Каб купілі карабля.
Днём каб каталісь, а ноч'ю влюблялісь
Да і на нас не забывалісь.

Жывіце здаровы, адзін аднаго любіце, паважайце
І нас не забывайце.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Ганны Рыгораўны, 1930 г. н., 1993 г.

Сваты

У сваты ідуць бацька, маці, хросная маці, хросны бацька, яшчэ якія родныя. Бяруць з сабой хлеб-соль, бутылку, перавязаную чырвонай або розавай лентай

з бантам. Заходзячы ў хату да маладой, сваты гаварылі: «Кажуць, у вас ёсць цялушка, а ў нас бычок. Ці не прадасце нам сваю цялушку?» Бацькі нявесты адказваюць: «А наша цялушка бадлівая, брыклівая». Але сваты не здаюцца. Ставяць на стол хлеб-соль, гарэлку і гавораць: «А як згодна ваша цёлачка з намі, то няхай перарэжа хлеб». Нявеста, калі згодная, то перарэзае хлеб папалам. І тут пачынаюцца запоіны або заручыны.

Заручыны

На заручынах дамаўляюцца пра дзень вяселля. Маладая дорыць сватам падарункі. Калі на заручынах былі сяброўкі маладой, то яны спявалі сватам:

Нашы свахі немы,
Дохлага каня з'елі.
Па палу качалі,
У попел мачалі.

Вяселле пачыналася звычайна ў суботу. Маладую прыбіраюць. Дружкі пяюць песні:

Дай плавала шчука-рыба
Па дну, па вадзе.
Дай клікала Манечка
К сабе татку:
– Прыйдзі, прыйдзі, татка,
Ка мне, к маладзе.
Да дай жа мне парадачак,
Беднай сіраце.
Да казала дай Верачка,
Што замуж не пайду.
Пасеяла чарнабрыўцаў
Цэлую граду.
– Вы расціце, чарнабрыўцы,
Не буяйце.
Вы не йдзіце, дзеўкі, замуж,
Пагуляйце.
Раслі, раслі чарнабрыўцы
Дай забуялі.
Не пайшлі ўсе дзеўкі замуж,
Не гулялі.

Маладую адзяваюць у спадніцу, вышываную кофту, на шыю адзяюць многа маністаў, валасы заплятаюць лентамі і на галаву адзяюць вянок з лентамі. Чым іх болей, тым лепш.

Малады з дружкамі прыязджае да маладой. Дружок маладога выкупляе нявесту, а затым едуць ужо ў цэркву вянчацца. Едучы з царквы да маладой, вяселле могуць колькі разоў астанавіць, каб узяць выкуп за праезд па дарозе.

Дома маладых сустракае бацька і маці, кормяць іх мёдам, каб соладка было жыць. Маладых садзілі на покуце на кажух, каб багатыя былі. На вяселле гатавалі боршч, аладкі. Калі хто быў багацейшы, то каржы, картоплі, сыровадку і кашу.

Бацькі налівалі гарэлку, і пачыналася вяселле. Маладыя сядзяць на покуце, яны не ядзяць, не п'юць, не танцуюць, каб пасуда не білася.

Каравай

Калі пяклі каравай, то каравайніцы спявалі:

Ляцелі гусачкі з-пад гаю,
А пыталіся ў нас караваю:
– Ці ўжо каравай замясілі?
Мы б вам каравай замясілі
Сваімі дзюбкамі вострымі,
Сваімі лапкамі быстрымі.

На мора ў красачкі зляталі,
Мы б вам каравай убралі,
Каб вам каравай ясен быў,
Каб вам каравай весел быў.

Каравайнічкі, пачынайнічкі,
Ды не стойце ў запечку,
Выйдзіце на хатачку,
Пачніце вяселейка, вяселейка вясёлае.
Дзевачкі – у песенькі,
Музычкі – у скрыпачкі,
А мамачка – у мыселькі.

Грае вясёлая музыка. Усе танцуюць. Калі каравай вымаюць з печы, вяртаюцца маладыя з царквы. Іх сустракаюць бацькі. Маці кажа: «Благаслаўляю і сустракаю вас, дзеткі, жытам, бытам, доўгім векам, добрым здароўем, каб доўга жылі, мяне не забылі, адно аднаго шанавалі. Што маю, тым сустракаю: і на быт, і на век доўгі». Пры гэтых словах маці тры разы абыходзіць маладых і пасыпае іх жытам, кветкамі. Потым трымае хлеб, а маладыя п'юць па чарцы гарэлкі, пасля закусваюць хлебам-соллю. У гэты час бацькі і госці глядзяць, якія будуць маладыя: пражорлівыя ці не, хто з іх хлеба болей адкусіць.

Пасля прывітання маці запрашае ўсіх у хату. Маладыя садзяцца побач на кажух, каб жылі па душы і былі заўсёды радам. Сват і сваха запрашаюць за стол гасцей. Госці садзяцца за стол. Сват кіруе вяселлем:

– Налівайце чаркі поўныя да вып'ем за нашых маладых!

Адзін з гасцей гаворыць: «Давайце вып'ем настойкі горкай!», каб усе закрычалі «горка!»

Усе госці выпіваюць і крычаць: «Горка!» Усе госці частуюцца, ідзе вясельная размова. У гэты час сваха звяртаецца да гасцей: «Госці, чаму вы прыціхлі? Заспявайце што-небудзь вясёлае!» Госці спяваюць песні, частушкі, танцуюць.

У самы разгар вяселля ад дому нявесты раздаецца страшэнны грукат. Гэта галоўны сват, хрышчоны бацька нявесты, хапае за качаргу ці ўхват, барабаніць ім па сценах і моцным голасам заклікае: «На ўспамаганне!» Гэта значыць, што пара «дарыць» маладых. Усе спяваюць, але сват не супакойваецца і працягвае крычаць:

Хто не падарыць,
У таго воўк свінню задавіць.
Калі няма чым дарыць,
Я буду хату валіць.

У хату ўносяць каравай, ставяць на стол. У маладой каравай дзеляць хросныя бацька і маці або хто другі з радні. Але толькі, каб яны былі не ўдаўцы і не

разведзеныя. Прыносяць да маладых каравай і даюць ім яго рэзаць. Хросны пачынае дзяліць каравай: «Благаславі, айцец і маць, вашага дзіцяці каравай раздаць». У адказ чуе: «Бог благаславіць». І так тры разы. А потым ужо вызывае дзеда з бабай, бацьку з маткай і потым усіх астатніх словамі: «У нашай маладой ёсць дзед і баба, просім прыняць каравай і маладым што-небудзь падараваць».

Хто бярэ каравай, той жадае маладым: «Даю рубель, каб купіў карабель, а к вясне і сына марака», «Сыплю вам сто рублёў, каб былі дзеці, як мядзведзі» і г. д.

Потым каравай замочваюць, а маладую ў гэты час замотваюць. Косы расплятаюць і кідаюць ленты. Калі ленты схопіць дружка, то нявеста будзе шчаслівая, а калі дружок, то мужык будзе біцца. Косы расплялі і раскладваюць іх вакол галавы, адзяюць хустку, і маладым на галаву ложаць века з дзяжы, і харашэнька ціскануць, каб дружна жылі.

Маладая сабірае свой пасаг. Дружкі лічаць, колькі ў яе набожнікаў: калі іх да пары, то маладыя будуць жыць у пары.

Вечарам маладая ідзе дахаты да маладога.

На другі дзень каравай дзеляць у маладога. Госці спяваюць песні, танцуюць.

На трэці дзень на галаўні жараць пятухі, куры.

ВЯСЕЛЬНАЯ ПЕСНЯ
(на раздачу каравая)

Ай, іграй, музыка, не гуляй,
Будзе табе заплата аддана,
Качан капусты на градзе,
Верабеечка ў гняздзе.
Качан капусты саўецца,
Верабеечка ў гняздзе знясецца.
Цёшча яешні напражэ,
Музыканту пад нос паднясе.
Хваліліся, што багатыя,
А яны ж скупаватыя.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Сідарэнка Ганны Дзмітрыеўны, 1936 г. н., 2004 г.

Ой, наш жаніх-дзядзя,
На маладую глядзя,
Было табе не ляніціся,
Да самому й ажаніціся.

Ой, не стой, татка, у парозе,
Падыйдзі ка мне блізенька,
Пакланюся табе ў ногі нізенька.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Цямляк Ульяны Пятроўны, 1923 г. н.

Сваты

Свадзьбу спраўлялі пасля пакопвання картошкі. Нельзя было яе гуляць у пасты. У выхадныя дні ехалі сваты да дзеўкі (абычна гэта былі бацька і брат ці хросны). Яны са сваёй гарэлкай уваходзілі ў хату і прасілі ў старых бацькоў рукі дзеўкі. Бацькі садзілі сватоў за стол і расказвалі пра дзеўку, а патом звалі дзеўку, дарылі ёй падаркі, а яна, калі сагласна, то тожа дарыць ім падаркі, а не сагласна, выносіла гарбуз. У гэты вечар назначалі дату свадзьбы, гаварылі аб прыглашоных, гулялі, спявалі песні.

Дзявішнік

Перад свадзьбай дзеўкі збіраліся ў пятніцу на дзявішнік. Там даўжны быць адны дзеўкі, яны спявалі песні, гаварылі, успаміналі врэмя, што былі ўмесце.

Каравай

Перад свадзьбай пеклі каравай. Пеклі замужнія жанчыны, бо пражылі ўжо ў сям'і. Не пеклі, што разышліся са сваім чалавекам.

Вянок нявесце рабілі дзеўкі з цвяточкаў. Раней не было як шчас, і вянок быў з жывых цвятоў ці з лентачак.

ЗАГС

Перад тым, як ехаць у ЗАГС, малады даваў выкуп за дзеўку, шукаў яе. Хавалі маладую незамужнія дзеўкі, ім давалі выкуп.

У нявесты

Пасля ЗАГСа маладых устрачалі радзіцелі, толькі якія адзін раз жаніліся і не расходзіліся, бо такая судзьба будзе ў маладых. Раней машын не було, і калі жаніліся, ездзілі на конях. Нявеста не даўжна з жаніхом сыйці на голую зямлю, зямлю пакрываюць чым-небудзь. Маладыя ішлі да парога, там стаялі радзіцелі з хлебам-соллю: хто больш адкусіць хлеба, той і будзе хазяінам у доме. Маладая даўжна разбіць тарэлку, а патом пераступіць з мужам чэраз асколкі, каб не было между імі ссор, а патом пераступаюць парог: хто первы пераступіць, той і хазяін у доме. Яшчэ давалі чаркі з гарэлкай, маладыя выпівалі і разбівалі чаркі. Абсыпалі зярном маладых, каб былі багатымі і здаровымі. Патом начыналісь гулянкі: спявалі песні, танцавалі госці.

За сталом маладых садзілі на вывернуты кажух, што азначала багацтва, а ў чаркі клалі манеты, якія патом хранілі пад скацеркай, каб быў дастатак у доме.

Дзяльба каравая

Калі дзеляць каравай, выходзяць перавязаныя рушнікамі сваты з гарэлкай і караваем. Сначала падхадзілі самыя родныя, клалі грошы на каравай, жалалі што-небудзь, выпівалі гарэлку і бралі каравай, толькі не голай рукой. Нявеста падаркі давала.

У жаніха

Як маладыя ехалі да мужа, нявесце адзявалі платок на галаву, бо яна стала замужняй, і яна брала свае падушкі, адзеялы і ехала да свякрові. Везлі маладую хросныя. Там свякроў і свёкар страчалі маладых. Нявеста, уваходзячы первы раз у дом свякрові, становіцца на парог і спрыгвае з яго, каб яе любілі ў этым доме. Тут тожа садзяцца за стол, п'юць гарэлку. А патом маладыя ідуць спаць. Раней маладых клалі на аржаныя снапа, іх не даўжно быць, каб дзялілася папалам, тады ні маладыя, ні іх дзеці не будуць ні ў чом нуждацца. А шчас такое не дзелаюць, а шчас хаця б клалі падушкі, штоб разрэзы навалочак былі павернуты адна да адной, каб маладыя не ругаліся.

Трэці дзень. Абрад «Куры»

На трэці дзень было прыгатаванне «курэй». На ўсёй дзярэўні ў тых людзей, што булі на свадзьбе, збіраюць курэй і гуляюць.

А нявеста ў новым доме аставалася нядзелю ў свёкраў, падмятала пол, мыла пасуду, памагала хазяйке.

Чэраз нядзелю вязуць нявестку дадому і зноў гуляюць.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г. н., 2002 г.

З гары, з гары, з даліны беглі конікі чатыры,
Везлі карэту сінюю, звенчалі Манечку сілаю.
Звенчалі яе за грошы, штоб быў Іванечка харошы.

Распусціцеся, варагі, не пераходзьце дарогі,
Няхай перайдзе радзіна, каб была дарожачка шчасліва.
Шчасліва дарожачка, шчасліва, каралямі цэркаўку масціла,
А чырвонцамі набівала, свайму Іванечку прысягала.

Пусці, сваточку, у хатачку, мы ў тваёй хатачцы век не бывалі,
На тваёй гарэлачцы век не півалі,
Хваліліся, што багатыя, аж яны скупаватыя.
Самі пяшком ішлі, маладога ў мяшку вязлі,
Сабакі гірчалі, ногі тырчалі.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Шкаляр М. А., 1922 г. н., 2001 г.

Сваты

Зразу высватают дзеўку. Прыедзе маладой з бацькам, з маткай, а таксама і хросны, і хросная, ну, і яшчэ там родныя. Проста так заходзілі: «Мы к вам, вашу дзевачку хочам».

Прыносілі з сабой хлеб і гарэлку. Дак раней жа такога не было: сагласна, не сагласна. Сілай аддаюць. Ну, а тады ўжо садзяцца за стол. От эта ж і ёсць і сваты, і заручыны. А тады ўжо вяселле.

Зборы да вяселля

Малады прыязджае к маладой і забірае маладую і дружкі маладой. І ўжэ тады маладую прывязуць, а яе дружкі – падружкі вешаюць ужэ набожнікі на іконы там, на вокны. Ну, маладая ж у касе ходзіць, а ўжэ потым дык дзевачка малая, 5–6 лет, расплятае касу. Садзілі маладога з маладой на кажух.

Каравай

Пеклі каравай. Каравай жэ – эта як свадзьба, тады ўжо каравай раздаюць, сват разносіць. Ходзяць ужэ з падносам, на ім каравай ляжыць, а там на падносе – бутылка, стакан. Ён к кожнаму падходзіць. Наразаюць каравай, ён выпівае, бярэ каравай, там дзеньгі ложаць, падаркі, мацерыял ці што яшчэ. Каравай пеклі радзіцелі. От, вярхушку, наверна, аддавалі маладым.

Свадзьба длілась дней 3. Едуць зразу к маладой. Малады прыязджае са сваімі дружкамі к маладой. Там госці, а тады ўжо адпразнуюць, і тады малады вядзе маладую к сабе, і тады ўжо свадзьба ў маладога.

А касу расплятаюць у дзявоцкай хаце. А бабы, дружкі выкупляюць. Каней украшалі, абсыпалі зернем, як толькі павянчаліс. Прыязджаюць радзіцелі, з іконай, хлебам-соллю страчаюць, штоб багатыя былі, абсыпалі зернем.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н. (нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Прыйшлі ў сваты. Сваты ўвайшлі ў хату, пашуцілі. Абычна бацька йшоў, хросная матка, хросны бацька, дзядзька родны. Бралі хлеб, гарэлку. Маладой нада разрэзаць хлеб. Пыталі старыя: «Цёлачка прадаецца?» Мы кажам: «Вот мы заблудзіліся. Шлі, мо ў вас дзяўчына е такая. Пусціце пераначаваць». А тады спрашуем у маладой: «Ты сагласна выйсці за нашага парня?» Яна сагласіе даёт. Ложаць хлеб на стол, нож. Яна перараэае хлеб напалам. І эта ўжо яна высватана. З яе рукі, хто на свадзьбе будзе гуляць, іх завуць на «первую чарку». Патом сваты дагаварююцца, када ўжо іграць свадзьбу. Дружкі былі. Маладая сваіх падружак бярэ, 4–5 дзяўчынак. А ён бярэ шаферэй такое калічэства, сколькі дружак. Тыя ўжо купляюць кветкі ў маладых. Дружкі ўжэ з шаферамі этыя кветкі прышываюць. Этыя ўжо выкуплівающь тыя кветкі. Садзяцца і едуць у цэркву.

Вечар перад свадзьбай называўся заручыны.

Каравай украшалі цвяточкамі. Перваначально гулялі ў маладой. У маладой каравай падзялілі. І дзеляць толькі каравай ад маладой рукі. Тамако ўжо хросны бацька ў аснаўном дзеліць каравай. Сначала маладым даюць. Просяць прыйці каравай прыняці і што-небудзь падараваць. На следующчы дзень ужо ў маладога гуляюць. Эта ўжо каравай дзеляць у маладога. Каравай маладога ўжо дзеліцца. На пасад маладую вядуць падружкі ў асноўным. Маладых садзілі на кажух, штоб багатымі былі.

У царкве поп вянчаў іх, кольца адзяваў. Када маладыя едуць, у нас абычна дарогу вяроўкай перацягваюць. Яны ўжо зацапіліся, і тыя людзі магарыч просяць.

Дзелаюць папялішча, када ўжо ў маладога адгулялі, у маладой адгулялі. На трэці дзень прыбіраюцца ў цыган. Прыязджаюць па дварах: «Давай куру, а не куру, значыць, давай бутылку». І эта ўжо зносяць у адзін двор к маладой ці к маладому. Папялішча дзелаюць такое.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Парынь і з дзевушкай дружыць, ну, а патом ужэ дагаварююцца і прыходзяць у сваты. Жаніх ужэ сваю радню бярэ: дзядзькі, еслі маладыя, браты жанатыя. Тры чалавекі, два, чатыры – колькі ў сіле. Ну, і ідуць жа к нявесці. Ідуць увечары, так паложана, часоў у двянаццаць. Там ужэ дагаварююцца. Заходзяць у хату, паздароваюцца. Патом кажуць:

– Можа, прадаеце што вы: карову ілі авечку?

Патом ужэ пагавораць, дагаворацца. Ета к маладой прыходзяць сваты. І тады ўжэ завуць хросных і маладога, і маладой. Прыходзяць тыя, моляцца Богу. Тады ідуць ужэ і адну дружку первую завуць, падругу і парня. Ідуць і к радзіцелям жаніха ў той самы вечар ці ноч. Выпілі, закусілі. Ну па етым ужэ ўсё. Пашлі дадому.

Патом, чэраз сколькі дней, эта ўжэ па дастатках, калі падгатуюцца, гуляюць заручыны. На заручыны ў маладой толькі гуляюць. Ну, ужэ вячэру вараць. І еслі ў каторай німа падгатоўленага палаценца вышыванага, набожніка, то дзеўкі кружава плялі, вышывалі – памагалі нявесці. Песні пелі.

Патом сабіраюцца не толькі дружкі, а ўся маладзёж сабіраецца, шахвяра. А тады ўжэ дагаварююцца, калі вянчацца ехаць. А радзіцялі не ўчаствуюць у етым. Заручыны – ета толькі маладзёж. Дагаварююцца ў цэркві з бацюшкам, калі ехаць вянчацца.

Вот у той назначаны дзень сабіраюцца там падводамі: і дзве, і пяць, і тры, і восем – ета ўжэ па дастатку. У еты дзень, як едуць к вянцу, то дзеўкі прыходзяць і заплятаюць касу, прыбіраюць маладую. У касу плялі ленты, на галаву адзявалі вянок і хвату. Як касу плялі, ніякіх песен не пелі, маўчалі. Ну вот, жаніх едзе к нявесце з шахвярамі і з падводамі. Яны заварачуюцца каля двара, выходзіць жаніх, і там ужэ радзіцелі нявесты благаслаўляюць, і яны ўжэ едуць у цэркву. А як ад хаты ад'язжалі, дык зярном абсыпалі, штоб жылі багата, добра.

У нас нявесту не выкупалі. А сватам перавязуюць платкамі рукі, быў такі абычай. Павянчаліс і едуць ужэ к жаніху. Маладых сустракае бацька і матка. Бацька з іконай, а матка з хлебам. Прыехалі дружкі – адна маладзёж толькі гуляе. Паабедалі і ідуць ужэ к маладой. Ета як цямнецца начынае. Сват ужэ – «каронны», гавораць, едзе з падводай дамоў. Там маладой ужэ расплятаюць касу, ад жаніха як прышлі. Тожа ўжэ садзяцца за стол: дружкі, шахвяра і ўжэ штук тры жэншчыны. А брат маладой, як е (а калі німа, дык так каго просяць), расплятае касу. Расплятае касу і магарыч спраўляе. Трохі папляце, а тады кажа: «Сват, сват, рукі памерзлі!» Ну еты ўжэ налівае. Расплялі касу. Тады бабы начынаюць замотуваць касу. Ну і чапец надзяюць. Ета ўжэ «прыданкі» называюцца, тыя, што дзеўцы косы зачэсваюць у чапец. І яны тады лён паляць на куце. Патом сыпяць па людзях жыта і гавораць:

Сыплю жыта відно,
Штоб усім завідна.
Кідаю жыта ўночы,
Засыпаю ўрагом вочы.

Так тры разы яны сказалі. Ну, а дзевачкі етыя ўжэ пяюць:

А мы што захочым,
Тое і запрочым.
Завядом за лозу,
Заплятом косу.

Дзеўкам-шахвяркам тожа даюць магарыч за тое, што кветку прышываюць шахвяру перваму, што вянец дзяржаў, калі касу расплятали. І сватам прышываюць. Гавораць:

Мы кветачку шылі,
Іголачку зламалі.
Нада сватом знаці,
Што за іголку даці.

А патом жа не даюць, таргуюцца, дык гавораць:

Нашы сваты хваліліся,
Што багатыя,
А яны скупаватыя.
Самі пяшком ішлі,
Жаніха ў мяшку нялі,
Сабакі гірчалі, ногі тырчалі.

Ну, там ужэ капейку даюць, ну, і магарыч ставяць.

Калі ўжэ кончыўся еты абрад, усе дзеўкі і парні выходзяць. Садзяцца ўжэ «прыданкі», сваты, і пачынаецца вячэра ўжэ паследняя ў нявесты. Павячэралі, сабіраюць маладой пасцелю, набожнікі – прыданае звязваюць. Маладая ўжэ адкланяецца радзіцелям, цалуюцца, паплачуць, усяго бывае. Адкланілася маладая. Маладому даюць ікону, маладой – хлеб. Едуць ужэ к маладому. У маладога ўжэ пасцелю сцелюць. Малады дае бацьку ікону, штоб яе павесіў, а свякруха ўжэ бярэ хлеб. Прыданкі ўжэ заходзяць, усё вешаюць, прыбіраюць. Павячэралі, пашлі маладыя аддыхаць.

Назаўтра брат маладой нясе ёй есці, снеданне. У той дзень ужэ ідзе свадзьба. Пякуць каравай. Караваі пякуць два. Пякуць тыя жэншчыны, што замужам і што харошыя хазяйкі. У еты дзень малады едзе па цёшчу, прывозіць цёшчу. Каравай ужэ спечаны. На караваі – шышкі з цеста, ета як хто сумее выдзелаць. Ну, ужэ радня маладой і маладога сабіраецца. Сабіраюцца, садзяцца за стол, выпіваюць. Маладыя не садзяцца, яны, дзе прытуляцца, там і сядзяць.

А далей дзеляць каравай. Уходзіць сват, говорыць:

Благаславі, айцец і маці,
Сваім дзецям каравай раздаваці.

Тры разы гаворыць так. Тады зразае верх, і малады з маладой ядуць верх. І даюць у платочак дружкам, штоб скора замуж ішлі. А там жа маладых німа, толькі ўзрослыя. За каравай даюць падарак, гавораць маладому:

Маладому даю каробку шпонак,
Штоб не любіў чужых жонак.
Жадаю шчасця, долі.

Дарую пасталы і анучы,
Штоб жылі ў кучы.

Ну, раздалі тут ужэ каравай, тады едуць і к маладой. Там гуляюць. Зноў гуляюць толькі старыя, узрослыя людзі. Маладзёж первы дзень пагуляла і больш не гуляе.

У маладой тожа пачынаюць дзяліць другі каравай і ўжэ гавораць маладой:

Дару каробку буракоў,
Штоб не любіла чужых мужыкоў.

Патом ужэ ідуць на бяседу. Ідуць ілі к хроснаму, ілі к хроснай, у каго ўжэ памяшчэніе дазволіць. І там ужэ гуляюць. Эта ўжэ так: ілі прыглосяць маладых, ілі не. Як хочуць. На етым ужо вяселле кончылась.

А на «пасад» саджаюць, як і к вянцу ідуць, і як ад вянца ідуць, і ў маткі ўжэ, як паследняя вячэра. Садзілі маладую на лаву на кут. Падсцілалі кажух, штоб добра жылі.

Штоб не сурочылі (не зглазілі) маладых, дык нявесце затыкалі ў плацце іголку. А то шчэ хросная так дзелала: як вянчацца ехаць, дык яна палку возьме паміж ног і кругом машыны аббягіць тры разы. А што яна гаворыць, я не знаю.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н.

Каля майго церама, (2 р.)
Каля майго новага
Бітая дарожачка,
Таптаная сцежачка.
Туды ішлі малайцы
У гуселькі йграць. (2 р.)
Як зачула дзевіца,
Як зачула красная,
У цераме седзячы,
Кашулечку шыючы.
Прасілася дзевіца
А ў роднай маманькі:
– Пусці мяне, маманька,
Пусці мяне, родная,
З церамак на ганачак,
Гуселек паслухаці, (2 р.)
Песенак наўчыцца.

А ЧЫЙ ГЭТА ГОЛАС?

А чый гэта голас
Раздаецца ў полі?
То мая падруга
Расстаецца з Колем.
Праважала яго
Па чыстаму полю,
Гаварыла яму
Патайныя рэчы:
– Куды, мілы, едзеш,
Куды ад'язджаеш?
На каго, мой мілы,
Мяне пакідаеш?

– Пакідаю цябе
На людзей, на Бога,
Нас на свеце многа –
Выбірай другога.
– Выбіраці буду,
Ды любіць не буду,
Пра цябе, мой мілы,
Навек не забуду.

ОЙ, ЧАГО Я СОХНУ

Ой, чаго я сохну,
Ой, чаго я вяну,
Прыйдзе вечарочак –
На каго я гляну? (2 р.)
Гляну на калечка,
Забаліць сардэчка,
Гляну на другое –
Забаліць, заное. (2 р.)
Дзесь паехаў міленькі
У Крым на вайну,
А мяне пакінуў
Гараваць адну.
Ой, вярніся, міленькі,
Не трывож мяне,
Успомні, што тут сохнут,
Вянут па табе.

СТУКНУЛА, ГРУКНУЛА НА ДВАРЭ

Стукнула, грукнула на дварэ.
– Ой, паглядзі, маманька,
Ці не па мяне?
– Па цябе, дачушка, па цябе.
– Схавай мяне, маманька,
За сябе!
– Не буду, дачушка, хаваці,
Трэба цябе сёлета аддаці.
Та-ра-ра калёсачкі, та-ра-ра,
Ой, павезлі Леначку са двара.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кавалёвай Алены Палікарпаўны, 1992 г.

Суджанага мужа свайго маладая не ведала.

Прыходзяць сваты ў хату з хлебам, з соллю, сядаюць за стол і дамаўляюцца пра свадзьбу.

Едуць у царкву вянчацца і распісвацца.

Спачатку свадзьба ў маладой. Дзеляць каравай. Вечарам вязуць к мужу з прыданым. Завіваюць маладую:

Завівае мяне дзядніца чорная, да як чарніца,
Слёзачкі не ўраніла, штоб яе пераламіла.

Да як заржалі сівыя коні ў полі,
Да кінулася свайму татачку ў ногі,

Да не аддай мяне ў чужы край:
Чужыя людзі судлівыя,
Дай асудзяць маю гаворачку, маю паходачку.

Дай не журыся, дзіця маё,
Будзем па воду ісці, будуць людзі стаяць,
Ты да іх дайдзі, ціхенька ўкланісь.
Ой, чыё ж то дзіця па воду пайшла,
Што такое дзіця ды прыветлівае.

Калі завівалі сірату, спявалі:

Станавісь, радзіначка, уся ў рад,
Вядуць сіраціначку на пасад.
Да кругом радзіначкі яна абыйшла,
Сваёй мамачкі не знайшла.
А ўжо ж мая галовачка ўся ў цвеце,
А мая мамачка на том свеце.

На каравай дружкі пяюць:

У бару сасна крывая,
Старшая свацця сляпая.

У адказ свацця:

Брашыце, дружкі, брашыце,
На кол языкі цяшыце.
А нашы сваты скупыя,
Самі ішлі, жаніха ў мяшку няслі.
Ногі тырчалі, сабакі брахалі.
У нашай свяцілкі кофта з брыжамі,
На ёй кароста струпамі,
На ёй сарочка сестрына,
Выганяйце яе з-за стала.

А вы, дружачкі, да іх не лайцеся,
Караваямі памяняйцеся.

Пажаданні

Дарую сарочку, штоб радзілі дочку.
Дару замок, штоб на другі год быў сынок.
Дарую маладым медзь, штоб малады быў, як мядзведзь.
А маладой дарую серабро, штоб было ёй жыць з маладым дабро, штоб хлеб-соль мелі і радню шанавалі.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Карнавушанка Хрысціны Анісімаўны, 1904 г. н., 1995 г.

Сватанне

Бацькі жаніха рыхтуюцца: маці пячэ пірог, бацька дагаворваецца з хросным. У назначаны дзень яны з хлебам, соллю ідуць к нявесце. Увайшоўшы ў хату, сваты гавораць: «Мы прыйшлі купляць цялушку маладзенькую да прыгажэнькую, да працавітую, казалі, што прадаеце такую».

Калі бацькі нявесты згодны, то запрашаюць сватоў за стол, а калі не згодны, то гавораць, што ніякай цялушкі мы не прадаём, адкуль прыйшлі, туда і ідзіце або пытайце ў другім двары.

Потым, калі згодны, то гавораць аб жаніцьбе дзяцей. Сваты кладуць на стол хлеб-соль або пірог, выпіваюць з бацькамі нявесты па першай чарцы.

Заручыны

На заручыны прыходзяць маладыя і блізкія. Пякуць пірагі з двух бакоў: бацькі жаніха і нявесты. Садзяцца за стол і пяюць песню:

Што ў агародзе капуста кілаватая,
Што першая сваха галаватая, ня ўмее рабіць,
З людзьмі гаманіць.
Толькі знае спаць ды людзей абсуждаць...

Сваха – свасе: «Давай, свашачка, не ламайся, на пірагі памяняймася. Пірагі нашы пячоныя, нашы дзеткі заручоныя».

Потым весяляцца, пеюць песні, танцуюць.

Вяселле

Гатовяцца да свадзьбы. Прыходзяць малады з дружкамі і з бацькамі выкупляць маладую. Доўга таргуюцца, пака ўсе грошы з карманаў не павысыпаюць за маладую.

После выкупа бацькі бяруць маладых і паводзяць іх кругом стала ў хаце (маладыя бяруцца за рукі і бацька іх таксама).

Вянчанне

Потым сабіраюцца ехаць к вянцу ў царкву. Маладая бярэ ікону з дома, і ўсе едуць у царкву. Ад маладой едзе сваха, бярэ кусок палатна і дзве свечкі. Гэта палатно сцеле ім пад ногі, называюць іх падножнікі. На гэта палатно становяцца маладыя, праходзіць вянчанне, бацюшка бярэ сваім фартухом за рукі маладых і водзіць іх вакол іконы. Маладыя цягнуць палатно за сабою, а сваха ідзе следам і рассцілае яго зноў пад ногі. Палатно цягаюць, каб усе дзеўкі пайшлі замуж.

Сустрэча маладых

Пасля вянчання едуць дамоў. На варотах не пускаюць маладых у двор, ставяць стол, угашчаюць выпіўкай. На парозе стаяць бацька і матка з іконай у руках. Маладыя кланяюцца ім і цалуюць ікону. Ідуць у хату за стол, садзяцца на скамейку, засланую кажухом. Ставяць у стакан свечкі, прынесеныя з цэрквы, а таксама веткі каліны. Пяюць дружкі песню:

Годзі, каліна, годзі, маліна,
У цёмным лесе стаяці.
Годзі, дзевачка, годзі, Манечка,
У сваёй маці гуляці.
А ўжэ ж каліну, а ўжэ ж маліну
Салаўі паклявалі.
А ўжо ж дзевачку, а ўжо ж Манечку
Суседзі абгаварылі.
Ой, не так яе, ой, суседачкі,
Як падружанькі.
Умесці былі, мёд пілі
Да й шчэ й абгаварылі.

Пасля вяселля нявесце расплятаюць касу браты. Трошкі расплятуць і крычаць, што замлелі рукі, дайце замачыць. Расплеценыя ленты вешаюць на вакно на шторкі. Каля маладых сядзіць святілка. Свахі пяюць:

Святілка-шпылька пры сцяне,
На ёй сарочка не яе.
На ёй сарочка свякрына,
Нада выгнаць яе з-за стала.

Дзядзька маладога завівае маладой валасы. Яна бярэ века (крышка з хлебнай дзежкі) і на яго ставіць два полустаканчыкі з водкай. Гэтай водкай яна мочыць галаву і пяе:

Ой, што мы хацелі,
То мы і зрабілі:
З хлеба – паляніцу,
З дзеўкі – маладзіцу.

Маладую забіраюць к маладому.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюля Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., 1993 г.

Сватанне

Ідуць у сваты да маладой бацька, матка, хросная і сваты. Калі прыходзяць, пяюць песню:

Сваха свасе пакарылася,
Нізенька ў ногі пакланілася,
Штоб з маего дзіцяці не глумілася.

Сваты прыходзяць з бутылкай, абвязанай краснай лентай, хлебам, соллю, із сенам, таргуюць «цёлку», прыходзяць з сваім «бычком».

Заручыны

Завуць ужо болей людзей: усіх братоў, сясцёр... На заручыны перавязваюць ручнікамі сватоў. Сваты пяюць:

Кукавала зязюлечка ў саду на памосце,
Прыехалі да дзевачкі тры казакі ў госці.
Адзін ідзе – каня вядзе,
Другі сядло вяжа,
Трэці стаіць пад акошкам,
«Добры вечар», – кажа.
– Добры вечар, маць-старушка,
Дай вады напіцца,
На тваю дачушку трохі падзівіцца.
– Ты ідзі, напіся,
Сядзіць дочка на краваці,
Ідзі, падзівіся.

Ад'езд да вянца

Хлопцы запрагалі тройку коней, украшалі дугу, вешая калаколы, каб званелі. Страчалі з хлебам і соллю. Потым маладых сажалі назад. На первы воз бралі

лучшых дружак, княжога, свяцілку. Другі воз – таксама ехалі дружкі, а трэці воз – сваты, старэйшыя. Нельзя, штоб людзі пераходзілі дарогу, калі едуць вянчацца. Маўчаць усе, як едуць да вянца, а ад вянца – пяюць:

Выйдзі, мамачка, з свячамі,
Мы тваіх дзяцей звянчалі,
Звянчалі ня дарам, за грошы,
Штоб быў малады (імя) харошы.

У хаце жаніха

Едуць з вянца к жаніху, у яго частуюцца, пагуляюць нямнога, а потым вязуць маладую дамой, саджаюць за стол, на кажух, каб былі багатыя. Патом прышываюць кветку княжому і пяюць:

Мы кветачку шылі, іголку зламалі,
Трэба свату знаць, што за іголку даць.

Сват налівае па румачцы дружкам, трохі каўтануць, а трохі ў стол выльюць. Патом маладой расплятаюць косу, замотваюць, надзяюць чапец і пяюць:

Што жа мы хацелі,
Тое мы зрабілі:
З цеста – паляніцу,
З дзеўкі – маладзіцу.

Надзелі чапец і абапнулі платок. Гуляюць, весяляцца. Пад вечар застаецца толькі радня, яна з маткай пачынаюць збіраць маладую, яе багацце: пасцель, вышываныя ручнікі, полкі тканыя, радны і пры гэтым пелі:

Давай, мамка, павячэраем,
Павячэраўшы, падзелімся.
Табе, мамка, тарэлкі, міскі,
А мне, мамка, падушкі-пярынкі.
Табе, мамка, бердзечка,
А мне, мамка, палаценечка.

Грузяць усё гэта і вязуць к маладому. Патом вешаюць ручнікі і сцелюць пасцель, пры гэтым знімаюць свякрушыны ручнікі і пяюць:

Пяньковыя ізнімайцеся,
Шаўковыя адзявайцеся,
Пяньковыя навіселіся,
Шаўковыя наляжаліся.

Другі дзень. Каравай

Назаўтра пачынаецца вяселле ў маладога. Прывозяць цешчу і скрыню з падаркамі. Раздаюць падаркі і дзеляць каравай. На пачатак кажуць свату: «Благаславі, ацец, маці, сваім дзецям каравай раздаці». Яму атвечаюць: «Бог, благаславі». Ён кажа: «Другі раз і ў трэці раз». І ўсе кажуць: «Бог, благаславі». І пачынаюць дзяліць каравай, жадаючы шчасця.

Пяюць вясельныя песні:

Нашы сваты хваліліся, што багатыя,
Аж яны скупаватыя,
Самі пяшком ішлі,

Жаніха ў мяшку няслі,
А ногі тырчалі, сабакі гірчалі.

У нашага свата някрытая хата,
У сянцах з бярозы ўсе людзі цвярозы.

Вяселейка Бог даў,
Ажаніўся статуй, торбу ўзяў.

Трэці дзень. «Галоўні»

Збіраюць курэй у тых людзей, хто ўчастваваў у вяселлі. Увечары ўсе збіраюцца і вяселле працягваецца.

Некаторыя людзі задзелываюцца пагана: жэншчына – у мужчыну, мужчына – у жэншчыну, прыходзяць летам на каньках, зімой – босыя, каб было смешна.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Анікеенка Кацярыны Пятроўны, 1933 г. н., 1998 г.

У нас усягда дагаварувaліся, што прыдуць у сваты. У сваты хадзілі хросны з хроснай і родственнікі маладога. Прыходзяць і кажуць: «Добры вечар! Мы чулі, што ў вас цёлка прадаецца?» Ну, а тыя казалі: «Да! Можам прадаць! Заходзьце ў хату». Ну, а патом, калі зайшлі, садзяцца ўсе за стол. Тады нявеста дорыць усім падаркі. Усягда дарылі ручнікі, вышытыя нявестаю. У еты ж дзень дагаварваюцца пра дзень свадзьбы.

У нас, еслі вянчаліся ў цэркві, то бралі шахвіра і шахвірку. Шахвірка дзяржыць вянок над маладою, а шахвір – над маладым. Калі бацюшка водзіць маладых кругом вянца, дак маладая цягне правай нагой палаценца па палу, штоб уцягваць сваіх падружак замуж.

Прыехалі ад вянца. Садзяць маладую і маладога на кут і ложаць пад іх кажуха. Ля іх садзяцца дружкі (хлопцы), а дзеўкі-дружкі, становяцца на лаўку, бяруць у дружкоў шапкі і прышываюць к ім цвяты. У ета ўрэмя сват стаіць ля стала і дзеўкі пяюць:

Выкупляй, сваток, шапаньку.
Калі не будзеш выкупляць,
Дык будзеш столлю выціраць,
Ветрам столлю-сталяну
За (імя) маладу.

Сват даваў ім капейкі, а яны прадаўжалі гаварыць:

– Хваліўся наш сват, што багат,
Што ў яго грошай повен мех,
А кінуў нам капеечку, як на смех.

Сват у тарэлку далей кідае грошы. І так далей спяваюць усякія песні.

Сначала ўсе гуляюць свадзьбу ў маладой і там дзеляць каравай. Каравай пеклі хросныя, каб толькі жанчына была не ўдава. Каравай рэзалі сваты. Первыя кускі каравая давалі маладым, тады родственнікам і гасцям. Калі дарылі падаркі, казалі:

Дорым зялёнага дуба, штоб жылі люба.
Дорым пасталы і анучы, штоб жылі ўсё жыццё ў кучы.
Дорым штаны і сарочку, што радзілі сына і дочку.

Пасля, як падзеляць каравай, пагуляюць трохі і начынаюць завіваць маладую. Маладая адна сядзіць на куце, яе становяцца завіваць дзве жанчыны. Знімаюць з галавы вянок, расплятаюць косу і адзяюць хустку. Надзелі хустку, а тады спяваюць:

Як жа мы хацелі –
Так жа мы зрабілі:
З хлеба – паляніцу,
З дзеўкі – маладзіцу.

А жэншчыны стаяць збоку і пяюць:

Як жа мы захочам,
Так жа мы і зробім.
Павядом за лозу,
Дай заплятом косу.

Тады пела маці маладой:

Устану паранесеньку,
А шчарбіна ў хаце,
Няма ўжэ майго дзіцяці.

На втары дзень прадаўжаюць гуляць у маладога.

На трэці дзень перадзяваліся ў цыганскае і ішлі па хатах збіраць курэй у людзей. Ета называлася «на куры». Гулянка начыналася звечара. Жанчына перадзявалася ў маладога, а мужчына – у маладую, едуць к цёшчы і кажуць: «Прымі сваю дачку. Я не буду з ёй жыць». А цёшча кажа: «Я сваю дачку забяру назад у любы дзень, як табе не наравіцца». Ну, а тады яшчэ смяяліся, шуцілі і ўходзілі. Дзесь да поўначы гулялі яшчэ ў жаніха і расходзіліся. І на етым у нас свадзьба канчалася.

Запісана ў в. Катловіца Брагінскага р-на
ад Максімчык Алены Уладзіміраўны, 1932 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на)

Вяселле праходзіць у хаце маладой. Хата ўбіралася па-святочнаму. Калі замуж ідзеш – бярэш чатыры дружкі. Вышывалі манішкі, рубашкі, каўнер і чахлы.

Вяселле гулялі ў любы дзень так, штоб на пост не пападала толькі.

Сваты

Сваты прыходзяць з хлебам, з соллю і з бутылкаю:

У нашага свата лубяная хата,
Сенцы з бярозы,
Пашлі ўсе цвярозы.
А наш сват Піліп
Сеў на лаўку, прыліп.
Ён сляпы, глухі,
Дружак не частуе.
У свата рукі каслівыя,
З кішэні выймае,
Нікога не вітае.
Выкупай, сватанька, шапаньку,
Калі не будзеш выкупляць,
Так будзеш сцены выціраць.

Такія жартоўныя песні пелі ў суботу, калі прыходзілі сватацца.

Нядзеля. Сватанне

У нядзелю прыязджае малады за маладой і вязе яе ў царкву вянчацца. Нявеста адзета ў спадніцу, кохту, вянок з фатой.

Хата ўбрана па-святочнаму: усланая канапа, на якой сядзяць маладыя, усланы для гасцей сталы, на якіх стаяць прыгатаваныя стравы (бульба вароная, уха з рыбы, студзень, аладкі, сыровадка, квасоўка, кісель, агуркі салёныя). На куце ікона вісіць. Маладыя садзяцца на кажух, каб былі багатымі. Вакол садзяцца дружкі з падружкамі, потым родзічы і ўсе астатнія госці. Самыя галоўныя госці на вяселлі – сваты, якія былі перавязаны ручнікамі.

У маладой

Пасля вянчання маладыя прыязджаюць да маладой, дзе іх віншуюць і сустракаюць з хлебам і соллю (гэта бацька дзержа), а маці – з іконаю. Маладыя кланяюцца. Пасля іх тры разы абводзяць вакол стала і абсыпаюць іх жытам, а госці спяваюць:

Ой, выйдзі, матуля, з свячамі,
Ужо тваё дзіцятка звянчалі,
Ужо тваё дзіцятка звянчалі,
Табе на пацеху прыслалі.
А яна пацеха – толькі жаль,
Адно дзіця мела – зяць забраў.
Адно дзіця мела – зяць забраў,
А за гадаванне нічога не даў.

Запрашаюць гасцей ў хату. Віншуюць маладых, выпіваюць, спяваюць і танцуюць.

Шумяць вербы каля грэблі,
Што я пасадзіла.
Няма таго казачэнькі,
Што я палюбіла.
Няма яго і не будзе,
Паехаў у Адэсу,
А мне сказаў:
– Расці, дзеўка, да маяго прыезду.
Расла дзеўка, расла красна,
Расці перастала.
Ждала, ждала казачэньку
Ды плакаці стала.
– Плачце, вочкі, плачце, кары, –
Така ваша доля.
Палюбіла казачэньку,
Пры месяцы стоя.
Не я яго палюбіла,
Палюбіла маці.
Заставіла сваю дачку
Ўвесь час гаравaці.

Пасля падружкі прышываюць кветкі нашым хлопцам і пяюць песні:

Кветку прышывалі, іголку зламалі.
Трэба свату знаць, што за іголку даць,
Хваліўся наш сват, што багат,
Што ў яго грошай повен мех,

Кінуў дружочкам ён на смех.
(Сват дае выкуп)

А ў нашага свата
Лазяная хата.
Сені із бярозы,
Пайшлі ўсе цвярозы.

Уносяць каравай

Госці працягваюць спяваць і танцаваць. Пасля сват прыносіць каравай, а госці пяюць:

Наш сват каравай нясе
Ды кудрамі трасе.
Хоць трасі, хоць не трасі, –
Караваю нам дасі.

Спачатку запрашаюцца маці і бацька. А сват просіць благаславіць каравай.
Сват і госці:
– Першым разам, лепшым часам благаславіце каравай дзяліць.
– Бог благаславіць!
– Другім разам, лепшым часам благаславіце каравай дзяліць.
– Бог благаславіць!
– Трэцім разам, лепшым часам благаславіце каравай дзяліць.
– Бог благаславіць!
Сват рэжа каравай і запрашае бацькоў маладых, яны жадаюць:

Даруем вам, дзеці,
Пару кароў, 12 петушкоў.
Даруем бульбы падполле,
Каб было дзетак застолле.

Дарым вам рубель,
Каб купілі карабель.
Дзень каталіся,
А ноч цалаваліся.

Пасля запрашалі хросных:

Дару саматканую пасцілку,
Каб ты пасцельку засцілала
Ды і на хросную не забывала.

А пасля запрашалі ўсіх, хто жадаў.

Жадаю вам быць багатымі, як зямля,
Здаровымі, як вадзіца,
Вясёлымі, як сонейка,
А працавітымі, як пчолкі.

Дару бялюсенькім палатном,
Каб ніколі жаніх не стаяў
Пад чужым вакном.

Дару куру-квактуху,
Каб маладая пацалавала свякруху.

Дарую качан капусты,
Каб малады не даваў жане распуты.

Дару карзіну буракоў,
Каб твая жонка
Не любіла чужых мужыкоў.

Спявалі таксама жартоўныя песні:

Дзе вы, сваты, валачыліся,
Што на полі замачыліся.
Ці сена касілі, ці гарох малацілі,
Ці ў саломе начавалі,
Што мышы вусы пааб'ядалі?

Казала Галечка, што замуж не пайду,
Пасеяла чарнабрыўцаў цэлую граду.
Расціце, чарнабрыўцы, не буяйце,
Ой, не йдзіце дзеўкі, пагуляйце.

Нашы сваты хваліліся,
Што багатыя, а яны ж да й убогія,
У іх коні да й бязногія.
Самі яны да пяшком ішлі,
Жаніха ў мяшку няслі,
Ногі тырчалі, сабакі гірчалі.

Пасля запрашалі брата нявесты (ці так якога-небудзь хлопчыка) расплятаць касу маладой.

Радзіцелі благаслаўлялі брата расплятаць касу, а сват даваў яму за лентачкі выкуп. Потым ён замотвае маладога і маладую векам (крышка ад дзяжы).

Другі дзень. Панядзелак

У панядзелак, калі малады прыязжае за маладой, то яе падружкі перадзяваюцца як ахрана з ружжамі, палкі прывязвалі. Ставілі бочку, як ступу, клалі гаршок з попелам, а патом білі па гаршку і пепел разлятаўся.

І калі едуць да маладога, дык маці з імі прашчаецца.

Маладая:

– Памінай мяне, мамка, хоць раз у аўторак, а я цябе, мамка, за дзень разоў 40. Успомні ж мяне, мамка, хоць раз у суботу, а я цябе, мамка, ідучы на работу. Успомні ж мяне, мамка, хоць раз у нядзелю, а я цябе, мамка, сцелючы пасцелю.

Маці:

– Прашчай, мая доча, прашчай жа, дзіціна. Я буду цябе ждаці кожную хвіліну.

– Пацалуй мяне, мамка, пацалуй хоць разочак, бо я прыеду к табе чэраз гадочак.

– Прашчай, мая донька, прашчай, і зяцёчак. Давай пацалую вас хоць разочак.

Трэці дзень. Аўторак

Ва аўторак ужо ходзяць па хатах тых, хто быў на вяселлі, ловяць курэй. Перадзяюцца. Адрубаюць курам галовы і вараць.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г. н., 2002 г.

Сваты

Сваты прыходзяць увечары. Жаніх ужэ бярэ з сабой братоў, таварышаў. Пяюць ужэ, нічога не гавораць. Прышлі калісь, у хату ўвойдуць. Прышлі сваты ў хату:

– Добры вечар!

– Добры вечар!

– Садзіцеся. Што вы, незнакомыя, зашлі к нам. Кажацца, не леснікі, вы не ў форме. Пачаму?

– Нам падказалі, што ў вас цялушка забегла чужая ў хлеў.

– Вазможна і забегла. Ды я сягодня не закутала. Дак што?

– Ну, дык, так еслі ваша, дык вы нам заплаціце, штоб мы прыдзержалі, а еслі ж чужая, вы нашу цялушку будзеце браць, ды вы будзеце плаціць.

Пасмяяліся.

– Ну, як хочаце, а мы прышлі па вашу маладзіцу.

– Ну, па нашу, дык садзіцеся.

Я гарахоў вынесла ім. Яны нічога не прыносілі, толькі спрашвалі, ці ўжо вы сагласны.

Тады ўжо прыязжае і матка, і бацька.

Ужо заручыны тады, а тады ўжо свадзьба. Каней паўбіраюць, двор. Дружкі ўжо садзяцца і едуць. Пяклі каравай. Гэта ўжо радня: збіраюцца, гатовяцца.

Калісь, у старае ўрэмя, яшчэ заматвалі пасцель. Заматваюць пасцелю і павезлі ўжо к жаніху, а назаўтра ўжо свадзьбу гуляюць ужо ў яго, у жаніха.

Хваты ніколі не надзявалі, а былі проста ў платку.

Вянчанне

Я калісь вянчалась, дык у валенках была. Кольцы адзявалі, калі бацюшка спрашвае, ці сагласны. Тады ўжэ бяруць тыя кольца. Яго кальцо ён ёй надзяе, а яе кальцо яна яму надзявае – мяняюцца.

Едуць да вянца

Ужэ калі едуць ад вянца, становяць дзяжу. Саджаюць маладых на кажух, штоб багатыя былі.

Дзялілі каравай

Каравай дзяліў сват, можна было і два свата: адзін носіць, другой дзеліць. Вярхушку прыказвалі зрэзаць і аддаць малым дзецям, штоб маладыя не бралі, не елі. Свайго караваю шоб не бралі. Шчытаюць старыя так, што е ўсякая слава, е ўсякія людзі. Можа хто на каравай жадае шчасця, а другія – не, дык вот не бяры свайго каравая.

Як калі спраўлялі: пагулялі сёння, пагулялі назаўтра, а е так, хто справіліся і там пагулялі ды і гатова, прайшла свадзьба.

У старое врэмя маладых на свадзьбу не пускалі, а цяпер і іх саджаюць за стол. А калісь толькі старыя гулялі, а маладыя самі сабе ўжэ дзе-нібудзь прытуляцца да і гуляюць.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н. (раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Хадзілі ў сваты. Адзяюць маладую, калі прыязджаюць сваты. Яе хавалі, каб не бачылі маладую. Дзеўку маладую дзяўчаты закрывалі, а хлопцы павінны ўжо даваць выкуп: гарэлку, канфеткі давалі. Тады ўжо маладую выкупяць, а тады ўжо глядзі, каб тухфель не ўкралі. А як украдуць тухфель, тады ўжо шафер должэн выкупляць. У цэркву ехалі на конях. Маладая едзе ўперадзе на конях, а тады малады. А калі ўжо павянчаліся, то ўжо ехалі на адным каню. Тады каталіся па дзярэўні. Мы дык паездзілі вакруг вярбы (вярба стаяла пасярэдзіне). Як прыехалі, то злазілі маладыя, а бацька і матка ідуць сустракаць маладых з іконай, тарэлкай, хлебам, соллю. Паздраўляюць, штоб добра жылі і грошы вадзіліся. Тры чаркі выпівалі, а трэцюю разбівалі. А хіба тры вып'еш, выльеш за плечы. Гулялі тры дні. Дзень – у маладой, тады – у маладога, а тады ўжо курэй ездзіш збіраеш. Вось колькі было гасцей, столькі бралі і курэй. Цаплялі на палку, украшалі, лентачку вешалі. Называлася «куры».

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Каўтуновай Юліі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Ажаніла маці маладога сына,
Маладу нявесту ана не ўзлюбіла.
Выпраўляла маці ў поле лёну браці,
Не ўбярэш лёну, не ідзі дадому,
Ана брала, ана брала,
Трохі не дабрала,
І ў чыстым полі таполяю стала.
Вот праходзіць годзік і другой канчае,
На парозе сына маці ўстрачае.
Ой, маці, ты маці, што й гэта за навіна,
Што ў нашым полі стаіць тапаліна?
Не пытайся, сынку, пра гэту навінку,
Бяры тапарочак, зрубай тапалінку.
Рубануў адзін раз – ана пашатнулась,
Рубануў другі раз – ана загаварыла:
– Не рубі ты, Яська, я – твая Паліна,
– Развярні лісточкі, там твая дзяціна.
Ой, маці, ты маці, што ж ты нарабіла,
А мы так кахалі, а ты пагубіла.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Лявоненка Феафаніі Трафімаўны, 1917 г. н., 2002 г.

У першы дзень, помню, песні добрыя пелі, прыгожа, а ў другі дзень – ужо абы як. Каравай, канешне, быў. Прыказваюць там ужо хто таку прыказку, хто таку прыказку. Інцерэсна было. Ужо жалаюць усяго.

У нас во адзін мужык быў, ужо памер, дык смяяліся ўсе з яго, такі шутлівы быў, дык ён ужо жалаў:

– Калі будзеце ругацца між сабой там, дык накрывайцеся падушкамі з адзеялам, каб мухі не слыхалі, бо будуць сплетні расходзіцца па ўсёй дзярэўне.

Маладую выкупалі. Юнакі з дзеўкамі ідуць ужо да нявесты ў хату. У нас жа малады жыве на адной, а нявеста – на другой вуліцы. Сватам крычаць:

Пусці, пусці, сваце, у хату,
Тут нас не багата.
Чацвёра ды пяцёра, ды ўсе дзевяцёра.
Пусці хаця ручкі пагрэці,
Маладу паглядзеці.

Ды ўсё гавораць, а іх ужо ў хату пусцяць, нявесту схаваюць. І просяць, каб плацілі. Малады ўжо знае, што дзеньгі нада плаціць. А дружкі ўсе крычаць: «Ой, мала, мала. Нада больша».

Малады ўжо бутылку ставіць і гаворыць: «Дык хваціць вам ужо. І дзенег далі, і бутылку паставілі, а вы ўсё просіце яшчэ». Ну, гэта ж шутка. Всегда-всегда шуцілі ж мы. Калі ехалі па дарозе, таксама песні пелі, дрэнна, што я не помню іх ужо.

«Ворагі, ворагі, не пераходзьце дарогі, няхай пярэйдзе..., каб было ўсё шчасліва», – гэтак гаварылі, калі ўжо за маладой ехалі.

Калі яшчэ каравай дзялілі, шуцілі, калі хто не прыйшоў: «Дзядзькі, цёткі, дзе вы? Ці вы па грыбы пайшлі?»

Калі цёшча прыязжае, нібы з голай дарогі, дык ужо зяць купляе тухлі, плацце. На вуліцы ўжо гармошка грала, танцуюць усе, а маладую адзяюць. Ужо прынясуць тухлі тыя, адзяюць. Яшчэ, каб зяць прыйшоў, цёшча на печку лезе, чакае, а потым гаворыць:

– Прынясі мне чобаты на печку,
Прынясі за дачку...

Гэта, каб яна ўжо дачку аддала.

За ўсе хлопаты
Нарабілі плоха вы мне.
А зяць мне чобаты даў,
А потым дачку маю ўзяў.

Ужо адзяюць тую цёшчу – плацце новае, тухлі новыя. Ужо яна танцуе так. На ўліцы ўжо танцавалі, бо добра так было. Гармошка грала, пад гармошку танцавалі. Цёшча яшчэ прыбяднялася, каб падаркі палучыць: «Няма ва што ўжо абуцца мне». Шуцілі так. А зяць: «Я ж табе купіў – ідзі, адзявайся, будзем гуляць, піць, танцаваць».

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Агалец Тамары Карпаўны, 1930 г. н.

Заручыны

Прыходзілі ў сваты бацька і маці, жаніх, хлопцы-шаферы. Маладая звала дзевак-шаферак. Калі сваты заходзілі ў хату, яны гаварылі: «Добры вечар вам! Ці ёсць у вас цёлачка? Мы свайго бычка к вашай цёлачцы прывялі». Калі дзяўчына была сагласна, яна выносіла сватам хлеб-соль. Сватоў садзілі на першы стол, у кут, а маладых за апошні стол, у парозе. Дамаўляліся на заручынах аб вяселлі, аб пасаду, пелі песні:

Як пойдзем на заручыны,
А там дзверы закручаны.
Пакуль дзверы адкруцілі,
А ўжо (імя дзяўчыны) заручылі.

Вясельная частка

У суботу пеклі каравай. Пекла каравай матка. Пачыналі гуляць вяселле ў нядзелю. Жаніх прыязджае за нявестай разам з шаферамі і прывозіць бутылку, перавязаную лентай. Нявесту хавалі ў пярэднюю хату, а жаніх разам з першым шаферам выкупваў яе. Потым жаніх забіраў нявесту і ехаў у цэркаў. Пасля вянчання маладыя едуць да маладой. Там іх сустракаюць бацька і маці з іконай, хлебам-соллю. Яны перавязваюць маладым рукі палаценцам. Маладой даюць хлеб, маладому ікону. Потым маладых садзяць за стол на перавернуты кажух. Гуляюць, танцуюць, спяваюць песні:

Кацілася ігрушачка із-за гор'я,
Прасцілася Манечка із застолля:
– Пусці, пусці, Ванечка, пагуляці,
У сенечках на дзверачках настаялась.

Ой, не жаласлівы сударбацюшка
Да мяне, да мяне.
Аддае ён мяне, маладзенькую,
Ад сябе, ад сябе.
А каму ж я свае цвяты алыя
Прыкажу, прыкажу.
Прыкажу ж я свае цвяты алыя
Маменьке, маменьке.
Уставай жа, мая родна маменька,
Раненька, раненька.
Палівай жа мае цвяты алыя
Часценька, часценька,
Слязою, слязою.

– На каго ж ты, Манечка, планавала,
Ой, якога ты сабе негадзяя спадабала.
Ці ты будзеш у полачцы спавіваці?
Ці ты будзеш у люлечцы калыхаці?
У полачцы спавіваці – полкі падзярэ,
У люльцы калыхаці – вожачкі парве.
Ой, дзевачкі-галубачкі, куда ж вы ідзяце,
Чаму ж мае Манечкі ўслед не ведзяце?
– Хадзем, хадзем, Манечка, услед за намі,
Саўём табе два вяночкі, усе з цвятамі.
– Ой, дзевачкі-галубачкі, зачэм мне вянок?
Ёсць у мяне Ванечка, ясны сакалок.

У канцы вечара дзялілі каравай. Выходзілі сваты і гаварылі: «Ці ёсць у нашых маладых ацец і маць, благаславіце каравай раздаць». Бацька і матка атвячаюць: «Бог благаславіць». І так тры разы. Выходзілі ўсе і дарылі падарункі, віншавалі:

Дарую маладым грошы,
Каб малады быў харошы.
Дарую маладым грошы,
Штоб купілі гектар жыта.
А вы, маладыя, хочаце жніце, хочаце не жніце,
А ў бабы мяне вазьміце.
Дарую маладой каробачку жучкоў,
Каб маладая не любіла чужых мужычкоў.

Калі маладым нада было ад'язджаць, маці маладога знімала з маладой вянок і павязвала на галаву хустку.

У доме маладога маладых сустракаюць бацька і маці з іконай. Маладыя кланяліся ім. Начавалі маладыя ў клецях.

Другі дзень гулялі ў маладога. Тожа каравай дзялілі.

Папялішча

На трэці дзень, зраніцы, госці перадзяваліся і хадзілі па дварах, сабіралі курэй. А вечарам сабіраліся ўжэ ў госці. Таксама перадзяваліся. У канцы вечара на жываце бацькі маладога білі гаршчок з попелам, што сімвалізавала канец вяселля.

У другое васкрасенне пасля вяселля прыязджалі маладыя к бацькам маладой і прыглашалі на гулянне. Гулялі ў бацькоў маладога.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Драмач Ірыны Яфрэмаўны, 1932 г. н., 2004 г.

Сваты

Спачатку ішлі ў сваты. У сваты ішлі ў суботу вечарам, каб ніхто не ведаў, бо было б саромна, калі дзеўка адмовіць. Зайшоўшы ў хату, сваты здароваліся з гаспадарамі і гаварылі: «Ці не прадаецца ў вас цялушка?» Ім адказвалі: «Ёсць у нас цялушка, ёсць і дзяўчушка». Сваты: «А ў нас хлопец ёсць. Ці не пажаніць нам іх?»

Гаварылі ці так, ці хто як умеў. Потым ставілі бутылку на стол і ежу і дамаўляліся, калі гуляць вяселле.

А нявеста не паказвалася. А калі бацькі ўжо дагаварыліся, то толькі тады выводзілі маладуху паказаць. І песню спявалі:

Ніхто нічога не ведаў,
Куды Міцечка наш паехаў.
Стукнула, грукнула на дварэ.
– Выйдзі, мамачка, паглядзі, ці не па мяне?
– Па цябе, дочачка, па цябе.
– Гатуй, мамачка, кубел мне.
–Едзь, мая донька, без кубла,
Ты маёй кудзелькі не скубла.
– А я скубла, скубла, шчэй хацела,
А за такога негадзяя замуж не хацела.

А калі бацькі не хацелі выдаваць дзеўку замуж, то выкочвалі сватам пад ногі гарбузу. Потым праз некалькі дзён, калі яшчэ не перадумалі гуляць вяселле, збіраюцца ўсе тыя, хто будуць гуляць вяселле з боку маладой на магарычы. Там прысутнічаюць і сваты. Вып'юць людзі, паядзяць, Богу памолюцца і расходзяцца. А бацькі маладых на магарычах ужо канчаткова дамаўляюцца аб вяселлі.

Потым ужо гулялі вяселле. Звянчаюцца ў царкве маладыя, прыедуць, бацька з маці маладых благаслаўляць. Абавязкова бацькі дараць маладым ікону і даюць чаркі з гарэлкай, якую трэба выпіць, а чаркі разбіць. Калі чарка не разаб'ецца, то дрэнна будуць жыць. Разбіваць чарку трэба не пад ногі, гэта значыць – шчасце пад ногі, а праз плячо.

Потым усе садзяцца за стол. Маладых садзяць у куце на шубу, каб багатыя былі. А людзі гуляюць, песні пяюць, танцуюць.

Ой, каму ж я свае цвяты алыя прыкажу?
Прыкажу ж я свае цвяты алыя роднай мамцы,
Палівай жа мае цвяты алыя раненька,
Шчэ й утранняй і вячэрняй зарою,
Шчэ й утранняй і вячэрняй слязою.

Гарманіста на вяселлі вельмі паважалі: садзілі на добрую падушку, частавалі самым смачным, што было на стале.

Дзяльба каравая

Калі дзялілі каравай, то сярэдзіну давалі маладым, каб іх жыццё было такім жа мяккім.

Перад тым, як пачаць дзяліць каравай, сваты пытаюцца дазволу ў бацькоў: «Ацец і маць, разрашыце каравай раздаць». Пасля дазволу сваты пачынаюць вызываць гасцей на каравай: «Дзе б вы ні былі, а каб к нам на каравай прыбылі і што-небудзь падаравалі». Госці ў адказ дарылі нешта і пры гэтым гаварылі:

Дару вам грошаў, каб былі харошы.
Дару вам медзі, каб былі дзеці-мядзведзі.
Дару каробачку жаб, каб малады не любіў чужых баб,
А маладой – павучкоў, каб не любіла чужых мужычкоў.
Сколькі ў полі кочак, столькі вам і дочак.
Сколькі ў лесе пянькоў, столькі вам і сынкоў.

Зборы да маладога

Пасля караваю яшчэ трохі пагуляюць і збіраюцца ехаць да маладога.

Выйдзі, мамачка, з свячамі,
Ужо ж тваю дачку звянчалі.
Выйдзі, мамачка, паглядзі,
Каго ад цябе павязлі.

Дружкі маладой развітваюцца з ёй, жадаюць шчасця і вельмі шмат спяваюць:

Заграбай, мамачка, жар,
Будзе табе донькі жаль.

У маладога

Прыехаўшы к маладому, брат маладой расплятае ёй касу і закручвае гулю. Разам з маладой прывозяць і сундук з дабром. Усё, што ёсць у ім, развешваюць, раскладваюць. Усе людзі з вёскі прыходзяць і глядзяць, якая маладая.

Другі дзень вяселля

На другі дзень вяселля гуляюць ужо ў маладога. Усё так жа гуляюць, як і ў першы дзень, толькі маладая за сталом сядзіць ужо ў хустцы. Але ўсё роўна весела ўсім.

Насадзілі чарнабрыўцаў цэлую граду.
Вы расціце, чарнабрыўцы, не буяйце,
Вы не ідзіце, дзеўкі, замуж, шчэ й пагуляйце.

Трэці дзень вяселля

Трэці дзень вяселля называецца «збіраць курэй». Нехта з гасцей пераапранаўся ў маладых, хадзілі па вёсцы, спявалі песні, хвалілі маладых, жадалі ўсім шчасця і багацця. Абавязкова гэтыя маладыя павінны былі зайсці ў хату к тым, хто гуляў вяселле, і запрасіць іх на вячэру. Гаспадары хаты абавязкова абяцалі прыйсці і давалі куру ці пеўня. Назбіраўшы добрых курэй, маладыя ішлі да маладога і аддавалі курэй.

Вечарам госці ішлі на вячэру, дзе было шмат ежы з курацины. Але госці ішлі не з пустымі рукамі, а кожны прыносіў ці бутэльку, ці нешта з ежы. Потым садзіліся за стол, шмат спявалі, жартавалі. У гэты дзень каравай ужо не дзялілі.

Бацька маладога стараўся не паказвацца ў хаце. Аднак яго ўсё роўна нехта з гасцей лавіў і прыводзіў у хату. У хаце бацьку маладога клалі на стол і ў яго на жываце разбівалі гаршчок з сажай, каб шчасце і багацце заўсёды было ў хаце маладых. Было так, што бацьку і маці маладога прымушалі выконваць ролю маладых, але вельмі-вельмі рэдка. У гэты дзень ужо доўга не гулялі.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Цукаравай Феафаніі Іванаўны, 1931 г. н., 1996 г.

Зборная субота

Ці я цябе, татачка, не дзяціна,
Што ты мяне процію ночкі да шлеш прочкі.
А дай жа мне, татачка, праваднічку,
А якога праваднічку – салавейку.
Салавейка – ранняя пташка будзе шчабятаць,
Будзе мяне, маладую, рана пабуждаць,
Бо свякруха – чужая маці не пабудзіць,
А як выйдзе за вароты, дак абсудзіць.
Санлівае, драмлівае чужое дзіця,
На работу лянівая нявеста мая.

Сядзь жа, мамка, павячэраем,
Павячэраўшы – падзелімся.
Табе, мамка, пасталы і аборы,
А мне кладзі ўсякія прыборы.
Табе, мамка, ніты і бердзечка,
А мне, мамка, палаценечка.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Такарэнка Лідзіі Антонаўны, 1932 г. н., 1992 г.

ВЯСЕЛЬНАЯ ПЕСНЯ

Звінела каморачка, звінела,
Звінела каморачка, звінела,
Дзе маладая Ганначка сядзела.
Прыйшоў яе ойчанька ў каморку,
Упала яна ойчаньку ў ногі.

– Не аддавай, ойчанька, ты мяне,
– Наехалі госці цябе ўзяці.
– Пусці іх конічанькі ў вішнёў сад,
Нехай маю рутаньку пабродзяць.
Зелёная рутанька, жоўты цвет,
Чаму цябе, міленькі, доўга нет?
Прыедзь, прыедзь, міленькі, з граблямі,
Зграбі маю рутаньку з камлямі.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Верамеенка Ганны Паўлаўны, 1930 г. н., 1994 г.

Вышла девчина наплаканная,
Наверно, девчина засватанная.
Вышла девчина платки раздавать,
А мне, молодому, разлуку давать.
Вышла девчина платки раздавать,
А мне, молодому, разлуку давать.

Запісана ў в. Новая Баршчоўка (раней Баршчоўка) Лоеўскага р-на
ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1937 г. н., 2001 г.

Калі ішлі ў сваты да маладой, то прама так не гаварылі аб прычыне свайго прыходу. Гаварылі заблытанымі словамі, а ўжо родныя маладой павінны былі дагадацца. Гаварылі тыпу:

– Наш галубочак пацяраў сваю галубку ды не можа знайсці. Вось прыйшлі да вас, можа, у вас найдзём.

– У нас ёсць красны малодчык. А ў вас, людзі казалі, ёсць красна маладзіца. Мы прыйшлі да вас свайго маладца паказаць, на вашу маладзіцу паглядзець.

А радзіцелькі могуць пачаць гаварыць, што ета не ў іх маладзіца красна, а ў суседзяў. А іхняя маладзіца не ўрадзілася, і яна будзе сцясняцца людзям паказацца. Але сваты настойваюць і бацькі запрашаюць іх да стала.

У сваты ў нас ішлі жаніх, яго матка, бацька, хросны і хросная. Ето як дзе. У некаторых местах ў сваты ішлі і друзья маладога альбо яго сёстры і брацця. Калі бацькі пагавораць з сватамі, яны завуць маладую. Маладая дорыць сватоў ручнікамі і перавязвае іх гэтымі ручнікамі. Калі дзеўка не згодна, то яна можа выйсці ў кажуху навыварат. Сваты абавязкова прыносілі бутылку, перавязаную краснай лентай. Красная лента, як красная дзеўка. У нас песні не спявалі.

Напярэдадні вяселля да маладой прыходзяць яе падружкі. Яны спяваюць песні і нараджаюць маладую. Яе садзяць на вывернуты кажух або падушку і заплятаюць касу. Потым маладая ходзіць з сяброўкамі па дварах і запрашае ўсіх, каго захоча, на вяселле. І ўжо тады ўсе выбягаюць і глядзяць на маладую. Потым ідуць у дом маладой, распранаюць яе і тожэ спяваюць песні.

Ужо ў дзень свадзьбы жаніх з дружкамі едуць за маладой. Перад дзвярмі стаяць хросная з дзеўкамі і не пускаюць жаніха з дружкамі ў хату. Тады жаніх пачынае выкупаць маладую. А хросная таргуецца з ім. Жаніх плоціць ёй грошы, а дзеўкі выводзяць яму маладую. Але гэта ненастаяшчая маладая, а яе сяброўка. Тады малады кажа, што гэта не яго нявеста. Тады яму выводзяць другую дзеўку. І так адбываецца, пакуль жаніху не вывядуць настаяшчую нявесту. Потым маладыя

едуць у сельсавет. Гэта раней так, а зараз у ЗАГС. А ў нас у сельсавеце загадвалі нявесце складваць мужчынскую рубашку, а жаніху – запеленаць ляльку.

Пасля сельсавета ўсе едуць да маладой. Дома іх сустракае маці з хлебам і соллю. Маладыя кусаюць гэты хлеб. І хто больш укусе, той і будзе галавою сям'і. Гэта і зараз так ёсць. Маладых садзяць на покуце на вывернуты кажух, каб у іх быў у сям'і дастатак, каб добра жылі.

Потым прыносяць каравай і нявеста дае па куску ўсім родзічам – сваім і жаніховым. Усе пачынаюць дарыць маладых. Маладую могуць у гэты час схаваць. А жаніх ходзіць і шукае яе. Калі не знойдзе, то павінен зноў выкупляць. Таксама ў маладой могуць украсць туфель, а жаніх павінен і яго выкупляць. Увес час на вяселлі спяваюць песні тыпу:

Ой, хацела мяне маці
Ды за першага аддаці,
А той первы да няверны,
Ой, не аддай мяне, маці!

Калі маладыя пачынаюць збірацца ехаць да жаніха, маладая можа пачаць плакаць як бы па сваёй дзявочай жызні. Бацькі нявесты кладуць у воз жаніха прыданае сваёй дачкі. Маці бярэ ікону і бласлаўляе ею маладых. Калі яны ідуць да воза, то іх можа маці абсыпаць свячоным макам з грошамі, каб багата жылі.

Калі маладыя прыязджаюць да жаніха, на пароге іх сустракаюць бацькі жаніха, таксама з хлебам і соллю. Маладая дарыць іх падарункамі. І ўжо тут п'юць і гуляюць да вечара. Пяюць песні розныя.

А ўвечары маці жаніха падходзе к нявесце, знімае з яе фату, расплятае ёй касу і надзявае на яе платок. І з гэтага часу нявеста без платка не ходзіць і з касой тожэ, бо яна ўжо жанчына.

Свадзьбу гуляюць два дні. А трэці дзень называюць «куры». Усе збіраюцца ў хаце, дзе гулялі вяселле. Звычайна збіраецца моладзь. Яны выбіраюць сабе нявесту (ненастаяшчую), апранаюць яе. Могуць выбраць і хлопца на месца нявесты, выбіраюць і жаніха. Усе астатнія наражаюцца хто цыганамі, хто кім. І выходзяць на вуліцу вёскі. Яны ходзяць па ўліцэ і ловяць курэй. Але на ето ніхто не абіжаецца, бо знаюць гэты звычай. Гэтых курэй б'юць, шчыпаюць і вараць. І таксама п'юць і гуляюць да вечара. А маладыя тут ужо не як маладыя, а як госці.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на ад Ліцвінавай Ніны Сяргееўны, 1940 г. н.

Сваты

Гуляюць дзеўка з хлопцам год ці два. Тады ўжэ бацькі хлопца ідуць у сваты. Хадзілі ўвечары пасля заходу сонца. Прыходзілі сват, сваха, жаніх, радзіцелі. Ну, гаварылі тады так: «Прыйшлі сватаць вашу дзеўку». Дагаворваліся нашчот свадзьбы, як дзеўка і радзіцелі былі сагласны. А калі не, то гарбузу вараную давалі сватам. А то ішчэ было такое: каб выгнаць сватоў, дзеўка брала дзяркач і начынала падмятаць хату.

Калі дзеўка згодна была, то гарэлку налівалі сватам, выпівалі.

Заручыны

Пасля сватоў ладзілі заручыны. Прыязжалі зноў сваты і жаніх. Тады ўжэ стол накрывалі. Усякія стравы ставілі і гарэлку. Садзіліся за стол усе. Кальцо жаніх

у еты раз не прыносіў з сабой. Ета было ўжэ, калі вянчаліся. Падаркаў ніякіх тожа не дарылі.

На заручынах дагаварываліся ўжэ аб свадзьбе. Рашалі, хто што будзе гатовіць, колькі гасцей зваць.

Зборная субота

Ужэ ў паследні дзень перад свадзьбай, у суботу, да хаты дзеўкі збіраліся падругі яе, а да хаты хлопца – друзья. Падругі рабілі разам з нявестай кветачкі з бумагі ці з мацерыі (хто багацейшы быў).

Раней жа ездзілі пад вянец на конях, дык убіралі воз, каня лентамі і кветачкамі. Прымервалі нявесце плацце ў той дзень. Жаніх у паследні дзень са сваімі хлопцамі ладзілі вазы, коней чысцілі.

А пад вечар ужэ жаніх ехаў да нявесты. У хаце дзеўкі іх саджалі на кут. Пад абразамі слалі кажух уверх шэрсцю, каб пазней муж і жонка багатыя былі. Нявесце падругі яе расчосвалі косы, падсмальвалі трохі і тады запляталі ў касу. Калі жаніх прыехаў ужэ дадому, то бацька браў яго і вёў у хату. Там абводзіў тры разы вакол стала. Послі етага жаніх цалаваўся з радзіцелямі. Чаго абводзілі, не знаю, так трэба было. Перад вянцом вакол стала абводзілі ўжэ і жаніха, і нявесту разам.

Каравай

Каравай пяклі з двух бакоў: і з боку маладога, і з боку маладой. Пеклі абычна маткі. А калі ў тых не палучалася добра, то яшчэ прыводзілі тых маладзіц, якія добра пеклі. Звалі з тых сямей, дзе добра жылі, каб каравай атрымаўся добры. Саджалі еты каравай у печ на кляновыя лісты. А калі ён быў ужэ спечаны, даставалі так, каб не паламаўся, бо то жызня маладых паламаецца. Было, што і печ разбіралі, калі каравай быў вельмі вялікі і не пралазіў.

Вянчанне

Послі заручын была і свадзьба. Праз тыдзень ездзілі пад вянец. Нявеста брала з сабой чатырох дружак, а жаніх – двух шафераў. Калі ўжэ бацюшка вянчаў, то дружка дзяржыць вянец над галавой нявесты, а шафер над галавой жаніха. Кольцамі абменьваліся, калі вянчаліся. Падчас вянчання малады з маладой дзяржалі ў руках свечкі запаленыя. Вельмі баяліся, каб етыя свечкі не патухлі. Калі агонь патушыцца, то той, у каго патухла, доўга жыць не будзе і скора памрэ.

Як жаніх з нявестай ехалі да вянца, то ім людзі дарогу перагароджвалі. Патрэбна было даць етым людзям выкуп. Давалі грошы, гарэлку налівалі, канфеткі. Калі нявеста ад'язджала да вянца, то яна галасіла па матцы і бацьку.

У маладога

Пасля вянца прыехалі к жаніху. На парозе іх устрачалі матка і бацька жаніха. Матка выходзіла з тарэлкай, якая была пакрыта рушніком. На тарэлцы етай ужэ стаіць хлеб і вада. Бацька нёс ікону. Маладыя злазілі з ваза, цалавалі матку і бацьку. Тады ішлі ў хату. Нявеста, як прыязжала к маладому і первы раз пасля вянчання ішла ў хату, астанаўлівалась на парозе і сама сабе гаварыла: «Ваша хата, ваша печ, маё слова, мая рэч». Рабіла яна ета ўціхую ад усіх, каб ніхто не чуў.

Як павянчаліся, то і свадзьбу ўжэ гулялі. Первыя два дні ў жаніха гулялі, а трэці ўжэ ў хаце нявесты.

Дзяльба каравая

Каравай дзялілі маладыя. Жаніхоў каравай быў для родзічаў яго, а нявесцін – для яе радні. Пры дзяльбе караваю госці дарылі маладым падаркі, грошы клалі. А тады малады наліваў гарэлку, а маладая клала каравай. У еты час гаварылі і пажаланні маладым:

Дару палена, каб жаніх пацалаваў нявесце калена.
Дару нявесце галлё бярозы, каб муж усягда прыходзіў дадому цвярозы.
Дару вам грошы, каб дзеткі вашы былі харошы.

А тады ўжэ гулялі з рання да вечара. Елі, пілі гарэлку, песні пелі. Хвалілі ў песнях жаніха і нявесту. На трэці дзень гулялі ў доме нявесты. А тады ўжэ забіралі нявесту і везлі да дому жаніха. У жаніховай хаце і жылі. За сталом усялякія песні пелі, хвалілі маладога з маладой, радзіцеляў іхніх.

Ужэ на дварэ змяркае,
А Іванка Ганначку піхае,
А Іванка Ганначку піхае:
Едзьма ж, Ганначка, дахаты,
Да не заязджайма да ні к кому.
Да не заязджайма да ні к кому,
Ні к майму роду, ні к твайму,
Ні к майму роду, ні к твайму,
Толькі заедзьма к аднаму.
Толькі заедзьма к аднаму,
К майму ж бацьку роднаму,
К майму бацьку роднаму,
Там у яго хата прыбрана.
Там у яго хата прыбрана,
Там у яго пасцелька заслана,
Там у яго пасцелька заслана.
Прыбрала хату залавіца,
Прыбрала хату залавіца,
Заслала пасцельку сястрыца.

Етую песню пелі, калі ўжэ вечар быў, перад тым, як маладыя спаць ішлі. І такую пелі за сталом, ета ўжэ калі з вянца прыехалі.

Дзякуй, дзякуй, мая мамачка,
На твой род.
Чаго мяне не падзяржала
Ішчэ год,
Чаго мяне не падзяржала
Ішчэ год?
Ой, хай жа ба я русу косачку
Часала,
Ох, хай жа ба я русу косачку
Часала,
Няхай жа ба я ішчэ з гадок
Гуляла.

На заручынах пелі такую песню:

Прапіў бацька дочку
На салодкім мядочку,

Ай, на белай тарэлцы,
Ай, на белай тарэлцы,
Ай, на горкай гарэлцы.
Ай, напіўшыся, скача,
Ай, напіўшыся, скача,
А праспаўшыся, плача,
А праспаўшыся, плача:
Куды ж маё дзіцятачка пайшло?
А ці ў лес па ягады,
А ці ў лес па ягады?
Ай, ці ў калодзеж па вадзіцу?
Свашачка, свашачка,
Мая ты мамачка,
Глядзі ж маё дзіцятачка.
Як засваталі ды заручылі,
Казалі кароў многа.
Як пайшлі даіць –
Адзін бык стаіць,
Ды й той дрыжыць.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Анікеенка Марыі Маркаўны, 1913 г. н., 2003 г.

Замуж нам можна было толькі ў васемнаццаць гадоў, але ж я выйшла ў пятнаццаць, без ведама бацькоў. Збіралі ў каго-небудзь дома дзевак, падружак, рабілі застолле, выпівалі, прыходзілі хлопцы і як бы выбіралі сабе дзеўку, якая панравіцца. І так хадзілі некалькі нядзель, пасля чаго хлопец прыходзіў к дзеўцы і к яе бацькам і казаў: «Буду браць вашу дачку». На чацвёртай нядзелі – роспісь, устраівалі гулянне, бацькі абгаварвалі ўсё наконт дзяцей. Пасля роспісі вянчаліся.

Падарункі

Запальвалі свечкі, калі аднаразова патухнуць, то ўмесце доўга будуць. Пажаданні былі на вяселлі:

Дарым скамеечку, на другі год – семечка.
Дару хлеб і сала, каб была слава.
Дарую каробачку жаб, каб не глядзеў на другіх баб.

Гасцям раздавалі гарбузныя семкі, пасля пелі песні:

Пад'язджаем пад сяло,
Іграй, дудачка, весяло.
Дудачка іграла,
З кім ты, Галячка, гуляла?
Гуляла з казаком,
Ажанілася з панічом.

Каравай дзялілі: адразалі верхнюю частку і аддавалі маладым, астатнюю рэзалі на кубікі, аддавалі спачатку хросным, затым усім астатнім. Клалі на каравай капейкі. На свёкраў кажух садзілі маладых.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Панцелеймонавай Ганны Сяргееўны, 1939 г. н., 2005 г.

Бяруць сватоў, также бралі дзве ці тры бутылкі гарэлкі, завязвалі красную ленту і тады ўжо ішлі к дзеўкі, якую сватаць сабраліся. Прыходзілі і казалі: «Ці не прадаецца цёлка, мы хочам харошую цёлку купіць». Затым пачынаюць таргавацца. Калі пратаргаваліся, завуць хросных з хлебам і соллю. У другую нядзелю гуляюць заручыны, пасля чаго вянчаюцца ў царкве. Потым шлі к маладой, заўтракалі – і к вянцу, ну, а пасля вянца шлі к маладому.

Ідуць у баяры. Замотвалі маладую векам з дзяжы, затым надзяваюць на галаву чапец. Назаўтра свадзьба. Скрыню маладой нясуць да маладога. Куру смалілі ў агні, і праз гэты агонь пераскоквалі. Калі жыццё не зладзілася ў маладых, то маладая бярэ хлеб і нясе маладому, пасля чаго разыходзяцца. Калі кладуцца ў пасцель маладыя і маладая аказваецца не цнатлівая, то адзявалі ёй на голаву хамут і выганялі.

Яшчэ былі шуткі ў нас такія, калі госці хацелі, каб гулянне свадзьбы прадаўжалась. Прыходзілі к маладой, кідалі вяроўку на камін і перавярнуць як бы стараліся. Выкуп патрабавалі. Каб камін не чапалі, маладая выносіла бутылку.

Каравай быў учынены на вадзе і на дражджах. Верх яго адразалі і маладым аддавалі. Замест грошаў і падарункаў клалі аржаны хлеб на талерку і тады бралі каравай.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Грыб Ганны Якаўлеўны, 1923 г. н., 2005 г.

У СУБОТУ – ДЗЕНЬ ВЯСЁЛЫ

У суботу, дзень вясёлы, нельзя ў полі работаць.
Эх! Нельзя ў полі работаць.
Пойдзем, дзеўка, пойдзем, красна,
Ва зялёны сад гуляці,
Эх! Ва зялёны сад гуляці.
Ва зялёненькім садочку салавейка шчабятаў,
Эх! Салавейка шчабятаў.
Салавей, саловушка,
Чаго не смуцён, галоўку павесіў,
Песню не паёш, песню не паёш?
Спяваў бы я песенку, да голасу нету,
Другое лецечка ссушыла мяне,
Маладая дзевачка ў саду гуляла.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Анікеенкі Арцёма Міхайлавіча, 1911 г. н., 2001 г.

Стукнула, грукнула ва дварэ,
Ці не па цябе ж, донечка, па цябе?
Па мяне ж, мамачка, па мяне,
Гатуй жа кублік мне.
Едзь жа, мая донечка, без кубла,
Бо ты ж мне кудзелькі не скубла.
А я, мамачка, скубла,
Ды мяне ахота не брала. Ух!
Шаснулі конікі паўз акно,
Ці не па цябе, донечка, па цябе?

Каравайнічкі п'яны, усё цеста пакралі,
Хто ў мех, хто ў кішэню –
Маладым на вячэру.
Кучаравы печ вымятае,
А ўсё цеста пакралі,
Хто ў мех, хто ў кішэню –
Маладым на вячэру.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Анікеенкі Ларывона Міхайлавіча, 2001 г.

СІРОЦКАЯ ПЕСНЯ

Стаіць адзінока дзяўчонка лет 8
І ціха па-дзецкі слава гаварыць:
– Туманы, туманы, вярніце мне маму,
Вярніце мне маму, прашу аб адном.
Адна ўмерла ты, мне была 3 года,
З цех пор на магілу нашу я цвяты,
З цех пор мяне, мама, ніхто не цалуе,
Ніхто не ласкае так нежна, як ты.
Туманы густыя праплылі над намі,
А я на магіле стаю не адна,
Цвяты паліваю сваімі слязамі,
Навернае, з дзецтва такая судзьба.
Туманы сядыя праплылі над намі,
Туманы не слышаць сіроткі слава,
Услыш мяне, мама, услыш,
Как рыдае дачушка твая.
Стаіць адзінока дзяўчонка лет 8,
І ціха па-дзецкі слава гаварыць:
– Туманы, туманы, вярніце мне маму,
Чаго ж мая мама ка мне не ідзёт.
Любіце, вы, маму, ласкайце, вы, маму,
А маміну ласку вы знайце ўсе.
Умрот ваша мама, тагда вы паймёце,
За золата маму не купіш нігдзе.
Умрот ваша мама, тагда вы паймёце,
За золата маму не купіш нігдзе.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Лявоненка Феафаніі Трафімаўны, 1927 г. н., 2002 г.

ПАЖАДАННІ НА ВЯСЕЛЛІ

Дару гаршчок гліны, каб кажны год былі хрысціны.
Дару гаршчок медзі, каб маладыя былі здаровыя, як мядзведзі.
Дару пару галубоў, каб у маладых была добрая любоў.
Дару вам грошы, каб былі вы харошы.
Дару вам палена, а на ім сучок, каб у вас радзіўся маленькі сынок.
Дару вам палена, каб малады маладую пацалаваў у калена.
Дару вам ветку бярозы, каб малады быў усё ўрэмя цвярозы.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Волкава Андрэя Фёдаравіча, 1942 г. н., 1992 г.

Сваталі ў рознае время і ў пост нават хадзілі. У асноўным у сваты хадзілі хросныя бацька і маці, чалавек, якога бралі за свата, жаніх. Зашоўшы ў хату, казалі: «Чулі, у вас цёлачка добрая е, прыгожая, працавітая, шчырая. Дык у нас вось бычок-мужычок удалы, працавіты ды і красавец. Дык як нам вось іх спарыць? Ці згодна ваша цялушка?» Дзяўчына выходзіла і прымала ад хроснага жаніха хлеб. Тады садзіліся за стол, гаспадары частавалі сватоў, пелі песні. Перад уходам назначалі дзень свадзьбы.

Вяселле гулялі ў дзень свята. Падружкі наражалі нявесту ў святочнае плацце. На галаве абавязкова павінен быў быць вянок – сімвал доўгай жыццёвай дарогі. Жаніх прыязжаў з хлопцамі да нявесты, даваў падарунак маці, такім чынам як бы палучаў дазвол да рукі нявесты. Уся радня ехала ў царкву з песнямі або ў сельсавет распісваць маладых. Пасля роспісі спраўлялі свята, первы дзень быў у нявесты, другі – у жаніха. Каравай пякла хросная маці, абавязкова круглы, каб дарога жыццёвая ў маладых была чыстая, шырокая. Першых да каравая запрашалі маці і бацьку маладой або маладога. Яны давалі благаславенне на караваі. Сват казаў бацькам: «Бацька і маці, просім каравай прыняці. Першы раз». «Бог благаславіць», – адказвалі. І так тры разы. І пасля дзялілі астатнім, хто прысутнічаў. У адказ на каравай маладых адорвалі падаркамі. Маладая ў свой час таксама дарыла падарунак свякрові, свекру, хросным, блізкай радне жаніха (цётка з дзядзькам, сёстры, браты).

На трэці дзень збіраліся госці, хто гуляў на святе, ішоў да нявесты. Маці іх сустракала з накрытым сталом. Тыя, хто быў за свата, і яшчэ некалькі старых чалавек ішлі ў хлеў і лавілі курэй, затым іх дралі і варылі, елі з юшкаю і так.

Калі выдавалі замуж дзеўку-сірату, усё было менш святочна, больш прасцей. Калі прыходзілі ў сваты, за маці і бацьку сіраты выступалі кросныя. На сватах дзеўка-сірата спявала:

Сірата я, сірата, сірацее меня нет,
Якое плацце ні надзену,
Ад таскі ліняет цвет.
Што я сірата, не віноўна ў етым,
Ніхто замуж не бярэ дзевачку за ета.
Пайду ў Божы манастыр,
Богу памалюся,
Перад іконаю святой слязамі зальюся.
Можа, Божа мне пашле
Долячку такую.
Можа, Божа мне пашле
Долю неплахую.
Ведзь у мяне, у сіраце,
Нет нікаго на свеце.

Свята было адзін дзень, прыходзілі блізкія, добрыя знаёмыя (у некаторых выпадках), дзялілі каравай, дарылі падарункамі, спявалі песні.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н., Мельнікавай Вольгі Фёдараўны, 1925 г. н.

Сваты

Бацька, матка і жаніх хадзілі ў сваты. Зараней не папярэджвалі аб тым, што прыйдуць. Заручыны гулялі чэраз нядзелю пасля сватоў, а свадзьба была праз 2 месяцы. У пост свадзьбы не гулялі. Запоін не было.

Выконвалі такую песню для нявесты-сіраты:

Хадзіла ўжо нявеста
Па зялёнаму саду,
Выклікала сваю мамачку
На параду.
Кайся, маё дзіця, у чужой старане...

Дзяльба каравая

Каравай быў круглы, з цвятамі і крастом. Кускі рэзалі роўныя, і дзялілі сваты. Спачатку давалі матцы і бацьку, а потым хросным матцы і бацьку, а пасля ўжо ўсім родственнікам.

Ездзілі распісвацца ў сельсавет, тады цэркваў яшчэ не было. Калі ехалі распісвацца, дарогу перагароджвалі мужчыны вяроўкай. Давалі ім бутылку, каб прапусцілі. Разоў тры-чатыры могуць перагарадзіць. Гарэлкі не дасі – нічога не будзе.

Зразу ехалі да жаніха. Матка з бацькам сустракалі з хлебам-соллю і з іконаю. Абсыпалі маладога жытам, як ішлі ў хату. Давалі ім чаркі, яны выпівалі і разбівалі іх.

Песні пелі, якія хто ўздумае. Дражнілі сватоў, песні ім пелі харошыя і паганыя. Песні спявалі і тады, калі вешалі рушнікі ў хаце маладых. Рушнікі павінна была вышыць маладая. Уся дзярэўня потым ходзіць глядзець. Бабы, якія вешалі, гаварылі: «Рукі памерзлі і ня будам вешаць». Давалі ім чарку, і тады яны ўжо зноў вешалі.

Свадзьба была два дні, а на трэці дзень у маладога дралі курэй. Бралі куру і круцілі, а пасля гулялі.

Таксама перадзяваліся на свадзьбе: мужчына – у бабскае, а баба – у мужчынскае. Калісь было і ў цыганей перадзяваліся. Бабы пераадзенуцца ў цыган, дзіцё ўкруцяць, і пайшлі яны ў хату, дзе гуляюць. Там яны наспяваюцца, натанчуцца, за гэта ім давалі што-небудзь у сумку пакласці. Потым яны ішлі ў тую хату, дзе гулялі свадзьбу, і там гулялі і танцавалі. Усё гэта было на трэці дзень.

Маладыя на вяселлі пілі з адной пасуды.

Калі маладая ад'язджала да хаты жаніха, яна прашчалася з бацькоўскім домам.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г. н.
(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на)

Сваты

У сваты хадзілі, канешне. Сначала пойдуць, пасватаюцца, а патом ужэ свадзьба. У сваты жаніх сам ездзіць. Друзей ніякіх у сваты не бяруць. Едуць жаніх, бацька, матка, хросны, хросная.

Адмовіць нявеста сватам не магла. Дык як яна адкажыцца? У нас тутака такога не бывала! Яны ж дагаварываюцца з жаніхом, жаніх пасылае сватоў. Яны ж

дружаць, маладыя. Дагаварываюцца пра свадзьбу, пра сватоў. Бацька з маткай гатовяцца, пірог пякуць і ідуць з пірагом у сваты. Усё па дагавору. Вось і дочка мая так сына жаніла. А вось матка мая калісь расказвала, што прыйшлі да яе трое сватоў з Шарпілаўкі, з Абакум і мой бацька з дзярэўні, а матка на вячорках была (яны з жанчынамі там пралі). А бацька мой тады астатніх усіх папраганяў і сказаў, што Ганна будзе мая. Ну і патом, калі прыйшлі ўжо сваты на прагляднае, то кланяюцца свякрусе, з гарэлкай, дык мая матка ў бабкі пытаецца: «А за каго хоць вы мяне аддалі?» А цяпер усё па дагавору, такога не бывае ўжэ.

А бацька хацеў маю матку аддаць за хлопца з Шарпілаўкі. А тады, кажуць, Гарэлікі былі, дык яны ведзьмачылі. Быў такі дзядзька Саламон, ён многа чаго ведаў. Дык ён бацьке гавора: «У кружку хлеба пакладзі і крутані, а тады чытай, дзе астановіцца». Бацька крутануў, а той і кажа: «Налятае на вас вялікая бура, прыбягайце з малітвамі к Богу, мо яна вас і мінуе». Дык бацька за таго шарпілаўскага не аддаў.

Вясельны каравай

Канешне, выпякалі каравай! Выпякалі абязацельна, а як жа ж. Такі здаровы, што з печкі не вылазіў. Каравай няслі гасцям і спявалі:

Просім чэсны шлюб прыняці
І нам што-небудзь падараваці.

Узамен каравая многа чаго дарылі. Усё дарылі: калбасу, яйкі, грошы, хто падушку, хто адзеяла.

Сустрэча маладых. Пасад

Сажалі на пасад маладых. Тады маладой косу расплятаюць. Яна ж раз ужэ пайшла замуж, то не далжна касу насіць. Той, хто расплятае касу, крычыць, што рукі памлелі, дык яму даюць выпіць.

Абязацельна абсыпалі маладых жытам. Яны ідуць ва двор, там іх зярном абсыпаюць. Встрачаюць іх хлебам, соллю, па чарке ім ставяць. Зярно ў чарку пападае – трэба праглатнуць.

Песні ўсё болей пра маладую пелі такія:

А ў агародзе жоўтым моркаўка сядзела,
На каго ты, дзеўка, дзевачка, глядзела?
Глядзела я, мае дзевачкі, у акенца,
Здаўся мне добры маладзец ад сэрца.
Сватоў сівых, як коні ў полі,
Убачыла дзеўка, дзевачка ў доме.
Хавай мяне, мая мамачка, у каморы,
Хавай мяне, мая мілая, у каморы,
Штоб не ўзялі тыя баяры з сабою.

А калі ўжэ едуць маладыя, а ідуць людзі, дык казалі:

А ў Пярэдзелцы берагі,
Прыходзьце, дарагія!
Няхай перайдзе радзіна,
Штоб шчаслівая гадзіна!

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Дружылі хлопцы з дзеўкамі, а патом ужэ свадзьба. Прыходзілі сваты і гаварылі: «Мы прыйшлі к вам пакупаць цёлку». «А харошы ў вас пастух?» – «А пастух харошы». Сваты прыносілі хлеб, і калі дзеўка разразала хлеб, значыць, яна сагласна.

А калі ўжо свадзьба, то нявеста становіцца на ручнік, ідзе, как будта бы гэты ручнік цягнуўся штоб за ей. Гэта для таго, каб падружкі яе тожа замуж выйшлі.

Ваабшчэ, дзевушка, як выйшла замуж, так і далжна жыць з адным, і ён таксама. Гуляюць два дні, на трэці дзень – пярэзвы. Чэраз адну нядзелю едуць к маладой, каб паглядзець, як жыве яна. Первы дзень гуляюць у маладой, другі – у маладога, ну, а трэці – гэта апахмелка.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н. (нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

У мяне не свадзьба была, а так, знаеце, не тое, што цяпер. Мы з мужыком любілі друг друга. Матка мяне адгаворвала, і яго радзіцелі процію былі, не хацелі. Матка казала: «Не ідзі, дачка, не ідзі ў 19 гадоў». Я не, пайшла ўсё роўна. Жыла ж патом у свякрухі, дык як у аду: тое не так, етае не так. Скупая яна была, страх. А дома ж я прывыкла рабіць, як хачу. І матка мая шчытае: жыві – не жалей, не эканом нікагда.

Прыйшлі к нам у сваты яго ўжэ маці (бацькі не было), брат і хросныя. Свідзецелі прыходзілі, тады іх называлі дружак і дружка. На стол накрывалі, і яны ж ужэ неслі гарэлку ці віно, а мы ўжэ бульбы прыгатовілі, ну, вобшчэм тое, што было. Дзень свадзьбы назначылі. Хацелі дзелаць вечар для кругу сваіх, а палучылася – чуць не ўся вёска.

Пеклі каравай з двух старон. У мяне ды ў яго. Мая радня дзеліць каравай, быў бальшы каравай, здаровы такі. Адкусвалі, я ж самы большы кусок адгрызла. У яго матка ўстрачала з іконкай і чарачкамі для маладых. Іх нада разбіць на шчасце. Першы дзень жа гулялі ў мяне, другі – ужэ ў маладога. Людзі пелі, танцавалі. Усё знамянітая песня была: «Нясе Галя воду, карамысла гнецца...». Я ўжо ня помню, забылася.

Есць прымета. Калі хто першы пераступіць цераз парог хаты, ну, ваабшчэ, любы першы парог, той у сям'і глаўны будзе. Дык я ўжо старалася першай. Ну, так і палучылася – я галоўная ў хаце. Плахая прымета: калі ў першы дзень кальцо ўпадзе, дык плоха жыць будуць маладыя.

А ў мяне ж свякруха была, як тая змяя падкалодная. Пасля свадзьбы яна мне хацела хвату качарыжкай ад капусты зняць. Дык кажуць, будзеш, як тая качарыжка, зсохлая. Дык яно і ўпраўду так сталася.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на ад Лемех Ганны Паўлаўны, 1927 г. н., 2005 г.

У суботу начынаюць, у аўторак канчаюць. А тады ў цэркву ідуць, потым дома «горка» крычаць. Становіцца нявеста на ручнік, а матка з бацькам з іконай

устрачаюць, хлебам і соллю. Нявеста ж яшчэ можа схавацца, а тыя трэбуюць за яе грошы. На кажух маладых садзяць. Людзі розныя е. Е, што зразу каравай дзеляць, а е, што после выпіўкі. Каравай самі пеклі. Тады ўжо дзялілі яго.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

На вяселлі песні пяюць. Я ўжо не памятаю. Дзедухна засцілала пасцель і глядзела, каб ніхто не дакранаўся да яе, пакуль не палеглі ўсе спаць на свадзьбе. І на кажух садзяць, косу расплятаюць нявесце, надзяваюць ёй хустку.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

Спракавеку дзяўчына выбіраецца па савету радні. Саседзі саветуюць.

Сваты

Сначала назначалі сватоў, каб ехаць за дзяўчынай. У сваты бралі гаваркіх, балбатлівых мужыкоў, каб зналі, што гаварыць, а патом, калі бацькі маладой сагласны, тагда назначаюць вяселле, ды так, каб ніякіх работ не было, штоб можна спакойна святкаваць.

Каравай

Вяселле гулялі 3 дні. Вот ужо вяселля было! А сколькі яды было! Ну, і, канешне, абязацельна бабы пяклі каравай. Рашчынялі зраніцы, ставілі ў цёплае места, штоб цеста добра ўзышло. І ў пачатку вяселля дзялілі абязацельна каравай. Носяць каравай госці такія, хто добра ўмее прыказваць. Сам каравай кладуць на тарэлку ці ў рэшата. Тады завуць бацьку і матку, а тыя платочкам бяруць, бо голымі рукамі нельзя, штоб былі багатыя, бяруць і раздаюць.

Вяселле

Жалалі маладажонам, штоб яны добра жылі, штоб дзяцей было ў кожным угле хаты, штоб жонкі не ганяў вакруг хаты. Гаварылі, хто што ўмеў.

Тагда ўжо ўся дружына садзіцца за сталы. Дзяўчыну садзілі на дзежачку, пакрытую кажухом. Еслі яна чэсная, то сядзе на кажух. Усе елі, пілі, спявалі, жартавалі, маладым «горка» крычалі, танцавалі. Вот, помню песню, кагда маці адпраўляла донечку сваю ў хату к мужу:

Ох, мамачка, у клець вядуць.
Ідзі, донечка, штось дадуць.
Я думала – калача,
А яны мне – таўкача.

После вяселля дочка ўязджала ад маці ў хату свайго мужа. Раньшэ от матка расказвала, што 12 чалавек у адной хаце жылі і нявеста ешчо.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2002 г.



Бацькі маладых выбіраюць сватоў, якія будуць дзяліць каравай. Умываюць іх гарэлкай, выціраюць рушнікамі, якімі патом перавязваюць свата. Умывая першага свата, кажа: «Дарую першаму свату кошку гарбату». Умывая другога свата, кажа: «Дарую другому свату сучку гарбату». Умывая трэцяга свата, кажа: «А трэцяму свату – мыш хвастату». Умывая чацвёртага свата: «І бізун зрабіў, і павесіў на сцяне, каб жонка бізун брала, кругом хаты ганяла». А перавязаныя сваты выносяць каравай і кажуць:

Удаўся каравай, удаўся.
А чаму яму не ўдацца.
Багатая ўчыняла,
Прыгожая начала,
Цяжарная насіла,
Губатая саджала.

Расці, расці, каравай,
Вышэй сталба ледзянога,
Вышэй жаніха маладога.

Сваты ставяць каравай на стол і спрашуюць у бацькоў благаслаўлення. Сваты просяць благаслаўлення бацькі і маткі, просяць каравай падаці. А бацькі ім гавораць, што Бог благаславіць. Маладая разразае каравай, з свайго боку адразае большы кавалак, каб у хаце буў дастатак. Першымі да стала прыходзяць бацькі. Госці адорваюць маладых падаркамі і гавораць розныя пажаданні. Свякруха прыглашае маладых да сябе ў хату, потым частуе на каравай. Затым да стала ідзе ўся радня. А пры канцы дзеяння на каравай дараць падаркі друзья і астатнія госці.

На вяселлі маладая давала згоду мужу ісці ў яго сям'ю, брала бутэльку з-пад гарэлкі, насыпала туды жыта і аддавала бацькам маладога. Матка ж маладога раскідвала гэта зерне ў хаце, двары, на вуліцы, каб маладыя жылі ў шчасці і дабрабыту. Каравай упрыгожвалі «шышкамі», булачкамі, галінкамі ёлак, абмотвалі рушніком. Калі маладая не захавала цноты, не мела права садзіцца на дзяжу, пакрытую кажухом.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., 2005 г.

У нас, калі прыязджалі ў сваты, то хазяін пытаў: «Хто там?», а яму адказвалі: «Адчыняй дзверы, мы шукаем клад такі, каб наша дзела пайшло на лад. Мы шукаем такую кветку, што цвіце і ўзімку, і ўлетку». У сваты хадзілі або жанатыя мужчыны, або ўжо цёткі добрыя. А разам з імі ішоў жаніх. Таксама маладую аглядалі, агледзіны называліся. Перад вяселлем маладая дружак сабірала. Прашчалася са сваім дзявоцтвам.

А яшчэ пра жызнь сямейную пагаворка была: «Не патрэбен і клад, коль у жаны з мужам лад».

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Вяселле гулялі 3 дні. Паследні дзень называецца «разгрэбіны». Ездзілі ў сваты хросны, дзядзька. Пагаварылі, пашуцілі: «У вас цялушка ёсць? Ці прадаеце вы яе?» Выкуплялі нявесту, тады завуць на заручыны родственнікаў, п'юць. Каравай пякла баба, якая ў пары жыла. Первы дзень у маладой гулялі, другі у маладых, трэці – кожныя ў сваіх. Каравай дзялілі хросныя маладых.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Сваты прыносілі гарэлку. Мужык должан прыйці, які казаў: «Вы прадаеце карову? Мы прыйшлі к вам купляць». Пап'юць гарэлку. Нявеста сядзела на печы, сцяснялася. Жэніх прыязжаў на тройцы каней серых, у вазку сядзелі. Ехалі затым у царкву. Прыехалі і гулялі. Сядзелі маладыя на куце, кажух падлажвалі.

Каравай пекла пара, якая харашо жыве, або хросныя. На каравай падаркі дарылі. Сустракалі пасля царквы маці з атцом. З дзяжы бяруць крышку і налажваюць на яе. Нада, штоб ніхто не прайшоў между маладымі да кута. Дзялілі каравай сваты, якіх паравязвалі. Радзіцелі первыя далжны іці. Першы каравай дзеліць яго радня, другі – яе. Каравай кругленькі, сладзенькім мазалі, штоб ён запякаўся.

Знімала фату маладой родственіца. Тры дні гулялі. Первы дзень – у маладой, другі – у маладога. Трэці – разгрэбіны, курэй разграбалі. Касцёр разлажвалі.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Перад вяселлем сваты былі. Нявеста ўжо ведала, што да яе сваты прыйдуць, і ўжо рыхтавалася. Патом прыходзяць сваты. Яны прыходзяць са словамі спецыяльнымі, прыбауткамі. Кажуць: «Мы прыйшлі і знаем, што ў вас ёсць аленькі цвяточак і хочам яго забраць». І потым радзіцелі маладой выносяць угашчэнні, ужо прыглашаюць сватоў, і потым намячаецца, калі свадзьба ўжо будзе. А калі нявеста ўжо не саглашаецца, тады яны забіраюць свой хлеб, соль і ўходзяць назад. А калі ўсё добра, то рыхтуюцца да свадзьбы. Раней на канях ездзілі па дамам, у цэркаў ездзілі. На лашадзях ездзілі вянчацца, а не так, як зараз, на машынах. А тады павозкі прыбіралі, коням лентачкі ў грыву ўпляталі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кукса Яўгеніі Паўлаўны, 1922 г. н., 2005 г.

Сватанне першае. Першыя ідуць матка, бацька. Ідуць ужо родзічы яго, вядуць кавалера. Заходзяць і гавораць: «Мы прыйшлі к вам купіць цёлку». Ну, ужо пагавораць, за стол садзяцца. Ужо высватаюцца.

Каравай абязацельна пяклі. Матка пякла ці прасілі. Каравай таксама ўпрыгожвалі: розныя цвяточкі зверху лажылі, пцічкі, шышкі, вераб'ёў. Дык раней прыйдуць дзеці, з гэтымі вераб'ямі гуляюць. Свадзьбу гулялі тры дні. Первый гуляюць, калі маладыя павянчаюцца. Назаўтра ўжэ курыцу смаляць. Паймаюць курыцу жывую, да яе бедную за ногу. Нап'юцца, ды п'яныя не жалеюць курыцу, бегаюць за ею. На трэці дзень ідуць гуляць ужэ ў другую хату.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Вілічэк Ефрасінні Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Сваты

Вяселле пачыналася з таго, што прыходзілі сваты, якія казалі: «У цябе ёсць цёлка харошая, а ў мяне бычок. Прадайце нам яе. Сколькі яна стоіць?» У мяне быў жаніх, які мне не нравіўся, але ж ён нравіўся маёй сястры і радзіцелям. Так, прыйшла я з дзеўкамі на танцы, а ён там. Мы ногі намылілі і ўцякаць адтуль. І вось прыйшлі сваты. Мамка пайшла за мною, а я ідці не хацела, за доскі ўцапілася і крычу, што не пайду, але ж прыйшлося ідці. Так бацькі дамовіліся аб вяселлі.

Вяселле

У той дзень мне пазаплятали лентачкі ў валасы, красіва было. Палажылі кажух, мы селі, а я ўсё «хі-хі» да «ха-ха» з дзеўкамі.

Згулялі вяселле ў нас, патом паехалі к маладому. Я ўцапілася ў забор зноў і крычу, што не паеду, але ж упіхнулі мяне ў машыну, як добрую цёлку. З сабой мне далі пасцельнае, рушнікі, скацерць, шторы на окны. Сколькі я тады гора пазнала... Грошы ўсе свякрухі аддавалі, яна мне заўсёды гаварыла, што ў мяне няма вілеек (чорных платкоў). Тады было так, што ў каго багата вілеек, той і багаты. Тады слухаліся радзіцелей. За сталом обшчая міска, калі яны паклалі ложкі, то і я з дзіцём на руках. Вось так.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

Вянчанне

Жаніліся ўвосень. У другое ўрэмя рэдка калі. Ездзілі да вянца ў царкву на конях. Калі ехалі да вянца, то дружкі нявесты прышчаплялі да летнікаў хлопцам кветкі, коней украшалі строчкамі і кветкамі, званочкі на дугу вешалі. Ехалі тады ўжэ вянчацца.

Пасля вянчання зразу дадому ня ехалі, а каталіся па дзярэўні, песні пелі, гармонік йграў.

Першы дзень вяселля

Первы дзень гулялі вяселле ў маладой. Пакуль ждалі маладых з царквы, гатовілі сталы.

Сустракалі маладых з іконаю, з хлебам і соллю. Вялі іх у хату і сажалі на покуце на кажух, ета штоб багата жылі. Радам з імі садзіліся хросныя матка і бацька. Ля маладога садзілася святілка – дзеўка, якая дзяржала свечку. У царкве яна тожа свечку дзержыць.

На вяселле нявеста запрашала сваіх падруг, а жаніх – таварышаў. Яны тожа садзіліся радам з маладымі. Усе госці запрашаліся за стол, пілі, елі. Потым выходзілі з-за стала паскакаць, павесяліцца.

За стол садзіліся два разы. На трэці раз усе садзілісся за стол. А каля маладых астаўлялі места на лаўцы пустое. Вакол нявесты збіраліся маладзіцы і завівалі маладую: знімалі з галавы строчкі, расплятали косу, дзялілі косы на дзве палавіны і абвівалі іх вакруг галавы. Шчыталася, што замужняй нельзя заплятаць косы. У ета ўрэмя пелі песні.

Тады накрывалі ручніком галовы маладым, бралі з дзяжы, што ўчыняюць, хлеб, крышку жыта, зярно і маладых паціху стукалі па галавах тры разы. Пры етым гаварылі:

Штоб жыта радзілася,
Штоб у хляве вадзілася,
Штоб у хаце багата
Й была дзетак поўна хата.

Тады етае зярно сыпалі па гасцях. Маладыя дзеўкі стараліся наперад забегці, штоб больш на іх жыта папала, штоб скарэй выйці замуж.

Дзяльба каравая маладой

Пасля етага ад маладой дзялілі каравай. Каравай дзяліў хросны маладой ці дзядзька. Дапамагала яму якая-небудзь жанчына з радні. Госці з боку маладой жадалі маладым дабра, шчасця, клалі на каравай грошы, мацерыю, падушкі – хто што. Потым вяселле прадаўжалася дапазна. Тады госці расходзіліся па хатах. Маладая аставалася пакуль у сябе дома.

Другі дзень вяселля

На другі дзень малады браў з сваёй радні чатыры жанчыны, іх называлі прыданкі. Яны ехалі за маладой выкупляць яе прыданае і прыглашаць яе гасцей у хату маладога прадаўжаць вяселле. А дома ў маладога гатовіліся сустракаць іх: насыпалі ў гаршкі попел, стаўлялі іх на вароты, госці ад маладога надзяваліся цыганямі. І калі пад'язджалі маладыя і прыданкі, каля варот іх сустракалі етыя ўжэ, цыгане. Яны прасілі выкуп за тое, што ўпусцяць іх у двор. Пры етым гаварылі: «Просім плату, а то не пусцім к жаніху ў хату». А калі тыя не саглашаліся, то білі палкамі па гаршках з попелам, ён разлятаўся, на гасцей попел сыпаўся. Тады ўжэ дзявацца некуды, што ж – плацілі выкуп.

Ім адкрывалі вароты, яны ўсе заходзілі ў хату і ўсе госці тожа. Прыданкі бралі прыданае нявесты, неслі ў хату. У хаце ўсё прыданае разлажвалі: посцілкі, просціны, падушкі на караваці, скацеркі – на сталы, рушнікі на сцены вешалі. Хвалілі гасцям прыданае маладой.

Пасля етага ўсе садзіліся за сталы. За трэцім разам дзялілі каравай ад маладога. Тады ўжэ выходзілі на двор і частавалі людзей, якія прыходзілі паглядзець вяселле. Пасля вяселля маладая аставалася жыць у свайго чалавека.

Трэці дзень вяселля

На трэці дзень сабіраліся госці, бралі жэрдку. Ішлі па вуліцам і лавілі людскіх курэй, штук колькі. Етых курэй падвешывалі на жэрдку і ішлі да каго з радні жаніха. Там зноў накрывалі сталы, гатовілі зноў гэтых курэй. Усе госці садзіліся за сталы – збіраліся на бяседу. Ета ўжэ паследні дзень вяселля.

Мы думалі: вы прыехалі,
А вы пешкі прыйшлі,
Маладога ў мяшку прынялі,
А дружка ў карзіне,
Штоб не з'елі свінні,
А святілку ў каробцы,
Штоб не ўкралі хлопцы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Галіны Яўціхееўны, 1906 г. н., 1995 г.

Стукнула, грукнула ва дварэ.
Ці не па цябе ж, донечка, па цябе?
Па мяне ж, мамачка, па мяне,
Гатуй жа кублік мне.
Едзь жа, мая донечка, без кубла,
Бо ты мне кудзельку не скубла.
А я, мамачка, скубла, да ахота не брала,
Я Іванечку да й ждала.
Шумкнулі конікі паўз акна,
Ці не па цябе, донечка, па цябе?

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Касцючэнка К. А., 1928 г. н., 2000 г.

На вяселле абавязкова прыходзілі сваты да нявесты, сваталіся, дагаварываліся. Выкупаюць нявесту на вяселлі. Пасля вянчання трэбавалі выкуп, перагароджваючы дарогу. Вось яны едуць, іх астанаўліваюць, трэбуюць выпіўку, канфеты, закуску, усё ў іх было. Яшчэ маладых на кажух садзілі. Прыходзяць, калі ўжо садзяцца за стол, сцелюць кажух, і яны садзяцца на яго. Гэта для таго рабілася, каб маладыя багатыя былі. Абавязкова каравай пяклі. Але ж каравайніц на свадзьбу не прыгласілі. Каравай жа вельмі красівы быў. Я і сама пекла на вяселле свайго сына. Усе здзіўляліся і спрашвалі, як жа ета можно такі каравай спекці, таму што ён быў вялічэзны і прыгажэнны. Упрыгожвалі яго цвяткамі і ўзорамі. Гулялі сначала ў доме нявесты, а толькі патом прадалжалі вяселле ў доме жаніха. Грузілі шмоткі, падушкі і везлі ў дом жаніха.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бойдак Лізаветы Іванаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Дагаваравалiся хлопец з дзеўкай. А потым ужо ў сваты ішлі. У сваты ішлі бацька, хросны, заходзілі ў хату і гаварылі:

– Добры вечар!
– Добры вечар!
– А ці вы рады нам?
– Захадзіце, захадзіце.
– А казалі, вы цёлачку прадаеце. А ў вашай цёлачкі дзве дзіркі пад носам.

Сват нёс толькі хлеб і бутылку. Потым яны садзяцца за стол. Сват гаворыць: «Еслі нравіцца наш хлеб, рэжце, а еслі не нравіцца, то мы забяром з сабой дамой». І дзеўка быстрэй рэжа гэты хлеб. Значыць, яна згодна жаніцца з ім.

Калі ўжо свадзьба, едуць к маладой. Ложаць на вуглу кажух і садзяць маладых. У маладога заўсёды дружок, а ў маладой – свяцілка. Кожная дзеўка загатаўлівае каліну. А свяцілка бярэ дзве свечкі і свеціць у цэркві. Прыязджае дамоў, свяцілка ложа каліну. Потым маладая бярэ гэтыя свечкі.

Гучыць песня:

З хлеба – паляніцу,
З дзеўкі – маладзіцу,
А як бы мы схацелі,
Так бы мы зрабілі.
Пайшлі ў садочак,
Сплялі вяночак.

Бяруць шмоткі яе і едуць да маладога. А дружкоў не пускаюць у хату. Тады яны бяруць залу і кідаюць за вароты. Дым падымаецца, і тады ўжо іх пускаюць у хату.

Аставайся здарова
І заграбай, мамка, жар, жар,
Мне вельмі жаль
Хадзіць у трэскі.
Мамачка, дажыдайся нявесткі.

Свахі:

Пусці, сватачка, у хату,
Мы ж тут не былі,
Гарэлачку не пілі.

Не ўцешайцеся, врагі,
Не пераходзьце дарогу.
Хай пяройдзе міла,
Каб была шчасліва.

Калі сабіраюць шмоткі, дзеўкі пелі:

Табе, мамка, кубялы, навойка,
А мне, мамачка, кароўка.
Табе, мамачка, усе ўслончыкі,
А мне, мамка, сувойчыкі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н., 2005 г.

Сватацца да дзяўчат мужчыны ідуць. К вяселлю гатовіліся добра. Рабілі ўсё пасмашней да пажырней. Ужо як пойдзеш з хаты сваей, дык ужо хто будзе

глаўнейшы? Мужык жа будзе. Да, каравай пякуць ужо з боку нявесты. Прасілі другіх баб, каб пяклі гэты каравай. Да, каб жа ж не ўдава была. Бо маладым жалалі здароўя, да смерці жыць разам. Яны ж у пары будуць жыць, дык трэба было, каб і тая баба, што пячэ каравай, у пары была.

На кажух садзілі маладых. На лаўку ці на канапу кажух кладуць, дзе маладыя будуць сядзець. Гулялі тры дні. У суботу пачыналі, у панядзелак – ужо усё, разбягаліся.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Хмелянок Марыі Яўсеевны, 1927 г. н., 2005 г.

Калі ж як спраўлялі вяселле, дык маладым налівалі па напёрстку віна, а болей не наліваюць. Засватаюць, як сваты прыходзяць. У сваты ішлі ўсе блізкія, радныя. Ну, там, бацька, маці, хросны, браты. Вобшчэм, уся радня. Гарэлку несці далжны былі, сала кусок, хлеба. Ну, усё неслі, што як абычна прыносяць.

Маладыя, як ідуць да маладога, іх матка ўстрачае, з хлебам і соллю сустракала. Маладыя адкусвалі хлеб. І ўжо хто большы кусок адкусіць, дык, шчыталася, будзець і глаўны ў сям'і.

Маладым жалалі шчасця, здароўя, жыць ажно век і памерці разам, дзяцей каб многа было.

На кажух садзілі, каб было абязацельна пад іконай. Кажух шчытаўся як знак багацця, каб маладыя былі ў цяпле, дабрэ, багатымі. Ну, ні саўсім ужо багатымі, а каб кусок хлеба ў хаце ўсягда быў.

Свадзьбу гулялі тры дні, а калі багацейшыя, дык і болей. А хто выпіць любіў, мог і нядзелю гуляць, і яшчэ больш хадзіць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.

Ездзілі ў сваты. Перавязвалі іх палаценцамі. Еслі сын, напрімер, – к нявесце ездзілі, а еслі дочка, дык к нам прыязджалі. На втары дзень абязацельна трэба было куру смаліць. Патом кладуць яе на палкі, нясуць туда, а тыя адбіраюць. Ды перадзяюцца хто ў што, каб смешна было. І там смаляць ужо куру.

Каравай выпякалі, выпякалі шышкі. Эта як у сваты ішлі, дык шышкі пеклі. Шышкі дзецям раздавалі. Напякуць розных галубей. Эта перад свадзьбай пяклі. Каравай дзялілі на первы дзень. Зразалі шапку верхнюю і аддавалі маладым. Каравай давалі сначала блізкім родственнікам, потым друзьям і знакомым.

Калі смаляць курыцу, перадзяюцца так, каб ніхто не пазнаў. Бяруць эту курыцу, ідуць, дзе жыве маладая. У сараі крадуць эту курыцу.

Маладых садзілі на шубу, каб былі багатымі, шчаслівымі, каб было многа дзяцей.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

Прыязджаюць у сваты бацька з сынам, дзядзька, старэйшы брат. Чалавек тры-пяць збіраюцца і сватаюць. Дагаворуюцца: «Давай сайдзёмся, пажэнімся!» Дзеўка мацеры сцісняецца гаварыць. Сястра ці брат матцы і бацьку скажуць. Прыходзяць у сваты і кажуць: «Мы к вашай дзеўцы прыйшлі ў сваты». Дагаворуюцца, калі свадзьба. Тройку каней запрагаюць ехаць у цэркву. Адзін, што пасрэдзіне, то дугу ўкрашаюць, калакол вешаюць. У цэркві павянчаюцца, тут шафера – два-трі чалавека і дзевак столькі ж. Павянчаліс, прыязджаюць і гуляюць свадзьбу. Хто быў учаснік, гуляў свадзьбу, то ў іх пярэзвы ў хаце ўжэ. На кажух жа маладую садзяць і перавязуюць палаценцамі сватоў, як дзеляць каравай. Малады сваіх ужэ родзічаў вызывае. А тыя ўжэ, з боку маладой вызываюць із свае рукі. Рушнікі вышываныя тады былі. Маладой расплятали касу і адзявалі платок. То ўжэ шчытаецца маладзіца. У пары іх ужо кругом стала абводзяць. Каравай я, напрімер, (із свае рукі) пяку, і яны – із свае. Нашыя аддаюць свой каравай, і яна ўжэ аддае свой каравай. У маладога гулялі. З мае стараны дзеліцца каравай, а тады – з яго. Первый кусок давалі маладым. Канхветы ў каравай тыркалі. Вяночак з цеста дзелаюць. Плацце маладой з марлі шылі. Із марлі фата была. А цвяты дзелалі з бумагі. І цвяткі вешалі, шаферу ўжэ вешалі цвяточак. На трэці дзень эта ўжэ «разгрэбіны» называлась, і кажды, хто гуляець, дае курыцу ці петуха. На палку навесяць і ідуць ужэ. Гулялі, пераадзяваліся ў цыганей.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Сваты

Прыходзяць сваты:

– Добры вечар, што вы кароўку прадаеце?

– Прадаём.

– А дзе ваша кароўка?

– У хаце.

У сваты прыходзіць хросны і бацька, жаніх. Еслі яна сагласна – хлеб разразаюць, а еслі не сагласна, значыць, гарбузу на стол кладуць.

Сваты прыносілі рушнік і бутылку. Мы ж от ездзілі ў Камарынск. Дак што мы... Булку хлеба ўвязалі ў платочык, соль там палажылі. Прыехалі:

– Добры вечар, добры вечар!

– А ці вы рады нам?

– Рады, рады, усе захадзіце!

Палажылі ўжэ хлеб на стол. Вот яны ўжэ тут стол накрываюць, паселі да сват і кажа: «Вот што, людзі добрыя, еслі нравіцца такі хлеб, так рэжце, а не нравіцца, дак мы забяром яго дадому». Вот маладая быстрэнька за нож, пакрэшчала, пакрэшчала, во той хлеб і гатовы.

Вот ужэ замуж аддалі, так после пяюць песню:

Сядзь, мамка, павячэрай,
Мо, павячэраўшы, падзелімся.
Да ты мне ніты і бердзечка,
А мне, мамка, мала,
Табе, мамка, усе ўслончыкі,
А мне ўсе сувойчыкі.

Вянчанне

Вянчаліся ў царкве. Сваты пасля вянчання прыязджаюць, кажуць: «Пусці, сватачка, у хатачку, мы ў хатачкі век не булі, мы ж тваёй гарэлачкі век не пілі». Сваха ўжо выходзіць і дае гарэлкі.

Каравай

Каравай пёк той, хто харашо жыве. Так вот жа пякуць так: каравай у маладога і каравай у маладой, а еслі была саўмесная свадзьба, значыць, адзін каравай. Калісь лажылі кажух і маладых садзілі на кут, штоб багатыя былі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

На вяселлі гучалі пажаданні:

Дарую калыску і кручок, штоб было сем дачок і сын – казачок.
Дарую мяшок жыта, каб не была маладая біта.
Дарую мяшок проса, каб маладая не хадзіла боса.

Запісана ў в. Карпаўка Лоеўскага р-на
ад Зязюлі Наталлі Пятроўны, 1949 г. н., 1993 г.

Свадзьбы ж добра іграюць. Хросныя ідуць у сваты, на заручыны.

Сваты

Прыходзяць у хату: «Ну, добры вечар. Мы прыйшлі к вам, можа, вы карову прадаеце?». Кажуць: «Прадаем». Гавораць, гавораць... Сваты ставяць на стол графін гарэлкі, лентачкай абвязаны, хлеб ложаць. Калі не сагласна – гарбуз кацяць.

Заручыны

На заручыны ішлі вечарам у суботу. Калісь у дружак былі вянкі да з лентамі. Нашывалі платкі абязацельна, насавыя платкі.

Запляталі касу, а ўвечары вот маладому нада забіраць маладую. Ну дык ужэ бяруць платок, чарку, тарэлку, грэбяшок, і ўжэ жэншчына, хросная матка, і ўжэ завівае яе. Скідаюць вяночак у тарэлку, ложаць за ікону, платок завязваюць. Яна ўжэ едзе к маладому не нявеста, а ўжэ жэншчына.

Маладых садзілі на кажух.

Каравай хросная пякла. Вярхушку маладым аддавалі. Каравай пяклі маладому і маладой.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

На третий день, обычно в понедельник, собирались в доме родителей молодой. Тоже устраивалось застолье, затем женщина переодевалась в мужчину и наоборот. Обычно (по договоренности) «воровали» петуха (курицу), шли на перекресток, где раскладывали огонь и смолили. Это символизировало невинность невесты. На этом перекрестке угощали спиртным всех встречных, а затем на тачке (или в начовках) катали свекра со свекровью (почему неизвестно, но есть до сих пор).

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Марусевіч Святланы Уладзіміраўны, 1971 г. н.

ПАХАВАННЕ

Як чалавек памёр, мылі яго жэншчыны, а мужыкоў памагалі мыць мужыкі. Адзявалі ў адзежу, у якую памёршы гаварыў адзець.

У гроб ложаць кусочкі хлеба із солью, і нада сказаць: «На табе тваё, а астаў мне маё». Шчэ ложаць платочкі, гэта значыць – уважэнне памёршага, а шчэ чэраз платочык перадае весць да памёршых родных.

Памёршаму звязваюць ногі, а патом абязацельна развязваюць, каб не былі спутаныя на тым свеце, і аддаюць чалавеку, што хворы на ногі ілі рукі.

Калі плачуць, то гавораць: «А куды ж ты ўходзіш? На каго ж ты мяне пакідаеш?»

Гатовіць на похараны родным няльзя.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г. н., 2002 г.

Памірае чалавек. Калі гэта жэншчына, яе мыюць жэншчыны, калі мужчына – мужчыны. Адзяваюць бяллё, касцюм наверх, хрэсцік на шыю, складаюць рукі на грудзі, даюць у рукі страсную свечку, каторая ў цэркві асвешчана на празнік Стрэчанне. Ложаць на голаву венчык, на грудзі кладуць «прахожую», ложаць на кут к той сцяне, якая ідзе к вуліцэ, адкрываюць акно, запальваюць свечы, лампаду, запінаюць зеркала, стаўляюць на стол сыту ў місцы (салодкая вада і хлеб), кладуць на міску 5 ложак, ложаць яшчэ булку хлеба на стол, кладуць пакойніку гасцінца, на акно стаўляюць стакан вады, дзелаюць мяцёлачку з каласкоў, свецяць гроб. Кладуць пакойніка ў гроб. Калі ляжыць пакойнік у хаце, прыводзяць бацюшку, збіраюцца бабкі, дапамагаюць яму адпраўляць паніхіду, але спачатку, калі пакойнік ляжыць у хаце, пяюць псальмы.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Анікеенка Кацярыны Пятроўны, 1933 г. н., 1998 г.

Ну, ужэ, шчытай, умер чалавек. Прыходзілі чужыя, абмывалі, а цяпер свае мыюць, патаму шта некаму, ніхто не хоча ісці. Мужчыны мыюць мужчыну, бабу бабы памыюць, надзенуць. Калісь казала адна жэншчына, мая падруга (ана была замужам там, у другой дзярэўні), што забалела, так яны не зналі, што яна ўчадзіла. Ну, а я ж была суседка, ды мне кажуць: «Давай нагрэем вады да абмыем». Бабы ўжэ памылі, паклалі яе, да ўжэ ж будэм гатовіць. А тая баба паднялась і кажа: «А чаго вы шэпчаце? Куды вы збіраецесь?» Дак усе бабы пабеглі з хаты, дак адну ажна павалілі. Ана ж, аказваецца, учадзіла, а яны гарачай вадой памылі, дак яна і адышла. Напужаліся бабы.

Калі памёр, эта ўжэ, шчытай, зеркала закрываюць, каб ужо не свяціла зеркала. Людзі галосяць, шкода ж. А шо ж вы думаеце, свайго шкода.

Душа 40 дней ходзіць па хаце. 9 дней – эта ж абед яшчэ, душа ў хаце. Кагда ўжэ 40 дней прайшлі – і яна пайшла, няма яе ў хаце.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н. (раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Када чалавек умрэ, дык закрываюць зеркала і целявізары. На пахаванне канон – абязацельная яда. Яго первага трэба з'есці па 3 ложачкі, штоб мёртваму там добра было. Гэта ўсягда так. Не толькі на пахаванне, але і на трыціны, і дзевяціны, і на паўгода так робяць.

Да сарака дней душа шчэ яго ў хаце. І вот на сарачыны сорак дней ужо адправяць, і ён ужо ідзе, яго ўжо няма, адпускае ён.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на ад Максіменка Варвары Анатольеўны, 1925 г. н., 2005 г.

Цвіў цвяточак, цвіў прэкрасны,
Всю даліну ўкрашал.
Дунуў вецер, дунуў быстры,
І цвяточак тот завял.
Можэт, я скора завяну,
Скора жызнь мая прайдзёт.
Можэт, завтрашней парою
Я такім жэ сном усну.
Можэт, заўтра пагребальный
Звон зазвоніт нада мной,
Прапают сцішок прашчальны
Са святымі ўпакой.
І ніхто маёй магілы
Із радных не пасеціт,
Ні ацец, ні маць радная
Не паплачут аба мне.
Толька страннічак унылы
Край магілачкі прайдзёт,
На высокам бугарочке
Там он сядзет, адпачнёт
Цяжалёханька ўздыхает,
Слязу выране аба мне.
Памяні, Божа, без радных
В чужой дальняй старане.
Маі браты, маі сёстры,
Памаліцесь аба мне.
Распрашчаюся я з вамі
Да всемірнага суда.
Кагда ўстануць чалавечы,
І яўлюся я туда,
А адно мне беспакоіт:
Баюсь Страшнага Суда.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на ад Курдзесавай Яўгеніі Барысаўны, 1935 г. н., 2002 г.

Когда умер мой папа, привезли его с больницы, пригласили соседей. Он находился в покрывале. Нагревали в чугунном тазе воду, отнимали одну сторону покрывала, тряпку обмачивали в воде и промывали покойное тело, протирали его и одевали в одежду. Ставили две скамейки, укладывали доски, застилали покрывало, потом ложили покойного головой к углу, где были образы. Покойный должен был переночевать ночь в доме. Его оплакивали дети, близкие, родственники. Голосила жена покойного, так как осталось четверо несовершеннолетних детей.

На следующий день в церкви бабки отпевали покойного молитвой. Тело выносили из дома близкие или соседи вперёд ногами. Родным нельзя было выносить. Во второй половине дня все возвращались в дом и происходил поминальный обед – поминки. Готовили канон – вода посвечёная с мёдом и покрышенным белым хлебом. Перед тем, как приступить к еде, каждый должен был попробовать канон. На первое обязательно подавали борщ и кашу, которую подавали в последнюю очередь с компотом. После чего расходились.

Поминки возобновлялись на третий, девятый, сороковой дни, через полгода и год. На эти дни ходили в церковь, подавали свещенную поминальную записку за упокой и проходила служба. После чего делали поминальный обед в кругу семьи или приглашали других родственников и ближних.

Запісана ў г. Гомель ад Юрасік Валянціны Савельеўны, 1946 г. н.
(раней пражывала ў в. Рудня-Каменева
(раней Папоўская Рудня) Лоеўскага р-на), 2002 г.

Людзі начуюць, вараць вячэру, тым, хто начуе, даюць хусткі. Потым прыязджае бацюшка, адпявае. Усе яго кніжкі кладуць на палаценца. Калі чалавек у пост памрэ, гатавалі ўсё поснае. Калі не – то ўсё гатавалі, што была. Свечы паляць, лампаду. Калі ўтопленік, сыту не ставілі, ставілі варэнне ці мёд.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

У нашай мясцовасці называўся «мерліны» такі абрад. Калі татка памёр, дык усе дзверы парасчыняліся і ў хляве, і ў хаце. Цёткі казалі, каб мы ў гэтыя дні нічога не рабілі.

Надзяюць чыстае ўсё на свеце. Адзявалі толькі чужыя. Яны ж і гроб рабілі, і яму капалі. Тым бабам, хто мыюць і абед варуць, давалі мацерыялы, бо палаценцаў не було ж. А хто і ваабшчэ нічога, дзеўкі, не дае. Шчас такое врэмя, што ніхто нічога не робіць. Вот раней, о-го-го.

Памятаю, калі татку з хаты выносілі, то бабка следам за ім падлогу вымятала і вадою свянцонай парогі апырсквала, каб смерць больш у хату не заходзіла. А хавалі так: на палаценцах ці вяроўках апускалі ў яму «хатку» і зямлёю закідалі. А патом быў стол. Пачыналі есці з кануна – салодкая жыжка такая: вада на мяду і булка пакрышана. Мёда ў каго няма, клалі сахару. Па тры ложкі нада кануна каждаму ўзяць. Ну, а тады наліваюць іншае. Там хто-небудзь скажэць рэч. У нас

во і квасолю вараць, і мяса будзет нескалько сортаў, і салатаў. Там во боршч падаюць.

Галашэнне пахавальнае (як развітваюцца на могілках):

Да свідання ж, да свідання!
Да свідання ж, да свідання!
Да шчасліва ж табе дарожачка!
Да сустракайце ж, бацькі, мацеры,
Да радзімачка,
Да сустракайце ж госцейку!
Да бярыце яго памаленечку,
Бо ён балючы.
Да глядзіце яго тутака...
...Да калі ж ты ка мне прыйдзеш?
Да ў якую пору?
Да з якога боку іцімеш?

Галашэнне памінальнае (у першыя дні пасля пахавання):

Маці мая дарагая...
Маці мая дарагая!
Куда ж ты мяне аставіла адну?
На каго ж ты мяне кінула?
А з кім жа я буду гаварыць?
А з кім жа я буду дзела рабіць?
А хто ж мяне пасаветуя?
А хто ж мяне пакамандуя?
А чаму ж я такая нешчаслівая?
Хай бы ж я шчаслівая была,
Да з маці рабіла,
Да мне маці пакамандавала,
Да мне маці што памагла.
А к каму ж мне зараз прыхіліцца?
А куды ж мне дзецца?
А ў каго ж мне савету папутаць?
А хто ж мне цяпер што скажа?

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.

Еслі памёр мужчына, то завуць мыць нябожчыка мужчын, а кагда жэншчына – жэншчын. В аснаўном тры чалавекі мылі. Абязацельна ў пакойніка далжна быць навярху правая рука, штоб дзяржаць крэсцік і свечку ў левай. А свечка далжна быць з страстной нядзелі. У гроб абязацельна лажылі мужчыне ікону мужыцкую, а жанчыне – жэнскую.

Калі абедалі пасля пахарон, то была коліва (сыта) і ўся яда, шоб з яе пар ішоў. Коліва нада было з'есці тры ложкі. Былі боршч, картошка, ладкі. Сначала тры ложкі коліва елі, а патом ужэ можна есці.

На трэці дзень хадзілі на кладбішча. На дзевяць хадзілі ў цэркву адпраўляць. Гавораць, што душа 40 дней ходзіць па хаце, нічога нельзя дзелаць. Завуць на абед тых людзей, каторыя мылі пакойніка, і тых, хто капаў яму.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н., 2005 г.

Калі это ўмер хто, наверное, такі ўжо абычай есць – закрываць зеркала. Як па закону, пакойнік далжон пераначаваць. Нада была, штоб яшчэ душа са ўсімі так у хаце была.

Вячэру дзелалі. У суботу перад Пасхай, ні на саму Пасху не хароняць. Гэта закон: сваім нельзя абмываць пакойніка, сваім нельзя памагаць нічога рабіць. Гроб тожа нельзя сваім несці. Ну, от так, па- божаму, наверна, паложаць так пакойніка, вады эта ж цёплай возьмуць, мокранькай трапачкай абцяруць, абцяруць чысценька і вытруць, чыстае адзяюць. Сваім не паложана дзелаць етага, завуць саседзей, там знакомых, і таксама прыходзіць бацюшка.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Велігорскай Ганны Акімаўны, 1930 г. н.
(раней пражывала ў в. Вялікая Весь Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Алена ***КАСТРЫЦА***

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І ЛОЕЎШЧЫНЫ

Англійскаму этнографу і вучонаму Э. Б. Тайлару належаць цудоўныя словы: «Калі які-небудзь звычай, навык ці думка дастаткова распаўсюджаны, яны падобны да патоку, які, аднойчы праклаўшы сабе рэчышча, працягвае свой рух на цэлыя стагоддзі» [1, 3]. На самой справе, мяняецца час, магчымасці, стымулы і перспектывы, але традыцыі застаюцца, ашчадна і надзейна перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Беларускі народны каляндар уяўляе сабой цікавую і багатую крыніцу вераванняў і народных ведаў, якія заснаваны на шматвяковых назіраннях за з'явамі навакольнай рэчаіснасці і перадаюцца пры дапамозе прыкмет і павер'яў.

Прыкметы і павер'і з'яўляюцца адной з архаічных з'яў фальклору. Яны ўзніклі ў глыбокай старажытнасці як спроба растлумачыць шматлікія змены, што адбываліся ў прыродзе, у асабістым жыцці людзей, у іх дзейнасці. Узнікненне і функцыянаванне найбольш старажытных прыкмет і павер'яў грунтуецца на глебе магічных, анімістычных, фетышысцкіх, татэмістычных вераванняў. Шматлікія міфалагічныя ўяўленні, адлюстраваныя ў названых малых жанрах, абавязаны сваім паходжаннем адухаўленню неба, зямлі, сонца і іншых прыродных з'яў.

Прыкметы і павер'і характарызуюцца спецыфічнымі адносінамі да рэчаіснасці і адметным спосабам яе адлюстравання. Яны ў большай ступені, чым іншыя жанры, паказваюць, як знешнія фактары адлюстроўваюцца праз прызму ўнутранага ўспрымання чалавека, з якімі міфалагічнымі ўяўленнямі звязана гэтае адлюстраванне, якія формы яно набывае ў кожным канкрэтным выпадку, які характар – рэальны ці міфалагічны – тых ці іншых форм вераванняў, які іх патэнцыял практычнага выкарыстання.

Вытокамі ўзнікнення народных вераванняў з'яўляюцца таксама рэальныя ўмовы жыцця і побыту і найперш гаспадарчая дзейнасць: чым больш значнае месца ў жыцці чалавека займала гаспадарка (земляробства, жывёлагадоўля), тым больш захавалася прыкмет, павер'яў і магічных дзеянняў, накіраваных на павелічэнне ўраджаю і дабрабыту.

Павер'і прысутнічаюць ва ўсім, што мае дачыненне да існавання чалавека. Няма, напэўна, ніводнай сферы дзейнасці, ніводнага перыяду жыцця, які б не суправаджаўся шматлікімі прыкметамі і павер'ямі. Раслінны і жывёльны свет («Заяц папярок дарогі перабег – няўдача цябе ждзе. Калі пятух ноччу закукарэкаў – ажыдай няшчасця» (г. п. Лоеў; Жураўская Кацярына Яфімаўна, 1938 г. н.)), прыродныя з'явы і прадметы нежывой прыроды, нараджэнне і

смерць («Цяжарнай жанчыне нельга працаваць на русальным тыдні, інакш у яе народзіцца ўрод» (в. Сяўкі Лоеўскага р-на; Плюшчай Валянціна Іванаўна, 1934 г. н.)), выхаванне і вучоба, надвор'е і ўраджай становяцца аб'ектамі пільнай увагі з боку чалавека. Штогадовыя назіранні, асацыятыўнае мысленне, своеасаблівасць народнага светапогляду, багатая фантазія паспрыялі стварэнню шэрагу парад, забарон, прыкмет, павер'яў і звязаных з імі магічных дзеянняў, якія з'явіліся пэўным практычным кодэксам паводзін гаспадара.

Вялікая колькасць прыкмет і павер'яў звязана з агнём, вадой і зямлёй. Пакланенне гэтым стыхіям мае старажытную аснову і ўзыходзіць сваімі каранямі да часоў язычніцтва, калі чалавек абагаўляў і адухаўляў прыроду, надзяляў яе звышнатуральнымі якасцямі. Ва ўяўленнях нашых продкаў агонь, вада, зямля маюць антрапаморфны выгляд, выступаюць як жывыя істоты (яны маюць жыццё, імёны, могуць размаўляць, слухаць, спаць і г. д.), здольныя не толькі знішчыць усё благое, зберагчы ад зла, аднак і прынесці непрыемнасці, адпомсціць тым, хто парушае пэўныя законы быцця («На Благавешчанне нічога рабіць нельга: гарадзіць нельзя, убіваць калоў нельзя. Ніхто зямлю трогаць не даўжон – не паложана. Зямля запячатана. Потым адпячатаецца ета зямля, тады можна і пахаць. Да гэтага нельга, бо дождж не йдзець» (в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на; Петухова Марыя Іванаўна, 1933 г. н., Старажова Куліна Парфёнаўна, 1934 г. н., Тачыленка Лідзія Трафімаўна, 1928 г. н.)).

Народ ставіць расліны побач з такімі важнымі стыхіямі, як агонь і вада, надзяляе іх звышнатуральнымі якасцямі і незвычайным паходжаннем. Абрадавае выкарыстанне зеляніны грунтуецца на веры ў апатрапеічныя здольнасці прадметаў (яны могуць быць сімвалічнымі), якія маюць адносіны да гэтага магічнага («Асіну ставілі пад сарай – на абярог ската, бярозку – для людзей, сям'і» (в. Суткова Лоеўскага р-на; Бондар Соф'я Дзмітрыеўна, 1937 г. н.). Найбольшай папулярнасцю, згодна з народнымі ўяўленнямі, карыстаюцца наступныя расліны: вярба, крапіва, бяроза, асіна. Прыродныя якасці гэтых раслін, а таксама незвычайныя ўласцівасці, якімі іх надзяляе чалавечая фантазія, абумовілі іх шматфункцыянальную нагрузку. Яны могуць засцерагаць ад неспрыяльных атмасферных з'яў (маланка, гром, град, пажар), аберагаць ад нячыстай сілы, спрыяць добраму ўраджаю, дапамагаць пазбаўляцца ад заняпаду ў гаспадарцы (пустазелля, грызуноў, чарвей, «мядзведак» і да т. п.).

Сярод разнастайных форм абрадавага выкарыстання зеляніны ў большай ступені запатрабаванымі з'яўляюцца біццё (для здароўя, ураджаю, ад ведзьмаў і г. д.) і спальванне (ад неспрыяльных прыродных стыхій, шкоднага ўздзеяння («Як вярбу пасвеціш, пруцік бярэш, скаціну выганяеш і як прыгоніш – назад у сарай, каб яе скот не калоў» (г. п. Лоеў; Кулеш Валянціна Сцяпанаўна, 1940 г. н., Самусенка Любоў Аляксандраўна, 1938 г. н.)).

Прыкметы і павер'і, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю, з ураджайнасцю, – своеасаблівы жыццёва-філасофскі звод народна-практычных ведаў і міфалагічных асаблівасцей светаўспрымання.

Штогадовыя назіранні, асацыятыўнае мысленне, своеасаблівасць народнага светапогляду, багатая фантазія паспрыялі стварэнню шэрагу парад, забарон, прыкмет, павер'яў і звязаных з імі магічных дзеянняў, якія з'явіліся пэўным практычным кодэксам паводзін гаспадара.

Плён у гаспадарцы, высокі ўраджай, яго якасць, памер і захаванасць былі спрадвечным клопатам селяніна. Для таго, каб паўплываць на вегетацыю некаторых

раслін, каб дасягнуць пастаўленай мэты, вырасціць і захаваць добры ўраджай, селянін выкарыстоўваў розныя шляхі («Шчыталі, хто скарэй прыйдзе з цэрквы на Пасху, у таго будзе добры ўраджай» (в. Суткова Лоеўскага р-на)).

Страх і бяссілле нарадзілі пэўныя забароны і засцярогі (устойлівае бытаванне іх падтрымліваецца традыцыяй), звязаныя з ураджаем і дабрабытам, якія ў большасці выпадкаў могуць быць прадстаўлены ў выглядзе схемы: калі не хочаш гэтага, не рабі тое («Гавораць, што 6 мая, на Юр'я, каб хазяйка курэй на росу не пускала, патаму што калі расы етай куры схвацяць – яічак не будзе» (в. Чаплін Лоеўскага р-на; Грыцкова Эмілія Яўхімаўна, 1933 г. н.).

Механізмы ўтварэння групы прыкмет і павер'яў, звязаных з надвор'ем, не заўсёды зразумелы сучаснаму чалавеку. Тое, што з'яўлялася для нашых продкаў рэальнасцю, нам падаецца выдумкай. Прадказанні надвор'я ў сваёй большасці заснаваны на прынцыпе мадэлявання пэўных асаблівасцей. З дапамогай сімвалічных адзінак, супастаўленняў і супрацьпастаўленняў усталёўваюцца асноўныя параметры вызначэння (прадказання) атмасферных змен («Калі первыя два дні ў іюлі дождж ідзе – весь месяц сухі будзе» (г. п. Лоеў, Жураўская Кацярына Яфімаўна, 1938 г. н.)).

Адзначым, што з цягам часу народныя прыкметы і павер'і ператварыліся ў своеасаблівыя маральна-этычны і утылітарна-практычны кодэксы, у рэгламентацыю паводзін чалавека.

Прыкметы і павер'і, а таксама шырокі спектр магічных дзеянняў адлюстравалі своеасаблівасць мыслення, багацце народнай фантазіі, высокі творчы і стваральны пачатак беларусаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Тайлор Э. Б.* Мифы и обряды в первобытной культуре. – Смоленск : Русич, 2000. – 624 с.

ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

Калі на Пакровы мароз, то зіма будзе цяжкая.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Савянок Марыі Рыгораўны, 1941 г. н., 1999 г.

Нельзя на ноч ключы на стале астаўляць, каб быў дабрабыт у хаце.

Нельга пляваць на зямлю – яна святая.

Калі чалавек едзе ў дарогу, то нельзя за нім зразу ўбіраць, пака не даедзе да места, каб усё добра было.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Калі выганялі на росы кароў і калі пузы мокрыя (расы многа на Юр'е), дык шчыталі, што ўраджай добры будзе. Было так.

Вось вы жывеце, так, што-та ў вас палучаецца нехарошае: дзверы ў вас адкрываюцца. Калі адкрыеце, там ляжыць цетрадзь, карандаш і свечка. Вы ціхенька сабірайце, але рукамі не бярыце ніколі, бо гэта вядзьмарства. А ціхенька нада забраць на достачку ці на савок, ямачку выкапаць і туда пакласці, і спаліць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі куры ўвесь час квокчуць – хто-небудзь памрэ.

На Дзяды трэба гатаваць сем страў, залежыць ад гэтага, як будзе ў сям'е добра ці пагана.

Студзень пагодны – будзе год плодны.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Філатавай Наталлі Міхайлаўны, 1943 г. н., 1999 г.

Калі сарока часта садзіцца на хлеў і сакоча, значыць, там знаходзяцца нячысцікі. А калі яна сакоча, то нячысцікі раз'юшваюцца, могуць нанесці шкоду жывёле, і зыходзяць яны з хлява.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Пілека Ганны Мікалаеўны, 1937 г. н., 1999 г.

Еслі накрывалі крышкай там у гаршку, ну, вот перад тым, як ужэ есць, адкрываюць этую крышку: еслі раса, значыць, будзе ўраджайны год, еслі няма, то няма і ўраджаю. Вот на 3 куцці ўсё глядзелі, ці ёсць раса.

Хлеб аддавалі каровам і сена тожа.

На Шчадруху, якая пападае ў ва ўторнік, у срэду, у любы дзень, то ў такі дзень (а назаўтра ўжэ стары Новы год, эта (13) Шчадруха) закопваюць, еслі картошкі не закопваюць, то мышы паядзяць усё: і салому, і картошку.

На печке не нада спаць, эта ж прыцяжэнне, гавораць. А еслі граза, так мая мамка пакойная хадзіла ды вокны крысціла, і ета ж, малітву якусь гаварыла. Да я, дзетачкі, не помню.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі ў дзеўкі сякуцца або лезуць валасы, то яе хлопец любіць другую.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Крупейчанкі Івана Апанасавіча, 1935 г. н., 1999 г.

Ката першага пускалі ў новы дом.

Кату адрубілі кончык хваста, таго што хвост – гэта вуж, які сядзіць у ім.

Квасяць капусту, штоб на першы дзень маладзіку. Ета яна ўкусная і харошая тады.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калі рана шмат лісця падае з бярозы, то будзе ранняя вясна.

На Пакроў вецер – зіма халодная.

Калі зіма снежная, лета будзе даждлівае.

Калі зіма сухая, то і лета будзе сухое.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Цукаравай Феафаніі Іванаўны, 1931 г. н., 1996 г.

Гаварылі, еслі рабёнак або чалавек балеет, на яго грудзі лажылі чорную кошку, ці яна сама прыходзіла і лажылася. І ён выздаравлівае тады. Кошка чуствуе, дзе бальное места, і туда лажыцца.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Калі апрэль ветраны да халодны, то прападзе ўсё ў полі.

Запісана ў в. Алішэўка Лоеўскага р-на
ад Прымак Надзеі Фёдараўны, 1939 г. н., 1999 г.

Еслі мертвец сасніцца, то гэта значыць, што дождж будзе ісці.
Еслі зімой сасніцца мертвец – к снегу.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Чаму нельзя пляваць праз правае плячо? А таму, што з правага боку святыя духі, а з левага – нячыстая сіла, і на яе нада пляваць.

А мусар раньшэ зжыгалі ў дамах, а не выносілі із хаты, бо шчыталася, што выносілі сваё шчасце. Тое самае і з памыямі рабілі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

Лічылася, што на Благавешчанне нельзя нічога сеяць і вабшчэ зямлю трогаць нельзя да гэтага праздніку. А цяпер вось дажджэй няма, бо сеялі да Благавешчання.

Ад засухі, калі дажджу не было, то хадзілі і бралі гаршкі, што вешалі на забор, б'юць іх і ў калодзеж кідаюць. Барану бралі і цягалі круга пасёлка, зачапілі дзеўкі і цягаюць. Мак святы кідалі ў калодзеж.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Мікітаўны, 1928 г. н., 2002 г.

На Стрэчанне, 15 студзеня, калі снег дарогу перамятае, то вясна будзе позняя, калі не, то ранняя.

За колькі дней да Благавешчання пчолы выляцяць з вулля, столькі пасля праседзяць у вуллі.

Калі на Саракі будзе мароз, то пасля Саракоў будзе яшчэ сорак марозаў.

Калі сабака па снегу качаецца, то будзе адліга.

Еслі пчолы не ідуць на лёт, то будзе дождж.

Калі лісце з дрэў падае адразу, то зіма ляжа зразу, калі знізу – ляжа рана, калі зверху – позна.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на ад Кашперка Надзеі Яфімаўны, 1931 г. н., Афанасенка Матроны Юр'еўны, 1931 г. н., 2000 г.

Калі зіма бурная, тады наступнае лета будзе даждлівым.

Калі ў ноч на Благавешчанне будзе мароз, тады холад будзе прадаўжацца 41 дзень.

Множаства сярожак у асіны – к ураджаю аўса і поўбы.

Множаства сярожак на альхе – к ураджаю грачыхі.

Куры дрэнна нясуцца – к ураджаю.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на ад Прышчэп Марыі Ульянаўны, 1927 г. н., 1993 г.

Многа бярозавага сока – усё лета дождж ліць будзе.

Калі мой сабака валяецца па снегу, то тады хавайся, бо будзе мяцель.

Ежэлі пціцы ўсе разам сабіраюцца і паляцяць, то зіма будзе строгай.

Када ў хаце мяцеш, ну, вы, напрымер, маладыя дзеўкі, так нельзя месці вакруг себя, вы так жаніхоў замятаеце.

Када збіраешся ў дарогу, нада прысесць на дарожку, тады будзе ўсё добра. Ды яшчэ во выбіраешся ў дарогу, ета ж дома нельзя мыць палы, вымятаць, а то во замяцеш след, і ён не вернецца.

Када блісцяць зоры ўзіму, то вялікі мароз будзе.

Нікагда не глядзіцеся ў зеркала разбітае, з трэшчынамі, нельзя глядзецца, эта плоха.

Верце, дзевачкі, валасы свае з грэбня нельзя выкідаць так: на вецер, на вуліцу, а то галава будзе балець. Нада іх паліць.

Бярэменныя жэншчыны не стрыгуць валасы, а то так можна ўкараціць ум дзіцёнку.

Шапку нельзя лажыць на стале, а то галава будзе балець усё ўрэмя.

Ну, яшчэ чуў, што нельзя шапку ў руке круціць, а то патом сама галава будзе кружыцца.

Жэншчынам нельзя сядзець на стале, а то будзе трудна ражаць.

Мой дзед шчэ гаварыў мне, што нельзя качаць нагой, а то ета чорта качаеш.

Мая матка шчэ казала, штоб я браў у рот кусочак ніткі, када яна на мне шыла што-та.

Ну, ета ўжэ ўсе знаюць: з нажа нельзя есць, а то злым будзеш.

Ну, е шчэ прымета на гасцей: еслі госці ўжо апаздываюць, то нада за скацерць падзёргаць, дак яны хутчэй прыйдуць.

Када еш і ўпадзе вілка, то нада пастучаць ёй па полу 3 разы, і тады не будзе нечаканых гасцей.

Када дома пацяраеш што, то нада так дзелаць: стул узяць, абвязаць яго чатыры ножкі платком, абайці 3 разы і сказаць (ну, я точна не помню), што-та такое: «Чорт, чорт, не іграй. Паіграў – так аддай».

Шчэ малымі былі, так кагда нос чэшыцца, то дулі круцілі пад носам.

Када на Мефодзія дождж, то пасля яго шчэ 40 дней будзе дождж. Ну, вы знаеце, і праўда ета!

Када рабіна очэнь красная расце, дак эта к халоднай зіме.

Еслі дзеўка ўжо прысніць свадзебнае плацце белае – эта к смерці.

Ладошкай нельзя страхіваць крошкі са стала, а то грошай не будзе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кацубы Міхаіла Мацвеевіча, 1930 г. н.
(раней пражываў у в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Цяжарнай жанчыне нельга працаваць на русальным тыдні, інакш у яе народзіцца ўрод.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Плюшчай Валянціны Іванаўны, 1934 г. н., 1999 г.

Еслі дзевушка долга не выходзіла замуж, то её раздзевалі нагала і пускалі бегаць па полю (жыту). Счіталась, што это паможэт ей выйці замуж.

Кагда в дзеревне случался пажар, бралі самую старшую жэншчіну і вадзілі яе з іконай Мікалая Угодніка вакруг пажара, і тагда он не перекідавался дальшэ.

Каб засеяная паласа не была вынішчана градам ці бураю, трэба ставіць на паласу вярбу, асвечаную на Юр'я.

Штоб гром і молнія не папалі в дом, ложаць пасвячонае яйцо пад страху дома.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., 2005 г.

Калі дзіця есць зямлю, то яно будзе доўга жыць.

Калі цяжарная жанчына пачуе дзіця ў правым баку, то будзе сын.

Калі ліст з дуба і бярозы падае на Пакроў і ўпадзе чыста – к лёгкаму году, а калі не – зіма будзе суровая.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Калі заносіш дзіця ў царкву, і яно крычыць, то жыць яно нядоўга будзе.

Калі ў пакой заляціць ластаўка, то смерць будзе.

Калі мярцвяк у грабу ляжыць, трэба за яго падзяржацца, каб не сніўся потым.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., 2005 г.



У агонь нельзя плеваць – грэшно.
Нада кідаць гладышкі ў калодзеж, штоб дождж быў.
Еслі жабу ўб'еш, то дождж пойдзе.
Чэраз парог нельзя нічога даваць.
Бярэменнай нельзя сядзець на пароге.
Маладым нельзя на рагу стала сядзець, штоб выйсці замуж.
Нічога з двара нельзя позна выбрасываць.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Ля калодзезя аблівaліся вадой, кідалі куўшыны ў калодзеж, кралі іх, штоб дождж ішоў.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

А я ў агародзе саджу агурцы. І штоб яно разоў 3 так памаліўся, штоб яны там харошыя раслі. Штоб і ўжо былі харошыя, эта я так прашу: «Госпадзі, міласцівый, памагі мне, Божачка!» Дык і добры ўраджай тады.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Усегда сваім дзецям і ўнукам я казала: «Кагда ядзяць, не нада чытаць: так можна сваю памяць з'есць».

Кагда прысніцца мне дурны сон, то ўтрам трэба ўстаць і прашаптаць яго на воду. І такі сон не збудзецца.

Ведаю, што пустыя бутылкі нельзя астаўляць на стале. А чаго – не ведаю.

Ну, вот знаю, што хлеб нельзя ставіць на гарбушку. Эта к смерці ці балезні якой.

Кот калі лашчыцца, то ён лажыцца на тое месца, дзе ў цябе балячка якая ёсць.

Нельзя мусар пад кавёр замятаць. А чаго – не знаю. Гавораць так.

Павукоў нельзя ўбіваць. Яны ж у хаце далжны жыць.

Ката вабшчэ нельзя лажыць у калыску к малым дзецям, а то яны ж могуць і задушыць іх.

Восенню, еслі бачыш павука на павуцінні або павуцінне, якое ляціць, дак эта к баб'ему лету.

Ведаеце, што калі сабака выe на луну – эта к пакойніку.

Бывае, што прысніцца, што купаюся ў гразнай вадзе, дык эта значыць, што цябе будуць абзываць і плоха казаць пра цябе.

Ой, прысніцца ж такое! Г... калі сніцца, слухайце, дзеўкі, дак эта ж к грошам.

Слухайце ж, дзеўкі! О, такое можна гаварыць перад сном з чацвярга на пятніцу: «Лажусь на маціцу, маціца, перавярнісь, хто палюбіць, той прысніс».

Ад зглазу нашу пад плаццем булаўку.

Во, калі паглядзіш на неба, а там месяц, ну такі, сярпом, уніз глядзіць – эта ўжо к дажджу, а калі во такі (коўшыкам) – эта ўжэ будзе цёпла.

Калі ў двор прыляцела сарока, то значыць, гавораць, што яна вестачку якую прынясе.

Маладой дзеўке кагда сніцца рыба – эта значыць, яна бярэменная.

Ведаеце што, калі сінічка заляціць у хвортачку – эта можа быць к смерці.

Кагда я ўчылась шыць, то мне мамка гаварыла, што перадаваць іголку нада, утыркнуўшы ў кусок тканінкі якой.

Я на дзяцей не ругалася, кагда яны пасуду якуюсь разаб'юць – эта на шчасце.

У хаце, ведаю, нельзя свісцець, а то мышэй будзе многа, а грошай мала. Ката тожа нельзя за хвост цягаць – эта ён гадзіць будзе ў доме.

Яшчэ прымеціла, што кагда кот ліжацца, то эта ён гасцей намывае.

Кагда кот лезе на печ – эта значыць, пахаладае.

Дзетачкі, калі нож пакінеш на стале, то шмат суеціцца будзеш па хаце.

Еслі жэншчына-саседка пяройдзе табе дарогу з пустымі вёдрамі, эта, мае дзетачкі, плоха, а калі з поўным, то грошы ў хаце весціся будуць.

А вы ведаеце, што нельзя во етыя свае сумкі на стол класці, а то грошы ў вас весціся не будуць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Параскевы Рыгораўны, 1930 г. н., 2005 г.

Кагда сатана хацеў спакусіць чалавека на што-та такое плахое, трэба сказаць: «Тфу, сатана, адкаснісь ад меня». Еслі злішся – сатана радуецца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Пасвячоны хрэн на акне абараняе ад грому, а на зіму к іконе прыбяру.

Усягда астаўлялі адно пасвяцонае яечка ад новага да новага года. Яно абараняла, калі пажарышча ці вецер які: кінь яйка ў пажарышча – і ўсё ўйдзёць. Гэта была наяву.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кардаш Вольгі Мікітаўны, 1931 г. н., 2005 г.

Нельзя на парозі сядзець.

Нельзя перадаваць што-небудзь праз парог. Нада перайсці парог, тада аддаваць.

Еслі ходзіш ты ў палажэнні, нельзя на парозі стаяць, бо доўгія роды будуць.

Каб быў добры ўраджай, выносілі іконку, хадзілі кругом.

Кідалі лапату, што хлеб сажалі, на двор, ужо як пойдзе град, дак штоб град не біў.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Нада хлопца купаць у любісціке, і будут дзеўкі яго любіць.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Гурыновіч Васіліны Філімонаўны, 1935 г. н.
(раней пражывала ў в. Барысаўшчына Хойніцкага р-на), 2005 г.

Каб быў хлеб харошы, нада снег вялікі і глыбокі. Снегу надует, то многа хлеба будзет, а вада разальецца – сена набярэцца.

Іней ноччу ўпаў – снег днём не выпадзе.

А вы ведаеце, шчэ нада, мне матка гаварыла, што када лошадзі спяць у стойле стоячы, дык да холаду. А во лажыцца – цяпло.

Калі дзіцё раждалась, яго інагда абмывалі ў вадзе з манеткамі. Яго так абмываў бацька. Ну, ета для таго, шоб багаты быў.

Када ўзімку, у пачатку многа доўгіх сасулек – да ўраджаю.

Дождж на Благавешчанне – многа грыбоў.

Калі аддолжыш грошаў перад Новым годам, дак будзеш доўжан увесь год.

Калі чырвоны месячык, то будзе вецер.

Нельзя месці мусар да чэрэз парог дзеўке. Эта ана жаніхоў вымятае. Яму нельзя чэрэз парог перадаваць там разныя вешчы. Эта к нядобраму.

Када мяцеш мусар, нельзя на другога месці, эта так ты на яго ўсё такое плахое шлеш.

Венік у хаце нада ставіць палачкамі етымо, ну там, дзе завязана. Эта для таго, шоб багатым быць.

Када пцічка ета, ну, варона ходзіць па дарогі, дак да цяпла.

Дак ета во сільная раса на Купалле – да ўраджаю агуркоў.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Любові Фядотаўны, 1927 г. н.
(раней пражывала ў в. Клубаўка Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Кажуць, як первы дзень Каляд цёплы, то будзе цёплае лета. А там вот снег ці дождж, то будзе даждлівае лета.

Калі садзіць гуркі на Юр'я, то гэта іх багата будзе.

На Міколу добра сеяць.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Ходили вокруг с солью и посыпали потроху и с любой молитвой, чтобы если боялись, что плохой урожай или побило помидоры, пшеницу, всё было хорошо и собрали много, чтоб не сурочили.

Брали чертополох и развешивали его везде в хате, особенно когда заходишь в хату. Делали так, чтоб не сурочили, чтоб ведьму отвадить.

Нельзя было махать ногами, когда едешь куда-то: с земли на себя накликаешь души мёртвых. Особенно очень опасно для молодых и детей.

Нельзя купаться после Ильи. После второго августа, говорят, что Илья наробил в реку. Илья наробит гнилья. Болячки будут. И река грязная. Ходить купаться можно после Переплавной среды.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Кудраўцавай Наталлі Данілаўны, 1972 г. н.

Еслі раса на траве, значыць, дажджа не будзе, а еслі расы няма, значыць, дождж будзе.

Адзяваліся ў русалак прыгожа. У нас была рож бальшая такая, мы туда хадзілі, плялі вяночкі. Хто сахраніт, прыбяжыт – на капусту ложыт: качаны штоб харашо завіваліся, харошыя былі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кулеш Валянціны Сцяпанаўны, 1940 г. н.,
Самусенка Любові Аляксандраўны, 1938 г. н.

Як пакойнік да свадзьбы, значыць, свадзьбы не будзе.
Сорак трэсак нада было ўнесць на Соракі, каб сорак яечак узяць.
Калі дождж і снег на свадзьбу, значыць, багатымі будуць.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Каляда Таццяны Паўлаўны, 1944 г. н.

Гавораць, што 6 мая, на Юр'я, каб хазяйка курэй на расу не пускала. Патаму што расы етай куры схвацяць – яічак не будзе. Эта так у дзярэўні гавораць.

Маладых садзілі на кажух, каб багатымі былі. У кажух лажылі грошы.

Запісана ў в. Чаплін Лоеўскага р-на
ад Грыцковай Эмілії Яўхімаўны, 1933 г. н.

Выйдзеш на Каляды – на небе зорачкі. Гэта значыць, багаты ўраджай будзе.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Рудак Ганны Пятроўны, 1923 г. н.,
Чаюк Любові Пятроўны, 1943 г. н.

Кажуць, куццю трэба варыць і курам даваць, каб несліся.

Увечары глядзіш, ці ё на небе зоры. Тады грыбоў будзе багата. Еслі зоры на первую куццю, то первыя грыбы будуць. Еслі на втарую куццю неба такое хмарнае, цёмнае – не будзе грыбоў. А на трэцюю – не будзе ўсё лета грыбоў.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Нямлей Вольгі Іванаўны, 1928 г. н.

Паскі пеклі і на стол клалі, на кут клалі, штоб было багатства ўсем.

Куццю ету абычна курам аддаюць, штоб куры неслісь.

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Кулага Валянціны Іосіфаўны, 1935 г. н.

Курам, карове неслі верх куцці, штоб куры не разбягаліся, кучкай хадзілі.

Бабкі-шаптухі прасілі кусок хлеба, каб на яго шаптаць.

Любы май (зеляніну) кладуць у капец бульбы – ад мышэй.

Запісана ў в. Белы Калодзеж Лоеўскага р-на
ад Камзолавай Ганны Іванаўны, 1940 г. н.,
Вострык Марыі Савельеўны, 1925 г. н.

Яйца красілі на Паску і ў царкву хадзілі. А вы знаеце, капусту палівайце, калі вот начынаецца вусень, вадой, што яйца красілі.

На голую лаўку маладых не сажаюць, каб былі багатыя. Яшчэ ў кажух лажылі грошы, штоб маладыя разжываліся.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кулеш Валянціны Сцяпанаўны, 1940 г. н,
Самусенка Любові Аляксандраўны, 1938 г. н.

Калі хто з блізкіх памрэ, то хаты не беляць, паскі не пякуць, яечкі не красяць.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Валянціны Іларыёнаўны, 1928 г. н.

На Паску пеклі сорак жураўлікаў і кідалі іх, загадвалі пра любоў, каб ураджай быў харошы.

На свадзьбе кідалі цвяты ўгору. Якая з дзяўчат зловіць, тая і замуж пойдзе.

Жаніха і нявесту садзілі на кажух, каб грошы былі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Малянок Марыі Якаўлеўны, 1927 г. н.

Вадзілі русалку і перад Пятром у жыта, каб качан быў крэпкі. На галаве ў дзяўчыны вянок з жывых кветак.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бераснёвай Валянціны Уладзіміраўны, 1935 г. н.

Сорак трэсак перакідвалі цераз страху (на Соракі), штоб находзіліся яечкі.

Еслі адкусіў пасвечаную паску і не папярхнуўся – будзе жыць.

Еслі карова пачынае кроўю мачыцца, забівалі асінавы калок на тое месца.

На Юр'е ведзьмы малако адбіраюць.

У купальскую ноч нада, еслі скот дзяржыш, аблажываць усё крапівай.

Калі памёр хтосьці з бацькоў маладых, то радзіцелі не сустракаюць, сустракаюць хросныя.

Штоб жызня была шчаслівая, пасыпалі маладых жытам, канфетамі.

Чарапкі ад гаршка з бабінай кашы на галаву паложаць і цокнуць, калі дочак няма.

Запісана ў в. Белы Калодзеж Лоеўскага р-на
ад Герасенка Раісы Васільеўны, 1938 г.н.
(раней пражывала ў в. Азершчына Рэчыцкага р-на)

Верх куцці аддавалі курам, каб несліся. На салому, што пад куццёй, курыцу садзілі.

Калі на Стрэчанне певень вады напіўся, а на Еўдокі вол – вясна будзе цёплая.

На Соракі дровы перакідвалі праз хату, каб сорак яечак знайсці.

Вярбу свяцілі на Вербную нядзелю, ставілі ў хляве пад стрэху, на прыпечку лажылі ад гразы.

Хрэн сухі і арэхі грэцкія лажылі ў карман ад зглазу.

На Тройцу асінку ўбівалі ў зямлю, каб адбівала нячыстую сілу.

Калі булку хлеба кінулі ў ваду, то патопіцца радня.

Запісана ў в. Старая Лутава Лоеўскага р-на
ад удзельніц фальклорнага гурта «Лутава»

Шкарлупу з яйка пасвечанага курам аддавалі, каб куры несліся.

Бывае (Русалле) ні ў суботу, ні ў пятніцу. З русалкі вянок схватывалі і клалі кругом капусты, штоб качаны завіваліся харошыя.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Каваленка Ганны Мікалаеўны, 1939 г. н.
(са слоў Марчанка Алены Рыгораўны, 1909 г. н.)

Шукалі папараць-кветку на Купалле. Хто знойдзе яе, той будзе шчаслівы. Раніцай травы збіралі на зелле : «Іван, Іван, на табе хлеб-соль, а нам аддай зелле». Мы тыя цвяты пасушым і ў чай кідаем.

На Івана ведзьмы шкоду рабілі: за гладышку ды пабегла па расе, тую расу збіраць. Прыходзім, а ў каровы малачка няма – ведзьма сабрала. Шапталі. Абараняліся ад іх, усё было.

Свецяць вярбу, і цвяты свяцілі. Цвятамі тымі мылі галаву, як баліць галава, мылі.

А каровак у первы раз тожа вярбой свячонай выганяюць.

Куццю ставілі на кут, а на ту салому садзілі курэй, каб несліся, штоб сядзела на яйках – не злазіла.

Казалі, калі звёзд багата на Каляды, грыбоў будзе багата, ягад будзе. Ё воблака на небе – тады гуркі, гарбузы будуць.

Маць як прысніцца – усягда які-небудзь убытак.

На Юр'я мыліся абязацельна расой, штоб здаровы быў, галава не балела. Пад парог ніты клалі, калі ў першы раз кароў выганялі, замок замыкалі, а на етую ноч вешалі крапіву на сараі, на вароты, штоб ведзьма малако не адабрала ў кароў.

На Стрэчанне лета з зімой встрачаюцца. Людзі свечкі свецяць у цэркві і бяруць з сабой. Када чалавек умірае, даюць у руку свечку.

На Благавешчанне нічога рабіць нельга: гарадзіць нельзя, убіваць калоў нельзя. Ніхто зямлю трогаць не даўжон – не паложана. Зямля запячатана. Потым адпячатаецца ета зямля, тады можна і пахаць. Да гэтага нельга, бо дождж не йдзець.

Шкарлупу з пасвяцонага на Пасху яечка збіраюць. Не выкідаюць. А кідаюць у агарод, у барану кладуць і сеяць.

Яечка паложаць у кружачку, і ўмываліся яны, уся сямейка ўмывалася, каб былі красівыя, як гэта яйцо.

Да Спасу нельзя яблакі есці, асобенна ў каго дзіцятка памерла.

На пахаванні глядзяць, штоб нічога ў гроб не падлажылі. Ё такія людзі, што ўсунуць што-небудзь , каб дурное зрабіць.

Калдуны цяжка ўміраюць. Еслі он не перадасць, то Бог на той свет не пусціць. Акно расчынялі, дзверы.

Нельзя на пароге стаяць, нада , штоб перайшоў чалавек парог.

Я калісьці к свякрусі прыйшла, да тая казала: «Дзетка! Хату мяці, а смецце, колькі жывеш, ніколі на вуліцу не нясі!» На ноч нельзя выкідваць.

Нельга каля хаты садзіць плакучую іву, рабіну.

Як пачуеш гром, трэба качацца па палу. Дзе ўслышаш гром, там можаш і качацца.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Петуховай Марыі Іванаўны, 1933 г. н.,
Старажовай Куліны Парфёнаўны, 1934 г. н.,
Тачыленка Лідзіі Трафімаўны, 1928 г. н.

Шкарлупу ад пасхальных яек то курам кідалі, то на агарод.

На Масленіцу, кажуць, не нада сціраць, штоб малако не пенілася.

Калі на Каляды многа зорак, то будзе ўраджай на грыбы.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Халалеенка Марыі Якаўлеўны, 1931 г. н.,
Халалеенкі Івана Мікітавіча, 1935 г. н.

Удовы пралі кудзелю, лён. За дзень напрадуць, наткуць палатна, тады ўжо ідзе дождж.

Вадой аблівaліся каліся. Пастух гнаў кароў, яго вадой аблівалі, каб дождж ішоў.

Калі жанчына была цяжарная, нельга было рабіць нікому з сям'і ў празнікі: дзіця магло радзіцца калечаным.

Шкарлупу ад яіц пасхальных сыпалі ў баразну. Тады, гавораць, павінна быць картошка чыстая.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Шамела Ганны Якаўлеўны, 1914 г. н.,
Казмярчук Марыі Паўлаўны, 1928 г. н.

Бярэменным чэраз вяроўку пераступаць нельга было.

Нельга бярэменным падходзіць к мёртвым. Калі мёртвага выносілі з хаты, нельзя было бярэменнай знаходзіцца ў хаце.

Нікагда не выбіралі кумоў з адзінакавымі імёнамі.

Мужа і жонку нікагда не бралі ў кумоў.

Калі наражаўся мальчык, яго купалі ў вадзе, а ваду вылівалі пад яблыняй, штоб у етых людзей свае добрыя мальчыкі раджаліся. А калі дзевачка, то ваду вылівалі пад вішню.

У рукі памершага давалі грамнічную свечку. Калі хтосьці памірaў, адкрывалі окна, дзверы, астанаўлівалі часы, закрывалі зеркала.

Сабака выe – к смерці.

Калі январ халодны, то іюль будзе сухі і жаркі, не ждзі грыбоў да восені.

Лес трашчыць – мароз будзе стаяць доўга.

Снега як надуе, дык хлеба прыбудзе.

Калі зімой гром грыміць, будзе вецер сільна дмуць.

Калі январ цёплы, вясна будзе позняй.

Калі слышна эха ў январэ – марозы крэпнуць.

Калі ў январэ слякаць, будзе ў іюлі дождж.

Калі конь зімой лажыцца – к цяплу.

Калі на Хрышчэнне поўная луна – вясной будзе вялікі разліў рэк.

Вароны каркаюць стаяй – к марозу.

Бальшая раса ўранні – к пагодзе, а калі няма расы – к дажджу.

Калі первыя два дні ў іюлі дождж ідзе – весь месяц сухі будзе.

Калі ўтрам сільная раса і туман – к добрай пагодзе.

Заяц папярок дарогі перабег – няўдача цябе ждзе.

Калі пятух ноччу закукарэкаў – ажыдай няшчасця.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Жураўскай Кацярыны Яфімаўны, 1938 г. н.

Еслі быў пажар, з пасхальным яйцом абыходзілі хату, каб другія не загарэліся.

Шкарлупкі асвечаныя толькі курам аддавалі. Косці закапвалі на гародзе ці ў сараі. Ета дзелалася, каб жывёла не балела.

Шчыталі, хто скарэй прыйдзе з цэрквы на Пасху, у таго будзе добры ўраджай.

Бабушка застаўляла дзяцей умывацца юраўскай расой. Шчыталася, што яны будуць чыстымі, бо Юр'я пасвяціў гэту вадзічку.

На Тройцу ішлі ў царкву, свяцілі цвяты, сушылі і лячылі імі, купалі дзяцей.

Еслі дзіця не спіць – выціралі падолам.

Бярэменнай нельзя было пінаць нагамі кошку, сабаку, бо дзіця будзе ва сне каўкаць, пішчаць, вішчаць.

У каляску лажылі свячоныя цвяты. Брызгалі святой вадой, штоб дзіця не балела.

Сабака вые ўніз да зямлю капае – да смерці, уверх – на пажар.

Перад Тройцай скошанае сена лажылі карове, штоб перазімавала.

Асіну ставілі пад сарай – на абярог ската, бярозку – для людзей, сям'і.

Запісана ў в. Суткова Лоеўскага р-на
ад Бондар Соф'і Дзмітрыеўны, 1937 г. н.

На Пасху нельга было дома вешаць розныя трапкі, штоб дзеці спакойныя былі.

Нельзя бярэменным пераступаць чэраз вяроўкі, аглоблі, каб у дзіцяці не заматалася пупавіна.

Нельзя бярэменнай у калодзеж з вядра адліваць ваду, каб дзіця не рвала.

Нельзя ісці і пляваць семкі – дзіця саплівае будзе.

Нельзя хадзіць на кладбішча, бо скора памрэ дзіця.

Нельга біць жывёл ні нагамі, нічым, бо ў дзіцёнка будуць шрамы.

Шпылячку зашпільвалі ў калыску малому, каб не зглазілі.

Малога не паказваюць нікому.

Запісана ў в. Каўпенъ Лоеўскага р-на
ад Краснаяравай Кацярыны Фёдараўны, 1945 г. н.

Што смецце вымецеш вечарам, не выкідаць. Таму што шчыталася, што шчасце сваё выносіш з хаты.

Калі што з рэбёнкам станецца (ці спугаецца), дак нада тым, што мужчына іспускае ў пасцелі, змазаць віскі. І ўсё пройдзе.

Калі дзіцёначак нягеглы, то нада ізмераць яго лінеечкай, убіць там асінавы кол, і калі ён гэты рост перарасце, то будзе жыць.

Калі скруце дзіцятка, гэта бывае, калі ў нерв пападуць уколам, то нада падняць спадніцу, зняць бялізну і сесці на ліцо.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Раньшэ ў нас, калі дождж не ішоў, бралі барану дзеравянную і цягалі з адной стараны вуліцы ў другую па дзярэўне. І так звалі дождж. А патом знімалі гаршкі, білі і брасалі ў калодзец. Так тожэ дождж звалі.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Калі выходзіш з хаты, кожнаму нада гэта гаварыць, каб у дарозе з табой нічога не здарылася: «Ранняе – прыбяжы, позняе – недабяжы, а Гасподзь Бог – дарогу ўкажы»; «Еду ў дарогу, бяру 3 ангелы ў падмогу: першы ангел у пуць-дарогу праважае, другі ангел маімі дзяламі ўпраўляе, трэці ангел з пуці-дарогі ўстрачае»; «Еду не адна – Ісус Хрыстос уперадзі, Божая Маці пры мне, памагі мне» (3 р.).

Калі каму-небудзь штосьці даш са сваёй гаспадаркі, то трэба за гэта ўзяць грошы, саўсім трохі, каб у цябе гэта не звялося.

Калі даеш, напрыклад, семяна, то нада з гэтай кучкі, якую адклаў, аддаваць, потым узяць некалькі штук сабе назад, каб не звялось.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Вайцяшэнка Ганны Фядосаўны, 1923 г. н.

Як выклікаць дождж

Удовы цягалі барану па дзярэўні і прасілі: «Дай, Божа, дожджыку».

Кралі ноччу гаршкі, хто павесіў на плот ці жэрдку, і кідалі ў калодзезь, штоб дождж ішоў.

Богу маліліся, дажджу прасілі. Людзі сабіралі красты, стаўлялі на перакрыжаванні, выносілі хлеб, соль і маліліся.

Як засцерагчыся ад граду

Каб град не пашкодзіў ураджай, трэба выкідваць лапату, на каторай насаджвалі хлеб у печ.

Нельга свісцець у хаце, бо не будзе грошай.

Нельга выціраць крошкі са стала голай рукой, бо не будзе чаго есці, будзеш галадаць.

Нельга глядзецца ў люстэрка, калі ясі, бо, кажуць, можна з'есці сваю прыгажосць.

Нельга, калі што-небудзь чытаеш, есці, бо можна з'есці сваю памяць.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Вайцяшэнка Ганны Фядосаўны, 1923г. н.

Калі разбіваецца зеркала, то значыць будзе якое-небудзь няшчасце. Закрываюць зеркала, калі молнія і гром.

Таксама яго закрываюць, калі ёсць нябожчык у хаце, каб зеркала не набралася атражэння мёртвага чалавека.

Нельга на сабе зашываць адзенне, лепш яго зняць і патом зашыць, а калі здарылася, што трэба зашываць, то ўзяць у рот якую-небудзь рэч (нітку).

Каб пазбегнуць разладаў у сям'і, нельга сваё свадзебнае плацце даваць каму-небудзь, нада, каб яно было з табой на ўсё жыццё.

Калі выходзіш замуж зімой, не трэба накрываць плечы маладой паверх фаты.

Прыкметы для цяжарнай жанчыны

Цяжарнай жанчыне не дазвалялася станавіцца на парог. Тады гаварылі, што дзіця можа нарадзіцца толькі шляхам кесарава сячэння. Нельга было хадзіць на скрыжаванне дарог, нельга было падымаць што-небудзь на скрыжаванні. Нельга было пераступаць цераз крывую жэрдку, вілы, аглоблю, сякеру, каб не адбыліся роды раней, чым патрэбна. Нельга хадзіць пад вяроўкамі, пераступаць праз вяроўку, каб дзіця пры нараджэнні не было запутана пупавінай вакол шыі.

Каб лёгка прайшлі роды трэба было ў той комнаце, дзе пачаліся схваткі, паздвігаць усю мебель, абыйсці вакол стала 3 разы, пераступіць праз парог 3 разы, перакрысціцца і, не аглядаючыся, выйсці жанчыне з гэтай комнаты.

Нельга цяжарнай ні ў чым адказваць, асабліва гэта наконт ежы, бо ўсё паядзяць мышы.

Калі цяжарная была на вяселлі, яе прасілі хоць трошкі, але паспрабаваць кожнае блюда.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Анісавец Веры Іванаўны, 1932 г. н.

Парог

Праз парог рукі не падаюць.

Цяжарнай жанчыне катэгарычна забаранялася сядзець на парозе, інакш роды будуць вельмі цяжкімі.

Калі нараджалася дзіця (дзяўчынка), пад парог закопвалі дзіцячае месца, каб яна выйшла замуж у свой час. Яшчэ ваду, у якой яе купалі, вылівалі таксама за парог.

А вот як дзіця ў цэркву везлі, хросныя сядалі ля парога, а, бувала, лажылі пад яго ці то сякеру, ці то верацяно, каб мелі дзеці здольнасці да працы. Калі маладыя прыязжалі пасля вянчання, бацькі іх сустракалі перад хатамі, а на парог клалі абрус.

Як выходзіш у дальні шлях, трэба сесці перад парогам, а потым пераступаць яго.

Нельга сядзець на парозе нежанатым хлопцам і дзеўкам.

Падушка

Нельга сядзець на ёй, бо страціш свой розум.

Пад падушку дзяўчаты клалі розныя рэчы, варажылі на суджанага.

Пасля дзяльбы каравая ў нас у дзярэўні нявесту садзілі на пуховую падушку.

Вядро

Нельга садзіцца на пустое перавернутае вядро.

Калі стрэнеш чалавека з пустым вядром і ён пяройдзе табе дарогу – гэта дрэнна. Тады кажы так: «Пуста вады – пуста бяды».

Цяжарнай жанчыне не трэба станавіцца на тое месца, дзе было вядро з вадой, калі мылі падлогу, бо ў дзіцяці лішай будзець.

У калодзеж па ваду іх адных не пускалі – дрэнна гэта.

Ручнік

Ткалі ручнікі толькі ў пост, бо тады душа чыстая ад грэшных помыслаў. На ручнік прымалі навароджанае дзіця.

У сваты як хадзілі, дык бралі ручнік, а ўжо ў час вяселля перавязвалі ручнікамі сватоў.

Калі маладыя вярталіся з вянчання, іх сустракалі з хлебам і соллю на ручніку.

Раніцай, умываўшыся, выціраліся ручніком.

Іконы абгорнуты ручнікамі з прыгожай вышыўкай.

Бабуля мая была знахаркаю, дык яна чырвоным ручніком лячыла розныя захворванні.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскай Ганны Андрэеўны, 1930 г. н.,
Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н.

ЛЕГЕНДЫ, ПАДАННІ, КАЗКІ

Вёска Бывалькі

Назва Бывалькі паходзіць ад таго, што ў той час тут жылі «бывалыя людзі» ці людзі, якія багата бадзяліся па свету.

Бывалыя людзі – гэта чужыя людзі, не мясцовыя, прыезжыя.

Як бывалькаўцы хвою валялі кабылай

Стаяла на касагоры вялізная хвоя, і трэба было яе спіліць. І вось каб яна не ўпала пад гору, прывязалі за вяршыню хвоі вяроўку, а за вяроўку ўпрэглі кабылу, каб яна цягнула на гору. А калі хвою падпілілі, яна пачала падаць пад гору, а няшчасная кабыла – услед за ёю па паветры. А ў гэты час па Дняпру плылі плыты-радульцы, убачылі гэта чуда, як кабыла, дрыгаючы нагамі, ляціць услед за хвоей, стаяць і размаўляюць: «Прыдзёт, мілая, прыдзёт». І ўпала гэтая кабыла прама на плот радульцам. Вось з таго часу іх у нас завуць кабыльнікамі.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Савянок Марыі Рыгораўны, 1941 г. н., 1999 г.

Вёска Удалёўка

Када-та сюда пасяліліс людзі. Тут места харошае было. Пасяліліс людзі і сільна добра ўсё дзелалі па хазяйству, хазяйственныя бочкі, цэбрыкі. Вот этыя людзі, каторыя пасяліліся, яны здалёку пасяліліся да былі вельмі добрыя, добра дзелалі эту пасуду дзеравянную. Так гаварылі: «От удала дзелаюць». Удала – эта значыць харашо. Бочкі етыя не цяклі, налівалі ў іх, і яны не цяклі. Ну, раз удала дзелалі – удальцы. І тада ад этага слова «ўдальцы» пайшла назва дзярэўні Удалёўка.

Вёска Вулкан

Тады там ад этай Удалёўкі сталі рассяляцца, зямлі там ужо не хватала. А тут вот эта месца. Яно, як вулкан, высокае такое. І вот на этам бугрэ пасяліліс людзі. Таму што там на Удалёўкі было нізка, а тады былі гады мачлівыя, і людзі, спасаясь ад вот этых нізкіх мест, пасяліліс на высокам месце, штоб хоць дажджы і будуць ідці, і тут ужэ не вымакне, не прападзе.

Вёска Гарадок

Эта када-та, дзе вот эта места, дзе дзярэўня Гарадок пастроена, када-та былі гарадкі ў дрэўнія ўрэмена. Былі дзеравянныя такія хаты, паселішчы. Было іх нескалькі гэтых дзеравянных хат. І вот людзі пасяліліся тут. Думалі, як назваць. Ну, назваць нада: «Гарадкі». Вот яны па этым вот хаткам рашылі назваць дзярэўню «Гарадкамі».

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Кулеш Лілії Сілаўны, 1926 г. н.
(нарадзілася ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Вёска Мохаў

Раней гэта вёска называлася Мохава, але потым канчатак убралі. Сама назва паходзіць ад слова «мох». Раней у гэтай вёсцы было шмат моху, і кожны, хто праязджаў праз яе, бралі гэты мох на падкормку. Адсюль і назва Мохаў.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Грыб Ганны Якаўлеўны, 1923 г. н., 2005 г.

Вёска Ліпнякі

Наша вёска пабудавалася вельмі даўно. Як расказвала мне мая баба, першыя людзі пачалі сюды засяляцца дзесь каля 150 гадоў назад. На гэтым месцы, дзе стаіць зараз наша вёска, было многа дрэў, больш за ўсё ліп. Былі тут непраходныя топкія балоты, што чорт нагу зломіць, стогадовыя дрэвы. Пачалі засяляцца сюды першыя людзі, якім не было дзе жыць.

Першапачаткова людзі сюды засяляліся з вёскі Церабееўка. У гэтай вёсцы было многа насельніцтва, а жыць не было дзе. Таму людзі і рашылі на месцы балот і ліп збудаваць сабе хаціны. Пачалі прыходзіць сюды і на зрубах другіх дрэў ставілі хаты. Першымі засяленцамі тут былі Таўкачовы, Качалавы. Потым за імі пачалі засяляцца іншыя. Так і збудавалася наша вёска, а жыхары вырашылі назваць яе вёска Ліпнякі, таму што тут было многа ліп.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Волкава Андрэя Фёдаравіча, 1942 г. н., 1992 г.

Гарадскі пасёлак Лоеў

І кагда татарскае нашэствіе шло, он дайшоў да Дняпра (он – гэта Лой, палкаводзец) і сказаў: «Усё. За Дняпром нашай зямлі нету». Здзесь і астанавіліся. І пасяму яго назвалі не Лой, а Лоеў. Ён быў, фамілія яго была Лой. А шчас нашаму Лоеву, можа, не 500 лет, а 700. Патаму што ніхто нічога не знае, ніхто нічога не пісаў.

Вёска Ручаёўка

Там была маленькая рэчка. Там быў пан. Дак ён вабшчэ о такіх маладых браў к себе нанач. Пан гаворыць на свайго лесніка: «А пачэму ў цябе вот ручэй цячэ, а ты нікак яго не назавеш?» А той гаворыць: «А дык слушай, а давай назавём дзярэўню Ручаёўка». Той: «Давай». І вот, назвалі эту дзярэўню Ручаёўка.

Вёска Каўпень

Пан вырашыў назваць яксьці дзярэўню. Во тут во, гавора, кол – граніца, а тут – пень. Вот і ўсё, стала Колпень.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кацубы Міхаіла Мацвеевіча, 1930 г. н.
(раней пражываў у в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Вёска Сяўкі

Быў у Сяўках пан Саўка. Он здзесь пастроіў дом срэдзі балот. З цягам часу ён пачаў расшыраць свае ўладанні, больш сеяў збожжа, наймаў парабкаў, а каб яны жылі паблізу ад яго, то дапамагаў будаваць хаціны. Ласкава сяляне гэтага гаспадара называлі Сеўка. Так рабілі яго дзеці і ўнукі, і ўжо ў яго быў не хутар, а невялікая вёска. А людзі ўсё роўна называлі яго «хутар Сеўкі». Неўзабаве пан Сева памёр, а назва засталася. Ішоў час, а назва вёскі заставалася Сяўкі.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., 2005 г.

Вёска Уборак

Узнікла вёска Уборак у 80-я гг. XIX ст. Заможныя сяляне скуплівалі ў памешчыкаў землі ў паўночна-заходняй частцы Лоеўскага раёна. Глебы тут цяжкія і гліністыя, і вёску сяляне рашылі пабудаваць на ўзгорыстым месцы, якое было занята сасновым борам. Ад гэтага і пайшла назва «Уборак».

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Бабраўнічай Вольгі Міканораўны, 1923 г. н., 2005 г.

Вёска Удалёўка

1. Кагда-та ў Кіеве па рацэ Дняпрэ плылі плыты. На этых плытах плылі і крычалі: «Далёка!» І ад этага слова праізашла назва Удалёўка.

2. Ёсць за ракой такая Часарудня, адтуда Удалёўка насялілася. Як людзі адтуль прыехалі, убачылі месца ўдалое: была старая рэчка Брагінка і старая вадзяная мельніца.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Герасіменкі Івана Васільевіча, 1927 г. н.,
Герасіменка Юліі Лявонаўны, 1927 г. н., 2005 г.

Вёска Цясны

Быў лес непрахадзімы, і цякла сюдою рака Днепр. А тут ля гэтага лесу была прыстань. Жыў у гэтых мясцінах адзін аб'ездчык па прозвішчу Цясноў.

Калі ён памёр, то пасля смерці гэтае месца пачалі называць Цясны.

Запісана ў в. Цясны Лоеўскага р-на
ад Чучвага Праскоўі Піліпаўны, 1919 г. н., 1999 г.

Вёска Ястрабка

Наша дзярэўня называлась Ястрабка, таму што ястраб гняздзіўся.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Лясы бальшыя былі кагда-та, тут у іх хаваўся злодзей. Яго звалі Ястраб. Ён так неажыданна нападаў на багачоў, што яго так і назвалі. Таму і вёска называлася Ястрабка.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Адна цыганка нагадала хлопцу быць утопленнікам. Раз ён сільна рваўся на рэчку, але ж яго радзіцелі закрылі і нікуды не адпускалі. Але ж на рэчку пайшоў яго бацька. І тут ён убачыў, як вална пачала падымацца і з'явілася нешта падобнае на галаву. І тут ён пачуў голас: «Нужэн быў, а не прыйшоў». Так той хлопец застаўся жыць.

Запісана ў г.п . Лоеў
ад Грышчанка Елізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Пасёлак Кірава (Зарэзаў)

Кадась была дзярэўня Рудня. З этаю дзя́рэўні пасяліліся. А там была места, куда кароў ганялі. Стойла там было. Найшлісь друзья, што варавалі вала. Тамака на том стойле завялі, а там пусты быў дый зарэзалі. І трэба населіваць эты пасёлак. А гдзе насяліць, а там, дзе вала зарэзалі. А як назваць дзярэўню, ну, Зарэзаў.

Вёска Вулкан

Праізашло ад слова «волкі». Как былі драмучыя лясы, на том месцы быў бугор. Там вадзіліся волкі.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Вёска Дзяражычы

Нашу деревню называют ещё Москва, а нас – москвичи, потому что за рекой живут староверы. Получилось, что все перемешались и сейчас говорят на русском.

Держали тут оборону, воеводы тут стояли ещё при Олеге с Киевской Руси. Когда на Киев наступали, Деражичи первыми встречали, и гонцы уже отсюда

должны были обороняться, пока кто-нибудь не приведёт из Киева войска. Оборону держали. От слов «держать» и «жить».

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Кудраўцовай Наталлі Данілаўны, 1972 г. н.

Пасёлак Марс

Казала мая мама, эта дзярэўня насялёная лесам была. Жаніліся людзі. А дзе дзецца? Зямлі мала. Так разрабатывалі, валілі лес, строілі хаты, пні выкарчоўвалі, выкапвалі. Ета такую плошчадзь раздзелалі. А тады прыходзіў во еты вот землямер, а ён вымяраў соткі. А таго землямера фамілія была Маркус. Той землямер ужо памiраў і сказаў: «Ну, як вы сваю дзярэўню назавеце?» Дзед адзін, такі неграматны, кажа: «Землямер – Маркус, так няхай дзярэўня – Марс».

Запісана ў п. Марс Лоеўскага р-на
ад Нямлей Вольгі Іванаўны, 1928 г. н.

Гарадскі пасёлак Лоеў

Горад называецца Лоевам, таму што вазілі лой. Гэта такі жыр, які складалі і перавозілі на Украіну. Гэта каровій, свіны жыр.

А мы жывём на вулканѐ. У нас яшчэ небальшы ён. Ён тутака ўзрастае, але яшчэ не ўзрываўся. Цэнтр вулкана на серадзіне Лоева.

Паданне аб крупейскай іконе

Бацюшка толькі адно гаворыць, што ў Крупейках паявілась ікона на дзераве. І знялі яе, і пайшлі па воду, і раднік паявіўся, і ўсе бралі лячэбную воду етую. Ездзілі ўсе: царкоўную машыну нагрузіў бацюшка і павёз па воду. Там панапіваліся, панаўмываліся і прыехалі сюды, і гаварылі, што нас Параскева зашчыціла, не дапусціла да подласці. І колькі раз яе адтуль ні знімалі і ні заносілі ў царкву, а яна ізноў там з'яўлялася.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Вялікамучаніца Параскева

Ва врэмя Шведскай вайны тут недалёка быў пуць з вараг да ў грэкі. І прыязджалі таргоўцы і разбойнікі. Тут тожэ грабілі і ганялісь за адной жэншчынай – Параскевай. Яна яўляецца всегда ў святую пятніцу на 10-ю нядзелю пасля Пасхі. Яе радзіцелі былі благачэсцівы. Па грэчаскаму Праскоўя значыць пятніца. Кагда эці разбойнікі ўвідзелі ікону на дзераве, яны дагадаліся, што за этай жэншчынай ганяліся.

Атмячают в 10-ю пятніцу после Пасхі ў храме.

Главар пашол в манастыр, і ўверавалі ў Бога, і Параскева прапаведавала хрысціянства. Быў цар Дзіалекціан, а ён праследаваў хрысціянства. Ён хацеў прызваць Параскеву пакланяцца ідальскай веры. Калі яна адмовілась, яе мучылі цела гваздзямі ізмучылі і пасадзілі ў цямніцу. Ноччу ёй явіўся ангел, прынёс крэст, губку, абцёр ёй раны. Раніцай мучынікі прыйшлі в цямніцу, убачылі, што

раны зажылі, і вырашылі, што эта іх Богі дапамаглі ёй, і сказалі: «Дай жэртву нашым Багам». Але яна адмовілась. Калі яна прыйшла ў ідальскае каплішча, усе ідалы пападалі. І ёй за гэта адсеклі галаву.

У гэтым гаду (2005) эта свята будут адзначаць 8 іюля.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Чаму кот мыецца пасля яды

Злавіў кот вараб'я. Ды перад гэтым пачаў мыцца. А той узяў да і ўцёк. Потым ён зноў злавіў і кажа: «Не, я цябе зараз з'ем, а потым мыцца буду».

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Плюшчай Валянціны Іванаўны, 1934 г. н., 1999 г.

Пра балота

Рабіў Бог зямлю. Выгладзіў, выдзелаў – люба паглядзець. Любаваўся сваёй працай і радаваўся. Тым часам чорт ужо быў. Сядзеў за кустом і ад злосці аж тросся. Зайздрасць яго брала, што Бог гэтак добра зрабіў. Як толькі Бог схаваўся за нябеснымі брамамі, чорт давай са злосці кіпцямі зямлю дзерці ды кідаць. Куды кіне – гара, куды плюне – балота.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Савянок Марыі Рыгораўны, 1941 г. н., 1999 г.

Пра возера

Ёсць у нас возера за дзярэўняй, у лесе. Называецца яно Млінок. Расказваюць, што кагда-то даўно адна старая чагосьці пракляла сваю дачку. І на тым месцы, дзе яна жыла, хата яе правалілася і возера абразавалася.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Пан і мужык

Прыйшоў пан да мужыка. А мужык вельмі бедна жыў. Вось пан і пытае ў яго:

– Чаму ў цябе такія дзеці галодныя?

– Не ў сілах я іх пракарміць.

– Я сабак сваіх магу пракарміць, а ты дзяцей не? Ну, давай зробім так. Ты возьмеш маіх сабак, а я тваіх дзяцей. Калі я ўкармлю тваіх дзяцей, то ты ў мяне будзеш за батрака працаваць, калі не, то аддам табе трэцюю частку свайго іменя.

– Добра, – кажа мужык.

Прыходзіць на другі дзень мужык да пана і пытае дзяцей:

– Ну, як вы, сытыя ўсе, накормленыя?

– Ой, бацька, добра нам, сытыя мы.

Дастаў мужык тады з кішэні семак ды арэшкаў ды і стаў раскідаць па палу. Накінуліс дзеці. Сталі іх па палу сабіраць.

– Бачыш, – кажа мужык пану, – як ты маіх дзяцей накарміў.

Плюнуў пан дый думае: «Ну, ладна, як ты маіх сабак накорміш?»
Аддае мужыку сабак і кажа:
– Заўтра я прыйду і пагляджу, як ты іх накорміш.
А мужык забіў свінню, ды так накарміў сабак, што яны палеглі і хвасты паадкідалі. Прыходзіць на другі дзень пан да мужыка. Адкрыў дзверы ды і стаў кідаць мяса на пол. А сабакі і не глядзяць на яго.
Вось так і правёў мужык пана.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Максіменка Аніссі Цімафееўны, 1911 г. н. (раней пражывала ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Як жартавалі на стары Новы год

Пад стары год некаторым драва пераносілі, а некаторым туалет ставілі пад забор. У каго драва, дапусцім, на дварэ ляжалі, вынасілі на вуліцу і складвалі. Дзелалі эта радзі шуткі, проста так.

Запісана ў г. п. Лоеў ад Белага Васіля Якаўлевіча, 1935 г. н., 2005 г.

Людміла Васільеўна ***МЕЛЬНІКАВА***

«БЕЗ БОГА – НІ ДА ПАРОГА» (Тэматычная шматграннасць і паэтыка парэмій Лоеўшчыны)

Кожная эпоха нараджае сваю паэзію, паэзію, якая запатрабавана ёю, якая моцнымі повязямі знітавана з жыццём, вераваннямі, інтарэсамі і спадзяваннямі народа. У залежнасці ад таго, як змяняецца свет, эвалюцыянуе грамадства, мяняецца і паэзія. І ці не парадаксальны той факт, што на працягу тысячагоддзяў, нібы насуперак гэтаму агульнапрызнанаму сцвярджэнню, многія фальклорныя жанры былі і застаюцца запатрабаванымі і па сённяшні дзень. На самой справе ніякага парадоксу ці супярэчнасці тут няма, бо ёсць жа «вечныя» маральныя і духоўныя каштоўнасці, а яны якраз і ствараюць аснову фальклорных твораў. Фальклор выступае індыкатарам грамадскіх настрояў.

Фальклор, зразумела, па-свойму адлюстроўвае і тлумачыць бытавыя рэаліі, гістарычныя падзеі, рэлігійныя вераванні, бо хутчэй за ўсё наш першабытны творца інакш, чым сучаснік, успрымаў свет – увесь у комплексе, як адзінае, непадзельнае тварэнне Божае, як жывую істоту, якая існуе ў часе. Бо сапраўды для міфалагічнага мыслення характэрны цэласны погляд на рэчы: усё суцэльна, і чалавек – частка гэтага непадзельнага цэлага. Таму, каб зразумець жыццё і зрабіць яго лепшым, самім трэба стаць лепшымі, змяніць парадыгму сваіх адносін да свету. Фальклорныя творы данеслі да нас жыццёвую мараль, этычныя нормы, народныя традыцыі, якія надзвычай далікатна прашчур-педагог перадаваў сваім нашчадкам. Таму мы можам з упэўненасцю сцвярджаць, што фальклор з'яўляўся комплексным сродкам выхавання калектыву і асобы. Гэтую думку можна праілюстраваць асабліва наглядна на прыкладзе найбольш архаічных парэмійных твораў.

Парэмійны дыскурс беларусаў даволі шматгранны і распрацаваны: выслоўі, фразеалагізмы, прымаўкі, прыказкі – вербальныя формулы, у якіх замацаваліся спрадвечныя, уласцівыя для нашай культурнай традыцыі жыццёвыя ўстаноўкі.

У парэміялагічны фонд у апошні час уключаны выслоўі як элементарныя фальклорныя тэксты. Аднак нават тое, што да гэтага часу няма акрэслена канкрэтнай фармуліроўкі гэтых тэкставых адзінак, сведчыць пра недастатковую іх вывучанасць. Так, «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» дае такое далёкае ад навуковага дыскурса азначэнне: выслоўе – гэта «глыбокая па зместу думка, выказаная невялікай колькасцю слоў» [1, с. 577]. Але гэтая дэфініцыя прыдатная

да ўсяго парэмійнага дыскурса. Няма канкрэтыкі і ў акадэмічным томе «Выслоўі». Даследчык гаворыць тут аб умоўнасці паняцця «выслоўе», дадаючы, што «незлічоная колькасць кароткіх вусных твораў і ўстойлівых словазлучэнняў, што не з'яўляюцца ні прыказкамі, ні прымаўкамі, ні фразеалагізмамі ў вузкім сэнсе, хоць нярэдка і падобныя да іх» [2, с. 5]. Тут жа даецца прыблізная класіфікацыя: застольныя жарты і тосты; вітанні, зычэнні; дражнілкі-кепікі; праклёны; трапныя; смешныя («Зяць любіць узяць», «Цесць любіць чэсць» – запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход Лоеўскага раёна), параўнанні («Дзярэ як каза ліпку», «Жыве як у Бога за пазухай» – запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў) і розныя ўстойлівыя выразы: «Не, гэта пасловіца («Без Бога – ні да парога» – *Л. М.*) з праку веку ідзе» (запісана ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., г. п. Лоеў).

Найбольш шырока прадстаўлены ў лоеўскай калекцыі творы традыцыйных малых жанраў – прымаўкі і прыказкі. Пры невялікім памеры, так бы мовіць, звышсцісласці, гэтыя парэміялагічныя адзінкі вызначаюцца звышінфармацыйнасцю: у іх адлюстраваліся ўяўленні пра месца чалавека ў свеце, погляды на сэнс жыцця, спецыфічныя рысы менталітэту народа, філасофія яго жыцця. Прымаўкі – трапныя выразы, у якіх не даюцца шырокія абагульненні і адсутнічае дыдактычны элемент. Яны вызначаюцца, як правіла, незавершанасцю думкі, ужываюцца і могуць быць зразумелымі толькі ў канкрэтным выпадку ў кантэксце, каб падкрэсліць пэўную рысу чалавека, ягоны ўчынак, раскрыць сутнасць з'явы. Напрыклад, каб выказаць сваё негатыўнае меркаванне аб здольнасцях чалавека, Андрэй Фёдаравіч Волкаў, 1942 г. н., кажа пра ягоны выраб: «Ні Богу свечка, ні чорту качарга» (в. Ліпнякі Лоеўскага раёна), або характарызуючы выкрутлівасць свайго субяседніка той жа інфарматар прамовіў, як адрэзаў: «Цябе ў ступе таўкачом не паймаеш».

Прыказка – «кароткі, лагічна і граматычна завершаны афарыстычны выраз, які адлюстроўвае шматвяковы жыццёвы вопыт і мудрасць народа часцей за ўсё ў мастацка-вобразнай форме і ўжываецца пераважна ў пераносным значэнні» [3, с. 398]. Не будзе перабольшваннем, калі мы скажам, што якраз прыказка найбольш пашыраны жанр у беларускім фальклоры ды і ў жыцці народа. І справа тут не толькі ў семантыцы, а і ў мастацкай дасканаласці, ды яшчэ ў тым, што прыказка трапна адгукаецца на самыя разнастайныя жыццёвыя калізіі. Прыказкамі як універсальнай энцыклапедыяй маральна-этычных нормаў паводзін чалавека пачалі цікавіцца здаўна. Першыя запісы іх прыпісваюцца Арыстоцелю, а ў 1500 годзе Эразм Ратэрдамскі склаў зборнік антычных прыказак. Самае ранняе выданне беларускіх прыказак ажыццявіў С. Рысінскі (Любча, 1918), а першае навуковае выданне – І. Насовіч. У 1976 годзе ўбачылі свет «Прыказкі і прымаўкі» ў дзвюх кнігах (серыя БНТ – складальнік М. Я. Грынблат). Вывучэннем прыказак і прымавак займаліся таксама К. П. Кабашнікаў і М. А. Янкоўскі.

Прыказкі і прымаўкі, якія ўзніклі ў далёкай старажытнасці, адлюстравалі архаічныя элементы народнага светапогляду і «тлумачылі» прыродныя з'явы, але ў лоеўскай калекцыі такіх прыкладаў зафіксавана нязначная колькасць. Да іх можна аднесці такія, як «дзе балота, там і чэрці», «абы балота – чэрці знойдуцца» (запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход Лоеўскага раёна). Найбольшае распаўсюджванне набылі прыказкі, дзе адлюстраваліся ўяўленні пра сямейнае жыццё: «Дом весці – не лапці плесці» (запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход Лоеўскага раёна), «Нашто клад, калі ў сям'і лад» (запісана ад удзельнікаў ансамбля «Жывіца» Лоеўскага

ГДК), «У добрых бацькоў і дзеці добрыя» (запісана ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., г. п. Лоеў), «Няма лепшага прыяцеля, як жонка», «Ад добрага цельпаша дык і трэска хараша» (запісана ад Кулеш Лілії Сілаўны, 1926 г. н., в. Вулкан Лоеўскага раёна). Але ў жыцці бываюць і канфлікты: «Не за то біта, што хадзіла ў жыта, но за то, што дома не начавала» (запісана ад Плюшчай Валянціны Іванаўны, 1934 г. н., в. Сяўкі Лоеўскага раёна).

Найбольш багатай групай парэміялагічных адзінак з'яўляецца тая група, у якой апісваецца працоўная дзейнасць чалавека, ухваляецца працалюбства і асуджаецца гультайства: «Сумленная праца – наша багацце», «Нічога само не робіцца», «Работу словам не заменіш», «Сказаць лёгка, зрабіць цяжка» (запісана ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., в. Сяўкі Лоеўскага раёна), «Калі хочаш смачна есці, трэба толькі раз у дзень прысесці» (запісана ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., в. Сяўкі Лоеўскага раёна), «Адзін і пры месяцы робіць, а другі і пры сонцы спіць», «Дзе шчырая праца, там густа, дзе лянота – пуста» (запісана ад удзельнікаў ансамбля «Жывіца» Лоеўскага ГДК), «Зіма лянцяя марозіт» (запісана ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н., г. п. Лоеў). Асобнае месца займаюць парэміі, дзе выказваецца клопат пра здароўе: «Хто курыць табак, той сам сабе ўраг», «За чужое здароўе выпівае сваё», «Лучшай знацца з дураком, чым з табаком» (запісана ад Курзіна Анатоля Піліпавіча, в. Уборак Лоеўскага раёна).

Важнай тэмай прыказак з'яўляецца тэма Радзімы: «У родным краі, як у раю», «Мілы той куток, дзе закопаны пупок» (запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход Лоеўскага раёна), «Кожны кулік сваё балота хваля» (запісана ад Волкава Андрэя Фёдаравіча, 1942 г. н., в. Ліпнякі Лоеўскага раёна).

Адметнае месца займаюць прыказкі дыдактычнага характару, у якіх асуджаюцца такія заганы характару, паводзін і звычак, як, напрыклад, лянота («Горш за хваробу – гультайства» – запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход Лоеўскага раёна, «Плясала баба, плясала, да макушка лета настала» – запісана ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н., г. п. Лоеў); двурушнасць («У ногі цалуе, а за сэрца кусае» – запісана ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н., в. Усход Лоеўскага раёна); хітрасць («У хітрага чалавека барада не расце» – запісана ад Пазняк Акуліны Дзмітрыеўны, 1940 г. н., в. Сінск Лоеўскага раёна); сквапнасць («Скупы дважды плаціць» – запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў); няшчырасць («Баба многа знае, толькі мала праўды кажа» – запісана ад Крупейчанкі Івана Апанасавіча, 1935 г. н., в. Крупейкі Лоеўскага раёна).

У многіх прыказках зафіксаваны пункт гледжання аўтара на пэўную жыццёвую сітуацыю, напрыклад, гучыць матыў засцярогі: «На чужы каравай рот не раскрывай» (запісана ад Волкава Андрэя Фёдаравіча, 1942 г. н., в. Ліпнякі Лоеўскага раёна), «Другому ўгадзі, а сабе ўгаладзі» (запісана ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., г. п. Лоеў). У парэміях інфармацыйна-пазнавальная мэта рэалізуецца наступным чынам: «Да святога духа не снімай кажуха, а як прыйдзе святы дух, так снімай кажух» (запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў).

Нягледзячы на форму падачы інфармацыі (імператыўная форма дзеяслова), парэміі носяць рэкамендацыйны характар: яны не выключаюць і не абмяжоўваюць валявы пачатак кожнага індывіда. Чалавек можа прыняць або адхіліць рэкамендацыю.

Да малых жанраў традыцыйнага фальклору адносяцца і загадкі. Загадка – гэта іншасказальнае вобразнае апісанне прадмета або з'явы, якія трэба адгадаць. Асновай загадак служыць працоўная дзейнасць людзей, у працэсе якой назапашваўся

вопыт і пазнаваўся свет. У загадках выяўляюцца назіральнасць, кемлівасць працоўнага чалавека, імкненне нашых продкаў разабрацца ў з'явах навакольнага свету, удакладніць і ўзбагаціць веды пра яго.

Тэматыка загадак ахоплівае многія з'явы і прадметы, непасрэдна звязаныя з практычнай дзейнасцю чалавека. На думку большасці фалькларыстаў, найбольш старадаўнімі з'яўляюцца загадкі-метафары аб прыродзе («Чорнае сукно ўлезла ў акно. (Ноч)», «Без ног бяжыць. (Хмара)», «Ляціць без крыл, бяжыць без ног. (Вецер)» – запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў; «Бегла лісічка каля лесу блізачка, яе ні дагнаць, ні след пазнаць. (Маланка)», «Без рук малюе, без зубоў кусае. (Мароз)», «Без рукі, без нагі пад вакном стучыць, у хату просіцца. (Вецер)» – запісана ад Антончыка Паўла Віктаравіча, 1920 г. н., г. п. Лоеў; «Вісіць сіта кругавіта, хто ўбача, той заплача. (Сонца)» – запісана ад Цукаравай Феафаніі Іванаўны, 1931 г. н., в. Ліпнякі Лоеўскага раёна); аб прыладах і выніках працы («Крывенькі, маленькі ўсё поле аббягае. (Серп)» – запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў (вар.: «Маленькі, крывенькі ўсё поле аббег. Дадому прыбяжаў, усю зіму праляжаў» – запісана ад Пікус Галіны Яўціхееўны, 1906 г. н., г. п. Лоеў; «Крывенькае, сляпенькае ўсё поле аббяжыць, а прыбяжыць – пад лаўкаю ляжыць» – запісана ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., в. Сяўкі Лоеўскага раёна); «Стаіць тур, на турах дрыжыць, калоціцца, аб усём свеці забоціцца. (Мельніца)» – запісана ад Шумігая Аляксандра Сцяпанавіча, 1927 г. н., г. п. Лоеў; «Быў я на копанцы, быў я на хлопанцы, быў я на пажары, быў я на базары, молад быў – людзей карміў, а стары стаў – кінулі мае косці на памойку, і сабакі не ядзяць. (Гліняны гаршок)» – запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў (вар.: «Быў на капанцы, быў я на пружанцы, быў я на пажары. Малады быў – увесь свет карміў, а як стары стаў, спавіваць стаў. Давялося паміраць – некаму касцей пахаваць» – запісана ад Пілека Ганны Мікалаеўны, 1937 г. н., в. Дзяражычы Лоеўскага раёна); «Я сяку лес – лес вяне, а на тым месцы гара потым устане. (Сенакос)» – запісана ад Антончыка Паўла Віктаравіча, 1920 г. н., г. п. Лоеў); пра чалавека і часткі яго цела («За белым брэзнічкам талалай брэша. (Язык за зубамі)» – запісана ад Цукаравай Феафаніі Іванаўны, 1931 г. н., в. Ліпнякі Лоеўскага раёна; «Вось вам быль-небыліца: у пяці чалавек адна паясніца. (Рука і пальцы)» – запісана ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., в. Сяўкі Лоеўскага раёна; «Дзве панначкі праз маленькі тынок не пералезуць. (Вочы)», «Мяккае, бухоннае, на стале не бывала, а ўвесь свет узгадавала. (Грудзі)» – запісана ад Радчанкі Рыгора Анатольевіча, 1943 г. н., г. п. Лоеў). У лоеўскай калекцыі загадак сустрэліся і загадкі-апісанні: «Чорная свінка, у неё тры спінкі. (Грэчка)», «Два канца, два кальца, а пасрэдзіне гвоздзік. (Нажніцы)» – (запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., г. п. Лоеў). Даволі многа своеасаблівых жартаўлівых загадак-пытанняў: «Сонца пячэ, ліпа цвіце, збожжа даспявае. Калі гэта бывае? (Летам)», «Пуста ў палях, мокне зямля, дождж палівае. Калі гэта бывае? (Восенню)» – цікавіцца Хлебіна Праскоўя Пятроўна, 1930 г. н., в. Сяўкі Лоеўскага раёна. «Нясла баба ў карзіне сто яец. А дно ўпала. Колькі асталося? (Ніводнага)», «Ішла баба з цестам, упала мяккім местам. Чым ты думаеш? (Галавой)» – (запісана ад Пікус Ганны Яўціхееўны, 1906 г. н., г. п. Лоеў).

Такім чынам, лоеўская калекцыя малых жанраў традыцыйнага фальклору пацвярджае іх каштоўнасць, даказвае, што ў іх зафіксаваны ключавыя паняцці народнага светапогляду, менталітэту і па сённяшні дзень парэміі з'яўляюцца адной з важнейшых крыніц вывучэння этнакультуры.

ЛІТАРАТУРА:

1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. Т. 1. – Мн., Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, 1977. – 608 с.

2. Выслоўі / Склад. М.Я. Грынблат. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979.

3. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Т. 4. Накцюрн-Скальскі / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1986. – 742 с.

ЗАГАДКІ, ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ

Пасярод балота ляжыць калода, не гніе, не сохне. *(Язык у роце)*

Пад печчайку, на ламаччайку тарарам брэша. *(Язык)*

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць, шосты водзіць, сёмы песеньку пяе.
(Дзверы, чалавек, скрып дзвярэй)

Поўна бочка круп, а наверсе струп. *(Макаўка)*

У дзеда вісіць, у бабы блішчыць. *(Вочап з вядром, вада ў калодцы)*

Запісана ў в. Барэц Лоеўскага р-на
ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., 1993 г.

Двое стаяць, двое ляжаць, пяты ходзіць, шосты водзіць, сёмы песеньку паёт. *(Дзверы)*

Бег бык, у дырачку смык. *(Ключ і замок)*

Што есць сена чатырмя зубамі? *(Вілы)*

Зімой і летам аднім цветам. *(Ёлка)*

Летам серы, зімой белы. *(Заяц)*

Ляжыць пад ганкам, хвост абаранкам. *(Сабака)*

Два брата жывут чэраз дарогу, а друг друга не відзят. *(Вочы)*

Стаяць сталбы бялёныя, на іх шапкі зялёныя. *(Бярозы)*

Што за ігрушка: чатыры ўха і два брушка. *(Падушка)*

Пасрэдзі двара стаіт капна, сперадзі вілы, ззадзі мятла. *(Карова)*

Два канца, два кальца, а пасрэдзіне гвоздзік. *(Нажніцы)*

Чорная свінка, у неё тры спінкі. *(Грэчка)*

Сто адзёжак, і ўсе без засцёжак. *(Капуста)*

Сідзіт дзед, в сто шуб адзет. *(Лук)*

У полі без корня расце. *(Камень)*

Чорнае сукно ўлезла в акно. *(Ноч)*

Хто меня ўб'ёт, тот людскую кроў пральёт. *(Камар)*

Сівае сукно лезе ў акно. *(Дым)*

Быў я на копанцы, быў я на хлопанцы, быў я на пажары, быў я на базары, молад быў – людзей карміў, а стары стаў – кінулі мае косці на памойку, і сабакі не ядзяць. *(Гліняны гаршок)*

Без ног бяжыць. *(Хмара)*

Ляціць без крыл, бяжыць без ног. *(Вецер)*

Крывенькі, маленькі ўсё поле аббягае. *(Серп)*

У каго шмат дзяцей па ўсім свеце? *(Зязюля)*

Не рыбак, а сеткі расстаўляе. *(Павук)*

Запісана ў в. Барэц Лоеўскага р-на
ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., 2005 г.

У бабы ёсць, у дзеўкі нету, у барышні адна і тая сперадзі яна. *(«Б»)*

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Кулеш Лілії Сілаўны, 1926 г. н.
(нарадзілася ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на), 2005 г.



Б'юць мяне палкамі, мнуць мяне камянямі, рэжуць мяне нажамі. Затое мяне шануюць, затое мяне любяць. *(Хлеб)*

Ехаў не дарогай, сцябаў не пугай, зшыбаў не палку, забіў не галку, шчыпаў не пер'е, еў не мяса. *(Рыбак і рыба)*

Быў я на капанцы, быў я на пружанцы, быў я на пажары. Малады быў – увесь свет карміў, а як стары стаў, спавівацца стаў. Давялося паміраць – некаму касцей пахаваць. *(Выраб гаршка)*

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Пілека Ганны Мікалаеўны, 1937 г. н., 1999 г.

Жылі тры браты: дык адзін любя зіму, другі – лета, трэці – усё раўно.
(Цялега, сані, мужык)

Вышэ лошадзі, ніжэ сабакі. *(Сядло)*

Два рога, адна нага. *(Саха)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Хто зубоў не мае, але кусаецца? *(Пуга)*

На агні не гарыць, на вадзе не тоне і на саломе не шалясціць. *(Цень)*

Гаршчок разумны, хоць сем дырак. *(Галава)*

Вісіць сіта круглавіта, хто ўбача – той заплача. *(Сонца)*

За белым бярэзнікам талалай брэша. *(Язык за зубамі)*

Што ўсяму на свеце нада? *(Імя)*

Што вышэй дзерава расце? *(Цеста)*

Стаіць ножка, а на ножцы бочачка, на бочачцы струп, поўна бочачка круп.
(Макаўка)

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Цукаравай Феафаніі Іванаўны, 1931 г. н., 1996 г.

Шыпіць, вішчыць, рагоча і яшчэ хоча. *(Гарачая скаварода)*

У куточку, на куточку шаматовы яйцы. *(Цыбуля)*

Вырас-павырас, са штаноў павылез, зверху залупіўся, дзеўкам прыгадзіўся. *(Арэх)*

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Волкава Андрэя Фёдаравіча, 1942 г. н., 1992 г.



Хто плача без голасу? *(Раса)*

Што расцець і кораня нету? *(Каменні)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Кацубы Міхаіла Мацвеевіча, 1930 г. н.
(раней пражываў у в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Гладзіць, гладзіць, покуль усадзіць, калі ўсадзіць, годзе гладзіць. *(Хлеб)*

Коціцца катушка: ні змей, ні птушка, ні зямля, ні вада – не адгадаеш нікагда. *(Сонца)*

Вырас-павырас, на канцэ залупіўся і дзеўкам панадабіўся. *(Арэх)*

Дзесяць братоў на Серунову гору невад цянуць. *(Штаны падцягваюць)*

На акне сядзіць кот. А то не кот, а хто? *(Кошка)*

Два браты жывуць цераз дарогу, а адзін аднаго не бачаць. *(Вочы)*

Матка – таўстуха, дочка – красуха, сын – перабор, пайшоў гуляць ва двор. *(Печ, агонь, дым)*

Ляжыць калода пасярод балота, не гніе, не сохне. *(Язык)*

У дзеда вісіць, а ў бабы блішчыць. *(Вочап і вада)*

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Лявоненка Феафаніі Трафімаўны, 1927 г. н., 2002 г.

Тры круты закруты. *(Саха)*

Крывенькая, сляпенькая, усё поле аббяжыць, а прыбяжыць – пад лаўкаю ляжыць. *(Серп)*

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., 2005 г.

Самі бягуць, а аглоблі стаяць. *(Рака і берагі)*

Рагат, а не бык, ежу бярэ, а не сыт. *(Ухват)*

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Вось вам быль-небыліца: у пяці чалавек адна паясніца. *(Рука, пальцы)*

Сонца пячэ, ліпа цвіце, збожжа даспявае. Калі гэта бывае? *(Летам)*

Пуста ў палях, мокне зямля, дождж палівае. Калі гэта бывае? *(Восенню)*

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., 2005 г.

Па пузу дарога, паміж ног трывога, а ў дзірачцы свадзьба. *(Самапрадка)*

Расло-павырасла, із штаноў павылезла, а патом залупіўся і дзеўкам прыгадзіўся. *(Арэх)*

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Грышкавец Марыі Міхайлаўны, 1936 г. н.
(раней пражывала ў в. Усход Лоеўскага р-на)

Ног многа, а на спіне дамоў ідзе. *(Барана)*

Стаіць лятунчык, за кожны глытунчык просіць пацалунчык. *(Шклянка)*

У лазні парыцца ў вопратцы, да стала ідзе раздзетаю. *(Бульба)*

Дзень і ноч сакоча, а есці не хоча. *(Часы)*

Бочка стогне, а баяры мёд п'юць. *(Свінні і парасяты)*

Ляціць – не птушка, вые, а не звер. *(Вецер)*

Сядзіць бабуля, сядзіць хатуля, хто забачыць, дык заплачыць. *(Цыбуля)*

Што жанчына зробіць з гаршком, перш чым варыць у ім абед?
(Паглядзіць у яго)

Маленькі работнік шмат гадоў працаваў, ніколі не спаў. Толькі адзін раз працаваць перастаў і навек прапаў. *(Сэрца)*

У адным клубочку сем дырачак. *(Галава)*

Сам голы, а сарочка за пазухай. *(Свечка)*

Запісана ў г.п. Лоеў
ад Кароткай В. Д., 1926 г. н.

Чатыры цыганачкі ільюць у адну баначку. *(Карова)*

Ішоў я каля хаты, апанавалі мяне сабакі – ні адпрасіцца, ні адмаліцца, ні куска хлеба даць. *(Пчолы)*

Сто адзін брат, усе ў адзін рад звязаныя стаяць. *(Пляценъ)*

Ішлі чарнічкі на вечарнічкі, як ляглі спаць, дык і цяпер стаяць.
(Цэгла ў хаце)

У вас і ў нас сярод хаты бас. *(Брус у столі)*

Прыйшоў госць – ды і пад лаўку. *(Ногі)*

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся, а ростам не роўныя. *(Пальцы на руцэ)*

Поўнае карыта белых лебядзей намыта. *(Зубы)*

Дзве панначкі праз маленькі тынец не пералезуць. *(Вочы)*

Маленькі гаршчок мае сем дзірак. *(Галава)*

Мяккае, бухоннае, на стале не бывала, а ўвесь свет узгадавала. *(Грудзі)*

Сухі Трафім далёка б'е. *(Ружжо)*

Сухі Матфей далёка лье. *(Ружжо)*

Хата рагата, вакон багата, як увойдзеш, дык назад не вернешся. *(Сетка)*

У Андрушкі сем кажушкоў, а душа голая. *(Капуста)*

Раз ступне – сто слядоў аставіць. *(Пастол)*

Нашто я вас браў, каб сваё цела ў вас не саджаў. *(Боты)*

Ляжыць ля хаты, жывот паласаты. *(Гарбуз)*

Стаіць конь на прывязі, не п'е, не есць, а ўсё гладчэй вырастае. *(Гурок)*

Маленькі Данілка ў пелькі ўтапіўся. *(Гузік і іголка)*

Пад лістом дагары хвастом. *(Агурочак)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Радчанкі Рыгора Анатольевіча, 1943 г. н., 2005 г.

Маленькі канёк за морам бываў. Спераду – шыльца, пазадзі – вільца, на грудзях – белы ручнічок. *(Ластаўка)*

Сіта сшыта, круглавіта. Хто адгадае, той многа знае. *(Павуціна)*

Белы бык у вакно тык-тык. *(Дзень)*

Тысяча муляроў хату зрабілі без вуглоў. *(Мурашкі)*

Ногі многі, вусы доўгі, хвост брык-брык. *(Рачок)*

Чорнае сукно накрыла вакно. *(Ноч)*

Стукачыць, грукачыць, тройка каней бяжыць. Разгадаць трэба, колькі аўса каням даць. *(Пярун)*

Рыкнуў вол на сто гор, на сто рэчак, на сто печак, на сто дваццаць сажаняў. *(Пярун)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бойдак Елізаветы Іванаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Большы рот, чым жывот, а ў вушах – вочы. *(Цэбер)*

Стаіць пятунчык, за кожны глытунчык просіць пацалунчык. *(Шклянка)*

У лазні парыцца ў вопратцы, да стала ідзе раздзеты. *(Бульба)*

Стаіць паніч дагары нагамі. *(Вілы)*

Ног шмат, а на спіне дамоў ідзе. *(Барана)*

Дзень і ноч сакоча, а есці не хоча. *(Часы)*

Што чалавеку мілей за ўсё на свеце? *(Сон)*

На хляве два дубкі. *(Рогі ў каровы)*

Бочка стогне, а баяры мёд п'юць. *(Свіння і парасяты)*

Што за палена з ямай па калена? *(Бот)*

У дзвюх матак па пяць хлапчанятак, кожнаму адно імя. *(Пальцы)*

Не агонь, а пячэцца. *(Крапіва)*

Ляціць – не птушка, вые, а не звер. *(Вецер)*

Пад адным капелюшом чатыры браты жывуць. *(Стол)*

Фіту, Міту, поўна шафа аксаміту. *(Сажа ў коміне)*

На кургане стаіць курачка з сяргамі. *(Авёс)*

Сядзіць бабуся, сядзіць хатуся, хто забачыць, дык заплачыць. *(Цыбуля)*

Не піў, не еў, а крычыць, як ашалеў. *(Школьны званок)*

Ляжыць палена, а ў сярэдзіне сэрца. *(Карандаш)*

Без языка, а гаворыць. *(Кніга)*

Маленькі работнік шмат гадоў працаваў, ніколі не спаў, толькі адзін раз працаваць перастаў і навек прапаў. *(Сэрца)*

У адным клубочку сем дырачак. *(Галава)*

Сам голы, а сарочка за пазухай. *(Свечка)*

Без рук, без ног на печку скок. *(Дым)*

Калі чалавек бывае рыбай, а калі ракой. (*Карп і Ніл)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад удзельнікаў народнага
ансамбля «Жывіца» Лоеўскага ГДК,
жыхароў вёсак Сінск, Шчытцы, Крупейкі, Н-Баршчоўка
метадыстам Дома культуры Берасневай В. У.

Белая, як снег, надулась, як мех, лапатамі ходзіт, рогам траву есць. *(Гусь)*

Крикнул вол на сто гор, на сто ночак, на сто речак, на тысячу городов.
(Гром)

Ишла Васе-простегласе, як упала, то и неба дастала. *(Дарога)*

Бежыць бык ды ў дзірачку тык. *(Замок и ключ)*

Вырас-павырас, из штанов вылез, кончику залупивсь, усем девкам знадобивсь. *(Орех)*

Повна дежачка вина, дий замочка нема. *(Яичка)*

Повна дежачка круп, а наверси струп. *(Макаўка)*

У деда висить, а у бабы блестит. *(Калодзец и вочап)*

Стаіць тур, на турах дрыжыць, калоціцца, аб усём свеце забоціцца. *(Мельніца)*

На одном месте хрестов двесте. *(Клубок)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Аляксандры Самойлаўны, 1927 г. н., 1998 г.

Ішла баба з цестам, упала мяккім местам. Чым ты думаеш?
Несла баба ў карзіне 100 яец. Адно ўпала. Колькі асталося?
Поле не змерана, авечкі не лічаны, пастух рагаты.
Чорная карова ўсіх людзей пабарола.
Карова – мамка, свіння – ямка.
Маленькі, крывенькі ўсё поле аббег. Дадому прыбяжаў, усю зіму праляжаў.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Галіны Яўціхееўны, 1906 г. н., 1995 г.

Бегла лісачка каля лесу блізачка, яе ні дагнаць, ні след пазнаць. *(Маланка)*

Без рукі, без нагі пад вакном стучыць, у хату просіцца. *(Вецер)*

Без рук малюе, без зубоў кусае. *(Мароз)*

Раздзеўся моўчкі, цішком жыве, а як памрэ, дык зараве. *(Снег)*

І тонкі, і доўгі, а з травы не відаць. *(Дождж)*

Вочкі чорненькія, зубкі вострынькія. *(Мыш)*

У лесе-берамсе палка залатая ляжыць. *(Гадзючка)*

За гарою еўга плача, слёзы лье. *(Бярозавы сок)*

Малыя дзеці сядзяць на павеце, як падрастуць – на зямельку злятаюць. *(Арэхі)*

У бацькоў на лапках сыны ў пляцёных шапках. *(Жалуды)*

Не агонь, а апалішся. *(Крапіва)*

Ляцяць гускі, дубовыя наскі, і кажуць: «Тук-ток-так». *(Цапы)*

Я сяку лес, лес вяне, а на тым месцы гара потым устане. *(Сенакос)*

Тры круты – закруты. *(Саха)*

Лёг вусаты, устаў гарбаты. *(Кот)*

Рынча рые – скокня скача, уцякае рынча – скокня плача. *(Свіння і зямля)*

Па зямлі ходзіць, неба не бачыць. *(Свіння)*

Семсот – свішча, чатыры – танцуе, дзве свечкі гараць, два вартавыя стаяць. *(Конь)*

Як малы быў – у чатыры дудкі іграў, падрос – горы варочаў, а на старасць – у танцы пайшоў. *(Бык)*

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Антончыка Паўла Віктаравіча, 1920 г. н.
(нарадзіўся ў Капыльскім р-не, Мінскай вобласці,
пражывае ў г.п. Лоеў з 1948 г.), 2005 г.

Прыказкі і прымаўкі

У хітрага чалавека барада не расце.
Што ў Піліпаўку спрадзеш, то ў Вялікі пост сатчэш.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Акуліны Дзмітрыеўны, 1940 г. н., 1999 г.

Не за то біта, што хадзіла ў жыта, но за то, што дома не начавала.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Плюшчай Валянціны Іванаўны, 1934 г. н., 1999 г.

Лепш ралля ранняя, чым позняя. На ранняй – пшаніца, на позняй – мятліца.
Не той хлеб, што ў полі, а той, што ў свірне.
Хто не сее, той не вее.
Калі хочаш смачна есці, трэба толькі раз у дзень прысесці.

Людзям засуха, папу сноп.
За сваё жыта я стала біта.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., 2005 г.

Зімой сонца свеціць, ды не грэе.
Сумленная праца – наша багацце.
Хто пазнаў бы дзятла, каб не яго доўгі нос.
Нічога само не робіцца.
Работу словам не заменіш.
Сказаць лёгка, зрабіць цяжка.
У сваім краі, як у раі.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., 2005 г.

Кто курыць табак, той сам сабе ўраг.
Здароўе згубіш – новае не купіш.
Лучшай знацца з дураком, чым з табаком.
За чужое здароўе выпівае сваё.
Чыстая вада для хваробы бяда.
Друг пазнаецца ў бядзе.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Курзіна Анатоля Піліпавіча, 2005 г.

Калі сакавік сухі, у красавіку травы яшчэ не чакай.
Калі ў марце жыта глядзіць на неба – не есць тады хлеба.
Сухі марац, мокры май – будзе жыта, як гай.
Калі на лёд грыміць, тады і вясна будзе халодная.
У родным краю, як у раю.
Дзе справа, там і слава.
Дзе балота, там і чэрці.
Горш за хваробу – гультайства.
Вялікаму каню – вялікі хамут.
Сілаю не будзеш мілы.
Запас бяды не чыніць.
Добры ўспамін – лепшая спадчына.
Абы балота – чэрці знойдуцца.
Мілы той куток, дзе закопаны пупок.
Хто з языком – той з піражком.
Сколькі вужоў уб'еш, столькі грахоў заб'еш.
У ногі цалуе, а за сэрца кусае.
Дом весці – не лапці плесці.

Зяць любіць узяць, а цесць любіць чэсць.
Без мукі няма навукі.
Рана загаіцца, а злое слова ніколі.
Няма лепшага прыяцеля, як жонка.

Запісана ў в. Усход Лоеўскага р-на
ад Зелянцовай Веры Сцяпанаўны, 1930 г. н.

На што клад, калі ў хаце лад.
У добрых бацькоў і дзеці добрыя.
Умеў гуляць – умей і дзіця забаўляць.
Добрая слава даражэй багацця.
Добры чалавек і сабакі дразніць не будзе.
Чалавек жыве век, а добрае дзела – два.
Не печ корміць, а рукі.
Другому ўгадзі, а сабе ўгаладзі.
Чый хлеб ем, таму і песенькі спяваю.
Хоць не багат, ды нікому не вінават.
Дзе шчырая праца, там густа, дзе лянота – пуста.
У лесе людзі дзічэюць, а ў людзях люднеюць.
Жураўлі ляцяць высока, зіма яшчэ далёка.
Адзін і пры месяцы робіць, а другі і пры сонцы спіць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад удзельнікаў народнага ансамбля «Жывіца» Лоеўскага ГДК,
жыхароў вёсак Сінск, Шчытцы, Крупейкі, Н-Баршчоўка
метадыстам Дома культуры Берасневай В. У.

У добрых бацькоў і дзеці добрыя.
Умеў гуляць – умей і дзіця забаўляць.
Чалавек жыве век, а добрае дзела – два.
Не печ корміць, а рукі.
Другому ўгадзі, а сябе ўгаладзі.
Чый хлеб ем, таму і песенькі спяваю.
Хоць не багат, ды нікому не вінават.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

Калі запасаюць на зіму сена, кажуць: «Каб да Юр'я было сена і ў дурня».
Калі сеюць гуркі на Пахома, кажуць: «Пахом, Пахом, прынясі гуркі мяхом».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Галіны Яўціхіеўны, 1906 г. н., 1995 г.

У каго дочкі, той будзе хадзіць без сарочкі.
Як пасцелеш, так і паспіш.
Не плюй у калодзец, самому напіцца прыйдзецца.
Колькі ваўка ні кармі, а ён у лес глядзіць.
Скажы дураку Богу маліцца, дык ён і лоб паб'е.
Абяцанка-цацанка, а дураку – радасць.
Адзін плача, другі скача.
Адна бяда не ходзіць.
На адном месце і камень абрастае.
Свіння гразі найдзе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Трасцяна Івана Аляксеевіча, 1928 г. н., 1994 г.

Без Бога – ні да парога.
Із рога ўсяго многа.
Што пасееш, то і пажнёш.
Скупы дважды плаціць.
Да святога духа не знімай кажуха, а як прыйдзе святы дух, так знімай кажух.
Які дзед, такая і баба.
Жыве як у Бога за пазухай.
Дзярэ як каза ліпку.

Запісана ў в. Барэц Лоеўскага р-на
ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., 2005 г.



Ад добрага цельпаша дак і трэска хараша.
Колькі вяровачкі ні віцца, кончык абязацельна найдзецца.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Кулеш Лілії Сілаўны, 1926 г. н.
(нарадзілася ў в. Грамыкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Прышлі Калядкі, то гэта ж бліны да ладкі.
Зіма лянцяя марозіт.
Працуйце і радзіцеся, не тарапіцеся, а работаць не ляніцеся.
Плясала баба, плясала, да макушка лета настала.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Хто нарадзіўся – крычыць, хто памёр – маўчыць.
Тры бабы – базар, а сем – ярмарка.
У чом дзеду стыд, у том бабе – смех.
Без плачу ў бабы праца не робіцца.
Пусці бабу ў рай, дык яна і карову павядзе.
Пака баба з печы ляціць, сем дум перадумае.
Сем тапароў умесце ляжаць, а дзве пралкі ўрознь.
Мёртвым ястрабам качкі не затравіш.
На смелага сабака лает, а труслівага кусает.
Ваўка баяцца, ад вавёркі бяжаць.
Колькі куўшыну па ваду хадзіць, калі-небудзь да галаву зламіць.
Ад ваўка ўцякаў, на мядзведзя папаў.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Анісавец Галіны Іванаўны, 1925 г. н., 1994 г.

Баба многа знае, толькі мала праўды кажа.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Крупейчанкі Івана Афанасьевіча, 1935 г. н., 1999 г.

На чужы каравай рот не раскрывай.
Голаму пажар не страшан.
Старцу сяло не круг.
Кажны кулік сваё балота хваля.
Ні ў салдаты, ні ў матросы, ні падмазуваць калёсы.
Нязваны госць хужай татарына.
Угасціць чым вароты падпіраюць.
Печ плача па бабе, а двор – па мужчыну.
Цябе ў ступе таўкачом не паймаеш.
Ні Богу свечка, ні чорту качарга.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Волкава Андрэя Фёдаравіча, 1942 г. н., 1992 г.

А вы знаеце такую пасловіцу: «Без Бога – ні да парога»? А эта пасловіца з праку века ідзе, еслі ты не верыш Госпаду Богу – такая ў цябе жызнь будзе нешчаслівая. А нада ўсё ўрэмя ўвераваць у Бога, маліцца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Алеся **КУЧАРАВА**

СВЯТЛО НЯЎЛОЎНАЕ ДЗЯЦІНСТВА

На пытанне, у чым прывабнасць дзіцячага фальклору, можна адказаць – у яго загадкавасці. Па сутнасці – гэта першае мастацкае слова, якім вітае чалавека жыццё. У дзіцячых фальклорных жанрах, як у кроплі расы, адлюстроўваецца непахіснасць векавога светапогляду.

І як чалавек пачынаецца з маленства, дзіцячая творчасць пачынаецца з калыханкі. «Калыханка найчасцей – кароценькая песенька з простым сюжэтам, якая расказвае аб рэчах, даступных дзіцячаму разуменню. Гэта невялічкае апавяданне з яркімі вобразамі, з пэўным зместам, які нясе патрэбную дзіцяці інфармацыю або перасцярогу» [1,63]. Калі гэты жанр даследчыкі лічаць найбольш распаўсюджаным жанрам дзіцячай вусна-паэтычнай творчасці, дык самым улюбёным яго персанажам, не памылімся, калі назавем Ката – «каточка», «коціка шэранькага».

Баю-баю, дзеткі, спаць,
А я буду калыхаць.
А ты, серанькі каток,
Прыляж з дзеткай на краёк.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Чыянавай Вольгі Алімаўны

Яшчэ Зінаіда Радчанка, апісваючы калыханкі, заўважала: «Як і ва ўсёй Расіі, спяваецца тут пра коціка... Печь, закалыхваць дзяцей і называецца «спяваці ката» [6]. Нешматлікія тэксты выразна дэманструюць устойлівыя матывы, уласцівыя для беларускіх калыханак: то шэранькага катка гаспадары запрашаюць прылегчы побач з дзіцём, каб яму добра спалася; то каток прыходзіць калыхаць дзіця; то коцік ходзіць «па лавачкі» ды «па мосціку», і за гэта гаспадыня яго карае: «Буду біць па лапачкі», «па хвосціку».

Даследчыкі па-рознаму тлумачаць прыроду гэтага вобраза: адны звязваюць вытокі яго ўзнікнення з мастацкім асэнсаваннем навакольнага свету, з назіраннем за звычайнымі паводзінамі ката: спакойная, заміраная яго варкота спрыяе добраму сну дзіцяці. Другія ж лічаць, што гэты вобраз часам набывае і больш глыбокае значэнне – жывёлы міфалагічнай, якая «здольная дапамагчы (чалавеку) і аказаць пэўны магічны ўплыў на яго жыццё» [5, 88] .

Паводле народна-міфалагічных уяўленняў, кот звычайна паўстае прадстаўніком сваёй, абжытай і бяспечнай прасторы (прыгадаем вядомы звычай класці ката ў калыску альбо ўдзел ката ў звычаях, звязаных з уваходзінамі ў новую хату).

Згодна з беларускім вясельным звычаем «у час вяселля пад ложак маладым саджалі кошку з кацянятамі, «каб было многа дзяцей», а «сон пра ката... прадвяшчае жанчыне хуткую цяжарнасць і нараджэнне дзіцяці» [5, 89]. Антрапаморфныя рысы, якія сведчаць пра міфалагічнае паходжанне гэтага вобраза, выяўляюцца ў здольнасці ката калыхаць дзіця, прыносіць падарункі, выконваць гаспадарчыя работы.

Славеснаму тэксту, якім суправаджалася калыханне дзіцяці, надаваўся магічны сэнс. Лічылася, што матчын спеў мог засцерагчы дзіця ад хвароб і паспрыяць шчаслівай долі. Аб заклінальных асаблівасцях калыхальнай паэзіі на Лоеўшчыне сведчыць калыханка-«замаўлянка», запісаная ў вёсцы Барэц:

Петушкі Андрэйкі,
А куркі Матронкі,
Забярыце ад майго Віцюшы (імя дзіця)
Крыксы, плаксы
Начныя, паўночные,
Дзённыя, палудзённыя.
А дайце яму добрага апеціта і сна,
Каб ён спаў, гуляў,
І к цельцу прыбываў.

Запісана ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н.

Забаўлянкі як жанр дзіцячага фальклору – гэта «вершаваныя творы з хуткім рытмам, жартаўліва-гумарыстычным зместам; яны не спяваюцца, а прыгаворваюцца, вымаўляюцца рэчытатывам у рытме пэўнага дзеяння, рухаў, якія пры гэтым выконваюцца» [1,74]. Заўважым, што на Лоеўшчыне іх называюць пацешкамі, для якіх уласціва найперш асаблівая рытмічная арганізацыя тэксту, што звязана з іх непасрэднай функцыянальнасцю – развесяліць дзіця, павысіць яго актыўнасць, выклікаць станоўчыя эмоцыі:

А-ту-та, а-ту-та,
Села баба на ката,
Паехала да папа.
Папа няма дома,
Паехаў па дрова.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Ксеніі Сяргееўны, 1920 г. н.

Забаўлянка, якая часта пабудавана ў форме дыялога, не толькі апавядае пра навакольны свет, яго аб'екты і з'явы, але і дапамагае развіваць памяць дзіцяці.

– Ласачка, ласачка, дзе была?
– У Бога жыла.
– Што рабіла?
– Красёнца ткала.
– Што зарабіла?
– Кусочак сала...

Запісана ў п. Падзіцель Лоеўскага р-на
ад Нікіценка Праскоўі Іванаўны, 1925 г. н.

Адметнасць прыведзенага тэксту ў выкарыстанні шматлікіх дзеясловаў, якія ствараюць дынаміку развіцця сюжэта.

Адным з рэдкіх жанраў, узоры якога не так часта можна пачуць ад сучасных дзяцей, але які добра захаваўся ў памяці прадстаўнікоў старэйшага пакалення,

з'яўляюцца заклічкі. Звычайна гэта вершаваныя радкі, звернутыя да прыродна-касмічных з'яў і прадстаўнікоў жывёльнага свету:

Дожджык, дожджык, лупані!
Бабу з поля прагані,
А дзеда – за косы,
Каб не бегаў босы.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г. н.

Лічыцца, што такія звароты дайшлі да нас з глыбокай даўніны, калі песням надавалася магічнае значэнне і былі характэрны для іх заклінальныя інтанацыі. Чалавек з іх дапамогай імкнуўся паўплываць на з'явы навакольнага свету, сілы прыроды. Паступова заклічкі страцілі сваё звышнатуральнае прызначэнне, набылі гульнёвы сэнс.

«Без гульні не мысліцца дзяцінства», – адзначае Г. А. Барташэвіч, падкрэсліваючы, што менавіта гульня з'яўляецца асноўнай формай дзейнасці дзіцяці, зместам яго жыцця [1,143]. Немагчыма ўявіць лічылкі без гульні. Звычайна гэта «невялікія вершаваныя, часцей за ўсё гумарыстычнага характару творы, з дапамогай якіх вызначаецца чарговасць у гульні, выбіраюцца дзеючыя асобы або вядучыя» [1,128]. Вядома, што гэты жанр узнік яшчэ ў старажытныя часы, калі нашы продкі верылі ў шчаслівы і нешчаслівы лік. Сярод сучасных запісаў сустракаюцца сюжэтныя лічылкі, якія дапамагаюць не толькі размеркаваць ролі ў гульні, але і авалодаць навыкамі лічэння:

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем.
Выйшла баба з доўгім носам,
А за ёю стары дзед
Запытаўся: «Колькі лет?»
Гавары хутчэй, не затрымлівай добрых,
Чэсных людзей.
Дуб, клён...
Дуб, клён, выйдзі вон!

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Антончыка Паўла Віктаравіча, 1920 г. н.

Ёсць таксама і так званыя «мудрагелістыя» лічылкі, у кампазіцыйную аснову якіх пакладзены гукапіс:

Чука-тэ-мэ
Амбы-фамбы
Ду-ма-нэ.
Ікі-пікі
Грамоцікі.
Клёнус выйшаў –
Гэта ты.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Антончыка Паўла Віктаравіча, 1920 г. н.

Адна з распаўсюджаных і добравядомых гульняў, занатаваных на Лоеўшчыне – гульня ў «Калечка». «У каго калечка, той маё сардэчка – выйдзі на крылечка!» (запісана ад Ігнаценка Ксеніі Сяргееўны, 1920 г. н. у в. Уборак Лоеўскага р-на).

«Калечка» – варыянт старажытнай па паходжанні гульні «У золата», «змест якой – адшуканне ў далонях удзельнікаў пэўнай рэчы» [1,149]: «З куту іду, золата

нясу, угадайце, баяры, дзе золата ўпала? – На куце ў паліцы, у красным, у ясным, у няшчасным» [3, 488]. Даследчыкі мяркуюць, што «прыгавор, дзе ўпамінаюцца баяры, шчаслівыя і нешчаслівыя месцы ў хаце ... найменне захаванай рэчы золатам, хаця гэта можа быць пярсцёнак, трэсачка або вугаль, сведчыць аб даўнасці гульні», старажытнасці яе паходжання [1, 150].

Калі ж мы звернемся да назвы гульні «У золата» і паспрабуем растлумачыць яе глыбінную сімволіку, атрымаецца наступнае: золата – «сімвал усяго вышэйшага, годнага, славы, сімвал «чацвёртага стану» пасля першых трох – чорнага (значэнне: грэх і раскаянне), белага (дараванне і нявіннасць) і чырвонага (ачышчэнне і страсць). Усялякае золата і ўсё, што выраблена з золата, імкнецца перадаць гэтую якасць сваім утылітарным функцыям» [4,223]. «Золата таксама – істотны элемент сімволікі схаванага альбо знікаючага скарбу як ілюстрацыі здабыткаў духу» [4, 223]. Апрача таго, што гэты каштоўны метал лічыцца адным з абавязковых элементаў царскай і боскай атрыбутыкі, беларусам уласціва асэнсаванне раслінных вобразаў у якасці залатых – «дрэва з залатой карой (голлем, лісцем і г. д.), якія сімвалізуюць ідэальны парадак на падворку слаўнага гаспадара, а па сутнасці, праектуюць на гэты падворак ідэальныя прастору і час выраю» [2, 193]. Сімволіка золата непарыўна звязваецца з салярнай, сонечнай сімволікай: «Сонца – вобраз сонечнага свету і, выходзіць, боскага розуму. І калі вобраз сонца ў чалавеку – сэрца, то ў зямлі – золата» [4, 222].

...І тады зусім да месца паўстае поруч са знакамітымі вытлумачэннямі даследчыкаў назва гульні «У каго калечка, той маё сардэчка...», запісанае на Лоеўшчыне.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Барташэвіч Г. А.* Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976 г. – 168 с.

2. Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.

3. Дзіцячы фальклор. Рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

4. *Керлот Хуан Эдуардо.* Словарь символов. – М.: «REFL-book», 1994. – 608 с.

5. *Коваль У. І.* Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы. – Гомель, 1995. – 180 с.

6. *Радченко Зинаида.* Гомельские народные песни (белорусские и малорусские). СПб.: В типографии В. Безобразова и комп., 1888, 256 с.

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

Скарагаворкі

Чистил щёткой я щенка, щекотил его бока.

Кто хочет разговаривать, тот должен выговаривать всё правильно и внятно, чтоб было всё понятно.

Калыханка-замаўлянка
(як не спіць дзіця)

Петушкі Андрэйкі,
А куркі Матронкі,
Забярыце ад майго Віцюшы (імя дзіця)
Крыксы, плаксы,
Начныя, паўночныя,
Дзённыя, палудзённыя.
А дайце яму добрага апеціта і сна,
Каб ён спаў, гуляў
І к цельцу прыбываў.

Запісана ў в. Барэц Лоеўскага р-на
ад Саўчанка Ніны Аляксееўны, 1936 г. н., 2005 г.

Баю-баюшкі, баю,
Не лажыся на краю,
А серанькі валчок прыйдзе,
Схваціць за бачок,
Унесёт у лясок.

Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на
ад Булацкай Марыі Дзмітрыеўны, 1936 г. н., 2002 г.

Дожджык, дожджык, лупані!
Бабу з поля прагані!
Дзеда – за косы,
Каб не бегаў босы.

Забаўлянкі

А-ту-та, а-ту-та,
Села баба на ката,
Паехала да папа.
Папа няма дома,
Паехаў па дровы.
Не па дровы, па лазу,
Казаў: «Зайца прывязу».

О-та-та, о-та-та,
Баба села на ката,
Паехала да папа.
Папа няма дома,
Паехаў па дровы.
Толькі адны дочкі
Ходзяць без сарочкі.

Калыханка

Баю, баю, баю, бай,
Памаленьку засыпай.
Прыйдзе шэранькі каток
І ўкусіць за бачок.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пікас Варвары Пятроўны, 1927 г. н., 2005 г.

Забаўлянка

Ідзе каза рагатая,
Ідзе каза бадатая
За малымі рэбятамі.
Ножкамі топ-топ,
Глазкамі хлоп-хлоп.
Кто кашы не еў,
Малака не піў,
Забадае,
Забадае,
Забадае.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Верамеенка Ганны Паўлаўны, 1930 г. н., 1994 г.

Дзіцячая забаўлянка

– Ласачка, ласачка, дзе была?
– У Бога жыла.
– Што рабіла?
– Красёнца ткала.
– Што зарабіла?
– Кусочак сала.
– А дзе сала?
– Кошка ўкрала.
– А дзе кошка?
– Пад печ пабегла.
– А дзе печ?

– Вада затапіла.
– А дзе вада?
– Валы папілі.
– А дзе валы?
– Доўбні пабралі.
– А дзе доўбні?
– На вайну пайшлі.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Нікіценка Праскоўі Іванаўны, 1925 г. н., 1993 г.н.

Калыханка

Люлі, люлі, люлі,
Палез кот на гулі,
Сеў на палаткі –
Адмарозіў лапкі.
Прыйшоў да дзіцяці,
Стаў калыхаці.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Не спі, коцік,
Не гуляй,
Ды ідзі дровец нарубай,
Ды печачку натапі,
Ды кашачкі навары,
Кашачкі навары,
Леначку накармі.
Яна будзе спаці,
А я калыхаці.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Максіменка Анісіі Цімафееўны, 1911 г. н.
(раней пражывала ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Калыханка

Ай, маленькі, люлі,
Не хадзі, коцік, па лавачкі,
Буду біць па лапачкі.
Не хадзі, коцік, па мосціку,
Буду біць па хвосціку.
Спі, мая маленькая.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г. н.,
Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г. н., 2005 г.

Лічылкі

Раз, два, тры – паляцелі камары.

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі.
Не чытаць, не пісаць,
А ў кукалкі гуляць.

Забаўлянкі і пацешкі

Сарока-варона
Дзеткам кашку варыла,
На прыпечку студзіла,
Палоўнічкам мяшала.
Етаму – давала,
Етаму – давала,
Етаму – давала,
Етаму – давала,
А етаму не дала.
Еты мал, круп не драў,
Дзяжы не мясіў,
Вады не насіў.
Табе кашка на паліцы
У маленькай чарапіцы.

– Ласачка-Парасачка,
Дзе была ты, красачка?
– Я была ў бабкі,
Што пячэ аладкі.

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Нада коніка каваць,
Штоб умеў ён танцаваць.

Ладу-ладу, ладушкі,
Пабіліся бабушкі
За камочак цеста.
Ды пасерад места
Засталіся крошкі,
Іх паелі кошкі.

Вялікія ногі
Ішлі па дарозе:
Топ-топ.
Маленькія ножкі
Беглі па дарожке:
Топ-топ, топ-топ,
Топ-топ, топ-топ.

Ідзе каза рагатая,
Сколе Вовіка пузатага-пузатага.

Калыханкі

А ту-та, а ту-та,
Села баба на ката,
Паехала да папа.
А паповы дочкі
Шылі чабаточкі.
Шылі, падшывалі,
Дротам падбівалі.
А Йванчыку-Сцяпанчыку
На дудачку йграе,
Песеньку спявае.

Ой, люлі, ой, люлі,
Паляцелі гулі,
Селі на вароцях,
У чырвоных чабоцях.

Баю-баюшкі-баю,
Не лажыся на краю.
Прыйдзе серанькі ваўчок
І ўкусіць за бачок.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Трасцян Еўдакіі Іванаўны, 1931 г. н., 1994 г.

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
На дарожцы слізка,
А дамоў не блізка.

Гоп-гоп, іга-га,
На буланцы едзе Янка,
Паўтараста рублей санкі,
Пяцьдзесят рублей дуга,
А кабылка – паўрубля.
Гоп-гоп, іга-га.

– Ладу, ладу, ладкі,
Дзе былі?
– У бабкі.
– А што елі?
– Кашку.
– А што пілі?

– Бражку.
– Бабулька казала, як нас частавала:
«Прыхадзіце часцей, пачастую смачней,
Дам вам сыраквашкі
Да й бярозавай кашкі».

Скок-паскок,
Малады драздок
Па вадзічку пайшоў,
Маладзічку найшоў.
Маладзічка невялічка:
Сама з вяршок,
А галава з гаршок.
Шугі-шугі паляцелі,
На галовачку селі.

Лічылка

Кацілася торба
З вялікага горба,
А ў той торбе
Хлеб, паляндвіца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ходас Ганны Мікітаўны, 1924 г. н., 1994 г.

Алай, алай, ноч ідзе,
Алай, алай, сон вядзе.
Мне лажыць твайго сынка,
Баю-бай, баю-бай.
Спі, малы, чаго не спіш?
Хутка вырасцеш, малыш,
І вярхом на скакуне.
А ці ўспомніш пра мяне?
Баю-бай, баю-бай.

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдлейкам сваёй маткі,
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам?
А як матка ў кут на лаве,
Сын хлеб-соль прад ёй паставе,
Ручкі, ножкі пацалуе,
Пачастуе мядком сытным,

Блінком мякенькім падсітным,
Піражочкам і з начынкай,
Верашчачкай гарачанькай.
Люлі, сынок, люлі, люлі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Насон Валянціны Міхайлаўны, 1956 г. н., 1994 г.

Лічылкі

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Выйшла баба з доўгім носам,
А за ёю стары дзед
Запытаўся: «Колькі лет?»
Гавары хутчэй,
Не затрымлівай добрых,
Чэсных людзей.
Дуб, клён...
Дуб, клён, выйдзі вон!

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Антончыка Паўла Віктаравіча, 1920 г. н.
(нарадзіўся ў Капыльскім р-не Мінскай вобласці,
пражывае ў г. п. Лоеў з 1948 г.), 2005 г.

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.

Хто паперад – таму жэраб,
Хто пазаду – таму жабу,
Хто пасерадочку – таму мёду бочку.

Запісана ў п. Кашовае Лоеўскага р-на
ад Малеевай Ганны Архіпаўны, 1938 г. н.

Пацешкі

Села баба на ката,
Паехала да папа,
Папа няма дома,
Паехаў па дрова.

Чыкі-чыкі, чыкалачкі,
Ехаў барын на саначках.
А барышня ў цялежцы
Шчоўкала арэшкі.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Ксеніі Сяргееўны, 1920 г. н., 2005 г.

Калыханкі

Ой, люлі да люленькі,
Прыляцелі гуленькі,

Прыляцелі гуленькі
Прама ў люлю к Юленькі.
Баю-баю, баінькі,
Куплю Юлі валенкі,
Куплю Юлі валенкі
Бегаць па завалінкі.

Баю-баюшкі-баю,
Не лажыся на краёк,
Прыдзя серанькі ваўчок
І ўхваціць за бачок.

Баю-баю, дзеткі, спаць,
А я буду калыхаць,
А ты, серанькі каток,
Прыляж з дзеткай на краёк.

Пацешка

Села баба на ката,
Паехала да папа.
Папа няма дома,
Паехаў па дрова.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на ад Чынавай Вольгі Алімаўны, 2005г.

Калыханкі

Не хадзі, коцік, па хаце,
Не будзі майго дзіцяці.
Мой Валерка будзе спаці,
А я буду калыхаці.

Баю-баю, люлі-люлі,
Усе хлопчыкі паснулі,
А не спіць адзін Валерка. (2 р.)
Ты, Валерка, засынай,
Баю-баю, баю-бай.
Баю-баю, люлі-люлі,
Усе коцікі паснулі,
А не спіць адзін Валерка. (2 р.)
Ты, Валерка, засынай,
Баю-баю, баю-бай.
Баю-баю, люлі-люлі,
Усе зайчыкі паснулі,
А не спіць адзін Валерка. (2 р.)
Ты, Валерка, засынай,
Баю-баю, баю-бай.
Баю-баю, люлі-люлі,

Усе курачкі паснулі,
А не спіць адзін Валерка. (2 р.)
Ты, Валерка, засынай,
Баю-баю, баю-бай...
(І гэтак далей, пакуль дзіця не засне).

Забаўлянкі

Дзелалі ў ладошку пальчыкам малому дзіцяці, а ў канцы слакаталі пад мышкай:

Сарока, варона
Кашку варыла,
Дзетак карміла.
Етаму дала, етаму дала,
Етаму дала, етаму дала,
А етаму не дала.
А ты, пальчык, мал,
А ты круп не драл,
Вады не насіў,
Дзяжы не мясіў.
Ідзі, пальчык, на палічку,
Табе кашка ў рукавічку.
Тут пень, тут крыніца,
Там халодная вадзіца.

У ножку пальчыкам дзелалі малому дзіцяці, а ў канцы слакаталі пад мышкай:

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка ліхая.

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Трэба каня падкаваць,
Каб далёка начаваць.
Паедзем па гарэлку,
Па красную дзеўку.
Тут пень, тут крыніца,
Там халодная вадзіца.

Гладзілі малое дзіця па жывоціку:

– Ласачка, ласачка, дзе была?
– У Бога.
– Што рабіла?
– Кросны ткала.
– Што наткала?
– Кусок сала.
– Дзе паклала?
– Пад лаўкай.
– Чым накрыла?
– Караўкай.
– Дзе ж тое сала?
– Мышка ўкрала.
– Дзе ж тая мышка?

– Кошка паймала.
– Дзе ж тая кошка?
– Пад печ схавалася.
– Дзе тое падпечча?
– Краскамі зарасло.
– Дзе тыя краскі?
– Дзеўкі парвалі.
– Дзе тыя дзеўкі?
– Казакі пакралі.
– Дзе ж тыя казакі?
– На вайне.
– А дзе тая вайна?
– Пасярод г...
– А дзе тое г...?
– Тут.
(Хлопалі малое дзіця па попцы).

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на ад Поўжык Марыі Іосіфаўны, 1925 г.н. (раней пражывала ў в. Старая Лутава Лоеўскага р-на), 1999 г.

Лічылкі

На залатом крыльцэ сядзелі
Мішкі Гамі, Том і Джэры,
Дзядзя Скрудж і тры ўцёнка.
Выхадзі, ты будзеш Понка.

Ехала белка на тележке,
Продавала всем орешки:
Кому – два, кому – три,
Выходи из круга ты.

Дражнілкі

Сяргей-варабей
На кані катаўся,
Рукі, ногі паламаў,
Без трусоў астаўся.

Лена-пена, калбаса
З'ела мышку без хваста.

Дзядзя Федзя
З'еў мядзведзя,
А на Пасху
З'еў калбаску,
А на Пакрову
З'еў карову.

Гульні

Я люблю гуляць у жмуркі. Каму жмурыцца, выбіралі па лічылцы:

Кацілася торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, пшаніца,
З кім ты хочаш
Пажаніцца?

Хто жмурыцца, той гаворыць:

Я шчытаю да пяці,
Не магу да дзесяці:
Раз, два, тры,чатыры, пяць,
Я іду іскаць.

Патом тыя, каго не нашлі, выбягаюць да таго места, дзе жмурацца і стукаюць: «Тук-тук, сам за сябе». Калі той, хто жмурыцца, нашоў каго-нібудзь, то тожа застукуе іх: «Тук-тук, Маша ілі Саша». Каго первага застукалі, той жмурыцца.

Заклічкі

Дожджык, дожджык, лупані,
Бабу з поля прагані,
А дзеда – за косы,
Каб не бегаў босы.

Дожджык дожджык, перастань,
Я паеду ў Казахстан,
У Казахстане пуста,
Вырасла капуста.
А ў капусце – чарвякі,
Нашы хлопцы – дуракі.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Івахненка Тані, 9 год, 1999 г.

ГУЛЬНІ

Столбік

Станавіліся па два чалавека кружком, начыналі гуляць. Там, дзе стаяла два чалавека, адзін уцякаў і станавіўся да другой пары, потым трэці чалавек з групы зноў уцякаў і станавіўся да іншай пары. І гэтак далей.

Кальцо

Хлопцы і дзяўчаты станавіліся ў круг, складалі далоні адна да другой, хтосьці адзін браў ці кальцо, ці булаўку і хадзіў па кругу, і быццам аддаваў кальцо. Потым трэба было адгадаць, у каго гэта кальцо.

Запісана ў в. Уборак Лоеўскага р-на
ад Ігнаценка Алімпіяды Рыгораўны, 1922 г. н., 2005 г.

Бяганка

Вось такая ў нас была цікавая гульня. Колькасць гуляючых у ёй – 6–7 чалавек у кожнай камандзе. Па жэрабю ўдзельнікі адной каманды – у горад, а другой – расходзяцца па полю. Гульню пачынае каманда ў горадзе. Яе капітан размяркоўвае чаргу біткоў па мячу. Сам ён у якасці «надкідальшчыка» падкідвае мяч уверх, каб біток змог ударыць па ім бітай. За час, калі мяч знаходзіцца ў паветры, біток, пакінуўшы біту, павінен «выбегацца». Гэта значыць, прабегці па полю і, абагнуўшы кон, вярнуцца ў горад. Каманда, якая знаходзіцца ў полі, імкнецца злавіць у паветры мяч ці папасць ім у бягучага бітка. Для зручнасці можна яшчэ і перакідваць мяч адзін другому, але ж нельга было з мячом бегаць. Гуляючы, які ўдала збегаў за кон і вярнуўся, атрымлівае ачко для сваёй каманды. Каманда горада выігрывае ў выпадку, калі яна набярэ па ачку і тры ачка на капітана. Калі ў камандзе сем гуляючых, то яны павінны набраць дзевяць ачкоў. Затым у горад ідзе каманда з поля. Яна таксама павінна набраць большую колькасць ачкоў.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Радчанкі Рыгора Анатольевіча, 1933 г. н., 2005 г.

ПАЗААБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

Вясёла бяседачка

Вясёла бяседачка,
Дзе муж з жонкай п'е,
Во ён жа ёй чарачку
Поўную дае.
Просіць выпіць мілую
Чарачку адну,
Каб забыць пра родную
Сваю старану.
Не буду я, міленькі,
Поўнай выпіваць,
Не буду староначкі
Роднай забываць.
У роднай староначцы
Птушкі пяюць,
А ў чужой староначцы
Часта слёзы льюць.

Запісана ў в. Буда-Петрыцкая Лоеўскага р-на ад Захарэўскай Еўдакіі Мяфодзьеўны, 1927 г. н., 1994 г.

Стаіць гара высокая

Стаіць гара высокая,
А пад гарою гай.
Цечот рэчка быстрая,
Вніз сходзят берага.
Стаяць вербы магучыя,
Схіліліся над ракой.
Асыпаюцца іх лісцікі,
І панесёт вада,
А моладасць не вернецца,
Не вернуцца гада.

Я сядзела і мечтала
У адкрытага акна,
Чэрнаглаза, уся ў лахмоццях,
Ка мне цыганка падашла.
– Падайдзі-ка, сядзь пабліжы,
Дай мне ручку пагадаць,

Раскажу табе ўсю праўду,
Нічэго не стану враць.
У цябе на серцы точна камень,
Улюблена ты ў аднаго,
Хочэш быць яго жаною.
Апішу чарты яго:
Он прэкрасен, он і стацен,
Нет асобенных прымет.
Но для жызні он апасен,
Встрэціш много гора, бед.

Да й увечар

Да й увечар,
Да й павечарэе.
Што й на маём серцы
Да й павесялее.
Ой, калі то сонца
За лясочэк зойдзе,
Ой, калі ж мой мілы
Да й да мяне дойдзе.
Хоць ні да міне,
Дык ля маёй хаты.
Адчыняй вароты,
Штоб не чула маці.
Варота адчыняла,
Лёгенька ўздыхала,
Лёгенька ўздыхала,
Праўдачкі пытала:
– Скажы, скажы, мілы,
Ой, ці верна любіш,
Ты з мяне смяешся,
Другую галубіш.
– Ох, я цябе люблю
І любіці буду,
Прызнаюсь па праўдзі,
Што браці не буду.
Што браці не буду,
Не вяліці маці,
Еслі я цябе вазьму,
Выганіць із хаты.

Каля мора я хадзіла

Каля мора я хадзіла
І не відзела мора дна.
Жыву ад маменькі далёка
І не відзела гады два.
Каму весела жывецца,
А мне гора да печаль,
Ой, наверна, мяне маці
Да й у пятніцу радзіла,
Ой, нашто ж ты мяне, маці,
Горкай доляй наградзіла.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н., 2001 г.

На трапінке маёй запарошэнай

На трапінке маёй запарошэнай
Нашы встрэчы былі гарачы.
Не хадзі ка мне, мілы,
Харошы мой,
І ў акошка ка мне не стучы.
Не хадзі ка мне, мілы,
Харошы мой,
І ў акошка ка мне не стучы.

Нет, не я цебя, мілы, заставіла,
Сам рэшыся на подвіг такой.
І не я, і не я цебя, мілы, заставіла
Цэлавацца на свадзьбе з другой.
І не я, і не я цебя, мілы, заставіла
Цэлавацца на свадзьбе з другой.

Не пайду я з табой за аколіцу,
Значыт, совесць мая не веліт.
Толька сэрца маё ўспакоіцца,
А ў падружкі маёй забаліт.
Толька сэрца маё ўспакоіцца,
А ў падружкі маёй забаліт.

І скажы, чэго ж цебе хочэцца,
Пад акошкам ты сядзь, пакуры.
Мне чужога няшчасця не хочэцца,
Хваціт мне на весь век сваего.
Мне чужога няшчасця не хочэцца,
Хваціт мне на весь век сваего.

Па трапінке маёй запарошэнай
Нашы встрэчы былі гарачы.
Прыхадзі, прыхадзі ка мне, мілы, харошы мой,
І ў акошка маё пастучы.
Прыхадзі, прыхадзі ка мне, мілы, харошы мой,
І ў акошка маё пастучы.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Кулагі Рыгора Іванавіча, 1935 г. н., 2001 г.

У лузе каліна стаяла

У лузе, у лузе каліна стаяла,
А на той каліне зязюля кавала.
Ой, яна кавала, усю праўду казала.
Гора, братцы, гора,
Хто з кім расстаецца.
Траўка з калінаю,
Вішня з рабінаю.

Запісана ў в. Каўпенъ Лоеўскага р-на
ад Анісавец Галіны Іванаўны, 1925 г. н., 1994 г.

Сямейная песня

Ой, гора, гора старому,
Ой, гора, гора старому

Да з маладою жонкаю.
Маладая жонка ўпрочкі пайшла,
Старога лапці знясла.
Ды знесла лапці-аборы,
Да ўсе старога прыборы.
Ды знесла лапці-анучы,
Да нечага старому абуці.
Да ў чаравічак плацця накрала,
Да мяне старога абакрала,
У цэбрыку мукі набірала,
Яна мяне, старога, згубіла.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Верамеенка Ганны Паўлаўны, 1930 г. н., 1994 г.

Ирвала я розу в зелёном саду

Ирвала я розу
В зелёном саду,
Ирвала, бросала
На быстру раку.

Плыви, плыви, роза,
Под новы ворота,
Не смейся, казача,
Что я сирота.

Не смейся, казача,
Что я сирота.
Кали б пришол в сваты,
То б я не пошла.

Не бойся, девчина,
Я в сваты не пойду,
Объеду Россию,
Покраше найду.

Объехав Россию,
Ще й три города,
Не нашел покраше,
Как ты, сирота.

Объехав Россию,
Ще й городов семь.
Вернулся, Маруся,
К тибе я совсем.

Выйду я на горачку

Выйду я на горачку,
На крут бераг-беражок,
Погляжу в окошачка,
Аж корабличок плывёт.

Погляжу в окошачка,
Аж корабличок плывёт.
Эй, корабель мой новенькай,
На ём питерский значок.

Эй, корабель мой новенькай,
На ём питерский значок.
Залатыя веселцы
Низка пляшуць пад вадой.

Залатыя веселцы
Низка пляшуць пад вадой.
Молодой казача,
Што смяешся нада мной.

Молодой казача,
Што смяешся нада мной.
Нада мною, девачкай,
Над круглай сиратой.

Запісана ў в. Новая Баршчоўка
(раней Баршчоўка) Лоеўскага р-на
ад Лаханька Ніны Фядосаўны, 1937 г. н., 2001 г.

Маці сына на службу сураджала

Маці сына на службу сураджала,
Сураджала ды і прыказвала:
– Ды едзь, мой сынок, не барыся, не жаніся,
Ды на трэці гадок назад вараціся.
Аж на трэці гадок ды едзе сынок,
Ды едзе сынок з нявестачкаю.
Ды выйшла маці ды дзяцей вітаць.
Сынка вітала медам ды віном,
А нявестачку атрутанькаю.
Сын віна не п'е
Ды пад коніка лье,
А атрутаньку папалам п'е.
Ды не ўмела ты, маці,
Ды дзяцей вітаці,
А ўмела, маці, дзяцей хаваці.
Пакладзі ж ты нас у адной магілцы.
Сынка паклала пад цэркаўкай,
А нявестачку – за цэркаўкай.
На сынку вырас зялёны явар,
А на навестачцы белая бяроза.
Ды раслі, раслі, ды і пахіліліся,
Ды цераз цэркаўку сашчапіліся,
Ды не так моліцца, як слёзна плача.
Ды, навернае, дзеткі, вы верна любілі,
Што цераз цэркаўку ды і сашчапіліся.

Узяў мілы мілую за ручаньку белую

Узяў мілы мілую
За ручаньку белую,
Павёў мілы мілую
Да к ціхаму Дунаю.
– Плыві, мілая, туды, дзе халодная вада,
А вярнуся дадому, дзетачак даведаюсь.
Толькі татка на парог:
– Дзетачкі дзе, да ноч.
Ой, татачка, татачка,
Ды ці ўбіў, ці прадаў,

Рыбачачкам так аддаў,
Рыбачачкі малады,
Ўзялі мамку, павялі.
Адное кажа: «Пайду ў лес,
Няхай мяне звер з'есць».
Другое кажа: «Утаплюся».
Трэйцяе кажа: «Наймуся,
Капеечку зараблю
Ды родную мамку памяну».
А ў нядзельку раненька
Штось у лесе гукае,
Татка дзетак шукае.
– Ідзіце, дзеткі, дадому,
Худа жыць і самому.
– Жыві, татка, як Бог даў,
Маладую жонку ўзяў.
Табе жонка малада,
А нам горачка, бяда.

Ой, умру я, умру

Ой, умру я, умру
Ды на цэлыя два дні,
Ды ці не выведаю з мілага праўды.
Аж мой мілы спужаўся
Ды ў паны выбраўся.
Ды ўжо выйшаў за вароты
Ды ў бокі ўзяўся.
– Ой, Божа мой, Божа мой,
Што мне рабіці,
Ці цела хаваці, ці каня сядлаці,
Ці каня сядлаці ды ехаць
На Украіну другую шукаці.
Аж ідуць людзі цела даведацца,
Ды адна ішла з чорнымі бровамі,
А другая ішла, тая не такая.
А дзетачкі плачуць, к маці прылягаюць.
Не плачце вы, дзетачкі, я яшчэ не ўміраю,
Я з вашага бацькі праўды вывядаю.
Ой, мамачка, мамачка,
Што ж ты нарабіла,
Ты нашаму бацьку славу пусціла.

Ой, крапіўка, крапіўка жыглівая

Ой, крапіўка, крапіўка жыглівая,
Ды была ў мяне свякруха журлівая.
Ды і журыла яна мяне, як дзень, як ноч,
Ды і выпраўляла яна мяне ды ад себя проч.
– Ды ідзі, нявехначка, у чыста поле,
Ды зрабісь, нявехначка, рабінкаю,
Ды будзе мой сынок з войска ехаць,
Ды будзе на рабінку дзівіцца.
– Ой, што то за рабінушка,
Ой, што то за кудравая
Пры дарозе стаіць,
Ды без вятру рабінка хістаецца,
Ды без дажджу рабінка макрэнькая.

– Ды бяры, мой сынок, бяры вострый меч,
Ды ідзі зрубі рабінцы галоўку з плеч.
Да што раз цюкнуў – кроў капнула,
Другі раз цюкнуў, прамовіла:
– Ты не рабінку рубаеш, а жонку сваю,
Не галінкі абсякаеш, а дзетак сваіх.
Ох, ты, маці, наша маці, ох, ты лютая змяя,
Ох, ты лютая змяя, як ты мяне развяла.

Ды куплю карабель

Ды куплю карабель на сто рублей,
На сто рублей з палцінаю.
Ды пасаджу жонку з дзяцінаю,
Ды не дам вёслы, штоб знесла быстра.
А карабель плыве, аж вада раве,
А жонка сядзіць, як свечка гарыць,
А дзяцінайка, што каліначка,
А мой міленькі беражком ідзе.
Беражком ідзе, ды і просіць мяне:
– Ды вярнісь, жоначка, ды вярнісь мая.
– Ды я не вярнусь, бо я цябе баюсь,
Ты біў мяне нагайкай, пачывала я пад лаўкай,
Выціралася караўкаю.

Ой, гора, гора, беднай сіраце гора

Ой, гора, гора, беднай сіраце гора,
Ды белы мароз ды ў ножанькі коле,
Ды не так мароз, як няродная мамка.
Легла сірата, не вячэраўшы, спаць,
Не вячэрала, не буду я і абедаць,
Ды пусціце мяне радзіначкі адведаць.
Ды пайшла я ціха, памаленечку,
Ды і падайшла я к брату пад акеначка.
А ў майго брата любая бяседа,
П'юць, гуляюць ды сястрычку ўспамінаюць.
Дзесь наша сястра, сястрыца пракрасная,
Долечка яе горкая, няшчасная.
Род мой міл, ды пой, мая душа,
Ды ў мяне тры бяды ў хаце.
Першая бяда – дзяціна малая,
Другая бяда – свекар раўлівы,
Трэцяя бяда – свякруха ліхая.
Ды пайду я пад новыя сені,
Ды паслухаю, што сям'я гаворыць.
А свякруха ды і вячэру варыць,
А свекарка ды і рабіну парыць,
А мой мілы ды і ў таткі пытае:
– Нашто, татка, ды рабіну парыш?
– Пару, сынку, ды на тваю жонку.
– А за што, татка, маю жонку біць?
Яна ўмее дзелячка рабіць,
А ў люлі дзяціна малая,
Няхай мамка з родам пагуляе.
Увайшла ў хату, засмяялася,
Праклята сям'я здагадалася.

Свякруха кажа: «Ідзі карову падаі»,
А свекарка кажа: «Ідзі каня напаі»,
А залвіца кажа: «Мне коску запляці
І на вячоркі гуляць адвядзі».
А мой міленькі кажа: «Сядзь павячэрай, адпачні».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Максіменка Анісіі Цімафееўны, 1911 г. н.
(раней пражывала ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Прыпеўкі

Ох, хто ж та ідзе
Па-пад горніцаю,
Чэрці мілага нясуць
З палюбоўніцай.

Ой, не стой пад акном,
Не махай рукавом,
Я не выйду ды не стану,
Ды з такім дураком.

Ты, саперніца мая,
Не выходзь наўстрэчу,
Паштурхаю за касу,
Навек пакалечу.

Што за месяц, што за ясны,
Калі свеціць, калі не,
Што за міленькі дружочак,
Калі прыйдзе, калі не.

Што ты, мілы, задаешся:
«Усё да я, да я, да я».
Не хадзі, не задавайся,
Дзе пахужай, то твая.

Чаго, мілы, не прыйшоў,
Я цябе чакала,
Да дванаццаці часоў
У фортачкі стаяла.

Ды не сядзі, Андрэйка, не сядзі,
Ды паднімі вочкі,
Ды на матку паглядзі.
Можа, цябе прыданачкі абманулі,
Старую бабку табе пасадзілі.

Ды брат сястрыцы касу расплятае,
Касу расплятае ды й прыгаварвуе:
– Вось табе, сястрыца, сястрыно,
Штоб табе гэта на лета было.

Ды равуць коні, равуць,
Ды багатырыку вязуць,
А ў нашага свата саламяная хата,
Ні клеці, ні павеці,
Ды недзе скрыні дзеці.
А ў нашага свата лазяная хата,
Сені з бярозы, пайшлі ўсе цвярозы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Максіменка Анісіі Цімафееўны, 1911 г. н.
(раней пражывала ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Прыпеўкі

Не ругай мяне, мамаша,
Што я ўтамілася,
Я на лавачцы з саседам
Цалаваць вучылася.

Балалайка, балалайка,
Балалайка дзінь да дзінь,
Я мілому прыказала:
– Прыхадзі ка мне адзін.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Насон Валянціны Міхайлаўны, 1956 г. н., 1994 г.

Я прыпевак многа знаю,
Начынаю первую,
Пракляла свайго мілога
За любоў няверную.

Ох, любоў, ох, любоў,
Дзе жэ ты падзелася?
Ой, наверна, ты, любоў,
Па полю разляцелася.

Ой, любоў, ой, любоў,
Хужэ сушаных грыбоў.
Грыбоў зварыш і з'ясі,
Любоў нікому не дасі.

Дарагая ты, падружка,
Памажы гору майму,
Перадай пару славечак,
Сама знаеш ты каму.

Дарагая ты падружка,
Плоха ты старалася,
Пахадзіла пад акошкам,
Пастучаць баялася.

Дарагая ты падружка,
Я старалась перадаць,
Я хадзіла пад акошкам,
Яго дома не відаць.

Дарагая ты падружка,
Як жа я буду стучаць?
Як замеціць яго маці,
Будзе мяне ругаць.

У мяне ўхажораў пяць,
Я магу пераказаць:
Шура, Коля, Лёня, Пеця,
Аднаго забыла зваць.

У мяне ўхажораў два,
У том канцы і ў етым,
Аднаго люблю зімой,
А другога летам.

У мяне ўхажораў трыццаць,
Я не знаю, дзе мне скрыцца?
Пайду брошусь у раку,
Няхай сядзяць на берагу.

Я любіла куст маліны,
Я любіла сенакос,
Я любіла кары глазкі,
Чорны волас на прычос.

Я любіла ў моры плаваць,
Камушкі выкідуваць.
Цяпер, мілы, не твая,
Нечага завідаваць.

Калі б знала ў моры дно,
Я бы не купалася,
Калі б знала, што ён бросіць,
Я бы не ўлюбілася.

Із-пад леса выйшлі двое,
Навернае, нашы.
У аднаго пуза ў малаке,
У другога – у прастаквашы.

Як надзену бела плацце
Ды пайду ў той канец,
У мяне міліцыя знакома,
Прадседацель – мой ацец.

Із-пад юбкі юбка відна,
Юбка вуліцу мяцёт.
Мілы кажа, што я дура,
Няхай вумніцу найдзёт.

Мілы піша: «Надаела
Вінтовачку заражаць».
Я пішу: «Надаела
Усякай сволачы ўважаць».

Не ругай мяне, мамаша,
Не ругай так грозна,
Ты сама была такая,
Прыхадзіла позна.

Мяне мілы праважаў,
Пад пахай гармонь дзяржаў,
Да крылечка правадзіў,
Зайграў і пайшоў адзін.

Пеця едзе ў лісапеце,
А я еду на другой,
Пеця ў розавай рубашцы,
А я – у галубой.

Адзін Коля дровы коліць,
А другі складае.
Адзін Коля мяне любіць,
А другі – страдае.

Як надзену бела плацце,
А наверх зялёны клёш,
Мой мілёнак,
Не ўцерпіш, падайдзёш.

Із-пад юбкі юбка відна,
Юбачка баціста́ва.
Ой, няўжэлі я не буду
Жонкай гарманіста.

Пасадзілі гарманіста
Пад самыя абраза,
Не гармошка заўлякае –
Яго карыя глаза.

Гарманіст, гарманіст,
Я цябе знаю,
Хоць за цябе не пайду,
Зато пагуляю.

Гарманіст, гарманіст,
Рубашачка атласная,
Я за цябе, гарманіст,
Угробіцца сагласная.

Я на Колеву гармошачку
Павесіла сірэнь,
Штобы Колева гармошачка
Іграла весялей.

Пакуль ажаніцца,
Ні кажы нікому,
Цябе людзі разнясуць,
Як вецер салому.

Я сядзела, рыбку ела,
У рыбкі сэрца відзела,
Чужых хлопцаў я любіла,
А сваіх я ненавідзела.

Ой, сірэнь, сірэнюшка,
Завяла без урэмюшка,
Завялі алыя цвяты,
Забыла я, забудзь і ты.

Я сядзела на масту,
Шыла кофту к Раждзяству,
Шыла я, ня мерала,
Любіла я, ня верыла.

Вышывала я платочак
Тоненькай іголачкай,
Паздраўляю цябе, мілы,
З новай ухажорачкай.

На шырокай паласе
Перапела песні ўсе.
Думаць я, дзяўчоначка,
Не смела пра мілёначка.

Сірата, сірата,
Мне эта не верыцца,
Ой, неўжэлі сірата
Не такая дзевіца.

Мілы піша, мілы піша:
«Гуляй, мілая, паціша».
А я яму пішу:
«Я гуляю, не спешу».

Не ругай мяне, мамаша,
Што смятану разліла.
Мой Алёшка пад акошкам –
Я без памяці была.

Гыля, гыля, серы гусі,
Гыля, гыля, вутачкі,
Вышла замуж маладая,
Ды думала шутачкі.

Гыля, гыля, серы гусі,
Гыля, гыля, гусачок,
Вышла замуж маладая,
Думала на часок.

Запісана ў в. Барэц Лоеўскага р-на
ад Атрошчанка Ганны Ціханаўны, 1928 г. н., 2005 г.

Гавараць, што некрасіва,
Ты не вер ім, дарагой.
Тыя пудрацца, румяняцца,
А я мыюся вадой.

Некрасівая сасна,
Красівы падсасёначак.
Некрасівая сама,
Красівы мой мілёначак.

На гарэ стаіць бальніца,
Пад гарой прыёмная.
Прыхадзі ка мне лячыцца,
Калі ночка цёмная.

Я саперніцу касую
На партрэце нарысую.
Глянь-ка, мілы, на партрэт,
Яна касая, а я нет.

Ой, мілка мая,
Тоненькага стану,
Хто цябе любіці будзе,
Калі я перастану.

Падружка мая,
Давай памяняемся.
Ночку я з тваім,
Ночку ты з маім,
Па вечарочку пастаім.

Мы з падружкаю ўдваём
Калацілі ў полі лён.
Калацілі, гаварылі,
Што мы замуж не пайдзём.

Мы з падружкаю ўдваём
Па дзярэўне славілісь.
Адбівалі, адбівалі,
Ліш бы нам панравілісь.

А мой міленькі прыехаў,
Сабе жонку прывалок.
А маю любоў гарачу
Ён прыбіў на паталок.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на ад Сініла Г. В., 1936 г. н., 2000 г.

Я прыпевак многа знаю
І на курсах не была,
Развясёлую такую
Мяне маці радзіла.

Урадзіла мяне маці
На высокай горцы,
Аставіла гараваць
На чужой старонцы.

На чужой старонцы жыць,
Нада кожнаму гадзіць:
Перваму, сярэдняму
І самаму паследняму.

Мяне дома б'юць, ругаюць,
Усё раўно я ўцяку,
Я назначыла свіданне
Ля ракі, на берагу.

Яшчэ трошкі, трошкі,
Не баляць ножкі,
А баліць галава,
Бо гарэлкі няма.

Ваенныя частушкі

Мой мілёначак далеко,
І платочак у яго.
Дык няхай жа ўціраецца,
Любіла я яго.

А мой мілы краснармеец,
Яго белае ліцо.
Нахіліўся на вінтовачку –
Чытае пісемцо.

Піша брат мне з Вастока:
«Дарага сястроначка,
Твайго мілага ўбілі
На маіх глазёначках».

Майго мілага ўбілі
Немцы-непрыяцелі,
У чыстым полі схаранілі
Без айца, без мацеры.

Ой, вайна ж, да ты, вайна,
Што жа ты надзелала,
Маладых кадравікоў
На калек падзелала.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на ад Жук А. П., 1927 г. н., 2000 г.

Палюбіла сокала,
Сокала высокага,
Штоб яго пацалаваць
Станавілась на краваць.

Ох, юбка мая
У чатыры веера,
Скоро-скоро я даждусь
Моряка із Севера.

Ой, чыя-то хата з краю,
Чы не свёкра маяго?
Каб яна яму згарэла
Разам з сынам з яго.

Хто, што ідзе,
То, наверна, нашы.
У твайго пуза ў супу,
У майго – у сыраквашы.

Не глядзіце на мяне,
Што я бойкая.
Разгарэлася ва мне
«Руска» горкая.

Я сваю саперніцу
Павязу на мельніцу,
Змялю шэльму на муку
Шчэ аладак напяку.

Я іду, да я іду
Па калена ў лебяду.
Хоць сама я некрасіва,
Да красівага вяду.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на ад Сідарок Т. В., 1969 г. н., 2000 г.

Ой, танцуйте вы, ботинки,
Я вами притопаю.
Неужели на ботинки
Я не заработаю?

Танцевала, танцевала,
Сбросила галоши с ног,
Я любила и забыла,
Он меня забыть не мог.

Я частушек много знаю
И хороших, и плохих,
Хорошо тому послушать,
Кто не знает никаких.

Что за домик, что за дом,
Занавесочки кругом.
Через годик, через два
У гэтым доме буду я.

Сыграй, милы, весяло,
Тебя хвалит всё село,
Тебя хвалит моя мать:
«Хорошо играет зять!»

Гармониста я любила,
Слушать на гору ходила,
Гармонист ко мне идет,
Он играет и поет.

Мне не надо дом кирпичный,
Лишь бы парень симпатичный,
Лишь бы парень да души,
Проживем и в шалаши.

Милый мой, твоя мамаша
Не хатит меня у дом.
Мы с делами разберемся,
Дык и сами не пойдем.

Меня милы изменил,
Думал, я ганюсь за ним.
Не такой характер мой,
Чтоб гоняться за тобой.

Меня мілы не цалуе,
Толька абяшчаецца.
А любоў без пацалуя
Строга васпрашчаецца.

Меня милы не цалует,
Говорит: «Потом, потом».
Прихожу, а он на печке
Тренируется с котом.

Запісана ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на
ад Пікас Варвары Пятроўны, 1927 г. н., 2005 г.

А я ў печы не паліла
Ці ж я дома не была.
Уся брыгада ў поле выйшла, (2 р.)
Я спаці лягла.

Як прыехаў брыгадзір
Да й на сівым кані.
Хадзі, міла, на работу, (2 р.)
Будзеш мой брыгадзір.

Як прыйшла я на работу,
Жаці стала з краю.
Уся брыгада закрычала: (2 р.)
– Снапоў мала маю.

Як прыехаў брыгадзір
Да й вачамі замаргаў.
Яшчэ снапоў не нажала, (2 р.)
А чатыры запісаў.

Бяжыць жонка брыгадзіра
Ды з вялікім дручком.
Хадзі, міленькі, дадому, (2 р.)
Вызывае райспалком.

Ні выходзіць брыгадзір
Заўтра на нараду,
Бо пабіта галава (2 р.)
Спераду і ззаду.

О-то-то-то, брыгадзір,
За твае ўчынкі,
Каб ты болей не хадзіў (2 р.)
Да чужое жынкі.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Казлоўскай Людмілы Анатольеўны, 1959 г. н., 2005 г.

Ля калодца вада льецца,
Вада макраватая.
Муж нап'ецца, прыдзяроцца,
А жонка вінаватая.

Ля калодца вада льецца,
Падсцялю я ёлачку.
Прывыкай, маё сардэчка,
К новаму мілёначку.

Сыграй, міленькі «Страданне»
На дванаццаць галасоў,
Штоб не спалась, не драмалась
Да дванаццаці часоў.

Ох, сад, вінаград,
Зялёная рошча.
Ох, хто ж вінават,
Жонка ці цёшча?

Запісана ў п. Кашовае Лоеўскага р-на
ад Малеевай Ганны Архіпаўны, 1938 г. н.

Я частушак многа знаю
І саджуся ў рашато,
І ўязджаю за граніцу
За частушкамі ешчо.

Мілая, мілёная,
Не пей віна зялёнага,
Пей тую налівачку,
Што рубель за бутылачку.

Мяне мілы праважае
Да каліткі, да варот.
Я думала, пацалуе,
Ён стаіць, разінуў рот.

У майго мілёначка
Другая паявілася.
Дзевачкі, не раўнавала,
Толькі падзівілася.

Мой мілёначак харош,
Хоць за пазуху палож.
Палажыла б за душу,
Ды баюся – задушу.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Курдзесавай Яўгеніі Барысаўны, 1935 г. н., 2002 г.

Я любіла цябе, гад,
Восем месяцаў падрад,
А ты мяне – паўмесяца,
І то хацеў павесіцца.

Я любіла цябе, мілы,
І наравіўся ты мне.
А ў цябе нашчот любові
Не хватае ў галаве.

Дзед сваю бабку
Завярнуў у трапку,
Паліваў яе вадой,
Штоб была шчэ маладой.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Лявоненка Феафаніі Трафімаўны, 1927 г. н., 2002 г.

Ой, мамка мая,
А я донька твая,
Кармі мяне калачамі,
Каб я гладка была.
Накарміла калачамі,
Пасінела пад вачамі. (2 р.)

Ой, мамка мая,
Любяць мяне хлопцы,
Даюць мне па сто рублей,
Жыта па каробцы.

А я жыта не бяру,
Усё кашамі грошы,
А паганых не люблю,
А люблю харошых.

Запісана ў в. Ліпнякі Лоеўскага р-на
ад Качалавай Алены Міхайлаўны, 1912 г. н., 1992 г.

Гаварыла баба дзеду,
Каб купіў ён мне «Пабеду»,
А не купіш мне «Пабеду»,
Перайду к другому дзеду.

Сядзіць цёшча на бярозе,
Аж бяроза гнецца,
Падажду, снімаць не буду,
Можа павярнецца.

Как-та цесць згарача
Падарыў мне «Масквіча»,
Но эта беспалезна,
Бо жана не ўлезла.

Ой, Бог, памагі
Ад такой напасці.
Распадзецца наш калхоз,
Век мы будзем прасці.

Ой, дзед, ты мой дзед,
Ты не знаеш усіх бед.
Захацелась мне маркоўкі,
А ў гародзе такой нет.

А ў майго мілёначка
Худая кабылёначка.
Не даехаў да гары,
Бо заелі камары.

Ой, ты, Коля, Коля,
Які ты разгаворысты.
Калі б Коля не радня –
Палюбіла б Колю я.

Ой, хто ж то ідзе,
Чые боцікі ззяюць?
Яны мяне, маладую,
Даўно заўлякаюць.

Ох, цёшча мая,
Старая хрычоўка,
Учапілась за нагу,
Думала вінтоўка.

А ў Лоеве на базары
Хлопцы прадаюцца.
Прадаюць за тры рублі
І то задаюцца.

А ў майго мілёначка
Галава із трох часцей:
Карбюратар, генератар
І каробка запчасцей.

На базары я была,
Відзела камедзію:
Баба каня цалавала,
Называла Федзею.

Дарагую рыбу ела,
Дарагога судака,
Многа гора я цярпела
З-за прастога марака.

Я капала агарод,
Дарыла да кораня.
Мілы замуж не бярэ,
Баіцца не пракорме.

А ў нашага гарманіста
Акуратненькі насок.
Восем курачак садзіцца,
А дзевяты – петушок.

Мілы мой, у нас з табой
Любоў платочкам звязана.
Із-за цебя, мой дарагой,
Семерым адказана.

У Валодзі на гародзе
Расцвятае белы мак.
Усе хлопцы пажаніліс,
А Валодзя, як дурак.

Я – дзяўчына маладая,
Што мне дзелаць і рабіць?
А таго я і страдаю,
Што не знаю, как любіць.

Я – бабёнка баевая,
Ешчо буду баевой.
За меня чатыры дзеда
Выхадзілі на дуэль.

Говорят, картошку з'елі
Караладскія жукі.
Ну і гора з той картошкай,
Ліш бы былі мужыкі.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Чапела Таццяны Мікалаеўны, 1959 г. н., 2005 г.

Трактарыста любіць
Ох, какой-жэ інцерэс.
Жэлезяку на пузяку –
І папёрся в МТС.

Трактарыста любіць
Нада падгатовіцца:
Тону мыла накупіць,
А патом знакоміцца.

Мене мілы ізменіл,
На другую паляцеў.
Пасля ягады-каліны
Ён маліны захацеў.

Ты, падруга, із дзярэўні,
Я – падруга з горада.
Круці голавы, рэбяты,
Пакуда я шчэ молада.

Мы з падругай удваем
Па дзярэўні славілісь.
Атабілі, атаб'ём,
Ліш бы мы панравілісь.

Запісана ў в. Мохаў Лоеўскага р-на
ад Атымяка Марыі Аляксееўны, 1938 г. н., 2005 г.

Сыграй, мілы, весяло,
Штоб пачула ўсё сяло,
Штоб пачула мая маць:
«Харашо іграе зяць».

Палюбіла я яго,
Такога інцярэснага,
Сахрані мяне, Гасподзь,
Царыца, Маць нябесная.

Палюбіла я парнішку,
А он, дзевачкі, связіст,
А ў яго вместа любові
Правада павіслі ўніз.

Палюбіла я парнішку,
А он, дзевачкі, шафёр,
У яго, вместа любові,
То машына, то матор.

Мой мілёнак, як кабылка,
Толькі розніца адна:
На кабылке ездзіць мілка,
А на мілке езджу я.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Кацуба Ганны Іванаўны, 1936 г. н.
(раней пражывала ў в. Новакузнечная (раней Шыя)
Лоеўскага р-на), 2005 г.

Пад акном стаіць бяроза,
А ў хаце – дрыбідзень,
Мяне мамачка ругала
За ўхажора кажды дзень.

Мяне мама за гулянку
Ўсягда біла кулаком,
Не так больна, як пазорна –
Стаяў мілы пад акном.

Не ругай меня, мамаша,
Не ругай так грозна,
Ты сама такая была,
Прыхадзіла позна.

Мамачка, ты, золатца,
Не брані за моладца.
Бяры прымер з сябе,
Як хадзіў папа да цябе.

Чаго, мілы, не прыйшоў?
Ці штанішак не найшоў?
А ты б дзедавы адзеў,
Дзень на печы не сядзеў.

У тым канцэ, на том парадку
Печка жарка топіцца.
Гэта мілы жарыць картошку,
Ка мне не таропіцца.

Хто там ходзіць за ракою?
То, наверна, твой і мой.
Твой – у розавай рубашке,
Мой, наверна, – у галубой.

Як, бывала, запяю,
Мілёначак увесь дрыжыць.
А цяпер як запяю,
Ухам ён не варушыць.

Многа зорачак на небе
Усякага каліберу.
Пачаму, дзяўчаты,
Вы гуляеце па гораду?

Гаварыла мне маць:
«Ніколі песень не спяваць,
Бо хто песенькі пяе,
Таму Бог долі не дае».

На маёй на галаве
Беленькі платочак.
Я нікім не занята,
Гуляю, як цвяточак.

На маім на сарахване
Цвет падолу паліняў.
На якую на разяву
Мяне мілы прамяняў?

Сядзь ты, міленькі, на стул,
Ножкі настаяліся.
Вараці любоў назад,
Штоб людзі не смяяліся.

А етыя частушкі ў пары дзевачкі паюць:

– Дарага мая падруга,
Я на станцыі была,
Твайго мілага відала
І прывет перадала.

– Дарага мая падруга,
Перадай Пецю паклон,
Я жа кланяюся Жорачке,
З каторым была знакома.

– Дарага мая падруга,
Я хацела перадаць,
Шла я окала акошка,
Яго дома не відаць.

– Дарага мая падруга,
Плоха ты старалася,
Шла ты окала акошка,
А стучаць баялася.

– Дарага мая падруга,
Як жа буду я стучаць?
А як выйдзе яго маці,
Што я буду атвячаць?

– Дарага мая падруга,
Ты бы так атвеціла,
Яна спросіць: «Што такое?»
«Я ўхажорка Пеціна».

– Дарага мая падруга,
Я атвеціць не магу,
Твой мілёначак красівы,
Я сама яго люблю.

– Ты, падруга, выйдзі ў сені,
Я скажу ціхонечка:
Стыдна так, падруга, дзелаць,
Адбіваць мілёначка.

– А ў мяне ў кармане роза,
А я думала зямля,
У падругі адбіць можна,
А я думала няльзя.

– Не адбівай, падруга, друга,
Не адбівай, красавіца,
Ён з табой дружыць не будзе,
Са мной не расстанецца.

Не адбівай, падруга, друга,
Не табе з ім маладзець,
На тваё калена сядзе,
На мяне будзе глядзець.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Травянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Ой, спасіба табе, мама,
Што вясёлу радзіла.
І ці гора, ці бяда,
Я заўсёды весяла.

Сіне морушка глыбока,
Не відаць у моры дна,
Выйшла замуж у край далёкі
Да й завяла, як трава.

Расцяні гармошку шырэ,
Хай дзяўчаты падпяюць,
Хай узнаюць ва ўсём міры,
Як калхознікі пяюць.

Балалаечка іграе,
Балалаечка гудзіць,
Балалаечка заставіла
Суседа палюбіць.

Не дай, Божа, не дай, Божа,
У старога ўлюбляцца.
Па калені барада,
Нельга цалавацца.

Гавараць, што баявая,
Баявая, так і есць.
Нынчэ ціхія не ў модзе,
Баявым бальшая чэсць.

Камандзірам я хадзіла,
Сцежачкаю топала.
Палюбіла я Сярожу
Ды й яго прахлопала.

Мне гавораць: «Некрасіва»,
Ты не вер, мой дарагі,
Дзеўкі мажуцца памадай,
А я мыюся вадой.

Чаго, мілы, не прыйшоў,
Як агонь быў не тушон?
Васкава свяча гарэла,
Па табе душа балела.

Пайшоў дзед па грыбы,
Баба – па апенькі.
Знайшоў дзед тры рублі,
Баба – ні капейкі.

Палюбіла я цябе,
Міленькі, мой мілы.
Не магу цяпер прадставіць
Без цябе я жызні.

Не стой, мілы, на парозе,
Захадзі ў хату.
Я мяшаю кабану,
Абліжаш ты лапату.

Чаравічкі мае
З боку выстрачаны.
Не хацела танцаваць,
Яны самі выскачылі.

Мяне мілый ізмяніл,
А патом пытаецца:
«Скажы, міла, дарагая,
Як табе гуляецца?»

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Кангар Таццяны Уладзіміраўны, 1938 г. н., 2005 г.

Сколька я ні сватаўся,
Сколька ні стараўся,
Все маі труды прапалі,
Халастым астаўся.

Я вясёлава люблю,
За нево ругала маць,
Як вясёлы заіграе,
Рада голаву зламаць.

Сядзь-ка, мілый, пасядзім,
Ножанькі ўсталі,
Друг на друга паглядзім,
Мы ведзь лучша сталі.

Девкі, пойце песні все,
Я знайшла букет у аўсе.
Гэта вовсе не букет,
Гэта мілава партрэт.

Рож густая і частая,
Каласочкі доўгія.
Але знаем, як гуляем
Вечарочкі зімнія.

Мяне спрашываў мілой:
– Чым ты набялілася?
– Я каровушку даіла,
Малаком умылася.

На стале стаіт бутылка,
А ў бутылкі – кірасін.
Рассярдзіўся дзед на бабу
І ў кіно не прыгласіў.

Слава Богу, панямногу
Стаў я разжывацца.
Прадаў дом, купіў варота,
Стану запірацца.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Хлебінай Праскоўі Пятроўны, 1930 г. н., 2005 г.

У меня мілёнка два,
Два і палагаецца.
Калі первы не прыдзёт,
Второй дагадаецца.

Міл уехал далеко,
А я еду дальшэ.
Разышчу сваю любоў,
Катора была раньшэ.

Вышываю я платок,
Залатыя коймы.
Вышывала, гаварыла:
«Любі мяне добра».

Мяне мілы праважаў,
У крылечка пастаяў.
Колькі звёзд на небе,
Столькі раз пацалаваў.

Кабы ты, мая харошая,
Была не па душэ,
Не хадзіў бы ночы цёмныя,
Не спаў бы ў шалашэ.

Скора, скора снег растае,
Уся зямля сагрэецца,
Скажы вернае славечка,
Можна лі надзеяцца.

Ты зачем жэ завлекала,
Калі я табе не міл.
Ты бы с осені сказала,
Я бы зіму не хадзіў.

Пабяжыш, мілы, тапіцца,
Ты зайдзі ка мне прасціцца.
Я да рэчкі праважу,
Глыбей месца пакажу.

Кабы я імела крылля,
Паляцела бы дамой,
Пасядзела бы на лавачке
У мацеры радной.

Ой, чыя ета хата,
Чыё то сіяніе?
Ой, чыё то сімпаценечка
Іграе страданіе.

Ой, гармошачка,
Планачкі блесцяшчыя.
Гарманісты да дзяўчат
Парні падхадзяшчыя.

Ой, ні лягу пад машыну,
Пад бальшое калесо.
Лучшэ сяду я к шафёру,
Будзет очень харашо.

Усе хлопцы як хлопцы,
Пры касцюмах, пры часах,
Маё чухала прычухала
У рваных сапагах.

Я на пенсію пашла,
Трошкі прыадзелася.
Рукі, ногі аддыхнулі,
Замуж захацелася.

На зялёным сарафане
Ленты белые падрад.
Як захочу – заўлякаю
Усіх лоеўскіх рабят.

Не любіце лейценанта,
Не счытайце звёздачкі.
А любіце старшыну,
Прынясе сялёдачкі.

Я любіла повара,
Ён цалуе здорава.
Зараз люблю старшыну,
Ён наводзіць цішыню.

Ой, падруга дарагая,
Выбівай чачотачку.
Распраклятая любоў
Загоніць у чахотачку.

Мой мілёначак харошанькі
За рэчкаю жывёт,
Калі хоча цалавацца,
На карзіначке плывёт.

Мілы едзе на машыне,
А я еду на другой.
Мілы шапкаю махае,
А я лентай галубой.

Я каровушку даіла,
Чорную буронушку.
Малако – цялёначку,
Слівачкі – мілёначку.

Я каровушку даіла,
Чорную, рагатую.
Свайму брату гаварыла:
«Выбірай багатую».

Кабы, кабы ды кабы
На насу раслі грыбы.
Самі бы варыліся,
Ды ў рот валіліся.

Мы з мілёначкам гулялі
Каля нашага пруда.
Нас лягушкі напугалі,
Не пайдзём большэ туда.

Самапрадку прадам
І верацяно прадам.
Гармонь куплю,
Плясаць пайду.

Гуляй, Мацей,
Не жалей лапцей.
Бацька лыка надзярэ,
Лапці новыя спляце.

На балоце, на снягу
Укусіў камар блаху.
Сядзіць заяц на бярозе,
Умірае са смяху.

Ой, кошка, брысь!
На парог не садзісь,
А то мілы мой пайдзе,
Спатыкнецца, упадзе.

Наша рэчанька глыбока,
На ёй тоненькі лядок.
Цалаваў мяне мой мілы,
Губы сладкі, як мядок.

Харашо бы імець туфельку
На лёгенькам хаду,
Штобы маменька не слышала,
Калі дамоў іду.

Успомні, мілы, дарагой,
Як стаялі мы з табой.
Шумела белая акацыя
Над нашай галавой.

Прыязджалі мяне сватаць
З пазалочанай дугой,
Пака пудрылась, румянілась,
Уехалі к другой.

Пайду плясаць,
Дома нечага кусаць:
Сухары да коркі,
На нагах аборкі.

Чорна юбачка ў складку
Эх! Любімая мая,
Не ўспела пазнаёміцца,
Адбілі ў меня.

У меня два ўхажора,
Два і палагаецца.
Адзін з арміі прыдзёт,
Другі сабіраецца.

У маего мілёначка
Друга паявілася,
Я не стала раўнаваць,
Толькі падзівілася.

Мяне мамачка радзіла
У полі, пад асінаю,
Красаты мне не дала,
Долю нешчаслівую.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад удзельнікаў народнага ансамбля «Жывіца» Лоеўскага ГДК,
жыхароў вёсак Сінск, Шчытцы, Крупейкі, Н-Баршчоўка
метадыстам Дома культуры Берасневай В. У.

А ў нашага свата
З лазы, з вербы хата,
А сені з бярозы,
Пайшлі дружкі цвярозы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Галіны Яўціхіеўны, 1906 г. н., 1995 г.

Мілы мой, мілы мой,
Я страдаю за табой,
Абраці вніманіе
На маё страданіе.

А ў майго мілёнка
Дурная мамаша.
Я іду, ана крычыць:
«Вот нявестка наша!»

Мілы мой, мілы мой,
Аленькі цветочак,
Не пабачу я цябе,
Баліць жываточак.

Мяне мілы не ўзнал,
Пень бярозавы абнял.
Думал: «У кохце розавай,
А эта пень бярозавы».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Ух, спаю я вам прыпеўкі,
Дзе б толькі не была.
Развясёлую такую
Мене маці радзіла.

Мене мілы ізменіл,
О, такія новасці.
Я б даўно яго змяніла,
Не хваціла совесці.

У майго мілёначка
Акуратненькі насок.
Восем курачак садзіцца,
А дзевяты – пастушок.

Меня мілый праважаў,
Пад сабой гармонь дзяржаў,
Да каліткі правадзіў,
Заіграў, пайшоў адзін.

Гавараць, што я ўныла,
Буду я ўныла,
Пакуль з арміі не прыйдзе
Заўлетачка мілая.

Ой, заўлетачка, заўлетачка,
Вяртучыя глаза.
На цябе, мая заўлетачка,
Надзеяцца нельзя.

Чаго, мілы, рэдко ходзіш,
У нядзелю адзін раз?
Адтаго, цяпер я веру,
Любоў крэпкая ў нас.

Дайце таз, дайце таз,
Дайце палаценцэ,
Дайце мілага на час
Успакоіць сэрца.

Мілы мой, а я твая,
Твае слава няверныя,
Кажды вечар у цябе
Падругі пераменныя.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Краўчанка Параскевы Рыгораўны, 1930 г. н., 2005 г.

Трактор едет номер пять,
Тракторист сидит на ять,
Хотела руку дать,
Да за дымом не видать.

Мой миленочек хорош,
Хоть за пазуху положь,
Положила б за душу,
Но боюся – задушу.

Мой мілёнак кучаравы,
Вельмі ён прыгожы,
У нас у калхозе есць баран,
На него похожый.

В агародзе на мяжы
Выросла пятрушка,
За то мене хлопцы любяць,
Што я весялушка.

Мой мілёнак худашчавы,
Аж на ветры гнецца,
Завяду на канюшыну,
Няхай адпасецца.

Я любила гармониста,
Не попала за него.
Не хватило капитала
У папаши моего.

Интересный ручеечек,
Рыбочка за рыбочкой,
Интересный мой миленок,
Говорит с улыбочкой.

Песню пела, грудь болела,
Сердце волновалося,
По лицу слезы бежали,
С милым расставалися.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Бойдак Елізаветы Іванаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Калі б я не сірата,
Па свету не цягалася,
Я б у маменькі радной
За дочачку шчыталася.

Дзевачкі, я не пахудала,
Наабарот, паправілась,
Мне калхозная работа
Очэнь мне панравілась.

Танцавала, танцавала
І калошы кінула,
Рана мая маці
Сіратою кінула.

Я па кладбішчу хадзіла,
Пясок рассыпаецца,
Родну мамачку будзіла,
Спіць, не прасыпаецца.

Я любіла лейценанта,
А ён быў радавой,
Разматалася абмотка,
Зачапілася нагой.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Гурыновіч Васіліны Філімонаўны, 1935 г. н.
(раней пражывала ў в. Барысаўшчына Хойніцкага р-на), 2005 г.



Радзіяцыя прышла,
Чорт яе гу́бе,
Пааддавалі ўсе каровы,
Гуляем у клубе.

Накармілі нас тушонкай
І згушчоным малаком,
А цяпер усюды пуста,
Пакаці хоць шаром.

Пакупайце каўбасу,
Невяліка трата,
Дзевятнаццаць тысяч яна –
Дзве мае зарплаты.

Я іду, а мне наўстрэчу
Дзевяноста лебядзей.
Чорт з табой, што ты жанаты,
Ліш бы не была дзяцей.

Дзевачкі, ало, ало,
К нам прыехала кіно,
Дзенег нет, мілёнка нет,
Некаму купіць білет.

Я іду, я іду,
На хаду ругаюся,
Заўлётку в армію вазьмуць,
А я завярбуюся.

А ў Колі ў калідоры
Вісіць балалаечка,
Ох, ужэ лі я не буду
Колева хазяечка.

А ў Колі ў агародзе,
Там стаяла караваць,
Дзве падушкі, адзеяла,
Толькі некагда паспаць.

Раздайся, народ,
Мяне пляскі бярут,
Я іду, папляшу,
На народ пагляджу.

Мяне мілы праважаў,
Толькі ручкаю пажаў.
Колька зорачак на небе,
Столькі раз пацалаваў.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Ціханенка Ганны Васільеўны, 1947 г. н.,
Ціханенка Ніны Іванаўны, 1934 г. н.
(перасяленкі з в. Вязок Брагінскага р-на), 2005 г.

Кацярына ***ПАБОРЦАВА***

МІФАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ЖЫХАРОЎ ЛОЕЎШЧЫНЫ

Калі хочаш пераканацца, што сапраўды тут, на лоеўскай зямлі, захаваліся рэшткі старажытных уяўленняў нашых продкаў, варта звярнуцца да лакальных міфалагічных звестак. Гэтыя вусныя дакументы, міфалагічныя аповеды пра аб'екты і з'явы навакольнага свету сведчаць аб глыбіні і паэтычнасці мыслення жыхароў лоеўскай зямлі.

Цікавымі з'яўляюцца, напрыклад, іх уяўленні, звязаныя з Богам. У мясцовай інтэрпрэтацыі знешні выгляд творцы неба і зямлі прадстаўлены ў адметным антрапаморфным выглядзе: «Барада чорная, а сам беленькі» (г. п. Лоеў). «У народнай традыцыі Бог звычайна ўяўляецца ў выглядзе сівога барадатага старога, які жыве на небе і часам вандруе па зямлі адзін або ў суправаджэнні святых (св.Міколы, Пятра ці інш.)» [1, с. 49].

Надзвычай пашыраныя на Лоеўшчыне міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з ведзьмай, якая, паводле вераванняў жыхароў Лоеўшчыны, можа пераўтварацца ў ката, сабаку (в. Вулкан), можа быць «і свіннёй, і змяёй, і калясом...» (в. Рудня-Бурыцкая), набывае воблік жабы (в. Чаплін).

Функцыянальнасць гэтага персанажа мае толькі адмоўную, шкодную скіраванасць: ведзьма «аднімае малако ў кароў», «у жыце заломы робіць» (в. Гарадок), «дзелалі што папала людзям» (в. Вулкан), «пазбаўляе людзей зроку» (г. п. Лоеў) і інш.

Асноўнымі спосабамі засцярогі ад ведзьмы з'яўляецца асінавы кол, які «нужна забіваць у варатах», малітвы, якія чыталі ад залому (в. Гарадок), мак, якім абсыпалі магілу ведзьмы, каб «не выходзіла з таго света і не рабіла людзям гора» (г. п. Лоеў) і інш.

Шчыра вераць мясцовыя жыхары і ў духаў, якія дапамагаюць падтрымліваць парадак у хаце, спрыяюць гаспадарам у розных справах. Называюць такіх істот «дамавымі». Паводле народных уяўленняў, дамавік мае як антрапаморфны воблік («дзядок маленькі, з бародкаю, сяды...» – в. Сінск), так і зааморфны (можа быць «кацапам, авечкай» – г. п. Лоеў, дамавік «такі, як звярок, пушысты, галава така лахматая, морда абезьяны...» – в. Сінск). Дамавік, як сведчаць запісы, не толькі добры дух, апякун дома, але і можа шкодзіць: «ежалі у хаце паселіцца дамавой, то ў той хаце няма дабра: і скот можа здохці, там няшчасці ўсякія, і чалавек можа балець, і ўся сям'я яго» (г. п. Лоеў).

Каб засцерагчыся ад шкоднага ўздзеяння дамавіка, трэба было абавязкова прыгатаваць і пакінуць для яго ежу, навесці парадак у хаце (в. Дзяражычы), перахрысціцца (г. п. Лоеў), пакласці кавалак хлеба на стол (г. п. Лоеў), паклікаць

«знахарку» (г. п. Лоеў), «папырскаць у хаце пасвечанай вадой і пасыпаць макам» (г. п. Лоеў), і інш.

Звычайна дамавік пасяляецца або «на чардаках ці за венікам у кутку» (в. Сінск), «на куту, за віконай» (в. Удалёўка), «пад печчу» (в. Трасцянец).

Асцерагаліся жыхары Лоеўшчыны і русалак. Верылі, што гэтыя істоты падобныя да ведзьмы: «русалкі – гэты ведзьмы з доўгімі валасамі» (в. Сяўкі), «пра русалак думалі, што гэта ведзьмы» (в. Пярэдзелка), «няма русалак, ета знахаркі, ведзьмаркі» (г. п. Лоеў).

Паводле мясцовых уяўленняў, русалкі могуць «зашчыкатаць да паўсмерці» (в. Сінск), «русалка заслакоча, калі паймае» (в. Ястрабка), «русалка дзяцей пужала, каб яны ў жыта не хадзілі» (в. Сяўкі) і інш.

У хляве, як сведчаць запісы, жыве такая істота, як ласка (ласіца, ласачка), функцыянальнасць якой (станоўчая, адмоўная) залежыць ад таго, ці падабаецца ёй жывёла: «Як ёй падабаецца скот, дак яна з ім жыве, а як не, дык худоба дохне» (г. п. Лоеў), «скаціну няўзлюбяць, так слакочуць яе, заплятаюць валасы каню» (п. Пабядзіцель), «карова, калі прыйдзеш утрам у хлеў, у мыле стаіць, а конь вабшчэ тожа на каленях стаіць» (г. п. Лоеў).

На пытанне, як выглядае ласка, жыхары Лоеўшчыны ўпэўнена адказваюць, што гэта «звярок беленькі з серанькім, большы як крыса» (в. Пабядзіцель), «звярок, як кот» (г. п. Лоеў), «крыса тонкая, длінная, рабая, быстрая, белыя пятны і чорныя» (в. Ястрабка), «маленькая, ціпа крысачкі» (г. п. Лоеў).

Сакральнай птушкай лічаць жыхары Лоеўшчыны бусла, паходжанне якога звязваюць з чалавекам. Агульнавядомымі ў беларускай міфалогіі з'яўляюцца вераванні, паводле якіх бусел – гэта «чалавек ці анёл, пакараны Богам за цікаўнасць: даручаную яму торбу ці гаршчок з сабранымі нячыстымі жывёламі-гадамі ён павінен быў кінуць, не развязваючы, у прадонне, ды не стрымаўся, развязаў паглядзець ды выпусціў усіх тых жывёлак на зямлю. Ператвораны ў птушку, цяпер ён мусіць лавіць усё тое, што некалі выпусціў, ачышчаць зямлю» [1, с. 51]. Прыведзеныя традыцыйныя ўяўленні пацвярджаюцца міфалагічнымі аповедамі жыхароў Лоеўшчыны: «А бусел жа – гэта, кажуць, з чалавека» (в. Крупейкі). Невыпадкова ўстойліва захоўваецца ў народзе павер'е аб тым, што «бусла нельзя абіжаць, он – чалавек» (г. п. Лоеў). Забаранялася разбураць гняздо бусла, бо, лічылі, што ён, пакрыўджаны, можа адпомсціць, спаліць негасцінную хату: «Кажуць, калі гняздо бусла разбурыць, дык ён на тое месца агонь прыносіт» (в. Крупейкі), «гавораць, еслі бусел мосціць на коміне, яго нельга скідаць. Было наадварот: дак ён узяў, накідаў у комін мусара, каб загарэлася хата» (в. Вулкан).

Варона ў народных павер'ях падаецца як «нячыстая» птушка, «нешанаваная і несцеражоная» [1, с. 69]. Пакаранне ж яна атрымала ад Бога за тое, што не працавала разам з іншымі птушкамі, а толькі «пакачалася ў гразі» (г. п. Лоеў), але ўпэўнена сцвярджала, што таксама капала зямлю, каб здабыць ваду. Бог яе і пакараў: «усе п'юць з ракі, а варона жджэ дождж» (г. п. Лоеў).

Вераб'я адносяць да птушак і шкоднікаў, таксама нешанаваных істот. Лакальныя міфалагічныя звесткі – сведчанне распаўсюджанасці матыву пакарання вераб'я за пэўныя правіннасці. Паводле народных уяўленняў, верабей скача так, нібы ў яго звязаныя ногі. «Верабей добра жыве і множыцца, бо гэта дазволіў яму Бог за тое, што ён украў адзін цвік, якім збіраліся прыбіваць Ісуса да крыжа» [1, с. 77].

У мясцовай інтэрпрэтацыі, вераб'і – гэта птушкі, якія «падносілі гвоздзі Ісуса Хрыста забіваць, як распіналі» (г. п. Лоеў).

Паводле агульнабеларускіх павер'яў, чарапаха – жывёла, якая засцерагае карову, садзейнічае павелічэнню ўдояў малака і паляпшэнню яго якасці. На Лоеўшчыне запісаны адметныя звесткі пра гэту істоту. Напрыклад, знешні выгляд чарапахі звязваецца ў народных уяўленнях з божым пакараннем («калісь чарапаха ела людзей», в. Ручаёўка), а Бог, убачыўшы гэта, вырашыў зрабіць так, каб яна не змагла лёгка паварочвацца: «І здзелаў, што на чарапахі етый чэрап на яе паклаў» (в. Ручаёўка).

Дэманічнай птушкай у вераваннях беларусаў з'яўляецца сава, якая «жыла ў міфічнай лясной прасторы, куды адсылаліся хваробы і нячысцікі, сама стала асацыявацца з хваробамі і смерцю» [1, с. 144]. У мясцовых павер'ях сава жыве на могілках, выконвае функцыю птушкі іншасвету, прадказвае няшчасці, смерць: «сава на кладбішчы жыве. Перад смерцю каго-небудзь усігда лятае па дзярэўне і сільна крычыць, асобенна каля дома таго, хто скора памрэ» (в. Гарадок).

Прыведзеныя намі мясцовыя вераванні, звязаныя з народнай дэманалогіяй, жывёламі і птушкамі, з'яўляюцца сведчаннем багацця фантастычна-міфалагічных уяўленняў жыхароў Лоеўшчыны.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.

МІФАЛОГІЯ

Павер'і пра Бога

Я думаю, што е, дзевачкі. І вот сны мне сніліся. Я наперад знала сваю судзьбу. Аднажды мне прысніўся сон, як я еду на баржы па Балційскаму мору, а якраз шторм такі страшны, што, кажацца, да неба нас падкідвае. І бачу неба галубое, а там тучы, і на тучы сядзіць Ісус Хрыстос. Хочаце верце, хочаце не. Барада чорная, а сам беленькі.

Бог не спіт нікагда. Ісуса Хрыстоса Гасподзь сатварыў у відзе себя. Он так палюбіў людзей. Тады былі худшыя людзі ў Старам Запавеце. Адама і Еву дзелалі на зямле, в Эдэме. Людзей жэ не была. После таго, как ані з'елі яблака пазнання, понялі, што такое любіць, стыдзіцца. І тады Бог іх сагнаў на другую зямлю.

Кагда было мучанне Хрыста, то ўзялі жанчыну з дзіцём і палажылі пад карыта. Дый гавораць: «Калі ты Бог, скажы, што пад карытам». А ён адказвае: «Там свіння з парасём». Адкрываюць, і праўда, там свіння з парасём. І яўрэі з гэтага моманту не ядзяць свінню.

Вот яшчэ адна історыя пра Ісуса Хрыста. Прыказалі цыгану прыбіць Ісуса Хрыста. Ён пайшоў, но не ўбіў, а прыляпіў на кроў мух ды і пайшоў дамой. Па дарозе яго сустракаюць і спрашваюць, ці ўбіў ён Ісуса. Ён адказаў, што да. Ва імя жызні Ісуса Хрыста можна збрахаць. Калі ты не знаеш празніка і работаеш, то Бог усё прашчае. І еслі очэнь нада, то можна. Украсці, каб паесці, не грэх, запомніце, дзевачкі. Бог нікагда в жызні не думае а заўтрашнем.

Цела – гэта адзёжа душы, знасілася цела – хароняць чалавека. Канец света далжон быць, ну а так, верце, дзеткі, Богу аднаму.

Бог сказаў, што змяя б'е чалавека ў пяту, а чалавек змяю б'е ў галаву. Бог так, як старычок, прэврашчаўся ў дзедушку, адзеты ў траву.

У жэншчыны ўсе робра роўненькія, а ў мужчыны два рабра зламаны.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калісь былі ўсе прымхі, а я такога не раблю. Вось так гавораць: «Без Бога не да парога, з Богам і за мора». У Бога нада верыць, бо той, хто робіць плахое – палучае плахое, хто харошае – таму Бог і дае дабро.

Свет быў создан ад Святога Духа, і так пайшоў свет, і патом усе былі созданы: і Адам, і Ева. Святы Дух е, усякае е.

Як Бог выглядзіць, а хто яго знае. Навернае, у такой адзеждзе дліннай, да пят. Ва ўсім белым-белым. І ліцо ў яго светлае, а валасы длінныя, кучаравыя. Я ж, дзяўчаты, не ведаю, як яно там. Людзі кажуць, а Бог яго ведае. Я сама ў царкву часта хажу, у Бога веру. А як жа ж, Богу малюся ды прашу.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Пікус Соф'і Самсонаўны, 1929 г. н., 2005 г.



Я прадставляю так, што ета е над намі дух.

Пекла – гэта людзі пападаюць, якія грэшныя. А рай – каторыя не грэшныя. Хто пападае ў пекла, той ліжа сваім языком скавараду. Гавораць жа так: чалавек умірае – душа яго ідзе на небеса. На небесах жа і ад, і рай. Патом рашаюць: ілі яго ў рай, ілі ў пекла. Канешне ж, рай красівы, там і лес, і сад, і што хочаш.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.

Вадзянік

У нас гавораць, што на раке жыве вадзянік. Ён нябачны. Але, калі хлопцы ўвечары плывуць на лодцы, на іх нападае нейкі страх. Іх лодка не можа плыць, уперадзе з'яўляюцца кругі, а лодку як бы нешта цягне. І чуваць, як нешта страшнае плёхкае ў вадзе, волны страшныя. Ён не крычыць, а стукае чымсьці па вадзе.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Вампір

Раней казалі, што е такія пакойнікі, шо ходзяць уночы. Дык кажуць, нада асінавы кол, каб прагнаць іх. Етыя ж пакойнікі кроў любяць, яны за ёй ходзяць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Чула, што вампір выпівае кроў з чалавека. Я на Уральску была, дык гаварылі, што мужык і жонка лавілі вялікіх людзей, рэзалі вены і пілі кроў, пакуль цёплая.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Патапенка Елізаветы Трафімаўны, 1934 г. н., 2003 г.

Ведзьма

Я ета сама відзела, як была малая. Сядзелі мы з адной дзевачкай (было 15 мінут первага) ля клуба. Глядзім: лошадзь ляціць. Галалёд такі быў, што нельга было па дарозе прайсці. Ляціць лошадзь, вот вродзе бы нагамі зямлі не дастае і ляціць. І вродзе

бы на ёй быў маленькі чалавечак. І ў наш канец вёскі паляцела. І на следующчы дзень умерла бабка, пра якую гаварылі, што яна што-та знала. Ведзьмай, наверная, была. Назаўтра мы ўжо баяліся ў клуб ісці.

Калі я была малая, мы з мамай пайшлі даіць карову. Прыйшла ета бабка – ведзьма і сказала: «Давайце я вам мух ад каровы паадганяю». Павадзіла ветачкай з вярбы, па карове памахала, і карова ні грама малака не дала. Мы пайшлі пустыя дамой. Можа, ана што сказала ілі зрабіла. Патом мы хадзілі к бабке, яна на ваду гаварыла, шаптала, а патом гэтай вадой пырскала карову, і малако паявілася.

Гавораць, каб засцерагчыся ад ведзьм, нужна забіваць кол асінавы ў варатах. Бывае, ведзьма ў жыце заломы робіць. І калі найдзёш, то трэба, каб знахар прачытаў малітву, потым залом зрэзаў і спаліў.

Некалі мая маці пайшла жыта жаць, а там яно было пераплецена ў адным месце. Маці хацела серпам зжаць гэты кусочак, а як толькі датронулася, ёй стала плоха. Яна ўпала, пачалася рвота. Пазвалі знахара. Ён прачытаў малітву, і маці стала лягчэй. Ён сказаў, што можа паказаць ведзьму, якая гэта зрабіла. Ён памаліўся, нешта зрабіў, і яны ўбачылі, што да іх бяжыць голая баба з распушчанымі доўгімі валасамі. Знахар сказаў: «Будзеш так яшчэ рабіць?» А яна прасіла яго, каб ён не рабіў ёй нічога плахога, што яна больш не будзе так рабіць. Ён заставіў яе землю есці, каб яна так больш не дзелала. І яна ела.

Калі ведзьмы ўміраюць, то ў іх то адзін глаз глядзіць, то палец сагнуты. І па этаму ўзнаюць, што яна была ведзьма. Тагда ёй у магілу забіваюць асінавы кол.

Ведзьмы абычна жанчыны. Яны вельмі цяжэло паміраюць, патаму што ёй нужна свае веды каму-небудзь перадаць. Таму, каб ёй лягчэй памерці, разбіраюць мастнішчы, пол значыцца. Перадаць веды яны даўжны толькі родственнікам. Ведзьмы – абычныя людзі, толькі ў цэркаў яны не ходзяць і вельмі замкнутыя, угрумыя, ні з кім не разгаварваюць. Ей нельзя нічога даваць. Еслі што-та найдзеш, што ведзьма падкінула, так нада ета спаліць ноччу дзе-та на гарэ, срэдзі дарог ілі на перакростке.

Ведзьмы могуць аднімаць малако. Есць бабкі, якія ведаюць загаворы ад гэтага. Закапваюць у землю пятакі і гавораць што-та. Яшчэ, кагда каровы ідуць, ведзьма абязацельна сядзіць каля хаты і смотріць.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Ёсць людзі, якія зрываюць бараду. Вось, напрімер, я іду жаць, сарву этую бараду і тады капут: плоха дзелаецца чалавеку, аж да смерці.

Вот жэншчына да мяне прыходзіць, у яе на галаве каўтун. Вот я яе і сейчас тры разы знімала.

На зярне ён скручаны. Яна, ведзьма, бярэ завітуху (называюць гэта завітухай), яе завее і што-та там яшчэ. Так косы спутваюцца – нельзя расчасаць, становяцца як жменька, вось я дзяржу кулак.

Судзьба ў яе не ўдалася: і сын павесіўся, і мужык узяў і памёр, а каўтун – як шоў, так і ідзе. Яна гаворыць: я з ім і пагібну. А самой абразаць яго нельзя.

Ведзьмакі забягаюць наперад і закручваюць етыя каўтуны, паганыя людзі.

Ведзьмы подлае дзелаюць. Да нас адна ведзьма з Украіны прыехала, ана знахарка была, дык людзі сабраліся ў клубе і сказалі: «Вон адсюда, шоб нагі вашай не было».

Ведзьмы могуць у любога чалавека ператварыцца, у кожным можа быць зло. Яшчэ яны могуць пераўтварацца ва ўжа і сасаць кароў абязацельна. Паўзе вуж вечарам, падлягае пад кароў і малако ў іх цягае. Ну, уначале тыя ўсі такія праведныя, якія ў цэркавь ходзяць, падняліся і разагналі іх, пачалі часнок паказваць, ды і ўшлі яны.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ну, гаварылі, шо ё ведзьмы. Абыкнавенна выглядзят. Людзі ж зналі, хто ведзьма. Знаюць, дзелалі ў жыце каласы, людзі балелі.

Не нада абшчацца. Матка мне расказвала мая, а эта маткіна матка – мая баба. Ну, і вышла ана замуж за дзеда. І дзед гуляў з другой дзеўкай. Ну, той дзеўкі не ўзяў, а ўзяў маю бабу, Алену. Ну, што, а тая была ведзьма, матка ёй перадала, ну, матка ж знае, дык перадае. Яна мо чужым пабаіцца, толькі сваім перадае. Ну, пажаніліс і жывуць дзед з бабаю, і дзеткі сталі ўжэ раждацца. У іх малыя памерлі. Не балелі, нішто. Вот, ляжа спаць і назаўтра не стае. І так чацвёра дзяцей. А яны шчэ малыя, месяцаў па чатыры–шэсць. А дзед заганяў плыты ў Херсон. Ну, ён жа ж не адзін, було шмат мужчын. І вот он з адным мужчынам пазнакомілся.

Ну, загналі той лес у Херсон, селі на параход, прыехалі ў Кіеў, а з Кіева едуць ужо дадому. Дзед і кажа: «Слухай, давай паедзем ка мне. Пажывеш у нас». А ён кажа: «Ой, Пятро, я дадому спяшу, у мяне дома работа». Дзед: «Ну хоць на два дні». Ён жа не знаў, што ён вядзьмак, той Іван. Ну, угаварыў. Прыехалі ў Дзерашчу, маю дзярэўню. Вот яны прыйшлі ў двор. І эты дзядзька і кажа: «Ой, Пятро Сідаравіч, так у цябе неблагапалучна ў хаце. У цябе ні карова ні водзіцца, ні свіней – нічога». Дак ён: «Праўда, дак адкуль ты знаеш?» – Той: «Я, во зайшоў і бачу». Тады ўвашлі ў хату, дак ён гаворыць: «А ў хаце цем болей. У цябе дзяцей не будзе. А табе нада людзей шукаць». І гэты дзед прыстаў к няму і дзве нядзелі ў іх быў. І ён гаворыць: «Дык памажы мне. Я хату прадам і табе заплачу». Дак ён яму загадаў з трох калодзежаў ваду прынесць. Ён набраў стакан вады з трох калодзежаў, туды вуголляў паклаў. Эта мне так матка расказывала.

– Слухай, Пятро Сідаравіч, ты як жаніўсь, так калі твой бацька памёр, то твой вянчальны пояс завязалі бацьку на той свет. Так от, калі хочаш, шоб у цябе дзеці булі, дык нада адкапаць і хоць трошкі адарваць ад гэтага пояса.

А калі ж гэта пазор быў. Дак дзед і кажа:

– Ой, як мне ўжэ бацьку з таго света варочаць, дык няхай ужэ лепей дзяцей не будзе. А тады і кажа: «Пятро Сідаравіч, ідзі паглядзі свайго ворага ў стакане вады». А ён прыйшоў да і кажа: «Дак эта ж саседка чэраз два дома». Дак ён і гаворыць, еты Іван: «Пятро Сідаравіч, яна сейчас прыдзе к вам».

Ён там шаптаў штосьці: «Шчас ана к вам прыдзет, дык папросіць даць ці хлеба, ці што, дык не дай, Божэ, штось даць». Дык і точна, прыйшла.

– Здравствуйце, здравствуйце. Добры дзень.

– Добры дзень.

– Дай мне хлеба.

– Няма ў нас хлеба.

А дзед дык за косы, добра даў: «Ах ты, ведзьма, так ты яшчэ прыйшла і хлеба пазычаць. Ты маіх дзяцей ясі і скаціну». А дзядзька сказаў: «Ніколі дажа палку не давай». І после этага ўсё добра было.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Шынкарэнка Марыі Прохараўны, 1921 г. н.
(нарадзілася ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), 2005 г.



Ведзьмы – эта людзі, якія не звязаны з Богам. Яны з чортам звязаны. Яны дзелалі што папала людзям, штоб здзелаць назло. Яны ў ката, у сабаку маглі преўраціцца. Каб бароцца з імі, то цэрква нада. Плахая эта жэншчына можа вам здзелаць разныя пакасці. Нада схадзіць у цэркву. Цэрква сільней за ведзьму. У цэркві нада прычэшчацца. І яны самі да цябе прыйдуць.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

У нас цыганка ведзьмай была. Спачатку мы не ведалі аб гэтым. Саседка мая пайшла на поле карову глянуць. Ідзе і бача, што яе карову нейкая жанчына за шыю абдымае. Гэтая жанчына ўбачыла яе і пабегла. Увечары карова не дала малака, а раніцай зусім упала на пуза. Пазвалі бабку-павітуху, тая сказала, што на карове порча ляжыць. Тады мая саседка паняла, што гэта была за жанчына. З тых пор гэтую цыганку ведзьмай празвалі. Аднойчы яна зайшла і да мяне ў хату, палажыла дзве часуйкі (льняная нітка, раздзеленая надвое) на стол, прысвіснула, і гэтыя часуйкі пабеглі па сталу. А я гляджу на іх і вачэй не магу адарваць. З таго часу я пачала дрэнна бачыць. Яшчэ казалі, што русалкі (русалкамі ў іх называлі ведзьм) ноччу ляталі і завіці на жыце завівалі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Барысенка Пелагеі Мікалаеўны
(нарадзілася ў в. Казярогі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ведзьма – эта абыкнавенная жэншчына. Яна дзелае врэд: забалее скаціна і пагібне. Так эта ж мала было такіх, ды яны ж патайна, казалі, адбіраюць малако. У етае врэмя была такая кніга – чарнакніжная, што там пісалася, дзе былі загавары. Вот, напрымер, ета стада пасецца, а ён, ведзьмар (ведзьма), сказаў колькі слоў. І калі гоніш там тую скаціну пугай, а ўсё роўна яна не сойдзе з месца. Памруць і з голаду – і не сойдуць, і нічым не сцягнеш. Да ходзяць ужо і шукаюць таго лекара. Тады ўжо лекар палечыць. Вот дык гэта кніжка была, паказвалі яе старыя людзі.

Быў случай: ужэ трі дні скот стаіць, а з места не ідзе: ні вады, ні яды. Там ім падказалі. Яны прыйшлі, давай прасіць лекара. Дык он ім кажа: «Я, маі дзеці, не бачу, я не дайду туды. Я стары такі. А вот я вам буду, шчытай, казаць, а вы пішыце, і тады пойдзеце, пачытаеце». Ужо забралі тую бумагу, пайшлі. Ту малітву прачыталі – скот сабраўся і пайшоў. Чарнакніжнікаў мала было.

Адзін чалавек паехаў на курорт, і прайшоў срок ужо, а яго няма. А жонка яго работала бухгалтарам. Ёй пасаветавалі схадзіць к адной знахарцы. Яна прыехала, дык тая кажа: «Твой хазяін там прыняўся і жыве». Дала ёй адрас, тая і паехала туды. Зайшла ў бюро, там ёй сказалі номер і вуліцу. Тая маладзіца прыйшла ўжо к ім ды давай стукаць:

– Хто ты?

– У вас такі і такі есць чалавек?

– А што?

– Ета мой родны брат. Ён чагось паехаў ды нічутна. Мяне прыслалі яго шукаць. Як ён жыве?

– А хто ты будзеш?

– Родная сястра.

– А дзе ён?

– На рабоце ён.

Потым ён ужо прыйшоў ды не прызнаў, што гэта яго жонка. Ды кажа: «Здароў, сястра. Ты скучала па мне?» Яна: «І бацька, і матка плача па табе». Дык ён пытае: «Як ты мяне найшла?» Яна: «Так і так». А ён кажа: «У той дзень, калі табе давалі адрас, так я быў у кіне з той жонкай. Аж падходзяць ка мне тры ваенныя і гавораць: «Падымайся!» Я падняўся, выйшаў на двор, і ўзялі мяне за грудзі: гавары адрас, нумар дома, і вуліцу! Заставілі. Я распісаўся, распіску даў. Яны тады кінулі мяне. Так вот, шчытай, еты адрас яны той далі, а яна ўжо табе. Яе ведзьмачы яго ўжо заставілі, штоб ён даў адрас у той стол. Эта нячысцікі былі».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калісь яшчэ жыла мая маць і ацец. Вот, так нам дзелал хтось. Ацец мой быў землямерам, зямлю дзяліў. Дык вот, ужо каму-то там не ўдзяліў. Так ужо здзелалі штось.

Купім парася якось ці што шчэ, дык яно здохне. Карова аціліцца, дык цяля здохне. Карова тая балее, малако не дае, а патом калі-небудзь матка доіць, дык яно ідзе з кроўю.

Ну, дак вот матке пасаветавалі такую бабу, к ей, мо, ездзілі з усіх дзеравень. Яе звалі ўсе, і плацілі ёй добра. Ну, мама прывозіла яе дадому к нам, дык яна ж вот, штоб не бачылі, што яна будзе дзелаць, сказала: «Выйдзіце з дома». Нас павысяляла, і матка дажа вышла. А ана там ужэ штосьці рабіла. І после этага, вот, знаеце, стала ўсё нармальна.

Дык вот эта ж ведзьма ўсё і дзелае. Яна ж такая, як і ўсе людзі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Я шчэ малая была, і папаша адну ведзьму ганяў. Расу збірала ў гародзе – малако забірала ў нас. На Івана Всяведзенскага раненька ўставала і збірала расу. Такая баба была. Яна вот дарогу пяройдзе, як ідзеш у лес. Я б ішла ў лес, яна б

перайшла – варочайся, бо нічога не набярэш. У яе і вочы былі паганыя. А як паміралa, трэба было зрываць паталок ці акно адкрыць. Дзед жыў недалёка ад мяне, а баба выйшла, картошку капае, а я хадзіла ў палажэнні. Прыйшла к ім і гавару: «Як эта вы?» А яна мне: «Я не магу, як эта ён там стогне да крычыць на ўсю хату». Яна выйшла з хаты зусім.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

І калдуны е. Малако яны ў каровы забіраюць. Цяпер не забіраюць малака. Эта ж людзі такія забіралі. Будзе маліцца, маліцца і, можа, не стане ў каровы малака. Глаза ў каровы становяцца плахія. Ведзьма паглядзіць – і можа карова не даць малака. Мужчыны тожэ могуць быць, як ведзьмы.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

У мяне быў брат родны, маленькі спужаўся і хадзіць проста перастаў. Сказалі, нада шукаць бабку. І бабка пашаптала яго, і ён стаў папраўляцца.

Гады тры назад у майго ўнука быў зглаз. Быў высокі, красівы, быў за ўсіх лучшэ. Хто-та яму што-та нагаварыў, і от такія глаза вылезлі. Шо, кажуць, еслі мама цябе карміла груддзю, патом атучыць хацела. Патом от плача толька бывае. От, табе бывае так ад таго зглаза. На каго гляне, штось падумае – і ўсё. Яны памагаюць, шаптухі. Яны, вобшчэм, звязаны ці з Богам, ці з чортам?

Ведзьма – эта плоха, а шаптуха етая ўсё плахое вылечвае.

Мая карова перастала малако даваць, ні з таго ні з сяго – эта ведзьма. Яе не атлічыш. Яна – абыкнавенная жэншчына. Кажуць, еслі ана ведзьма да ўмірае, яна не ўмрэ, і еслі ўмрэ, так яна ж вылазіла. Асінавы калок забіваюць у магілу і кругом макам абсыпаюць, шоб яна не выходзіла з таго света і не рабіла людзям гора.

Асіна ж ета, наверна, грэшнае дзерава було. Знаю, шо кажуць, на асіне чорт павесіўся.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Велігорскай Ганны Акімаўны, 1930 г. н.
(раней пражывала ў в. Вялікая Весь Рэпіцкага р-на
Чарнігаўскай вобласці Украіны), 2005 г.

Так была у нас адна бабка, і ўсе зналі пра яе. Аднаго разу прыехаў да нас хлопец, які знаў, што з такімі людзьмі рабіць. Ведзьмы могуць быць кім угодна: і свіннёй, і змяёй, і калясом, і яшчэ багата кім. Так, адзіны раз ішоў той хлопец з

клуба і бачыць, што коціцца на яго калясо. А ў гэтага хлопца ў кармані вяроўка была, якую ён прадзеў праз калясо і завязаў на вузел. На наступны дзень убачылі ў гэтай бабкі завязаную вяроўку на спіне, якая праходзіла праз рот і зад. Пасля гэтага яна доўга не жыла і памерла.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

Жыта як у колас ідзе, тады завівалі такія завіткі. Адна жэншчына завівала вот этыя завіткі. Тыя ж хазяева найшлі дзеда якогасьці, што ён панімаў пра етае вот, і прывёз таго дзеда, а той дзед ужэ сільнейшы за тае бабы. Людзі сабраліся, і ён стаў ужо лячыць той колас. А людзі ўжэ гавораць, што калі б узнаць, хто ета так дзелае. А ён кажа, што пабачуць.

І вот тая жэншчына мясіла хлеб (ну калісь жа хлябы етыя пеклі самі), і ёй прыспічыла, што трэба бегці туды, і ўсё роўна яна прыбегла, дзяжу надзела на галаву і з дзяжой прыбегла туды, на колас. Усе людзі, пакуль яна не памерла, ненавідзелі і клічку ёй далі.

Пужалі людзей абычна на купальскую ноч. Вось адзін вядзьмак дзелаўся жабаю, такой здароваю жабай. К адным прыйшоў там саседзям, той хазяін жабу тую і ўбіў (ён жа не ведаў, хто яна такая), але назаўтра ўстрэціліся, а ў яго ўсё ліцо пабіта. Хто етым занімаўся, то казалі, што які-та змей лётаў у комін. Так вот была.

Запісана ў в. Чаплін Лоеўскага р-на
ад Грыцковай Эмілії Яўхімаўны, 1933 г. н.

Пра дамавіка нічога не бачыла і не чула. А вот ведзьма... На маю суседку кажуць, што яна паганая на вочы. Яна мне ў гарод падкінула яечка крашанае пасля Паскі. Так я закапала яго ў другі гарод. Яна вред людзям дзелае: прыдзе, паглядзіць на што, то дрэнна палучаецца.

Вот быў у нас такі сабачка гарны, а яна прышла, паглядзела на яго, кажа: «Які сабачка ў вас гарны», дык ён на наступны дзень захварэў, быў увесь пакусаны. А то прышла да хазяіна ды просіць: «Дай солі чарачку». Я патом яе соль паліць хацела да высыпала. Кажуць, гэта ёй трэба шось з двара ўзяць. Мне адна жанчына падказала, што ад ведзьм рабіць. У мяне кароўка захварэла, перастала даваць малако. Яна малако адабрала, дык трэба мачою павадзіць па вымю, хвастом абкруціць і казаць: «Хай з цябе льецца, як з гэтай кароўкі». Пасля таго кароўка хоць палову малака стала даваць.

Вабшчэ ведзьма врэд людзям дзелае: сям'ю каля яе жыта са свету зжыла: мужык памёр, патом жонка. Падкідуе ўсё, круціцца ля двара. А калі на яе ругацца, то яна маўчыць, дажы не агрызаецца. Кажуць людзі, ведзьмамі становяцца тады, як памірае той, хто знае, гэта перадаецца. У яе, кажуць, матка такая была, патом сястра. Раней, як маладзейшая была, то шчэ нічога, а цяпер, як пастарэла, то як маладзік, так і бяжыць...

Хаджу часта на кладбішча ў любое врэмя, «Отча наш» перамалюся і іду смела.

Але калісь мне было такое даўно: у грыбы хадзіла я ля кладбішча, дык з бярозкі на мяне так скалатнула ветрам, што нічога цяпер не бяру.

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на
ад Грышкавец Марыі Міхайлаўны, 1936 г. н.
(раней пражывала ў в. Усход Лоеўскага р-на),
Грышкаўца Якава Сямёнавіча, 1937 г. н.
(раней пражываў у п. Марс Лоеўскага р-на)

Баба Лена, мая маці, расказвала, як хадзілі гуляць. Яшчэ да вайны было. Мы дома былі, а брат пайшоў гуляць аж да рова. Калі ішоў дадому, то ўслед за ім бегла свіння. Ён ускочыў у сенцы і кажа: «Дзеўкі, глядзіце, якаясь свіння бегла».

Яшчэ адзін расказуваў. Я яшчэ невялікай была, а ён быў хлопцам. Сяджу, кажа, сяджу з дзеўкай, аж каціцца абруч. Ён узяў палку ды палкай. А назаўтра, аказваецца, у адной бабы руку перабіў. А яна, аказваецца, у абруч ператварылася.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Каваленка Галіны Мікалаеўны, 1938 г. н., 2003 г.

Матка мне расказвала. Жыла недалёка ад іх Вольга. Як ідзеш, так была такая кладачка цераз Вітач. Ішлі два хлопцы. На плечы аднаму ўскочыла цяля, дак другі гаворыць: «Давай гэтае цяля занясём у хату к каму-небудзь». Ну, і панеслі. Расказалі, у хаце як было, дык дзед кажа: «Адрубайце ногці патрошачку, а каб кроў не ішла». Яны адрубалі, адрубалі.

Назаўтра падружкі спрашвалі ў Волінай маці: «Дзе Вольга?» А яна выходзіць і пальцы замотаныя.

Ведзьма перад жнівом раздзявалась дагала, качалась па жыту. Брала жменямі жыта і завязвала вузлы. А еслі пачыналі жаць, то гэты вузел зразалі і кідалі на дарогу.

Запісана ў г. п. Лоеў Гомельскай вобласці
ад Патапенка Елізаветы Трафімаўны, 1934 г. н., 2003 г.

Дамавік

Дамавікі бываюць у кожнай хаце. Іх нада шанаваць. Яны нікога не могуць задушыць і нічога не могуць плахога зрабіць. Яны не бачны, але, бывае, сядзіш у хаце адзін, нікога няма, а табе кажацца, што хто-та заве цябе, па імені называе. Разглядзіш, а нікога няма.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.



Прыходзіла ноччу ка мне гэтая жэншчына, яна маладая. І такі крык там у дварэ. Я кажу: «Што там такое случылася?» Яна пераскочыла цераз гэты забор, ногу закінула, косы так распатланы, і ў грудзях усё мокра, і крычыць:

«Ой, спасайце, я ўміраю!» Я кажу: «Умерці ты не ўмрэш. Ну, раскажы, што ў цябе там?» Яна: «Вот такое дзела. Мужык мой паехаў у Маскву, дзве дзевачкі ў мяне. Ходзе за мной мужык па хаце, вочы такія павыпуканыя, страшэнны. У хаце шэрудзіт там, дзеці пазахаваліся: адно пабегла пад печ, плачуць. Яна гаворыць, што прыдзе к нам начаваць. «Еслі выдзержыш, начуй», – гавару я. Расцераная такая. А потым ужо прыйшла, гаворыць: «Спала добра, ніхто мяне не трывожыць».

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Савінко Марыі Міхайлаўны, 1928 г. н.
(нарадзілася ў в. Грохаў Лоеўскага р-на), 2005 г.

За каждым чалавекам ёсць дамавы. Я жыла дзеўкаю. Тады ні грошай не было, нічога. Сапагі прыйшла купіць на базар з Крупеек, 7 кіламетраў. Сапагі дзядзька прадае. Я гавару: «Дзядзечка, пашый-ка мне сапагі». Ён сказаў: «Дай 5 рублей задатку». Ён кажа: «У нядзелю я табе прынясу». Я нядзелю пасядзела – няма, я і другую пасядзела – няма. Так я сабралась дай прышла. Іду зімой. Іду, і так утупалась. А з гары чалавечак крыкнуў: «Куды ты ідзеш проціў паланы!» – дый прама ідзе на мяне. Я зір – паланья, зір – там быў чалавек. І тут той чалавек як утануў, і няма таго чалавека. Як ён мне паказаў, так я і пайшла. І назад так ішла. Каб ні ён, то была б мая смерць. У каждага чалавека ёсць свой дамавы, які яго ахраняе.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Трасцян Еўдакіі Іванаўны, 1931 г. н.
(нарадзілася ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ё дамавыя, ё. Свякруха мая яшчэ гаварыла, што бачыла дамавіка. Аднажды яна спала, а ў ва сне яе што-та пугае, і такі воздух над табой стаіць. Дажа мой брат прыйшоў дамой адзін раз і лёг там, дзе кут (каля ікон), дык дамавік будзіць і гавора: «Ты на маё месца лёг».

Дамавы, ён у розных відах выглядае. Еслі цапнеш у шэрсці дамавога, дык ўсё добра будзе. Яны ўсякія могуць быць: кацапам, авечкай. Жыве часта на чардаке.

Аднажды я так устала, і мне ўсе надаелі, і я пайшла спаць у каморку. І тут бачу, будта на мне кажух ляжыць, паглядзела ўбок і бачу, дзверы адчынены, і відна крыльцо. А я думала, што гэта нашы хлопцы балуюцца, а тут-то не – гэта дамавы.

Калі вось пераязджаеш у новую хату, то ўзяць трэба венік ці лапаць і казаць: «Дамавой, дамавой, паехалі з намі дамой». Яшчэ дзе ў новай хаце кот спаць ляжа – стаў ці краваць, ці іконы вешай.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Жыў у нас дамавы, да, веру. Чутна, як дзверы адкрываюцца, як хто ходзіць. Чашка раз сама звалілася са сталу. Мы шчыталі, што ён не дзелае плахога. Ён такі маленькі, з барадой, мо ў паўметры. Жыў на чардаках ці за венікам у кутку.

З катом, калі ў каго ёсць кот ці кошка, не дружыў, баяўся яго. Мы шчыталі, што з ім па-добраму нужна быць.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Кацярыны Васільеўны, 1920 г. н., 2005 г.



Хто яго знае: можа, ё дамавік, а можа, і няма. Усе пра яго гамоняць. А я думаю, ён малога росту, такі, як звярок, пушысты, галава така лахматая, морда абезьяны, хваста не знаю, ёсць ці не. У хаце ён не жыве, больш у лесе. Дамавік ходзіць па хатам. Людзі гавораць, што дамавік саабшчае, хто памрэ. Аднажды прыснілася мужыку, а мо і не прыснілася, я не знаю. Ну, дык вось. Лёг мужык спаць, а яго будта хто-та раскрывае. А ў яго нядаўна жонка памерла, ну, дык, наверна, ета ж нячыстая сіла.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Чучвага Анастасіі Іванаўны, 1920 г. н.,
Бухавец Ганны Барысаўны, 1913 г. н.,
Прымак Анастасіі Раманаўны, 1926 г. н., 2005 г.

Веру ў дамавіка. Гэта дзядок маленькі, з бародкаю, сяды, шапачка ў яго невялічкая, з-пад карча ножкі кароткія. Вось памёр мой дзед, лажуся спаць, а ля мяне штосьці дыша на падушцы. Я падскачу – нічога няма. І так часта було. Ох, гэта ён і выскоквае з-за пянька.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

Кагда я пакупала дом, то жэншчіна, каторая яго прадавала, стаяла перад іконай і малілась, штоб дамавой пашол с ней.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Чучвага Людмілы Валянцінаўны, 1968 г. н., 2005 г.

Як плоха зробіцца ў сям'е каму, дык гэта дамавой не ўзлюбіў. Жыў на куту, за віконай. Яго не замячалі.

Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на
ад Малянка Уладзіміра Васільевіча, 1929 г. н.,
Малянок Любові Навумаўны, 1930 г. н.,
Рабянок Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2005 г.

Дамавікі ёсць у каждай хаце. Так, адна дзеўка ждала дзіця. Яна лягла спаць, і ёй што-та начала давіць на жывот, катаецца па ім. Дзеўка памянялася з мужам

мястамі, але і ён пачуў гэта. Так яны не спалі цэлую ноч. Утрам дзеўка пайшла да мамкі і спрасіла, што ёй рабіць, а мамка сказала, каб яны папырскалі свяшчонай вадой і пасыпалі макам, а ў гэтага сказала спрасіць, як ён прыйшоў, к худу ці к дабру? І вось уначы дзеўка яго ўбачыла. Гэта быў дамавы: ён быў цёмным і небальшым, но он не паказываў зад. А дзеўка там бачыла хвост. І вось, яна запытала, як ён прыйшоў і адчула, што ён прыйшоў к худу. І тут дамавы знік.

Радзілася дзіця са срошчанымі пальцамі. Так дамавы папярэдзіў дзеўку аб гэтым.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Грышчанка Елізаветы Антонаўны, 1933 г. н., 2002 г.

Я дамавога не знаю. Но ежэлі ў хаце паселіцца дамавой, то ў той хаце няма дабра. Там усё плоха: і скот можа здохці, там няшчасці ўсякія, і чалавек можа балець, і ўся сям'я яго.

Дамавой – эта плоха. Дамавой – эта дух ў відзе чалавека. Можна ж ад няго ізбавіцца. Завуць знахаркі. Знахаркі етыя ж тады ізганяюць. Дык вот я ета не знаю, як іх ізганяюць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

З'ехала з адной кварціры ў другую, легла спаць, аж у цябе па хаце штось, здзесь: стук-стук, грук-грук.

Дамавыя ж абходзяць всё. Я як перайшоў са сваёй хаты ў другую, і зразу паявіўся ён, і абязацельна кусок хлеба, штоб на стале ляжаў. Еслі хлеба не лежыт на стале, зразу начынае грукат, стулья пачынают, значыць, стукацца. Тады кусок хлеба як палажыў – усё, зразу цішына.

Дамавой добры. Дамавой, ён за домам усё ўрэмя смотрыт. Яго ніхто не відзеў. Ён толькі ноччу паяўляецца, стулья пачынае двігаць.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Мазгавога Мікалая, 1959 г. н., 2005 г.

Гавораць, што эта дзядок з барадой. Эта было не свяшчэннае, не бажэственнае.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ну, е. Еслі дамавой не палюбіць, пойдзеш замуж ды ён не палюбіць, дык жыць не будзеш. Эта цень па комнаце будзе бегаць і ўсё. Ён стучаць не будзе, а

проста ты можаш паглядзець пад койкаю, можа здацца. Нада перахрысціцца, і яго бачыць не будзеш.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на)
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.



Мы не чулі, мо жыве? Но мы ж яго не бачылі. Ну, урэда ж нікому не зрабіў. Мо жыве ён пад печчу, а мо і не? Пітаецца, мабыць, з коцікам маім, малачко п'е.

Запісана ў в. Трасцянец Лоеўскага р-на
ад Яшчанка Параскі Аляксандраўны, 1926 г. н.,
Выгляд Таццяны Максімаўны, 1925 г. н., 2005 г.

У нас в доме домовой был. Поругалась с мужем, поехала в Киев, а он ему – тук-тук, не давал спать. Муж позвонил, сказал, чтоб домой приехала, а то домовой уже доконал.

Приехала, а в хате бардак. Мужик пил и, можа, гулял. Я начала убирать. Первую ночь стучит. Опять убираем, драем – он всё равно стукает. Потом мне сказали: «Приготовь еду, и пусть она стоит на столе». Эта ночь побыла с едой, и после этого он перестал стучать. Не любит домовой беспорядок.

Запісана ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на
ад Кудраўцавай Наталлі Данілаўны, 1972 г. н.



Я чула, што ёсць дамавік. У доме, кажацца, жыве. Чула, што часы ў доме цікаюць. Прыслухаешся ноччу – у адном кутку чуеш, і там цікаюць таксама часы. Ну і гавораць: «Гэта дамавік».

Гавораць, добра, калі дамавік у хаце знаходзіцца. Прошлы год, кажацца, сядзім і чутна, што цікаюць часы. І Наташа, і Ніна чулі, што цікаюць часы. Лена расказвала, суседка, як клікаюць: «Дамавой, дамавой, ідзі дамой. Будзеш дом сцярэгці».

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Каваленка Галіны Мікалаеўны, 1938 г. н., 2003 г.

Ласка

Ласка, кажуць, карову слакоча так, што карова ў хлеў не заходзіць дайжа. А ў каня грыва сплецена, то, кажуць, ласічка заплятае яе.

Яна – такі звярок тоненькі, беленькая сама. А ёсць і рабенькая. На Ракордзе (вёска), калі капцы закапвалі, дык гаварылі была ласічка, невялічкі звярок.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Каваленка Галіны Мікалаеўны, 1938 г. н., 2003 г.

У калхозе была ласіца. Бачыла, як крыса: тонкая, длінная, рабая, быстрая. Белыя пятны і чорныя.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г. н., 2005 г.

Ласка – эта такая маленькая, беленькая, ціпа крысачкі. І яна залазіць на карову і начынае па ёй лазіць, ласкае яе ўсю. Карова, калі прыйдзеш утрам у хлеў, у мыле стаіць, а конь вабшчэ тожа на каленях стаіць. Да такой сцепені іх залізваюць. Таму і ласкай называют. Эта, ну яе ў баню, як яна завядзецца, дык не знаеш, як яе вывесці. Яе не задобрыш. Ей эта прыятна, ана ж тут з каровы пену эту снімае. Можа ёй нада эта, што яна пацее.

Ласачкі е і з палоскай па хрэбту. Відзел я адзін раз яе. Яна белая, хвосцік такі. Я ў сарай якраз зайшоў, дзе мы кароў дзяржалі, і яна ў углу сядзела. Ну, я толькі яе ўвідзеў, і зразу яна прапала, больш нікагда не было.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Мазгавога Мікалая, 1959 г. н., 2005 г.

Лесавік

Лесавік возіць чалавека кругом. Прыводзіць на адно і тое месца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Патапенка Елізаветы Трафімаўны, 1934 г. н., 2003 г.

Калісь мы ў дзярэўні адной былі, выпівалі. Толькі не ў сваёй. З жонкай. Так я, значыць, думаю: пабудзем і вярнуцца трэба. Палучылась, што яна там начаваць, а мне нада дадому: карова ж там. Я ішоў, ішоў, а там цераз лес трэба было ідці. Ішоў, ішоў, сілы нет, я лёг і задрамаў. Возле мяне і свішчуць, і крычаць, і танцуюць. Я глазамі так во матануў, і етыя калёсы і зашумелі, і паразбягаліся. Душу забраць дзедаву хацелі.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Русалка

Ну, русалкі тады ета не было. Калісь бегалі етыя ведзьмы, ды па каноплі бегалі. Да там ужэ захочуць узнаць, якая эта дзеўка – ведзьма, дык пойдуць лавіць бабы ўжэ пажылыя ў каноплі. Пойдуць, а яны там бегаюць, хоць хто знаў, хто не знаў, валасы распусцяць і бегаюць. Калі дазнаюцца бацькі, што дзеўка ў каноплі бегала, дык сякуць яе крапівой.

Пра русалак думалі , што гэта ведзьмы. А што ведзьмы? Ведзьмы рабілі людзям урэду. Разве ж можа нячыстая сіла дабро рабіць? Толькі ўрэду.

Запісана ў в. Пярэдзелка Лоеўскага р-на
ад Равянок Марыі Адамаўны, 1928 г. н., 2002 г.

Дзяцей пугалі русалкамі. Як не слухаюць дзеці, топчуць жыта, а маці не хочуць, каб тапталі, дык гаварылі: «Вонь, русалка там». Пугалі так.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Каваленка Галіны Мікалаеўны, 1938 г. н., 2003 г.

Няма русалак. Ета знахаркі, вядзьмачкі. Людзі, якія перадзяваюцца, ідуць у жыта і пугаюць. Гэтымі знахаркамі чорт камандуе. Яна, гэта знахарка, вядзьмачкіна сям'я сем мяшкоў высыпе. Пакуль чорт збірае, яна аддыхае.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Канстанцінавай Яўгеніі Рыгораўны, 1924 г. н.
(нарадзілася ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), 2005 г.

Так гамоняць, а што за русалка, не знаем. Гавораць, а мы верым. Як выглядзіць? А Бог яго ведае. Косы, мо, распушчаны. Як тая баба Яга наражаецца. Гавораць, што не нада хадзіць па жыце, бо русалка можа паймаць ды зашчыкатаць да паўсмерці.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Валянціны Мацвееўны, 1935 г. н., 2005 г.

Не, я не веру ў русалку. Бог яго ведае, як яна выглядае. Дзеўка красівая, апранутая ў белае, валасы яе чорныя, длінныя, без хваста, са сваімі нагамі. Аднойчы ў дзяўчыны памерла маці, сядзела горам прыбітая на печы, прычытала: «Забярыце мяне да маці». Сніцца ёй сон. Стаіць перад ёй русалка і кажа: «Не заві мяне, я сама прыйду».

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Колас Марыі Пятроўны, 1935 г. н., 2005 г.

Русалка – гэта ведзьма з доўгімі валасамі. Яна дзяцей пужала, каб яны ў жыта не хадзілі.

Запісана ў в. Сяўкі Лоеўскага р-на
ад Краўчанка Марыі Пятроўны, 1929 г. н., 2005 г.



Баяліcь русалак. Не хадзілі, дзе жыта расце. Казалі, што русалка заслакоча, калі паймае.

Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на
ад Бандарэнка Ніны Рыгораўны, 1927 г. н., 2005 г.

Русалкі – абыкнавенныя дзеўкі. Распушчу свае сівыя воласы і пайду русалкай. Што надзену ды сяду ў жыта. Дак ідуць і пяюць: «Правяду русалку да бору, сама вярнуся дадому».

Параўняюцца са мною, я із жыта выскакваю і давай ужэ яе шчыкатаць, дак што еле ўцёклі, дак а я ж паймала. Дак тая ўжэ крычыць, як я яе паймала. А тыя ўжо пабеглі і пабеглі. Адпусцім яе, а яна ідзе і плача, яна ўжэ спужалася, што русалка яе паймае. А мы жэ не кажам, хто пойдзе русалкай.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.



Русалкі былі калісь. Казалі, што на Траецкай нядзеле.

Кажуць, русалкі ходзяць у белым. Яшчэ еслі хто на Траецкай нядзеле ўмірае, то тагда стане русалкай.

Запісана ў в. Трасцянец Лоеўскага р-на
ад Яшчанка Параскі Аляксандраўны, 1926 г. н.,
Выгляд Таццяны Максімаўны, 1925 г. н., 2005 г.

Русалкі – гэта маладыя дзеўкі. Іх шмат. Дзеўкі ўюць вянкі з розных цвятоў, ідуць на могілкі і на красты вешаюць, штоб капуста ўрадзілася. Потым знімалі вянкі з крастоў, ішлі дадому і вешалі іх на капусту, каб ураджай быў добры.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Малянок Марыі Якаўлеўны, 1927 г. н.

Хлеўнік

У мяне ў хляве жыла ласічка, ну, там яна жыла. Як ёй падабаецца скот, дак яна з ім жыве, а як не, дык худоба дохне.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Ластачкі (ласачкі) жывуць у хляве. Скаціну няўзлюбяць – так слакочуць яе, заплятаюць воласы каню.

Ён такі звярок беленькі з серанькім, большы як крыса. Яна і цяпер жыве багата ў каго. Карову мучыць, мокрая скаціна становіцца, пацее. Каб пазбавіцца ад яе, гавораць, нада казу ўзяць і яе кожу павесіць у хляве.

Запісана ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на
ад Марозавай Вольгі Пятроўны, 1929 г. н.,
Заўялец Марыі Герасімаўны, 1931 г. н.,
Атрошчанка Вольгі Нікіцічны, 1928 г. н., 2002 г.

Ну, есць такія. Гавораць, русалкі такія, што карову заганяе, што мокрая становіцца. Эта ад русалак. Эта есць такі звярок у хляве, як кот, во, ласачка. Патом выходзіць – і карова мокрая, і лошадзь мокрая.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н., 2005 г.

Чорт

Чэрці – эта людзі, каторыя не вераць Богу і стараюцца здзелаць плахое дзела.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Пратасава Арсенція Дзмітрыевіча, 1932 г. н.
(нарадзіўся ў в. Дуброва Лоеўскага р-на), 2005 г.

Раз уязджала я са свайго старога дому. Сабрала свае вешчы і легла спаць. А тут чую, што нехта цягне адзеяла. А адкрыла вочы і ўбачыла некалькіх чарцят. Яны паціху сцягвалі маё адзеяла. І тут я ім кажу: «Дайце мне паспаць, я заўтра ўязджаю». І яны зніклі. Так я больш іх і не бачыла.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Паўлюшчанка Анастасіі Сяргееўны, 1925 г. н., 2002 г.

У Лоеве, мо 100 гадоў назад, быў скрыпач Тарас, хадзіў на вяселлі граць, на хрысціны, куды пазавуць.

Ноччу гэта адбывалась, там было Раманькава балота. Была позняя восень. Мужыкі малацілі і начавалі ў гумне, чуюць, што штось скрыпіць і скрыпіць. Адзін гаворыць другому: «Хадзем пабачым». Узялі цапы і пайшлі. Падходзяць, Тарас сядзіць на купіне і на адной ноце іграе: «Р-р-р!» Кажуць: «Тарас, Тарас, што ты робіш?» Кажа: «Іграю панам і паненкам». А вакол яго ляжаць гнілыя яблыкі. Кажуць: «Тарас, хрысцісь, ты ў Раманькавым балоце». Дык ён пачаў хрысціцца. Гаворыць: «О, а дзе я?» Ачнуўся. Тыя: «А чаго ты сюды папаў?»

Завялі яго ў гумно, адагрэўся, стаў расказваць: «Іду з Мохава, з вяселля. Толькі выйшаў, падходзяць два паны і гавораць: «Хадзі на вяселлі іграць». Завялі мяне ў зал, там паны і паненкі».

Тарас прыйшоў дадому, пабіў скрыпку.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Патапенка Лізаветы Трафімаўны, 1934 г. н., 2003 г.

Духі

У духаў веру. Еслі памірае чалавек, дык прыходзіць ён, гэты дух. Раз у бабкі перад смерцю штора за грубкай зашавялілася, зашымацела. Значыць, смерць прыдзе. І, што вы думаеце, на следуйшчы дзень памерла баба. Дзед памірáў, дык у левым вуглу нехта стукаў тры разы. Назаўтра ён памёр. Ну, значыць, е што-та такое. Гэта валшабство.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Бухавец Кацярыны Васільеўны, 1920 г. н., 2005 г.

Уяўленні аб сусвеце

Очень веру в Бога. Я малюся Богу кажды вечар, станаўлюся і малюся, малюся Богу.

Калісь у цэркві бацюшка гаварыў, што Ісус Хрыстос – ета быў чалавек, раждзённый чалавекам ад веруюшчых людзей. І ён паверыў усяму этаму і выпаўняў усё тое, што ў Евангеллі было напісана. А патом ужо ён, калі яго распялі (ён жа быў распяты, пагіб, нежывы), усё роўна зняўся сам. Ніхто ж яго не зняў, а сам зняўся з гэтага распяцця і паляцеў на небяса.

У рай пападаюць людзі веруючыя, каторыя Госпаду Богу веруюць, каторые нікаго не абіжаюць, нікаму не дзелаюць зла. Вот, эта такія людзі пападаюць у рай. А ў пекла жа эта пападаюць людзі неверуюшчыя, сярдзітыя такія, каторыя зло людзям дзелаюць. Вот.

У пекле агонь, толькі не помню хто там главны. Можа, чорт? Помню, я была в санаторыю, дзе-та ў Латвіі. Эта ж ужо даўно было. Дык там была такое памяшчэніе... Ні цэркаў, но нападобіе. Дык вот эта там паказваліся такія страшныя, ну як іх зваць? Чэрці – ня чэрці. Іх называлі нячысцікі, шо вот нячыстыя сілы. Ох, якія яны страшныя, такія рысункі на іх былі: на галаве ды ні валос, ды ні рога, але вошы якія-та. А, Божа мой! Ліцо!.. Дык рот такі страшны: па тыя вушы. А людзі гараць там у агне за грахі свае.

А ў рай хто пападае, таму добра ўсё, незямная жызнь там. Да разве ж там чалавек жывы? Там душа яго. У пекле ж мучаюцца нежывыя, там жа толькі душа, так і ў раю.

Ну, сначала жыў якісь народ, а патом жа здзелаўся патоп, да патапілася ўсё, весь мір той патапіўся. Толькі адзін карабль быў, адзін такі балышы карабль, пастроены, як сказаў Бог, Ною. І туда было на карабль заслана трохі святых чалавек: і жэншчыны, і мужчыны, і пціцы патроху – усяго па пары. Ну, еты карабль бальшушчы плаваў вездзе і на свеце. Патом заплыў на высоку гору. І патом эта вада (прашло ж 40 дней і 40 начэй) стала ўжэ спадаць. Па просьбе Ісуса Хрыста

(ён сільна маліўся) так стала вада спадаць. І апусціўся карабль на землю, і ўсе етыя пціцы былі выпушчаны, і людзі выйшлі.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Крот Надзеі Міхайлаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Пасмяротнае жыццё

Я думаю, што яно е гэта пасля смерці жыццё. Вот паверце, я вам скажу. Случылася гэта мне: мой унук у Гомелі, а зяць памёр. Я, знача, іду ў луг, шукаю свайго сена, а я шукаю, думаю: ну дзе ж маё сена? А еты мой унук (ды там памёр сусед), дык ён яго хараніў. Яны ў кагось купілі гарэлку, дык он выпіў, і каб не скорая помашч, дык ён бы і памёр. Дык вот жа сніцца: а еты ж зяць, яго бацька едзе канём, дык я на яго і крычу: «Не бяры Валодзю, бо загубіш!» А ён кажа: «Не буду браць». І я праснулася. Ажна мне саабшчылі, як бы там скорую помашч не вызвалі, так бы і было там.

Я прызнаю, што ё душа ў чалавека. Чаго ж я вам гэта прызнаю. Памерла мая матка, а мне было дванаццаць гадоў. Ну, што ж, карову ўжо даіла, так мае рукі так папухлі ўжэ, дык я ўжо ж нясу даенку ў бяседачку. А я сяджу і галашу: «А чаго ж ты мяне, мая мамка, кінула на такое, шоб ты пабачыла, як мае рукі папухлі». Дык гэта ж іду з чулана, а яна стаіць там у кутку. Дык я ж так крыкнула: «Ой, мамачка!» І даенка з рук. Во так і пабачыла мамку.

Веру ў Бога, пачаму ж не верыць. З малітвай устаю, з малітвай лажуся. З Госпадам у дарогу іду.

Ну, я прадстаўляю, што е Бог на свеце. Мы яго не бачым, я нічога не думаю, я тока знаю, што е Гасподзь, веру і ўсё. А я ж знаю, какі ён і што ён, а толькі адно скажу: е Бог на свеце, на небесах.

Так у нас зямля круглая, куда ні едзь, дык зямля круглая. Края нету зямлі.

Легенда пра варону

Раней ракі не было. Бог ужо ўсіх сабраў і сказаў усім: «Капайце!» Дак ужо ўсе капалі, а варона ўзяла да пакачалася ў гразі, і ўжо к Богу прыйшла: «І я капала». А Бог яе наказаў: усе п'юць з ракі, а варона жджэ дождж. Дак яна ўжо не нап'ецца.

Верабей

Жыды на іх казалі, што падносілі гвоздзі, Ісуса Хрыста забіваць, як яго распіналі. Бог даў, што ўсе ходзяць, а іх спутаў.

Зязюля, салавей

Во такая легенда е. Зязюля – эта казалі, кагда дачка ідзе ў госці, а там ужэ ў дзярэўні грэбля была такая. Яны ідуць да грэблі, а ён робіцца вужам, і яна патом з дзецьмі прыйшла, дык патом пытаюцца: «Дзе твой хазяін?» Адзін хлопец адмаўчаў, а дзеўка і кажа: «Дак у нас жа бацька, як дайшлі да грэблі, вужам зрабіўся». Дак яна пракляла сваю дачку, што будзеш ты зязюляю, шоб хавалася ад вераб'ёў, ад усіх. Дык эта матка яе пракляла, а сына здзелала салаўём, верабейка-салавейка. Яна ж хаваецца, а за ёй ганяюцца верабейкі.

Бусел

Калісь Бог сабраў усіх звяроў, усякіх вужаў, гадзюк, затаптаў у мех, завязаў і даў чалавеку: «Нясі ўжэ». Той жа нёс, нёс, тады прынёс к балоту да захацеў паглядзець, што Бог тутака наклаў, ды развязаў. Із меха папаўзлі вужы. Ну, Бог і здзелаў яго буслам: хадзі па балоту, лаві вужоў да жаб. Ён вужоў ловіць да дзяцей корміць. Бусла нельзя абіжаць, он – чалавек.

Сабака

Сабака – лучшы друг чалавека, таго што ў яго ўм, як у чалавека. Ён жа свайго хазяіна знае. Хазяіну плоха, дак і ён з ім.

Сабачы хлеб

Саграшылі людзі, дак Бог узяў, а раней жа, колькі кален, столькі і каласкоў, і аставіў толькі вярхушку на сабаку і на ката.

Чаму жанчыны працуюць без адпачынку

Такая е легенда. Быў у бацькі сын. Ён адправіў сына касіць траву. Той, пакуль прыйшоў, дык і спаць захацеў, ды і заснуў. А Бог хадзіў па зямле, цяпер не ходзіць, а раней хадзіў. Аж ідзе чалавек, а ён-та і знае, што ета Бог, і кажа: «Ну што з яго будзе? Усе працуюць, а ён спіць». А дзеўка палола картошку. Так поле, што пот лье, пыль стаўбом. Дык ён падыходзіць і кажа: «Во то твая пара». Яна век будзе трудзіцца, а ён будзе аддыхаць. Во так і будуць жыць. Во за гэта нас Бог наказаў, што мы не аддыхалі.

Чаму трэба шанаваць старых людзей

Старых людзей нада так пачытаць, таму што яны цябе нарадзілі, узрасцілі, дык нада ж аддаць ім. Нада старых уважаць, эта нашы кармільцы.

Чаму Бог больш не ходзіць па зямлі

Бог не ходзіць па зямлі, бо людзі саграшылі, а як, не ведаю.

Зоркі

Ад неба да зямлі ты ніколі не ступіш.

Калі нарадзіўся Ісус на Ражаство, седзьмога, тады было многа зор і свяціў месяц. Када ўжэ Ісуса Хрыста мучылі, так і звёзд не было. Калі Ісус радзіўся, так і звязда яго ўжо ўзашла.

Пчала

Пчала ўмірае адразу, када жаліць, таму што яна аддае свой яд і без яго не можа сушчэстваваць. Свой яд як яна ўпусціла, так і ўпала.

Ангел-храніцель

Кагда дзіця раждаецца, дык Бог пасылае яму ангела. Ён яго ахраняе ўсё жыццё, калі ён не саграшыць. Ета ангел-храніцель.

Смерць

Калісь маему брату прыснілася, калі ён служыў у арміі. Ён і кажа: «І сніцца мне: ідзе смерць, можа так, як чалавек. Дык у руках у яго кола, па плячах вяроўкі ляжаць і нож». Ён спужаўся і бягом да дзяжурнага ў дзвярах. Ён цяпер кажа: «Я бачыў, якая смерць».

Навальніца

Ета Бог дзелае гразу. Калісь быў сільны лівень. Было ж такое, што молнія спаліла ліцо чалавеку. Дак страшна было. Гэтага ж мужыка ўбіла.

А ў нашай дзярэўні молнія аж хату запаліла. Такая бура падхапілася, гром. І дом еты зусім згарэў.

Рай і пекла

Душа ідзе на неба, у рай або ў ад.

Во, была такая історыя: чалавек з жонкай пагана жыў, ну дак яна ўжэ памерла, дак яе адправілі ў рай. А чалавек памер, дак яго Бог наказаў і адправіў у ад. Ён наказаў за тое, што жонку біў. Ён хацеў у Бога папрасіцца, шоб яго адправілі ў рай. А Бог кажа: «Ты не дастоін, ты яе крэпка абіжаў».

Камні

Камень расце, патаму што так дадзена Богам. Е такое места, вот ета, што цэмент робяць. Маладзіца расказвала, што е такое каменне, якое ніхто не падымае. І яны іх во так абходзяць. Ездзяць і разбіваюць тое каменне. Робяць з тых камней гальку.

Камні растуць, ета я вам точна скажу. Я такі камень адзін прымеціла, і па тым камні во такая чарта напісана, а ён такі доўгенькі, тоўсты. І вы знаеце што? Расце! Вот я ўжэ хадзіла туды яго глядзець: то быў такі маленькі, а то – во ўжэ такі тоўсты.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Юшчанка Марыі Рыгораўны, 1910 г. н.
(раней пражывала ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на), 2005 г.

Бусел

А бусел жа – гэта, кажуць, з чалавека. Пітаецца вужамі, лягушкамі і ўсякімі гадамі. Кажуць, калі гняздо бусла разбурыць, дык ён на тое месца агонь прыносіт.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Максіменка Варвары Анатольеўны, 1925 г. н., 2005 г.

У дзярэўні нада абязацельна, штоб быў бусел. Гавораць, еслі бусел мосціць на коміне, яго нельга скідаць. Было наадварот: дак ён узяў, накідаў у комін мусара, каб загарэлась хата.

Еслі бусел скідае буслянят – эта будзе голад, ураджай будзе плахі. Е бусел, які яечка скіне, е, што і буслянят скідае.

Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на
ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г. н.,
Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г. н.
(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на), 2005 г.

Калісь быў чалавек. Бог загадаў закапаць: ці вужоў, ці што, ён потым выпусціў іх. Бог сказаў: «Будзеш збіраць». І стаў чалавек буслом.

Запісана ў в. Белы Калодзеж Лоеўскага р-на
ад Камзолавай Ганны Іванаўны, 1940 г. н.,
Вострык Марыі Савельеўны, 1925 г. н.

Кукушка

Кукушка толькі да Пятра кукуе, да 12-га, а тады яна ўжо хаваецца. Вераб'і, усякая пціца за ёй ганяецца, а яна хаваецца. Яна сама не выводзіць яйца сваі, а ў чужом гняздзе. Дык яна як падрастае і дзяцей гэтых паесць. За тое яе і ганяюць.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Максіменка Варвары Анатольеўны, 1925 г. н.

Каб засцерагчыся ад засухі, да васхода сонца гатовілі кужаль (льняное валакно), пралі яго, ткалі на берагу ракі. У гэты ж дзень даўжны спрасць і выткаць палатно. Слалі ля вады, малілісь Богу.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Патапенка Елізаветы Трафімаўны, 1934 г. н., 2003 г.

Калі грыміць гром, дак эта ж гавораць так, што туча з тучай сходзяцца, саедзіняюцца, і вот ані, дажджы, і ідуць. Гавораць шчэ – Ілля-прарок ездзіць.

Канешна, мужчына должэн быць старшы ў сям'і. І спраку веку так. І калісь старыя людзі гаварылі: «Мужык пад стол, а вядзі яго за стол, паважай яго ўсягда і падчыняйся яму». Нада мужчыну ўсягда падчыняцца, таму што ён старшы ў сям'е далжон быць.

Кагда-то было так: ішоў Бог да і стрэціў, стаў пытаць у мужчыны, а ён косіць. Ён косу кінуў і стаў гаварыць. А шла я да кажу: «Падажджы, бо мне няма ўрэмені». Дак вот ты і рабі. Во так.

Сабака – лепшы сябар, таму што, еслі твой сабака харошы, ён цябе нігдзе не аставіць. Ты во тут ляжыш, і ён каля цябе. Ён ад цябе ўжэ дальшэ не пойдзе нікуды. А еслі не такі, то ён пабег і пабег, а ты хоць умры, дык ён не саабшчыць.

Гавораць так, што вот ты пойдзеш у рай, а той пайдзёт у пекла. А я так магу сказаць: адзінакава зямля. Той, што і ў рай, у адной зямле, і той, што ў пекла, – у зямле.

Адна заснула і расказвала, што, хадзіла: стока многа цвятоў, дарожкі такія, дзеткі, кажа, бегаюць усё.

Еслі чалавек ляжыць бальны, то, када ён ужо памірае, гдзе-та што-небудзь у вуглу будзе трышчаць.

Ужэ былі падросткамі, гулялі па хатах, і вот прышлі ў адну хату. Перад етым можа ў акно хто стукаць пачаў, ілі што прыдавацца стала, што хто-та стучыць. Эта, знай ужэ, еслі пакойнік ляжыць, то эта будзе смерць. Хазяін вышаў на вуліцу – нігдзе нікога. Во так у вугал пачаў хто ружжом страляць, ён увайшоў у хату да кажа: «Нікога няма». І втары раз, і потым сказалі, што племяннік памёр.

Штосьці сніцца – прадвяшчае смерць. У меня была родзічка ў Рэчыцы, так мы прыехалі (яна ўжэ старая была, 105 гадоў), дак яна кажа: «Я ўжо чэраз две нядзелі пайду замуж, прыходзіў ка мне зямлянскі (смерць)». І точна яно. Чэраз две нядзелі памерла.

Ёсць жыццё пасля смерці. Душа ходзіць сорак дней. Я спрашывала сама лічна ў бацюшкі, чаму нада закрываць зеркала, а ён гаворыць так: «Людзі не ўсе ж ідуць пакойніка глядзець, людзі ідуць, штоб дзе што пачуць, выглядзець што-нібудзь». Яна, кажа, будзе тут стаяць, у зеркала будзе ўсё паглядаць, дзе-та хто што робіць. Яна ўсё бачыць. Дак закрываць зеркала вездзе, усюды нада.

Я ж гавару такое, што можна, еслі ты замеціш цень ілі дзе што-нібудзь, нада перакрасціцца.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1924 г. н.
(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),
Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г. н. , 2005 г.

Некаторыя людзі чуствуюць час сваёй смерці. Так, адна бабка пазвала сваіх дзяцей, каб папрашчацца, схадзіла ў баню, памылася, пераадзелася і легла на лаўку. Так яна і памерла.

Запісана ў в. Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на
ад Семяненка Лідзіі Іванаўны, 1932 г. н., 2002 г.

Легенда пра гром і маланку

Гром і маланка бываюць тады, як па небу едзе святы прарок Ілля. Ён так хутка едзе на сваіх колах, што тыя грукаюць як бы на масту, калі вязуць пустыя бочкі.

Адзін чалавек пастроіў сабе хату. І калі пачалі там жыць, то кожную ноч хтось казаў: «Ці вывернуць?»

Гаспадары вельмі перапужаліся. Аднойчы шоў падарожнік і папрасіўся пераначаваць. Лёг, а тут зноў голас: «Ці вывернуць?»

– Ну і выверні.

Тут поўную хату золата наваліў.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Акуліны Дзмітрыеўны, 1940 г. н., 1999 г.

Аса пайшла к Богу і кажа: «Еслі я ўкушу чалавека, ён должан умерці». А Бог: «Еслі ты так кажаш, дык умірай сама». Рассудзіў па справядлівасці.

Чарапаха

Калісь чарапаха ела людзей. Ну што, Бог ідзе, а яна чалавека есць. Дык ён і кажа: «Не, мая дарагая, больш ты есць чалавека не будзеш». І здзелаў, што на чарапахі етый чэрап на яе паклаў. Дык цяпер яна б рада каго-нібудзь укусіць, ды ўжэ не павернецца. От так. Яна не павернецца, таму што ей Бог накінуў чэрапа. Такой, шо ты калі біў яго, бей яго – не разаб'еш. Можа толькі тапаром. Вот табе якая чарапаха.

Запісана ў в. Ручаёўка Лоеўскага р-на
ад Гурыновіч Васіліны Філімонаўны, 1935 г. н.
(раней пражывала ў в. Барысаўшчына Хойніцкага р-на), 2005 г.

Бяроза і асіна

Гэта няверная жонка і яе любоўнік. Жонка пры дапамозе любоўніка забіла мужа, за што Бог ператварыў яе ў бярозу, якая плача, а любоўніка – у асіну, які ўвесь час трасецца са страху.

Днепр звілісты адтаго, што некалі даўно купаўся ў рэчцы сын ведзьмы. Купаўся ды і патануў. Яна, каб адпомсціць рацэ, перагарадзіла ёй дарогу, а тая ўзяла ды і паплыла кудой хацела.

Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на
ад Крупейчанка Івана Афанасьевіча, 1935 г. н., 1999 г.

Птушка-смерць

Есць у нас пціца такая – сава-пугач, на кладбішчы жыве. Перад смерцю каго-небудзь усігда лятае па дзярэўне і сільна крычыць, асобенна каля дома таго, хто скора памрэ. Як закрычыць, значыць хто-та скора памрэ, гэта людзі прымецілі. А яна такая серая, бальшая.

Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на
ад Якушэнка Валянціны Васільеўны, 1960 г. н., 2002 г.

Ражаство Багародзіцы начынае шэраг больш значных праваслаўных празнікаў. Багародзіца – маць Ісуса Хрыста, духоўная маці кажнага чалавека. Яна – нябесная заступніца людзей. Пачытанне Багародзіцы праходзіць праз іконы, многія із іх праславіліся як цудадзейныя. Людзі абрашчаюцца да Багародзіцы з малітвай: «Все ўпованне на Ця вазлагаю, Маці Божая, сахрані Мя пад кровам Тваім. Прэсвятая Багародзіца, спасі нас!»

Многіх яна ісцаліла ад усялякіх балезней, таму людзі вераць ёй, прэкланяюцца перад ёю, надзеюцца, што яна заўсёды будзе іх ахраняць ад ворагаў.

Час смерці

Некаторыя людзі чуствуюць час сваёй смерці. Так, адна бабка пазвала сваіх дзяцей, каб папрашчацца, схадзіла ў баню, памылася, пераадзелася і легла на лаўку. Так яна і памерла.

А яшчэ адзін мужык пазваў тожэ сваіх дзяцей і кажа: «Чым мог, тым і дапамог. Далей самі разбірайцеся». Ён прыбраў усе сваі вешчы, сабраў кнігі і сказаў, што яны яму большэ не нада. Патом ён папрасіў жонку, каб яна прыбрала яго касцюм і рубашку. Жонка так і зрабіла. На следуюшчы дзень яны сабіраліся на кірмаш, і жонка запытала мужа аб тым, чаму ён не адзеў той касцюм: «Ён мне яшчэ пана-дабіцца», – сказаў мужык. Патом яны прыйшлі дамой, паелі, і тут гэтаму мужыку стала плоха. Паклікалі ўрача. Доктар сядзеў доўга, але як толькі ён выйшаў за дзверы, мужык уздыхнуў цяжка і памёр. Во як было.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Пазняк Акуліны Дзмітрыеўны, 1940 г. н., 1999 г.

Я раньшэ тожэ не верыў. А вот адзін раз на кладбішчы раслі грыбкі. Я хацеў іх сабраць, дык раптам хтосьці ў ладошы тры раза за спіною стукнуў, пахлопаў. Я азірнуўся – нікаго няма. Гэта значыць, не нада браць. А на наступны дзень прыйшоў – іх ужо не было.

Вот я вам яшчэ раскажу. Калісь я служыў на граніцы з Турцыяй. Была ў мяне дзеўка. А тады ўсім пагранічнікам выдавалі наган, пісталет і патроны. Іду я да яе ў лунную ноч, дык гляджу, кот трэцца аб мяне, два разы ў яго страляў – ды асечка. Я спугаўся, абярнуўся. Патом павярнуўся – яна стаіць, а кот ісчэз. Я выстраліў два

разы ў паветра – асечкі не было. Расказаў ёй усё, дак яна рэзка атвеціла: «Нечага на гэта ўніманіе абрашчаць».

Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на ад Грышкавец Марыі Міхайлаўны, 1936 г. н. (раней пражывала ў в. Усход Лоеўскага р-на), Грышкаўца Якава Сямёнавіча, 1937 г. н. (раней пражываў у п. Марс Лоеўскага р-на).

Дамавік

Знаю я такога. Я яшчэ калі малая была, маці мне расказвала пра яго. Быў з ёю адзін случай такі. Звычайна, павячэраўшы, яна крышку малака і ежы астаўляла на стале, каб дамавы паеў, а аднойчы забулася. Дык што тады було: усю ноч грымеў посуд, скрыпелі дзверы, палавіцы, і дыхаў ёй у твар нехта так цяжка. Прыйшлося ўстаць ёй пасярод ночы і наліць у місачку малака. І ведаеце, тады ўсё супакоілася. А на наступны дзень стала яна пасярод хаты і папрасіла ў дамавога прабачэння, бо баялася, што зноў ноччу не дасць спаць, але ўсё было спакойна, дзякуй Богу.

Выглядае ён так: маленькі дзядок з сівою барадою, маленькімі вочкамі. У ва што апрануты? А па-рознаму: бувае ў кашульцы чырвонай, тады ён добры, а бувае прыходзіць і ў шэрай, гэта значыць – нешта яму не даспадобы. Як у хаце ўсё добра, дык і ён добры, нічому не мяшае, не шкодзіць і жывёлу дамашнюю не чапае. Не любіць кошак, баіцца іх. Не любіць іх яшчэ таму, што яны, бувае, лажацца на яго месца. От тады ён вельмі злуецца.

Жыве ён звычайна пад венікам, зімою бувала на печы яго бачаць. Дамавікі – гэта добрыя сушчаства. Нічога дрэннага не робяць, калі ты з імі добры. Яшчэ яны могуць прадказуваць. Бувала, згубіцца якая-небудзь рэч і ўжо не знаеш, як яе знайсці, тады папрасі дамавога падказаць і ён дапаможа. Яшчэ ў нас ў вёсцы быў случай такі. Жыла сям'я – дзед з бабай. І ў дзеда замест адной нагі была дзеравяшка. Памёр гэты чалавек і пахавалі яго без гэтай дзеравяшкі. А ноччу да гаспадыні ў сне прыйшоў яе чалавек, але ўжо не ў сваім выглядзе, а ў выглядзе дамавіка, маленькага такога чалавека. Ну і назаўтра закапалі ў магілу гэту дзеравяшку. А патлумачыў сваё з'яленне дамавы-чалавек тым, што не можа ён хадзіць па тым свеце.

А вот мая дачка, якая жыве ў горадзе, расказвала, што аднойчы мыла яна яблыкі, а, памыўшы, паклала на талерку і пайшла ў другі пакой. Прыходзіць, а яблыкі зноў у ракавіне ляжаць. Яна зноў іх выняла і пайшла. Дачка не ведала што гэта. Можа здалося? А старыя людзі сказалі, што гэта быў дамавы, напэўна, хацеў, каб яна лепш памыла яблыкі. Потым ён яшчэ не раз прыходзіў. І яна, дачка, называе яго яксці – барабашка? Гаворыць, ён посуд перастаўляе, банкі з паліц прыбірае.

Вось, прымета ёсць такая, што два венікі нельга штоб былі ў адной хаце, бо дамавыя будуць ругацца, а ад гэтага жыцця не будзе гаспадарам.

Калі ў новую хату пераязжалі, бралі з сабою стары венік, бо ў ім жыў дамавы. Але ж не кожны чалавек і бачыць дамавіка, гавораць, што толькі з добрымі помысламі.

Калі дамавік жыў не ў хаце, а ў хлеве, дык людзі называлі яго хлеўнік. Гаварылі, што ён бароніць дамашнюю жывёлу.

Быў і нядобры хлеўнік. Вот мая суседка расказвала, да і сама я яшчэ помню. Неяк стала яе карова худнець, не есць нічога. Да і конь у яе быў, дык і той схуднеў

і не ведала яна, што рабіць. А гэта хлеўнік аказваецца на іх усю ноч ездзіў: то на карове, то на кані, замучыў іх зусім, так карова і здохла. Аднойчы пайшоў гаспадар прасіць у яго, каб аставіў ужо ён каня і пабачыў там хлеўніка – чалавечка маленькага. Сядзеў ён на кані. Пачаў гаспадар прасіць у яго, каб аставіў ужо ён каня, і паабяцаў прыносіць яму ежу кожны вечар. З тых пор хлеўнік не турбаваў больш іх.

А ў бані не, не знаю, напэўна ніхто не жыў.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскай Ганны Андрэеўны, 1930 г. н.,
Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2004 г.

Я чула не раз, што дамавік ёсць у доме, бо як жа ж, без яго нельга. Гавораць, што гэта добра, калі дамавік ёсць. Ён сам па сабе не благі, глаўнае яго не гнявіць, тады ён будзе жыць мірна і нават дапамагаць у хатніх справах.

Дамавы – ета маленькі дзядок з длінной барадой, ён жыве ў адным месцы ў хаце, а ходзіць там, дзе яму падабаецца. Асабліва дамавы арудуе, калі ўжо цёмна на дварэ. Інагда кажацца, што пол ці дзверы скрыпаюць – гэта ходзіць дамавы: правярае ці ўсё ладна. Інагда чуеш, як цікаюць часы. Прыслухаешся, у адным кутку цікаюць, потым у другім, ну і гавораць, што гэта дамавы. Вельмі дрэнна, калі дамавы гнявіцца на цябе, тады ён спакою не дасць пакуль не залагодзіш яго. Не любіць дамавік, калі два венікі знаходзяцца ў доме, калі на стале ляжыць нож і соль стаіць. Вельмі ён ужо не любіць катоў, каб былі ў хаце.

Калісьці малая сядзела, а каля мяне кот быў, тады ён ні з таго ні з сяго як устурупіцца, як зашыпіць і адразу на двор шмыгануў уцякаць, гэта дамавы яго напалохаў. Калі гнявіцца дамавік, табе ноччу можа сніцца, што цябе хтосьці душыць, прачынаешся – аж нікога нідзе няма. Тады можа біцца пасуда проста так, як сама з рук выскальзвае. Падюць рушнікі, вродзе і вісіць добра, а тады сам возьме і ўпадзе. Часта бывае, што дамавы хавае нейкія рэчы.

Аднойчы я гатавала ежу, памяшала ложкай і паклала яе радам, тады пайшла за чымся, прыхажу, зноў трэба была памяшаць, цап – няма ложкі, думаю: ну толькі ж во мяшала – ужэ няма, пашукала, пашукала – няма, ну, што рабіць, трэба ісці за новай ложкай. Пайшла, прыхаджу – ляжыць мая старая ложка зноў. Я адразу падумала, што дамавы жартуе, тады трэба гаварыць: дамавой, паіграй, паіграй і аддай. Мая маці расказвала, як дамавога клікаць: «Дамавой, дамавой, ідзі дамой, будзем дом сцерагчы!» Калі ўжо так выйшла, што раззлавалі дамавога, то трэба вярнуць даверые. Можна аставіць ці на стале, ці дзе ў куточку варэнне ў місачке, ці канфет, бо дамавы вельмі любіць есць саладосць. Дамавой сам на вочы нікому не паказваецца, бо не хоча, каб яго бачылі, а калі хто і ўбачыць яго, дык нікому аб гэтым не расказвае, каб дамавы не гнявіўся, а то разазліцца і не будзе шанцаваць у жыцці. Калі паказаўся дамавік – гэта добра, значыць ты яму спадабаўся, не трэба гэтага баяцца.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Лазнік

У бані жыве лазнік. Жыве там, патаму што очэнь любіць мыцца і парыцца. Калі не затапіў баню – лазніка няма, а калі баня топіцца – ён вылазіць, каб памыцца.

Мыецца лазнік толькі ноччы, калі ўжо ўсе памыюцца, таму нельзя хадзіць после 12 часоў у баню, там і другія нечысці тожа. Нада астаўляць таму, хто апошні мыецца, нямножка вады для лазніка.

Калі абідзець лазніка, дык калі мыешся, чуецца ўсё грукат, можаш абварыцца вадой, а можа і зусім лазнік запарыць так, што стане дрэнна, кружыцца галава, дык нада бягом выходзіць. Або калі хто даўно пайшоў мыцца і яго ўсё няма, дык нада схадзіць праверыць, а то ўдруг лазнік запарыў. Нельзя пускаць адных дзяцей.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Лясун

Лясун жывець у лесі. У яго длінныя рукі і кароткія ногі. Вушы ў яго бальшыя і паглядаюць уперад. Гэта, каб усё было чутно яму. Уместа валасоў на галаве веткі з лісцямі. Адзежа такжа з лісця. Усё врэмя ён ходзіць па лесу. Ён любіць гушкацца на ветках дзярэўяў. І вот калі ён сільна разгушкаўся, тады ўсе вярхі дзярэўяў калышуцца і шумяць. У такі час, хто каво і завець у лесе, усё роўна не дазавецца.

Аднажды быў такі случай са мной. З малой дочкай я пашла ў лес. Была спакойна і ціха ў лясу. Мы сабіралі ягады. Сабраліся іці дамой, а куды пайці – не знаю. Рашыла іці прама. Трохі прайшлі, гляжу – не туды. Дочка гаворыць, што нада іці ў другую сторану. Сначала я яе не паслухала, а патом сагласілася. Прайшлі мы трохі і дарогу ўбачылі. После дочка расказала, што ёй дарогу паказаў нейкі дзядок у зялёных лісцях. Ён ішоў спераду, а послі ісчэз.

Ён хазяін леса. Раней я часта на ахоту хадзіў, цяпер ужо стары стаў, ногі не тыя. Дык вот, пойдзець у лес, а там то зайца прыстрэліш, то звера пабольш, але каб вдалося прыстрэліць каго-небудзь, трэба дазвол лесуна. Калі ён не захоча, дык ты нават і не пабачыш ніводнага звера. Не любіць ён, каб на пянькі ў лесі садзіліся – гэта ягонае месца, там ён адпачывае. Лешы – гэта ж і ахоўнік лесу. Бувае і шуціць ён з людзьмі, але шуткі ў яго нядобрыя і нават злыя. Ну вот як бувае: заблудзіць чалавек в лесе і не можа выйсці, а лясун шуміць дрэвамі, гукае, нібы паказваючы дарогу назад, а аказваецца, наадварот, заводзіць у самую глуш. Тады вжо трэба ўпрошваць лесуна паказаць дарогу дадому, а калі не пакажаць, то блукалі да позняй ночы.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскай Ганны Андрэеўны, 1930 г. н.,
Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2004 г.

Лясун камандавае ў лесе, глядзіць за парадкам і не любіць, кагда людзі крычаць у лесе, порцяць дрэвы, грыбніцу. Лясун любіць збіваць з панталыку людзей, якія сабраліс іці ў лес.

Раз мы пашлі з мамай у лес па чарніцы. Збіралі разам, у адным месце, патом я адышла трохі, да шчэ, проста сама не хацела адходзіць, а тады там віжу многа ягад, аж усё сіня, і тады далей яшчэ больш. І вот я збірала доўга, тады ўстала – няма мамы. Я і туды кінулась, і сюды – няма. Я пачала званць маму, і яна потым учула,

тожа мяне заве, і я пашла на голас. І мне казалась, што то там адгукнецца, то ўжо ў другім месцы. Доўга хадзілі, але найшлісь. Мама гаварыла, што гэта лясун заблытаў мяне.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Русалка

У нашай дзярэўні шмат іх, бо блізка рака. Хто гэта такія? Дзяўчыны, што ўтоплі. Гавораць, яны вельмі прыгожыя, з длінными белымі валасамі і зялёнымі вачамі. Сама я іх не бачыла, да і не хачу, баюся. А хто б не баяўся? Гавораць, што ані маладых прыгожых хлапцоў зацягваюць в ваду. Яны дажэ інагда с вады выходзяць, па жыту гуляюць. Любяць яны слакатаць людзей. Бувала, ідзеш па жыце, а яно калышацца ва все бакі, дык гэта русалкі гуляюць. На дзеравах яны сядзяць, гушкаюцца на галінках і спяваюць тонкім і прыемным галасочкам, а галінкі дастаюць да вады. Дзеравы гэтыя растуць ля вады, дзе самыя глыбокія віры.

Калі хтосьці з людзей, асабліва маладыя хлопцы, пачуюць тыя песні ды пойдуць на голас, то дадому дарогу ўжо не знаходзяць. Русалкі іх забіраюць з сабой. Шчэ я чула, у русалак цела пакрыта луской, як у рыбы, на месцы ног – хвост.

А рыбакі расказвалі, што выварочвала яна іх сеткі, сувала ў сеткі ўсякі бруд. Бувала і пыталась дажэ патапіць людзей, пераварочвала лодку. Каб збавіцца ад русалак трэба перахрысціцца або намаляваць крэст на зямлі, яны гэтага вельмі баяцца і хуценька збягуць.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскай Ганны Андрэеўны, 1930 г. н.,
Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2004 г.

Русалкамі становяцца маладыя ўтопленіцы-дзеўкі, якіх не маглі знайсці. Самі русалкі красівыя, з длінными валасамі, замест ног у іх хвост, у косы свае яны ўсоўваюць кветкі, каб быць красівымі. Яны могуць вадзіцца не толькі ў вадзе, але і ў жыце.

Калі русалкі ў жыце жывуць, дык у галаве ў іх вянкі з васількоў. Русалкамі дзяцей пужалі, калі яны не слухаюць, а лезуць таптаць жыта, а маці не хоча, каб тапталі, дык кажа: «Вунь, русалка там!» Пужалі так. Калі русалка жыве ў вадзе, то яна можа зацягнуць цябе ў ваду, потым можаш не выйсці і ўтапіцца. Русалкі прыгожыя, і многія не думаюць, што яны могуць абмануць, задурыць галаву.

Асобенна, калі вечарам прыдуць хлопцы купацца, можа паказацца ім русалка, яна будзе загаворваць тады таго хлопца, можа папрасіць, каб сарваў ліляю, якая расце далёка ў вадзе. Хлопец паверыць, паплыве і можа аказацца, што цвет далёка ці яго зусім няма, і не будзе сіл назад даплыць, і ён утопіцца, а русалачкі толькі будуць хіхікаць.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Чорт – гэта нячысцік. Ён невялікага росту з доўгім хвастом, рукі і ногі доўгія. На канцах кіпці. Цела пакрыта чорнай шэрсцю, на галаве вострыя вушы і рогі. Выраз твару заўсёды ў злобнай ухмылцы. Ён нічога харошага не дзелае людзям. Дзе ён ні паявіцца, там усягда сварка, праклёны, бойка. А чорту гэта нравіцца.

Былі случаі, кагда чорт збіваў мужыкоў з правільнай дарогі. Вось едзе выпіўшы мужык па воду, дрэмле, конь ціха ступае. Праз нейкі час мужык прасынаецца, а конь стаіць распрэжаны ў незнакомым месцы. Усё гэта чортавы прадзелкі.

Шчэ расказуюць, што калі паміраюць людзі, то некаторыя пападаюць у рай, а некаторыя ў пекла. Дык вот пекла – гэта там, дзе чэрці жывуць, і туда пападаюць грэшнікі. Дак чэрці іх паджарываюць на скавародках. А праведныя пападаюць у рай.

Бабуля расказвала, што ніколі нельга, седзячы на лаўцы, матаць нагамі, бо казалі, што гэтым ты калышаш чортавых дзяцей. Яшчэ чорт можа ператварацца ў людзей, жывёл. Кажуць, калі добры чалавек становіцца злым, пачынае піць, б'е жонку і дзяцей, то ў яго чорт усяліўся.

Але як і ўсе нячысцікі, чорт баіцца малітвы і краста. Ён тады адразу знікае.

Запісана ў в. Страдубка Лоеўскага р-на
ад Бартнеўскай Ганны Андрэеўны, 1930 г. н.,
Бартнеўскага Дзмітрыя Паўлавіча, 1930 г. н., 2004 г.

Хлеўнік

Хлеўнік – гэта істота, якая жыве ў хляве, у сараі. Ён смокча карову, і тады яна не дае багата малака. Можа карова захварэць ад гэтага, не браць есці, піць не хацець. Калі ў хляве хлеўнік, то карова ня хоча захадзіць у хлеў, баіцца яго. Трэба пасля таго, як падоіш карову перахрысціць яе. А калі ў каня грыва заплецена, ды так, што нельзя расплесці, то гэта ласічка заплятае яе. Можа быць ласічка і беленькім, і рабенькім маленькім, тоненькім звярком. Хлеўнік можа заганяць каня ноччу так, што той назаўтра не можа нічога рабіць, можа нават захварэць і здохнуць.

У нас было такое, дык гавораць трэба ў кутку ўтыркнуць пасвечаную вярбу, папырскаць сарай свяцонай вадой, а калі толькі прыдзеш з цэрквы на Вербніцу, то адразу ісці і пабіць жывёлу гэтай асвечанай вярбой, жывёла не будзе тады хварэць.

Запісана ў в. Каўпенъ Лоеўскага р-на
ад Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Ведзьма

Мама расказвала, як брат хадзіў гуляць, яшчэ да вайны было. Мы дома былі, а ён пайшоў гуляць. Гуляў доўга, калі ішоў дамоў было ўжо позна. А ўслед за ім свіння бяжыць. Ён пабег быстрэй дамоў, ускочыў у сенцы. Нас пазваў, кажа: «Глядзіце, якая свіння за мной бегла». А гэта, мама гаварыла, ведзьма была. Ператварылася ў калясо, не хацела, каб ён з той дзеўкай гуляў.

Запісана ў в. Каўпенъ Лоеўскага р-на
ад Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Калі жанчына няверуюшчая і мела стасункі з нячыстай сілай, то яна становіцца ведзьмай.

Еслі ў дварэ акажацца нейкі незнаёмы прадмет – яйцо, каструля або штосьці другое, то гэта падкінула ведзьма, каб нічога не вялося. Еслі знаходзіш гэтыя вешчы, то нельзя браць голымі рукамі, а іх трэба аднесці і ўтапіць. Ці яшчэ можна выйці на перакростак і закапаць, і калі будзеш закапваць, то той чалавек абязацельна праявіцца. Будзе праходзіць там ці ехаць, гэтае месца як бы прыцягвае яго. Падкідвае ведзьма гэтыя рэчы для таго, каб увесь твой ураджай пераходзіў ёй, каб у цябе нічога не радзіла і нічога не ладзілася.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Вайцяшэнка Ганны Фядосаўны, 1923 г. н., 2004 г.

Вадзянік

Мой бацька расказваў, што калі быў маладым хлопцам, аднойчы пайшоў з сябрамі позна вечарам на раку купацца. На беразе распалілі вогнішча, пакупаліся ў цёплай вадзе, нагрэтай за дзень, і пачалі балавацца. Усе падлеткі любяць пасваволіць. Смяяліся, крычалі, прыгалі праз касцёр. І тут з кустоў выйшаў нейкі дзед худы, малы, чорны ад гразі, увесь у якіхсьці лахмоццях і кажа: «Сціхніце, паршыўцы!» Але хлопцы не паслухаліся, яшчэ мацнейшага нарабілі голасу, дражніліся, крыўляліся, рагаталі. Дзед ім прыгразіў і знік. А хлопцы працягвалі весяліцца. І тут пачулі нейкі страшэнны крык. Прыслухаліся. Крык змяніўся на рогат, потым на плач. Вогнішча нечакана затухла, нібы і не было яго. Раптам стала ціха-ціха, і толькі быў чуцен плёскат па вадзе, нібыта хтосьці велічэзны плыве прама да іх. Хлопцы перапужаліся і кінуліся уцякаць. Ім здавалася, што нехта гоніцца па пятам і вось-вось схопіць. Прыбеглі ў вёску, ледзь перавялі дух. А раніцаю сустрэліся і прыйшлі да згоды, што гэта быў вадзянік. Відаць, яны парушылі яго пакой, і ён вырашыў іх пакараць, крыху папугаць, а калі б спаймаў, зацягнуў бы ў ваду і ўтапіў.

Больш хлопцы ноччу купацца не хадзілі на раку, баяліся.

Запісана ў в. Глушэц Лоеўскага р-на
ад Гулевай Соф'і Ільінічны, 2005 г.

Пра ведзьму

У нас быў такі случай. Была жэншчына. Усе казалі на яе: «Ведзьма, ведзьма». І вот перад Купаллем чалавек натапіў баню. І вот тая ведзьма пайшла ў баню, упала там, абы што гаворыць. За яе, на вуліцу. Ну, вот пашло, што ёй нада было ўрэд каму-то здзелаць, а яна пакаялася. І вот ёй што-та здзелалася. Суткі так было, а патом стала нармальна.

Ведзьма – гэта жанчына, мурзатая, згорбленая, як клубок, з чорнымі заплутанымі валасамі, у белай адзежы.

Матка расказвала, што калі пойдзеш гуляць і позна вяртаешся дамоў, пасля поўначы, можаш убачыць, як бяжыць-коціцца ведзьма, як клубок белы. Тады ўсе ўцякаюць. Яна можа сесці каму-небудзь на плячо і будзеш везці, дакуль яна захоча. Можа чалавека пакалечыць, задавіць.

Ведзьма можа накласці на чалавека закляцце. Мая цётка расказвала вось такую гісторыю. Прыехаў у дзярэўню пагоршнік. Гэта чалавек, які робіць гаршкі з гліны і ездзіць па вёсках і іх прадае. Дык вось, прыехаў ён у дзярэўню, а ўжо было пад вечар.

Папрасіўся ён заначаваць у першым двары на яго шляху. Яго пусцілі. Пагоршнік паставіў воз з гаршкамі цёмначы ў двары, павячэраў, і тут жа, ля возу, лёг на сена адпачываць, каб гаршкі не пакралі. А ў гэтую ноч у гаспадароў дома нарадзілася дачка. Пагоршнік прачнуўся ноччу нечакана і бачыць, штосьці белае падышло да вакна і кажа: «Пражыць табе, дзяўчо, 18 гадкоў, а будзеш ісці замуж, то ўтопішся ў калодзежы».

Пагоршнік вельмі перапужаўся, не мог шалахнуцца, і праляжаў так да самай раніцы. І, канечне ж, расказаў усё, што бачыў і чуў гаспадару дома.

Прайшоў час, дзяўчынка вырасла. Ёй споўнілася 18 гадоў, сабралася ісці замуж за каханага. А бацька памятаў, што расказаў яму пагоршнік 18 гадоў назад і баяўся гэтага моманту.

У дзярэўні быў адзін-адзіны калодзеж, і калі дачка выходзіла замуж, калодзеж абвязалі, крышкай накрылі, забілі. І што толькі не рабілі, а дзяўчына ўсё роўна ўтапілася. Якаясь чорная сіла цягнула яе туды.

Дык вось я думаю, што гэта ведзьма прыходзіла пад дом і пракляла дзіця, каб пакараць бацькоў за штосьці.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Крамар Домны Сцяпанаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Мой дзядзька расказваў, што ведзьма можа быць чорнай кошкай.

Аднойчы, калі ён позна вяртаўся дамой з поля, да яго пад ногі выскачыла кошка і пачала кусацца, шыпець. Дзядзька адкідваў яе, але кошка прычапілася намертва і да самай хаты не адпускала, нават у сенцы забегла. Тады ён вышвырнуў яе на ганак і сказаў: «Ідзі адкуль прыйшла». А кошка там доўга яшчэ лязгала чымсьці, дзерлася ў дзверы і выла дзіўна, як чалавек. А бацька дзядзькі сказаў, што трэба было заламаць гэтай кошцы лапу, а назаўтра пабачылі б, хто ў дзярэўні ходзіць з паламанай рукой ці нагой.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Марчэўскага Рыгора Сямёнавіча, 1935 г. н., 2005 г.

Была ў нашым сяле адна вядзьмарка. Мы дажа з ёй дружылі. Зразу я яе баялася, яна ета замеціла і кажа: «Ты мяне не бойся, я табе нічога плахога не зраблю».

У мяне ды каровы ўсё не вяліся, вот і той вясной здохла ў мяне карова. А ў суседнім сяле хадзілі чуткі, што хазяін маладую карову хоча на мяса перавесці, бо вельмі праціўная была карова, падаіць яе вялікіх трудоў трэ было. Вельмі ж нагамі білася. Малако харошае, а скаціна паганая. Ну, я Таццяне (так звалі вядзьмарку)

і кажу, так мол, і так, дзіця без малака не можа, а дзе купіць карову, не знаю. Ну, яна і кажа: «Купляй тую ў дзядзькі, не твае клопаты, няхай дзядзька прывядзе, ды толькі ў хлеў не ўводзіць, я сама».

Купіла я карову, прывялі да хаты. Та пабыла ў хляве яго мінут 20 і ўсё. Дзесяць гадоў жыла гэтая карова, якая ето была карова! Малако – адна смятана, а якая була рахманая! Болей у мяне такой каровы не було, во якая была сіла вядзьмарская. Кажуць, што яна і ў ваўчыцу магла пераўтварыцца, но я гэтае точна не знаю і не хачу напрасліну казаць. Дарма, што яе ўжо няма, для мяне яна была добрай.

Яна тады ўжо перад смерцю казала: «Жалка, што не магу табе нічога перадаць, бо няма ў цябе сілы, а калі няма сілы, то і словы ні да часа».

Вось такая была маладзіца. Дзядзька той, што карову ў яго купіла, усё дзівіўся, як гэта я карову такую цярплю. А я нічога яму не гаварыла, не трэ було.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Лысенка Валянціны Фёдараўны, 1935 г. н., 2005 г.

Гэта да вайны было. Мы ўсе дома сядзелі малыя, а брат пайшоў гуляць. Калі ішоў дадому, то ўслед за ім бегла свіння. Ён ўскочыў у сенцы і кажа: «Глядзіце, якаясь свіння бегла». А гэта не свіння, а ведзьма была. Яшчэ адзін расказваў, калі ён быў хлопцам: «Сяджу, – кажа, – з дзеўкай, аж каціцца арбуз». Ён узяў палку, ды палкай. А назаўтра, аказваецца, у адной бабы рука перабіта. А яна, аказваецца, ператваралася ў арбуз, не хацела, каб ён з гэтай дзеўкай гуляў.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Фядосенка Вольгі Аляксееўны, 1931 г. н.,
Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г

Дамавік

Дамавік – гэта той, якога вельмі цяжка заўважыць, але ж можна заўжды пачуць. Людзям ён паказвацца не любіць, але ж за намі назіраюць яны амаль усюды. Яны маленькіх памераў і засяляюцца толькі туды, дзе добрым чалавекам пахне. Не любяць яны хлусні і цёмных спраў. Калі чалавек дамавога не крыўдуе, яму пашанцавала, а калі ж нешта не так, пачынае ён паказваць свой нораў.

Гэтую гісторыю распявядала мне мая маці. Яшчэ даўно, калі былі ветраныя млыны, хадзілі ўлетку начаваць туды дзеці, якія такім чынам сцераглі іх ад злодзея. Вось і ў гэтую ноч, як заўжды сабраліся яны, чалавек пяць, у млыне, селі ў кружочак і пачалі гутаркі весці. А ноч на двары светлая, месяц з неба так і блішчыць. І пацягнулася ў нас размова аб розных нячысціках. Хто што расказваў, выдумляў, але ж мы разумелі, што гэта ўсё выдумкі. Удоваль нагаварыўшыся, пачало нас на сон браць. Леглі мы ўсе адзін да аднаго, каб цяплей было, і пачалі кожны свой сон чакаць. Прайшло некалькі часу. Хто ўжо спаў, аж падсопваў. А Акуліне не спалося. І тут пачала яна ўлаўліваць на слых нейкія незразумелыя гукі з вугла. Не паспела яна расштурхаць свайго суседа, як нехта над імі па балцы прабег, а я ляжу і нават дыхаць перастала. Пачалі прасынацца і астатнія. Глядзім, але нікога не можам убачыць у тым баку, дзе шорахі былі. А ўверсе кола было, якое ад вакна і месячнага святла асвятлялася. Чуем, нехта пайшоў да яго, тут раптам яно зашумела, загрукала, пакруцілася з хвілінку і зноў стала. Крокі пачуліся ад

тога кола ўверх да акна, дошкі пад ім так і стагналі, скрыпелі. Крокі сталі, вакол акна стала такая цішыня, што нават мы змаглі ўлавіць яго рытм дыхання. Потым праз хвілінку-дзве нешта хуценька пабегла к таму вуглу, адкуль усё пачалося, і раптам як закашляе нехта, быццам бы аўца якая – і ўсё знікла.

Мы ўсе пасля гэтага не маглі заснуць і ўсе з нецярпеннем чакалі раніцы, прыжаўшыся яшчэ бліжэй адзін да аднаго. І з гэтай пары кожнаму, хто не верыў у нячыстую сілу, прыйшлося прыняць за праўду.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Казлоўскай Людмілы Антонаўны, 1952 г. н., 2005 г.

У нас у дзярэўні гаварылі заўсёды, што калі ў хаце нядобра, часта хварэюць ці не ладзіцца што-небудзь, значыць, жыве ў хаце дамавік.

Дамавік плахі. Я не ведаю, які ён, бо ён нябачны. Уяўляю яго мышшу, якая жыве ў мяне пад печчу, дзе складваю дровы і трымаю ўзімку курэй.

Як у новую хату ідзеш на жытло, дамавіка звалі з сабой: «Дамавік, дамавой, я хазяін твой, а ты – мой памочнік. Я дамой – і ты са мной».

Дамавіка заўсёды трэба зваць з сабой у новую хату, бо ён можа пакрыўдзіцца і нарабіць шкоды.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Крамар Домны Сцяпанаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Я чула не раз, што дамавік ёсць у доме. Тады кажацца, што часы цікаюць. Прыслухаешся, яны ў адным вуглу цікаюць, тады ўжо ў другім, ну і гавораць, гэта дамавы. Гавораць добра, калі ёсць ён у хаце. Яго клікаюць:

Дамавой, дамавой,
Ідзі дамой,
Будзеш дом сцярэгчы.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Фядосенка Вольгі Аляксееўны, 1931 г. н.,
Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Дзядок

Нада было мне пекць паляніцы. Замесім і качаем, не ў воду мачаем рукі, а ў муку – называлісь паляніцы. Ета тожа к Дзядам пяклі. Ну, я ўчыніла і зрання, прыбегла ўжэ ўвечары, замясіла той хлеб. Стала я саджаць у печ, дык сын мой, яму гадоў два з палавінай было, і ён лезе ў дзяжу. Я прасіла, прасіла: «Не чапай!» Да нічога. Я рукі трошкі выцярла, за яго – на печ і к шэсці прывязала: «Сядзі, калі не слухаісся». Прывязала.

Ён плакаў, плакаў, а патом крычыць: «Баба, баба, дзед і к нам маленькі, сівенькі прыйшоў!» Тая пытае: «Так дзе ён?» А ён крычыць: «А тут!» А ў нас перагародка была, мы не маглі бачыць. «Так, а куды ён пайшоў?» Сын гавора: «На кут». – «А ціпер там?» – «Німа».

Калдун

Мне от мама расказувала. Быў чалавек, што вот як стукнуў па сталу: «Гавары праўду! Гавары праўду!» І стол падымаецца, апускаецца, падымаецца, апускаецца. Так было тут, у Казярогах.

Коцік

Мужыку майму так было. На конях работаў. Прыехаў з работы, загнаў коней і ідзе дадому. І вот – коцік. Хоча ўлупіць аброццю, а ён уцякае. Хоча ўлупіць паміж ног, нельзя іці. Метраў сто так. А далей, кажа, размахнуўся да трошкі захваціў. Дык ён адбег, ды сеў, да як зарагоча, як чалавек. Я, кажа, без памяці ўжо прыбег дадому.

Ласачка

То можа і быў хлеўнік. Ну, вот у нас глядзелі, якая ў сараі ласачка бегае, глядзі яе цвет: рабенькая ілі беленькая, чорная, значыць такую скаціну нада дзяржаць. Яна будзе весціс.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Казлоўскай Людмілы Антонаўны, 1952 г. н., 2005 г.

Яно, кажуць, карову смокча, і тады карова ў хлеў не заходзіць. А калі ў каня грыва сплецена, то кажуць, што ласічка заплятае яе. Гэта такі звярок беленькі, тоненькі, бывае рабенькі.

Запісана ў в. Каўпень Лоеўскага р-на
ад Фядосенка Вольгі Аляксееўны, 1931 г. н.,
Прымак Анастасіі Аляксандраўны, 1918 г. н., 2004 г.

Я не ведаю хлеўніка. Гэта ж ласка пуджае кароў у хляве. Яна, як кошка, з пушыстым хвастом. Скача па каровах, а яны яе баяцца, бо ласка іх слакоча. Каторая карова баіцца – аж дзярэцца на сцяну. У мяне нават збягала за дзярэўню, а як спаймаеш, у хлеў не хоча ісці.

Ласка можа паесці ці падраць курэй. Каб злавіць ласку, ставілі сіло (капкан).

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Крамар Домны Сцяпанаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Нечысць

Шчэ такое расказвалі. Аралі мужыкі трактарам на полі. Наперадзе балацянка. А там сталы стаяць пазасціланыя, столькі песень, столькі людзей. Завуць іх: «Хадзіце, хлопцы, вып'ем!» Яны думаюць: «Што ж ета такое?» Яны трактар заглушылі, перахрысціліся, дак як нічога і не было.

Прывід

А то, казалі, жэншчына была ў Міхалёўкі. Чэцвера дзяцей было ў іе. Да яна ўмерла. Да пачала хадзіць. Прыдзе, косы распусціць і калыша дзіця. Ну, дык дзед такі быў, Паўло. Лазіна якаясь спецыяльная ё, ну, шчэ слова якое-та знаў. А яна ўсё ідзе да наступае на тую лазіну. Ён іе падняў і кажа: «Ідзі, а то вот етае лазіны як сцёбну, дык будзе табе!» І яна перастала хадзіць.

Адзін чалавек і к скірдзе прыехаў, туды залез да задрамаў. Тут едзе з Мохава конем, топат. Я, кажа, ляжу. Яно пад'ехала, за ногі – цоп. Я, кажа, зноў залез. Яно зноў сцягне. Мужык кажа: «Захарка, хваце табе дурыць». Захарка – то быў сторажам. Яно ізноў. Цягне ў чацвёрты раз. Той ускочыў, перахрысціўся, няма-знаць, дзе што дзелася. Ён злез, нігдзе ні следу няма, ні капыта. Ну, кажа, я ўжэ і не заснуў, сон прайшоў.

Русалка

Русалка – гэта прыгожая вадзяная дзяўчына, якая жыве пад вадой у южнай старане ракі, пруда. Яны вельмі прыгожыя, валасы заўжды распушчаныя, пры тым розных колераў, але ж жанчыны іх не паважалі, і стараліся сваіх гаспадароў не пускаць адніх да вады, так як русалкі іх к сабе заманьвалі. Гэтаму сведчыць адна з гісторый пра плотніка Аўдзея.

У нас тады яшчэ, як вёсцка хутарам была, жыў малады, вясёлы, вельмі прыгожы плотнік. І вось аднойчы пайшоў ён па арэхі ў лес для сваёй каханай. Пайшоў дай і заблукаў. Хадзіў, хадзіў, Бог знае куды зайшоў, а тут ноч пачала збірацца. Вось ён і прысеў пад дрэва наступнага дня чакаць. Прысеў і задрамаў. Праз сон чуе, што нехта заве яго танюсенькім і прыемным галасочкам.

Адкрыў вочы Аўдзей, але нікога не прыкмеціў. Зноў пачало яго на сон браць – апяць нехта кліча. Адкрыў вочы, пачаў яго страх браць і тут перад ім – бац! Русалка на трэцяй гале ад кораня сядзіць і яго да сябе падклікае. А месяц-та высока і ясна свеціць на яе – усё відаць, нават яе ўбранне на шыі, хвасце. Уся яна такая светленькая, уся ў срэбры сядзіць на ветцы і пакачваецца. Аўдзей так і застыў на месцы, а яна ўсё хахоча ды й яшчэ яго рукой да сябе падзывае. Ён, што зачараваны, пачаў да яе падыходзіць і тут раптам ачнуўся і хуценька пачаў хрысціцца і казаць: «Згінь, нячыстая, згінь». І наўцёкі збірацца пачаў.

Русалка як залямантуе, як заплача. «Чаго ты, лясное зелле, плачаш?» – спытаў Аўдзей. Тая, нічога не адказаўшы, вырвала з сваёй галавы тры чырвоных валасы з наступнымі словамі: «Не захацеў быць са мной у вадзяных палацах – век табе ўсмешкі не адчуваць». Кінуўшы на яго тры валасы, плёснула аб дрэва хвастом і знікла.

З тых пор і сапраўды ніхто больш не бачыў вясёлага плотніка Аўдзея з усмешкай на вуснах.

Запісана ў в. Малінаўка Лоеўскага р-на
ад Казлоўскай Людмілы Антонаўны, 1952 г. н., 2005 г.

Ці ёсць русалкі, ці не – я не ведаю, а вось расамаху бачыў сваімі вачыма. Гэта нечысць, падобная на жанчыну з распушчанымі валасамі, якая пры жыцці забіла сваё дзіцятка, а сама ўтапілася.

Касіў я раніцай каля ракі траву. Рана добра касіць – трава мокрая ад расы, мяккая. Чую, зусім блізенька плача дзіця. Я да яго, а яно ўцякаць, я за лазу, а дзіця ў траву. Шукаю ў траве, а малое ўжо дзесьці ля ракі. Падкраўся, гляджу, а на беразе ракі голая жанчына сядзіць, трымае на руках маленькае дзіцятка і расчэсвае валасы. Я хацеў падысці блюжэй, а яна напэўна пачула, спужалася, схапіла немаўлятка і шабултых у ваду, аж бурбалкі пайшлі.

Калі прыйшоў дамоў, маці спытала, чаго я ўвесь вечар такі маўклівы, а я нічога не расказаў, бо ўсё роўна ніхто не паверыць. Я і сам ужо праз столькі гадоў не веру, можа прыснілася мне?

Запісана ў в. Глушэц Лоеўскага р-на
ад Куксы Астапа Трафімавіча, 1920 г. н., 2005 г.

Русалка – гэта страшэнная голая жэншчына з доўгімі валасамі. Як жыта на полі пачынае спець, яна там з'яўляецца. І гэтая нядзеля называецца русальнай.

Русалка пужае людзей. Калі каго паймае, то трохі пакудлашчыць. Як жыта саспее – уцякае ў лес, жыве там з рознымі нечыстотамі.

Запісана ў в. Сінск Лоеўскага р-на
ад Крамар Домны Сцяпанаўны, 1924 г. н., 2005 г.

Чорт

То расказваў пакойны дзед мой. Сын лясніком быў. Пайшоў сын гуляць, а бацька пайшоў дзяжурыць. І к яму нячыстая сіла прыйшоў: чалавек, толькі з рагамі. Расставіўся ля агня і стаіць, і рукі грэе. Той пачаў малітвы маліцца, дык ён нямазнаць, дзе дзеўся.

Запісана ў в. Казярогі Лоеўскага р-на
ад Карась Ксеніі Іванаўны, 1922 г. н., 2001 г.

Ведзьма

Раней былі ведзьмы і вельмі многа. Было шмат выпадкаў, калі людзі расказвалі пра ведзьм. У нас у вёсцы быў такі выпадак. Ішоў позна вечарам чалавек дамой, вёў каня і ўбачыў, што сядзіць на паласе жанчына і робіць залом (ведзьма ломіць некалькі каласоў і кажа сваю малітву, потым ложыць іх на север, юг, захад і васток. Кладзе на вытаптанае ёю месца. Былі заломы на то, каб весь скот здох, або хваробы людзей...). Гэты чалавек здагадаўся, што гэта ведзьма. Тады ён падыйшоў і спытаў у яе, што яна робіць. А ведзьма адказала, што калі каму раскажаш, будзе табе худа. Яна была маладая, з распушчанымі валасамі і голая. Але мужчына гэты расказаў усё жонцы, жонка – саседцы, так слухі разышліся па ўсёй вёсцы. Тады гэты чалавек зразумеў, што ведзьма яму будзе за гэта помсціць.

Ён вырашыў пайсці к Хімчуку (чалавек, які мог знімаць заломы...). Хімчук яму адказаў, што калі будзеш ісці і табе ўпадзе на плечы каза, авечка, то цягні яе дадому і атрубі ёй ногі. А калі вечарам прыйдзе яна к табе, то вазьмі агнём або жарам і кінь у яе цень. Восенню, калі людзі ўсе сушылі пшаніцу, гэты чалавек таксама сушыў сваё жыта ў гумне. Было вельмі холадна, але ў гумне была печ. Вось вечарам ён чуе, што раздаўся свіст, і застукалі вароты. Ён прыслухаўся і пачуў шагі. Потым жаночы голас і кажа яму, каб ён выйшаў з гумна. Гэты чалавек не стаў згаджацца. Тады ведзьма стала яму пагражаць і сама пайшла ў гумно. І толькі яна адкрыла дзверы, як гэты чалавек схапіў галаўню і стаў біць ёю па цені ведзьмы. Яна з крыкам выскачыла. А на наступны дзень яна памерла.

Запісана ў г. п. Лоеў
ад Максіменка Анісіі Цімафееўны, 1911 г. н.
(нарадзілася ў в. Шчытцы Лоеўскага р-на), 1993 г.

Лідзія ДОЛБІКАВА

КРАЙ УЗНЁСЛЫХ ПЕСЕНЬ, КРАЙ МАЁЙ ЛЮБОВІ...

Культура Лоеўскага раёна мае сваю традыцыйную накіраванасць, звязаную з захаваннем тэатральнай і самадзейнай творчасці, народнага вакальнага мастацтва і развіццём народных рамёстваў.

Работа ўстаноў культуры, а іх у раёне 23, накіравана на выкананне рэспубліканскіх, абласных і раённых мэтавых праграм.

Пры сельскіх Дамах культуры і клубах дзейнічае 91 гурт мастацкай самадзейнасці. Займаюцца ў іх 890 удзельнікаў, палова з іх – у дзіцячых.

З задавальненнем жыхары Лоеўшчыны наведваюць вакальныя ансамблі і гурты: народны ансамбль народнай песні «Пралеска» Уборкаўскага, «Малінаўка» Малінаўскага, «Алеся» Бывалькаўскага сельскіх Дамоў культуры, вакальныя гурты «Вербіца» Сяўкоўскага СДК, «Девчата» Ліпнякоўскага сельскага клуба, «Вячоркі» Крупейскага сельскага клуба, «Днепрянка» Страдубскага СДК, «Суседкі» Каўпенскага СДК, «Свята» Пярэдзелкаўскага СДК, дзіцячы вакальны гурт «Ліхтарык» Сяўкоўскага сельскага Дома культуры, танцавальныя калектывы «Надзея» Уборкаўскага СДК, «Танок» Каўпенскага СДК, «Юность» і «Лялькі» Пярэдзелкаўскага сельскага Дома культуры. Нямала аматараў і ў драматычнага калектыву «Лик» Малінаўскага сельскага Дома культуры. Радуюць сваёй творчасцю «Усмешка» Страдубскага СДК, «Калейдаскоп» Крупейскага сельскага клуба, а таксама дзіцячыя гурты «Радуга», «Лявон», «Раніца» Страдубскага, Бывалькаўскага, Ручаёўскага сельскіх Дамоў культуры, рок-клуб «Возрождение» раённага Дома культуры.

Найбольш адметныя фальклорныя калектывы: «Калінушка» Дзімамеркаўскага, «Сударыня» Дзяражыцкага, «Дубравушка» Каўпенскага СДК, народны фальклорны гурт «Лутава» Сяўкоўскага сельскага Дома культуры, а таксама ансамблі народных інструментаў: «Жалейка» Уборкаўскага сельскага Дома культуры, «Мужыкі» Лоеўскага раённага Дома культуры.

Фальклорны гурт «Лутава» быў створаны ў 1987 годзе. Тамара Сяргееўна Шапавал – яго арганізатар і нязменны кіраўнік. Сваю назву калектыў атрымаў па найменню жывапіснай вёскі Лутава, якая размясцілася ў міжрэччы. Спяваюць у гэтым калектыве сем жанчын сталага ўзросту. Рэпертуар складаюць тыя песні, што захавала памяць, – колішнія песні бабуль і матуль. Ансамбль удастоены звання «народны», прымаў удзел у заключных мерапрыемствах II Усебеларускага фестывалю народнай творчасці «Беларусь – мая песня» ў Мінску.

Ансамбль народнай песні «Жывіца» быў створаны ў 1979, а ў 1985-м годзе яму было прысвоена званне «народны». З'явіўся ён дзякуючы намаганням вялікага энтузіяста самадзейнай сцэны Валянціны Уладзіміраўны Берасневай. Сама яна пачала спяваць яшчэ са школьных гадоў. Загадвала хатай-чытальняй у вёсцы Новая Баршчоўка, вучылася ў Ленінградскай культасветнай школе, але сэрца зноў паклікала яе на родную Лоеўшчыну.

46 гадоў творчай працы! Бераснева кіравала харавым калектывам, вакальным ансамблем, агітбрыгадай. Дапамагала і самадзейным калектывам райбальніцы, «Сельгастэхнікі», «Сельгасхіміі», аказвала практычную дапамогу сельскім калектывам у падборы рэпертуару, апрацоўцы абрадавых дзействаў той мясцовасці, дзе працавалі фальклорныя гурты. Валянціна Уладзіміраўна надавала вялікае значэнне сустрэчам з носьбітамі фальклору, ад якіх і рэканструявалі розныя абрады, у прыватнасці, ваджэнне русалкі.

На змену Валянціне Берасневай прыйшоў вялікі аматар самадзейнага мастацтва, вопытны музыкант Пётр Іванавіч Бондар.

У выступленнях творчых калектываў нашага раёна ўвасоблены і вясёлка летняга дня, і яркія фарбы палеткаў і сенажацяў, і духмяны водар лесу, і плёскат дняпроўскіх хваляў... Усе гукі і рытмы сівой мінуўшчыны і сённяшняга дня.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці – жаданыя і ганаровыя госці раённых і абласных фестываляў, абласных аглядаў-конкурсаў народнай творчасці, адзначаны шматлікімі граматамі і дыпломамі. Але найдаражэйшая ўзнагарода для артыстаў з народа – гэта ўдзячнасць сваіх аднавяскоўцаў, землякоў. У гэтым яны і чэрпаюць натхненне.

У раёне дзейнічаюць 33 клубы па інтарэсах, з іх больш паловы – дзіцячыя. Работа з дзецьмі і моладдзю – адзін з асноўных і перспектыўных накірункаў дзейнасці ўстаноў культуры.

Развіццю грамадскай актыўнасці моладзі садзейнічаюць аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах: маладой сям'і «Я + Ты» Каўпенскага, «Здоровье» Сяўкоўскага, «Диско-клуб» Пярэдзелкаўскага СДК, маладзёжны «Іван-ды-Мар'я» і спартыўны клуб «Геркулес» Уборкаўскага сельскага Дома культуры, дзіцячыя клубы «Піліпка» і «Спадарожнік» Сяўкоўскага сельскага Дома культуры, «В гостях у Алеси» – Лоеўскага раённага Дома культуры і інш. Займаюцца ў гэтых і іншых грамадскіх аб'яднаннях 513 чалавек, з якіх больш паловы – дзеці і падлеткі. Ёсць і 7 дзіцячых гурткоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якіх займаецца 68 вучняў.

Пры бібліятэках раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы дзейнічаюць 16 клубаў па інтарэсах, у 12-ці з якіх займаюцца дзеці. Бібліятэкары таксама прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна, ва ўсіх культурна-асветніцкіх мерапрыемствах: выпускаюць баявыя лісткі – «маланкі», разам з клубнымі работнікамі праводзяць Дні культуры на фермах, палявых станах. Культработнікі ўстаноў культуры ўдзельнічаюць у акцыях «Добраўпарадкаванне вёскі – справа кожнага».

Любоў да сваёй гераічнай зямлі, гонар за яе герояў – найбольш актуальная тэматыка работы клубных устаноў. Гэтаму былі прысвечаны раённыя культурныя акцыі: фестываль народнай самадзейнай творчасці «Песни юности наших отцов и дедов» і «Грай, гармонік», свята ў гонар 60-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Гэта нам забыць нельга».

Музей бітвы за Днепр з'яўляецца навукова-даследчай і асветніцкай установай аддзела культуры, мае ваенна-гістарычны профіль, які і вызначае накірункі яго

дзейнасці – патрыятычнае выхаванне моладзі і школьнікаў не толькі свайго раёна, але Гомеля і вобласці. Музейныя работнікі праводзяць экскурсіі па памятных мясцінах Лоеўшчыны. З нядаўняга часу сталі ажыццяўляцца турыстычныя маршруты на цеплаходзе па Дняпры да вёскі Крупейкі, дзе ў кастрычніку 1943-га пачыналася фарсіраванне славутай славянскай ракі. Ладзяцца і водныя экскурсіі ў дуброву Вербуж, на левабярэжжы.

З дапамогай сельскіх культработнікаў прайшлі святы Масленіца (Уборкаўскі сельскі Дом культуры), Купалле (Малінаўскі сельскі Дом культуры), Зажынкі (Пярэдзелкаўскі сельскі Дом культуры), а таксама такія культурна-масавыя мерапрыемствы, як тэатралізаванае прадстаўленне «И выстояли, и победили» (Страдубскі сельскі Дом культуры), спартыўна-маладзёжная праграма «Марафон в страну здоровья» (Каўпенскі сельскі Дом культуры), вечар для працаўнікоў вёскі «Тепло души никогда не туши» (Ручаёўскі сельскі Дом культуры).

Цікавымі з'яўляюцца паданні, звязаныя з паходжаннем нашага гарадскога пасёлка. У летапісных крыніцах Лоеў упамінаецца яшчэ ў 1505 г. як «Лоева гара». Аднак многія вучоныя ўпэўнены, што гэта ўсходнеславянскае пасяленне існавала тут яшчэ намнога раней – у XI – XIII стст.

Адна з версій паходжання назвы Лоеў звязана са словам «лой» – тлушч. Магчыма, купцы, якія плылі па Дняпры, спыняліся ў гэтым месцы, каб папоўніць запасы ежы, і бочкі з лоем захоўвалі на прыстані.

А, магчыма, назва сучаснага райцэнтра пайшла ад слова «лойва» – човен для некалькіх вандроўнікаў, ці ад імя Лой – заснавальніка паселішча.

Аналагічныя назвы сустракаюцца і ў Расіі, і Украіне. Таму не выключана, што перасяленцы з Валыні, Падоліі, Галіцыі з'явіліся тут ужо ў перыяд Кіеўскай Русі.

У 2005-м г. Лоеў адзначыў свой 500-гадовы юбілей. Напярэдадні гэтай даты прайшла раённая прапагандысцкая акцыя «Мой горад, маё жыццё», праводзілася шмат мерапрыемстваў пад дэвізам «Мой горад вечна малады».

Наш гарадскі пасёлак над Дняпром усё прыгажэе, дзякуючы працавітым, добразычлівым людзям, якія жывуць тут, кахаюць, нараджаюць дзяцей, будуюць дамы, вядуць гаспадарку, вырошчваюць хлеб, саджаюць скверы і паркі.

Мы любім свой Лоеў і лічым, што няма ў свеце больш прыгожай мясціны. Тут чуеш рэха стагоддзяў, з'яўляешся сведкам непарыўных славянскіх сувязей, якія ва ўсе часы дапамагалі нашым народам адольваць ворага, падпітваць роднасныя культуры такімі падобнымі вобразамі, мелодыямі, традыцыямі.

Жыві і квітней, мой Лоеў!

Людміла Генадзьеўна ***МЕЛЬНІКАВА***

ФАЛЬКЛОРНАЯ СПАДЧЫНА – НЯСПЫННАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Мы – сучасныя людзі, але захоўваем легенды, паданні, казкі, звычаі, абрады, часам не ведаючы, адкуль яны бяруць свой пачатак. А звязаны ён з міфалогіяй. І зараз на Лоеўшчыне ў густых лясах, ва ўрочышчах, у жыце, на берагах глыбакаводнага Дняпра можна пачуць «далёкія галасы мінулых эпох», песні русалкі ў час выканання абраду яе праводзін:

Павяду русалку з лесу,
Рана-рана з лесу,
З лесу да ў ядронае жыта,
Вот там русалцы і жыці.

Ад той старажытнасці засталіся «русалкіны сцяжынкі», якія яшчэ захавала людская памяць. У Лоеўскім раёне да сённяшняга дня захаваліся ўспаміны пра прыгожы і паэтычны вобраз русалкі. Калісьці ён бытаваў у Лоеве, вёсках Бывалькі, Дзяражычы, Дзімамеркі і інш.

Праблема сувязі эпох заўсёды была адной з самых галоўных і вызначальных для людзей. Што мы сёння шукаем у нашым мінулым? Чаму мы так пільна ў яго ўзіраемся? Чаму так карпатліва і беражна збіраем народныя скарбы?

Легенды, паданні, казкі, каляндарныя святы і абрады – самыя далёкія галасы мінулых эпох, якія даходзяць да нас сёння і звязваюць кожнае новае пакаленне з пачатковымі вытокамі нашай гісторыі. І гэта не выпадкова, бо ў вуснай народнай традыцыі ўтрымліваюцца цікавыя прыкметы і павер'і, звязаныя з нараджэннем, вяселлем і пахаваннем.

Адраджэнню святаў, а таксама народных рамёстваў у іх нацыянальна-самабытных формах (лозапляценне, саломапляценне, разьба па дрэве, ткацтва, вышыўка) садзейнічала вялікая работа аддзела культуры, метадычнага цэнтра народнай творчасці, раённага і сельскіх Дамоў культуры, клубаў, бібліятэк. Яна праводзілася згодна з раённай праграмай «Жывая памяць Лоеўскага краю». У ходзе яе рэалізацыі былі сабраны і запісаны матэрыялы па краязнаўству, фальклорныя творы, апісаны колішнія каляндарна-земляробчыя, сямейна-абрадавыя святы.

Своеасаблівым зводам цікавых архіўных і краязнаўчых матэрыялаў, якія захоўваюцца ў клубных установах, бібліятэках, з'яўляюцца летапісы вёсак і гаспадарак. У раёне складзена картатэка назваў рэчак, урочышчаў, населеных пунктаў, якія зараз не існуюць.

У раённым метадычным цэнтры народнай творчасці маюцца картатэкі інфарматараў-носьбітаў колішніх свят і абрадаў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Пры Уборкаўскім сельскім Доме культуры вось ужо сем год дзейнічае цэнтр народных рамёстваў. Яшчэ да яго стварэння з 1986 года тут пачало сваю работу аматарскае аб'яднанне «Пакой майстроў», якім кіраваў У. Р. Бабраўнічы – дырэктар вышэйназванага Дома культуры. Гэта вельмі таленавіты чалавек. З дзяцінства ён любіў спяваць, маляваць, з'яўляецца актыўным удзельнікам мастацкай самадзейнасці (стаяў ля вытокаў стварэння народнага ансамбля народнай песні «Пралеска», ансамбля народных інструментаў «Жалейка» і іншых калектываў мастацкай самадзейнасці Дома культуры, неаднаразова ўзнагароджваўся дыпломамі і граматамі).

Члены аматарскага аб'яднання «Пакой майстроў» займаліся разьбой па дрэве, пляценнем кошыкаў, жывапісам, рабілі рэчы з металу. На базе гэтага аб'яднання праводзіліся раённыя і абласныя семінары работнікаў культуры. Сярод лепшых майстроў-метадыстаў у раёне можна назваць Міхаіла Чарнавокага, Мікалая Трума, Яўгена Жарына, Валянціну Бярнацкую.

Адзначым, што і зараз у цэнтры рамёстваў падтрымліваюцца гэтыя традыцыі. Вядзецца работа па шматлікіх накірунках: выяўленне майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і вывучэнне рамесніцкіх традыцый на Лоеўшчыне, арганізацыйна-метадычны працэс па адраджэнні традыцыйных тэхналогій, арганізацыя выстаў, аўкцыёнаў вырабаў майстроў і іх вучняў, правядзенне «Дзён адчыненых дзвярэй».

Адраджэнне народнай творчасці – няспынны працэс. Гэта і работа з народнымі майстрамі, творчая сувязь паміж навучэнцамі і майстрамі-метадыстамі, якія забяспечваюць стабільную работу класаў саломапляцення, лозапляцення, а таксама вучаць разьбе па дрэве, ганчарнай справе, жывапісу. Слоў удзячнасці заслугоўваюць майстры-метадысты Уладзімір Бабраўнічы, Вячаслаў Жук. На змену апошняму ў свой час прыйшоў Фёдар Блізнец.

Вельмі таленавіты майстра і Валянціна Бярнацкая. Яна пляце з лазы кошыкі, вазы, куфэркі, займаецца саломапляценнем, вышыўкай, макрамэ, валодае сакрэтамі па набіванні дываноў. Майстар Наталля Чубрава натхнёна перадае вучням уменне выконваць інкрустацыю саломкай. Людзі старэйшага ўзросту дзеляцца сваім вопытам з маладымі. Гэта і ёсць пераемнасць пакаленняў. І ў рамесніцкім цэнтры кожнаму знаходзіцца справа па душы. Мабыць таму, многія вучні звязваюць сваё жыццё ў далейшым з народнай творчасцю і выкарыстоўваюць набытыя веды ў паўсядзённым жыцці: упрыгожваюць уласны дом, акружаюць сябе і сваіх блізкіх неабходнымі ў побыце вырабамі, якія радуюць вока.

Многія з таленавітых юнакоў і дзяўчат закончылі спецыяльную ўстанову «Гомельскі дзяржаўны каледж народных мастацкіх промыслаў» і зараз прымяняюць сваё ўменне на практыцы.

Калектыў цэнтра рамёстваў прымаў актыўны ўдзел у абласным аглядзе-конкурсе народнай творчасці «Адраджэнне і творчае развіццё нацыянальнай спадчыны» і ўпраўленнем культуры Гомельскага аблвыканкама быў узнагароджаны дыпломам II ступені, а таксама заахвочаны грашовай прэміяй.

Майстры-метадысты цэнтра адзначаны на міжнародных, рэспубліканскіх, абласных конкурсах і фестывалях дыпломамі і граматамі.

Мінае год за годам. Мяняецца ўсё, а народнае мастацтва застаецца вечным.

Вера ГЕНАШ

ІХ НАРАДЗІЛА ЗЯМЛЯ ЛОЕЎШЧЫНЫ

З далёкага мінулага бярэ літаратурная Гомельшчына свае вытокі, з тых часоў, калі шматграннае духоўнае жыццё народа знаходзіла сваё адлюстраванне ў яго, на дзіва, багатым і цікавым фальклоры (народных песнях, казках, прыказках, паданнях і інш.), які доўгія стагоддзі служыў галоўным сродкам выяўлення народных дум і спадзяванняў, адлюстравання своеасаблівага развіцця беларускай нацыі. Менавіта ў фальклоры крыюцца і вытокі той багатай духоўнай спадчыны, якую пакінулі нам літаратурныя і грамадскія дзеячы старажытнасці. З'яўляючыся выразнікамі дум народных, яны ўзнімалі актуальныя для свайго часу праблемы, клапаціліся аб заўтрашнім дні «паспалітага люду».

На літаратурным небасхіле старажытнай Гомельшчыны ярка вылучаецца асоба Кірылы Тураўскага, які ўвайшоў у гісторыю даўняй літаратуры як майстар урачыстага царкоўнага красамоўства. Яго творчасць, асабліва «Словы», карысталася папулярнасцю, іх перакладалі амаль да XIX ст.

У пазнейшы час мастацкая літаратура на Гомельшчыне (аж да рэвалюцыі) была прадстаўлена надзвычай сціпла. Адметнай з'явай у літаратурным жыцці Гомеля канца XVIII ст. з'явілася дзейнасць Кулябкі-Карэцкага, у вершах і артыкулах якога гучалі матывы сатырычнага выкрыцця чыноўніцтва, бюракратаў, членаў гарадской управы і думы.

Найбольш плённае развіццё, станаўленне творчай індывідуальнасці пісьменнікаў Гомельшчыны прыпадае на перадваенны (М. Грамыка, Р. Сабаленка, Ул. Дадзіёмаў і інш.) і ваенны час. Прыгадаем, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў радах барацьбітоў знаходзіліся яе лепшыя сыны, выдатныя прадстаўнікі літаратуры – Іван Мележ, Іван Шамякін, Іван Навуменка, Андрэй Макаёнак, Мікола Сурначоў, Міхась Даніленка і інш.

Пра асобу Міхася Пятровіча Даніленкі – прадстаўніка Лоеўшчыны – як пісьменніка-празаіка можна сказаць словамі аднаго з яго герояў: «Знайсці работу па душы. І каб адну – на ўсё жыццё». Менавіта гэтаму запавету верны Міхась Даніленка і сёння. Сведчаннем таму з'яўляюцца яго апавяданні і аповесці, творы для дзяцей. Яго пісьменніцкі голас шчыры, светлы, як крыніца, разважлівы, як пошум восеньскага лесу.

Нарадзіўся М. П. Даніленка ў вёсцы Ястрабка. Калі будучаму пісьменніку споўнілася тры гады, бацькі пераехалі на новае месца жыхарства ў пасёлак Бодры (селішча, якое часам называлі Княжамі. Кажуць, некалі там жыў князь).

Закончыў Баршчоўскую школу-сямігодку, вучыўся ў Рэчыцкім педвучылішчы, дзе далучыўся да мастацкага слова, адчуў радасць першай публікацыі ў мясцовай газеце «Зара камуны». У гады вайны – кароткая вучоба ў запасным палку (аж у Казахстане), баі на Харкаўскім напрамку. У 1942 годзе быў кантужаны, трапіў у палон, адкуль уцякае, і з 1944 года – у дзеючай арміі. У галодным 1945-м вярнуўся ў родныя мясціны, працаваў у Казярожскай сямігадовай школе, затым была завочная вучоба ў Гомельскім педінстытуце імя В. П. Чкалава. З 1952 года і да выхаду на пенсію – работа ў рэдакцыі газеты «Гомельская праўда». Зараз жыве ў Гомелі, знаходзіцца на заслужаным адпачынку.

З пачатку літаратурнай дзейнасці (1952 г.) з-пад пяра Міхася Пятровіча выйшла шмат зборнікаў прозы («Вернасць слову», «Майская навальніца», «Зачараваны гарлачык», «На вуліцы Сонечнай», «Наш дом», «Запаветны акіян», «Маці Мар'я», «Журлівіца», «Ключы бабулі-зімы» і інш.). Асобныя творы нашага земляка друкаваліся ў перакладах на латышскую, украінскую, польскую мовы.

У цэнтры ўвагі пісьменніка – просты чалавек з яго клопатамі і турботамі, чалавек, улюбёны ў працу, прыроду, родныя краявіды. Адчуваецца добрае веданне жыцця «малой» радзімы, якое арганічна спалучаецца з філасофскім асэнсаваннем вялікіх і незабыўных падзей вайны, сведкам і ўдзельнікам якіх быў сам пісьменнік, з вострымі і надзённымі праблемамі сучаснасці. Асабліва прыцягвае нашу ўвагу зборнік «Наш дом». Людзі заўсёды радуюцца новым дамам, у якія засяляюцца, з нецярплівасцю чакаюць наваселляў. У святочным настроі і настаўніца Ганна Макараўна Раеўская – чалавек шчырага сэрца, прыгожай душы. Заслужаная настаўніца пакутуе ад таго, што яе сын вырас не зусім прыстойным чалавекам. Ды праца вылечвае кожнага, гоіць раны. Факт яе жыватворнай сілы і сцвярджае М. Даніленка ў большасці сваіх твораў.

Падчас нашай сустрэчы з пісьменнікам я спытала, якіх твораў у Міхася Пятровіча больш – для дзяцей ці для дарослых? Ён адказаў: «Цяжка вылучыць, бо многія з іх, напісаныя спачатку для дарослых, увайшлі ў дзіцячае чытанне і наадварот. Мне здаецца, што пісаць для дзяцей – не толькі вялікае шчасце, але і вялікая адказнасць, бо хоць чытач і маленькі, а запатрабаванні ў яго вялікія» (Запіс нашай гутаркі з пісьменнікам ад 18 мая 1993 года).

І вось за такую нялёгкую, адказную працу і ўзяўся ў свой час Міхась Даніленка, які знайшоў ключык да сэрцаў дзяцей, а гэта – самае важнае для пісьменніка. У творах для дзяцей ён сцвярджае думку аб вернасці дадзенаму слову, дружбе, чэснасці, выхоўвае павагу да старэйшых, паказвае важнасць любой прафесіі. Маленькіх герояў празаіка можна сустрэць і на полі, і на ферме, і на лузе. Заўсёды адчуваецца любоў апавядальніка да юнага чытача, добрае разуменне яго свету і псіхалогіі.

Цікавым і па задуме, і па мастацкім увасабленні з'яўляецца зборнік Міхася Даніленкі «Зачараваны гарлачык», у якім дванаццаць апавяданняў звязаны адной тэмай – любоўю да матчынай зямлі, да Лоеўшчыны, і прасякнуты гонарам за чалавека-працаўніка. У апавяданні «Самая галоўная работа» празаік даказвае высакароднасць прафесій печніка, шафёра і інш. А ў «Маміным памочніку» паэтызуе непрыкметную, на першы погляд, прафесію цялятніцы. І сёння на старонках «Гомельскай праўды» можна сустрэць творы Міхася Даніленкі.

Некалі Павел Кавалёў сказаў пра М. Даніленку: «Добры ты празаік, сціплы чалавек, сумленны працаўнік». І з гэтым цяжка не пагадзіцца. Меладычнасць і напеўнасць прозы М. Даніленкі арганічна спалучаецца са значнасцю думкі,

глыбокімі філасофскімі абагульненнямі. Гэта мастацкае ўсведамленне сваіх грамадзянскіх абавязкаў перад народам, маленькім чытачом, перад землякамі.

Якою мераю можна вызначыць сённяшнюю вялікую ролю, што адыгрываюць творы пісьменнікаў Лоеўшчыны, у якіх адчуваецца імкненне падзяліцца з чытачом сваімі думкамі, роздумамі аб сённяшнім дні? Кожны з іх высвечвае пэўную адметную грань у жыцці сучасніка, нейкі адмысловы бок побыту Лоеўшчыны, узаемаадносін з землякамі.

Напрыклад, у зборніках «Голас сэрца» і «Музыка душы» (былога дырэктара тэатра лялек у Гомелі, а сёння жыхара Лоева) Івана Іванавіча Лямешкі выразна праглядваецца сваё, рэгіянальнае: шчырая і пастаянная зацікаўленасць лёсам роднага краю, якая нязменна адчуваецца і ў фактах асабістай біяграфіі, і ў паэтычных радках.

З вялікай павагай ставіцца да землякоў і Лідзія Дзмітрыеўна Долбікава – першы намеснік старшыні Лоеўскага райвыканкама. Гэта выразна адлюстроўваецца ў яе паэтычным зборніку «С любовью к жизни». Яе вершы вылучаюцца добрым веданнем жыцця, побыту і культуры Лоеўшчыны, таго сялянскага асяроддзя, у якім жыве і працуе паэтка. Кожны верш высвечваецца гранямі майстэрства, чалавечай цеплыні.

Незвычайная здольнасць захоўваць і зберагаць нацыянальную культуру свайго рэгіёна заўважаецца і ў творчасці галоўнага рэдактара часопіса «Палессе», ураджэнца Лоеўшчыны Рыгора Мікалаевіча Андрэяўца, аўтара кніг «Жыццё Францыска Скарыны» і «Беларусы ў Маскве». Рыгор Андрэявец глыбока асэнсоўвае багаты жыццёвы матэрыял палескага краю, працуе вельмі плённа, творча і з натхненнем. Гэтыя адметныя рысы творцы падмацоўваюцца і шчырасцю яго душы.

Адметнай з'яўляецца і творчая манера Мікалая Фёдаравіча Мельнічэнкі, паэта з Лоеўшчыны, які ў зборніку «Над стромай Дняпра» асэнсоўвае шматлікія надзённыя праблемы жыцця родных мясцін.

Шчыра і мілагучна, па-сапраўднаму кранальна гучыць паэтычны голас Аляксандра Уладзіміравіча Кукары, які звыш сарака гадоў працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў Лоеўскім дзяржаўным педагагічным каледжы. Нарадзіўся ён ў в. Горваль Рэчыцкага раёна, пісаць пачынаў яшчэ ў студэнцкія гады. Яго вершы – аб прыгажосці роднага краю, напоўнены матывамі радасці жыцця і ўзнёсласці кахання. Лірычны герой паэта ўзлятае сваімі думкамі да праблем Сусвету, апускаецца да трывог і болю землякоў.

Друкавацца А. У. Кукара пачаў у перыядычным друку («Гомельская праўда», «Чырвоная змена», часопіс «Маладосць» і інш.). У 2000 г. ён падрыхтаваў калектыўны альманах «Песні над Дняпром», у якім сабраны творы 35 аўтараў-землякоў.

У 2002 г. выйшаў з друку яго зборнік «Жаўруковая песня», вершы якога вылучаюцца шчырай любоўю да «малой» радзімы.

Да 500-гадовага юбілею Лоева Аляксандр Уладзіміравіч падрыхтаваў альманах «Над хвалямі дняпроўскімі», куды ўвайшлі вершы 70-ці паэтаў, выхадцаў з Лоеўшчыны: сённяшніх студэнтаў каледжа, працаўнікоў на ніве культуры і сельскай гаспадаркі, а таксама тых, хто жыве за межамі бацькоўскага краю, напрыклад, жыхаркі Бабруйска Ніны Пінчук. Цэнтральная тэма альманаха – родны кут, маці, Радзіма.

Сам жа Аляксандр Уладзіміравіч змясціў у альманаху вянок санетаў – «Горад над Дняпром», сярод якіх вылучаюцца вершы «Лоеву» і «Дзе над Дняпром і

Сожам вербы з клёнамі», у якіх апяваецца родная крынічная зямля, ушаноўваецца памяць аб загінуўшых, услаўляюцца землякі, якімі сёння ганарыцца Лоеўшчына. У паэтычным выданні змешчаны таксама творы Міколы Мельнічэнкі і Уладзіміра Бабраўнічага.

Спадзяемся, што вершы названых аўтараў знойдуць шчаслівую дарогу да сэрцаў чытача. Пажадаем аўтарам натхнення і паэтычных здабыткаў.

Літаратурная Лоеўшчына сёння прадстаўлена талентамі, якія знаходзяцца ў росквіце творчых сіл. Хочацца верыць, што іх творы яшчэ доўга будуць сустракацца на старонках друку, прыносіць чытачам радасць і задавальненне, узбагачаць наш жыццёвы і пачуццёвы свет.

Леанід КУЗЬМІЧ

ШЧЫМЛІВЫ ПЛЁСКАТ ХВАЛЬ ДНЯПРОЎСКІХ

Магутны і велічны Дняпро спакойна і разважліва нясе свае воды па гомельскай зямлі. Стромкімі і абрывістымі берагамі, абложыстымі паплавамі ён цешыць вока і запрашае ў такі непаўторны куточак, імя якому Лоеўшчына. Адметная прырода, незвычайная гаворка, па якой можна пазнаць мясцовых жыхароў, у многім вызначылі слоўнікавы склад рэгіёна. Аб гэтым яскрава сведчаць этналінгвістычныя даследаванні навукоўцаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны. Іх пяру належыць «Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны», складзены Т. С. Янковай, «Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны», «Матэрыялы для слоўніка назваў жыхароў Гомельшчыны», «Матэрыялы для слоўніка гідронімаў Гомельшчыны», падрыхтаваныя супрацоўнікамі кафедры беларускай мовы.

У моўнай тканіне лоеўцаў прадстаўлены шматлікія назвы прадметаў быту, гаспадарчых пабудоў, расліннага і жывёльнага свету. Так, словам «конік» на Лоеўшчыне называлі цвыркуна, чарку і варэнік, а ў множным ліку конікі – жарты. Некалькі значэнняў мае леска: лесвіца, дробныя пруткі, доўгая тонкая жэрдка. Мнагазначнасць адзначаецца і ў іншых найменнях: малай (недапечаны хлеб, хлеб з грэцкай мукі); макаўка (верхняя частка галавы, лілея), пень (пень, корань зуба, корань расліны); вянок (вянок, рад бярвенняў зруба, пляцёнка цыбулі); храпа (храпка, ножка качана; замёрзлая зямля, гразь без снегу); цацкі (вазоны, лекавыя травы); цвет (кветка, узор па краях хусткі) і іншыя.

Моўны запас лоеўцаў добра дапаўняюць словы, якія адрозніваюцца глыбінёй і выразнасцю зместу: вілюха – зігзаг; вітуха – фасоля, якая ўецца; галаватар – завадатар; выганшчына – харчы (збожжа), якія выносяць пастуху ў дзень выгану кароў у поле; клапоўнік – багун; лазянка – будынак з лазы; лея – моцны дождж; гатнік – той, хто робіць гаці; хрэновік – нагатаваны хрэн; шаламок – кепка; шацёрчык – парасон; блінцоўка – дзежка для бліноў; берасцянка – лыжка, якой аграбаюць рой; асінаўка – вялікая бочка з асінавай клёпкі; яблашнік – кісель з яблык; ядалка – лыжка; відук – мак-самасейка; кугачнік – бакеншчык; пярвач – першы рой; пярвачка – карова.

Шырокі моўны дыяпазон звязаны з традыцыйнымі стравамі з бульбы, без якіх проста немагчыма ўявіць не толькі штодзённы, але і святочны стол. Якіх толькі назваў не заўважаецца тут, якіх толькі страў не пакаштуеш у ціхай прыдняпроўскай хаце, якая прытулілася ля векавога бору: варанікі – бульба, вараная ў шалупайках, тапчані – тоўчаная бульба, таранікі – аладкі з бульбы, дранікі, сухапарнікі –

смажаная бульба, салонікі – вараная бульба, рабчыкі – бульба, зрэзаная з аднаго боку, каб заходзіла соль, цэлкі – крупы з шалупаек бульбы, пячонкі – печаная бульба, пячэня – бульба, звараная ў вадзе, але не працэджаная, засмажаная салам з цыбуляй, паранікі, паранка, прэжанка – смажаная бульба, палавінкі – разрэзаная бульба, нячышчанікі – нячышчаная вараная бульба, мяшанка – тоўчаная бульба, пюрэ, лысікі – бульба ў мундзірах, дзічкі – аладкі з перамёрзлай бульбы, крышані – суп з бульбы, камы – бульбяная каша, бабка – страва з дранай бульбы, калдун – варэнік з цёртай бульбы з мясам, клёцка – мучная або бульбяная галушка, гулікі – аладкі з перамёрзлай бульбы, штаны – нячышчаная бульба і іншыя.

Як бачна, большасць найменняў бульбяных страў адзначаюцца ў множным ліку, і толькі нязначная колькасць – у адзіночным.

Многія словы актыўна ўжываюцца ва ўстойлівых спалучэннях: конікі вытвараць – капрызіць; буглаі напалі – гультайнічаць; убіваць бубна – многа працаваць; нацягваць кій на булаўку – знаходзіць выхад з цяжкіх жыццёвых абставін; лістам слаць – дагаджаць, гадзіць, красамоўна гаварыць; даць макаўца – пстрыкнуць; палер падняць – закрычаць, зашумець; як за пнём – спакойна, без турбот; ні ў пір, ні ў мір – нікуды не варты; цеста ў горкія пячонкі – надакучыць; набіць гулькі – нарабіць сінякоў; за вуха вазьмі і сёрбай – аб рэдкай страве; укласці вочы – закахацца; вочы драць або выбіраць – дакараць, папікаць; вады напіцца – пра вельмі прыгожага; рабіць казла і барана – здзекавацца; бегаць за ветрам – лодарнічаць, гультаяваць і іншыя.

Некаторая колькасць слоў выкарыстоўваецца ў пераносным сэнсе. За вядомым словам кошка замацавалася назва прылады для выцягвання затануўшых рэчаў. Круцёлка – гэта не толькі закрутка, але і жывая, рухавая жанчына; валяваха – чапля і непаваротлівая жанчына; акіянка – піла з тонкім палатном і сварлівая жанчына.

Вучоныя даўно прыйшлі да высноў, што гаворкі Лоеўшчыны маюць свае адметнасці. Асабліва гэта заўважаецца на фанетычным узроўні, што звязана з уплывам суседняй украінскай мовы, а таксама шматлікіх перасяленцаў з іншых раёнаў Беларусі.

Прыродныя ўмовы раёна адлюстраваны ў слоўнікавым запасе яго жыхароў. Дняпро і другія водныя аб'екты сталі крыніцай узнікнення назваў рыб і іншых слоў рыбалоўнай і воднай лексікі: бабыр – ёрш; васказуб – пячкур; вербавік – лешч, які нерастуе; сібель, чарноха, рыбель – маленькая рыбка. Па-рознаму называлі вясло: цуг і бабайка. Апошняе выкарыстоўвалася на плытах. Запруда на рэчцы для лоўлі рыбы і прарубка; пелька, куды запускаецца нерат – гэта яз. Асаблівы нораў паказвае Дняпро ў разводдзе, а па-мясцоваму – вадатока. У такі час на рацэ добра відаць бычкі або кручы. Аснач – плытнік, на плытах і спіць і есць. У сучаснай беларускай літаратурнай мове ён ужываецца з паметай устарэлае, што дае падставу сцвярджаць аб спрадвечнасці гэтай прафесіі. Нам здаецца, што аналізуемы назоўнік паходзіць ад дзеяслова аснаваць са значэннем аснаваць і абцягнуць і абазначае канкрэтнае дзеянне – сплесці калоды ў плыты.

Аб моўным багацці Лоеўшчыны можна меркаваць па тым, што для назваў многіх слоў існуюць сінонімы. Напрыклад: абабібок – распуснік, байдзік; абклад – вопух; выжымкі – мязга; бур'ё – бурачок; лепні – варэнікі-конікі; наброда – павалока.

Лоеўшчына чакае даследчыкаў даўніны і этналінгвістычнай спадчыны. Адметны моўны каларыт, разнастайны анамастычны матэрыял, шматлікія археалагічныя помнікі – сведчанне багатай мінуўшчыны старажытнай мясціны Беларусі.

Алена **ВОІНАВА**

КАНКРЭТНА-БЫТАВАЯ ЛЕКСІКА ЛОЕЎШЧЫНЫ

Усходняе Палессе, у склад якога ўваходзіць і лоеўская зямля, як вядома, – унікальны рэгіён з адметнай гісторыяй, этнічнымі, культурнымі і моўнымі асаблівасцямі. Ён адыграў істотную ролю ў фарміраванні беларускага этнасу, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры. Менавіта гэтым фактарам тлумачыцца наяўнасць многіх рэліктавых, старажытных з'яў на тэрыторыі Усходняга Палесся ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Аб'ектам нашага даследавання з'явіліся назвы адзення і яго частак, якія выкарыстоўваюцца ў гаворцы Лоеўскага раёна. Аналіз лексікі, звязанай з намінацыямі адзення, мае важнае значэнне для вывучэння гісторыі беларускага народа, высвятлення культурных і моўных зносін паміж народамі.

Прадметна-тэматычная класіфікацыя адзначаных назваў выяўляе іх шматлікасць і разнастайнасць. Вывучэнне лексікі паводле семантычных пластоў служыць вырашэнню многіх лінгвістычных пытанняў: дазваляе выявіць семантычнае поле лексемы, ролю тэматычнай групы ў лексічным складзе мовы, вывучыць суадносіны паміж спрадвечнай і запазычанай лексікай, стылістычную прыналежнасць кожнага канкрэтнага найменння. Так, паводле прыналежнасці адзення пэўнаму полу або ўзросту выдзяляюцца:

1. Агульныя назвы адзення: адзёжа, адзёжка: Паедзім у горад, купім там адзёжку. Дзяражычы; адзя'ванне: Галя вурасла так хутка, давай толькі адеванне. Дзяражычы; прыбор «святочнае прыгожае адзенне»: Прыбор у скрынях хавалі, а надзявалі на празнік. Чаплін.

2. Назвы мужчынскага адзення: бе'кеш «доўгае мужчынскае адзенне з даматканага або фабрычнага сукна, са зборкамі ля пояса, ніз сшыты ў кліны; мужчынскае паліто»: Бекеш мушчыны надзявалі. Ручаёўка; грэ'йка «цёплае зімовае адзенне»: Зімой грэйку апранаем. Ручаёўка; ермяк «від летняга мужчынскага адзення, якое ўяўляе сабой накідку». Ермяк – летняе адзенне. Ісакавічы.

3. Назвы жаночага адзення: альпіга «шарсцяная спадніца»: Калісь мы тады жылі, дык у нас і сіцец, і атлас, і альпіга былі. Пярэдзелка; балахон «адзенне свабоднага крою»: Што ужэ цепер за мода пашла, усе і плацці і польты пашыты балахонамі. Ручаёўка; андара'к «саматканая спадніца»: Андаракі калісь насілі ў клетачкі, у полоскі. Дзяражычы; галаплечка «сарочка»: Рубашка прарэжыцца да зарубіцца, і рукава е – галаплечка. Пярэдзелка; гарсэ'т «старажытны жаночы ўбор, які ўяўляе сабой безрукаўку з тонкага матэрыялу, якая надзяваецца паверх кашулі»: Гарсэт на ўсе гузікі буў, шчытненькі. Ручаёўка.

4. Назвы дзіцячага адзення: руба'шачка «дзіцячая сарочка»: Рубашачку чыстую надзень дзіцяці. Бывалкі; камбін'зон «суцэльны дзіцячы касцюм з курткі і штаноў»: Камбінзоны цяпер усе купляюць. Дзяражычы; плацейка «дзіцячая сукенка для дзяўчынак»: Дачке плацейка купіла. Крупейкі.

5. Назвы сумеснага (мужчынскага і жаночага) адзення. Даследчыкі адзначаюць, што «ў беларусаў не было рэзкай розніцы паміж мужчынскім і жаночым адзеннем» [1, 152]. Гэтая група прадстаўлена наступнымі намінацыямі: ватніца 'мужчынская і жаночая фастрыгаваная ватовая куртка, фуфайка': Ватніцы прывезлі ў лаўку. Карпаўка; камізэ'лька «мужчынская і жаночая безрукаўка»: Камізэльку і цяпер люблю насіць, у мяне яна як кухвайка цёплая. Р.-Бурыцкая; касцю'м «мужчынскае (пінжак і штаны) ці жаночае (жакет і спадніца) адзенне»: Прыбіраліся на празнік у касцюмы. Дзяражычы.

У тэматычную класіфікацыю назваў адзення неабходна ўключыць яшчэ назвы тканін: аднолічка «аднабаковая тканіна»: Аднолічка – гэта мацерьял, што з аднаго боку токі. Бывалкі; саці'на «баваўняная ці шаўковая тканіна, якая мае бліскучы правы бок»: Во ў мене хвартух з саціны. Чаплін; алляны «ільняны»: Калісь усе аллянае насілі, здаравей было. Дзяражычы; гумазейка «цёплая баваўняная тканіна. У мяне была сарочка з гумазейкі. Р.-Бурыцкая;

частак адзення: акрайка «тканы або плецены пояс з кутасамі»: Жэншчыны калісь падперазувалісь, называлась акрайка. Дзяражычы; бахромка «махры»: Я хацела бахромкай абшыць спадніцу, дак сын засмеяў – не модна. Чаплін; брыж «аблямоўка з тонкай тканіны са зборкамі»: Калісь шылі спадніцы ў двое, ў трое брыж. Ручаёўка; заборы «складкі, зборкі на адзежыне, матэрыяле»: Калісь сорочкі з заборамі, з чэхлікамі да вуштупаеш – ого як. Дзяражычы; каўнер «пояс штаноў»: Ушый коўнер у штаны нову. Р.-Бурыцкая;

фурнітуры: гаплі'к «аплік, якім зашпільваюць адзенне». Гаплік – кручок, што зашпільваюць. Бывалкі; гузік «металічная, касцяная або іншая зашпілька, пераважна ў форме кружка, якая прышываецца да адзення, абутку». Прышый гузік на сароццы. Дзяражычы.

Адзенне падзяляецца таксама, як вядома, на верхняе, асноўнае і сподняе. Верхняе адзенне ў сваю чаргу мае розныя віды ў залежнасці ад матэрыялу вырабу: а) з сукна, палатна і інш.: кулька «верхняя баваўняная жаночая вопратка доўгага памеру»: Кулька даўжэй ватніцы, на хлоп'і, Дзяражычы; ко'хта «верхняя жаночая ватная вопратка доўгага памеру»: Кухвайка кароткая, а даўжэйшая – кохта на ваці. Кажуць: доўгая кохта. Пярэдзелка; кулёк «суконная мужчынская саматканая світка». Кулёк – суконная, саматканая світка мужчынская. Дзяражычы; і футравае адзенне: б) казачына «старажытнае адзенне з аўчыны асаблівага крою: доўгае, прысабранае ў таліі»: Казачына – кажух с авечак, тут ззаду зоборы, такая, як ото юпкі калісь бабы шылі. Дзяражычы; ка'жух «доўгая верхняя вопратка з выраблены аўчын»: Кажухі і зараз носім. Бывалкі; паўшубак «кароткае адзенне з аўчыны, кажушок»: У паўшубку ўдобна зімой. Казярогі.

Адносна спосабу нашэння асноўнае адзенне можна падзяліць на плечавое, паясное і суцэльнае. Да назваў плечавога можна аднесці: ру'башка «мужчынская і жаночая верхняя рубашка»: У мужчын верхніе рубашкі былі чмарые. Дзяражычы; са'рочка «мужчынская і жаночая верхняя рубашка»: У свята мужыкі сарочкі белыя адзявалі; забіранка «мужчынская кашуля са складкамі каля каўняра»: Добрую забіранку пашыеш з етага саціну. Пярэдзелка. Групу паяснога адзення можна праілюстраваць наступнымі лексемамі: сінёўка «спадніца»: Трэба сінёўку падкласць, бо доўгая. Р.-Каменева; за'панка «фартух»: Запанка – хвартух без брыжоў.

Чаплін; спадніца 'паясная адзежына ў выглядзе некалькіх сшытых полак тканіны': Спадніца доўгая у цебе, ты б трохі падшыла ее. Дзяражычы.

Назвы суцэльнага адзення пераважна жаночыя: пла'цце 'жаночае суцэльнае адзенне, якое апранаецца паверх бялізны, сукенка': Плацці раней жа не насілі, ета толькі цепер. Ручаёўка; сара'хван 'жаночая сукенка з вялікім выразам, без рукавоў; плацце без рукавоў': Унучка мая ўсё лета ў сарахване прахадзіла. Р.-Каменева.

Сподняе адзенне, як мужчынскае, так і жаночае, прадстаўлена шматлікімі лексемамі, напрыклад: бе'лень «бялізна»: Белень белу расцілалі на зелену траву (З нар. песні). Карпаўка; спадняк «ніжняя саматканая спадніца. А пад ніз спаднякі раней насілі. Дзяражычы; споднікі «нацельныя мужскія штаны»: Споднікі пад ніз надзяем. Крупейкі; по'ртак «споднія штаны, кальсоны»: Летам портак не носяць, і так душна. Чаплін.

У асобную групу выдзяляюцца назвы адзення, якія адрозніваюцца часам нашэння:

а) зімовае: паліто' «верхняя цёплая вопратка, звычайна ніжэй за калені»; 'тулуп «доўгае верхняе адзенне з аўчыны»; палшубак «кажушок, пацягнуты матэрыялам»; пацеганка «кажух, пакрыты зверху тканінай»; жа'кетка «зімняе адзенне з мяккага матэрыялу»;

б) веснавое -- асенняе: целагрэйка «мужчынская фастрыгаваная ватовая куртка; фастрыгаваная ватовая безрукаўка»; кух'вайка «куртка, падшытая ватай; ватоўка; целагрэйка»; плахта «суконная накідка ад дажджу»;

в) летняе: сарафа'н, плацце;

г) назвы адзення, якое выкарыстоўваюць у розныя пары года або ў пераходны сезон: пінжа'к «кароткае верхняе мужчынскае адзенне»; камі'зэлька «мужчынская кароткая адзежына без рукавоў і каўняра, якую надзяваюць на сарочку»; сві'тар «цёплая фуфайка без засцёжак з высокім каўняром»; суконнік «жаночая вопратка з саматканага сукна, сукенка».

Разнастайнасць і багацце назваў адзення пацвярджае і вывучэнне тыпаў іх матывацыі. Апісанне матывацыі прадугледжвае аналіз унутранай формы найменняў. Разумеючы пад унутранай формай лексемы ўяўленне, якое захавалася ў слове, аб пярвічнай прымеце, пакладзенай у аснову паняцця, з аднаго боку, і моўную матываванасць, пры дапамозе якой ажыццяўляецца стварэнне новых слоў, з другога боку, заканамерна размяжоўваюць структурную і семантычную матывацыю.

Аналізуючы матываванасць канкрэтна-прадметных намінацый, правамерна адрозніваць структурную і семантычную матывацыю. Пад структурнай матывацыяй звычайна маюцца на ўвазе дэрывацыйныя адносіны паміж утваральнай і вытворнай асновамі.

У працэсе аналізу былі выдзелены два асноўныя тыпы структурнай матывацыі намінацый адзення і яго частак: аддзеяслоўныя дэрываты і адыменныя ўтварэнні.

У ліку аддзеяслоўных дэрыватаў выключную перавагу маюць суфіксальныя ўтварэнні тыпу: адзяванне «агульная назва адзення»; целагрэйка «мужчынская фастрыгаваная ватовая куртка; фастрыгаваная ватовая безрукаўка»; забіранка «мужчынская кашуля са складкамі каля каўняра»; абшыванка «пацягнуты кажух» і інш., матываваныя назвай адзення, названага ўтваральнай асновай дзеяслова.

Адыменныя дэрываты структурна матываваныя найчасцей назвай якасці – асновай прыметніка: споднікі «споднія штаны»; верхнікі «верхнія штаны»; суконнікі

«штаны з саматканага сукна»; сінёўка «спадніца»; сітцавік «верхняе жаночае святочнае адзенне».

У складзе адыменных дэрыватаў сустракаюцца назвы, структурна матываваныя найменнем прадмета, асновай назоўніка: безрукаўка «куртка або кофта без рукавоў»; наплечнік «вышываная наплечная ўстаўка ў жаночым адзенні»; начоўка «начная жаночая сарочка» і інш.

Аналіз семантычнай матывацыі назваў адзення і яго частак у гаворцы Лоеўшчыны паказаў вялікую колькасць тыпаў намінацыі. Так, у складзе лексем з празрыстай «унутранай формы» можна выдзеліць наступныя прадуктыўныя тыпы матывацыі:

а) многія назвы адзення матываваныя спосабам вырабу відаў адзення або спосабам аздаблення, апрацоўкі: вышыванка «мужчынская верхняя сарочка з вышыўкай»; даматкан «суконная спадніца, андарак»; пацеганка «кажух, пакрыты зверху тканінай»; самавязка «адзенне, звязанае ўручную»; самапрадка «самаробная тканіна»;

б) даволі значная група назваў адзення матывавана матэрыялам вырабу: ватнік «ватовая куртка»; палатнянікі «палатняныя штаны»; перкалёўка «жаночая сарочка з тонкага палатна»; парцянік «несуконная спадніца»; сітцавік «верхняе жаночае адзенне з сітцу»;

в) прадуктыўным тыпам з'яўляецца матывацыя назваў адзення яго прызначэннем, функцыянальнай характарыстыкай: грэйка «цёплае зімовае адзенне»; душагрэйка «безрукаўка з аўчыны»; касаплётка «стужка»; паддзяванец «цёплая безрукаўка»; падпяразанка «пояс»;

г) актыўным тыпам матывацыі назваў адзення з'яўляецца намінацыя паводле месца яго нашэння: верхнікі «верхнія штаны»; нагруднік «жаночая безрукаўка на ваце»; наплечнік «вышываная наплечная ўстаўка ў жаночым адзенні»; наручнікі «манжэты»; нацельніца «сподняя жаночая сарочка»; падштанікі «сподняе мужчынскае адзенне».

Такім чынам, назвы адзення, зафіксаваныя на тэрыторыі Лоеўшчыны, прадстаўляюць сабой разнастайную ў лексіка-семантычных адносінах групу і з'яўляюцца часткай духоўнай культуры беларусаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Молчанова Л. А.* Материальная культура белорусов. – Мн., 1968. – С. 152.

Наталля БАГАМОЛЬНІКАВА

ГІСТОРЫЯ ЛОЕЎШЧЫНЫ Ў ТАПАНІМІЧНЫХ НАЗВАХ

«Анімічныя адзінкі – у гісторыі,
а гісторыя – у анімічных адзінках»
Г. М. Мезенка

Пастаяннымі спадарожнікамі жыцця чалавека з'яўляюцца не толькі яго імя, імя па бацьку і прозвішча, але і ўласныя назвы геаграфічных аб'ектаў. Аднак ніводная геаграфічная назва не ўзнікла выпадкова, сама па сабе. Акрамя адраснай функцыі ў найменнях захоўваецца яшчэ пазнавальны патэнцыял. Гэта своеасаблівыя каштоўныя скарбонкі-захавальніцы слоўнага багацця папярэдніх эпох. Онімы могуць распавядаць аб мінулым і сучасным этнаса, яго духоўнай спадчыне, занятках, старонках гісторыі і геаграфіі. Многія з іх ідуць з глыбіні стагоддзяў, але і сёння працягваюць служыць чалавеку. Семантыка большасці ўтваральных асноў онімаў лёгка этымалагізуецца, аднак сустракаюцца найменні з непразрыстай этыялогіяй, што чакаюць свайго даследавання. Наконт іх паходжання маюцца толькі гіпотэзы. Назвы падуладны часу, за перыяд існавання яны могуць мяняць фанетычнае і арфаграфічнае аблічча, знікаць і замяняцца новымі.

Да гіпатэтычных адносіцца і назва г. п. Лоеў. Гістарычныя крыніцы сведчаць, што першапачатковая назва паселішча гучала як Лоева Гара, упершыню ўпамінаецца ў пісьмовых помніках у 1505 г. і фіксуецца так да 1594 г. [4, с. 207; 5, с. 577]. Найменне састаўное, уяўляе сабою атрыбутыўную пасесіўную канструкцыю «прыналежны прыметнік + назоўнік». Галоўным кампанентам у словазлучэнні выступае слова, якое называе аб'ект прыналежнасці, – гара (паселішча ўзнікла на высокім правым беразе Дняпра каля ўпадзення ў яго левага прытока – Сажа). Азначальны кампанент утвораны ад праславянскага асабовага імя Лой («тоўсты, поўны») пры дапамозе суфікса –ев-, які паказвае прыналежнасць прадмета адной пэўнай асобе, г. з., з семантыкай індывідуалізаванай адзінкавай (асабовай, персаніфікаванай) прыналежнасці. Такі тып высокапрадуктыўны, асабліва ў гутарковай мове. У аснове самога імя знаходзіцца апелятыў лой у значэнні «тлушч». Лексема лой у гаворках Гомельшчыны захавалася дагэтуль [6, с. 40], у якасці імя-мянушкі прыведзена вядомым даследчыкам антрапонімаў М. В. Бірылам [2, с. 189]. Ад гэтага імя паходзяць онімы в. Лоеўцы пад Камянец-Падольскам (Украіна), прозвішча Лойка, адзначаецца і прозвішча па бацьку (Хадко Лоевіч) [4, с. 207].

Час узнікнення Лоева адносны. Вядома, што адлік даты «нараджэння» пасяленняў пачынаецца з першай іх фіксацыі ў пісьмовых крыніцах. Лоеў, на нашу думку, існаваў значна раней 1505 г. Меркаванне пацвердзім гісторыяй узнікнення іменаслову. З трох кампанентаў (імя, імя па бацьку і прозвішча) імя з'яўляецца самым старажытным. Да прыняцця хрысціянства славяне карысталіся двума тыпамі імён, утворанымі на базе славянскай лексікі: складанымі тыпу Святаслаў, Яраполк і простымі апелятыўнага паходжання (Дуб, Граб, Сокал, Жук і г. д.). Чалавек тады верыў у магутную сілу слова, у тое, што агульныя назвы, узятыя ў якасці імён (семантычны шлях утварэння), становяцца іх апекунамі. У той перыяд кожнае паўназначнае слова магло быць выкарыстана як уласнае імя. Пасля прыняцця хрысціянства чалавека суправаджалі спачатку два імені: кананічнае і славянскае. У помніках пісьменнасці побач з хрысціянскімі апошнія выкарыстоўваліся аж да XVII ст. Як сведчаць пісьмовыя помнікі, славянскае імя Лой не суправаджалася другім імем.

У дакументах 1672 г. пункт адзначаецца ўжо як Лоеў [4, с. 207]. Вядомы рускі географ і падарожнік П. П. Сямёнаў-Цян-Шанскі, апісваючы пасяленні ў Беларускім Палессі, называе яго варыянты: Лоевъ, Лоёвъ (Лоіовъ)-градъ [3, с. 381]. Мае права на жыццё і версія аб матывацыі оніма апелятывам лоів (лоіва) са значэннем «вялікая мнагамесная ладдзя». Такія чаўны ставіліся звычайна каля берагоў буйных гандлёвых водных шляхоў, дзе яны служылі ў якасці прыстані [4, с. 207].

Участак р. Днепр каля сучаснага Лоева ў пачатку XVI ст. насіў назву Татарскі Брод. У найменні зафіксаваны гістарычны факт. З усходу праз раку не раз перапраўляліся перакопскія татары, якія пад кіраўніцтвам трох сыноў крымскага хана Менглі-Гірэя рабілі на паўднёвыя раёны Беларусі спусташальныя набегі. Гэтыя абставіны прымусілі Льва Сапегу, дзяржаўнага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, у склад якога ўваходзіла тагачасная Лоеўшчына, прыняць меры перасцярогі. Ён загадаў закласці на Лоевай Гары замак-умацаванне. У XVII ст. Татарскі Брод называўся Лоеўскай Брамай. Старажытная лексема брама мела значэнне «застава каля горада» [7, с. 25]. Цяпер пераправа выкарыстоўвалася для нападу казацкіх атрадаў, што былі накіраваны ў Беларусь гетманам Запарожскага казацтва Б. Хмяльніцкім з мэтай адцягнуць напад войска Вялікага княства Літоўскага на Украіну з боку Беларусі [5, с. 578]. Да казакаў далучыліся і беларускія сяляне. У выніку барацьба вылілася ў казацка-сялянскае паўстанне. Аб гэтых падзеях і знаходжанні казакаў на тэрыторыі Лоеўшчыны сведчаць гідронімы Казакова – заліўны луг (п. Пабядзіцель), Казацкае – 1. балота; 2. забалочанае ўрочышча (в. Усход).

Лоеў і землі вакол належалі рэчыцкаму войту М. С. Юдзіцкаму і яго нашчадкам. Як сведчаць дакументы, сяляне жылі ў надзвычайнай беднасці. Да 1861 г. яны павінны былі адбываць абавязковую паншчыну. Большая частка мужчын з навакольных вёсак адпраўлялася на працяглы перыяд (з пачатку вясны да позняй восені) на вадзяныя сплавы. Свая зямля прыходзіла ў запусценне, бо жанчыны і дзеці не ў стане былі яе належным чынам апрацаваць, яны большасць дзён тыдня адпрацоўвалі на панскіх землях. Да таго ж сем'і плацілі панам розныя падаткі. Мала што змянілася і пасля адмены прыгоннага права. Для сялян меліся забароны любога роду дзейнасці ў сваю карысць на панскіх участках, за гэта яны неслі пакаранне. Ва Устаўной грамаце Лоеўскага маёнтка ад 1862 г. адзначалася, што сялянам не дазваляецца лавіць рыбу ў азёрах і іншых вадаёмах, займацца паляваннем на тэрыторыі, якая знаходзіцца ў карыстанні памешчыцы [5, с. 45–49]. Перыяд панскага

ўладання адлюстраваўся ў наступных тапонімах: Паназер'е – абшар (в. Мохаў), Паноў востраў – заліўны луг (в. Першамайск), Панкоў вадазбор – (ад панок, в. Хаткі), Панскае – заліўны луг (в. Дзяражычы), Панскія – балоты (в. Шчытцы).

Падзеі паслярэвалюцыйнага перыяду ўвасоблены на Лоеўшчыне ў такіх класах онімаў, як айконімы (назвы населеных пунктаў) і гадонімы (назвы вуліц і завулкаў). У тапаніміі Беларусі адбыўся пасля падзей Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі сапраўдны «бум». Амаль усё старое новай уладай адмаўлялася. Палітычная платформа Камуністычнай партыі і Савецкай улады патрабавала абнаўлення жыцця, сцвярджэння новай сацыялістычнай рэчаіснасці, рамантычнай узнёсласці, дзеля чаго ва ўсіх сферах сацыяльна-эканамічнага і палітычнага існавання маладой дзяржавы шукаліся новыя формы, прыёмы і сродкі, якія не заўсёды былі дасканалымі. У айканіміі, у прыватнасці, для новых пасяленняў прызначаліся іншыя назвы, прасякнутыя пафасам (назвы-мемарыялы), а таксама пракацілася хваля перайменаванняў. Гэта з'ява выражана ў наступных онімах Лоеўскага раёна: в. в. Новакузнечная, Пабядзіцель, Першамайск (раней Папоўка), Усход (як сімвал новага жыцця); п. п. Барэц, Бодры, Майск, Прагрэс, Райск, Слава, Смелы; вуліцы Кааператыўная, Кастрычніцкая, Першамайская, Працоўная, Савецкая і інш.

Барацьба нашага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў таксама знайшла сваё адлюстраванне ў тапаніміі. Так, у найменнях вуліц і завулкаў г. п. Лоева і населеных пунктаў раёна ўвекавечаны прозвішчы тых, хто вызначыўся падчас вызвалення тэрыторыі раёна, асабліва ў фарсіраванні р. Днепр каля Лоева ў кастрычніку 1943 г.: Акуцыёнак П. А., Апарын М. Р., Батаў П. І., Волкаў Е. Д., Даўлетаў Б. Я., Ермакоў Ф. А., Сухараў А. П., Фралянкоў А. Р., Царыкаў Б. А., Шэвелеў М. А. 279 байцоў, камандзіраў і палітработнікаў былі ўзнагароджаны медалём «Залатая Зорка» Героя Савецкага Саюза. У перамозе над ворагам адзначыліся і партызаны, падпольшчыкі. У гонар камандзіра партызанскай брыгады «За Радзіму», сакратара Лоеўскага падпольнага РК КП(б)Б Сінякова Р. І. названа адна з вуліц у Лоеве. Гадонімы сведчаць, што не забыты лоеўцамі подзвігі землякоў Грыба К. П., які адным з першых фарсіраваў Дняпро і загінуў у баі (яго імем названа вуліца ў в. Бывалькі), лётчыкаў Казлова А. В., Пінчука Р. С. (у іх гонар названы вуліцы ў Лоеве).

Лоеўшчына мае багатую гісторыю: у XI–XIII стст. уваходзіла ў склад Чарнігаўскага княства, з сярэдзіны XIV ст. – у складзе Вялікага княства Літоўскага, з 1793 г. у выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай адышла да Расійскай імперыі і толькі ў 1926 г. была далучана да БССР. І тапонімы – найкаштоўныя моўныя гістарычныя помнікі роднай зямлі.

ЛІТАРАТУРА:

1. Беларуская мова. Міжведамасны зборнік. Вып. 23. – Гомель-97. – С. 126–162.

2. *Бірыла М. В.* Беларуская антрапанімія. – Мн., Навука і тэхніка, 1966. – 327 с.

3. Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., эконом. и быт. значении: Лит. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Мн.: БелЭн, 1994. – 550 с.

4. *Жучкевич В. А.* Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Мн., БГУ им. В. И. Ленина, 1974. – 447 с.

5. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Лоеўскага раёна / Рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2000. – 592 с.

6. Тураўскі слоўнік. У 5 т. Т. 3. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 311 с.

7. *Яшкін І. Я.* Беларускія геаграфічныя назвы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1971. – 255 с.

Аляксандра ***СТАНКЕВІЧ***

НАРОДНАГАСПАДАРЧАЯ ЛЕКСІКА ЛОЕЎШЧЫНЫ

Гісторыя... Гэта маўклівая сведка мінулага, гэта жывая памяць, настаўніца жыцця. Яна пралівае святло ісціны на падзеі мінулага, дазваляе зразумець сучасныя факты. Гэтыя словы Цыцэрона актуальныя і ў наш час. Гісторыя мае выключнае значэнне ў грамадскім жыцці. Ведаць яе абавязкова. Важным набыткам гісторыі з'яўляецца народная культура.

Традыцыйная беларуская нацыянальная культура, якая гістарычна фарміравалася на працягу многіх стагоддзяў, адлюстравала ў сабе народную мудрасць і вопыт, нацыянальную свядомасць і светапогляд.

Важнейшым кампанентам духоўнай культуры з'яўляецца народная мова, якая была і застаецца прадметам пільнай увагі даследчыкаў. Слоўнікавы запас народнадыялектнай мовы ўяўляе сабой пэўным чынам арганізаваную лексічную сістэму, у якой знаходзяцца розныя паводле часу ўзнікнення, паходжання, тэрыторыі распаўсюджання, семантычнага аб'ёму і стылістычнай афарбоўкі словы. «Ядро» гэтай сістэмы, яе цэнтр утварае гаспадарчая лексіка, якая адлюстроўвае асноўны занятак карэнных жыхароў.

Гэта лексіка называе шматлікія рэаліі разнастайных народных рамёстваў, многія з якіх ужо зніклі або знікаюць, знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Іх назвы, якія яскрава адлюстроўваюць гісторыю, самабытнасць і нацыянальны каларыт Лоеўшчыны, з'яўляюцца неад'емным элементам народнай духоўнай культуры. Іх неабходна збіраць, вывучаць і тым самым зберагаць для будучых пакаленняў.

Як адзначаюць даследчыкі, гаворка Лоеўскага раёна ў сучасным стане не з'яўляецца аднароднай. У яе складзе гістарычна вызначаюцца тры асноўныя групы: гаворка карэнных жыхароў Лоеўшчыны, гаворка перасяленцаў з былой Мінскай і Магілёўскай губерняў і гаворка перасяленцаў з былой Чарнігаўскай губерні. У гаворцы карэнных жыхароў Лоеўшчыны пераплятаюцца асаблівасці як беларускай, рускай, так і ўкраінскай моў [1, с. 3].

У складзе народнагаспадарчай лексікі Лоеўшчыны вызначаюцца розныя тэматычныя пласты. Самую значную ў колькасных адносінах групу складае будаўнічая лексіка. Гэта зразумела, паколькі жыллё чалавека, гаспадарчыя пабудовы з'яўляюцца важнейшым кампанентам матэрыяльнай культуры беларуса, яны арганічна звязаны з яго сацыяльна-вытворчым і бытавым укладам і векавымі традыцыямі. Як вядома, менталітэт беларусаў выключна канструктыўны, стваральны. Дзе б ні пасяліўся беларус, у першую чаргу пачынаў ён уладкоўваць сваё жыццё, будавацца і апрацоўваць зямлю.

У складзе будаўнічай лексікі вызначаюцца розныя тэматычныя групы, самую значную з якіх складаюць назвы жыллёвых пабудоў і іх частак: пастройка, закат (закота) «зашчытак», запір, лабок «франтон», застрэшнік, казырок «навес над дзвярыма», кватэрка «фортачка», комлата «пакой, хата», падваліны «ніжні вянок зруба», нарожнік «падстрэшнік», паталок, столь, перабойка «перагародка», подмур «фундамент», пол, прыдзелак, прыдзелачка, хіжа, прыхатак «прыбудова», прыстопнік «кладоўка», прыталака «перакладзіна паміж вушкамі дзвярэй», шчыт «грэбень страхі». Асобна ў гэтай групе можна выдзеліць па колькасці назвы печы і яе частак. Печ у сялянскай хаце займала віднае месца, яна адыгрывала важную ролю ў паўсядзённым побыце селяніна, у яго традыцыйных звычаях, абрадах і вераваннях. Печ была поліфункцыянальнай: на ёй гатавалі гарачыя стравы, выпякалі хлеб, варылі корм жывёле, ёю абагравалі памяшканне, на ёй сушылі рэчы, выграваліся малыя і старыя і г. д. [2, с. 397]. Таму і слоў для назвы печы і яе частак было многа: запечак, запечча, заткала, кабыла «скляпенне ў печы», камешнік «куток ля печы, дзе стаяць вілкі», комінак «выступ у печы», падпрыпечак, падпрыпек, печак «фундамент у печы», прыпечак «прыпек», пяколак «тое ж», жарніца «месца на прыпеку, куды выграбаюць жар», пячурачка «ніша ў сцяне печы», стаяк «комін», труба «комін, дымаход», цялешнік «чалеснік», ямка «месца ў печы, куды заграбаюць жар».

Даволі разнастайныя на Лоеўшчыне назвы гаспадарчых пабудоў і іх частак: інбар «свіран», пунька «пуня», сцёбка «варыўня», драбы «яслі для сена», пагрэбец «пограб», падмост «падвал», прыгрэбнік «склеп», падвосець «ямка ў восеці, у гумне, дзе кладуць агонь», прыбаннік «прылазнік», прыгрэбня «насціл пад склепам», прыдзелак «прыбудова да хлява», прыістобашнік «прыбудова да істопкі», прыклетнік «прыбудова да клеці», прыстопнік «кладоўка», чулан «камора», гуўно «гумно», шопа «памяшканне без сцен для гаспадарчых мэт», «паветка над склепам, стогам» і інш.

Адметнае месца ў аналізуемай ЛСГ назваў з агульным паняційным полем «будаўніцтва» займаюць назвы будаўнічага матэрыялу: доска, дубіна «матэрыял з дубу», дыль «брус», ігліца «брусок, якім замацоўваюцца дошкі ў дзвярах», жэрдка, леска «доўгая, тонкая жэрдка», мурлаты «бэлькі», нагаловіч «перакладзіна, якая трымае вушакі зверху», забойка «шчыкетнік», падмоснікі «лагі», паплёт «жэрдкі, латы», пахі «выемкі ў дошках», саха «шула, слуп», страпіліна «кроква», тычкі «жэрдкі, якія кладуць паверх саломы на страсе», цялеш «кавалак бервяна», шалёўка, шпонка «драўляны шып, якім замацоўваюцца дошкі», шчотка «дошкі, якія прыбіваюцца ўпоперак да лат», шыферынка «ліст шыферу» і інш.

Разглядаючы групу будаўнічай лексікі, нельга абысці ўвагай і назвы інструментаў і прыстасаванняў: драчка «цяслярскае прыстасаванне», калёўка «рубанак для выбірання ўзору на налічніках», калодка «частка рубанка», кіянка «драўляны малаток», фігурэй «рубанак, якім робяць фігуры», баран(ак) «рубанак з дзвюма ручкамі», легар «вага», сакера, шклюд «шырокая сякера для часання бярвенняў», кастыль «верхняя ручка ў падоўжанай піле» і г. д.

У колькасных адносінах пасля будаўнічай лексікі вызначаюцца сельскагаспадарчыя назвы. Гэта тлумачыцца тым, што сельская гаспадарка, земляробства былі асноўным відам заняткаў, працоўнай дзейнасці беларусаў. У складзе ЛСГ назвы прылад сельскагаспадарчай працы: бабка, патрапашка, трапашка, мянташка «кавадла, якім клепяць касу», грабцы «граблі, якія прымацоўваюцца да касы», драпка, капаніца «матыка», капіца «частка цэпа, зробленая з рэмня», малатарня, стальвагі «драўляныя ворчыкі»; назвы жорнаў і іх часткі: драчка

«ручныя жорны», жорван «жорны», дылі «дашчаны насціл, на якім ляжыць ніжні камень у жорнах», лечая «адтуліна ў жорнах», парпліца, паўпрыца «жалезны шворан у жорнах», спадняк «ніжні камень у жорнах», вяршняк «верхні камень у жорнах», заступ «рыдлёўка, лапата», шухля «лапата, шуфель», навільнік «вілы з доўгім вілачнікам»;

назвы сельскагаспадарчых культур: азімка, жніўні «рунь», кардошка, картопель, картоплі «бульба», красная «гатунак бульбы», пшанчанка, семянушка, скарада «усходы жыта ўвосень», турчанка «сорт бульбы», уруна, урун «рунь», хлеб «збожжа, жыта», чарнушка «цыбуля», часнак, ярушка «яравое жыта»;

асоб, якія займаюцца сельскагаспадарчай працай: жанец «жнец», жнейка «жняя», куратнік «мужчына, які даглядае курэй», куратніца «жанчына, якая даглядае курэй», падсяваха «сейбітка», плугатар «араты»;

хатніх жывёл і птушак: жэраб, жэрваб «жарабец», кура, пярэдайка, пятух, трацяк «трохгадовы конь», цяліца «цёлка»;

спосабаў укладкі збажыны, сена, саломы, сельскагаспадарчых культур: бабка «10 снапоў», залом «пераход стога ў конусную форму», кукла «звязка пачэсанага лёну», куль «вялікі сноп», палукапак «капа з 30 снапоў», скірта «вялікая ўкладка снапоў у полі», ярус «капец (бульбы)»;

зямельных угоддзяў, надзелаў зямлі: гоні «кавалак поля», заварат «градка бульбы», кардаплянішча «бульбянішча», пар, прыпар «папар», пусташ «незасеянае поле», пустыня «неўрадлівае поле», пшанішча «поле, на якім расла пшаніца», траціна «трэцяя частка надзела»;

адыходаў пры апрацоўцы сельскагаспадарчых культур: жамкі, жам «жамерыны», лупа «астаткі пасля прасейвання мукі», субар «адходы жыта, проса, ячменю»;

пабудоў для жывёл: кашара, куратнік, летнік «летняе стойла», свіношнік, свінушнік.

У ліку астатніх тэматычных груп у колькасных адносінах можна вылучыць лексіку ткацтва, якое таксама займала важнае месца ў сялянскай хатняй вытворчасці. Гэта назвы ткацкага стану, прыстасавання для вырабу тканін у хатніх умовах: кросны, ставы; частак ткацкага стану: бёрда, галава, дошчачка, жураўка, качулка, набілкі, наватка, пакацёл, панарад, рубашка, чыны, снавадла, сукала, трубка, трысцё, увой, хлудзец, храставіна, чыноўкі; назвы намотаных нітак: адноручак, пачынак; віду тканння: парэкулі; памылак пры тканні: блізна; меры палатна: губка, сувой; асобы, якая займаецца тканнем: снавака, снаваха, ткаха.

Можна вызначыць і транспартную лексіку, якая называла розныя віды транспартных сродкаў і іх частак: колавы транспарт: гарба «воз», пасцельнік «насціл у возе», роспускі «воз для вывазкі лесу»; санны транспарт: грынджалы, крынджалы «сані без розвальняў», самакаткі «ручныя сані», водны транспарт: байдак «вялікая лодка», пераплаў «параход», самаходка «цеплаход», чалка «плыт», лотка, чоўнік «чаўнок», баржа, лайба «баржа», бабайка «вясло на плытах», цуг «вясло» і інш.

Асобную тэматычную групу складае рыбалоўная лексіка: назвы рыбалоўных прылад і іх частак: блёхалка, блісня, грузь «грузіла», закота, кульмень, падсака, сцябло; рыб: вербавік «лешч, які нерастуе», кляпец «плотка», краснаперка, лін, сібель, чарноха і інш.

Прааналізаваная лексіка – розная па паходжанні і структурна-семантычнай характарыстыцы. Асноўнае ядро яе складаюць уласныя спрадвечныя назвы, і гэта падкрэслівае яе старажытнасць і важнасць у лексічнай сістэме. Тыпы структурна-семантычнай матывацыі абумоўлены значэннем лексемы.

Так, напрыклад, назвы многіх прылад працы ці асобы маюць аддзеяслоўнае ўтварэнне, матывуюцца дзеяннем, якое ўтвараюць: драчка (драць), драпка (драпаць), капаніца (капаць), малатарня (малаціць), севалка (сеяць), тканка (ткаць), снаваха (снаваць), жнейка (жаць), назвы пабудоў і іх частак маюць адсубстантыўнае ўтварэнне, яны матывуюцца месцам: запечак, падпрыпечак, прыпечак, прыгрэбнік, падмост, прыбаннік, прыстопнік, зрэдку дзеяннем: пастройка, перабойкі, продзелак. Месцам або аб'ектам працы матывуюцца назвы асобы: куратніца, куратнік, плугатар.

Ёсць метафарызаваныя назвы: казырок «навес над дзвярамі», кабыла «скляпенне ў печы», зладзейка «месца ў печы, дзе кладуць запалкі», шыйка «месца на печы паміж комінам і сцяной»; баран «рубанак з двума ручкамі», кастыль «верхняя ручка ў падоўжанай піле»; бародка «выступ ззаду ў сякеры» і інш. Гэта зааморфная метафара (баран, кабыла), антрапаморфная (бародка, зладзейка, шыйка), метафарычны перанос па падабенстве прадметаў (казырок, кастыль).

У складзе прааналізаванай лексікі нешматлікая група запазычанняў: германізмы: драбы, мурлаты, шпонка, шыфер, легар, стальвагі, шухля, шпонка; балтызмы: пунька, склюд, парпліца, крынджалы, куль; цюркізмы: гарба, інбар; лацінізмы: комін, кватэра. Як бачым, гэта назвы канкрэтных прадметаў – прылад працы, прыстасаванняў і іншых рэалій. Не выключана, што назвы гэтыя запазычваліся разам з рэаліямі.

Калі характарызаваць семантыку прааналізаваных лексем, то неабходна адзначыць, што ў выключнай большасці гэта адназначныя словы, што цалкам зразумела – яны называюць канкрэтныя прадметы, рэаліі, (у іх дакладная прадметна-паняційная суаднесенасць), яны адносяцца да прафесійнай лексікі. І тым не менш у некаторых з іх назіраецца пашырэнне семантыкі, развіццё пераноснага значэння, а ў асобных выпадках – набыццё экспрэсіўна-эмацыянальнай афарбоўкі.

Так, некаторыя назвы канкрэтных прадметаў набываюць вытворныя значэнні, становяцца многазначнымі, полісемантычнымі. Полісемантызацыя, ці як яе яшчэ называюць, семантычная дэрывацыя (утварэнне многазначнай лексічнай адзінкі) адбываецца рознымі спосабамі, але найчасцей у выніку метафарычнага або метанімічнага пераносаў.

Прыклады метафарычнага пераносу, заснаванага на падабенстве формы рэалій: верацяно «прылада для ручнога прадзення ў выглядзе завостранай палачкі» > «вертыкальны шпянёк у жорнах», заварат «градкі бульбы, размешчаныя ўпоперак у канцы нівы» > «паварот ракі»; саха «шула, слуп» > «стоўб калодзежа»; паўпрыца «жалезны шворан у жорнах, на якім круціцца верхні камень» > «шпень у жорнах»; падабенства формы і месца размяшчэння: прыпечак «выступ у печы» > «выступ у калодзежы».

Метанімічны перанос адбываецца на аснове пераважна аб'ёмна-прасторавай сумежнасці. Тыпы пераносу разнастайныя: месца → чалавек, які там працуе: куратнік «пабудова для курэй» > «чалавек, які іх даглядае»; прылада працы → чалавек, які з ёй працуе: свердзел «інструмент для свідравання дзірак» > «свідравальшчык»; месца → прадмет, які там знаходзіцца, застрэшнік «застрэшак, край страхі, які навісае над сцяной» > «сноп саломы для застрэшка»; падваротніца «шчыліна паміж варотамі і зямлёй» > «дошка, якая кладзецца там; матэрыял → выраб з яго: паплёт «жэрдкі, латы» > «плот з жэрдак» шалёўка «тонкія дошкі, якія ідуць на абшыўку драўляных пабудоў» > «агароджа з дошак»: пэўны аб'ём рэчыва → мера яго: капа «невялікі стажок» → «адзінка лічэння, 60 снапоў» каромісел «каромысел» > «мера»

(два вядры), працэс → прадмет, які пры гэтым выкарыстоўваецца: строй «узвядзенне, збудаванне будынка» > «драўніна для будоўлі»; частка → цэлае: комлата «пакой» > «гарадскі дом», «хата».

Разгледжаныя тыпы метафарычнага і метанімічнага пераносаў выконваюць намінатыўную функцыю, паколькі ўтвараюць новае нейтральнае значэнне. Утварэнне намінатыўнай метафары, якое адбываецца ў межах канкрэтна-прадметнай лексікі, засноўваецца на падабенстве знешніх прымет прадметаў і выконвае класіфікуючую або ідэнтыфікуючую функцыю ў мове.

Ад намінатыўнай метафары неабходна адрозніваць вобразную метафару, якая выконвае, акрамя намінатыўнай, яшчэ і функцыю характарыстыкі прадметаў, і па гэтай прычыне мае яркую экспрэсіўную афарбоўку: баржа «вялікае пласкадоннае судна для перавозкі грузаў» > перан. «лянівая, непаваротлівае жанчына»; (аснова пераносу – асаблівасці дзеяння); заткала «скрутак з ануч, пакулля, якім затыкалі комін, пячную трубу» > перан. «брудная, неахайная жанчына» (аснова пераносу – знешні выгляд); капа «сена, салома, складзеныя конусам, невялікі стажок», > перан. «непаваротлівая, тоўстая жанчына» (аснова пераносу – форма); грынджалы «сані без розвальняў» > перан. «ногі» (аснова пераносу – форма); шклюд «цяслярская сякера для абчэсвання бярвення» > перан «худы чалавек», «скупы» ; акіянка «піла з тонкім палатном» > перан. «сварлівая жанчына» (аснова пераносу – унутраная асацыяцыя).

Агульным атрыбутам, на аснове якога адбываецца перанос назвы, з'яўляецца пэўная адзнака формы або знешняга выгляду рэаліі: «круглы», «аб'ёмны», «тонкі», «доўгі», «брудны». Адзначаны перанос заснаваны на прыблізным падабенстве аб'ектаў параўнання, у сувязі з чым у семантычнай структуры вытворнага значэння развіваецца сема «падобны на...» Паколькі падабенства тут недакладнае, параўнанне носіць утрыраваны характар, што і абумоўлівае экспрэсіўна-эмацыянальную канатацыю семантыкі і выклікае гумарыстычны эфект.

Метафарычны перанос на аснове якаснай характарыстыкі аб'ектаў, іх унутранага падабенства – даволі складаны семантычны працэс, заснаваны на пэўных асацыяцыях. Семантычная карэляцыя прамога і пераноснага значэнняў у гэтых выпадках апасродкаваная, яна ўскладняецца асацыятыўна-псіхалагічнымі напластаваннямі, выкліканымі ў свядомасці намінатара пэўнымі прыметамі і ўласцівасцямі рэаліі: шклюд (цяслярская сякера для абчэсвання бярвення з доўгім, тонкім лязом) → тонкі, завостраны → худы → згорблены → нязграбны → скупы (ланцужок асацыяцый); акіянка «тонкі, завостраны» > злы, сварлівы. Як бачым, перанос назвы ўскладняецца негатыўнай, зніжанай афарбоўкай. З усёй лексікі сустрэўся толькі адзін выпадак развіцця пераноснага значэння са станоўчай канатацыяй: падсяваха «сейбітка» > перан. «спрытная, рухавая жанчына».

Такім чынам, дыялектная лексіка Лоеўшчыны яскрава адлюстроўвае асаблівасці народнага жыцця і побыту, гаспадарчага ўкладу, гісторыі традыцыйнай культуры. Лексіка самабытная, яна вызначаецца яркім каларытам, дзякуючы празрыстай матываванасці, «жывой» унутранай форме. Разнастайная паводле семантыкі і сферы ўжывання, яна ў пераважнай большасці адносіцца да спрадвечных назваў і займае важнае месца ў агульнай лексіка-семантычнай сістэме народна-дыялектнай мовы.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Янкова Т. С.* Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. – Мн.: Навука і тэхніка, 1982. – 432 с.
2. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

Уладзімір КОВАЛЬ

З ЭТНАЛІНГВІСТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЛОЕЎШЧЫНЫ

У 1982 годзе ў выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшаў у свет «Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны», у якім змешчана каля сямі тысяч слоў і ўстойлівых словазлучэнняў. Аўтар названага слоўніка – былая загадчыца кафедры рускай мовы Гомельскага дзяржаўнага універсітэта дацэнт Тамара Сямёнаўна Янкова (1919 – 2005), якая руплівa сабрала, сістэматызавала і апісала гэтае моўнае багацце. Збор матэрыялу ажыццяўляўся Тамарай Сямёнаўнай у палявых умовах на працягу двух дзесяцігоддзяў, з пачатку 50-х і да пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя. У сярэдзіне 50-х гадоў ёю была абаронена кандыдацкая дысертацыя, дзе ўсебакова былі апісаны фанетычная і марфалагічная сістэмы, а таксама лексічны склад лоеўскіх гаворак. Асабліва падрабязна была даследавана Т. С. Янковай гаворка карэнных жыхароў Лоеўскага раёна, якая сумяшчае асаблівасці як беларускай, рускай, так і ўкраінскай моў.

У чым значэнне «Дыялектнага слоўніка Лоеўшчыны» для сучаснага мовазнаўства? Як і кожны рэгіянальны слоўнік, ён з'яўляецца важнай крыніцай для вывучэння лексіка-фразеалагічных, марфалагічных і фанетычных асаблівасцей аднаго са старажытных рэгіёнаў Усходняга Палесся. Варта звярнуць увагу на тое, што інфарматарамі Т. С. Янковай, як яна ў свой час расказвала аўтару гэтых радкоў, былі ў асноўным пажылыя людзі – пераважна малапісьменныя жанчыны 70–80-гадовага ўзросту як найбольш «кансерватыўныя» носьбіты дыялектнай мовы, якія ў найбольшай ступені захавалі яе асаблівасці. Слоўнік змяшчае лексіку, якая суадносіцца з асноўнымі фрагментамі моўнай карціны свету сельскага насельніцтва тагачаснай Лоеўшчыны: назвы прадметаў хатняга ўжытку, назвы страў, вопраткі, абутку, прадметаў жывой і нежывой прыроды, сельскагаспадарчыя тэрміны, тэрміны роднасці; назвы дзеянняў, стану, якасці, уласцівасці і г. д.

Аднак акрамя ўласна моўнай каштоўнасці, «Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны» з'яўляецца важнай крыніцай для вывучэння народнай духоўнай культуры – абрадаў, звычаяў, павер'яў, міфалагічных уяўленняў аб навакольным асяроддзі. Трэба адзначыць, што ў дыялектных слоўніках, выдадзеных у савецкія часы, было вельмі складана (па прычынах цэнзуры) змяшчаць матэрыялы, звязаныя з рэлігійнымі і народна-міфалагічнымі ўяўленнямі. Тым не менш, аўтары такіх работ (як і Т. С. Янкова, і аўтары шырока вядомага «Тураўскага слоўніка») прыкладалі ўсе намаганні, каб захаваць для нашчадкаў каштоўнейшую этнакультурную інфармацыю.

Так, у слоўніку прыводзіцца ўстойлівае словазлучэнне *гуляць дажынкі* «спраўляць заканчэнне жніва». Аднак апісанне звычаю, што даецца ў ілюстрацыйным прыкладзе, толькі часткова суадносіць яго з дзеясловам *гуляць* «святкаваць»: перш за ўсё тут выяўляецца сувязь названага зварота з вельмі архаічным звычаем «завівання барады». Яго сакральны сэнс заключаецца ў тым, каб аддзячыць духу поля, маці-зямлі за добры ўраджай і забяспячыць ураджай будучага года. Менавіта таму ў гэтым выпадку адбываецца прынясенне звязаным разам і ўпрыгожаным стужкамі каласкам («барадзе») своеасаблівай ахвяры – хлеба-солі: *Гуляюць, п'юць, у каласкі сольку, хлеб пакладуць, бораду зделаюць, на каласках пазаўязуюць – от і гуляюць дажынкі.* (Ручаёўка).

Яшчэ адзін звычай – калядаванне – даволі добра захаваўся да нашых часоў. На Лоеўшчыне ён называецца *вадзіць казу*. Як і ў папярэднім выпадку, прыведзены ў слоўніку ілюстрацыйны прыклад у сціслай форме раскрывае змест звычаю, які для інфарматара ў 50-х – 60-х гадах мінулага стагоддзя асэнсоўваўся ўжо як несучасны, аб чым сведчыць прыслоўе *калісь*: *У нас калісь ваділі козу: з песнямі хаділі па хатах, адін хлопец надееццца козою, танцуе, усе пеюць спецыяльные песні.* (Ручаёўка).

У вёсцы Чаплін Т. С. Янковай былі занатаваны звесткі аб куцці – абрадавай вячэры, якая тройчы праводзіцца з 7 па 19 студзеня: *посная куцця, першая куцця* «абрадавая вячэра перад Калядамі». *На посную куццю варым посны боршч, кашу, узвар; багатая куцця* «абрадавая вячэра перад Новым годам». *Багатая куцця проці Новага году, тады скаромнае можна есці; трэцяя куцця* «абрадавая вячэра перад Вадохрышчам». *На трэццюю куццю поснічаюць, ходяць у цэрквy.*

Адным з увасабленняў культу продкаў з'яўляецца абрад *дзяды*, у час якога гатавалася памінальная ежа, а старэйшыя члены сям'і расказвалі дзецям аб добрых справах іх дзядоў і прадзедаў, бабак і прабабак: *дзяды* «памінальны дзень». *Деды му ж правілі. Кашу, боршч вараць, на стол стаўлеюць: деды ж нашы памерлі.* (Дзяражычы).

З ушанаваннем продкаў мае непасрэдную сувязь зварот *пакачаць яйцо (яечка)* «прыгадаць памерлага, прыйсці на могілкі з ядой». У «Дыялектным слоўніку Лоеўшчыны» да гэтага фразеалагізма прыведзены адпаведны ілюстрацыйны прыклад: *Тые небожы, што пабралі ее добро, дак і ейца не пакачаюць, і скацеркі не засцелюць. Ніколі на могілкі не прыде пакачаць яечка.* (Дзяражычы). Несумненна, у гэтым кантэксце знайшлі адлюстраванне добра вядомыя на Усходнім Палессі ўяўленні, што маюць дачыненне да Радуніцы. Адным з элементаў памінання продкаў у гэты дзень з'яўляецца наведванне могілак з абавязковай рытуальнай ядой для ўсіх членаў сям'і (шырэй – роду) і іх продкаў. Качанне велікоднага яечка, што сімвалізуе жыццё, яго перамогу над смерцю, па магіле – несумненна, архаічны магічны акт, які мае мэтай не толькі выражэнне павагі да памерлых і памяці аб іх, але і «запрашэнне» продкаў да сумеснай ежы.

З пункту погляду этналінгвістыкі – навукі, што вывучае моўныя адзінкі «праз люстра» традыцыйнай народнай культуры, – вялікую цікавасць выклікаюць цалкам нематываваныя ўстойлівыя звароты, у склад якіх уваходзяць словы-кампаненты, маючыя этнакультурную маркіраванасць. Выдатнай ілюстрацыяй такога тыпу зваротаў можа служыць лоеўскі дыялектны фразеалагізм *аддаць дзяжу з цестам* «аддаць усё, што можна». *А ты ему хоць і дежу з цестам аддай, а ўсё мала, і ўсё не ўгодіш.* (Дзяражычы). На першы погляд, гэтае ўстойлівае словазлучэнне не толькі не ўтрымлівае ніякага «падтэксту», але і з'яўляецца алагічным па зместу (дзяжа з цестам = нешта вельмі каштоўнае; тое, чаго нельга аддаваць). У сферы народнай духоўнай культуры дзяжа маркіруецца як сакральны прадмет, звязаны (праз сувязь дзяжы з «нараджэннем» у ёй цеста) з уяўленнямі аб дзетанараджэнні.

Адпаведна і адносіліся нашы продкі да дзяжы вельмі далікатна, з асцярожнасцю і павагай – як да цяжарнай жанчыны. Дзяжу, у прыватнасці, трэба было трымаць на адным і тым жа месцы, ні ў якім разе не мыць яе гарачай вадой (і тым больш – не скрэбці нажом) і ніколі не выносіць з дому, не пазычаць суседзям. У адваротным выпадку, як лічылася, дзяжа «пакрыўдзіцца», і ў ёй не будзе падыходзіць хлеб.

Для дыялектнага дзеяслова *атамшчаць* «адпомшчваць» у слоўніку прыводзіцца наступны даволі паказальны кантэкст: *Калісь атамшчалі: бралі след у людей. Ета знахарства е на Украіне.* (Ручаёўка). Выраз *браць след* рэпрэзентуе адзін з прыёмаў шкаданоснай («чорнай») магіі: для навядзення сурокаў ведзьма або калдун у літаральным сэнсе слова бралі (г. зн. зразалі шырокім нажом ці лапаткай з зямлі) след чалавека (аб'екта закляцця), вымаўлялі адпаведную замову ці праклятце з пажаданнямі хваробы або смерці.

Увогуле вера ў вядзьмарства, у «чорнае вока», у здольнасць чалавека сурочыць вельмі распаўсюджана і ў наш час. Адпаведныя павер'і знайшлі адлюстраванне і ў «Дыялектным слоўніку Лоеўшчыны»: *уракнуць* «сурочыць». *Як я красівая, здоровая, дак могуць і ўракнуць.* (Дзяражычы). *Адна мне ўракнула: у цебе печ чыстая, дак забалелі рукі.* (Ручаёўка); *урочлівы* 1.«той, хто здольны сурочыць». *Ён такі ўрочлівы чалавек: як пагледіць, дак ты абезательна захварэіш.* (Бывалькі); 2. «той, каго можна сурочыць». Я не ўрочлівая, я не баюся ўрокаў. (Дзяражычы). *А мая Таня дак часта хварэе, такая ена ўрочлівая: як толькі етая баба пагледіць, абезательна ее ўсю ператрэ, перахварэе.* (Чаплін).

Агульнапашыранымі з'яўляюцца ўяўленні аб тым, што ведзьма можа нанесці вялікую шкоду селяніну – пазбавіць яго поле ўрадлівасці, зрабіўшы на яго полі залом. На Лоеўшчыне для гэтага тэрміна існуюць дыялектныя адпаведнікі – *за́вітка* і *за́віць*. Каштоўнасць наступных прыкладаў заключаецца не толькі ў тым, што ў іх даецца апісанне магічнага дзеяння, але і прыводзіцца прыклад нейтралізацыі вядзьмарства: завіткі «залом». *Дядна завіткі завівала ў жыці, у чом яшчэ, да як прыйде ўрэмя, дак на берозах завівала, а наша баба ўмела развіваці етые завіткі.* (Ручаёўка). *Завіткі на полі. Каб хто ўмер, хто на каго злы, каб валы ці коровы подохлі.* (Чаплін); *завіць* 'залом'. *Еныя завіці бегаюць завіваць на русалнай неделі. Завіці люді не беруць: баба загадае перэвітак наламаць з сухога лазу і паліць завіць.* (Дзяражычы).

Пакаранне за вядзьмарства, паводле народных уяўленняў, непазбежна прыдзе «зверху», ад нябёсаў, ад Бога ці Іллі-прарока. Як можна меркаваць па аднаму з прыкладаў, занатаванаму ў разглядаемым слоўніку, менавіта за тое, што змеі (вядзьмаркі) «адбіралі» ў кароў малако, іх «убіў гром» (г. зн., маланка): змяя «жанчына-вядзьмарка». *Калісь бувала на Корчомцы бабу булі, змеі, шо молоко адбіраюць – ото шо гром убіў.* (Ручаёўка). Магчыма таксама супрацьдзеянне вядзьмарству і «знізу», ад звычайных людзей. Асноўны прыём нейтралізацыі варожых чараў у такім выпадку – вербальная засцерагальная магія, якая можа быць рэалізавана звычайным праклятцем: *А што б цябе вохват ухваціў! (вохват «нячысты, чорт»).* (Первамайск); *Шоб цебе перань асмаліў* (*перань* «пярун, гром»). (Ручаёўка). Больш радыкальным сродкам пазбаўлення ведзьмаў іх небяспечнага чаравання з'яўляецца лаянка, вымаўленне непрыстойных слоў. Па названай прычыне выкарыстанне «мацюкоў» супраць ведзьмаў нельга лічыць непрыстойнасцю: *Прыходзяць две етроўкі-ведьмачкі, а мой чалавек на іх мацюком!* (Ручаёўка).

Прыведзены матэрыял сведчыць аб значнай каштоўнасці «Дыялектнага слоўніка Лоеўшчыны» як важнай і аўтарытэтнай крыніцы этналінгвістычных даследаванняў.

Елена ХОЛЯВКО

К ПРОИСХОЖДЕНИЮ ЛОЕВСКИХ ЛЕКСЕМ *калдун* и *каўтун*

Широко распространенные на Лоевщине созвучные лексемы *калдун* и *каўтун* не имеют, на первый взгляд, семантического сходства. Для первого слова свойственна кулинарная семантика: «варэнік з цёртай бульбы з мясам»: *Мучны варэнік з м'ясам, дак ета пільмені, а еслі тараньыя картоплі з м'ясам, дак ета калдун* (Первамайск) [1, с. 148]. Вторая лексема многозначна. Доминирующим является значение болезни волос: «каўтун»: *У яе на галаве каўтун, ён з ляку бывае і з таскі* (Чаплін). Периферийные значения явно производные: «зблытаныя валасы»: *І не стыдна табе, ты ж велікая девачка, а галавы не рашчэшаш – каўтун на галаве* (Дзяражычы). Последнее значение, также возникшее в результате метафорического переноса по внешнему виду, отражает ироничное отношение: «від жаночай прычоскі»: *Пасаділа каўтун екі на галаву, ён табе не прылічна* (Чаплін) [1, с. 155].

Лоевские лексемы имеют общее происхождение и некогда обнаруживали семантическую общность и друг с другом, и с общелитературным наименованием человека, занимающегося магической деятельностью.

Авторы ЭССЯ полагают (анализ других этимологий см. ЭСБМ 4, с. 145–148), что первоначальное значение современного *колдун*, этимологически тождественного **kъltunъ*, – «тот, кто путает, закручивает, например, колосья, со злым умыслом», в обоснование чего приводят производные разветвленной глагольно-именной семьи с этим корнем **kъlb-/*kъld-/*kъlm-/*kъlt-* (ср. укр. диал. *ковба́ситься* «скручиваться (о нитках)» и рус. диал. *ко́лбасить* «колдовать» [2, 13, с. 185]. Этот ряд можно продолжить за счет бел. диал. экспрессивных глаголов *накоўба́сіць* «няроўна напрасці» [3, 3, с. 136–137], *кілба́сіца* «блытаць» [4, 5, с. 32], а также бел. диал. *калтун, каўту́н, коўту́н* «колтун; пучок волос; колосья, закрученные со злым умыслом» [5, 2, с. 380, 508], восходящего к праслав. **kъltunъ*.

Факт этимологического родства праславянских лексем и наличие возможной семантической мотивации бел. *каўтун* «болезнь, напускаемая колдунами» позволил В. Л. Вереничу установить отношения производности между **kъldunъ* > **kъltunъ* [6, с. 57]. «Назіраецца пэўная сінанімічнасць Каўтуна з заломам на полі, у кожным разе супадаюць персанажныя, хранатопныя ды іншыя коды пазбаўлення ад іх, якія адназначна сцвярджаюць прыналежнасць Каўтуна, як і залому, да сферы ўмяшання нячыстай сілы і чарадзеяў» [7, с. 237].

Однако вслед за авторами ЭССЯ можно признать генетическое тождество данных лексем с общей архесемой «гнуть, вязать». Тогда становится понятной причина семантического параллелизма исходных единиц: например, в белорусских говорах *калтун, каўтун* и *калдун* могут выступать как дублетные в значениях «каўтун»: *Некалі казалі і што як калтун сав'ецца – астрігаць нельзя. Валасы саб'юцца ў калтун і атрасце, яго абрэзаць і трэба несці закапаць, не аглядаючыся. Каўтун – то такі кумяк валасоў, што неможно яго расчасаць, абрэзаць, бо ўпадзе ў мозгі – і памрэш. Мусі, нячыстая сіла вяжа гэтого каўтуна. Мела дзеўка калдун: салдаты спужалі – і калдун стаў. Казалі, што калдун нельзя зразаць, як зрэжаш – здурэеш;* «жмут валасоў, які выкарыстоўваецца для прычоскі»; «наўмысна зробленая ў жыце закрутка з каласоў са злым намерам»: *Некалі казалі: калдун у жыця, ні чапай калдуна, нада яго абжаць, нехта пакалдніў;* «пакручанае бурай збожжа»: *Віхор паклаў жыта і павіў у калдуны, і сярпом не звернеш;* «амяла» [2, с. 379–380].

Семантический параллелизм свойствен также рус. зап. *колдуны, колтуны* «вареники с мясом» [8, 2, с. 135], *колтуны, колдуны* «блюдо или яство, приготовляемое в западн. губ., пельмени» [8, 2, с. 143].

Учитывая бел. *калду́н* «страўнік» [5, 2, с. 371], можно предположить следующий путь формирования кулинарного значения: «отварная требуха» → «вареники, пирожки с требухой» → «вареники с мясом» [4, 4, с. 149] с исходной семантикой изогнутости, характерной для наименований желудка (см. например, бел. *коўб* «страўнік» [4, 4, с. 139]). Однако можно предположить и другие способы номинации: например, по наименованию начинки (первоначально) из рубленого («крученого») мяса или по признаку способа приготовления, поскольку любая начинка *заворачивается* в тесто. Не исключено также название вареников, пельменей, пирожков по признаку изогнутой формы, что также не противоречит семантике исходного корня. Таким способом оформилось значение заимствованной лексемы *пельмень* [9, Ш, с. 230], а также ряда исконных, например: рус. диал. *вушки* «вареники с рубленым вареным мясом» [10, с. 69]; бел. *камы* «клёцкі, начыненыя мясам» [5, 2, с. 392] и др.

Итак, общая семантика *колтун* сводилась к обозначению пучка ниток, пеньки, волос, колосьев – всего, что объединено общей семой гибкости, откуда потом вполне логично формируются семемы «болезнь» и (бел. диал.) «колосья, закрученные со злым умыслом».

В связи с этим становится более отчетливой глубинная структура семантики общеслав. **kъldunъ*, воплотившегося, например, в рус. диал. *колдун* «кто колдует, чародей, волхв, волшебник, знахарь; ворожея, гадатель» [8, 2, с.135], бел. диал. *калдун* «колдун, волшебник» [5, 2, с. 371].

Что же касается лексемы **kъldunъ* «чародей», то она оказывается «порождением земледельческой идеологии» [11, с. 307], поскольку «...у славян продолжалась, причем так и не завершилась сублимация более низовых антропоморфных анимистических представлений и их обозначений. Поэтому для древнеславянских верований более присуще наличие относительно примитивной магии, колдовства» [12, с. 171], что вполне совместимо с представлением о колдуне как «лице, закручивающем колосья со злым умыслом» (ср. смол. *заломы заломляць* «способ колдовства на растущем хлебе с целью отнять урожай или принести несчастья и болезнь хозяину поля» [13, 10, с. 220], бел. *зало́мщица* «колдунья, делающая заломы в стоячем на поле хлебе» [14, с. 173], отсюда экспрессивность, уничижительность наименования.

Действительно, номинации лиц, занимающихся магической деятельностью, соотносятся с названиями этой деятельности, что подтверждается наличием синонимичных наименований колдуна: *наузник* и *узольник* «знахарь, занимающийся навязыванием амулетов» [15, с. 79], *на́узник* и *на́узница* «колдун, ворожея, знахарь» и соответственно *на́узить* «колдовать, знахарить, заговаривать, нашептывать» [8, 2, с. 488]. «В Малороссии колдун называется *каверзник*, т. е. вяжущий, что соответствует тверскому *наузник* собственно делающий наузы» [16, с. 369], поскольку «вязать значит колдовать» [16, с. 368]. В эту же группу входит прибайк. *кобе́нник* «колдун» с толкованием: *«Кобенник хлеб заломит»* [13, 13, с. 357].

Дополнительным аргументом в пользу существования взаимосвязи между витьем, вязанием и колдовством является общеслав. **kuzlo* (производное с суффиксом *-zl-* от корня **kovati, *kujQ*), реализовавшееся в бел. диал. *ку́зла* 'закрутка из хлебных колосьев в поле, сделанная с колдовской целью' [5, 2, с. 558–559], чешск. *kouzlo* «колдовство, чары», слвц. *kúzlo*, в.-луж. *kuzło* в том же значении [2, 13, с. 142–144] и **kuzlarъ*: ст.чешск. *kuzlléř* «волшебник», в.-луж. *kuzłać*, н.-луж. стар. *kuzłać* «чародей, волшебник» [2, 13, с. 142].

Аналогичный семантический переход наблюдаем в рус. диал. *ку́клы* «колосья ржи или овса, особенным образом завязанные с левой руки на правую» (они делаются колдунами на чью-нибудь голову или на чей-нибудь скот или хлеб. Кто снимет куклу, тот будто бы умрет) → «колдовство» в тех же орловских говорах [17, с. 195]. В белорусских говорах данная лексема помимо указанного значения «кузла» (*Нехта закруціў куклу ў жыця, мусіць, нешта заваражыў, кап ты галавой налажыў*) [5, 2, с. 561] имеет обрядовое значение «борода» – «звязаны пучок нязжатых каласоў, што пакідалі ў час дажынак жыта» (*Трэба куклу закруціць, казалі раней, палолі, каменьчыкамі абкладалі, хлеп клалі, дажынкі спявалі*) [5, 2, с. 561], что подтверждает нашу мысль о единых мифологических истоках соответствующих верований; а также ряд конкретных значений, обусловленных первичной семантикой корня **kuk-* [4, 5, с. 150]: «скрутак валакна льну, канапель», «жаночая прычоска» [5, 2, с. 561].

Таким образом, с учетом исходной семантики представляется естественной негативная маркированность семантики *колдун* и производных значений. Характерно, что эта негативная коннотация, предопределенная мотивирующим признаком, отчетливо ощущалась даже в хронологически продвинутых текстах с заметным христианским влиянием, о чем свидетельствует следующий способ смыслового различия между номинациями с общей семемой «чародей». Так, «не нужно смешивать колдуна со знахарем; разница между ними та, что колдун – отщепенец веры, не носит креста, не ходит в церковь, а если и ходит для виду, то не молится, если причащается, то не глотает святые Дары, всем вредит, но не пользует; напротив, знахарь – человек совершенно другого закала, он истинный христианин, он врач и благодетель для всей окрестности, но не враг, он не портит, а выгоняет порчу, на что у него есть свои приметы» [18, с. 221]. Аналогичный подход наблюдается в следующем контексте: «Даўней, як *калдун* зробіць *плахое* на доўгае врэмя, то шукалі *знахара* каб адрабіў» [5, 2, с. 371].

В связи с этим появление у лексемы *колдун* вторичных значений, характеризующихся ослабленной негативной маркированностью либо ее отсутствием, можно объяснить забвением мотивирующего признака, расширением исходного семантического объема, влиянием парадигматических связей внутри лексико-семантической группы. Речь идет о значениях типа *колдун* «знахарь» (пермск., арх., ворон.) [13, 14, с. 117]. В словаре В. И. Даля понятие *колдун* определяется

через синонимию «чародей, волхв, волшебник, знахарь; ворожея, гадатель» [8, 2, с. 135], показательны также в связи с этим диал. значения глагола *колдовать* «гадать, ворожить», «лечить с помощью наговоров» [13, 14, с. 116].

Кроме названных причин здесь следует отметить возможность номинации лица, обладающего сокровенным знанием, по наименованию субъекта, занимающегося чародейством. Развитие вторичной магической семантики регулярно развивается на основе исходного признака кривизны и отражает представления об этой сфере иррациональной деятельности [19, с. 83–92]. В таком случае признак номинации лексемы *колдун* может интерпретироваться более широко: как лица, одаренного «вещею силой», выполняющего магические функции, деятельность которого отлична от обыденности и восходит к жреческой практике.

ЛИТЕРАТУРА:

1. *Янкова Т. С.* Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. – Мн.: Навука і тэхніка, 1982.

2. Этимологический словарь славянских языков: Праславянский лексический фонд / Под ред. О. Н. Трубачева. – М.: Наука, с 1974.

3. Тураўскі слоўнік: У 5 т. / Склад. А. А.Крывіцкі, Г. А.Цыхун, І. Я.Яшкін і інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1982–1987. – Т. 1–5.

4. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Рэд. В. У. Мартынаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1978–1993. – Т. 1–8.

5. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: У 5 т. / Рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979–1984. – Т. 1–4.

6. *Вярэніч В. Л.* Аб беларуска-польскіх ізалексах // Беларуская лінгвістыка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976. – Вып. 10. – С. 56–63.

7. *Валодзіна Т.* Каўтун // Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – С. 237–238.

8. *Даль В. И.* Толковый словарь живого великорусского языка: В 4 т. – М.: Русский язык, 1989–1991.

9. *Фасмер М.* Этимологический соварь русского языка: В 4 т. / Пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева / Под ред. и с предисл. Б. А. Ларина. – 2-е изд., стереотипное. – М.: Прогресс, 1986–1987.

10. *Расторгуев П. А.* Словарь народных говоров Западной Брянщины: Материалы для истории словарного состава говоров. – Мн.: Наука и техника, 1973. – 296 с.

11. *Трубачев О. Н.* Славянская этимология и праславянская культура // Славянское языкознание: X Межд. съезд славистов: Докл. сов. делегации. – М.: Наука, 1988. – С. 292–347.

12. *Трубачев О. Н.* Этногенез и культура древнейших славян: Лингвистические исследования. – М.: Наука, 1991.

13. Словарь русских народных говоров / Под ред. Ф. П. Филина. – М.–Л.: Наука, с 1965.

14. *Насовіч І. І.* Слоўнік беларускай мовы. – Мн: БелСЭ, 1983.

15. *Афанасьев А. Н.* Древо жизни: Избранные статьи / Подготовка текста и коммент. Ю. М. Медведева, вступит. статья Б. П. Кирдана. – М. Современник, 1982.

16. *Потебня А. А.* Слово и миф. – М.: Правда, 1989.

17. *Буслаев Ф. И.* Исторические очерки русской народной словесности и искусства. – СПб, 1861.

18. Русский народ: Его обычаи, обряды, предания, суеверия и поэзия / Собр. М. Забылиным: Репринтное воспроизведение издания 1880 г. – М.: Автор, 1992.

19. *Холявко Е. И.* Отражение мотива кривизны во вторичной семантике русского и белорусского слова. – Гомель, УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 2002.

Тамара КРУЧЭНКА

З ГЛЫБІНЬ ЖЫВАТВОРНЫХ

Лутава: планета Вернасці

Цяпер я ведаю яшчэ шмат адмецін гэтай зямлі, што прыцягваюць да сябе. Не, не толькі Дняпро... Бэзавым раем, песенным краем хачу назваць зямлю лоеўскую, якая ў кастрычніку 2005-га стрэла сваё 500-годдзе.

У маі мы разам з прафесарам кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны Валянцінай Новак не маглі налюбавацца зараснікамі бэзу. Якіх толькі колераў і відаў няма яго на Лоеўшчыне! У пухнатыя гронкі ныралі тварамі. І наўкол у паветры чулі гэты п'янкі пялёсткавы водар. А завіталі, каб паслухаць песні народнага фальклорнага гурта «Лутава». Жанчыны спявалі на сцэне Сяўкоўскага СДК для работнікаў культуры з усяго раёна на семінары па народнай творчасці. Здавалася, іх песня вырывалася з грудзей, ёй было цесна і ў той прасторнай канцэртнай зале... Яна неслася ў аксаміт-ныя лугі, да іх родных вёсак Старой і Новай Лутавы, Глушца, да люстраной роўнядзі аднайменнага возера. А абрысы твараў святліліся такой дабрынёй, што з кожнай можна пісаць абраз. І як тут было не адгукнуцца на запрашэнне гасцінных жанчын даехаць у іх бацькоўскі куточак, адкуль вытокі іх долі, іх песень. Рушылі разам з метадыстам раённага метадычнага цэнтра народнай творчасці Марыяй Шумігай і дырэктарам Лоеўскага РДК Ларысай Фёдаравай у бок Лутавы, туды, дзе абсягі нашай Беларусі нібы адразаюцца Дняпром ад старажытнага ўкраінскага Любеча.

Мікрааўтобус спыніўся ў Глушцы, на беразе возера, непадалёк ад сціплага абеліска ў бэзавым атачэнні. «Давайце паклонімся нашым салдацікам», – прамовілі спявачкі. Мы ўчытваліся ў залацістыя радочкі надпісу і дранцвелі ад адчування, на якой святой зямлі стаім: «На гэтым плацдарме ў ноч з 1 на 2 кастрычніка 1943 года батальёны 467 стралковага палка аднымі з першых у 81-й Калінкавіцкай Чырвонасцяжнай ордэна Суворава стралковай дывізіі фарсіравалі раку Днепр. Гэта было пачаткам наступлення дывізіі ў складзе войскаў 61-й арміі па вызваленню Беларусі. За адзнакі ў баях пры фарсіраванні Дняпра і расшырэнні плацдарма імя Герояў Савецкага Саюза ўдастоены...» 22 мужчынскія прозвішчы, па якіх можна чытаць каардынаты абаронцаў Айчыны.

Тут, на маляўнічым узбярэжжы возера Глушэц, каля помніка лутаўчанкі заспявалі рускамоўную «Седину». І ўзносіліся над хвалямі, ляцелі ў паднябессе згукі, што краналі да слёз:

«Сколько бед, сколько бед принесла нам война!
Седина, ты моя, седина...»

Песня – і як люстэрка іх уласных лёсаў.

Вольга Рэвянок:

– Наша зямлянка была адна на ўсю вуліцу. Дзверы нізенькія. Кожную ноч салдаты прасіліся на начлег. Я да капітана ведала адзнакі. Гукі снарадаў вызначала. Чую, ляціць, і я «бух» на зямлю як той салдат.

Здаецца, я твары іх помню. Мне дванаццаць гадоў было. Адзін зайшоў неяк, мабыць туркмен. Пілотачка ў яго маленькая. Мама гаворыць: «Шапачка ў цябе малая». Ён маміны словы пераказаў так: «Малы шапка».

Пасля фарсіравання Дняпра тут уся зямля была перавернута, зрыта бліндажамі, акопамі. Рыдлёўку нельга было ўсадзіць – скрозь метал. Я знайшла салдацкую сумку з-пад патронаў. Мама пашыла мне з яе кофтачку і спаднічку.

Тры дзядзькі мае на фронце загінулі. Памятаю, як у Дзень Перамогі 1945-га мы з мамай галасілі па іх. А ў 60-я лёс адносіў мяне далёка адсюль, аж у Таганрог. Паўтара гады адрабіла на заводзе «Красный котельщик» электразваршчыцай, была стахановкай. Ды не вытрымала ад тугі па дому, вярнулася ў Лутаву. Працавала даяркай і цялятніцай. А як сталі мы спяваць, заўважыла нас Ірына Аляксандраўна Рудзько, тагачасны кіраўнік раённага аддзела культуры. Добра дапамагалі нам баяністы, два Пятры – Бондар і Плюшчай, а цяпер Эдуард Пархоменка. Нізкі паклон ім!

Марыя Цыбульнік:

– Возера наша было чырвонае ад крыві людской. І я, шасцігадовая, ужо не баялася з іншымі дзецьмі па трупах набрынялых у вадзе, як па падушках, вунь там, у Баброўніку, да Дняпра пераходзіць... А на зямлі, там, дзе ляжаў паранены ці забіты – трава парасла высокая, чорная.

Маліцесь Богу, што мы перацеглі ўсё, вынеслі... Лёс так распарадзіўся, што сынок мой, Мікола, на вайну ў Афганістан трапіў. Вярнуўся паранены. Цяпер яму сорак восем, працуе ў Лоеве.

Таццяна Хлебіна:

– Я ў бацьку ўдалася, чарнявая. На вайну ён пайшоў з двума сынамі, Грышам і Васілём.

Неяк у шпіталі сніцца бацьку: здаравушчая свіння, цэнтнеры тры, у канцы нашага агарода рые, ды так, што ў розныя бакі косці ляцяць, кавалкі мяса. Бацька ўстаў, а адзін з суседзяў па ложку пытаецца: «Чаго, Паўлуша, не спіш?» «Знаеце, хлопцы, – адказвае бацька, – такі сон бачыў, што ўсяго б'е. Пэўна, дома нешта не так». А адзін паранены запытаў: «У цябе сыны ваююць? Два? Напэўна, на самым канцы вайны аднаго з іх не стане». Бацька тады за Грышу хваляваўся, бо ён усю вайну быў на перадавой, пайшоў з дому яшчэ ў 1938-м, на дзяйсцвіцельную... А не стала Васіля, меншага. Ён загінуў за чатыры дні да Перамогі, 5 мая 1945-га, на рацэ Одэр, у Германіі... А ў той час яны ўжо з Грышам марылі пра сустрэчу, бо часці іх на той момант злучыліся, нага ў нагу ішлі...

У гасцінным, хлебным доме Хлебіных, што на ўскрайку Глушца, мы слухалі народныя песні-споведзі «Лутавы». У па-святочнаму прыбранай святліцы, з цэлым іканастасам абразоў, і спеў жанчын у нацыянальных строях падаўся нам як святая малітва ўдоў. За мілога, што «павёў за Дунаем каня запрагаці», за сястру-удавіцу, што прасілася ў брата перазімаваць, а той не пусціў, калі прызналася: «У мяне дзетак небагата, усяго восем, я дзевята...» Якая ж яна сугучная сённяшняму нашаму жыццю, гэта народная песня! І ці ж ведамы ёй межы? Водгукі яе ляцяць цераз Дняпро, на Украіну, і не ўгадаць, чый жа на самой справе гэты жураў, што

хадзіў па беражку? Ці той казак, што ехаў «па нявесту, – пад капытам камень трэснуў, салавейка ў гаі свіснуў?...» Спаконвечная, радзінная, славянская, наша песня!

Ой, хто каго верненька любіць,
Той прыйдзе, прыйдзе праз воду...

Тамара Шапавал, кіраўнік «Лутавы»:

– Вы ўпэўніліся, што жывучы тут, у гэтай прыродзе, не спяваць нельга. «Лутава» – гэта маё жыццё. Працую ў бібліятэцы, у 45-гадовым узросце скончыла культпрасветвучылішча. Спяваем мы разам 21 год. Я ўдзячна сваім жанчынкам, што ў любую пару пакліч іх для выступлення – і яны збяруцца. Прытупаюць, як ні цяжка, праз гэтыя два кіламетры між вёскамі, ці коніка запражэ Марыя Цыбульнік, і з'едуцца. А такіх песень, як у нас, вы нідзе не пачуеце!

Валянціна Кошчанка:

– Увесь век тут жыву, у Глушцы. Дваццаць гадоў на ферме адпрацавала. Дзяцей было чацвёра, цяпер трое... З маім лёсам... Калі б я не ездзіла спяваць, то ці б жыла?

Галіна Чэрнянок:

– Я таксама глушэцкая. Вельмі люблю «Ой, хадзіў жураў». Яна мне лёгка спяваецца. Дзеці раз'ехаліся, толькі Валя бліжэй усіх, у Бывальках. Дачка і сын у Мінску жывуць, яшчэ адзін сын у Добрушскім раёне. Васьмёра ўнукаў маю.

Вера Рэвянок:

– А мяне ў Лутаву аж з Магілёўшчыны занесла. Колісь у тую ж школу хадзіла ў Александрыі, што і Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, наш Прэзідэнт.

Ужо паўвека на Гомельшчыне. Спачатку працавала па размеркаванню пасля сельгастэхнікума ў Брагінскім раёне. Аграномам, брыгадзірам, даяркай, бібліятэкарам, пошту насіла 14 гадоў. Гаспадар мой памер, сын жыве ў Светлагорску, дачка – на Буда-Кашалёўшчыне. А песня мая любімая «Расці, расці калінонька...».

Ды не, не толькі лірычны рэпертуар у «Лутавы». Ёсць і задзірыстыя прыпеўкі, што клічуць ускокі, накшталт:

Палюбіць, дык палюбіць
Прыгожага, вясёлага!
А такога – нечага,
Каторы дрэме з вечара!

І з сябе саміх лутаўчанкі могуць паіранізаваць, прыгадаць прымаўку: «Пела, як бацькоўскі хлеб ела, а як стала свой, дык і голас не той!».

«Лутава» – народны гурт у самым высокім вызначэнні слова. Мару пра тое, каб калектыў адзначылі на дзяржаўным узроўні, узнагародзілі адпаведна за беражлівае захаванне песень і абрадаў роднай Беларусі. Яны шмат ездзяць, выступаюць. Былі і ў Чачэрску, на абласным фестывалі фальклору. Шчодра дзеляцца сваім майстэрствам з дзіцячым гуртом-спадарожнікам у вёсцы Сяўкі. Перадаюць дзяўчаткам-школьніцам калядныя, купальскія, вясельныя песні сваіх матуль. Згадваюць ім пра перажытае: як пасля вызвалення краю з вясковымі ўдовамі ўпрагаліся і валачылі за сабой плугі. Каб узараць і засеяць палеткі, вырвацца з нішчымніцы і гора. Нядаўна натхнёных спявачак слухалі «Песняры».

Для ўсіх іх, лутаўчанак, застаецца Радзімай гэты лапік зямлі ў пойме Дняпра. Галоўны рубеж іх лёсу, з якога ўжо не сысці ім у нябыт безыменнымі. Спявайце, цётачкі!

Тамара КРУЧЭНКА

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ

Дзяражычы: свяшчэнны куток радзімы

Вёска Дзяражычы ў Лоеўскім раёне прасціраецца па ўзвышаным беразе Дняпра. Гледзячы з яго вышыні ўніз, бачыш своеасаблівыя тэрасы-напластаванні. Уяўляеш, якой шырокай была рака калісьці.

Восенню 1943-га тут ішлі жорсткія баі, гітлераўцы моцна замацаваліся: дзотамі, бліндажамі, рознымі сховішчамі, траншэямі быў зрыты бераг. Свяшчэнны гэты куток беларускай зямлі шчодра паліты крывёю нашых салдат і камандзіраў.

У свой час начальнік палітаддзела 55-й Мазырскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. Б. Івушкін у кнізе «У грозныя гады» успамінаў: «Бой за вышыню 111,5 ішоў амаль суткі. Вораг прадпрымаў чатыры контратакі пад прыкрыццём танкаў, імкнучыся любым чынам вярнуць вышыню. Не раз ствараліся тут крытычныя сітуацыі. Аднак бралі верх беззаветная адвага і высокае воінскае майстэрства нашых байцоў і камандзіраў».

1322 воіны 61-й і 65-й армій, удзельнікіў фарсіравання Дняпра на Лоеўшчыне, знайшлі спачын у брацкай магіле ў вёсцы Дзяражычы. Тут пахаваны і дзесяць Герояў Савецкага Саюза: рускія Аляксей Еўдакімаў, Мікалай Міхайлаў, Васіль Пічугоў, Мікалай Яромушкін, Барыс Самсонаў, украінцы Павел Скалацкі, Іван Перахода, узбек Абдусалім Дзехканбаеў, казах Ідрыс Ургенышбаеў, якут Фёдар Папоў.

82-гадовая Вольга Антонаўна Корж, карэнная жыхарка Дзяражыч, згадвала, што вызваленне гэтых мясцін далося вялікай цаной: «Столькі было пабіта вайскоўцаў, што ступіць не было куды». І 17-гадовы брат гэтай жанчыны, Міхаіл, загінуў і пахаваны ў гэтым мемарыяле. Пры сустрэчы з гэтай жанчынай падумалася: відаць, і мацуе яе Усявышні, дае сілы для жыцця, таму што спаўна выконвае яна свой чалавечы доўг, дбае пра ўшанаванне памяці тых, хто загінуў, вызваляючы родную зямлю.

Насельніцтва сённяшніх Дзяражыч у большасці сваёй пенсіянеры. «Напішыце пра нашых Марыю Якаўлеўну і Івана Лазаравіча Шкаляр, — параіла старшыня Бывалькаўскага сельскага выканаўчага камітэта Вольга Андрыянец. — Дастойныя людзі!»

Утульны, дагледжаны дом гэтай сям'і на ўскрайку вёскі, на вуліцы, якая носіць імя Героя Савецкага Саюза Фёдара Папова. Да Шкаляроў трапляеш праз вінаградны тунэль. Любуешся прасторным дворыкам з мноствам восеньскіх кветак.

Марыя Якаўлеўна і Іван Лазаравіч ужо 40 гадоў разам. Выгадавалі дваіх сыноў, маюць пяцёра ўнучак. Старэйшы са сваёй сям'ёй жыве ў Мінску, працуе на трактарным заводзе. Малодшы ж застаўся на Лоеўшчыне, у вёсцы Сяўкі, механізатар. Да бацькоў сыны з нявесткамі прыязджаюць, каб дапамагчы ў пасадцы бульбы (не так проста апрацаваць гектар зямлі), уборцы ўраджаю.

— Мы, дзякаваць Богу, і самі яшчэ добра спраўляемся, — дзеліцца ўвішная Марыя Якаўлеўна. — Але ж, вядома, весялей, калі дзеці прыязджаюць, хата ажывае.

Дзецьмі сваімі Шкаляры-старэйшыя задаволены. Старанныя, працавітыя, ведаюць сапраўдную цану кавалку хлеба. Да бацькоў ставяцца з павагай, не забываюць павіншаваць з днём нараджэння, іншымі святамі.

Мы ж завіталі ў гэты дом якраз у 62-гі дзень нараджэння Івана Лазаравіча. Мелі магчымасць упэўніцца, наколькі ён, ветэран Верхне-Дняпроўскага басейнавага ўпраўлення, дбайны гаспадар. У хату падведзена паравое ацяпленне, ладзіцца лазня. Ды і традыцыйная для вяскоўцаў жыўнасць вядзецца: конь, карова, парсюкі, куры. Іван Лазаравіч падпрацоўвае скотнікам у СВК «Ленінскі сцяг». Дапамагае вартаваць і тэхніку ў Дзяражычах, якія аддалены ад цэнтральнай сядзібы на 10 кіламетраў.

І Марыя Якаўлеўна, ужо пенсіянерка, не сядзіць без справы. Летам дапамагае гаспадарцы ў апрацоўцы дзялянкі буракоў, здае малако дзяржаве. Не пакінула жанчына і сваё пастаяннае месца працы — Дзяражыцкі ФАП. Завітаўшы ў гэтую дагледжаную будыніну ў цэнтры вёскі, ад загадчыцы Марыі Лобан пачулі шмат цёплых слоў удзячнасці ў адрас санітаркі Шкаляр. «Не ведаю, як бы я тут без Якаўлеўны ўпраўлялася! Яна не проста санітарка, яна сапраўдны медык па характару — спагадлівая, душэўная».

На ФАПе абслугоўваецца звыш 300 чалавек — не толькі жыхары Дзяражыч, але і вёсак Цясны, Добры Рог. Большасць пенсіянеры, толькі чатыры дзесяткі чалавек ва ўзросце ад нуля да васемнаццаці. Вясковая амбулаторыя сёння спаўна выконвае і ролю сувязіста з раённым цэнтрам, бо тут ёсць тэлефон. Даволі часта людзі звяртаюцца ў ФАП за неадкладнай дапамогай: бывае, што і ноччу выклікаюць і загадчыцу, і санітарку М. Я. Шкаляр.

Зімою, калі больш вольнага часу, Марыя Якаўлеўна любіць па вечарах займацца дываномі. Згадвае ліпеньскае цвіценне дняпроўскага берага, кастрычніцкую пазалоту ясакараў і бяроз, і рукі, нібы па ўзмаху чароўнай палачкі, выводзяць непаўторныя ўзоры.

Тамара ***КРУЧЭНКА***

ЯК ЖЫВЯЦЕ, МАРСІЯНЕ?

«Яшчэ ў далёкай старажытнасці людзі звярнулі ўвагу на ярка-аранжавую зорку, якая час ад часу ззяла на небасхіле. Старажытныя егіпцяне і жыхары Вавілона называлі яе проста чырвонай зоркай. Піфагор прапанаваў называць яе Пірэй, што азначае «палымяны». Старажытныя грэкі прысвячалі ўсе планеты багам, і канечне, для бога вайны Арэса не знайшлося больш падыходзячага сімвала, чым чырванаватая зорка ў чорным небе. У рымскай міфалогіі Арэсу адпавядаў бог Марс. Так планета набыла сваё цяперашняе найменне». (Астраномія. Энцыклапедыя для дзяцей. Масква, 1999 г.)

Колькі ж таямніц хавае ў сабе Марс, як і ўсё тое, што хоча спасцігнуць чалавек! Пракладваючы барозны ў космасе, мы самаўпэўнена сцвярджалі ў адной з песень, што «і на Марсе будуць яблыні цвісці».

Даўно прагнула і я паназіраць, якія яны, марсіянскія яблыні, у майскім марыве вясновым. Ды вось даехала да Марса толькі цяпер, дачакаўшыся зімы. Казалі мне многія: абязлюдзела «планета», нічога там каларытнага, ніякай экзотыкі. І ўсё ж...

Маімі экскурсаводамі па марсіянскіх прасторах згадзіліся быць дырэктар КСУП «Страдубскі» Лоеўскага раёна Дзмітрый Міхайлавіч Выгляд (выгляд чалавек мае ўнушальны!) і сакратар Страдубскага сельсавета Тамара Пятроўна Шкурко. З імі на машыне і скіравалі мы на запаветны паварот з указальнікам «Марс».

– Зараз, канечне, у нас тут зацішша, – казалі мае спадарожнікі. – Спачывае ўсё наваколле, зімовая спячка. Многія марсіяне састарэлі і памерлі, многія з'ехалі ў горад. І хаця ў вёсцы значыцца 24 жыхары, найбольш гэта дачнікі. Добра, калі чалавек пецярых застанем карэнных.

А першымі прывіталі нас на ўездзе на вуліцу Садовую... індзюкі. Цэлы статак! Хто ж даглядае такую «армію»?

– Ды вунь гаспадыня спяшаецца, – сказаў Дз. М. Выгляд. – Вядомая ў ваколіцах Марса даярка, цётка Соня.

І сапраўды, з другога канца вуліцы імкліва набліжалася яна, Соф'я Мікалаеўна Лазарчук – невысокая ростам, жвавая жанчына. Пацікавілася, хто тут завітаў да яе марсіянскай хаты, з якою мэтай? Здівілася, бо даўно тут апошні раз журналістаў бачыла, лічы, ў 80-х гадах мінулага стагоддзя, калі фатаграфавалі яе ва ўласным кветніку між вяргіняў для рэспубліканскага часопіса «Работніца і сялянка». Запрасіла нас у хату. Пераступіўшы парог, паспяшалася гаспадыня да буфеціка

ў зале, дзе і захоўваецца яе Ганаровая грамата з нагоды 20-годдзя гаспадаркі. Перадавая даярка тагачаснага саўгаса «Узыход» (цяпер КСУП «Страдубскі»), яна 40 год аддала працы на ферме.

– Ды я ж з 14 гадоў працую. Інакш і не ўмею жыць, – распавядае цётка Соня. – Гэта ўжо ў крыві! Колькі сіл е, столькі і буду працаваць. Колісь яшчэ зацемна запрагу каня – і на ферму за два кіламетры ў Страдубку, пазней – у Чаплін, а затым і ў Рэкорд ездзіла. Не ведаю, што такое на лаве сядзець, як гарадскія пенсіянеры, ды і нашы некаторыя.

Цётка Соня век звекавала адна. Замуж не выходзіла, але, па яе шчыраму прызнанню, ад добрага чалавека нарадзіла сына. 40-гадовы Сцяпан і яго дружная сямейка – уцеха і радасць у гэтым жыцці. Жывуць дзеці ў Рэчыцы, часта наязджаюць, падвозяць маці ўсё, што неабходна. Прынамсі, яна ж ні чым асаблівым, акрамя хлеба, і не цікавіцца, жывучы практычна са сваёй натуральнай гаспадаркі. Ну чым не фермерша!

– Я ж яшчэ гектар зямлі апрацоўваю, гадую трыццаць пяць індзюкоў, чацвёра свіней, маю карову і каня, – расказвае Соф'я Мікалаеўна. Да нядаўняга часу ў гаспадыні былі дзве каровы, два кані, індзюкоў паўсотні.

За ўсё сваё жыццё толькі аднойчы і адпачыла марсіянка ў санаторыі «Чонкі» пад Гомелем. Калі мела нейкую вольную хвіліну– вышывала хрэсцікам сурвэткі, настольнікі, ручнікі. Усе гэтыя выпраменьваючыя цеплыню і дабрыню яе працавітых рук работы ўпрыгожваюць сціплую сялянскую хату, што заўсёды патанае ўлетку ў ружах і вяргінях. Зрэдку ўключыць цётка Соня тэлевізар, паглядзіць чарговую «мыльную оперу» з Бразіліі ці Мексікі, паспачувае чужому лёсу, ды па-сялянску мудра рассудзіць: «Без працы людзі нудзяцца, не ведаюць, куды сябе дзець».

Цётка Соня лічыць, што яе родны Марс – цывілізаваная «планета», бо знаходзіцца ўсяго ў двух кіламетрах ад ажыўленай трасы на Лоеў, паблізу ад Дняпроўска-Брагінскага вадасховішча, у двух кіламетрах ад прыгажуна-Дняпра. Прыязджае ў вёску аўталаўка, наведваюцца і камерсанты.

– Дзякаваць Богу, няма ў нас ніякіх трагедый, зладзейства. Жывем мірна, ціха. Бацькі тут, на сваёй зямельцы жылі і працавалі, знайшлі свой спачын, і мы тут ляжам, ля свайго Марса, – гаворыць цётка Соня, указваючы ў бок вясковых могілак.

У пошуках чарговага героя-марсіяніна праехалі ледзь не ўсю вёску. Дзе зачынены дзверы, дзе з гаспадаркай упраўляюцца, а каго, як, напрыклад, Івановых, забралі зімаваць у Холмеч ці ў іншыя месцы. Таму зазірнулі мы ў двор дома № 9 па ўсё той жа Садовай: штакетнік яго агароджы абкладзены кладамі дроў, значыць, тут плануе жыць чалавек.

– Мікалай Сцяпанавіч Маркавец, – прадставіўся нам яшчэ адзін карэнны марсіянін. Унутры яго дома, як і ў цёткі Соні, адметныя прыкметы савецкага дабрабыту – усё тыя ж трумо, буфет, канапа...

– Ды ці шмат нам цяпер трэба? – разважае Мікалай Сцяпанавіч Маркавец. – Пенсіі 117 тысяч атрымліваю. Хапае мне аднаму. Агуркоў-салонікаў наставіў, цыбулі вунь цэлыя вязанкі вісяць над грубкай. Не кажучы ўжо пра бульбачку, капусту, буракі, моркву. Хапае і гэтага дабра. Зямлі ў нас на Марсе – нямерана, было б здароўе працаваць!

Не ад аднаго тутэйшага гаспадара пачула я гэты выраз: «у нас на Марсе», хаця правільна ў дачыненні да вёскі гаварыць «у Марсе». Відаць, і сапраўды планетарнага кшталту тут людзі!

Вось той жа Мікалай Сцяпанавіч. 28 гадоў адпрацаваў трактарыстам, каля пятнаццаці – камбайнерам. А на старасці ў сваёй прасторнай хаце, якую колісь будавалі з жонкай для двух сыноў і дачкі, – жыве адзін. Як напамін пра гаспадыню – невялічкі буданчык сельмага, што прысуседзіўся ля хаты Маркаўца. Дзевяць гадоў таму памерла жонка. Сваталі да ўдаўца розных кабет, але ён адналюб, кажа, «чым абы з кім побач, дык лепш аднаму». А дзеці пастаянна клічуць бацьку да сябе. Валерый, Віктар і Святлана добра ўладкаваны, маюць машыны, не забываюць старога. Да іх прыезду той то труса, то пеўня заб'е.

– Ды весялей у гэтых клопатах, – разважае М. С. Маркавец. – Гадую 30 кралёў, чатыры дзесяткі курэй, двух парсючкоў. У такіх клопатах і дні неўпрыкмет злятаюць, як тыя квіткі з календара. З Марса з'язджаць не збіраюся. Дзед яшчэ мой калісьці са Страдубкі сюды пераехаў. І ўсе яго 7 сыноў жылі тут. І я сабе тут прытулак знайду.

– А хто ж так назваў вашу вёску? – пытаюся ў Сцяпанавіча.

– Ды чуў я, што яшчэ ў 1924 годзе нейкі землеўпарадчык паназываў моднымі найменнямі нашы вёскі. Тут жа побач ёсць Рэкорд, Венера нават была, праўда, ужо вымерла, састарэла, – дзеліцца марсіянін. – Анекдот-быль чулі?

Аповед, запісаны ад жыхара вёскі Марс Лоеўскага раёна Мікалая Сцяпанавіча Маркаўца:

– Паехаў у 70-я гады мінулага стагоддзя вядомы наш аднавясковец з прозвішчам Немлей у Маскву, на ВДНГ. Пасля ўзнагароджання за рэкордныя паказчыкі ў працы добра «узяў на грудзі». Ідзе сабе па праспекце, як той прафесар Плейшнер па Швейцарыі, крыху паводзячыся ўбакі. Затрымаў яго міліцыянер. Маўляў, хто такі, адкуль?

– Ды з Марса я, – шчыра адказаў селянін.

– Ды ты яшчэ і жартуеш? – раззлаваўся служка пры выкананні абавязкаў і добра «з'ездзіў» бедалагу жэзлам. – Яшчэ скажы, што ў вас і Венера ёсць!

– Ды недалёка, у двух кіламетрах ад нас Венера... – збянтэжана выдыхнуў беларус, атрымаўшы яшчэ пару «гарачых».

– Ну а хоць прозвішча сваё згадаеш? – дабіваўся міліцыянт.

– Немлей! – гучна адрапартаваў чалавек з Марса, чым яшчэ больш «завёў» ахоўніка правапарадку.

– Я то не самлею, а вось ты ў мяне ў аддзеле міліцыі самлееш, – выгукнуў чалавек у форме і праводзіў пад аховай перадавіка сельгасвытворчасці ў належнае месца. А калі марсіяніна даставілі куды трэба і пазнаёміліся з дакументамі сталічнага госця, ад рогату супрацоўнікаў міліцыі, здавалася, трэсліся сцены. «Гэта ж трэба: Немлей, ды з Марса! І Венера побач! Ай ды беларусы!». Суправаджалі нашага земляка як ганаровага госця, пасадзілі ў цягнік на Беларускім вакзале.

– А вы прыязджайце да нас вясною, калі зацвітуць яблыні, – гасцінна запрашалі мяне марсіяне. Я ж прапаную такую ідэю: сабраць у горадзе ўсіх «бэйбусаў», што днямі туляюцца па дварах шматпавярховак і нідзе яшчэ ні гадзіны не працавалі, прывезці сюды, на падворкі сялян Лазарчук і Маркаўца. Хай вучацца ў марсіян, як выжываць трэба на Зямлі!

Таццяна МАРОЗАВА

РУСАЛКІ, УЛАДАРНІЦЫ РАСЫ...

Абрад «Провады русалкі» на Лоеўшчыне як адметная з'ява русальнай абраднасці беларусаў

Плынь неадольная часу ляжыць паміж намі і нашымі продкамі. Аднак непахіснай застаецца асаблівасць чалавечага сэрца: магчымасць верыць. Гэта і яднае нас з мінуўшчынай, таму і цікавяць нас розныя вераванні, абрады, звычаі. У іх знаходзім і прыгажосць, і шчырасць, і прыцягальную сілу. У гэтым плане абрад «Провады русалкі» – адна з самых цікавых з'яў у каляндарна-абрадавым фальклоры беларусаў, цікавасць якога звязана з прысутнасцю ў ім галоўнага вобраза абраднасці – русалкі.

Эпіцэнтрам бытавання русальных абрадаў з'яўляецца руска-беларуска-ўкраінскае памежжа. Песенная творчасць пра русалку найбольш пашырана ў беларусаў, вядома ўкраінцам, сустракаецца ў сумежных з Беларуссю раёнах у рускіх. Увогуле беларуская русальная абраднасць як сукупнасць вербальна-акцыянальных тэкстаў – з'ява лакальная. Яе ядро – Лоеўскі і Брагінскі раёны Гомельскай вобласці, перыферыя – Веткаўскі, Гомельскі, Рэчыцкі, Нараўлянскі, Лельчыцкі і Петрыкаўскі раёны, якія акаляюць ядро з паўночнага ўсходу і захаду. Аднак вераванні пра русалак ахопліваюць значна большую тэрыторыю, не абмежаваную Беларуссю і ГБЧ-рэгіёнам. Яны вядомы і на Наваградчыне (дастаткова ўзгадаць знакамітыя творы Адама Міцкевіча «Свіцязянка», «Рыбка», «Пан Тадэвуш», заснаваныя на гэтых вераваннях), і на Міншчыне, пра што сведчаць яшчэ фальклорныя запісы XIX стагоддзя (П. В. Шэйн, Я. Р. Раманаў, М. В. Доўнар-Запольскі), на Смаленшчыне, Браншчыне, Разаншчыне і ў Паволжжы, а таксама амаль на ўсёй тэрыторыі Украіны, дзе назіраюцца значныя семантычныя адрозненні ў вобразе русалкі. Праўда, трэба адзначыць, што звесткі пра абрады «Провады русалкі» тут адсутнічаюць, акрамя тэрыторыі Паволжжа ў Расіі. Так, напрыклад, у рускіх русалка ўяўляецца як «закладзены нябожчык» («закладзенымі» лічыліся нябожчыкі, якія памерлі не сваёй смерцю, заўчасна, альбо тапельцы ці нехрышчоныя дзеці) і характарызуецца дэманічнымі рысамі. Ва ўкраінцаў дэманічнасць русалкі паслабляецца з набліжэннем да межаў Беларусі, дзе ўжо выразна назіраецца неадназначнасць гэтага вобраза. Беларуская русалка ў абрадзе – істота стваральная, хаця ў вераваннях і некаторых песнях можна знайсці пацверджанні яе адмоўнай ролі. Вывучэнне акцыянальных сімвалаў (ці рытуальных дзеянняў) абрадаў «Провады русалкі», заснаванае на

разуменні гэтых дзеянняў інфарматарамі на тэрыторыі Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці, даказвае перавагу стваральнага пачатку ў вобразе русалкі, у выніку чаго самі абрады тлумачацца як урачыстае суправаджэнне падаўніцы добрага ўраджаю, русалкі, у жыта.

У залежнасці ад мясцовасці арэала беларускі вобраз русалкі ўяўляўся па-рознаму. Гэта магла быць пераапранутая дзяўчына ці саламянае пудзіла русалкі (лялька). Самі ж рытуалы «провадаў» адрозніваліся дэталямі, якія з глыбокай старажытнасці мелі магічны сэнс. Напрыклад, у Нараўлянскім раёне русалку праводзілі ў **панядзелак** Русальнага тыдня, а ў Брагінскім раёне – у **нядзелю**. Нязменным заставаўся толькі час русальных святаў – другі тыдзень пасля Сёмухі (Тройцы). Агульнай жа ідэяй Русальнага (Гранога) тыдня з'яўляліся провады вясны і пераход да летняй абраднасці.

Адрозніваўся таксама і час на працягу дня, калі русалку праводзілі ў жыта: **апоўначы** (Лельчыцкі, Веткаўскі, Хойніцкі раёны) і **апоўдні** (Лоеўскі, Брагінскі раёны). Інварыянтная схема абраду «Провады русалкі» ўключае наступныя звёны:

1) русалку ловяць на могілках (прысутнічае толькі ў Нараўлянскім, Брагінскім і Лоеўскім раёнах);

2) вядуць на горачку ў танок (толькі Веткаўскі і Лоеўскі раёны);

3) вядуць праз галоўную вуліцу вёскі (толькі Добрушскі і Лоеўскі раёны);

4) па дарозе ў жыта:

а) скачуць праз агонь, спаліўшы на ім русалчын вянок (толькі Лельчыцкі раён) ці саламянае пудзіла-русалку (толькі Гомельскі раён);

б) русалку абмываюць у рэчцы і варожаць на вадзе (толькі Лоеўскі раён);

5) русалку вядуць у жыта (прысутнічае па ўсяму арэалу);

6) разрываюць убранне русалкі на часткі, якія нясуць у агароды (таксама прысутнічае па ўсяму арэалу).

Аднак у такім, інварыянтным выглядзе абрад захаваўся толькі ў цэнтральнай частцы арэала – у Лоеўскім раёне. Гэты унікальны абрад да апошняга часу выконваўся ў вёсцы Дзімамеркі, а таксама ў вёсцы Шчытцы і ў самім гарадскім пасёлку Лоеў (тут, праўда, выконваюцца не ўсе звёны абраду). Напрыклад, у ***Лоеве*** Русальны тыдзень вызначалі провады русалкі ў жыта нейкага гаспадара. Гаспадар ведаў, што гэтым вечарам будуць весці русалку, і падрыхтоўваў дзяжы з дзёгцем. Ганяліся за русалкай, лавілі яе, прывязвалі да дрэва ці да слупа і абмазвалі дзёгцем яе ўсю, каб яна больш не таптала жыта.

Колькасць звёнаў у перыферыйных раёнах распаўсюджання русальнай абраднасці непастаянная (ад трох да пяці), што напрамую звязана з мясцовымі прыроднымі асаблівасцямі. Так, наяўнасць ракі непадалёку ад вёскі абумоўлівае існаванне такога звяна, як рачное абмыванне русалкі перад провадамі яе ў жыта. У пагоркавых мясцовасцях русалку абавязкова вялі ў танок на горку і ўжо пасля праз усю вёску праводзілі ў жыта. Акрамя таго, у некаторых мясцовасцях назіраецца дэградацыя абрадаў. Напрыклад, у Рэчыцкім раёне (в. Заспа) абрад «Провады русалкі» страціў свой сакральны сэнс, звязаны з провадамі яе ў жыта, у выніку чаго яго структура разбурылася, саступіўшы месца шматзначным тэатралізавана-драматызаваным гульнёвым дзеянням.

Толькі на **Лоеўшчыне**, у *вёсцы Дзімамеркі*, «Провады русалкі» сумяшчаюць у сабе тры культы – раслінаснасці, урадлівасці і продкаў, якія судакранаюцца праз шматгранны вобраз русалкі. Акрамя таго, праз усе звёны абраду праходзіць скразная думка аб шчаслівым шлюбе.

У нядзелю, бліжэй да вечара, дзяўчаты ідуць у поле ці ў лес, каб назбіраць кветак для вяночкаў. Важным тут з'яўляецца як выбар кветак, так і час пляцення вянкоў. Напрыклад, вянкі, якія трэба павесіць на крыжы на могілках, дзяўчаты плятуць як раз перад захадам сонца і пакідаюць на ўсю ноч на магілах. Для такіх вянкоў выкарыстоўваюцца толькі рамонкі. Як вядома, белы колер сімвалізуе чысціню, дзённы свет. Аднак на Лоеўшчыне (як і ў некаторых іншых раёнах Беларусі) ён суадносіцца са смерцю (напрыклад, на пахаванне жанчыны павінны завязваць на галаву толькі белыя хусткі). Таму такія вянкі ў выглядзе замкнёнага кветкавага кола сімвалізуюць сувязь *жыцця – смерці – жыцця ў новай якасці.*

Для сябе дзяўчаты плятуць вянкі з васількоў, час збірання якіх прыходзіцца на момант каласавання жыта. Васількі ўвабралі ў сябе колер неба. Гэтыя кветкі і зараз яшчэ жыхары Дзімамерак лічаць дзявоцкімі. У агульнаславянскай традыцыі засеянае поле – сімвал плоднасці жанчыны, а сіні колер сімвалізуе вернасць і пастаянства – адпаведна народнай маралі, якасці, неабходныя будучым жонкам і маці.

Для найбольш прыгожай, жвавай дзяўчыны з доўгімі валасамі, якую і абіраюць на ролю русалкі, дзяўчаты звіваюць вялікі вянок з розных кветак. Чырвоная канюшына, ружовыя смолкі, аранжавая кашка, белыя рамонкі, жоўтыя дзьмухаўцы, сінія васількі, пераплеценыя лісцем папаратніку, – абавязковыя палявыя кветкі вянка русалкі, які ўбірае ў сябе асноўныя колеры вясёлкі і разам з адзеннем русалкі сімвалізуе найвышэйшы росквіт прыроды.

Адзенне русалкі мае ўрадлівую сілу і абавязкова рыхтуецца з галінак бярозы і асіны. Цікава, што з апазіцыі «*лісцевыя дрэвы – хваёвыя дрэвы*» выбіраюцца толькі лісцевыя. Тлумачыцца гэта досыць проста: з аднаго боку, хваёвыя дрэвы амаль адсутнічаюць на тэрыторыі Лоеўшчыны (калі не ўлічваць цэнтралізаваныя лесапасадкі апошніх пяцідзесяці год); з другога боку, садовыя, акультураныя дрэвы з'яўляюцца другаснымі, тады як бяроза, асіна, дуб, клён – першасныя (як і палявыя кветкі ў параўнанні з садовымі).

Бяроза ў славянскай міфалогіі лічылася сакральным дрэвам і да сённяшняга часу шануецца як жаночы сімвал. Асіна, наадварот, мае негатыўную семантыку, якая тлумачыцца дзвюма асаблівасцямі – дрыжаннем лісця нават пры ціхім бязветраным надвор'і і чырванаватым адценнем сэрцавіны. Асіны звязваюць з ведзьмамі, нядобрымі духамі і нават з чортам. Зразумела, чаму для адзення русалкі выбіраюцца менавіта дрэвы з рознабаковай семантыкай: у народнай свядомасці гэта падкрэслівае амбівалентнасць самога вобраза, яе адмоўных і станоўчых якасцей.

Вянок і адзенне русалкі, а таксама вяночкі дзяўчат плятуцца з самага рання, пакуль сонца не высушыць расу. Верылі, што менавіта ў гэты час зеляніна поўная жыццёвых сокаў, здольных засцерагчы ад негатыўных сіл на працягу дня. Па меры таго як кветка будзе вясці, ахоўная энергія будзе змяншацца.

Абраную на ролю русалкі дзяўчыну распранаюць да сарочкі (а калі валасы ў яе вельмі доўгія, то і дагала), апранаюць у сплеценую сукенку і абвіваюць гірляндамі з кветак. Варта зазначыць, што расплятанне касы, агаленне дзяўчыны, якая абіраецца на ролю русалкі, мае на мэце не знешняе падабенства да гэтых міфічных істотаў. Вядома, што распускаць косы павінны ўсе ўдзельніцы абраду, і таму гэта дзея з'яўляецца агульным сакральным момантам русальнага абраду.

Пасля неабходных прыгатаванняў дзяўчаты з вянкамі ў руках ідуць на могілкі, спяваючы русальныя песні. Такія паходы не заўсёды заканчваюцца добра: часам хто-небудзь хварэе пасля перапуду. Звычайна хлопцы падстройваюць

якія-небудзь «штучкі», каб напужаць дзяўчат: перацягваюць вяроўку ўпоперак вуліцы, ганяюцца за дзяўчатамі з крапівою. Тым самым як бы робяцца спробы перанесці забавы русалак у сапраўднае жыццё. Дзяўчаты пакідаюць вянкі на могілках (на крыжах сваіх блізкіх) і вяртаюцца дахаты.

Назаўтра апоўднем вяскоўцы збіраюцца на могілках – гэта так званыя *Русальныя дзяды*, якія спраўляюцца на другі тыдзень пасля Сёмухі. Неўзабаве паміж дрэвамі і крыжамі з'яўляецца русалка: расплеценыя доўгія валасы, на галаве вянок з жывых кветак, зялёнае адзенне з галінак бярозы, асіны, пераплеценых рамонкамі і васілёчкамі. Яна ўвасабляе духаў продкаў, нагадвае аб тым, каб іх не забывалі, ушаноўвалі. Уяўленне пра русалак як духаў продкаў робіць іх добрымі дэманічнымі істотамі. Аднак постаць русалкі здаецца чароўнай і нерэальнай, таму дзяўчаты спалохана разбягаюцца, а хлопцы пачынаюць лавіць русалку. *Злавіць русалку* – значыць падпарадкаваць яе стваральнай сіле, пасля чаго на працягу ўсяго абраду яна становіцца пасіўнай, «вядомай» воляй удзельнікаў абраду. З'яўляючыся на могілках, яна прадстае як своеасаблівы сувязны паміж светам жывых і светам памерлых. «Аднак людзі адчуваюць перад ёю страх, быццам яна нешта дрэннае ім зробіць. Але ж гэта русалка гранога тыдня. І яна ўжо не вадзяная, а тая, якая жыве на дрэвах і ў полі. Яна сумна ходзіць між могілак, аднак людзі лічаць, што яна за імі гоніцца» (запісана намі ў 1993 годзе ў вёсцы Дзімамеркі падчас фальклорнай экспедыцыі ад Берасневай Валянціны Уладзіміраўны, 1945 г. н. – *Т. М.*).

Дзяўчаты асобна ад жанчын пачынаюць вадзіць карагоды-танкі вакол насыпных горак з пяску. Горкі насыпаюць загадзя бацькі дзеля таго, каб пасадзіць на іх па дзіцяці (своеасаблівая ахоўная магія ад нападаў русалкі). Калі дзеткі сядзяць на такіх горках, то іх добра відаць бацькам і яны не могуць ужо куды-небудзь знікнуць. Танок-карагод называюць *крывым*, бо водзяць яго па крывой лініі вакол трох удзельніц ці гэтых жа горак з пяску. Падчас руху такі карагод ствараў фігуру, падобную на дзве злітыя васьмёркі.

Пасля таго як зловяць русалку, яе вядуць ў цэнтр *крывога* танка і пакідаюць на горцы, а дзяўчаты пачынаюць вадзіць вакол яе свае карагоды. Русалка тут выступае як падаўніца добрага шлюбу: менавіта з ёй звязваюць дзяўчаты і хлопцы мары аб шчасці ў сваёй будучай сям'і. Старэйшыя жанчыны ў такіх карагодах не ўдзельнічаюць: яны збіраюцца ў капліцы і спяваюць свае, жаночыя песні.

Пасля русалку *вядуць праз усю вёску* ў жыта пад рукі два русалы (ці рушчалы – хлопцы, якім даверылі праводзіць русалку), а за імі – моладзь, жанчыны, мужчыны, старыя, дзеці (гэты момант захаваў у сабе калектыўны характар архаічнага свята). Такім чынам *выводзяць з вёскі ўсё дрэннае* – русалка тут быццам бы прыцягвае да сябе адмоўныя сілы.

Шэсце выходзіць за вёску і спыняецца каля рэчкі. Дзяўчаты *абмываюць русалку* рачной вадой. У гэты ж час некаторыя з дзяўчат варожаць, пускаючы вяночкі па цячэнню. Калі сыйдзецца адзін вяночак з другім – значыць, выйдзе дзеўка замуж: «Вось мы, сяброўкі, з могілак назбіралі вяночкаў і бягом у рэчку. І вось так: кінем два вяночка, і чые вяночкі сайдуцца, тая замуж пойдзе. Можа, гэта саўпадзенне якое, а мая сяброўка кінула, і яны паплылі, паплылі ўмесці. А я ж кінула: адзін паплыў, а другі ў траўку, а потым нямножачка пастаяў і дагнаў таго вяночка. Тая ж падружка ўперад замуж пайшла, а я – тыдні праз два» (запісана намі ў 1993 годзе падчас фальклорнай экспедыцыі ў вёсцы Дзімамеркі ад Жупан Марфы, 1922 г. н. – *Т. М.*).

Увесь шлях ад рэчкі да жыта суправаджаецца песнямі, прымеркаванымі менавіта да гэтага моманту абраду – *праводзінаў русалкі ў жыта*. Музыка, жарты сціхаюць, і толькі мелодыя русальнай песні гучыць над наваколлем: над полем, над дарогаю, над вузенькаю палоскаю лесу, узносячыся ўсё вышэй і вышэй, прама ў бясконцую блакітнасць нябёсаў. Чым бліжэй становіцца жытнёвае поле, тым яшчэ больш урачыста гучаць словы русальнай песні, тым выразней пералівы мелодыі:

Правяду русалку да бору,
Ой, рана-не рана, да бору.
А сама вярнуся дадому,
Ой, рана-не рана, дадому.

Правяду русалку да й грушкі,
Ой, рана-не рана, да й грушкі.
А сама вярнуся к падружкі,
Ой, рана-не рана, к падружкі.

Правяду русалку ў шчырай бор,
Ой, рана-не рана, ў шчырай бор.
А сама вярнуся ў таткаў двор,
Ой, рана-не рана, ў таткаў двор.

(Запісана намі ў 1993 годзе падчас фальклорнай экспедыцыі ў вёсцы Дзімамеркі ад Жупан Марфы, 1922 г. н. – Т. М.).

Усе глядзяць на русалку, а тая, з тугой азірнуўшыся, раптам скідвае з сябе ўсю зеляніну і кідаецца праз жыта ў лес. У гэты час кожны з прысутных хапае па галінцы з адзення русалкі і хуценька вяртаецца ў вёску. Бягуць у агароды і кідаюць тыя галінкі хто ў гуркі (каб раслі добрыя), хто ў капусту (каб качан быў крэпкі, густы), хто ў бульбу. Русалчына адзенне мае магічную плодную сілу. *Разрыванне адзення і вянка русалкі* сімвалізуе заканчэнне вясны, надыход новай сельскагаспадарчай пары для селяніна і новага этапу ў прыродзе.

Пасля гэтага свята працягваецца: люд збіраецца ў цэнтры сяла і танцуе, і спявае аж да поўначы. Дзяўчаты і жанчыны водзяць танкі, сядзяць на калодках і ўвесь час спяваюць русальныя песні, многія з якіх услаўляюць магічную моц русалчынага адзення.

Так праходзіць абрад «Провады русалкі» ў вёсцы Дзімамеркі. У ім арганічна сінтэзаваны розныя абрадавыя дзеянні, распаўсюджаныя па ўсяму арэалу бытавання. Зразумела, што сам абрад, акрамя сваіх асноўных мэтаў (культу расліннасці і ўраджаю, клопату пра шчаслівы шлюб), мае яшчэ і выхаваўчыя мэты: прывучыць моладзь шанаваць продкаў; навучыць дзяўчат глядзець за дзецьмі – і ў будні, і ў святы ахоўваць іх; абудзіць веру ў іншасвет, з якім можна наладзіць магічную сувязь, не раз'ядноўваць гэтую векавую традыцыю; шанаваць працу, хлеб, прыкладваць усе сілы дзеля атрымання новага ўраджаю.

Душа народа не памірае, і таму сведчаннем гэты выдатны абрад, які змаглі захаваць на Лоеўшчыне. І ў гэтым – феномен народнай душы, якая праз усе нягоды можа заставацца сама сабой, захоўваць сваю спадчыну для нашчадкаў.

Уладзімір БОБРЫК

З МАТЭРЫЯЛАЎ ДА «СЛОЎНІКА ГІДРОНІМАЎ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ» (ЛОЕЎСКІ РАЁН)

Лоеўскі раён уваходзіць у склад Дняпроўскага басейна. На яго тэрыторыі працякалі і працякаюць рэкі Дняпро, Сож, Брагінка, Песачанка, на многія кіламетры разлілося Дняпроўска-Брагінскае вадасховішча. Гэтыя спецыфічныя ўмовы спрыялі ў мінулым значнай забалочанасці мясцовасці, што прывяло да ўзнікнення ў поймах гэтых рэк шматлікіх вялікіх і малых старых рэчышчаў, азёр, балот, сажалак, крыніц, балацянак, забалочаных мясцін і г. д. Аб іх багацці сведчаць звыш тысячы гідранімічных назваў, сабраных намі ў час дыялекталагічнай практыкі. Па слушнай заўвазе М. І. Надзеждзіна, «назвы – мова зямлі, а зямля ёсць кніга, дзе гісторыя чалавецтва запісана ў геаграфічнай наменклатуры». Гэты каштоўны матэрыял адлюстроўвае спецыфіку прыроды роднага краю, гаспадарчую дзейнасць насельніцтва, сацыяльна-эканамічныя адносіны ў грамадстве і заключае ў сабе шмат цікавых звестак пра гісторыю гэтага рэгіёна для гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, лінгвістаў. Нагадаем некаторыя назвы:

АБАКУМАЎСКІЯ ДЖУНГЛІ – непраходнае балота (г. п. Лоеў).
АБРЭЧАК – канава (п. Майск); прыток ракі (в. Чаплін, г. п. Лоеў).
АГАРОДНІК – непраходнае балота (в. Шчытцы).
АДРЫНІШЧЫ – балота (вв. Казярогі, Уборкі).
АЗЁБКІ – балота (в. Дзімамеркі).
АЗЁРЦЫ – балота (в. Чаплін); возера (в. Страдубка).
АЛЕШНІК – балота (в. Ястрабка).
АЛЁС – балота (в. Іванькаў).
АЛЕСІН ВОСТРАЎ – балота (в. Вышкаў).
АЛЬСЯНІК – балота (в. Дуброва).
АЛЬХОВІК – балота (вв. Буда-Петрыцкая, Малінаўка).
АМШАРНІК – балота (в. Шчытцы).
АНДРОСАВА – балота (в. Усход).
АНТОНАВА – крыніца (в. Пярэдзелка).
АНЮЦІНА – балота (в. Новакузнечная).
АРЦЁМАЎ ЛОГ – балота (в. Вышкаў-Бурыцкая).
АСІНАВАЕ – балота (в. Старая Лутава).
АСІНАВАЕ РЫЛКА – балота (в. Рудня-Бурыцкая).
АСІНАВЫЯ КЛАДЗІ – балота (в. Вазон).
АСТАПАВА – балота (в. Мохаў).

АСТРАЎСКОЕ – балота (в. Астравы).
АФОНЯВЫ РАГІ – балота (в. Бывалькі).
АШХАВАТАЕ – возера (в. Бывалькі).
БАБ'Е – балота (п. Пабядзіцель).
БАБРОВА – канава (в. Грамыкі).
БАБРОВІНЫ – балота (в. Ястрабка).
БАГАТЫ МОХ – балота (в. Мохаў).
БАГЛЕЕВА – балота (п. Кірава).
БАГНІСТАЕ – балота (в. Дзяражычы, г.п. Лоеў).
БАЙДАКОВА – балота (в. Каўпень).
БАЛЬ – балота (в. Мохаў).
БАМ – возера (в. Суткова, п. Пабядзіцель); Днепра-Брагінскае вадасховішча (г. п. Лоеў).
БАРАВІЦА – возера (в. Дзяражычы).
БАРАВОЕ – балота (в. Казярогі, пп. Пабядзіцель, Прагрэс).
БАРШЧОЎСКІ КАНАЛ – канава (в. Удалёўка).
БАРЭЦКАЕ – балота (в. Барэц).
БАТРАКОВА – балота (в. Усход).
БЕГУНЁНКАЎ КРУГ – балота (в. Дуброва).
БЕЛАВОДА – рака (в. Бывалькі).
БЕЛАГАЛОВАЕ – возера (п. Прагрэс).
БЕЛАЕ – балота (вв. Іванькаў, Сінск).
БЕЛАЕ ПОЛЕ – балота (в. Сінск).
БЕЛАЯ ГЛІНА – балота (в. Астравы).
БЕЛЫ КОНЬ – балота (п. Смелы).
БЕЛЫ МАШОК – балота (в. Бушацін).
БЕЛЯВОЕ (БЕЛЕВОЕ) – балота (в. Ісакавічы).
БЕРАСНЁЎКА – балота (в. Сяўкі).
БЕРВІЦА – крыніца (в. Новая Лутава).
БОРТНАЕ – балота (в. Новакузнечная).
БРАГІНКА – рака (вв. Буда-Петрыцкая, Вулкан, Грамыкі, Малінаўка, Міхалёўка, Удалёўка; пп. Кірава, Смелы).
БРАДОК – балота (в. Дзяражычы).
БРОХАВА – балота (в. Уборкі).
БРЭЙСКІ РОЎ – возера (в. Гарадок).
БУДНЕЦКАЯ БЕЛЬ – балота (в. Буда-Петрыцкая).
БУРЖУЙКА – крыніца (в. Ліпнякі).
БУШАЦІН – балота (в. Бушацін).
БЯЗОДНАЕ – балота (г. п. Лоеў).
БЯРОЗАВІЦА – возера (в. Гарадок); крыніца (вв. Бывалькі, Гарадок).
БЯРЭЗІНСКАЕ – балота (в. Шчытцы, г. п. Лоеў).
ВАЛАЎЦОЎ МОХ – балацянка (в. Сінск).
ВАСІЛЕЎСКАЕ – балота (в. Новая Алішэеўка).
ВАЎКАЎНЯ – балота (в. Дуброва, пп. Бодры, Кірава).
ВЕРАС – балота (в. Шчытцы).
ВЕРЫНЫ ГАЛЫ – балота (в. Барэц).
ВЕТАЧКА – прыток рэчкі (в. Казіміраўка).
ВІЛЫ – балота (в. Грохаў); возера (в. Бывалькі).
ВІРА – возера (в. Цясны).

ВІТАЖ – балота (п. Прагрэс).
ВІТАЧ – балота (г.п. Лоеў); раўчак (г. п. Лоеў); рэчка (г. п. Лоеў, п. Прагрэс).
ВІТАЦКАЕ – балота (г. п. Лоеў); возера (г. п. Лоеў).
ВІТАШ –возера (г. п. Лоеў).
ВІШАР – балота (вв. Буда-Петрыцкая, Бушацін, Мохаў).
ВІШАРНІК – балота (в. Шчытцы).
ВІШНЁЎСКАЯ САЖАЛКА – сажалка (в. Бушацін).
ВОЛАК БЛІЖНІ – балота (в. Новая Алішэеўка).
ВОЛАК ДАЛЬНІ – балота (в. Новая Алішэеўка).
ВОЛАКАЎСКІ МОХ – балацянка (в. Сінск).
ВОСТРАЎ – балота (в. Новая Алішэеўка); балацянка (в. Глушэц).
ВОЎЧАЕ – балота (п. Прагрэс).
ВЫГАРЫ – балота (в. Ястрабка).
ВУДЗІШЧА – балота (п. Кірава).
ВУЖАР – балота (в. Буда-Петрыцкая).
ВЫГАР – балота (г. п. Лоеў).
ВЫСОКАЯ ГРЫВА – балота (в. Новая Баршчоўка).
ВЫШКАЎСКІ ВУЖАР – балота (в. Вышкаў).
В'ЮНІШЧА – балота (в. Барэц).
ВЯЛІКАЕ – балота (в. Крупейкі); возера (в. Каўпень).
ВЯЛІКАЯ ГРАЗЬ – балота (в. Будзішчы).
ВЯЛІКІ БРОД – балота (в. Пярэдзелка).
ВЯЛІКІ ЛЕС – балота (г. п. Лоеў).
ВЯЛІКІ МОХ – балота (в. Ястрабка).
ГАБРЭЛЕЎ ВЫГАР – балота (в. Новакузнечная).
ГАДЗЮЧАЕ – балота (в. Барэц).
ГАЛУБНІКІ – балота (в. Мікалаеўка).
ГАЛЫ – балота (вв. Барэц, Мікалаеўка, Усход).
ГАНЧАРКА – балацянка (в. Дзімамеркі).
ГАНЧАРОЎКА – балота (в. Гарадок).
ГАРАДЗІШЧА – возера (в. Гарадок).
ГАРБАХІ – балота (г. п. Лоеў).
ГАРОЖА – балота (в. Бывалькі).
ГАРЭЛАЕ – балота (вв. Барэц, Грохаў, Дзімамеркі, Іванькаў, Казярогі, Крупейкі, Мікалаеўка, Мохаў, Новая Алішэеўка, Цясны, г. п. Лоеў).
ГАРЭЛАЕ БАЛОТА – возера (в. Цясны).
ГАРЭЛЫ АЛЁС – балота (в. Ястрабка).
ГАРЭЛЫ БАРОК – балота (в. Бушацін).
ГАРЭЛЫ КРУЖОК – балота (в. Крупейкі).
ГАРЭЛЫ МОСТ – балота (в. Сяўкі).
ГАРЭЛЫ МОХ – балота (п. Бодры).
ГАЦІ – азёры (в. Глушэц).
ГЕНЕРАЛЬСКАЯ КАНАВА – прыток рэчкі (в. Лесуны).
ГЛІНІШЧА – балота (п. Прагрэс).
ГЛУДКІ – балота (в. Пярэдзелка).
ГЛУШЭЦ – возера (в. Новае Лутава); старое русла ракі (в. Страдубка).
ГЛЫБОКАЕ – балота (вв. Ваўкашанка, Міхалёўка, Трасцянец).
ГЛЫБОКАЯ ПЕЛЬ – балацянка (в. Ручаёўка).
ГРАЕЎ – балота (в. Будзішча).

ГРУДОК – балота (в. Буда-Петрыцкая).
ГРУДЫ – крыніца (в. Сяўкі).
ГРУЗКАЕ – балота (вв. Буда-Петрыцкая, Рудня, Удалёўка, Хаткі).
ГРЫШКАВА – балота (в. Усход).
ГУЛЯЕВА – возера (в. Бывалькі).
ГУСЕНІЦА – возера (в. Цясны).
ДАЛЁЎКА – рэчка (в. Белы Калодзеж).
ДАЛЬНЯЯ – балацянка (в. Сінск).
ДАМАШНЯЯ – балацянка (в. Страдубка); возера (в. Ісакавічы).
ДВОРЫШЧА – балота (в. Каўпень).
ДЗЕДАЎ МОХ – балота (в. Мікалаеўка).
ДЗЮБКАВА ПЕЛЯ – балота (п. Бодры).
ДЗЯНІСЬКІ – балота (в. Шчытцы).
ДНЕПР (ДНЯПРО) – рака (вв. Бывалькі, Дзяражычы, Казіміраўка, Крупейкі, Мохаў, Першамайск, Пярэдзелка, Суткова, г. п. Лоеў).
ДНЯПРОЎСКА-БРАГІНСКАЕ (ДНЕПРА-БРАГІНСКАЕ) – вадасховішча (в. Рэкорд, п. Смелы).
ДОЎГАЕ (ДОЎГАЯ) – балота (вв. Бушацін, Крупейкі, Страдубка, г. п. Лоеў, п. Смелы); возера (в. Бывалькі); крыніца (вв. Бывалькі, Гарадок, Казіміраўка, Старая Лутава).
ДОЎГІ МОХ – балота (в. Рэкорд),
ДУБІНСКІ ВЫГАР – балота (в. Новакузнечная).
ДУБНЯК – балота (в. Сінск).
ДУБОВЫ ПРУД – балота (в. Новая Баршчоўка).
ДУБОВЫ РОГ – балота (п. Добры Рог).
ЕЛЬКАВА – балота (п. Кірава).
ЕРМАКОЎ РОГ – балота (в. Ісакавічы).
ЖАРАВАЯ – крыніца (п. Свірэжа).
ЖОЎТАЕ – балота (в. Бывалькі).
ЖОЎТАЯ ЯМА – балота (вв. Белы Калодзеж, Вышкаў).
ЖУРЛІВІЦА – балота (в. Пустая Града).
ЖЫВЕЦ – балота (г. п. Лоеў).
ЖЫВОЕ – балота (г. п. Лоеў).
ЖЫРНАЕ – балота (в. Лесуны).
ЖЫРАЎКА – балота (в. Дуброва).
ЗАБРОДА – балота (в. Бывалькі).
ЗАГАРОДКІ – балота (в. Дуброва).
ЗАКРУЖЖА – балота (в. Новая Баршчоўка).
ЗАКРУТНІК – балота (в. Рудня-Удалёўская).
ЗАЛУСКАЕ – балота (в. Каўпень).
ЗДАРОВАЕ – балота (в. Бушацін).
ЗЯЛЁНЫ МОХ – балота (вв. Дуброва, Лесуны, Новая Баршчоўка, п. Кірава).
ІВАНАЎ РОГ – балота (в. Грамыкі).
ІМШАРНІК – балота (г. п. Лоеў).
ІМШАР – балота (в. Ручаёўка).
КАВАЛЁЎ МОХ – балота (вв. Белы Калодзеж, Рудня-Бурыцкая).
КАВАЛЁЎ РОГ – балота (в. Сінск).
КАВАЛЁВА – балота (вв. Гарадок, Казіміраўка, Усход).
КАЗАЦКАЕ – балота (в. Усход).

КАЗЛІНЕЦ – балота (в. Сінск).
КАЗЯРОЖСКАЕ – возера (в. Мохаў).
КАЛОДНАЕ – балота (в. Сяўкі, п. Майск).
КАНАПЛЯНІЦКАЕ – балота (п. Пабядзіцель).
КАПЫЖАЛАВА – балота (в. Усход).
КАРАВАТНАЕ – балота (в. Белы Калодзеж).
КАРАСЁВА – балота (в. Малінаўка).
КАРПЕНКАВА – балота (г. п. Лоеў).
КАШОВА – возера (в. Казіміраўка).
КІЦЕЦКАЯ ПЕЛЬКА – возера (в. Пярэдзелка).
КОРХАЎ МОХ – балота (в. Ісакавічы).
КОРШАКАВА – балота (п. Майск).
КОТАВА – балота (в. Пустая Града).
КОШАЎ МОХ – балота (вв. Абрамаўка, Ручаёўка); крыніца (в. Грохаў).
КОШКІНА – балота (п. Пабядзіцель).
ЛАБАЎНЯ – балота (в. Уборкі).
ЛАБУДЗЕВА – балота (в. Рэкорд).
ЛАСІНАЕ ТАПІЛА – балота (в. Новая Баршчоўка).
ЛЕМЕХАВА – балота (в. Сінск).
ЛІПАВАЕ – балота (г. п. Лоеў).
ЛІТАШОВА – балота (в. Будзішча).
ЛОЗКІ – балота (в. Будзішча).
ЛОКЦЕВА – балота (в. Казярогі).
ЛОПАЦЕНЬ – балота (г. п. Лоеў); возера (в. Крупейкі).
ЛУГАВОЕ – балота (в. Мохаў).
ЛУТАЎСКАЕ – балота (в. Новая Лутава).
МАЗАНКАВАЕ – балота (г. п. Лоеў).
МАЙДАН – балота (в. Казярогі).
МАКРЭЦ – балота (в. Сяўкі).
МАКСІМАВА – балота (в. Трасцянец).
МАЛАХАЎ ВЫГАР – балота (в. Новакузнечная).
МАЛЫ БРОД – балота (в. Пярэдзелка).
МАРОЗАВА – балота (в. Бушацін).
МАРЦІНАВА ПЕЛЯ – балота (в. Буда-Петрыцкая).
МАСТКІ – балота (в. Сінск).
МАХАЎСКОЕ – балота (в. Суткова, г. п. Лоеў, п. Прагрэс).
МАЧУЛІШЧА – балота (в. Малінаўка).
МАШОК – балота (в. Буда-Петрыцкая, п. Бодры).
МЕЛЬНІКАВА – балота (в. Іванькаў).
МІКІТАВА ПАЛЯНКА – балота (в. Трасцянец).
МІХАЛАЎ ГРУД – балота (в. Новая Баршчоўка).
МІХНЕВА – балота (в. Абрамаўка).
НАВІНСКАЕ – балота (в. Крупейкі, г. п. Лоеў); возера (в. Крупейкі).
НАДОБРЫНА – балота (в. Сінск).
НЕРАБАВА – крыніца (в. Новая Лутава).
НЯЎДОБНЫ МОХ – балота (в. Удалёўка).
ПАГАРЭЛАЕ – балота (в. Сінск).
ПАДХВІТНІК – возера (в. Сінск).
ПАНСКАЕ – балота (в. Шчытцы).

ПАПОЎ ВОСТРАЎ – балота (в. Пярэдзелка).
ПАПОЎКА – возера (в. Казіміраўка).
ПАПОЎ РОГ – балота (в. Бушацін).
ПАПОЎШЧЫНА – балота (в. Вазон).
ПАРУБЕЖНАЕ – балота (в. Ісакавічы).
ПАЎЛАВА ЧЫСЦІНЯ – балота (в. Бушацін).
ПЕРАХОДКА – балота (в. Бывалькі).
ПЕСАЧАНКА – прыток Дняпра (в. Ручаёўка); рака (вв. Астравы, Вазон, Дзімамеркі, Міхалёўка, Новая Алішэеўка, Новая Лутава, Сінск, Сяўкі, Тучкі).
ПЕСОШНЯ – балота (в. Міхалёўка).
ПІЛІПАВА – балота (в. Астравы).
ПІЛІПАЎ ХУТАР – балота (в. Бушацін).
ПІЛІПЧУКОВА – балота (вв. Буда-Петрыцкая, Дуброва).
ПІЛІПЧУКОВА ЛАЗА – балота (в. Іванькаў).
ПЛЁС (ПЛЁСА) – балота (вв. Міхалёўка, Мохаў, Старая Лутава, г. п. Лоеў).
ПРЫШЧЭПАВА – балота (в. Ястрабка).
ПУГАЧОЎСКІ КРУЖОК – балота (в. Пярэдзелка).
ПУХОЎКА – балота (в. Новая Баршчоўка).
РАГАВОЕ – балота (в. Казярогі); возера (г. п. Лоеў).
РАКІТАВА – балота (в. Рэкорд).
РАКІТНАЕ – балота (в. Іванькаў); балацянка (в. Глушэц).
РАМАНАВА – балота (г. п. Лоеў).
РАМАНЮЖЫНА – балота (в. Лесуны).
РАЕНКАЎ КРУГ – балота (вв. Дуброва, Іванькаў).
РЖАВАЕ – балота (в. Глушэц, г. п. Лоеў).
РЖАВЫЯ ПЕЛІ – балота (в. Малінаўка).
РУДАВЕЦ – балота (в. Астравы).
РУДЗЕЦ – балота (в. Глушэц).
РУДЗЯНЕЦ – балота (в. Новая Алішэеўка).
РУДОЕ – балота (в. Мохаў).
РЫГОРАВА – балота (в. Пустая Града).
РЫЛЬЦА – возера (в. Бывалькі).
РЫМАРАВА – балота (в. Казіміраўка).
РЭГЕЛЕВА – балота (г. п. Лоеў).
РЭПІШЧА – возера (в. Глушэц).
РЭЧОМКА – прыток Брагінкі (в. Буда-Петрыцкая).
САМОЙЛАЎ РОГ – балота (в. Цясны).
САНТАНАВА – балота (в. Крупейкі).
САРАКАВУХІ – балота (в. Вазон).
СВІРЭЖСКАЕ – возера (г. п. Лоеў).
СВЯТОЕ – возера (г. п. Лоеў).
СВЯТОЕ ГАЛА – балота (в. Удалёўка, п. Бодры).
СІНЮКОВА – балота (в. Малінаўка).
СКАЧКОВА – балота (п. Прагрэс).
СЛЕПІШЧА – балота (в. Новая Алішэеўка).
СМАЛОВІЦА – возера (п. Гарадок).
СОБАЛІ – возера (в. Страдубка).
СОЖ – рака (вв. Карпаўка, Хамінка).
СПАРЫШ – возера (в. Бывалькі).

СТАЛОЎКА – балота (в. Міхалёўка).
СТАЛЯРОВЫ КОПАНКІ – балота (в. Ручаёўка).
СТАНЦОВА – балота (г. п. Лоеў).
СТАРЫ КАМЕНЬ – балота (в. Вулкан).
СТАРЫК АБАКУМАЎСКІ (ХАМІНКА, ШЧЫЦЕЦКІ) – старое рэчышча (г. п. Лоеў, в. Пярэдзелка)
СТАЎ – балота (в. Старая Лутава).
СТРАЖА – рэчка (в. Буда-Петрыцкая).
СТРЭЛКА – возера (в. Бывалькі).
СУРЖЫКАВА – балота (п. Пабядзіцель).
СУРЖЫКАЎ КРУГ – балота (в. Астравы).
СУХАЯ ХВОЯ – возера (в. Бывалькі).
СУХОЕ ГАЛО – балота (г. п. Лоеў).
СЯРГЕЕВА СТОЙЛА – балота (в. Грохаў).
СЯЎКОЎСКАЕ – балота (вв. Бывалькі, Трасцянец).
ТАРАСЮКОВА – балацянка (в. Рудня-Бурыцкая).
ТОПЛЯ – балота (в. Пярэдзелка).
ТУРКАВА РЭЧКА – прыток ракі Брагінкі (в. Буда-Петрыцкая).
УЛАСАВА – балота (п. Усход).
УЮНІШЧА – балота (п. Усход).
ФЕДОСАВА – балота (в. Каўпень).
ФІЛЬКАВА КОПАНКА – балота (в. Ястрабка).
ХАРАБОРСКАЕ – балота (в. Уборкі).
ХАРОМНІ – крыніца (в. Страдубка).
ХЛАПОВА – балота (п. Усход).
ЦІТАВА – балота (в. Рудня-Бурыцкая).
ЦІХАЕ – возера (в. Дзяражычы).
ЦІХАНОЎКА – балота (в. Буда-Петрыцкая).
ЦОПАНКАВА – балота (г. п. Лоеў).
ЦЫГАНЫ – балота (п. Кірава).
ЧАРАТОВА – балота (в. Гарадок).
ЧОРНАЕ – балота (г. п. Лоеў).
ЧОРТАВА – балота (вв. Мохаў, Пярэдзелка); возера (в. Мохаў, г. п. Лоеў, п. Прагрэс).
ЧОРТАВА ГАРА – балота (в. Пярэдзелка).
ЧЫСЦЕЦ – балота (г. п. Лоеў).
ШАВЫРАЎ МОХ – балота (в. Міхалёўка).
ШАХАЎ – балота (в. Бывалькі).
ШУПЛЯКІ – балота (в. Шчытцы).
ШЧЭРБАВА – балота (п. Усход).
ШЫРОКАЕ – возера (г.п. Лоеў).
ЯГАДНАЕ – балота (в. Астравы).
ЯГОРЧЫКАВА – балота (в. Рудня-Бурыцкая).
ЯЗВІНЫ – балота (в. Каўпень).
ЯЛОВЕЦ – балота (в. Малінаўка).
ЯМЕНЕЦ – балота (вв. Белы Калодзеж, Вулкан, Рудня-Бурыцкая, Удалёўка).
ЯСЕНОВІК – балота (в. Сяўкі).
ЯШКАВА – копанка (в. Удалёўка).

Валянціна СМЫКОЎСКАЯ

ПА ШЛЯХУ ДУХОЎНАСЦІ

Лёс распарадзіўся так, што я на працягу шасці гадоў (чэрвень кожнага з іх), з'яўляючыся старшынёй Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі ў Лоеўскім педвучылішчы (з 1 верасня 2004 года педкаледж), мела магчымасць далучыцца да багатага духоўнага жыцця педагагічнага калектыву і навучэнцаў гэтай навучальнай установы. За 40 гадоў дзейнасці (юбілей вучылішча адзначаўся ў 2003 годзе) тут склаліся плённыя, лёсавызначальныя традыцыі, якія працягвае і ўзбагачае кожнае новае пакаленне моладзі – носьбітаў духоўнай культуры краю, народа.

Я сэрцам усвядоміла, як шануюць тут, дзе «спакойна і павольна, як у зачараваным сне», цячэ прыгажун Дняпро, дзе ў ціхія летнія вечары густа пахне бэз і чаромха, чаруюць сваім хараством сады і сенажаці, як тут разумеюць моц і харство чалавека, значэнне школы, кнігі ў жыцці народа, дбаюць пра лепшую долю свайго чароўнага кутка, нясуць «на свет цэлы» як неабходны духоўны набытак плён сваёй творчай працы.

Сённяшні дырэктар вучылішча Уладзімір Паўлавіч Краўчанка перакананы ў тым, што тут вучаць настаўнікаў, тых, хто будзе фарміраваць характар і светапогляд будучых грамадзян Рэспублікі Беларусь. Таму з такой вялікай адказнасцю адносяцца да выканання сваіх абавязкаў выкладчыкі-прафесіяналы, не толькі даючы моладзі грунтоўныя і трывалыя веды, але і вялікі зарад той духоўнасці, без якой сёння нельга выхаваць грамадзяніна і патрыёта, свядомага прадстаўніка нацыі.

Агульнавядома, што ўсё вялікае, геніяльнае нараджаецца менавіта на глебе нацыянальнага духоўнага вопыту. Па словах намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце Раісы Васільеўны Бараўцовай, «важнейшая задача пачатковай школы – стварыць умовы для авалодвання вучнямі трывалымі ведамі, уменнямі і навыкамі. Але ж у гэты перыяд, – лічыць яна, – дзіця не толькі назапашвае багаж ведаў, рыхтуецца да далейшага навучання, яно павінна жыць багатым духоўным жыццём».

Выпускнікі Лоеўскага педвучылішча (сёння гэта ўжо цэлыя дынастыі педагогаў) ідуць у самастойнае жыццё, разумеючы сваю высакародную задачу, свой абавязак перад Радзімай, грамадствам: даваць глыбокія веды дзецям, развіваць цікавасць да кнігі і чытання, выхоўваць ў іх высокія маральна-этычныя якасці і ў цэлым служыць пачэснай справе выхавання духоўнасці ў чалавеку.

Па шляху сапраўднай духоўнасці крочаць сёння і былыя выпускнікі гэтай навучальнай установы, якія пасля заканчэння вну сталі дырэктарамі, завучамі, настаўнікамі сярэдніх школ, загадчыкамі аддзелаў, супрацоўнікамі Міністэрства

адукацыі РБ, навукоўцамі, работнікамі органаў дзяржаўнага кіравання, выдатнікамі адукацыі, членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Вось ён, плён той духоўнасці, таго багатага вопыту, прафесійнай кампетэнтнасці, якімі валодае калектыў выкладчыкаў вучылішча. Вялікія змены ў грамадстве станоўча ўплываюць на сур'ёзнае разуменне выкладчыкамі значнасці і важнасці той справы, якой займаюцца, аберагаючы і захоўваючы агульначалавечыя і культурныя каштоўнасці народа, нацыі.

У Лоеўскім педвучылішчы заўсёды клапаціліся і сёння клапоцяцца аб тым, каб моладзь ведала багатую спадчыну свайго краю. Навучэнцы-краязнаўцы (а такіх нямала ў вучылішчы) за перыяд вучобы назапашваюць багаты матэрыял для музея «Спадчына», пачынаюць знаёмства з духоўным набыткам краю з яго мінулага. Што ж сёння шукаюць яны ў гэтым мінулым, чаму так пільна ўглядаюцца ў яго?

Доўгі час у Лоеве жылі Герой Савецкага Саюза, мясцовы «Марэсьеў» А. В. Казлоў, ўдзельнікі рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Гісторыя іх жыцця і дзейнасці – добры прыклад выхавання ў навучэнцаў патрыятычных пачуццяў. Напярэдадні 60-годдзя Вялікай Перамогі праводзіліся сустрэчы навучэнцаў з вядомымі людзьмі, удзельнікамі фарсіравання Дняпра, былымі воінамі дняпроўскіх дывізій, што ўдзельнічалі ў вызваленні Лоева, родзічамі загінуўшых герояў, паходы па месцах гераічнай гісторыі роднага краю. У навучэнцаў асабліва абвастрылася пачуццё гонару за сваіх землякоў. Жыхары Лоеўшчыны, як аб тым сведчыць іх гераічны летапіс, заўсёды былі годнымі людзьмі, умелі любіць і ненавідзець, ніколі не гнуліся перад чужынцамі.

Вялікую ролю ў выхаванні духоўнасці, нацыянальнай самасвядомасці ва ўсе часы адыгрываў фальклор. Фантастычнасць чароўных міфаў і паданняў, вымысел народных казак, лірызм і цеплыня песняў, дакладнасць і прыгажосць прыказак і прымавак, дасціпнасць і мудрасць загадак – усё гэта прывучае думаць, садзейнічае выхаванню высокіх грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў. Менавіта ў фальклоры праходзілі праверку на чысціню і трываласць жыццёвыя ідэалы беларуса, яго ўяўленні пра матэрыяльныя, маральныя, духоўныя каштоўнасці, пра сэнс жыцця.

На зямлі Лоеўшчыны здаўна любілі песні. Любяць і шануюць народную «крылатую» песню і ў педвучылішчы. Любяць выкладчыкі і навучэнцы. І калі я слухала яе ў выкананні хора вучылішча, адчувала, якая багатая і цудоўная нам засталася спадчына. Яна адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці моладзі, яе духоўнасці.

Услухайцеся ў пранікнёныя словы песні-гімна педвучылішча, сённяшняга педкаледжа «Прызнанне вечнае ў любові» (сл. А. Кукары, муз. А. Сусла):

Хвала табе, Дняпро сівы,
Хвала тваім магутным хвалям!
Жыццё тут пачыналі мы,
Мы тут навукі пазнавалі.
Мы тут вучыліся любіць,
І душы напаўняюць любоўю,
Мы навучыліся, як жыць,
Бацькоўскі край, адным табою.

Гэта прызнанне ў любові да сваёй малой радзімы, якую любяць навучэнцы і выкладчыкі. Але, як вядома, з гэтай адзінай, сваёй, адметнай малой радзімы чалавек ідзе і прыходзіць да той Вялікай Радзімы – Бацькаўшчыны.

Абуджаюць добрыя ўспаміны і светлыя пачуцці ўдзельнікі жаночага вакальнага ансамбля вучылішча «Гаспадынькі» (кіраўнік Канаплянік Н. А.), краязнаўчага гуртка «Зямля маіх продкаў» (кіраўнік Сямашка Л. М.), гуртка «Фантазія і мы» (кіраўнік Шумігай І. Л.). Сцэнічнаму мастацтву і майстэрству вучыць моладзь Канцавая Р. М. Гурткоўцы – пастаянныя госці ў школах, на прадпрыемствах Лоеўшчыны.

За высокія дасягненні і актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і абласных выставах тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнцы ўзнагароджваліся граматамі і дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Калі ўважліва ўглядаешся ў творчыя работы навучэнцаў, адчуваеш іх адметнае стаўленне і да тэатра, і да музыкі, і да жывапісу. Умеюць яны «чытаць» «найпрыгажэйшую кнігу прыроды» Лоеўшчыны, радуюцца і праляцеўшаму буслу, і ўзбярэжжу Дняпра, і зарэчным заліўным лугам. Усё для іх мае сваё значэнне і свой глыбокі сэнс. Перад імі шырока раскрыты навакольны свет, свет жыцця, чысціні, прыгажосці.

Услухайцеся ў сціплыя прызнанні былых выпускнікоў вучылішча. «Мне вельмі пашанцавала. Усё жыццё побач са мной былі людзі, якія запальвалі агеньчык творчасці, не дазвалялі спыняцца на дасягнутым.

Самыя шчырыя словы ўдзячнасці хочацца сказаць калектыву педвучылішча, сапраўдным майстрам педагагічнай працы, творчым людзям, якія заўсёды ў пошуку, якія ўмеюць весці за сабой і ісці побач», – успамінае свае шляхі-дарогі, сваю Alma mater загадчык аддзела адукацыі райвыканкама А. Юкоўская. А былая настаўніца пачатковых класаў школы № 2 г. Лоева В. Тарасава, зараз пенсіянерка, з гонарам зазначае, што заўсёды чула толькі цёплыя словы падзякі ў адрас Лоеўскага педагагічнага вучылішча і ў вобласці, і ў рэспубліцы.

Гэтыя шчырыя прызнанні сагрэты цяплом сапраўднага чалавекалюбства, вялікага гонару за сваіх былых выкладчыкаў.

Паказчыкам сапраўднай годнасці чалавека, сімвалам гонару народа ва ўсе часы лічылася родная мова. Для педагагічнага калектыву вучылішча і навучэнцаў яна – найдаражэйшы і неацэнны скарб, які яны аберагаюць, ашчадна захоўваюць.

Доўгі час літаратурнае аб'яднанне «Узлёт» (цяпер «Маладыя галасы» (кіраўнік Сусла Г. М.)) узначальваў Кукара А. У. (аўтар паэтычнага зборніка «Жаўруковая песня», творца выключна таленавіты і апантаны ідэяй дабра і прыгажосці). Вялікі свет сваёй малой радзімы наблізіў ён да нас, з'явіўшыся ініцыятарам выдання паэтычнага зборніка «Песні над Дняпром» (з 35 аўтараў 17 – паэты вучылішча), зборніка паэзіі 40 выкладчыкаў і навучэнцаў «Дняпроўскія зоркі», выдадзенага да 40-годдзя навучальнай установы. У анатацыі да яго сказана: «Выкладчыкі і выпускнікі розных год, цяперашнія навучэнцы і работнікі педвучылішча ў сваіх вершах апяваюць родны край, зямлю, людзей, прысвячаюць свае радкі роднай маці і роднай мове, узлятаюць на крылах песні да зорак, услаўляюць чалавечую годнасць і подзвіг тых, хто аддаў жыццё за нас, мараць аб шчасці для людзей і светлым і святым каханні».

За кожным паэтычным радком гэтага выдання адчуваеш чысціню светапогляду аўтараў, іх уяўленні пра матэрыяльныя, маральныя і духоўныя каштоўнасці, пра сэнс жыцця. І характэрная, сімвалічная назва зборніка, і даверлівасць, задушэўнасць паэтычнага радка пачынаючых творцаў сведчаць, з аднаго боку, пра іх арыентацыю на лірычнае самавыяўленне, споведзь пра запаветнае, з

другога, – аб высокай духоўнасці, грамадзянскасці, патрыятызме выкладчыкаў і навучэнцаў.

Матывы вернасці роднай зямлі, паэтызацыя яе народна-маральных каштоўнасцей, асэнсаванне нялёгкага гістарычнага лёсу з'яўляюцца вызначальнымі ў паэтычных задумах аўтараў.

Сімвалічны верш-прысвячэнне Бараўцовай Р. В. «Лоеўшчыне»:

Дзе ў свеце знойдзеш прыгажэйшы край,
Чым ты, маё святое Прыдняпроўе?
Тут стромы берагоў, зялёны гай
І тут сям'і маёй выслоўе і высноўе.

Сваё ўспрыманне радзімы ў былых навучэнцаў Малеева У., Місачэнка Л., Кашкар Н. Яны апавядаюць пра непарыўную сувязь з зямлёй бацькоў, з роднымі вобразамі і з'явамі, не раз назавуць і Лоеўшчыну, і Беларусь сваёй Бацькаўшчынай. Яны вядуць своеасаблівы дыялог-споведзь, размову з імі, разумеючы свой абавязак перад народам і Радзімай: «...і поўніцца родным і кроўным душа», «дакрануся душой да любімага краю», з ім сустрэчы заўсёды я так шчыра жадаю».

Тут сустракаюць шчодрым хлебам-соллю,
Сардэчна запрашаюць пагасціць,
Наладзяць вам вясёлае застолле,
Тут песня дружбы і радасці гучыць,

– усхвалявана піша ў вершы «Роднаму краю» Наталля Кашкар. І гэта не проста сцвярджэнне такіх вызначальных рыс характару яе народа, як шчырасць, гасціннасць, чалавечнасць, добразычлівасць, шчодрасць. Гэта яшчэ і праяўленне высокіх патрыятычных пачуццяў, актыўнай грамадзянскай пазіцыі пачынаючай паэткі. І міжволі думаеш, што такія выхаванцы зберагуць багатыя традыцыі роднага краю, мараль і псіхалогію сваіх землякоў на гонкіх зямных раздарожжах, на складаных пуцявінах свайго жыцця.

А ў вершах А. Кукары «Родная мова», «Ці не мы беларусы...» адчуваеш натуру гордую, шчырую, адкрытую. Аўтар данёс да чытача свае пачуцці, свае адносіны да роднай мовы, сваю трывогу за яе будучыню:

Ты песня і казка, матчына мова,
Ты з чыстых жыўцовых палескіх крыніц,
Ты з нівы жытнёвай, пяшчоты вятровай,
Ты з памяці, з суму сівых камяніц.
І высахнуць рэкі, а ты не змялееш,
І вечны пад небам гучаць будзе спеў –
Купала і Колас, і Быкаў, і Мележ –
Вяковая мудрасць атуліць цябе.
О, родная мова! Матчына песня!

Нам блізкія сёння думкі паэта, яго мастакоўская пазіцыя, яго ўрокі, якія набываюць значэнне не толькі сур'ёзных абагульняючых вывадаў, але і ўрокаў дабра і чалавечнасці, і не столькі па абавязку службы, колькі па абавязку сэрца.

З даўніх часоў народ Лоеўшчыны адмоўна ставіўся да індывідуалізму, эгаізму, хцівасці, сцвярджаў ідэалы дабра, справядлівасці, спагады і міласэрнасці. Чытаеш радкі вершаў, прысвечаных маці, бацькам, і пачынаеш усведамляць, што яны, навучэнцы-дзеці, толькі звяно ў ланцужку пакаленняў. Ім наканавана здзяйсняць тое, што завешчана бацькамі. Нам гэты працяг бачыцца і ў непарыўнай сувязі паміж пакаленнямі выкладчыкаў і навучэнцаў вучылішча. «Ідучы» ў паэтычным зборніку «Дняпроўскія зоркі» побач, і тыя, і другія сцвярджаюць

высокую духоўнасць, чалавечнасць ў адносінах паміж людзьмі наогул, сваё разуменне высокай годнасці беларуса:

Ці не мы даравалі дзяржаўнасці мову –
Літоўскаму княству культуры аснову?
Ці не з нашае «цемры» выходзяць Скарыны,
Што яснотнасцю дум сваіх свет азарылі?

«Ці не нам, беларусам, не толькі па званню, // Свет любоў падарыў і агульнапрызнанне?» – піша літаратурны настаўнік моладзі Кукара Алесь у вершы «Ці не мы беларусы...».

Большасць вершаў зборніка «Дняпроўскія зоркі» напісаны на рускай мове, мове, якая ў нас сёння таксама дзяржаўная. І гэта сведчанне таго, што ў Лоеўскім педвучылішчы добра ўсведамляюць: у шматграннасці і разнастайнасці, у садружнасці моў, культур, літаратур крыецца глыбокі агульначалавечы сэнс. На змену нацыянальнай абмежаванасці прыходзіць разуменне неабходнасці такіх узаемасувязей, сінтэзу духоўных каштоўнасцей, духоўных узаемаўплываў. Наталля Гошка ў вершы «Не создан человек для одиночества» шчыра прызнаецца:

Не создан человек для одиночества,
С дремучими инстинктами в крови,
Он может жить без имени, без отчества,
Но никогда – без ласки и любви.
Живой душе живое поклонение
В грехах нам забываться не дает.
Живой души подводное течение
Столетья движет человечий род.

Агульнае ва ўсіх творах зборніка – духоўная блізкасць вытокаў творчасці паэтаў, агульначалавечы пафас, патрыятычнае і грамадзянскае гучанне, жанрава-стылёвая разнастайнасць. Фактычны матэрыял вершаў данёс да нас багацце думак, пачуццяў, маральных перакананняў і актыўнасць грамадзянскай пазіцыі прадстаўнікоў розных пакаленняў.

Калектыў выкладчыкаў і навучэнцаў Лоеўскага педкаледжа валодае шчаслівым талентам, талентам чалавечнасці, той паляшуцкай чуласці і спагадлівасці, якія моцна прыварожваюць кожнага, хто далучаецца да жыцця і людзей краю. Лоеўскія выкладчыкі даюць не толькі ўрокі па прадметах, але і ўрокі, шчырыя і глыбокія па сваёй сутнасці, чароўныя і жыццесцвярджальныя, поўныя вялікай веры ў прыгажосць і высокі сэнс чалавечага быцця.

І хочацца пажадаць ім далейшых поспехаў на гэтым складаным шляху духоўнасці...



Дзе над Дняпром і Сожам вербы з клёнамі
Над зоркамі высокімі шумяць,
Дзе салаўі над вёснамі зялёнымі
На тры дзяржавы аб любві звіняць, –
Зямля мая, крынічная, азёрная,
Няма святей і даражэй зямлі.
Пра тваю славу, Лоеўшчына зорная,
На цэлы свет спяваюць салаўі.

Палёў абрусы сонечна-зялёныя
І абеліскаў мармур ля дарог...
Жыве тут памяць бессмяротных воінаў,
Хто ў той вайне крывавай перамог,
Хто з-пад Масквы, з-за Волгі, з Поўдня, з Поўначы,
Хто нарадзіўся ля дняпроўскіх стром,
Чые імёны вечна будуць помніцца:
Апарын, Батаў, Царыкаў, Казлоў...

Вятры над партызанскімі зямлянкамі
Бушуюць у Амелькаўскіх лясах.
Не зарастаюць сцежкі партызанскія,
Жыве ў табе змагарская краса.
Салдатам Сінякова ўспамінаюцца
Блакады, і паходы, і баі...
Над партызанскім краем заліваюцца,
Пяюць каханне свету салаўі.

Ой, край мой прыдняпроўскі, край палескі мой,
Край шчодрых сэрцаў і руплівых рук,
Багаты і легендамі, і песнямі,
Табою ганарыцца Беларусь!
Жыць і любіць, і верыць нарачоная,
У бессмяротнай вечнасці й пасля,
Багатая майстрамі і вучонымі, –
Над Лоевай Гарой – мая зямля...

Плывуць Дняпра і Сожа хвалі вечныя –
У мора-акіян, як песня салаўя.
Старонка мая любая надрэчная,
О, Лоеўшчына, любая мая!

Алесь КУКАРА

ЗМЕСТ

Лоеўшчына – «край шчодрых сэрцаў і руплівых рук»!
С. А. Мятліцкі 3
Расскажу я секрет. *Л. Долбикова* 6
Ад аўтара-ўкладальніка. *В. Новак* 7
Замовы Лоеўшчыны ў сучасных запісах. *С. Вяргеенка* 9
Замовы 14
Народны каляндар Лоеўшчыны. *В. Новак* 36
Зімовыя абрады і песні 48
Веснавыя абрады і песні 112
Летнія абрады і песні 166
Восеньскія абрады і песні 191
Мясцовая спецыфіка сямейна-абрадавай паэзіі Лоеўшчыны.
В. Новак, М. Касцюкова 197
Радзінна-хрэсьбінныя абрады і песні 202
Вяселле 228
Пахаванне 277
Прыкметы і павер'і Лоеўшчыны. *А. Кастрыца* 282
Прыкметы і павер'і 285
Легенды, паданні, казкі 302
«Без Бога – ні да парога» (Тэматычная шматграннасць і паэтыка парэмій Лоеўшчыны). *Л. В. Мельнікава* 309
Загадкі, прыказкі, прымаўкі 314
Святло няўлоўнае дзяцінства. *А. Кучарава* 328
Дзіцячы фальклор 332
Пазаабрадавая паэзія 344
Міфалагічныя ўяўленні жыхароў Лоеўшчыны. *К. Паборцава* 374
Міфалогія 377
Край узнёслых песень, край маёй любові... *Л. Долбікава* 415
Фальклорная спадчына – няспынная творчасць.
Л. Г. Мельнікава 418
Іх нарадзіла зямля Лоеўшчыны. *В. Генаш* 420
Шчымлівы плёскат хваль дняпроўскіх. *Л. Кузьміч* 424
Канкрэтна-бытавая лексіка Лоеўшчыны. *А. Воінава* 426
Гісторыя Лоеўшчыны ў тапанімічных назвах.
Н. Багамольнікава 430
Народнагаспадарчая лексіка Лоеўшчыны. *А. Станкевіч* 433
З этналінгвістычнай спадчыны Лоеўшчыны. *У. Коваль* 438
К происхождению лоевских лексем *калдун* и *каўтун*.
Е. Холявко 441
З глыбінь жыватворных. *Т. Кручэнка* 445
Зямля і людзі. *Т. Кручэнка* 448
Як жывяце, марсіяне? *Т. Кручэнка* 450
Русалкі, уладарніцы расы... *Т. Марозава* 453
З матэрыялаў да «Слоўніка гідронімаў Гомельшчыны» (Лоеўскі раён). *У. Бобрык* 458
Па шляху духоўнасці. *В. Смыкоўская* 465
«Дзе над Дняпром і Сожам вербы з клёнамі...» *А. Кукара* 470

Навукова-папулярнае выданне

ЛОЕЎШЧЫНА... БЭЗАВЫ РАЙ, ПЕСЕННЫ КРАЙ
СУЧАСНЫ СТАН ТРАДЫЦЫЙНАЙ
КУЛЬТУРЫ ЛОЕЎШЧЫНЫ

Адказны рэдактар В. С. Новак
Рэдактар Т. І. Звяркова
Тэхнічны рэдактар С. М. Вяржбоўская
Мастацкі рэдактар Г. В. Кушнікава
Карэктар Л. В. Фралова
Мастак вокладкі В. І. Кушняроў
Камп'ютэрная вёрстка Н. М. Ганчарова

Падпісана да друку 27.08.07 г. Фармат 70×100/16.
Папера афсетная. Гарнітура Баскервіль.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 38,06. Ул.-выд. арк. 36,9.
Тыраж 1000. Зак. 1526.

Камунальнае выдавецка-паліграфічнае
унітарнае прадпрыемства «Сож»
ЛВ № 02330/0133036 ад 30.04.2004 г.
ЛП № 02330/0056834 ад 30.04.2004 г.

246015, Рэспубліка Беларусь, г. Гомель,
вул. Лепяшынскага, 1

Выраб вокладкі:
ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа»
220600, г. Мінск, вул. Чырвоная, 23